

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР

ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ
імя ЯНКІ КУПАЛЫ

Піліп Пестрак

ЗБОР ТВОРАЎ У ПЯЦІ ТАМАХ

Рэдакцыйная калегія:
БАРЫСЕНКА В. В., КАВАЛЕНКА В. А.,
МУШЫНСКІ М. І., ПАВУМЕНКА І. Я.,
ПЕСТРАК А. С., ХРОМЧАНКА К. Р.,
ШАМЯКІН І. П.

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1984

Пілíп Пестрак

ТОМ

1

ВЕРШЫ

ПАЭМА

АПАВЯДАННІ

АПОВЕСЦІ

Рэдактар тома
К. Р. ХРОМЧАНКА
Падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі
Т. Р. СТРОЕВАЙ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1984

Бел 2
П 28

П $\frac{4702120200-055}{M\,302(05)-84}$ падпісное

© Афармленне. Прадмова. Каментарыі. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1984.

АД РЭДАКЦЫІ

Збор твораў у 5-ці тамах вядомага беларускага пісьменніка Піліпа Пестрака (1903—1978) — першае навукова-масавае выданне яго літаратурна-мастацкай, публіцыстычнай спадчыны. У параўнанні з папярэднім прыжыццёвым чатырохтомным выданнем новы Збор твораў больш поўны: у яго ўпершыню ўключаны некаторыя вершы апошніх гадоў, паэма «Слова пра Мінск», публіцыстычныя і літаратурна-крытычныя артыкулы, а таксама раман «Лесавічанка».

Да кожнага твора даецца адпаведны літаратурны і гісторыка-тэксталагічны каментарый. У апошнім томе змешчаны «Асноўныя даты жыцця і творчасці П. Пестрака».

Творы ў выданні размешчаны паводле жанрава-храналагічнага прынцыпу:

першы том — прадмова да выдання, вершы, паэма «Слова пра Мінск», апавяданні, аповесці;

другі і трэці тамы — раман «Сустрэнемся на барыкадах»;

чацвёрты том — раман «Серадзібор»;

пяты том — раман «Лесавічанка», публіцыстычныя і крытычныя артыкулы, «Асноўныя даты жыцця і творчасці П. Пестрака».

Збор твораў П. Пестрака падрыхтаваны ордэна Дружбы народаў Інстытутам літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў БССР.

ВОДГЛАС ЗВЕДАНАГА І ПЕРАЖЫТАГА

У незабыўны верасень 1939 года была зруйнавана ненавісная панская мяжа, якая на працягу доўгіх дваццаці гадоў раздзяляла адзінакроўных братоў-беларусаў. Над спакутаванай зямлёю Заходняй Беларусі ўзвіліся тады пурпуровыя сцягі свабоды, што прыйшла з усходу і разбіла ланцугі няволі і прымусу.

Разам з сваім мужным і нязломным народам змагаўся за гэтую свабоду і Піліп Пестрак, рэвалюцыянер-камуніст, паэт-трыбун, чыё палымяное слова было грознай зброяй у барацьбе працоўных за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. За яго плячамі быў ужо немалы жыццёвы шлях, адзначаны і згрызотнымі будняміі гаротнага сялянскага побыту, і доўгімі гадамі пакут у змрочных мурах астрожных казематаў, і суровымі сцежкамі падполля. Гэты вялікі запас уражанняў і назіранняў, вынесены з заходнебеларускай рэчаіснасці, з'явіўся арсеналам тэм, матываў і вобразаў для многіх твораў пісьменніка, вызначыў характар і аспоўны напрамак яго далейшай літаратурнай творчасці.

З старонак шматлікіх паэтычных зборнікаў, кніжак апавяданняў, аповесцей, з рамапаў П. Пестрака, напісаных у савецкі час, паўстаюць яркія і хвалюючыя карціны пядаўняга мінулага, поўныя сапраўднага гераізму, мужнасці і самаахвярнасці. У іх святле глыбей асэнсоўваюцца многія падзеі і з'явы нашай сучаснасці, больш поўна і ўсебакова раскрываецца вобраз працоўнага народа Заходняй Беларусі ва ўсёй яго гістарычнай велічы і значымасці.

Нарадзіўся Піліп Сямёнавіч Пестрак 27 лістапада 1903 года ў вёсцы Сакаўцы былога Косаўскага павета на Палессі ў сям'і селяніна. Бацька яго з-за недахопу зямлі часта вымушаны быў пакідаць гаспадарку і ісці працаваць на чыгунку. На невялікім падзеле ўпраўлялася маці з дзецьмі. У голадзе і нястачах праходзіла дзяцінства будучага пісьменніка.

Калі ж да Палесся дакацiўся фронт імперыялістычнай вайны, сям'я Пестракоў з абозам бежанцаў накіравалася па старой Брэст-Маскоўскай шашы на ўсход, у бок Бабруйска, а адтуль чыгункаю аж на Паволжа. Там і знайшла яна прытулак у вёсцы Максімаўка Бузулукскага павета Самарскай губерні. Піліп працягваў вучобу ў двухкласным вучылішчы, якое і закончыў у 1917 годзе.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя адкрыла для П. Пестрака, як і для ўсіх дзяцей працоўных, шырокую дарогу ў жыццё. Вучыўся ў гімназіі ў Бузулуку, затым перайшоў на

рабфак у горадзе Чапасўску, а ў 1920 г. паступіў на сацыяльна-гістарычны факультэт Самарскага універсітэта. Гэта былі гады актыўнай грамадскай дзейнасці юнака-камсамольца, пара светлых мар і надзей.

Мы рыхтаваліся к сяўбе
На новай ніве пераможнай,
І кожны компас браў сабе,
Каб не заблудзіць ў далі дарожнай.

Так пісаў пазней паэт пра тыя часы ў паэме «Сын Кастрычніка» [1]. Але не суджана было тады збыцца яго марам. Голад і эпідэмія тыфу, што ахапілі Паволжа, прымусілі Пестракоў у ліпадзе 1921 года вярнуцца на радзіму, у заняволеную польскімі панамі Заходнюю Беларусь. Тут у хуткім часе памёр бацька, застым сястра і брат.

З цяжкасцю знайшоў для сябе нядаўні студэнт працу рабочага на лесапільным заводзе, а крыху пазней, у 1924 годзе, пасаду лесніка ў купца-лесапрамыслоўца каля Слоніма. Спрабаваў зноў вярнуцца ў Савецкі Саюз, але беспаспяхова. Быў злоўлены на граніцы каля станцыі Гарадзея, этапным парадкам дастаўлены ў свой павет, пасля чаго месяц адсядзеў пад арыштам.

Вярнуўшыся з вайсковай службы, якую праходзіў у 1924—1926 гадах у горадзе Торунь, П. Пестрак стаў актыўным дзеячам Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, быў абраны членам Косаўскага павятовага камітэта БСРГ. У верасні 1926 г. ён уступіў у рады Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. З гэтага часу і пачаўся для яго нялёгкі шлях рэвалюцыйнай барацьбы, які правёў яго нялёгкімі сцежкамі падполля праз многія гарады і вёскі буйнарнай Заходняй Беларусі, праз этапныя дарогі і доўгія гады турэмнага зняволення.

Каля адзінаццаці гадоў правёў паэт-рэвалюцыянер за кратамі. Там ён таксама быў змагаром: кіраваў дзейнасцю турэмных партыйных камітэтаў, узначальваў барацьбу палітзняволеных за свае правы, прымаў удзел у нелегальным астрожным друку, выкладаў розныя навукі непісьменным і малапісьменным вясковым хлопцам.

Пісаць П. Пестрак пачаў у сярэдзіне 20-х гадоў, калі над заходнебеларускай зямлёй шумелі хвалі народна-вызваленчага руху, разгортвала сваю дзейнасць Грамада. Горача, нафаспа заклікаў тады паэт сваіх прыгнечаных братоў змагацца за свабоду, за лепшую долю:

Уставай, галодны беларус,
Служыць радзімай справе,
Скінь з плеч прыгоны і прымус,
Дабудзь дарогу к славе.

«Наперад, гэй...», 1926.

Праўда, гэтая рамантычная ўзнёсласць, навеяная ўздымам рэвалюцыйнай барацьбы, знікне з разгромам Грамады. На змену ёй прыйдзе стрыманая цвярозая разважлівасць над лёсам свайго народа, шляхамі да яго вызвалення.

---

[1] Рукапіс паэмы загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны. Вядомы толькі ўрывак з яе пад назвай «У Маскве».

У паэзіі Пестрака канца 20-х і асабліва 30-х гадоў знайшло яскравае адлюстраванне цяжкае жыццё прыгнечанага панамі селяніна, побыт беларускай вёскі з мазольнай працай на вузкім загоне, з штодзённым змаганнем за кавалак хлеба («На гарэ маці жне», «Калыханка», «Агурэчны ўкроп», «Грэчка», «Ты збудзі мяне, маці, рана»). А побач з гэтым матывы пратэсту, усвядомленай барацьбы з несправядлівым панскім ладам, які павінен быць звергнуты («Над намі віхры выюць...», «Мацуйся!», «Моладзі», «На фронце»). Лірычны герой Пестрака ўжо не той гаротнік-селянін з масавай заходнебеларускай паэзіі, што толькі плаксіва паракаў на свой лёс, а мужны змагар, рэвалюцыянер-падпольшчык, «агітатар-салдат-масавік», якога не палохаюць ні суровыя выпрабаванні, ні астрожныя пакуты, ні сама смерць («На смерць барацьбіта»). «Хто ж, як не мы, галаву падыме горда, каб узысці на эшафот?!» — заяўляе паэт-камуніст вуснамі свайго героя ў вершы «Пасля прысуду».

Подыхам гэтага суровага часу абумоўлена разуменне аўтарам задач і прызначэння паэзіі як грознай зброі ў барацьбе з ворагамі. Паэзія — гэта магутны гром, заклік да бою, «меч прамяністы», нацэлены ў тых, «хто абуў жыццё нашае ў лапці,— у тую чорнакрывавую зграю!» («Паэзія»). Такім было палымянае слова і самога Пестрака, якое вырывалася з-за астрожных крат, пранікала над саламяныя стрэхі сялянскіх хат, узнімала масы на барацьбу, усяляла ў сэрцы змагароў мужнасць і веру ў перамогу.

Даверасцёўская паэзія П. Пестрака — адна з яркіх і цікавых старонак заходнебеларускай літаратуры. Большасць яго вершаў была напісана ў турмах, за кратамі. Занатаваныя на абрыўках паперы, цвіком на сцяне або захаваныя ў памяці таварыша па камеры, яны часцей за ўсё не маглі трапіць у друк. Калі ж ім удавалася вырвацца на волю, яны ішлі ў народ, станавіліся рэвалюцыйнымі песнямі, каб «калыхаць паходы» (В. Таўлай), жыць і змагацца за лепшае будучае.

Пад многімі вершамі П. Пестрака стаяць як адзнакі этапных дарог паэта назвы астрогаў — Гродзенскага, Лукішскага, Пружанскага і інш. Але гэтыя творы — не проста лірыка асабістых настрояў і перажыванняў паэта-вязня. Гэта — паэзія вялікіх мастацкіх абагульненняў, суровы гімн мужнасці і нязломнасці рэвалюцыянераў-барацьбітоў, якія ў адкрытым баі стойкасцю і цярпеннем перамагаюць ворагаў. «Мы не памрэм!» — асноўны матыў астрожных вершаў Пестрака. Праз суровы турэмны побыт, адзіночкі, карцэры, галадоўкі, здзекі і катаванні паглядчыкаў праносіць лірычны герой прагу да барацьбы і нязгасную веру ў перамогу.

Знаю — выйду вясною шумлівалістаї,
Каб тысячы мук,
як сцягі, падняць! —

заяўляе ён у вершы «Мы не памрэм!».

Паэт, які сам ішоў шляхам рэвалюцыйнага змагання, да канца зведаў і будні падполля і цяжар астрожных пакут, здолеў праўдзіва перадаць настрой чалавека-барацьбіта, раскрыць яго самыя патаемныя думы і пачуцці. Выключнай дакладнасцю ў паказе жыццёвых рэалій, турэмнага побыту, у стварэнні псіхалагічнага партрэта лірычнага героя вызначаюцца такія яго астрожныя вершы, як «Сціхніце, зоры...», «Гадзіна мукі», «Голад», «Развітан-

не», «Гоман ночы свае чары рассеяў...», «На волю», «Пад Новы год» і інш. У іх П. Пестрак з вялікай мастацкай сілаі увасобіў ідэю бессмяротнасці і непераможнасці народа, які ўзняўся на барацьбу за сваё сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне. Уласна ж перажытае, зведанае паэтам падавала творам асаблівую страснасць, эмацыянальнасць.

Сацыяльныя матывы, грамадзянскі пафас выступаюць на першы план у інтымнай і прыродаапісальнай лірыцы П. Пестрака. Каханая лірычнага героя — гэта або сялянская дзяўчына, якая, частуючы яго кашай картаплянай, «ў вокны жвава паглядала — ... за мяне дазор вяла, мяне — паўстанца — сцерагла!» («Пад роднай страхой»), або маладая камсамолка, таварыш па падполлю, «змагарская, шчырая, простая», з якою ідуць яны адной дарогай «у народ».

Паэта глыбока хвалюе лёс прыгнечанага народа, яго будучыня. У вершы «Дарожка» (1936) зварушлівы вобраз звілістай сцяжынкі вырастае да сімвала шляху, па якому бясконца брыдзе народнае гора. На рытарычнае запытанне, «калі ж багачкай вернешся, дарожанька мая?», паэт дае разгорнуты адказ у вершы «Сон аб аграноме» (1937). Ён малюе ўзнёсла-рамантычную карціну будучага, «...калі зары чырвонай шквал змяце сляды навалы панскай», і ён, праменны, прыйдзе «з той падарожы барацьбянай на свята трактарнае песні», дзе вясёлай песняй сустрэне яго «кругла-віды, сіпявокі, рассмеяны і жвавы піянер».

Дзеля гэтага будучага заклікае паэт усіх працоўных свету затрымаць крывавую руку фашызму, занесеную над Краінай Саветаў:

Люд увесь працоўны, барані Саветы
Ад усіх крывава-кіпцюроўскіх рук!
Там будуюць шчасце, долю ўсяму свету,
Для усіх народаў волю ў ім куюць.

«На штурм!», 1936.

Яго глыбока кранае трагедыя мужнай Іспаніі, над якой «павісла ворага агіда, як чорны смок».

Аднак паэт верыць, што справа, за якую пралілася кроў лепшых сыноў многіх народаў, не загіне. Жар іскраў на дымных вогнішчах Мадрыда збярэцца ў новую буру ўсенароднага змагання з ненавісным фашызмам.

Пасіянарыя!
Каваўся гнеў народны ў гарт паходаў,
І грудзі рвалі шум, імпэт і рокат сэрц —
Пароль! Яшчэ скуецца сталь рэспублік і народаў
І сцягам блісне нам вялікі СССР!

«Пасіянарыя», 1939.

Паэзія Пестрака канца 30-х гадоў прасякнута верай у перамогу камуністычных ідэй, у пераадоленне тых цяжкасцей, што ўзніклі перад заходнебеларускімі рэвалюцыянерамі пасля роспуску КПЗБ. У той складаны час трывожнага зацішша перад бурай паэт звяртаецца да гераічных падзей грамадзянскай вайны, успамінае, як чырвоная конніца граміла белапалякаў на беларускай зямлі, вызваляла яе ад акупантаў («Бой над Нямігай»).

Радасна вітаў П. Пестрак верасень 1939 года, тую светлую

«зару збаўлення», якая заззяла з усходу, адчыніла астрожныя брамы, змыла «крывавы рубеж» і «руйнуе ўсе сляды народнае памукуты». Імклівы марш савецкіх танкаў выратаваў ад смерці і самога паэта, прыгаворанага вермна-палявым судом да расстрэлу. Вызвалены з гродзенскай турмы, ён выйшаў на свабоду і з запалам камуніста-змагара аддаўся ўстанаўленню новага савецкага ладу. «Мы ўвесь час былі ў дазоры, амаль не спалі, паспявалі ўсюды, слі па хаду, клаліся адпачываць на крэслах»,— успамінае паэт пра тыя дні [1]. Ён быў сакратаром рэўкома ў Гродна, члепам камітэта рабочай міліцыі, прымаў удзел у рабоце Народнага Схода ў Беластоку, быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, з верасня 1940 г. узначальваў Беластоцкае аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР.

У 1940 годзе выйшаў першы зборнік Пестрака «На варце», які быў складзены з адшуканых або адноўленых па памяці вершаў, напісаных паэтам у давераспёўскі час. Кніжка была цёпла сустрэта крытыкай і літаратурнай грамадскасцю. Савецкага чытача захапілі ў ёй новыя тэмы і матывы — жывыя адгалосы народнай нядолі і мужнай барацьбы. Творам даравалася нават некаторая мастацкая недаскапаласць, бо яна пакрывалася іх ідэйным гучаннем, высокім грамадзянскім пафасам.

У перыядычным друку тады часта паяўляліся вершы Пестрака, у якіх паэт асэнсоўваў новыя з'явы савецкай рэчаіснасці, выяўляў настроі вызвалепага з няволі чалавека («Маўзалей», «Аб Леніне вялікім», «Даўні знаёмы», «Еду ў Мінск»). Яго захапляліі веліч сацыялістычнага будаўніцтва ў Заходняй Беларусі, радасць свабоднай працы ў дружнай сям'і савецкіх народаў («Мой першы Май», Слаўлю»). Пра гэта ён шмат пісаў тады ў артыкулах, гаварыў у выступленнях перад працоўпымі Беластока, Гродна, Мінска, перад таварышамі па пяру на пісьменніцкіх сходах.

А затым грымнула вайна. Трывожныя дні ў напружанай працы на эвакуацыі насельніцтва Гродна, вывазу прамысловага абсталявання, адступленне пехатой на ўсход і, нарэшце, глухая вёсачка на акупіраваным ужо мазырскім Палессі, дзе апынуўся паэт разам з сям'ёю ў сярэдзіне верасня 1941 г. Праз некаторы час ён наладзіў сувязь з партызанамі, уступіў у атрад. Быў радавым байцом у злучэнні генерала А. Сабурава, якое базіравалася ў Лельчыцкіх лясах, затым працаваў у рэдакцыі газеты «Партизанская правда».

У перапынках паміж баявымі аперацыямі, вартавой службай пісаў паэт-партызан вершы пра гераічныя справы народных мсціўцаў, раскрываў унутраны свет мужных змагароў, якія ўзняліся на абарону свайёй Айчыны («На варце», «Маці», «Пад зорным карагодам», «Перастрэлка над ракой»). У ліпені 1943 г. Пестрак быў выклікапы Цэнтральным Камітэтам КПБ у Маскву і прызначаны начальнікам Управлення па справах мастацтваў пры Саўпаркоме БССР, дзе і працаваў да 1946 года.

Вялікая Айчынная вайна дала пісьменніку багаты матэрыял для мастацкай творчасці. Аспоўнае месца ў яго вершах ваеннага часу, якія ўвайшлі ў зборнік «За сваю Айчыну» (1946), займае тэма Радзімы. Любоў да роднай Бацькаўшчыны ў паэзіі Пестрака спалучасцца з глыбокай верай у перамогу, у светлае будучае свайго народа («Слухайце, пушчы, паляны», «Павей, вецер», «Рыцар

---

[1] Пестрак П. Дарогаю жыцця.— Полымя, 1959, № 12, с. 148.

Айчыны», «Прыпяць», «Дзядзька-беларус»). У вершы «Ткачыха» паэт стварае яскравы вобраз Беларусі, якая і ў час вашых пажараў «тчэ неаглядныя мары» аб міры і будучым шчасці людзей.

Падзеі вайны знайшлі сваё адлюстраванне ў многіх пазнейшых творах Пестрака. Звяртаючыся да новых тэм, услаўляючы мірную стваральную працу савецкіх людзей («Ляснік», «Новы дом»), шчаслівае маленства дзяцей («Хлопчыку»), паэт не забывае, што ўсё гэта здабыта нашым народам у цяжкім змаганні з ворагам, заваявана цаною вялікіх ахвяр («Голас у пушчы»).

У сярэдзіне 40-х гадоў у перыядычным друку былі апублікаваны першыя апавяданні П. Пестрака на тэмы з партызанскага жыцця. З гэтага часу проза паступова займае ўсё большае месца ў творчасці пісьменніка, а затым і выходзіць на першы план. Праўда, Пестрак не пакідае канчаткова і паэзію.

Асноўнай тэмай першых празаічных твораў пісьменніка з'явілася барацьба беларускага народа супраць фашысцкіх акупантаў, матэрыялам — падзеі, асабістыя назіранні і ўражанні аўтара ў часы партызаншчыны. Вайна з яе суровасцю, трагізмам, ахвярамі выявіла ў народзе і кожным чалавеку многія раней невядомыя якасці, абудзіла вялікую энергію і волю да супраціўлення захопнікам. Пісьменнік у сваіх творах і раскрывае гэтыя рысы народа, паказвае здольнасць простага чалавека на подзвіг, на гераізм і самаахвярнасць. Такімі з'яўляюцца героі апавяданняў «Дзед Кандрат», «Гараць вёскі», «Аўдоцця і яе ўнучак» і інш.

П. Пестрак праўдзіва малюе вясковы побыт часоў фашысцкай акупацыі, раскрывае ўнутраны свет сваіх герояў, прыкмячае тое новае, адметнае, што выяўляла або нараджала ў псіхалогіі чалавека вайна. Само жыццё навучыла старога селяніна стрыманасці, асцярожлівасці. Не адразу адкрывае ён душу невядомаму начному госцю, хаця той і ў форме савецкага генерала («Генерал»). І толькі калі генерал бярэ з рук старога лапаць і пачынае падплятаць («Спрытна падкалупваў, саджаў палосінку, браў яе ў зубы, тады зноў падкалупваў...»), дзядзька канчаткова ўпэўніўся, што гэта «наш» генерал.

Пісьменнік імкнецца пісаць лаканічна. Замест доўгіх апісанняў, разважанняў ён ахвотней ужывае важкую, ёмістую дэталь, трапны, характэрны штрых. Умела карыстаецца П. Пестрак дыялогам, які ў яго творах часцей за ўсё яркі, дынамічны, дапамагае развіццю дзеяння.

Лірыка-рамантычная манера пісьма П. Пестрака найбольш яскрава выявілася ў апавяданнях «Пад славацкія песні» і асабліва «Лясная песня». Тут увага пісьменніка засяроджваецца не на паказе падзей, а больш на раскрыцці ўнутранага стану герояў, іх перажываннях, настрою. Так, удала выкарыстаны ў «Лясной песні» прыём мастацкага паралелізму дазволіў аўтару стварыць яркія, запамінальныя вобразы партызана Сцяпана Хомчыка і маладой хутаранкі Аксені, раскрыць іх глыбокае і прыгожае каханне.

Гэтая ўдала пачатая і несумненна плённая традыцыя ў далейшай празаічнай творчасці П. Пестрака, на жаль, не знайшла свайго паглыблення і развіцця.

Авалоданне майстэрствам апавядальніка ў творчай практыцы П. Пестрака адбывалася паступова. Не заўсёды і не адразу пры асэнсаванні жыццёвых падзей узнімаўся ён да мастацкіх абагуль-

пепняў. У асобных яго творах адчуваўся даволі спрошчаны паказ народнай барацьбы, калі за апісальнасцю, знешнімі праявамі дзеяння недастаткова раскрываўся чалавечы характар. Ды і самі падзеі, баявыя справы партызан выглядалі часам не зусім праўдападобна, як, напрыклад, у апавяданнях «Закон лесу», «Непаразуменне» і некаторых іншых.

На матэрыяле Вялікай Айчыннай вайны напісаны аповесці П. Пестрака «Муж і жонка» (1945) і «Пачатак» (1946). У першай аб'ектам аўтарскага даследавання з'явіўся канфлікт паміж селянінам Макарам і яго жонкай Алепаі, якая ў складаных абставінах барацьбы апынулася ў варожым стане.

У аповесці «Пачатак» аўтар ставіў за мэту паказаць партызанскі рух як заканамерны і глыбока ўсвядомлены пратэст савецкіх людзей супраць фашысцкага заняволення. Пісьменніку ўдалося праўдзіва перадаць атмасферу народнага жыцця ў часы гітлераўскай акупацыі, намаляваць яркія карціны вясковага побыту. Цікава намечаны ў творы асобныя вобразы, хаця стварыць яркія, паўнакроўныя чалавечыя характары Пестрак так і не змог.

Адначасова з тэмай нядаўняй вайны ўвагу П. Пестрака ў канцы 40-х гадоў прыцягвала і тое новае, што ўзнікала ў жыцці і свядомасці заходнебеларускіх працоўных у першыя пасляваенныя гады. У сваіх апавяданнях гэтага часу «Першыя ўсходы», «На світанні», «Яе перамога» і інш., якія ўвайшлі ў зборнік «Першыя ўсходы» (1951), пісьменнік паказаў, як разам з вялікімі сацыяльнымі пераўтварэннямі змяняліся людзі, вырастаў новы чалавек, свядомы будаўнік камуністычнага грамадства.

Станаўленне калгаснага ладу ў Заходняй Беларусі адбывалася ў жорсткай барацьбе з варожымі сіламі, якія імкнуліся вярнуць старое, запалохаць сялянства, адштурхнуць яго ад калгасаў. Актыўным змагаром за новае і выступае ў апавяданні «Першыя ўсходы» былы падпольшчык, камуніст Станіслаў Тарасевіч, які здолеў з'яднаць вясковы актыў і зламаць супраціўленне ворагаў.

Тагачасная крытыка станоўча ацаніла апавяданні П. Пестрака. Б. Бур'ян у рэцэнзіі на зборнік адзначаў, што «Піліп Пестрак здолеў даволі выразна ўвасобіць у жывых мастацкіх вобразах першыя ўсходы савецкага светапогляду ў свядомасці тых, хто нядаўна яшчэ жыў у зусім чужым для нас грамадстве, у свеце буржуазнай маралі, нацыянальнага ўціску, сацыяльнай няроўнасці» [1].

У 1948 годзе пісьменнік прыступае да напісання буйнога эпічнага твора — гісторыка-рэвалюцыйнага рамана «Сустрэнемся на барыкадах» — пра мінулае сваіго народа, які на працягу двух дзесяцігоддзяў мужна змагаўся супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту і ў барацьбе здабыў свабоду і шчасце.

Новы твор П. Пестрака, над якім аўтар працаваў каля пяці гадоў (1948—1952), выйшаў асобным выданнем у 1954 годзе. Ужо на падставе першых часопісных публікацый рамана Г. Шчарбатаў рабіў вывад, што «ў асобе П. Пестрака беларуская літаратура мае пісьменніка, які можа вырашаць складаныя творчыя задачы» [2].

---

[1] Беларусь, 1952, № 8, с. 30.

[2] Шчарбатаў Г. Раман аб вызваленчай барацьбе народа.— Літ. і мастацтва, 1951, 17 лют.

«Сустрэнемся па барыкадах» — адзін з першых і найбольш значных у нашай мастацкай прозе твораў пра жыццё і барацьбу працоўных Заходняй Беларусі. П. Пестрак зноў вяртаецца ў ім да незабыўных гадоў мінулага, да тых хвалюючых падзей, што засталіся ў памяці і сэрцы як невыказны боль нераскутых пакут, самаахвярнай барацьбы за шчасце свайго народа. Ён аддае даніну глыбокай павагі мужнасці і гераізму лепшых сыноў народа, якія, не шкадуючы сіл і жыцця, змагаліся за вялікую справу вызвалення.

Раман П. Пестрака ў значнай ступені аўтабіяграфічны. Праз вобраз галоўнага героя Андрэя Касцевіча пісьменнік паказаў многае ўласна перажытае або бачанае ім самім у часы заняволення Заходняй Беларусі польскімі панамі.

А. Адамовіч ацэньвае «Сустрэнемся на барыкадах» як «праўдзівае мастацкае слова рэвалюцыянера аб перажытым ім самім і яго народам, слова мастака-публіцыста, які і ў літаратуры застаецца змагаром» [1].

Менавіта гэтым абумоўлена мастацкая структура твора. Гістарычная дакладнасць жыццёвых з'яў і падзей, глыбіня аўтарскага пранікнення ў сутнасць чалавечых характараў арганічна спалучаюцца ў ім з надзвычайным лірызмам, якім сагрэты многія вобразы і мастацкія карціны. Дзеянне дасягае ў творы часам такога высокага эмацыянальнага напалу або драматычнага напружання, што аўтар, як бы ўмешваючыся ў ход падзей, пачынае гаварыць ад сваёй асобы. Тады ў рамане паяўляюцца прачулыя лірычныя адступленні або ўзнёсла-рамантычныя маналогі-роздумы, у якіх гучыць шчыры голас самога пісьменніка. Прыгадаем хаця б аўтарскі зварот да шляху, што злучае Брэст з Масквою. У ім выказана глыбокае пачуццё еднасці беларускага і рускага народаў, увасоблена вера працоўных Заходняй Беларусі ў дапамогу іх савецкіх братоў. «Дапясіце ж, бясконцыя прасады, данясі ты, шлях стралісты, наш гоман аж да Масквы, раскажы, як тут нам жывецца, як здзіраюць з нас скуру паны ельскія, паны малачэўскія і іншыя і іншыя п'яўкі, як паліцэйскія бізуны свішчуць па нашых спінах і ўдзень і ўначы, як груганнём павіснуў страх над вёскамі. Прынясі нам, дарога, дарагую вестку,— калі ж будзе канец нашым пакутам? Мы сабраліся магутнай сілай, мы гатовы да бою — з дымам пажараў пусціць да неба ўсё панскае, усё шляхецкае, што вякамі высмоктвала нашу зямлю, сушыла наш народ. Зброя ў нас у руках. Камандзіра нам дайце, камандзіра, эх, ды такога, як Чапаеў, Качубей, як Шчорс... Мы каменя на камені не пакінем, мы знішчым панскую няволю навекі!..»

У рамане праўдзіва адлюстравана дваццацігадовая гісторыя народа, які ва ўмовах жорсткага сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту не страціў веры ў сваё вызваленне і светлае будучае, узняўся на рэвалюцыйную барацьбу, выстаяў і перамог. Усё гэта паказана пісьменнікам ярка і захапляюча, праз складаныя чалавечыя лёсы, на шырокім фоне грамадскага жыцця, гістарычных падзей, з выкарыстаннем багатага фактычнага матэрыялу,

---

[1] Адамовіч А. М. Беларускі раман: Станаўленне жанру.— Мн.: Выд. АН БССР, 1961, с. 274.

які арганічна ўключаецца ў сюжэтную тканіну твора. Жыццёвая праўда спалучаецца ў ім з выключнай мастацкай пераканаўчасцю.

«Станоўчы бок рамана,— адзначаў Я. Шарахоўскі,— у тым, што ў ім амаль за кожным героем адчуваецца прататып, амаль за кожным эпізодам — выпадак з сапраўднага жыцця. Таму, калі чытаеш раман «Сустрэнемся на барыкадах», часам забываеш, што перад табой літаратурны твор, здаецца, што гэта само жыццё цячэ перад табой магутнай і пястрымнай плынню» [1].

У выніку з старонак «Сустрэнемся на барыкадах» паўстае яркая, рухомая карціна народнага жыцця у гэты надзвычай складаны перыяд гісторыі. З глухой палескай вёскі Запалянкі, куды вяртаецца з Савецкай Расіі сям'я Касцевічаў, пісьменнік паступова выводзіць свайго галоўнага героя Андрэя Касцевіча на шырокі прастор грамадскага жыцця, уключае ў бурлівы вір падзей, кідае ў розныя куткі Заходняй Беларусі. У рамане шырока адлюстраваны перакаты народнай барацьбы, яе прылівы і адлівы на розных этапах рэвалюцыйнага руху. Гэта — і запозненае рэха грамадзянскай вайны — партызаншчына пачатку 20-х гадоў, хораша паказаная праз гераічныя справы хлопцаў-малойцаў Сцяпана Каваля, і дзейнасць Грамады, і сялянскія хваляванні, і выступленні гарадскога пралетарыяту, і барацьба палітзняволеных у турмах у час разгулу фашысцкага тэрору.

Рэвалюцыйная барацьба выступае ў творы як масавы ўсенародны рух, які ахоплівае ўсё большае кола ўдзельнікаў, прымушае кожнага выявіць свае адносіны да яе, стаць на тої або іншы бок барыкад. На шлях змагання з ненавісным капіталістычным светам становяцца рабочыя і сяляне, гарадская інтэлігенцыя і вясковая моладзь, людзі розных узростаў, схільнасцей, характараў. Рознымі дарогамі прыходзяць да рэвалюцыйнай барацьбы Дзям'ян Гарагляд, Захар Зубец, Арцём Світка, Таццяна Ціханчук, Макар Краўчук, Лупрэй Чарняк, Пятрусь Хадыка, Марцін Шапко, Сцяпан Касцевіч. Надзеленыя сваімі адметнымі рысамі характару, усе разам яны ствараюць абагульнены вобраз працоўнага народа Заходняй Беларусі, пязломнага ў горы і мужнага ў змаганні.

Арганізатарамі і кіраўнікамі народнай барацьбы былі камуністы, лепшыя сыны народа, якія ў служэнні рэвалюцыйнай справе бачылі свой важнейшы абавязак. Такім паказаны ў рамане верны сын ленінскай партыі Іван Паддубны, прадстаўнік ЦК КПЗБ таварыш Васіль. Ярка намаляваны мужны камсамолец Саша Грынявіцкі, які ў час суда распраўляецца з правакатарам. спрактыкаваны важак моладзі Надзя Харашэвіч, Пеця Ціханчук, Грыша Плотка і іншыя прадстаўнікі маладога пакалення барацьбітоў.

Шлях ад простага сялянскага хлопца да рэвалюцыянера-прафесіянала, кіраўніка падполля праходзіць Андрэй Касцевіч. Нялёгкі, цярністы гэты шлях, пямала на ім розных нечакапасцей, выпрабаванняў і перашкод. Але, ступіўшы на яго, герой ідзе па ім цвёрда і непахісна. На гэтым вобразе пісьменнік раскрывае складаны працэс выхавання характару рэвалюцыянера, фарміравання светапогляду камуніста. Прычым паказана гэта ў творы як

---

[1] Шарахоўскі Я. Шчырае слова.— Беларусь, 1954, № 1, с. 22.

жывая біяграфія чалавека з яе адметнасцю, індывідуальнай непаўторнасцю.

Аўтару ўдалося знайсці ўнутраную логіку развіцця характару героя, якая і вызначае напрамак яго думак і паводзін у кожнай канкрэтнай жыццёвай сітуацыі.

Шырока прадстаўлены ў раманс варожыя сілы, тыя, што на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў душылі працоўны народ Заходняй Беларусі. Гэта і пыхлівы нашчадак старадаўняга шляхецкага роду буйны землеўласнік граф Ельскі, і ксёндз-іезуіт Абнорскі, і кулак Мікіта Лазун, і шматлікія шпікі, даносчыкі, правакатары, турэмныя наглядчыкі, урадавыя чыноўнікі, асаднікі, на якіх трымаўся прагнілы дзяржаўны лад буржуазна-памешчыцкай Польшчы.

Найбольшай удачай П. Пестрака ў стварэнні адмоўных персанажаў з'яўляецца вобраз кулака Лазупа. Пісьменнік намаляваў закончаны тып крывасмока-эксплуататара, з сваім уласным светапоглядам, звярынай філасофіяй уласніка, раскрыў аблічча агіднага панскага паслугача. У пагоні за нажывай, багаццем ён страчвае ўсё чалавечае, нават любоў да сына.

Раман «Сустрэнемся на барыкадах» прасякнуты гарачай любоўю пісьменніка да свайго народа, да працоўных людзей іншых нацыянальнасцей, якія разам змагаюцца за свабоду і шчасце. Цікавымі і захапляючымі з'яўляюцца тыя старонкі твора, дзе паказваецца агульная барацьба за свае чалавечыя правы працоўных палякаў, украінцаў, яўрэяў, якіх яднае з беларускімі рабочымі і сялянамі класавая салідарнасць, адзінства мэт і задач. Адной дарогай рэвалюцыйнага змагання ідуць у раманс палякі Вацлаў Сапкоўскі і Станіслаў Барвіна, украінец Антон Данілюк, яўрэй Грыша Плотка, разам здабываюць яны свабоду і шчасце. Шчыра і прачула гучаць у творы словы беларускага селяніна Дзям'яна Гарагляда: «Значыць, і польскі рабочы і селянін нам не вораг. І яны ў бядзе жывуць, як і мы, прыгнятаюцца памешчыкамі і капіталістамі... І ўкраінскі рабочы і селянін нам прыяцелі, і літоўскі... Ну, а рускі... рускі наш брат ужо вызвалены і думае аб нас... Кажучы па-простаму, рабочыя людзі ўсіх краін толькі тады перамогуць панаў, значыць, гэтую буржуазію, калі будуць у моцным саюзе паміж сабою».

Першы буйны эпічны твор П. Пестрака быў прыхільна сустрэты літаратурнай грамадскасцю і шырокімі коламі чытачоў. Ужо на часопісную публікацыю «Сустрэнемся на барыкадах» у рэспубліканскім друку паявілася звыш дзесяці рэцэнзій. Выказваліся самыя розныя думкі, меркаванні, уносіліся прапановы, даваліся шматлікія парады аўтару. Пры гэтым крытыка адзінадушна прызнавала, што раман Пестрака — значная падзея ў беларускай мастацкай прозе, што сіла твора — ва ўмелым спалучэнні глыбокага гістарызму і мастацкасці. Паводле сваёй жанравай прыроды і сюжэтна-кампазіцыйнай структуры твор «Сустрэнемся на барыкадах» быў вызначаны як гісторыка-рэвалюцыйны раман.

На дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве (1955) пра раман П. Пестрака гаварылася як пра пэўнае дасягненне ўсёй савецкай многанацыянальнай літаратуры (А. Мар'ямаў, В. Ажаеў, З. Кедрына, Л. Шабуніп, І. Сяргбраны, М. Злата-

гораў). Ус. Іванаў, у прыватнасці, адносіў твор да «своеасаблівай плыні ў развіцці савецкага рамана» [1].

Высокую ацэнку раману ў лісце да яго аўтара даў А. Фадзееў. «Сустрэнемся на барыкадах» быў адразу ж перакладзены на рускую і ўкраінскую мовы. Надрукаваны ў ленінградскім часопісе «Звезда», выдадзены ў Маскве, Кіеве, ён атрымаў шырокае прызнанне ва ўсесаюзнага чытача. І пазней, з даволі значнай дыстанцыі часу, крытыка ацэньвала раман П. Пестрака як з'яву прыкметную і самабытную. «Сустрэнемся на барыкадах»,— пісаў А. Яскевіч,— у нашай празаічнай традыцыі заняў сваё месца не толькі як адна з яркіх старонак рэвалюцыйнай мастацкай гісторыі беларускага народа, але і як пэўны вопыт нашай прозы ў асваенні форм мастацка-біяграфічных, жанру рамана-хронікі» [2].

Пасля рамана «Сустрэнемся на барыкадах» увагу пісьменніка ўсё больш прыцягвае сучаснасць, асабліва будаўніцтва новага жыцця ў заходніх абласцях рэспублікі. Гэтая тэма і з'яўляецца асноўнай, цэнтральнай у апавяданнях, якія былі напісаны ў 50-я гады і ўвайшлі ў зборнік «Лясная песня» (1958).

Адметнай рысай гэтых твораў было тое, што аўтара цікавілі ў іх не столькі жыццёвыя з'явы, падзеі, колькі змены і пераўтварэнні ў свядомасці простага чалавека. Змрочнае мінулае паклала свой адбітак на псіхалогію заходнебеларускага селяніна; многія прыйшлі ў сённяшні дзень з цяжарам старых паняццяў і ўяўленняў, вызваліцца ад якіх удаецца не адразу. Так, герой апавядання «Вярнуўся» Данілка Цецярук яшчэ з часоў панскай улады цвёрда засвоіў, што каля начальства «заўсёды можна пажывіцца». Ён спрабуе прытрымлівацца гэтага правіла і тады, калі яго аднавяскоўцы пачынаюць ужо жыць па-новаму. Так, на сходзе ў прысутнасці сакратара райкома ён выступае з гарачай агітацыйнай прамовай за стварэнне калгаса, першы запісваецца ў яго. Але калі трэба было везці на агульны двор інвентар, ён ніяк не можа расстацца са сваім дабром. А «няўдзячнае» начальства чамусьці не хоча ўлічваць, што Данілка ўжо зрабіў «паслугу» калгасу сваім выступленнем на сходзе. Спатрэбіўся немалы час, каб гэты селянін перамог у сабе ўласніцкія звычкі і зразумеў сэнс новага жыцця. «Не, цяпер начальства іншае,— разважае ён,— не такое, як пры панах. Дагэтуль здавалася, што ўвесь свет на няпраўдзе пабудаваны... А цяпер... не, нешта не так...»

Не адразу ўдаецца вызваліцца ад рэлігійнага дурману маладому міліцыянеру Станіславу Бутрымовічу («Раздвоены»). Стоячы на пасту, на гарадской вуліцы, ён доўгі час аднолькава аддае чэсць і сакратару райкома і ксяндзу. У галаве гэтага вясковага хлопца, выхаванага ў духу каталіцкай веры, ніяк не ўкладваецца тое, што ксёндз, які «ведае ўсялякія таямніцы свету», можа быць звязаны з варожымі элементамі. Калі ж у час аблавы на бандытаў Станіслаў пазнае сярод затрыманых ксяндза, ён капчаткова вызваляецца ад заблуджэнняў. «Цяпер, ойча, я табе адсалютую інакш... Мне ўсё зразумела...»

---

[1] Зб. «Декада белорусского искусства и литературы в Москве».— Мн.: Государственное издательство БССР, 1955, с. 330.

[2] Каваленка В., Мушынскі М., Яскевіч А. Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы: Агульны рух і галоўныя тэндэнцыі.— Мн..: Навука і тэхніка, 1972, с. 210.

Героем апавяданняў Пестрака ўсё часцей з'яўляецца новы чалавек, свядомы будаўнік камуністычнага грамадства, які па-інакшаму глядзіць на жыццё. Гэта — калгасны кладаўшчык Іван Кляшчэвіч, які не хоча ўжо карыстацца старым і нязграбным бязменам з ненавіснымі пудамі і фунтамі, а патрабуе сапраўдных вагаў, якія, на яго думку, неабходны калгасу, як для скрыпкі струны («Як для скрыпкі струны...»); руплівы рахункавод Сцяпан Чаравака, для якога службовыя абавязкі важней за асабістыя інтарэсы («Путавод»); стары пчаляр Іван Падабед, які ведае і любіць сваю справу, у працы знаходзіць сапраўдную паэзію («Імунітэт»).

Пісьменнік умее гаварыць пра сваіх герояў з лагодным гумарам, часам незласліва пасмяяцца над асобнымі іх недахопамі, ставіць іх у камічныя сітуацыі, недарэчныя абставіны. У гумарыстычным асвятленні паказаны хітраваты балбатун Данілка з апавядання «Вярнуўся», а таксама раўнівая Кацярына, якая без усякіх падстаў падазрае свайго мужа ў заляцаннях да маладой удавы Аляксандры («Путавод»), скупаватая Юстына, што шкадуе свайму Максіму яек на снеданне («А гудок гудзеў...»), або недаверлівая свякруха Таццяна, якой увесь час здаецца, што яе маленькая ўнучка Валечка зусім не падобна на свайго бацьку, яе сына Антося («Дзіця»). У асобных творах П. Пестрак узнімаецца да гнеўна-сатырычнага выкрыцця чалавечых заган або адмоўных з'яў жыцця, выступае за выкараненне старога, шкоднага, што замінае руху нашага народа наперад («Дзед за сцяною», «Уяда»).

Амаль ва ўсіх сваіх творах пра сучаснасць Пестрак застаецца па-ранейшаму верным заходнебеларускай тэме. Многія вобразы, падзеі, эпізоды ў яго апавяданнях падсвечваюцца водбліскам мінулага. Памяць зноў і зноў вяртае пісьменніка да былога, да зведанага і перажытага, якое раптам ажывае ў творы ў нейкім новым асвятленні праз чый-небудзь успамін або захапляючы расказ пра мінулае, пра чалавечую мужнасць, душэўнае харастно. Так, у апавяданні «Гумно без варот» размова пра старую будыніну наводшыбе сяла абуджае ў кожнага з прысутных цёплыя згадкі пра нешта сваё, запаветнае, а аднаго з герояў, Сяргея Баравога, які праз многа год прыехаў у родныя мясціны, прымушае яшчэ раз прайсці ў думках дарогамі свайго юнацтва.

Святлом даваенных падзей азорана і выпадковая сустрэча ў калгасным клубе двух некалі блізкіх людзей, журналіста Лазовіча і сакратара калгаснай партарганізацыі Соні Вярбіцкай у апавяданні «Не, не загубленая...». Рамантычна прыўзнята, з замілаваннем малюе Пестрак сваіх равеснікаў, людзей складанага жыццёвага лёсу, якія выпесслі на сабе цяжар вайны. Такім паказаны герой апавядання «У змаганні» былы партызанскі камандзір Аляксандр Іванавіч Сідарчук, чалавек моцнага характару, не падуладны шэрай паўсядзённасці жыцця.

З яркай жыццёвай біяграфіяй і герой апавядання «Апошні крыж». Сорак пяць гадоў правёў на чужыне ў Амерыцы Дзяніс Калывайка з беларускай вёскі Цівуны. Там на заводах Форда растраціў ён свае сілы, каб цяпер дажываць астатак гадоў у багадзельні. І вось пацягнула чалавека на радзіму, да той роднай зямлі і людзей, што так многа перажылі за час, калі ён развітаўся з імі. І Дзяніс вярнуўся, каб памерці тут, быць пахаваным побач з тымі, каго знішчылі ў вайну фашысты.

Асобнае месца ў творчасці Пестрака займае аповесць «Камень» (1954), твор, які сведчыць аб шматграннасці таленту пісьменніка, аб яго вялікіх творчых магчымасцях. Аўтар услаўляе людзей моцнай волі і цвёрдых перакананняў, людзей, якія здольны на пратэст, на самаахвярнасць у імя высокіх ідэалаў. Твор вызначаецца яркасцю і цэласпасцю створаных у ім чалавечых характараў, вастрынёй і дынамічнасцю, выразнасцю моўных характарыстык.

У 1963 г. выходзіць у свет новы раман П. Пестрака «Серадзібор», напісаны на матэрыяле калгаснага жыцця першых пасляваенных гадоў. У ім, як падкрэслівай А. Адамовіч, аўтар «страсна і па-сучаснаму ставіць не новую, але вельмі актуальную праблему зямлі і чалавека-працаўніка, чалавека-гаспадара на зямлі» [1]. Твор поўны глыбокага роздуму аб чалавеку, зямлі, аб тых хвалюючых праблемах грамадскага жыцця, што заўсёды паўстаюць перад нашым народам у яго няспынным руху да светлай будучыні — камунізму.

Непаспешліва, засяроджана вядзе пісьменнік зацікаўленую гаворку пра справы і турботы людзей палескага краю, пра тых, што вынеслі на сваіх плячах цяжар нечуванай вайны, фашысцкай навалы і цяпер бяруцца за аднаўленне разбуранай акупантамі гаспадаркі. Вясна перамогі ўдыхнула ў іх новыя сілы. «Серадзіборскія сады пачала ўжо ўкрываць белая духмяная квецень. Разам з вясной да людзей прыйшлі супакаенне, уцеха ад хараства людзей, ад чакання, што заўтра будзе лепш. Жыццё ўваходзіла ў свае нормы, і пачынала здавацца, што яно так было і ўчора і заўсёды. Гэта тыя нормы, калі сонечныя дні ў росквіце прыроды напаўняюць людзей ахвотай да працы і сваёй цеплынёю супакойваюць, абнадзейваюць, клічуць».

Але перажытае не забываецца, яно ўвесь час дае сябе адчуваць. Вайна прайшлася па зямлі Палесся, як і ўсёй Беларусі, слядамі руін, папялішчаў, свежых магіл. Глыбокія раны пакінула яна і ў душах многіх людзей, яшчэ больш загартаваўшы іх або спустошыўшы да канца. Нялёгкая праца прадстаіць савецкаму народу. «У шуме аднаўлення», у барацьбе з усім чужым, шкодным, варожым жывуць і працуюць героі рамана — сакратар райкома Сцяпан Малашкін, сельскі ўрач Вера Лукашэвіч, начальнік раённага аддзела дзяржбяспекі капітан Рыбін, малады вучоны аграном Платон Грушка, журналіст Аляксей Жарнавік, стары земляроб Несцер Падкова, былы партызанскі камандзір Васіль Чаравака, машыністка Саша Іванкевіч і іншыя простыя савецкія людзі, якім над сілу не толькі залячыць цяжкія раны вайны, але і вывесці калгаспас сяляпства на шырокую дарогу новага жыцця.

Не закрываючы вочы на тыя адмоўныя з'явы, што мелі месца тады ў калгаспым будаўніцтве, у кіраўніцтве сельскай гаспадаркай, аўтар выступае за новыя формы савецкага агульнажыцця, за чулыя, уважлівыя адносіны да чалавека працы, славіць магутны саюз зямлі і навукі, які павінен пераўтварыць не толькі суровую прыроду Палесся, але і саміх людзей. Пісьменнік узвышае чалавечую дабрыню, шчырасць, сумленнасць, паэтызуе

---

[1] Адамович А. Становление жанра: Белорусский роман.— М.: Сов. писатель, 1964, с. 329.

прыроду роднага краю, працу земляроба, які стаў гаспадаром свайго лёсу. Выгадаваная на ўчарашніх балотах пшаніца радуе душу селяніна. «Стары Несцер ходзіць на мяжы, не можа адарваць вачэй ад гэтага залатога палетка, і на сэрцы такое шчасце, што ажно плакаць хочацца. Ці хто думаў, што ў нашай нескавой, балотнаї няўдаліцы ды можна зрабіць з полем такое дзіва? Залатыя людзі ёсць на свеце і залатыя ў іх рукі. Так думаў Несцер і браў колас і клаў, не зрываючы, на сваю жорсткую далонь земляроба і разглядаў яго, любаваўся. Потым адпускаў: расці, налівайся, спей!..»

Раман «Серадзібор» узпімаў важныя і актуальныя пытанні сучаснага жыцця нашага народа і вырашаў іх з прынцыповых пазіцый будаўніцтва новага грамадскага ладу. У 1964 годзе ён быў удастоены рэспубліканскаї прэміі імя Якуба Коласа.

П. Пестрак шмат падарожнічаў. Ён набываў у многіх рэспубліках нашага Саюза, неадпаразова выязджаў за мяжу, дзе знаёміўся з жыццём, гісторыяй, культураї народаў іншых краін. Выпікам гэтых паездак з'явіліся яго дарожныя нататкі «Падарожжа па Народнаї Польшчы» (1956) і зборнік паэзіі «Падарожнае» (1962). У цыклах вершаў з гэтага зборніка «Сягоння і ўчора», «Сябрам па-сяброўску», «Нарач», «Латышскія сустрэчы», «З чэхаславацкага дзённіка», «Пад небам Францыі», а таксама пазнейшых сваіх вершаваных творах аўтар вучыць чытача ісці праз жыццё чыстай дарогай, любіць свої краї і парод, шанаваць яго гераічнае мінулае, паважаць братоў-суседзяў, не забывацца пра тых, хто і сёння яшчэ пакутуе ў няволі.

Усё часцей звяртаўся паэт да такой вершаванай формы, як санет, які даваў яму магчымасць лаканічна і надзвычай вобразна асэнсоўваць важныя з'явы і падзеі сучаснасці, выяўляць свае да іх адносіны, паказваць мінулае свайго парода. Санеты Пестрака прасякнуты шчыраї любоўю да роднаї зямлі, яе чароўнай прыроды. Яны напоены духмяным водарам палявых кветак, пахам жытніх каласоў, меданоснымі сокамі верасовых палян, свежасцю ранішняї расы на палескіх абшарах. У іх чуецца кукаванне зязюлі, усплёскі нарачанскіх хваль, развітальны крык журавлёў, што адлятаюць у чужыя краіны, колерамі вясёлкі зіхацяць сонечныя пералівы свіцязянскіх вод і празрыстая роўнядзь ціхай, задуменнай Прыпяці.

У 1968 г. выйшла асобным выданнем паэма П. Пестрака «Слова пра Мінск». Гэта была першая і адзіная яго закончаная паэма. Праўда, да гэтага жанру Пестрак звяртаўся і раней, пра што сведчаць урыўкі з яго паэм 30-х гадоў «Шум сасон», «Закатаваныя», «Ганцы», «Сын Кастрычніка», але самі творы да нас не дайшлі. Новы твор паэт прысвяціў 50-годдзю Савецкай Беларусі. Але напісаны ён быў яшчэ ў канцы 40-х гадоў, пра што сведчаць пастаўленыя самім аўтарам даты — 1949—1950 гг.

У «Слове пра Мінск» П. Пестрак у лірычна-публіцыстычнаї форме расказвае пра лёс беларускага парода ў пераломны перыяд яго гісторыі, прыводзіць важнейшыя падзеі, звязаныя з мінулым беларускаї сталіцы, барацьбоі яе жыхароў за свабоду, за перамогу Савецкаї улады. Многія гістарычныя факты прапушчаны праз прызму лірычнага ўспрыняцця паэта, пастаўлены ў сувязь з яго ўласнаї жыццёваї біяграфіяї, што надае твору асаблівую эмацыянальную настраёвасць. Паэма ўспрымаецца не толь-

кі як паэтычпая гісторыя Міпска, хроніка яго жыцця і барацьбы, але і як шчырая споведзь самога аўтара, прызнапне ў любові да роднай Беларусі, яе народа.

Пестрак быў частым і жаданым госцем у калгасах, на будоўлях, дзе ён заўсёды ахвотпа гутарыў з людзьмі, цікавіўся іх жыццём, працай, дапамагаў парадамі. Былі ў пісьменніка і свае любімыя мясціны, куды ён прыязджаў з найбольшай ахвотай. Гэта — Палессе, край, асабліва блізкі і дарагі яго сэрцу, пераўтвораны сёпня рукамі і воляй савецкіх людзей.

Шматлікія паездкі, новыя знаёмствы, асабістыя ўражанні давалі пісьменніку багаты матэрыял для мастацкіх твораў. Так былі напісаны яго выдатныя мініяцюры з цыкла «Сярод чаротаў» (1963), у якіх аўтар з хваляваннем і любоўю расказаў пра тое новае, што прыйшло на палескую зямлю і ў душы людзей, абудзіла ў іх вялікую энергію, жаданне зрабіць свой край яшчэ багацейшым і прыгажэйшым. Пісьменнік любуецца гэтымі людзьмі, іх працавітасцю, шчырай прастатой, душэўным харастаом, захапляецца прыгажосцю прыроды. Гэтае захапленне вылівалася ў прачулыя паэтычныя роздумы-маналогі аўтара, поўныя любові і замілаванасці да свайго краю, яго людзей, у своеасаблівыя гімны роднай зямлі:

«Я спыняюся і ўслухоўваюся ў перашэпты чаротаў. А яны, перашэпты, такія выразныя, вострыя і жорсткія, быццам нажавыя. Выраслі ж яны на суровай зямлі, прабіліся к сонцу з першабытных глыбінь. І цяпер расказваюць пра свой жорсткі шлях. Казка іх доўгая, бясконцая. Вокам акінуць — яны ўсё шэпчуць і шэпчуць. І здаецца, толькі я адзін заслухаўся ў іх перашэпты».

Так з глыбінь народнага жыцця вырастала і творчасць П. Пестрака. Напоеныя сокамі гэтага жыцця, яго творы ўзнімаюцца да вышынь сапраўднага мастацтва, каб несці людзям вялікую сілу праўды. Толькі расказваюць яны пра гэтую праўду не шэптам чаратовым, а шчырым пранікнёным мастацкім словам, якое натхняе чалавека на велічныя справы, абуджае ў ім імкненне стаць лепшым, служыць свайму народу, Радзіме.

У 60-я гады ўвагу П. Пестрака ўсё больш прыцягвала тэма партызанскай барацьбы па акупіраванай фашыстамі беларускай зямлі. Памяць усё часцей вяртала пісьменніка да тых суровых і велічных дзён гераічпага змагання. Пра іх нагадвалі таксама частыя сустрэчы з былымі сябрамі-партызанамі, абуджалі ўспаміны шматлікія помнікі-магілы, што засталіся на лясных прасторах Беларусі. У яго была задума напісаць твор пра мужных народных мсціўцаў — трылогію «Камісар Шчупак». Пестрак карпатліва збіраў матэрыялы, вывучаў дакументы архіваў партызанскага руху. У друку паяўляліся ўжо асобныя ўрыўкі з будучага твора. Адпак па гэтым праца была спынена. Аўтар як бы ўвесь час адчуваў неабходнасць запоўніць тоі своеасаблівы прабел у стварэнні мастацкай біяграфіі народа Заходняй Беларусі, якім з'яўляліся перадваенпыя гады. І ён пачынае працу пад раманам «Лесавічанка», якая працягвалася да канца жыцця пісьменніка.

Храпалагічпа твор ахоплівае перыяд з верасня 1939 года да першых дзён Вялікай Айчыннай ваіны. Раскрываючы жыццёвы лёс галоўных герояў Лепы Лесавічанкі і Паўла Верасовіча ў часы ўстанаўлення Савецкай улады ў Заходняй Беларусі, аўтар зася-

роджвае ўвагу на складанасці многіх з'яў і працэсаў, што адбываліся тады на гэтай нядаўна вызваленай зямлі. Паспяховаму будаўніцтву новага жыцця тут часам перашкаджала тое, што гэтая справа была даручана людзям непадрыхтаваным, палітычна непісьменным, а то і проста несумленным. Яны і праводзілі тут сваю лінію без уліку мясцовых абставін, ствараючы атмасферу падазронасці, недаверу ў адносінах да былых членаў КПЗБ. Супраць такіх праяў парушэння законнасці, за камуністычную мараль і выступаюць сапраўдныя камуністы Якаў Славінскі, Веньямін Башкоўскі, таварыш Вяргіня, Аляксей Варанюк. Яны рашуча змагаюцца з абыякавасцю да лёсу чалавека, кар'ерызмам, дэмагогіяй такіх, як Зарубін, Канчалаў і іншыя. Аднак асноўны пафас рамана ў паказе таго новага, што трывала ўваходзіла ў жыццё і свядомасць заходнебеларускіх працоўных з устанаўленнем Савецкай улады.

На многіх жыццёвых фактах, падзеях раскрывае аўтар, як гэтае новае стапавілася сваёй, кроўнай справаю і простага палескага селяніна, што душою адчувае перавагу калгаснага ладу, і студэнта Верасовіча, які ўпарта штурмуе ў Маскве вяршыні філасофскай навукі.

Раман «Лесавічанка» пры жыцці аўтара не друкаваўся. Ён быў апублікаваны толькі ў 1980 годзе ў скарочаным варыянце.

П. Пестрак спрабаваў свае сілы ў розных галінах літаратурнай творчасці. Шмат увагі аддаваў ён інсцэніроўкам рамана «Сустрэнемся на барыкадах», пісаў п'есы пра жыццё і рэвалюцыйнае змаганне працоўных Заходняй Беларусі («Перад вызваленнем»), ствараў кінасцэнарыі, оперныя лібрэта, займаўся мастацкімі перакладамі. Ён перакладаў вершы польскіх паэтаў — С. Дабравольскага, Е. Путрамента, У. Бранеўскага, Яна Гушчы, украінскіх — Л. Украінкі, М. Рыльскага, П. Тычыны, У. Сасюры, Л. Первамайскага, П. Усэнкі, А. Підсухі, Я. Шпорты, літоўскіх — В. Сірыёс-Гіры, В. Гіедры, латышскіх — Ф. Рокпелніса, Б. Сауліціса, празаічныя творы І. Франка, Э. Ажэшкі, Л. Кручкоўскага і многіх іншых пісьменнікаў.

Выступаў П. Пестрак і як літаратурны крытык, публіцыст, жыва адклікаўся на важнейшыя падзеі грамадскага і літаратурнага жыцця. Нямала цікавых і слушных думак было выказана ім у розны час пра творчасць А. Міцкевіча, С. Жаромскага, У. Бранеўскага, У. Маякоўскага, М. Шолахава, В. Ажаева, Я. Купалы, Я. Коласа, К. Чорнага, К. Крапівы, І. Мележа, П. Труса, В. Таўлая, Я. Брыля, М. Машары, Т. Хадкевіча, А. Вялюгіна, А. Зарыцкага, Р. Сабаленкі, У. Шахаўца, Я. Васілёнка, А. Русака, І. Дуброўскага, У. Корбана, Р. Барадуліна, Д. Бічэль-Загнетавай і іншых пісьменнікаў.

Надзвычай уважліва ставіўся ён да маладых літаратараў, падтрымліваў іх творчыя пачынанні. Яго агляды паэзіі маладых, рэцэнзіі на першыя зборнікі вызначаюцца не толькі дакладнасцю ацэнак, але і добразычлівасцю, глыбокай заклапочанасцю лёсам роднай літаратуры.

Творчая спадчына Піліпа Пестрака — надзвычай яркая, непаўторная старонка гісторыі беларускай літаратуры. Звыш пяцідзесяці гадоў працаваў ён у розных галінах мастацкай творчасці і ўзбагаціў нашу літаратуру многімі каштоўнымі набыткамі. З вышыні вялікіх ідэйна-эстэтычных дасягненняў сучаснай мастацкай культуры цяжка заўважыць, што не ўсё ў твор-

часці гэтага цікавага і самабытнага мастака было раўнацэнным.

Адпак, што заўсёды адрознівала Пестрака як пісьменніка, дык гэта выключная прынцыповасць, бескампраміснасць, пязменнае адчуванне высокай адказнасці перад сваім народам, глыбока ўсвядомленае імкненне служыць мастацкім словам вялікай справе пераўтварэння жыцця і ўдасканалення чалавека. Менавіта па гэтай ідэйна-этычнай аснове і нараджалася ўсё тое лепшае, што вызначае яго творчае аблічча, што трывала ўвайшло ў скарбніцу нашай нацыянальнай літаратуры.

К. Р. Хромчанка,
кандыдат філалагічных навук

ВЕРШЫ

Праз
турэмныя
гады

*

ДНІ...

Дні пяюць перагудам мне сонную быль
Аб няясных далёкіх імкненнях,
І ў гарачых маіх летуценнях
Песні сумпай гудзе пераліў...

Дні ў пакінутым сэрцы маім будзяць жаль,
Сустракаюць тугою глыбокаю,
І пад сіняй ў палях павалокаю
Чаруе, заве мяпе даль.

Дні пясуць мне трывогу — пакуту маю,
Хоць вітаюць мяне рашкаў росамі,
Грэюць сонца ласкавымі косамі,
А я сумны... ў задуме стаю.

Дні хочуць ад думак мяпе адарваць
І ў ціпе жыцця запляспелаї
Да штодзённасці здзеравяпелаї
Ланцугом прыкаваць, прыкаваць!

НАД НАМІ ВІХРЫ ВЬЮЦЬ...

Над намі віхры вьюць і лісцем дрэў лапочуць,
І хмары чорныя варожа нам гудуць,
І барацьбу, і страх, і смерць прарочаць,
І весткі ваяўнічыя нясуць...

«Мы — людзі, мы — арлы, мы ў вочы бога Рока
Пасмелі кінуць выклік як назло,
І голас наш адклікнуўся далёка,
І лье жыцця прабуднае святло.

Ты, лёсаў нашых пан, далоў жа з п'едэстала!
Твайму прыгнёту смела вызначым канец.
Ты знай, што смерць табе ад нашых рук настала,
Мы стопчам, разарвём паганскі твой вянец!

Мы — людзі, як арлы! Гаворым табе ў вочы
Пад буры свіст і рокат гнеўных хваль —
Рассеем змрок тваёй злавеснай ночы
І заклік падамо ў бушуючую даль.

Да нас прыйдуць усе, хто у грудзях збалелых
Нясе агонь дабра, нясе нядолі крыж,
Хто ў муках сэрц сваіх, стагнаннем ашалелых,
Змагання грознага падняў трывожны кліч!»

НОЧЫ СОН...

Ночы сон свае чары рассеяў...
Сыпле росы крынічны альшынік,
Сон палёў летуценні навеяў,
Сон абняў гнуткіх вербаў галіны.

Месяц сее пябесныя іскры
На халодныя буйныя росы,
Сваю зелень красы дробналістай
Расплялі прыгажуні-бярозы.

Жыта спіць. Каласы нахілілі
Всі спу над спачыўшай зямлёю.

А павевы прасторы тулілі,
Цалаваліся з цішай начною.

І туманы дымком шапацелі,
Расплываліся пібы над морам,
Сны пячутна ляцелі... ляцелі
Да ласкавых, засмучаных зораў.

Хто мне друг — прынясі сон жаданы
Для маёй безадказнай тугі,
Раскажы мне, душою адданы,
Аб чым родныя спяць берагі?..

МАЦУЙСЯ

Мацуйся, мой браце, ў крывавым змаганні
За волю Радзімы — забітай зямлі.
Няўжо нам заўсёды бадзяцца ў стагнанні,
Жыць тым, што вякі падняволля далі?

Змагайся, мой браце,— не здайся ніколі,—
За свой пад'ярэмны і змучаны люд,
Што, ў цемры абдаран кайданнаю доляй,
Аплакваў у немачы бедны свой кут.

Мацуйся, мой браце, ты молад душою,
Бо песню змагарскую ты пераняў.
Ідзі ж непахіснай і смелай ступою —
Той самай дарогай, якой распачаў.

Мы — дзеці цяжкое, мазольнае працы,
Мы — дзеці адзінай рабочай сям'і,
Свабоды з пяволі ідзём дабівацца
Цаною сваёй збунтаванай крыві.

Па-новаму свеціць зара небасхіла,
Нясе нам прыгожыя, повыя дні,
І мы — маладая, наспеўшая сіла,
І мы — светазорныя бліскі-агні!

НАШ МАРШ

Нас зараз звяжуць. Мы пайдзём
Спякотай дзён да зорнай мэты,
Цярністым шляхам пабрыдзём,
У гарт адзеты.

Трымайся стройна!
Хай кайданы звіняць,
Няхай агні ў грудзях бурляць,
А погі... хай ідуць спакойна!

Шабляў бліск
І ляск капытаў,
Нагаек свіст
Ў руках паймітаў —
Не страшны нам!
Мы шлях цярэбім к новым дням...
Мы чуем —
Полымя вачэй
Яшчэ прарвецца ў бунт магутны,
Яно малашкамі бічэй
Разрэжа тых,
Хто сплёў нам путы.
Нас недарма зямля паслала
У навальнічны авангард,
Цярплівасць нам дала і гарт
І наказала:
«Быць інжынерамі барыкад
І трон
Валіць
На скон».
З адвагай, горда,
Непакорна
Сей іскры ворагу на страх.
Хадою — цвёрда,
Сэрцам — зорна!
Гучней, наш марш, вышэй, наш сцяг!

Я ЦЯБЕ АБНІМУ

Мы з табою ідзём да світання
Па разлогах пахучых палёў,—
Я цябе абніму, уквячу красаваннем
Маладых, палымнеючых сноў.

На стомленых всях тваіх
Матылёчкам світанне мігоча,
Гоман ночы глухое заціх,
Яшчэ воддалі бор свергатаці не хоча.

Ветрык мораку пасмы пагнаў, зварушыў
І абняў твой красуючы стан,—
Разаслаўся далінай, паволі паплыў
Малачаіі — маладжавы туман.

Я вачэй тваіх сінь прыбяру, асвяжу
Каляровай сцюдзёнасцю рос
І па скроні твае смутак свой палажу,
На духмянасць шаўковых валос.

Ведай ты, што у сэрцы сумненняў пяма,
Што у ім ты не знойдзеш дакору,
У сумненнях сваіх будзь разумнай сама
Ці спытайся вось гэтага бору!

Асалодзіць наш сум прыдарожны румянак —
Сакавіты, духмяны і горкі,
Аж пакуль не зірне ў сінь туманную ранак
І не згаснуць дрыжачыя зоркі.

Ў белі твару твайго буду ночы шукаць,
Што яшчэ не сагнала світанне...
Я цябе абніму на расстанні
Там, дзе сосны старыя шумяць...

НА ВОЛЮ

Турма ў цішы змроку прыплюшчыла вочы,
Бразнулі ў браме замкі заржавелыя,
І восень сырой, агаявокаю ноччу
Дыхнула мне ў грудзі збалелыя.

Горад снаваў свае сеці-зігзагі...
З імглы агнявой,
Як з пажару,
Рад фабрычных, як здань, камінoў
Замаячыў закопчаным тварам.
Як ад смагі,
Упіваўся мой стомлены зрок...
З туркату-шуму прарваўся,
Ўвышыню узляцеў, абарваўся,
Заблукаўшыся недзе, гудок...

Да лёту, браты, да шырокага лёту!
Арлом маладым шыбануць у нябёсы —
паплыць...
Атрахнуцца ад зморы,
Грудзьмі захлябнуцца,
душой адпачыць,
Распластаўшы крылле
на хвалях прастору...
. . . . . .
Іду...
Па дарожках, па прасёлачках.
У даль прастору гавару:
«Прыхілі мяне, мая долечка,
Барацьбяная Беларусь!»

ПАЭЗІЯ

Ты просішся ў дзверы
маёй беднай хаткі
Асенняю, ветранай, цёмпаю ноччу...
А можа — не?
Можа, гэта стогны маёй хворай маткі,
Што там, у кутку цяжка-змрочным,
Калышучы боль у паўсне,
З дзеткамі разам ляжыць?

Вецер дзіка пяе за акном,
Па грушах, па стрэхах
галосіць-шуршыць,

Б'е
крылом...
І глуха даносіцца спеў адзінокі.
То сціхне, парвецца,
То жалем далёкім
Ён хлыне нанова,
То ў сонныя згадкі
Разам з ветрам зліецца...
Можа, гэта песня майго п'янага бацькі —
Аж з гасцінца: «Не шумі, дуброва...»?
Ноч прыліпла да шыбін, глядзіць у акно...
То было так нядаўна-даўно...
Ад згрызоты балючай
Сэрца можа парвацца,—
Пад дзяружкай калючай —
Больш нічым не сагрэт —
Разам з ночкай асенняю плачу па матцы
Я — загінены хлопчык-паэт...
Ноч прыліпла да шыбаў, махае крылом...
Так! то было...
было...
...Больш не трэба! не трэба! не трэба
Тых жахлівых, бязвыхадных пут,—
Я даўно не малюся да неба,
Я гадую ў душы сваёй бунт!
Дай, паэзія, меч прамяністы —
Слова-гарт, слова-кліч, слова-бой,
Дай палёт мне арліны, агністы —
Гімнам-полымем біць да нябёс!

Тых начэй векавое праклянцце
Кінуць громам у тых, каго знаю,
Хто абуў жыццё нашае ў лапці,—
Ў тую чорна-крывавую зграю!

НЁМАН

Цябе вітаю, Нёман родны,
Тугі народнае рака,
Ў тваіх зялёных тонях водных
Струменіць скарга мужыка.

Па гладкай плыні ў даль гляджуся,
Ў тваю задуму берагоў,
Дзе замярлі ў лясістай глушы
Грамады-перавалы гор.

Знямены, здзіўлены, трывожны
Стаю, заслуханы ў цябе,
Квяцісты луг — залом твоей кожны
Жальбой расстання ў грудзі б'е.

Шчабечаш песняю птушынай,
Хвалюеш маладосці сон,
І льецца борам спеў дзяўчыны,
І грае рэха ў перагон!

Сыпнуўшы косы залатыя,
Блакіт на дне тваім заснуў,
Калыша ў сэрцы далі тыя —
Загонаў плужную вясну.

А дзе галотай свеціць вёска,
Страхой прыпала да цябе,—
Шуміш сіротлівай бярозкай,
Ракочаш ласкаю ў журбе.

Далёка ціхнеш адгалосам...
І там, дзе нізка над вірком
Ў тужлівых думах віснуць лозы,
Нячутна плачашся цурком...

І заціхаеш ў пушчы грозпай,
Сніш сон бізуннай старыны,
Як мукі боль у долі слёзпай
Няслі сярмяжныя сыны.

А з пушчы выплыўшы, памкпуўся,
Як лебедзь белы з аблакоў,
Як вочы дзетак Беларусі,
Смяешся хваляй васількоў...

...Гляджу. А ў сэрцы штось глыбока
Шапоча, пеніцца, кіпіць,
Плыве з прастораў дум шырокіх,
З народных просіцца крыніц.

Ці з лугавых дзён салаўіных?
Ці з долі — мачыхі ліхой?
Ці з дзедаўскіх начэй лучыпных
Імглістай восені глухой?

Ці з тых дарожак каляістых —
Тугі прыгоннае зямлі?
Ці з песні маці над калыскай
У вечар сцюжнае зімы?

Адкуль, адкуль плыве? А толькі
Сны ўюцца хмелем-дзеразой,—
Кіпіш мне, Нёман, быллю горкай,
Шуміш народнаю слязой!..

Цяпер спрагнёнымі вачыма
Ў душу бяру тваю красу,
З астрожнай пошкай за плячыма
Прывет байцоў табе пясу.

Калі ж у гулкім хваляў гудзе
Вялікі боль раскалышу?
Або на ўспепепыя грудзі
Я галаву сваю злажу?..

ДАРОЖКА

Дарожка з вербаў выбегла,
Памчала за сяло,
Як быццам гора выгнала,
Ў бяздолле павяло.

Ляцела, прыпыпілася,
Цыгпула за масток,
Мураўкай пакацілася,
Нырпула у лясок.

Зялёпаю красуняю
Трашчала па сучках,
Пастушкаю-пявупняю
Шугпула па кустах.

З лясочка ў жыта роўнае,
Як хваля, паплыла
І жнейкаю працоўпаю
Далёка жаць ішла.

То хусткаю квяцістаю
Між хваляў прамільгне,
То дужкай залацістаю —
Сярпом — на міг блісне.

А як за жытам вольная
Дыхнула сенажаць —
Цябе яна, прасторная,
Ляцела абнімаць.

То стан твой стужкай красачнай
Абніме-абаўе,
Прытуліцца, як ласачка,
Вянок табе саўе.

І так пляла-старалася
Дзявочы твой прыбор,
Пакуль ты не схавалася
Ў далёкі цёмны бор.

Ішла ты борам сумная
Дзіцячаю пятой,
Прыціхлая, задумная,
Забытай сіратой.

Бор ціхім шумам дзедаўскім
Цябе багаслаўляў
І, як бы нешта ведаўшы,
Нічога не казаў.

Як з бору ў поле шчырае,
Разбегшыся, пайшла,
Махнула птушкі крыллямі,
Ляцела, як страла.

А потым бабкай згорбленай
На горку — ў добры час! —
Там дзед гасцінцам з торбаю
Бандураю брынчаў.

У далеч акунулася,
Як з пошкай, набрыла,
Прыстала, аглянулася,
Слязамі заплыла.

Жабрачкай-папрашайкаю
Ў шырокі свет пайшла,
Няскончанаю байкаю
Нядолю папясла.

Калі ў каптан адзенешся,
Лахманная сям'я?
Калі ж багачкай верпешся,
Дарожанька мая?

РАЗВІТАННЕ

Я сягоння выходжу на волю,
Сонцам разгладжу маршчыны на твары,
А ты застаешся ў сценах няволі,
Мой дарагі, мой ты добры таварыш!

Нямала панурых гадоў
Будуць піць твае косці вільгаць астрожную,
Думкі крылатыя, непераможныя
Вячэрняй прайдуць чарадой...

І не раз, і не раз засмяецца вясна,
Далі сінія звонка на скрыпках зайграюць,
І запеніцца кроў, закрынічыць яна,—
Так патокі прадвесня снягі разрываюць.

А калі жаўруком зашчабеча лазур,
Да акна падыдзеш, гэтым спевам праняты,
І далёкую сінь пацалуеш праз краты,
І пабегшую здушыш слязу...

...Міліярды праносяцца дум...
О, дайце мне сілы! Я сэрца агнём
З грудзей сваіх вырву, на меч насаджу
І з паходняю рушу: за мной!

Меч вышэй! Гэта сэрца гарыць —
хай палае!
Гэта з цемры-задухі ідуць мільёны,
А полымя сэрца ім ноч рассякае,
Шлях прамоны світання ляжыць...

У маёй адзіночцы чатыры сцяны,—
Ці ж можа змясціцца ў іх сэрца-паходня?
Таварыш, на волю іду я сягоння,
На шлях пераможнай вясны!

Ты не гаворыш, задумна маўчыш,
Мо павагі расстання не хочаш трывожыць?
Руку дай, таварыш,— зазвінелі ключы,
Адчыніліся дзверы: «Выходзіць!»

ПАДАРОЖНІК ПАСТАЯННЫ

Іграе вецер па скрыпцы
мелодыю ранку,
Жытнія струны звіняць.
Пералівам флейты-крыніцы
Альшанік пяе без устанку,
А ў небе... стрэлы сонца зіхцяць.

Вышэй і вышэй угару
Трэпеты-крыллі!
Ў бездані сіняй
Цымбаламі сыпле жаўрук.
Звон касы...
У вянок
плятуцца пакосы...
Вяршынямі гордай красы
Ў неба ппуцца,—
Ах, як я вас бачыў даўно! —
Дык вышэй, мае родныя сосны!

Іду...
Я — падарожнік пастаянны,
З кайданнымі знакамі
На руках.

Прастор, прымі,
Загоі мае раны,
Прытулі свайго бедняка.
Прастор дзіцячых сноў!
Люблю цябе
любоўю яравою,
Як зеленню аўсоў,
Як сенажацяў
кменнаю травою,—
Так любіць можа толькі
Дзіця.

Меру крокам час той,
Калі люду вольнаму
Пастаўлю на стол
Хмелю-красы тваёй
Я чару поўную —
Дар майго лета
Ланцужнага,
Вяспы маёй
Лапцюжнай,
Як дар неўміручы паэта!

ПАСЛЯ ПРЫСУДУ

Сэрца, не кіпі! О не — я не сплю...
Лячу ў прадонне небыцця...
Прадонне, не шапчы,
Што я, загінены, цярплю,—
Ты лжэш! Маўчы!
Бо я іду — па шумнаї дарозе
жыцця!

Ціха на дне... Цемра... Імгла...
Распластай крылле, віхар,
І накіп гневу аж датла
Ўздымі маім вулканным дыхам!

Хваляў шум... Бурупы...
Натоўпу вал, як гоман пушчы...
Ці то клякочуць буцту струны?

А мо маяк свой зор прыплюшчыў
І мору волю даў на штурмы?

Прапала песня...
А... гэта ты
З натоўпу бліснула усмешкай?
Што шэпчаш мне? Дрыжаць лісты?
Лапочуць над маім падстрэшшам?

«Шляхам бярозы без краю
Просяцца даллю: пастой!
Ціхія зоры іграюць,
Клічуць-завуць на прастор».
— Не спявай. Знаю — люблю.
Не плач. У струнах песень не згублю.

«Хто шумы бору успеніць,
Зваліць народа турму?
Хто прыласкае цярпенні?
Хто прыгалубіць зямлю?»

— Цярпеннем мост будуем туды, дзе
сцелецца краса,
На бераг той ракі, а там — вясна...
«Там па дарожках жабрачых
Вехі лахманных падзей
Ў полі бярозкамі плачуць,
Болем народных грудзей».

— На нарах астрожных ляжу прыкаваны,
Распяты, бунтуюся ў сне,
І сочацца кроўю, гараць мае раны...
За мной, прада мною гадоў чараду
Ночка астрожная лічыць пры мне.
Бывай! Пайду!

Вачэй праменні,
Дагары!
Маяк гарыць
Над морам пенным.
Пружыпься, крок мой, цвёрда,
Шумі,
паход! —
Хто ж, як не мы,

Галаву падыме горда,
Каб узысці на эшафот?!
Гары, ў кім песні не астылі,
Ў паходах-штурмах па Бастылію!

ПАД РОДНАЙ СТРАХОЙ

(Верш з падполля)

Дала мне кашы картаплянай
І кубак малака,
Хлеб чорны кроіла рука,
На стол мне клала незасланы.

Я еў,
На шэрасць хатнюю глядзеў
І чар тваіх дзявочых рухаў
Душою стомленай лавіў
І ціхім сэрцам слухаў.

А ты
Стаяла вішняй нада мной
І шчырай матчынаю ласкай
Журботу роднай беднаты,
Гатовую бліснуць слязой,
Вачыма ў сэрца пасылала.
Як там дзвярыма хто забразгаў,—
На кожны стук,
На кожны рух
Ты ў вокны жвава паглядала —
Ты за мяне дазор вяла,
Мяпе — паўстанца — сцерагла!

«Калі ж канец мучэнням нашым?
Калі ж пазбудземся паноў?» —
З маўклівым і бунтоўным плачам
Пыталася ты зноў і зноў.

І мой табе паліўся спеў
Аб волі буйпай і магутпай,

За што крывавімся цяпер,
Ланцужных дзён зрываем путы.

З табой, ласкаваю, ішоў
Я з цёмнай хаты на прыволле,
Зямлю абшарпікаў дзяліў,
З астрога ўсіх асвабадзіў

І люд працоўны горда вёў
З задухі-цемры падняволля.
Шумеў над намі сцяг чырвоны
І прамяніў паход мазольных.

Ты слухала, душой ірдзела,
Чырвонай мальваю расла
І тварам шчасна харашэла,
Са мною крок у крок ішла.

Іграў усмех твой мімалётны —
Далёкі, блізкі, быстралётны.
Усмех, усмех... як жаль расстання,
Як трэпет блізкага вітання...

Гадуй для катаў ты праклянцце
І з гартам сонечных падзей
Нясі разорай-паласою,
І ў час бязлітасных распяццяў,
Галубка родная, прыйдзі,
Уцеху сэрцу прынясі
І думкі мужныя сагрэй
Сваёю ласкаю-красою...

НА ФРОНЦЕ

(Верш з падполля)

Бярозы шумяць галалёдам,
Ноччу цёмнай ахутаны шлях...
Іду... да абуджаных гушчаў народу,
Л ў сэрцы —

сцяг.

Ноч — памочніца мне. Я ўжо многа прайшоў
Па зборах узброеных душ,
Расставіў пасты, ў поле выслаў ганцоў,
І пяе мне гудком тэлеграфных слупоў
Кіпучая,
родная глуш...

І ў душу маю просяцца зоры...
Гэта бляск камсамольскіх вачэй,—
Гэй, на варце трымаюць дазоры
І хвалююць душу гарачэй!

Рэвалюцыі кузня агністая...
Шум бяроз... Не, то падпольшчыны шум
Раздзьмухае, кіпіць, сыпле іскры
Авангардных дум...

Жалезны наказ дысцыпліны
Нясі,
не падарві!
Будзь з імклівасцю кожнай хвіліны,—
Вось наш пераможны дэвіз!

Толькі той мае вочы адкрытымі,
Толькі той можа правільна плыць,
Хто умее ў агні самакрытыкі
Ўсе грахі свае смела спаліць!

Хто на кожны удар свайго ворага
Чулым вухам адмервае час,
Каб атакаю руху народнага
Стрэлам даць ураганным...
Руку авангарда трымаць пастаянна
На пульсе
мас...

...Іду. Вёскі ў полі рассыпаны,
Уцякаюць у снежную даль,
Стрэхі, снегам марозным прысыпаны,
Ноч старожаць. І чую — куецца,
Чую — трэпетам-іскрамі б'ецца,
Гартуецца збройная сталь.

І агні, і агні перахрэсткамі
Рассякаюць прасторы, дрыжаць,

Як па фронце мігаюць пражэктары —
Хаты фронтам-дазорам глядзяць...

Мы ж вядзём наступленне
Кожны час, кожны дзень, кожны міг,
І у вогненным гарце цярпення
Ў сэрцах нашых расце бальшавік.

Рэвалюцыі крочыць паход...
Помню волата гпеў, царскай зграяй раскляты,
На грымасе стыхіі распяты,
Нахмураны,
У дыме паганаў закураны,—
Дзевяцьсот дзевятнаццаты год!..

..Але стой... Нейкі шум... Палазы ад мароза
лютуюць.
Коні ў пене шыбуюць патокам,
Свае душы ў баях недзе людзі гартуюць,—
Едзе бульба ткачам Беластока,
Каб спыніць катаў люць,—
Стань, салдат, і аддай салют!..

Фронт адзіны, як буралом,
Развіваецца ў барацьбе,
Вяжацца цесным вузлом
У сэрцы кіпучым КПЗБ!

А далёка, далёка
Яснасць ў неба шыбае,
Мігае,—
Гэта горад
Забастоўкай палае,
Раздувае гарно, гучыць молат —
Заржавелы ланцуг разбівае.

Зайграйце ж, бярозы, мне маршам.
Пралетарскі гудзе бранявік,
Б'е трывогу. Спяшай стаць на варце,
Агітатар — салдат-масавік!

* * *

Ты і я на возе
Лугавога сена.
Вечар па дарозе
Пах рамонкі сее,
Сцелецца туман,
І цвіце курган
Кветкай сосен вышняй,
Ў воблачкі прыбран.
Знемаглася, спіш ты?

Па шаўковай плыні
Шырыні нябёс
Месяц-серп няспынна
Хмарак жне пакос.
І зубчаты бор
Дакрануўся зор,
Думай ціхай сніць,
Дыхае ў прастор.
Ах, устань, не спі!..

Стужкаю ружовай
Ноч зара вітае,
З кожным павяваннем
Косы расплятае.
Групы ціхі сум,
Сведка даўніх дум,
Сэрцу б'ецца весткай
Аб сірочым дню.
Ты не спіш? Прыгледзься!

Ў змучаныя грудзі
Кветкаю дыхні,
Хай нам шчасце будзе
Песняю вясны,
Каб яна шумела
Над зямлёй збалелай.

МЫ НЕ ПАМРЭМ!

(Падзеі лёху)

Ці зараз надыдзе світанне?
Ці хутка яно загляне?
Ноч...
Доўгая ноч...
І лёху сырое смактанне
Хлюпае ў цемры глухой і плюгавай.
Катоўская стража ізноў
Прыйшла паўтарыць свой здзек —
Пытала: «Цо, ешчэ не здэх?»

Дня няма — у лёху дня няма...
Толькі ноч...
І мохам заіпевеў твар.
І яму каменную, яму ярма,
Мераеш крокам, як вошчупам:
Раз-два, раз-два...

Адарваны. Не ведаю. Дзе вы, таварышы?
Холад гмаху навалены. Вільгаць. Падвал.
І цемра хіхікае ў вочы пачварамі...
Слухай, ноч,
і на волю наш кліч падавай!

Недзе крокі таемна ў цішы засычэлі...
Знаю — то крокі тэрору.
Глуха бразнуў ланцуг, і завесы дзвярэй зарыпелі
Жудасцю чорнай
на калідоры...

І — ціша. То ціша тэрору
Запала і цемрай шугнула ў грудзі...
Слухай, ноч,
і ў лёхах мы прагнем прастору,
І ў лёхах пяём мы, і славім, і будзім!

Мокрым холадам моршчыцца цемра,
Сліззю караваю сэрца дзярэ,
І варта катоўская крокамі дрэмле...
Надарма! Надарма!
Мы — не памрэм!

Гарт маёй думкі маланкуе іскраї,
Творыцца радасць вызвольнага дня,
Калі выйду вясною шумлівалістай,
Каб тысячы мук,
як сцягі, падняць!

ПЕРШЫ СНЕГ

Снег пушысты, бадзёры, крамяны
Ціхай беллю празрыстаю лёг,
Дрэвы, хаты ахутаў, рахманы,
І застыў на шырокіх палёх.

Першы снег — гэта сэрцу навіна,
Гэта — рапы прыкрыла зямля,
Гэта — з жартам прабегла дзяўчына,
Смех пры студні і скрып жураўля...

ГАДЗІНА МУКІ

Вечар апаў.
І цемра кладзецца на плечы.
Куды пайду? Якім слупам
Я панясу цяжар свой чалавечы?

Праз краты ноч плыве...
Савінымі вачыма гусцее на кутках.
І ў гэтай цемры йдзе спрагнёпы чалавек
Праз ночы змрок
з пабудкай ранняга гудка.

Адзіночка, як трупа...
І голага, жывога сэрца трэпет
Кляшчамі сціснула турма,
І сочыцца крыві гарачы кіпень.

Сіроцтвам шэпчуцца хвіліны...
Пад ношкаю цярпення — о, не згінай пляча!

Хоць п'яўкамі варушаць свежыя марпчыны,
На твары мукаю кладуць сваю пячаць.

Чую — пераклікі там за перавалам,
Дзе бяздоллем лёг для нас рубеж,
Прарэзаны слупамі вяльможнаю навалай
На нашай ростані ў вялікай барацьбе.

За рубяжом Усход гарыць зарою...
Смялей на перавал! Ў напружанай вандроўцы
Я захлябнуся ўласнай кроўю
І там, на вышыні, яе змяшаю з сонцам!

Вось і адпачынак мой пявучы —
Ліпа над крыніцаю шуміць...
Прыпадаю вуснамі да вады гаючай —
Уталі, радзімая, спрагнёпага прымі.

СОН АБ АГРАНОМЕ

У плыні месячнай
ноч сцеле перламі расы,
Звініць крыніца аб карчы,
За чаротамі
хаваюцца лясы,
І пушча побач... думае, маўчыць.

І што ж ты тоіш, пушча?
Што ў сваіх нетрах захавала?
Каму калыскаю была праз век прыгонны,
век дрымучы?
Скажы, каму ты песні шумныя спявала?
Звініць крыніца аб карчы...
Скажы мне, пушча, не маўчы.

Твае мне ведамыя сны,—
Я знаю, сніш ты згубу гору...
Тут кожны корч, і кожны куст,
І шопат кожпае саспы
Душою пашаю гавораць —
Душой народна-беларускай,

Што лахманом трасла вякамі
Над папшчыпнай палоскай грузкай,
Над шляхам, плыўшым жабракамі,
Душой, раздзёртай ад трывог,
Раскрыжаванаю на ростані дарог!

З табою разам сню
Аб родным аграноме нашым, блізкім,
Які народную вясну
Уквеціць сонечнымі лісцьмі.

Калі зары чырвонай шквал
Змяце сляды навалы панскай,
Сваім праменнем стрэльне ў лоб
Усёй навале акупанцкай,—
Не будзем, пушча, гараваць,
Лятунак наш не будзе сном:
Ударны прыйдзе аграном!

Збярэ сыноў сям'і бядачай,
З-пад цёмных стрэх збярэ паход
І на сцягу усім назначыць:
«Ўсё для народа і ўсё праз народ...»

Рухавіком, нібы стралой,
Пратне балоты, мхі і лозы
І разам з плесняй векавой
Затопіць мукі, здзекі, слёзы.
Шашою блісне з краю ў край,
І край наш стане быццам рай.

Люд-пралетар, люд песні працы
Заб'е прыгонпае пракляцце,—
Па рэках новых і па шынах,
Ўздыхпуўшы вольнымі грудзьмі,
Сталёвым туркатам машыны
Па пушчы рэхам загрыміць!
І ўторыць будзе перабіўны
Крыніц радзімых спеў турбінны!

Як будуць змыты ўсе сляды
Амшэлай, дзікай, горкай плесні
Краіны нашай, век забранай,—

Прыйду, прамяніы, я тады
З тої падарожы барацьбянай
На свята трактарпае песні.

І на чале брыгад адважных
У паходзе мнагасцяжным,
У дзень квітнення ясны, чысты.
Дарогай — беллю камяністай,
Б'ючы паходным смелым крокам,
Сустрэне з песняю мяне
Круглавіды, сінявокі,
Рассмеяны і жвавы піянер.

МОЙ РАМАНС

Цвіце вясна, а мой раманс
Расплыўся жалем над зямлёй,
Як кучаравісты туман,
З вячэрнім шэпчацца быллём.

Настрой душы звініць: люблю...
Бярозы ўздых над галавой
Маю юнацкую жальбу
Зялепіць руннаю травой.

Бярозы іншай чую ціш...
Краса яе кранула скронь...
З імглою месячнай ляціць
Павеву зорны, ціхі сон.

І твару бель, і шоўк валос,
І вочы кажуць: «Маладзей!
Бо вецер жару не разнёс
З тваіх расхрыстаных грудзей!»

Нашу я маладосці спеў,
На сэрцы — зорныя сляды,—
П'ючы з жыцця любоў і гнеў,
Я буду вечна малады!

ПАСІЯНАРЫЯ

Пасля заканчэння вайны ў Іспаніі газеты паведамілі, што Пасіянарыя ад'ехала ў Мексіку.

Прагрымелі дні крывавай канапады,
Не гучаць над фронтам залпы ярыя,
Не ідуць на штурм грымотныя брыгады,—
І дзе ж ты, дзе, Пасіянарыя?

Глядзі!
Яшчэ дымяцца вогнішчы Мадрыда
І рэхам — трэск, і шум, і тупат ног,
А над усім павісла ворага агіда,
Як чорны смок.

Пасіянарыя!
Праменны шлях цярэбім!
У гурбах цел, гранатаў, карабінаў,
У дымах пеністае Эбро
Твой крык, твой бунт не згінуў!

Пароль!
Сэрца на мячы палае горда,
Хоць аддана дань чалавечаму ярму,
Дань з песні і крыві — зары вяспы народнай,—
Ах, чаму ж, чаму?

Пасіянарыя!
Каваўся гнеў народны ў гарт паходаў,
І грудзі рвалі шум, імпэт і рокат сэрц —
Пароль! Яшчэ скуецца сталь рэспублік і народаў
І сцягам блісне нам вялікі СССР!

Глядзі!
Дыміць Іспанія раздзерта,
А попел іскраў жар збірае ў гром,
І за табою ўслед —
агністы кліч паэта
З жальбою-болем строф.

Пасіянарыя!
Сякеры бляск цямрычнага Таледа —

І там над мурам смерць — абмыта кроўю скронь...
Дарожны ныл застыў на твары бледным,
А танкаў вал грымеў
на ўвесь наўстанчы фронт...

Салют
Трагічным дням карабінарыя!
З магіл жывая б'ецца кроў —
І голас водкліку:
— Пасіянарыя!!!
З табою, за табой народ!

ЦІХІ ЗРОК...

Ціхі зрок на нястомную плынь маіх дум
Рассявае забытую быль зорных сноў...
І ці радасць, ці жаль для душы ў іх знайду?
Ты пайшла... Я шукаю слядоў тваіх ног...

Чую — ў нетрах душы абудзіўся тытан,
Хоча рваць, хоча біць на кускі ланцугі.
Голас жалю крычыць: «Не будзі, перастань!
Не будзі скамянелай тугі!»

Што ж зраблю, калі ў скрыгаце-ціску журбы,
Што па сэрцах у нас напісаў круты лёс,
Ноч па ранах маіх, ранах дзён барацьбы,
Сцеле шоўкам тваіх залацістых валос.

За слядамі лячу,— ах, нашто, не пытай!
Звону струн залатых, я прашу, не парві,—
Будзе ў песнях ірдзець і душой трапятаць
На шумлівы прастор жар мяцежнай крыві.

Можа, вораг нагой стопча грудзі твае,
Як захоча зламаць нашай моцы красу?
Я твой боль пераможны не буду таіць —
Ціхім зорам па ростані ўсё раскажу...

Як не верне цябе наш крыўдзіцельны рок,
Не падслухаеш больш маіх дум і знямог,—
Мой задуманы, ціхі і змучаны зрок
Будзе кветкі збіраць на слядах тваіх ног.

У шуме
вызвалення

*

ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Краіна родная! Вітай зару збаўлсння!
Ўжо мы прыйшлі з астрожных брам,
Скаваных дум прастор і радасць вызвалення
Нясём сваім затужаным братам.

Хай песня зазвініць.
Ланцужныя аковы
Насіла ты ў цямрычнай духаце,
Складала ў барацьбе крывавых песень словы
І громам сеяла,— і сцяг твой зіхацеў.

Хай згіне жаль тых вузенькіх палосак
І песня сумная гаруючай жыві,
Хай згіне крык душы забітых вёсак,
Няхай пагроза ката закляйміць.

Рассей, радзімая, па ўсім сваім прасторы
Ўсю моц сваю ў размаху новых дум.
Ўжо нам не жаліцца аб нашым вечным горы,—
Збірайся ў шумную да працы грамаду!

Рубеж крывавы змыт.
Дзяржаўны крок грыміць.
Свабодных дзён краса у зорах пяцікутных
Да сонца сцеле шлях для радаснай зямлі,
Руйнуе ўсе сляды народнае пакуты.

Шукаю цёплых слоў.
Мы выйшлі з цёмных брам,
І грудзі нашыя пяюць аб гібкай сталі,—
Пароль на збор усім вызволсным братам,
Чаго так доўга ў змроку мы чакалі.

МАЎЗАЛЕЙ

Асцярожна ідзі, чалавек,
І схілі галаву ў цішы змроку,
Глянь на думу закрытых павек
І глядзі, не спускай свайго зроку.

Ты пачуеш: ідуць праз вякі...
Ўсё ідуць і ідуць пакаленні,
Ўюць сардэчнай любові вянкі...
Гэта ж спіць... неўміручы спіць Ленін...

Ленін спіць... Ён жывы... Ленін вечны!
Бо за ім расквітнеліся далі,
Ў прах затоптан прыгнёт чалавечы,
І на варце мы, мужныя, сталі.

Асцярожна ідзі, чалавек...
Хаї у цішы хвіліны замлеюць
Пры святле ад заснуўшых павек,
Што дрыжыць на сцяне Маўзалея.

АРМІЯ ЧЫРВОНАЯ

На шляхі зялёныя
Йшла нераможная
Армія Чырвоная
Путы рваць вяльможныя.

І плылі над сцягамі
Песні прамяністыя:
Роднымі прасцягамі
Ехалі танкісты.

Цераз боры шумныя,
Рубяжы крывавыя
Слалі мнагадумныя
Весткі волі слаўныя.

Беларусь Заходняя
Расцвіла праменнямі,
Беларусь народная
Зашумела песнямі.

Сілы накіпеўшыя,
Сілы гартаваныя
Паліліся песнямі,
Воляй раскаванымі.

Бацька прыгарунены
Усміхнуўся сонечна,
І маршчыны сумныя
Прамянелі горача.

І слязамі радасці
Маці абрасілася,
І ў забітай старасці
Сэрца маладзілася.

А дзяўчына любая,
Прыгажуня спеўная,
Йшла вясельнай дружбаю,
Птушкай перапеўнаю.

А хлапцы адважныя
Йшлі атрадам з песнямі,—
Ўсе віталі радасна
Армію прадвесную.

Помні, брат вызволены,
Верасень семпаццаты:
Быў ты абяздолены,
Стаў ты найбагацейшы.

Дык красуй, прыгожая,
Армія Чырвоная,
Ты — непераможная
Армія народная!

ВЯСНА МАЯ

Вяспа мая! Цябе чакаў я доўга
І плыў на хвалях вогненнай тугі.
Крамністаю была ўся нашая дарога,
А рукі кволыя вязалі ланцугі.

Вясна мая! Прыйшла ты печакана
У дзень задухі, болю і трывог,
Прыйшла ты, пышная, вітаннямі убрана,
Што аж цябе за раз душой абняць не мог.

Іду я днямі, сню, цябе ў душу ўбіраю,
Іду праз людскіх мар цудоўны сад,
І на слядах сваіх свой позірк я спыняю
Дарогай схіленых, задуманых прысад.

З усмешкай люд глядзіць на сонечнае ранне...
Бывай, бяда — ярэмны скрып тугі!
Народных дзён прастор і сэрцаў ракатанне
Нясе на шлях ударныя сцягі.

Мы не забудзем дня, калі шумлівым ходам
Ішлі байцы... Як расцвіла зямля!..
Вясна мая! Шумі ж ты карагодам,
Каб кожны міг цябе у песнях праслаўляць.

* * *

Я маю сонцы два.
Адно святлом хвалюе,
У працы творчай дня
Яно мяне цалуе.

Другое сонца маю —
Ў надзеі тут і там
Ў ім шчасця я шукаю —
Яго цалую сам.

ДАЎНІ ЗНАЁМЫ

Недзе быццам іх бачыў я — русыя вусы,
Акуратны прабор галавы...
Ён як быццам з павагаю кожнага вучыць,
Голас рэзкі, крыху гарлавы.

Мо, сустрэўшыся з ім на дарозе жыццёвай,
Я не раз падзяліўся куском,
Узбадзёраны быў яго бацькаўскім словам,
Яго ветлівым, ціхім смяшком?

Можа, з Горкага кніг ён зазначыўся мігам,
У душы здаецца ціхаю стаў?
Можа, вычытан мной з задушэўнае кнігі:
«Як гартавалася сталь»?

Ў будаўніцтве працуе мой даўні знаёмы...
І цяпер за супольным сталом
Сыпле іскры вачамі і кідае громы,
Выглядае суровым арлом.

Я люблю гэту моц, гэту ёмкасць размаху,
Пад суровасцю — ласкі прастор.
Ён — жыцця гаспадар, разважае без страху,
Апускаючы руку на стол.

І закончыў: «А ўсё ж такі мы збудавалі...
Вырас дом, як палац, на суровай зямлі...»
Гэта ж мо за яго мы бакал падымалі
На сустрэчы ў Маскве, у Крамлі?

АБ ЛЕНІНЕ ВЯЛІКІМ

Трывогай ціхаю, як даляў пераклікі,
Звіняць акорды струн без назвы, без імя,—
Яны пяюць аб Леніне вялікім,
Як пад яго ступою расцвіла зямля.

То поўняй дум яны набухнуць аж да краю,
Як пройдуць па душы бадзячыя гады,

То сурмаї баявої, трывожнаю зайграюць:
«Каб жыў цяпер вялікі правадыр...»

Так лірнік песенны нахіліць свае думы
І заглыбіцца ў быт далёкі і глухі,
І ловіць, як у сне, аддаленыя шумы
Лясоў і ніў, дзе сцелюцца шляхі.

А думы бачаць даль, і сэрца кажа: Ленін!
Бо з петраў цёмных, з-за сляпых акон
Ён за сабой павёў да шчасця пакаленні
Цяперашніх і будучых вякоў.

І сыпнуцца ад струн гарачыя прамені,
І пойдуць маршам сніць аб долі залатой,
Якую ўсім навек прынёс вялікі Ленін,
Якой не аддамо нікому нізашто!

ПАРТЫЗАНСКАЯ МАРШАВАЯ

Мы — племя шумнае,
Адважна-бурнае,
Мы — партызанскія сцягі.

Ідзём мы лаваю
З народнай славаю
За край наш родны, дарагі.

Мы б'ём з прыцэлу
Зпішчальна, смела
Па бандах дзікае арды.

Нямчуры подлай і нягоднай
Ад нас не скрыцца нікуды!

Кат топча нівы,
Наш дар шчаслівы,
Ў пажарах топіць наш народ.

У родным краі
Усё знішчае,
Што мы расцілі з году ў год.

За мукі родныя,
За стогны слёзныя,
За смерць дзяцей, жанок, бацькоў

Мы помсцім страшна,
Мы помсцім страсна —
Смерць за смерць і кроў за кроў!

* * *

Пад зорным карагодам
Спеў льецца без канца:
«Нішто не загародзіць
Дарогу малайца!»

Ўжо ноч задумай лёгкай
Лягла на паплавы,
Байцы пайшлі далёка
Ў маўчанні баявым.

Гітары песні-зыкі...
Нашто ж прыгожа так?
Нашто у марах ціхіх
Гарыць ва ўсіх душа?

За хараство Краіны
Пайшлі байцы на бой,
За радасці Айчыны,
Сагрэтыя душой.

А песня ў карагодзе
Дрыжыць услед байцам:
«Нішто не загародзіць
Дарогу малайцам!»

ПЕРШЫ МАЙ

Першы май сабірае мільёны
Па крывавых дарогах-шляхах,
Запаляе агонь у грудзях
І гуртуе палкі, батальёны.

Першы май б'е на бітву трывогі
З дзікім, чорным, ліхім груганом,
Што, скаваўшы народы ярмом,
Людаедствам запоўніў дарогі.

І размах баявых пераклікаў
Рэхам громкім, як хваля, гудзе,—
Мы куём перамогу штодзень
Нашай маці — Айчыне вялікай!

Знаем мы — прашумяць аблакамі
Нашы дні — баявыя труды,
Будзе свята і ў нас, і тады
Першы май прамянець будзе з намі.

Слухай сэрцам, як весткі ляцяць,
Аж з далёкай Масквы палымнеюць,
Там пры строгай цішы Маўзалея
Клятвай вернасці сэрцы гараць.

ПАМЯЦІ
ЯНКІ КУПАЛЫ

Твой дух лунаці будзе славаю вавек
Над вольнымі палямі Беларусі,
Імя тваё там кожны назаве
І ў сэрцы закране найчулейшыя гуслі.

Праз гомап пушч і сінія тумапы,
Праз родны шлях ты з ліраю ў бядзе,
Праз ціхія забытыя курганы
Ішоў, прарочыў шчасця светлы дзень.

Ты дачакаў. Твоій сон шчаслівы збыўся —
Наш край парваў няволі кайданы,
Сярод народаў вольных ты разліўся,
Сваёю песняй сэрцы паланіў.

Зноў гуганнё зляцела на Краіну,
Ў пажарах топіць люд, і не сабраць тых слёз,—
Ты варты роднае ў сваім шляху не кінуў
І да апошніх дзён свой дар народу нёс.

Ў цяжкіх баях з нямецкім акупантам
Паўстаў народны, непрыступны шквал...
Табе ў змаганні з ворагам заклятым
Была апорай родная Масква.

Ты чуеш гром з палаючай Краіны,—
То б'ецца Беларусь, ідзе да перамог...
І я прыйшоў адтуль, з далёкае пуціны,
Твой меншы сын,— аддаць табе апошні доўг.

РЫЦАР АЙЧЫНЫ

Памяці генерала Даватара

Ноч і снег... І пажары... Віхурай — галоп...
За плячыма ў змаганні народ і Масква...
— Гэй жа, хлопцы мае, дык ударым назло,
Каб скацілася ў немца з плячэй галава!

То не сосны над шляхам мяцежна шумяць,
Не маланкі ўзрываюць навіслыя хмары,—
Гэта гулка дрыжыць ад капытаў зямля,
А навокал пажары, пажары...

Шлемаў зорных імчыцца магутная раць,
Перад імі герой — на ім бурка, папаха,
Шабляў вострых кліпкі жарам бітвы гараць,
А ў душы — ні сумнення ў, ні страху.

Не відаць па-за хмарамі зяючых зор...
І куды ж паляціць твая сіла героя?

Зрокам сокала мерыш ты буйны прастор,
З бурай ў сэрцы, заковапы ў зброю.

— Я змагацца лячу за Савецкі Саюз
Ў сакалінай пястомнай пагоні,
Я змагацца лячу за цябе, Беларусь,—
Твоїй народ у жахлівым палоне.

Мы Краіне трывожныя клічы пашлем,
Ўсіх узнімем на бой ўсенародны,—
А Масква ў шумным ветры свой голас услед:
«За Айчыну! Адважна і горда!»

Гнецца лес. Ён на родных шуміць рубяжах.
Шаблі тпуць, коні рвуць па руіне,
Немцы покатам густа на снезе ляжаць —
На шырокай на рускай раўніне...

Ўжо народпае помсты агні паплылі
Пад нагамі чужынцаў праклятых...

. . . . . .

Сярод гукаў гарматных, дрыжання зямлі
Мне легендаю сніцца... Даватар.

МАЦІ

Ноч снежная ў акпо загадкаю глядзела,
Па хаце палыхаў у цешях бляск лучыны,
А ты, тужлівая, сядзела за кудзеляй,
Нахмурыўшы над бровамі маршчыны.

І дзіўным для мяне было тваё маўчанне —
То восень так маўчыць, як сыплюцца лісты...
Хвіліну кожную хацелася прызнання:
Чаму ж так погляд твой ў суровасці застыў?

Я быў у зношаным, палатаным шынелі,
А ногі мокрыя сагрэла цеплыня,
І, абапершыся з вінтоўкай на калені,
Я ціха думкаю у даль жыцця лупаў...

Гадзіны ўсё плылі, і патыхаў цяплом
Лучыны камінок бяздомны, адзінокі...
Вось поўнач за акном шарахнула крылом,
А маці не рассталася з задумаю глыбокай.

— Скажы, скажы мне, маці, дзе ж твая сям'я?
Чаму так пуста, холадна у хаце?
Ты не здзіўляйся, не, што так пытаю я,
Я — свой табе, скажы, не бойся мне сказаці.

— Мяркую, што ты свой, хоць многа цяпер зброду
Валочыцца у нас, палюе на людзей,
І гіне шмат нявіннага народу —
Жанок, мужчын, старых, дзяцей.

Глыбокі ўздых растаў павольна па кутках,
Маршчыны зноў над бровамі сышліся,
Па нітцы павяла прывычная рука,
І губы ў вострым болю зацяліся.

— Я мела трох сыноў, саколе мой.
Малодшы спіць ужо ў сырой зямельцы,
Яго, як партызана, жніўнаю парой
Забралі і забілі немцы.

А двух другіх у арміі даўно...
І калі з Мінска надышоў наказ,
Дык зашумела нашае сяло.
Сказала я:
«Ну што ж, сынкі, бывайце, ў добры час!»

Мінула восень, вось цяпер зіма,
Душу туга і думка адалела,—
Ні вестачкі, ні аднаго пісьма
Я з таго часу ад сыноў не мела.

Скажу яшчэ... Хоць страшна мне самой...—
І словы ў голасе старое задрыжалі...
— Нядаўна гэтаю марознаю зімой
Нявестку з ўнучкам ворагі забралі.

Якою смерцю згінулі абое —
Не ведаю... Не бачыла іх ран...
Забралі ж іх, сынок, за тое —
Насілі яны есці ў лагер партызан.

Нявестка... божа мой!.. Як кветка, маладзіца.
І ўпучак рос. Не верне іх вясна.
І дзе цяпер мне, беднай, прытуліцца?
Як пень стары, сяджу, тужу адна.

І вось табе мой сказ.— Гаручая лучына
Свой разлівала бляск па сценах, па кутках,
Іграла цепямі па струджаных маршчынах,
А нітку ўсё вяла прывычная рука.

Па ночы цёмнай ў інеі пушыстым
Далёка затрашчаў за вокнамі мароз —
То сівы бор ў цішы марознай і празрыстай
Пра быт дрымучы голас нам прынёс...

— Ідзі ужо, сынок, бо стараста дазнае...
Учора з немцамі паліцыя была...
Чаму іх бог чумою не скарае?
Чаму не прыбярэ іх нашая зямля?

Дала ў кішэню мне кавалак хлеба,
Сказала пару слоў яшчэ пра здзек, пра глум.
Надходзіла світанне, ўжо віднела неба,
І я пайшоў у белую імглу.

А потым было ўсяк. Дзе Гомель, Магілёў
І дзе шырокая хвалюючая Прыпяць,
Я не забыўся ціхіх і суровых слоў —
Яны мяне й цяпер трывожаць і калышуць.

З баямі мы ішлі, грамілі гарнізоны,
Мы прарываліся праз пушчы і палі,
Масты ўзрывалі мы, спускалі эшалоны
І раз у вёску нейкую прыйшлі.

На скрыжаванні дзвюх дарог мы бачым
шыбеніцу,
І труп вісіць, схіліўшы галаву...
Ці можа што падобнае прысніцца?
Я анямеў і ў бездань цёмную плыву...

Здымаем труп з пашапай, зрэбнінай адзеты...
І, глянуўшы на твар, авеяны журбой,
Я крыкнуў мсціўцам: «Знаеце, хто гэта?
За маці партызанскую — на бой!»

СЛУХАЙЦЕ, ПУШЧЫ, ПАЛЯНЫ...

Цёмная ноч агарнула
Пушчы, дарогі, палі,
Але нідзе не заснула
Нічога на родпаіі зямлі.

Там па лясах непраходных
З позняй да ранняй зары
Полымя мсціўцаў народных
Помстай вялікай гарыць.

Слухайце, пушчы, паляны,—
Тупаты ног паплылі;
Гэта ідуць партызаны,
Сыны беларускай зямлі.

Туліцца вораг агідны,
Туліцца немец, як звер,
Ноч для яго — гэта гібель,
Ноч для яго — гэта смерць.

Кроўю заплыўшыя хмары
Стынуць над краем руін,—
Гэта палаюць пажары
Ў бунце народнай крыві.

За папялішчы, за раны
Слухайце ўзрывы ўдалі,—
Помсціць пайшлі партызаны,
Сыны беларускай зямлі.

Мацеры нашы і дзеці...
Нам не забыцца пра іх...
Знішчым заразу на свеце,
Прыкончым фашыстаў усіх.

Ў помсце святой і магутнай
Выкаваць волі зару
Ўзняўся народ беларускі
За родны свой край — Беларусь.

Пушчай, дарогай, паляшай
Рэха ўдараў грыміць;
Гэта ідуць партызаны —
З боем на роднай зямлі.

ПРЫПЯЦЬ

Прыпяць шырокая і таямнічая,
Маці балот і лясоў,
Рэхам шуміць твая хваля крыпічная,
Як байка з нязпаных вякоў.

Імчыш свае воды ты ў далі загадкаю
І рвеш непрыступны прастор,
Праз дзівы такія плывеш ты нязнайкаю,
Якіх мо не бачыў ніхто.

У месцах адных ты аброслая сёламі
І туліш к сабе гарады,
А потым туды прарываешся лозамі,
Дзе вечна шумяць чараты,

Дзе ціша пад небам застыла пахмурпая,
Прырода глухмяна маўчыць,
Дзе птушка загублена кружыць нячутная,
Нішто не пяе, не крычыць.

І там ты ляніва — шырока-ўладарпая,
Здаецца, не хочаш плысці,
У неба глядзішся адна, светла-хмарпая,
Дзяцінствам зямлі шалясціш...

Праз бары сівыя, гаі дубовыя
Ў нязпапыя цягпеш канцы,
Праз сенажаці квяціста-шаўковыя,
Дзе косамі звоняць касцы.

З хвалямі шумнымі мова народпая
Льецца ў лясістую шыр,
Песня задумпая, звонкая, гордая —
Дума народпай душы...

* * *

Ворагі хцівыя! Слава надзьмутая!
Дарэмны сюды ваш прыход,—
Тут помста гняздзіцца карэннямі лютая,
Тут беларускі народ!

Прыпяць чаўны свае гнала далёкія
Ў дрымучых вяках напралёт,
Туды, дзе імчыць свае воды шырокія
Сівы, магутны Дняпро.

Там на прасторах прывольнай Украіны
Ў бітвах за волі зару
Свае багатырскія грудзі расправіла
Ў змаганнях Вялікая Русь.

Не, вы забыліся, орды тэўтонскія,
Што і цяпер тая шыр
Рэкамі нашымі мкнецца бясконцымі —
Сілай народнай душы.

* * *

...Ты бачыла, Прыпяць, і чула, шырокая,
Народу крывавы палон,
Як плачы, праклёны і стогны прарочылі
Лютаму ворагу скон.

Лес спахмурнеў, у цябе заглядзеўшыся,
Як падалі дзеці ў крыві...
У помсце святой, над вінтоўкай схіліўшыся,
І я твае слёзы лавіў.

Шумна збіралася сіла народная,
Тваёй шырынёю расла,
А ты, панахмурана помстаю, гордая,
Грозныя хвалі нясла.

Слухай ты, нечысць прусацка-паганская,
Смерць пачала вас касіць.
Слухайце! Прыпяць — рака партызанская,
Яна вас затопіць усіх!

Ў бітвах кіпучых шуміць легендарная
Слава герояў-сыноў,
Як Прыпяць шырокая, неадгаданая —
Маці балот і лясоў.

НА ВАРЦЕ

Я з віптоўкай на варце стаю,
З вострай пільнасцю сэрца і воч,
А са мной толькі цёмная ноч
У маім партызанскім краю.

Прада мною балотаў імшар,
Дзе паблісквае ў цемры вада,
А як глянеш навокал у даль —
І баліць і нямее душа...

Рассявае і смерць і пажар
Недзе вораг драпежнай рукой,
Жахам дыхае край увакол,
Небасхілы дрыжаць і дрыжаць...

Час ад часу ў далёкай глушы
Пырсне немец ракетай увысь,
Аглядае лугі, паплавы —
Нас баіцца у чуйнай цішы.

Пад палётам агністым клубка
Заіскрыцца жывая вада,—
Гэта Прыпяць шырокая там,
У зялёных кустах лазняка.

І здаецца, убачу на міг,
Як глыбокі асветлены вір
Круціць хвалі варожай крыві —
Беларусь мая у агні.

Небасхілы дрыжаць і дрыжаць...
Я з вінтоўкай на варце стаю.
За краіну у крыўдзе сваю
Думка вострыцца бліскам нажа.

ПАВЕЙ, ВЕЦЕР...

Песня

Павей, вецер, павей, вецер,
Ды з роднага краю,
Я з другіх краёў на свеце
Лепшага не знаю.

Там шумяць бары, дубровы,
Нівы залатыя,
А над хатай клён шаўковы
Шуміць сіратліва.

Там расце ў смутку-болю
Адна сіраціна,—
Я не знаю, што з табою,
Любая дзяўчына?

Можа, сэрца здратавалі
Немцы-людаеды?
Ці ў палон куды загналі,
Што няма і следу?

Ці сыдуцца пашы сцежкі
На прасторы вольным,
Ці запахнуць зноў пралескі
У бары зялёным?

Да цябе лячу ў трывозе
У баях заўзятых,
У змаганні, у паходзе —
Да знаёмай хаты.

Як гукну табе па лесе
Вольнай Беларусі,
Ці пачую тваю песню:
«Ой, ляцелі гусі...»

ТКАЧЫХА

Ты тчэш неаглядныя мары
Ў жаданнях сваіх залатых,
Хоць люта палаюць пажары
Яшчэ на прасторах тваіх.
Ўсё тая ж пападная постаць,—
У песнях аб ёй расказаць! —
Усмешкі стрыманае роскаш
І шчырая ў горы сляза.
Імклівая ў працы ухватка,
І ціхасць задумпай красы,
І ветлая тая аглядка,
І трэпет шаўковай касы.
Ізноў твае вей упалі
На твой сонцам тканы уток,
Ізноў, як у вершах Купалы,
Ідзеш за сяўбою ў прастор.
Змагаеш наследкі няволі...
Размахам сваім маладым
Абдымеш шырокае поле
І ў песні сальешся ты з ім.
Я знаю, ты вытчаш на дзіва...
За поступам лёгкай хады
Я з вершам імкнуся, шчаслівы,
Кажу: «Беларусь, гэта ты!»
Свой зрок задуменны і ціхі
Вясною схілі нада мной,—
Я поясам роднай ткачыхі
Хацеў бы бліснуць над зямлёй.

ДЗЯДЗЬКА-БЕЛАРУС

Сядзіш, мой дзядзька, добры, сівы,
Яшчэ ў цябе нямала сілы,
Сядзіш на прызбе ля парога,
Гаворыш радасна і многа.
Праходзяць людзі міма хаты...
Ідуць цывільныя, салдаты,
На твой падворак заглядаюць.

«Ці можна адпачыць?» — пытаюць.
У ільняным адзенні белым,
Ў старэцкай шапцы прапацелай
І з люлькай-піпкаю ў зубах,
Ты, ўвесь загледжаны на шлях,
Ўстаеш, з усмешкаю вітаеш,
Людзей у хату запрашаеш:
«Заходзьце, людцы, што ж такое?
Вайна на свеце — ліха злое...
Як церпяць людзі, божа мілы,
І дзе набраць тут столькі сілы?
Ісці без ежы, адпачынку
І дзень і ноч без перапынку...
Праклятый немец, што ён хоча?
О, шчэ не так ён засакоча,
Што косцю ў горле яму стане
Усё яго заваяванне...
...Салдацікі, за стол сядайце,
Хвілінку, трохі пачакайце...»
І дзядзька ў сенцы выбягае,
Дае загады, памагае,
Гаворыць жонцы-гаспадыні,
Гаворыць дочкам, свайму сыну:
«Ты вось пясі буханку хлеба,
Нарэзаць ў міску сала трэба,
Кваску зрабіць з гурком, цыбуляй,
Каб хоць па лыжцы ўсе хлябнулі,
І з тога чорнага гляка
Наліць, паставіць малака.
Прыняць людзей, каб спаміналі,
Заўсёды нам дабра жадалі...»

Ідзе у хату прамяністы,
Такі бадзёры, урачысты,
Як бы вяселле ён спраўляе,
Людзей размовай ажыўляе.
Каля байцоў прысеў на лаве,
Дыміцца люлька, голас жвавы...
«...Адкуль, салдацікі, вы самі?..
Прыйдзецца вам ісці лясамі,
Яно і лепш. Я услужу,
Я вам дарогу пакажу.
Што зробіш? Цяжка... Знаю, брат,
І сам я рускі быў салдат!

Прайшоў вайну з праклятым немцам,
А ён ізноў, нягоднік, прэцца...
Ён дачакаецца свайго —
Дастане перцу — ого-го!..
Вы толькі ешце, не шкадуйце,
Ў дарогу ж вам,— сябе шануйце.
Мы тут як-небудзь пражывём,
Як будзем жывы, нажывём.

Учора вось пасля вячэры
Зайшлі у хату афіцэры,
Яны у нас паначавалі,
Мы іх таксама частавалі,
Тым часам ёсць, дзе спаць, што есці...»
І дзядзька горды з гэтай чэсці!

Байцы сядзяць,— ім так прыемна,
Ім так зацішна і адменна,
Бы чуюць матчыны напевы
Ці нівы роднае павевы.
Любоў вялікая — Айчына
Стаіць у сонцы прад вачыма,
І распірае грудзі бурай
Нянавісць-помста да нямчуры.
Байцы клянуцца, абяцаюць,
Разбіць нямчуру прысягаюць,
Выходзяць — дзякуюць ласкава.
Праводзіць іх наш дзядзька бравы,
Ім дух бадзёрасці ўлівае,
У добры путь благаслаўляе...
Бывай, мой дзядзька, добры, сівы,
Няхай табе паслужаць сілы
У нашых цягасных нягодах,
Твая душа — душа народа,
І я пайду з душою гэтай
Да перамогі — нашай мэты,
І твой наказ з сабой бяру,
Мой родны дзядзька-беларус!

СІНІЯ ТУМАНЫ

Санет

Застылі на дарогах сінія туманы,
І здзіўлена ўзыходзіць сонца над зямлёй,
Яно на росы траў, атуленых імглой,
Колерам вясёлкі упала на паляны.

Ўдыхаю пах зямлі, іду зачараваны,
А бунт яшчэ мацней шуміць ў маёй душы,
Што чую, як сляза закапала ў цішы
На мой ласкавы край, драпежнікам забраны...

О людзі! О зямля! Ўздымайце моц грудзей!
Хай знае вораг сілу нашае трывогі,
Хай ў памяці яму навекі стане дзень,

Дзень нашай страшнай помсты-перамогі,
Калі з слязою радасці у громах мы прыйдзем
І вернемся на родныя дарогі!

ПАЛКОЎНІК

Сонца пражыць.
Як варам, зямлю аблівае,
Пыл курыць у паветры гарачай імглой,
І атрады байцоў па пяску валяць валам —
Ўсім на сэрцы вялікае гора лягло.

А-а... палкоўнік!..
Стаіш ты ў вачах,
як асілак.
Потам капае долу
суровы твой вус,
Зорны шлем, шпаркі крок тваёй сілы
Адзначаюць байцам
цяжкі струджаны пуць.

А з байцамі змяшаліся
з клункамі людзі —
Мужчыны, жанчыны і дзеці,
Па гарачым пяску
намагалі іх грудзі
Нянавісць
супольную песці.

Ты аглядаешся часта, палкоўнік,
Схіляешся, бачу,
над белаю хусткай,
І трэпет на твары тваім неспакойны,
І лёгкая ўсмешка на вуснах.

Прамовіў: «Што, цяжка табе, маладзічка?
А хлопчык не плача? А можа, заснуў?
Пакажыце яго мне... Ах ты, малышка...
Дайце... я яго вам падняcу...»

І істоту маленькую,
толькі ў пялёнках,
Рукой загрубелай палкоўнік бярэ...
«Ісці нам з табою, малютка, нялёгка,
У бітвах за нашу свабоду гарэць».

Узняў над байцамі
той скарб чалавечы
Яшчэ і яшчэ раз... «Клянёмся, байцы,
Што вынесем к сонцу
Радзіму на плечах
І ворагу люгаму
зробім канцы».

І дзіўная ціша павісла ў паветры...
«Клянёмся! Клянёмся!» — байцы пракрычэлі.
І грознае рэха кацілася з ветрам,
І твары байцоў, як ад шчасця, яснелі.

Ўскалыхнулася ціша ўзбадзёранай хваляй...
Пайшлі
тым вялікім праторанym следам,
Дзе пекалі продкі ішлі
грозным валам —
Шляхам герояў —
за сонечным шлемам.

ПЕСНЯ
АБ ВОЛАЦЕ

Як шумела каласамі
Жыта па раўніне,
Наляцелі груганамі
Немцы на краіну.

Як прыціхнуў бор высокі
Пад варожай хмарай,
Запалалі нашы вёскі
У агні пажараў.

Забівалі каты дзетак,
Гналі люд ў няволю,
Быў патоптан наш палетак
Дзікаю ардою.

Выйшаў волат наш магутны
З пушчы на паляны,—
Ў бой вялікі з катам лютым
Выйшлі партызаны.

Доўга біліся, крывава
На зямлі забранай,
Лёг, распластаны ў няславе,
Вораг здратаваны.

Зарупела ў вольным полі
Залатое жыта,
Немцу тут не быць ніколі —
Кат ляжыць забіты.

Пасля вайны

*

ДЗЯЎЧЫНКА

Куды ж ты ідзеш у сірочай задуме,
Як казка лясное глушы?
Вядуць цябе ўдаль карагодныя шумы
Праз бору магутнага шыр.

Ідзеш, азіраешся ўсё палахліва,
Не бойся — ніхто не кране,
Дзяды нашы з ўнукамі страхі на нівах
За вас пераможылі раней.

Ідзі, мая зорка, дарогай лясною,
Хай казка з табою плыве,
Мільгнуцца, як даўняй сірочай вясною,
Мне босыя ножкі твае.

* * *

Дарогаю лясною
Ўсё еду, еду я,
Асенняй цішынёю
Жыве душа мая.
Заслуханыя ў восень,
Сасопны маладняк
І веліч ціхіх сосен
Даюць таемны знак.
Гавораць: «Уздымі
Ты вочы ў неба просінь
І сэрцам успрымі
Хмурынак лёгкі шлях,
Пракляццем закляймі
Ўчарашні дым і страх».

ВУЛЕЙ

Забыты...
Здасцца, нікому нязнаны,
Вулей пануры павіс на сасне.
Ён, шумам іглістых вяршынь калыханы,
Нібыта заслухаўся ў восеньскім сне.

Не чутна і пчолак руплівага рою...
Ад грэчак мядовых, далёкіх прысад
Цяпер не лятуць ціхазвонныя мроі —
Пустуе тут маткі-царыцы пасад.

Тут дрэмле зацішша.
А з ночы украдкам
Туман закурыцца ў блакітную рань,
Дазорам глядзіць апусцелая хатка,
І побач павалены плот у бур'ян.

Мне цяжка і сумна стаяць пры дарозе
І слухаць лясную асеннюю ціш.
Не ведаю, што мне рабіць у трывозе —
З табою астацца ці далей брысці?

Я знаю, народзяцца новыя пчолкі —
Яны прыляцяць на сялібу сваю,
І шум баравы,
раніх росаў вясёлкі
Па-даўняму зноў прывітаюць сям'ю.

Я знаю, расстанемся з кожнай бядою,
І росамі раны залечыць зара,
І бабчыну байку аб рэках мядовых
Дзеці палёў будуць зноў паўтараць.

Усё гэта ведаю, ціш залатая,
Але адкажы мне...
не прамаўчы,
Чаму тут уцеха мяне не вітае?
Як крыўду цяжкую мне перамагчы?

ЖУРАЎЛІ

Стаяьма. Цішыня. Як адпачыи зямлі.
Ледзь чутны дзятла стук у гушчыні далёкай...
Як толькі можа ўвысь загляиуць вока,
У выраї цягнуць ў небе жураўлі...

Ўсё чуе тут асеннюю пару:
Бяроз на ўскраіне задума расставання,
Ў някошанай траве вужакі шалястанне
І сумнае над небам: кру-кру-кру.

Ляціце, родныя! І я б хацеў мець вашы
крыллі,
Аб чым у цяжкі час не раз душой згараў.
Мае й цяпер к палёту мары не астылі —
Я ж мушу тут адкрыць нязпаны раї!

І што б часы нам ні судзілі,
Я не пакіну родны край!

ЛЯСНІК

Вітаю, Даніла, як вестку-надзею,
Сустрэць тут цябе не чакаў.
Я знаў скрыпача-чарадзея,
А бачу цяпер лесніка.

І што ж гэта сталася, мілы Даніла,
Зусім ты зрабіўся стары.
А дзе ж зухаўство тваё, сіла,
Якімі ты цуды тварыў?

Без ліку найграў за жыццё ты вяселляў
І многа найграў вечарын,
Дзе маладосць віравала, кіпела
Праз ночы да самай зары.

Цяпер вас жыве толькі трос,
Бы ў казцы якоїі ці у сне,—
Ты, і ружжо драбавое,
І скрыпка твая на сцяне.

Няма тваёй жонкі і дзетак —
Замучыў іх кат-людамор,
І ты, як вандроўнік без мэты,
Па ночах імкнешся да зор.

Пустэльнікам стаўся, жывеш, як бяздомнік,
Чаму ж ты адрокся сяла?
У бор мнагадумны, таемны
Мо скрыпка цябе прывяла?

Ў вачах тваіх ціхасць цяжкая застыла...
Яшчэ, знаць, твой смутак вялік,
Бо, вусы спусціўшы, Даніла,
Ты сівай чупрынай панік.

Пакінь жа, Даніла, ўсю гэту задуму,
Хай камень ў грудзях не ляжыць.
Я знаю таксама, не думай,
Як цяжка на свеце без радасці жыць.

Вазьмі сваю скрыпку, вазьмі ты, Даніла,
Няхай загаворыць яна,
Каб сэрцу уцехі прасіла
У восені ціхай струна.

Зайграй жа пра новыя дні маладыя,
Пра наш адваёваны край,
Пра пошумы ніваў і былі лясныя
Зайграй жа, Даніла, зайграй!

ЯКУБУ КОЛАСУ

Здаецца, чуў цябе у полі
Яшчэ маленькім пастушком,
Сярод бярозаў і таполяў
У песнях ранку над лужком.

Ішоў жыццёваю дарогаї
І гэты скарб у сэрцы нёс
Сярод мапы, няпраўды многаї,
Чым так багаты быў наш лёс.

У вёсках цёмных і галодных,
Дзе панавала слота, гразь,
У бунце і жальбе народнай
Мы сустракаліся не раз.

Твае задумы над старонкай
Даўно шляхамі праляглі —
У шуме ніў, у ранках звонкіх,
У сказах роднае зямлі.

СЯБРЫ

Няспынна шум плыве з імглы
З цяжкім салёным ветрам,
Імкне да сонечнай зямлі,
У зелені адзетай.

А я задуманы сяджу,
Прад зрокам даль марская,
На хвалі светлыя гляджу,
Сваіх сяброў чакаю.

З-за небасхілу будзе знак —
Устане з хваляў кропка,
А потым мачта
На маяк
Скіруецца таропка.

Сябры прыедуць з далячынь,
У сэрцы столькі свята!
Нам ёсць пагутарыць аб чым,
У дружбе дні багаты.

Сябры — мой родны рускі брат,
Сын шчырай Украіны,
Масква, Батумі, Ленінград —
З усіх куткоў краіны.

У нас усіх адзін узлёт
Душы крылатай, шчырай
І мары смелае палёт
У роднай вольнай шыры.

Для нас не здолее нішто
Закрыць прыгожых даляў
І закаваць той дум прастор,
Які мы раскавалі.

Бо наш гартоўны экіпаж
Да повых мкне падзеяў,
Натхнення поўны кожны з нас
Ад ленінскіх ідэяў.

...Сябры мне будуць гаварыць,
Як песняй менестрэля,
Пра мора, што ўдалі шуміць,
Пра ўсё, што дзе сустрэлі.

Аб палыханні ціхіх зор
У цішыні світальнаї
І што казаў марскі прастор
Ў магутным калыханні.

Пра спеў, з якім у свет плылі
Пад сцягам славы, дружбы
Сыны суровае зямлі —
Савецкія Калумбы.

...У думках пройдзем па зямлі
Вялікай, прамяністай,
Дзе штурмы слаўныя прайшлі
Пад сцягам камуністаў.

Мы ўсіх адважных сабярэм,
Сыноў сям'і крылатаї,
І паплывём над спеў сірэн
Шляхамі арганаўтаў.

ЛЕНІНГРАДУ

Здаецца мне, што помню ўсё,—
Цябе, вялікі Ленінград,
Дзе повы час для ўсіх прыйшоў
Пад сцягам збройных барыкад.

Я там не быў, а помню ўсё,
Бо нёс у сэрцы з барацьбоїї
Той жэст, што ўсім навек прасцёр
Вялікі Ленін над табой.

Хоць Беларусь, мая зямля,
Была калісьці сіратой,—
Яна ў гісторыю прыйшла
Народнай ленінскай ступой.

У днi баёў, у днi трывог,
На акрываўленых шляхах
У днi грымучых перамог
Нам Ленінграда веяў сцяг.

Блакада... сцюжа і пажар —
Ўсёй лютай эпасі шлях...
Нам не забыць тваіх ахвяр
Навек, бяссмертная зямля!

У ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЙ КРЭПАСЦІ

Казематы,
Адзіночкі —
Адна за другой,
Адна за другой...
А ў іх —
Заржаўленыя краты,
Заржаўленыя ложкі
І успамін
Аб звоне ланцугоў.

Цяпер
Тут пуста ў змроку...
І толькі сонца
За акном
Трапечацца ў лістах,—
Ведаю,

Да болю пазнаю
Ў тым клёне і бярозцы
Дрыжанне сэрца чалавечага ў ціскách.

І часам
Вось здаецца,
Што нехта ў глушыні
Ў задуме ходзіць за дзвярыма,
Што нехта сэрцам
Марыць-сніць,
Пахілены над думамі сваімі.

Іду. За мною калідора рэха.
І пусташ
Адзінокая, як сон.
Ці думаў я,
Што дарасту да ўцехі,
Каб слухаць без знямогі,
Як рэвалюцыі набатны звон
Плыў да перамогі.

Слава тым,
Што да народа шлях прабілі
І за яго пайшлі
Да рудпікоў
Кайданных і крывавых,
Да дальніх тундраў
Царскае Сібіры,
Да цытадэлі
Польскае Варшавы!

І дума ціхая плыве,
Як водгалас жыцця
Далёка за сцяною;
Яна спяшалася гарэць
І трапятала лістам,
Калі, зняволеных турмою,
Вялі на смерць
Іх першых — дзекабрыстаў?

Ульянаў Аляксандр,
Баўман
І Горкі,
А вось яна —

Ў вянку цярпістым — Фігпер...
Ў вачах усіх гарыць
Чалавечая
Любоў і праўда,
І чую толькі,
Як недзе шум задумна ціхне.

Адыходжу,
Як быццам расстаюся
З даўнім, неражытым.
Я ведаю, не раз яшчэ
Душой сюды вярнуся,
Як рэха у глушы забытай,
З сардэчным словам: Чэсць!

ЛЯ ПОМНІКА ЛЕРМАНТАВА

Сплывае вечар цішыні
На горныя прасторы,—
Аб чым, паэт, у смутку сніш,
Аб чым душой гаворыш?

Ўпачы таполі нам з журбой
Ўсё аб табе гавораць,
Ў вянок сплялося над табой
Далёкае сузор'е.

Калі над сонмам ціхіх гор
Ўстае ў прахладзе ранак,
Ты ўвесь загледжаны ў прастор
Душой зачараванай.

Мо хочаш песеньку пачуць,
З каўказскага улуса,
Рукой прыветнаю махнуць
Да снежнага Эльбруса?

Мне так знаёмы смутак твой
У зроку распалёным,
У думках зорных харапство,
Адвагай акрылёных.

Зпявагі, здзеку ў сэрцы пож
Тых царскіх, моцных свету,—
Жыццёвы ветразь цябе нёс
Самотна, без прывету.

Плывём цяпер мы к новым дням
У шумным карагодзе
І, як бы ні прыйшлося нам,
Цябе, паэт, зпаходзім.

І колькі будзе жыць паш свет
З трывогай-барацьбою,—
Ці хто паэт, ці не паэт —
Панікне прад табою!

НЯВА

Мерна калышацца шум,
Ветраны, вольны, шырокі,—
Нехта кранае душу,
Шэпча аб печым далёкім.

Ціха туманы плывуць
Недзе ад гор і азёраў...
З ласкай глядзяць на Няву
Ціхія позіркі зораў.

Ў шпаркім імкненні ракі
Даўняя сага мне сніцца,—
Знаю — плылі рыбакі,
Беглі алені напіцца.

Ў люстры амшэлых азёр
Глянула ў квецці адвага,
І палілася да зор
Новая дзіўная сага.

Сага аб ленінскіх днях,
Што прагулі навальніцай,
Як узнікала ў агнях
Нашай свабоды крыніца.

КВЕТКА

Я слядоў сваіх прагна шукаю
Па лясістых палескіх шляхах
І цяпер вось яе сустракаю,
Кветку, знаную ў думах і снах.

Яна вырасла гожа, высока
Між пягодаў і слотаў жыцця,
І глядзіць яе зорнае вока
На палескі задумны прасцяг.

Тут чароты шумелі над ёю
І тулілі туманы ўначы,
Як бы знялі, што з гэткай красою
Можна ўсе непагоды змагчы.

Яе водбліск у тварах іграе,
У дзявочых усмешках гарыць,
Сэрца музыкай вольнай кранае,
Што над водамі ў далях дрыжыць.

Гэта вее вясна — наша госця,
Нам расшыла вянкі на грудзях,—
Дык заліся, гармонь маладосці,
Паглыбей, пашых вёслаў размах!

Я ж казаў — гэтай думы аб кветцы
На прасторах балот не згублю —
І цяпер хаджу з песняю ў сэрцы,
Запаветнае нешта люблю.

Будзе кветка гарэць на прыволлі
І раскажа, што шэпча чарот,—
Ведаў, што гадаваць у бяздоллі,
Тут, вякамі забіты народ.

Сярод пушчаў, пяскоў і балотаў
Выпіў горкую чару да дна,
Вось і выпесціў долю ў журботах —
Кветкай шчасця завецца яна.

ЗЕЛЕННЮ ШЧАСЛІВЫ

Зеленню шчаслівы,
Сонцам край ущешан.
Восенню маўклівай
Дагарае снежань.

Сонечнае мора
Лашчыць бераг ціхі,
І чутны з прастору
Хваль марскіх уздыхі.

У ліловай дымцы
Горы анямелі,
І з іх снежнай беллю
Хоча сонца зліцца.

О Каўказ, табою
Я не надзіўлюся.
Хоць нашу з сабою
Песпі Беларусі!

АБ МУДРАСЦІ І ЛЮБВІ

Заўсёды ў сэрцы у мяне адна
Жыве свая нягаснучая дума,
Яна зарой вітае ранак дня,
Яна жыве ў народнай працы, шуме.

Шчаслівы гэтай думаю наш век,
Дзе ў бляску сонца нашай новай долі
На п'едэстал узняты чалавек,
Пазбаўлены знямог і скарг няволі.

Мне сны аб ёй навеяны калісь,
Яна мне стала пуцяводнай зоркай,—
Я з гэтаї думаю іду у камунізм —
З той доляю, якую значыў Горкі.

Так мудрасць ветлая іскрыцца ў даль вякоў,
Каб атуліць зямлю і рокат акіянаў,

Ачысціць свет ад злыдняў і крукоў
І сэрцы вызваліць ад пошасці паганаі.

Мяшчанства лютае карэннем апляло
Той свет стары, затручаны у крыўдзе,—
Мяшчанства Горкі біў сваім святлом
І нас вучыў да смерці ненавідзець.

І хто з паклёпнікаў, што з пальцамі ў крыві,
Пачне, дзе б ён ні быў, атрутную гамонку,—
Я не аддам той мудрасці-любві,
За што змагаўся аж да смерці Горкі!

МАСТАК

У змрочны вечар нечая рука
Пастукала мне ціха да пакоя.
Я падышоў да дзвернага замка,
Узрушаны прыгодаю такою.

Бо хто ж, адкуль у нечаканы час
Прыйшоў маю парушыць адзіноту?
І чым мне госця позняга страчаць —
Ці дружбаю, ці, можа, неахвотай?

Госць увайшоў, пясмела, ціха стаў,
Як нейкі пілігрым, здарожаны, спакойны.
Ён капялюш, вітаючыся, зняў
І паглядзеў мне ў вочы пранікнёна.

Высокае чало і сівізна валос,
На твары — чулае, закрэплае натхненне,
І думу строгую над бровамі звяло
Ў маршчыны найвялікшае цярпенне.

З трывогаю гляджу на гэтай думы знак,
Руку працягваю з душэўпым трапятаннем:
— Я пазнаю... Я пазнаю цябе, мастак,
Сядай, мой друг, хачу тваіх прызнанняў!

Мастак прысеў і позіркам ва ўпор
Ізноў крануў душу мне пранікнёна...

— Мяне сюды прывёў,— сказаў ён,— подых зор
І бляск агнёў у горадзе замглёным.

Бо сілаї творчасці гарыць мая душа...
Схапіў бы кісць... Здаецца, без адрыву
На палатне б я думы ўваскрашаў,
Што ў свет імкнуць паводкаю шумлівай.

Ды што зраблю?.. Скажы, скажы мне, брат,
Як вызваліць накопленыя дзівы?
Мне правую руку адсек фашысцкі кат,
Каб я не маляваў прыгожасці Радзімы...

Замоўк мастак... Панікнуў галавою...
А Млечны Шлях за вокнамі — нібы рака...
І я, ахоплены трывогаю такою,
Загаварыў да сэрца мастака:

— Вялік твой боль, бо тужаць па табе,
Як ты і сам, прасторы нашых даляў;
Вялік твой боль, бо ў нашай барацьбе
Мы пішам свету новыя скрыжалі.

Павер, мастак не можа не тварыць,
Не можа кат зрабіць яго калекай,—
Мне ёсць аб чым з табой пагаварыць,
Мой друг, я веру ў сілы чалавека!..

ПУШКІНСКАЯ ВОСЕНЬ

На полі ціш. Даўно пажаты нівы,
І даль мярэжыцца асенняю імглой,
Напевы дальнія, як бомы-пералівы,
Плывуць з далін над ціхаю зямлёй.

Міжволі хочацца заслухацца ў прасторы,
Адчуць свае дзіцячыя гады,
Дзе кожны паварот дарогі мне гаворыць
Аб прайдзеным, далёкім, маладым.

Не развітацца мне з таемным шумам сосен,
Што ўдаль глядзяць з курганнай вышыні,

Дзе ліраю звініць мне пушкінская восень
І будзіць спеўныя для сэрца думы-сны.

І любасць цёплая, як хмарка ў небе чыстым,
Плыве у сэрцы з пушкінскіх карціи,—
Той спеў дзяцінства ў вечар серабрысты
Краиае «Бурею» і «Вновь я посетил...»

Здалёку чую шум знаёмы сосен,
Нясу заветнае любові плынь
Да тых бяскрайніх, светлых далячынь,
Дзе ліраю звініць мне пушкінская восень...

ХЛОПЧЫКУ

Ты званочкам звініш па дарожцы лясной,
Ціхі лес — твой чаруючы сад...
Трэба ж ведаць табе, мілы хлопчык ты мой,
Што на Волзе стаіць Валгаград.

Ты заслухаўся ў шчэбеты-спевы пташын,
Кожны лісцік табе рад і рад,—
Ўсё спявае, мой хлопчык, у мірнай цішы
Пра геройскі, пра наш Валгаград.

Ты свой кошычак, поўны грыбамі, нясеш,
Кажаш — добра умееш збіраць.
Гэта ўсё... ўсё таму так уцешна ў красе,
Бо на Волзе стаіць Валгаград.

Пойдзем, хлопчык, з табой па дарожцы ляспой
Ціхі лес — твой чаруючы сад...
Нам і восень з табою здаецца вясной,
Бо на Волзе стаіць Валгаград.

Гэтым лесам прабіўся праз вогненны шквал
Не адзін партызанскі атрад,
Як усю Беларусь суцяшала Масква,
Як баямі грымеў Валгаград.

Тады волю народаў грудзьмі адстаяў
Непахісны наш воін-салдат,
За Айчыну святую ён кроў праліваў,
Каб над светам ірдзеў Валгаград.

З АСЕННІХ МАТЫВАЎ

Іду дарожкай ціхаю,
Лясною гушчынёй,
Спакоем восень дыхае
І сцелецца за мной.

Ні рэха і ні гоману,
Таемна лес застыў,
І шэлест насцярожаны
Кладзе на дол лісты —

Дубовыя, кляновыя
Апошняе красы,
Мядзяныя, шаўковыя
Ляцяць на верасы.

Бярозанькі задумныя
Льюць залатыя сны,
Яліны ціха-хмурныя
Замерлі ў цішыні...

О восень, восень любая,
Ў тваіх лясах, палях
Табою прыгалублена
Ўся нашая зямля.

З табой дарожкі сходжаны
Ў задуманую даль,
Лятункам упрыгожаны,
Будзілі ў сэрцы жаль.

Вялі у свет за долю,
За промнямі красы,
Каб клаліся мядоваю
Расой на верасы.

НЕ ЗАБЫТЫ ПЕСНІ...

Не забыты песні, шаблі і гарматы,
Сечы Запарожскай храбры ў бітвах стан,
Буйны стэп арліны, бітвамі багаты,
Украіны-нэнькі слаўны сын Багдан.

Бралі люд татары, аркапамі рвалі,
Чарнабровых сотні гналі у палон
І султанскім туркам гуртам прадавалі
На няволю, здзекі, на павольны скон.

Шляхта Вішнявецкіх і паноў Патоцкіх
Ўшчэнт паліла сёлы імем караля,
І крывёй сплывалі ночкі і дзянёчкі,
У пажарах, стогнах плакала зямля.

Рэха баявое, рэха, як быліны,
Далятае лірнай думкай кабзара,—
Вось ідзе ў паходы гетман Украіны,
Каб народу волі бліснула зара.

Эх, ляцела віхрам конніца Багдана,
Клаўся стэп пад ногі буйнаю травой,—
Разбівала хана, разбівала пана
І навек злілася з братняю Масквой!

МАЯК

Ты, партыя, для ўсіх маяк,
Высокі, горды і агністы,
Яго не засланіць ніяк
Шалёным штормам, дням імглістым,
Ні бурам восені імжыстай,
Ні хмарам — чорным груганам,
Бо ты — маяк, ты свеціш нам!

Ты асвятліла даль вякоў,
Ты азарыла шыр зямную —
Ты там, дзе шолах каласоў,

Дзе плынь жыцця заўжды віруе,
Дзе ў звоне молата гартуем
Свабоду, шчасце, дружбу, мір.
Ты, партыя,— наш правадыр!

Працоўны свет заўсёды рад
Напіцца з ленінскай крыніцы:
Дзе Ленінград, дзе Валгаград,
Дзе светлы шум Масквы-сталіцы —
Святло вялікае бруіцца
І палымнее над зямлёй
Зямной нязгаснаю красой.

ДАРОЖКА

Памяці Якуба Коласа

Адплывалі ціха хвалі,
Адплывалі
І вячэрнюю задуму
Навявалі.

Грэў агонь душу ласкава
На ўзбярэжжы,
І гукала яго Нарач
У бязмежжы.

Прыплывалі, адплывалі
Шэпты-ўсплёскі,
Слухаў ён, як засыпалі
Ціха вёскі.

Думка думку наганяла —
Ўсё пра тое,
Дзе пасеяна насенне
Залатое

І якія яно ў сэрцах
Дало ўсходы,
Які колас вырас людзям
Для свабоды.
. . . . . .

Ён сядзеў ля хваль бязмежных,
Хваль прарочых,
Вечар думай прыгаруньваў
Яму вочы.

І ад сэрца ўдаль шлыло
Залатаструнне
Пра ласкавую зямельку
Прыгажуню.

А ўжо месяц, крадучыся
У сутонні,
Пракладаў яму дарожку
У бяздонне.

І прыйшла яна — хвіліна,
Доля тая,—
Павяла яго дарожка
Залатая...

БОМЫ

Яны ішлі дарогаю знаёмай
З лазовымі кашамі у руках
І за сабой губілі рапкавыя бомы
Па сцежках, каляінах, па кустах.

Там, дзе над Нараччу пры беразе крыніцы
Гараць у полымі наплыўшае зары,
Ўмываліся пяшчотна маладзіцы,
Пры цішы не хацелі гаварыць.

І зноў дарожкі росна-пескавыя
Іх павялі да баравых гадоў,
І зазвінелі бомы залатыя,
Як нашых матак даўніх маладосць.

Іх бор вітаў, прымаў у свае сховы —
І ціш сасновая, і неба, і гады —
Знаёмы, вечна таямніча-новы
Бор песенны, бор вечна малады.

ДЗІВАСІЛ

Ёсць расліна дзіўная ў народзе,
Яна ходзіць казкаю па ўсіх,
Мо калісьці пры цяжкой пагодзе
Так празвалі людзі — «дзівасіл».

Мы сядзім ля плота. Бабка з намі —
Усё вядзе свой даўні, дзіўны сказ,
Як жылося цяжка пад панамі,
Як пабіты сын быў — Апанас.

«А паны за тое збілі грудзі,
Бо аддаў народу столькі сіл...
Што я думала і жыць не будзе,
Аж знайшлі ратунак... Дзівасіл...

Ён падняў на ногі майго сына...»
Бабка кажа рознае пасля,
Як раслінку гэтую так дзіўна
Напаіла сокамі зямля.

А ён вось за плотам жоўтым квеццем
Усё ківае нам над галавой
І не ведае, што ўсім на свеце
Раздае нектар чароўны свой.

«Калі вам на сэрцы цяжка стане,
Адбярэ вам немач рэшту сіл,
Не сумуйце, дзеткі...— Бабка ўстала.—
Дам вам на дарогу дзівасіл».

ВЕРАСЫ

То не кветкі на бэзе нам шчасцем зардзелі —
Ў парачанскіх лясах верасы расквітнелі.

Дыванамі паслаліся ціхімі днямі,
Паплылі, прытаіліся ціхімі снамі

Па шырокіх лагах і утульных паляпах,
Пры дарогах-шляхах і па ўзгорках-курганах.

Так у цішы плывуць і задумаї ласкаваї
За сабою вядуць гэты бор велічавы.

І як толькі калі пачынаецца золак,
Верасы напаўняюцца шэптамі пчолак,

Верасы аддаюць меданосныя сокі —
Свой апошні для лета, свой дар сіпявокі.

Бо не льецца ужо птушак спеў галасісты,
Не шуміць ужо сонечны ранак расісты.

Верасы, верасы... Яны нешта хаваюць,
Верасы па-асенняму ціха ўздыхаюць...

То не кветкі на бэзе нам шчасцем зардзелі —
Ў нарачанскіх лясах верасы расквітнелі.

ТАК СКАЗАЎ КАПІТАН...

— Нёман цячэ праз рэспублікі дзве,—
Так мне сказаў капітан парахода,—
Ніжняя доля належыць Літве,
Верх беларускаму служыць народу.

На параходзе відны два сцягі,—
Чырвань з зялёным — то сцяг беларускі,
Ў тых жа колерах таксама другі,
Хоць і падзелены белаю стужкай.

Розніца ў колерах трошачкі ёсць —
Гэта не шкодзіць для дружбы вясёлай,
Наша на сцягах гарыць маладосць,
Ўсіх нас вянчае на іх серп і молат.

Вось, як імчымся да Гродна уверх —
Сцягам літоўскім уквечваем Нёман,
А як да Каўпаса ўніз паплывем —
Сцяг беларускі для ўсіх там знаёмы.

Быццам у госці ўзаемпа штодня
Мы прыязджаем, збіраем прыветы,—
Знаць, немагчыма сябровак разняць,
Раз яны шчасцем аднака сагрэты.

БЕЛЫ КОМІН

Белы комін з-за гары
Дымам кучаравіцца,
Ў ранніх сполахах зары
Цішыня купаецца.

Рыбы ўсплёск, і ціша зноў
Баравая, чыстая,
Свеціць росамі на дно
Ціша брыльянцістая.

Комін з-за гары глядзіць,
Дымам кучаравіцца,—
Завядзі нас, завядзі,
Залатая раніца,

Па сцяжынцы, што пайшла,
Павілася стромаю,
Да сяброўскага цяпла
Пад страхой-саломаю.

Там стаіць ужо яна
На парозе дзедаўскім,
Поўна радасці, вясна,
Нашы крокі зведаўшы.

Белы комін з-за гары
Дымам кучаравіцца,
Ў сонцы-полымі гарыць
Нёманская раніца.

ХВАЛІ ЖЫТНІЯ...

Хвалі жытніе над Нёманам,
Там, на бераэе, высока,
Залацістыя, знаёмыя,
Пад блакітам вабяць вока.

Каласамі пахіляюцца
Над зялёнымі вірамі,
З намі позіркам вітаюцца
І плывуць, здаецца, з намі.

Ты махаеш белай ручкаю
З вышыні, уся ў праменнях,
Быццам лётнаю галубкаю
Шлеш сваё нам захапленне.

Я вяду душою гутарку
Пра наднёманскія дзівы...
Каб дастаў тваю я ручаньку,
Як жа быў бы я шчаслівы!

ПА ДНЯПРЫ

Мы імчымся па Дняпры,
Хвалі ўслед за намі...
Мо зрабілі б дзе прыпын
Разам з берагамі?

Бо яны назад бягуць,
Уцякаюць быццам,—
Не паспею, не змагу
Ніяк надзівіцца

На узгоркі ў ветраках,
На крыніцу з кладкай,
Як хаваюцца ў садках
Сопечныя хаткі,

Як слапечнікі плывуць
Жоўтымі радамі,

Кожны хіліць галаву,
Расстаецца з намі.

А за імі ў сонцы ўся
Стаіць маладзіца —
Украінская краса,—
Дайце ж надзівіцца!

Тут сказаў мне друг-сабрат
Вольнай Украіны:
«Хочаш краскі ўсе пабраць
За адну хвіліну?

Яшчэ хопіць, пачакай,
Хоць галоўку кружыць.
А Ўкраіна ўся така́,
Дарагі мой дружа!»

УКРАІНЕ

(Абразкі-фрагменты)

I

Ў чыстым небе — месяц
З усмешкай жартаўлівай,
А ля плятнёвых весніц
Юнацкі смех гуллівы

Баіцца шэпты ночы
Спалохаць пад таполяй,
Хоць сэрца... сэрца хоча
Бяскрайняга раздолля.

II

Чумацкі шлях.... Дарогі...
І стэп да небасхілаў...
Ідзе сляпец убогі
Між курганоў-магілаў.

За кожным сваім крокам
Сумуе ў струнах шчыра,
І стогне Днепр шырокі
Шаўчэнкаўскаю лірай.

III

Галопы... І трывогі...
Сцягі на ветры сінім,
Крывавыя разлогі
У стэпе белым, зімнім.

Ігралі грозна сурмы,
Складаліся быліны...
На сход склікалі шумны
Працоўных Украіны.

IV

На шлях народнай буры
Ішлі на бой Астапы,—
Дзянікіны, пятлюры
Падмазвалі кульцяпы.

Нястрымнаю лавінай
Імчалі коні ў пене —
За волю Украіны
Павёў вялікі Ленін!

V

Прайшлі баі, трывогі...
Ўжо гоман плыў вясёлы,
Зарою перамогі
Яснелі далі, сёлы.

Гудкі гудзелі спеўна
Па гарадах Данбаса
Прысягаю на вернасць
Для будучыні шчаснай.

VI

Квітнее праца ў славе
Для міру і для шчасця,

Каб з доляю крывавай
Не знацца нам, не знацца.

А толькі ў дружбе вечнай
Быць сілаю адзінай...
Прымі паклон сардэчны,
Сястрыца Украіна!

СОНЦА

Сонца ўзышло. Пералівамі грае,
Мірыядамі іскраў у росах заззяла,
І збудзіла гудкі над азораным краем,
І радасць палям на праменнях паслала.

Кожны ў працы герой, кожны з сэрцам агністым
Будзе шчасце каваць на штодзень, на вякі,
Бо тут сонца знайшло сваю мірную прыстань,
Яно іскрамі пырскае з кожнай рукі.

Няхай ведаюць — чуюць у свеце пачвары,
Як зямля харашыцца пад нашай пагой,—
Гэта нашыя радасці, нашыя мары,
Гэта сонца радзімы маёй дарагой!

ЛАТЫШСКІЯ СТРАЛКІ

Латышскія стралкі стаялі на пастах,
Закамянелыя, як з мармуру скульптуры,—
Па ўсёй Расіі люта палымнелі буры
І заравам у небе калыхалі сцяг.

Той слаўны эшалон... ён непрыкметна стаў
Між эшалонаў іншых, шэра-бурых,
З вінтоўкамі на тамбурах пашурых
Латышскія стралкі застылі на пастах.

Япы учора йшлі ў калонах штурмавых
Супроць Юдзеніча ў пястрымным наступленні,

І кожны з іх — нязломны, баявы —
Сягоння стаў на варце ў захапленні,

Што будзе жыць народа рулявы...—
Ў тым поездзе ў Маскву спяшаўся Ленін...

ДВАЦЦАЦЬ АДЗІН

(У музеі Леніна ў Празе чэшскай)

Сталы і крэслы без змены стаяць,
Быццам кажуць, што людзі выйшлі,
Што вернуцца зараз, каб зноў распачаць
Каванне марксісцкай мыслі.

Ў Расіі рэакцыя, чорная ноч,
Ліквідатары кажуць: «Даволі!»
А тут у дыскусіі кожны ахвоч
Слухаць ленінскай волі.

І там, дзе столік упоперак стаў
Для канферэнцыі цэнтра ідэйнага,
За ім я ўбачыў, адразу пазнаў
Жывога, простага Леніна.

Ён пацірае сакратаўскі лоб,
У будучыню глядзіць...
Іх там у Празе ў пакоі было
З Леніным — дваццаць адзін.

Мы пахіляем галовы ў цішы
Над форумам спраў нятленных
І адносім з сабою ў нашай душы
Вобраз жывога Леніна.

АБ ВЯСНЕ

За доўгаї зімой, знаю, прыйдзе вясна,
Яе я чакаю пачатку,
Каб пяпулася звонкая ў сэрцы струна,
Расказала усім сваю казку.

Расказала аб тым, што жыццё недарма
Нам далося на сцежках цярністых
І што лепшае долі на свеце няма,
Як сэрцам адкрытым і чыстым

Блакітныя шчырыя далі абняць
Ды глянуць у вочы з усмешкай
Той, што табе не забыла сказаць
Запаветнае, цёплае нешта,

Што ўчора было і сягоння жыве,
І вабіць, і кліча ў прасторы,
І сказам жыцця за табою плыве
У радасці светлай і ў горы.

Вітаю заўсёды задуму смугі
На родных палях, над лясамі,
У ёй пазнаю родны твар дарагі
Зямлі, што шуміць каласамі.

Яна маю й зараз калыша любоў
І напамінае заўсёды
Пра тое, як з песняю рваліся ў бой
За вясну залатую народы.

ЗАЛП «АЎРОРЫ»

Займалася Кастрычніка світанне,
Чырвопай паласой дрыжала па Няве,
І чула цішыня, як пад зарой плыве
«Аўрора»... затаіўшы грозпае дыханне.

І свет стары прыціх, бы чуючы канапне...
Вось зараз загрыміць, маланкай ажыве

Прастор над хмарамі, сігналам даль парве,
Узрушыць вуліцы і плошчы хваляваннем.

Пароль рабочым і салдатам дадзеп...
Буржуазія стане на калепі —
Палкі ўжо рушылі ў туманным Петраградзе,
А побач ходзяць, тулячыся, цені...

І грымнуў залп... Агністай праўдзе
Руку прасцёр натхнёпы Ленін...

НА МАГІЛЕ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Ласкава кіпарыс шапоча над табою,
Цудоўны наш паэт, згарэўшы без пары,
Дзе сонечны блакіт над Ялтаю гарыць,
А мора ўсё клякоча хвалямі прыбою.

Усё жыве, паэт, нягаснучай красою,
Як тыя бомы там, у песенным бары,
Ў старонцы той, дзе ты пачаў тварыць
Яшчэ бяздольнаю часінаю цяжкою.

Цяпер у нас растуць шчасліўцы будавання —
З іх кожны глыбу дзён душой сваёй кране
Без жалю, без сірочага стагнання,—

І не адзін паэт у нашай старане
Па-над табою схіліцца ў пашане
І шчыра праспявае аб вясне...

ВЯЧЭРНІЯ ДАЛІ

Памяці Веры Харужай

Вячэрнія далі вялі за сабой
Вячэрняю, шэрай задумай,
Нямой пуцявінай, знаёмай журбой,
Сірочаю казкаю сумнай.

Сярод камяністых палёў праляглі
Любімыя сэрцу дарожкі,
Па долах да ціхай стаптанай зямлі
Прыпалі дрымучыя вёскі.

Туды ты ляцела з гарачай душой
І сыпала кветкі уцехі,
І гул захаплення з табою ішоў —
Цвілі саламяныя стрэхі.

Быў сэрцам адданы народны гушчар,
Ён знаў залатыя праменні —
Цану непадкупных, крывавых ахвяр
І гарт запаветных імкненняў.

Ён ведаў і ведае, чым ты была
Для долі кайданнай, цямрычнай,—
Ты ўсё для народа нясла, аддала,
І смерцю сваёй гераічнай

Ты памяць пакінула ў сэрцах жывых,
Святую пакінула памяць,
І ведай — у будніях і днях баявых
Наш край нашай славы не сплямiць,

І там над шляхамі, дзе шум баравы
Пра штурмы і смерці гаворыць,
Не згасне шырокі прастор агнявы,
Што выткалі ціхія зоры...

ВОЗЕРА СВІЦЯЗЬ

Баюся гаварыць я аб тваёй красе...
Рыбак шануе гэтак рыбную хвілінку,
Не спудзіць вецер гэтак яблынькі галінку,
Ляснyю рань у ціхай сопечнай расе.

Знаёмай казкаю ты зноў расцеш,
Вандроўнік я, не ведаю спачынку.
Няхай жа мне прытульную часінку
Тваё лясное лона прынясе.

Хоць і не прыйдзе тая, што ўцякла ад пана
Некалі з прыгону — «дзеўка ад кудзелі»,—
Кінулася ў хвалі раша на Івана...

...Ў топях срэбны месяц. Стыне лесу веліч.
Нехта ўсё ўздыхае цяжка, несціхана...
Можа ён, Міцкевіч?..

ЗЯЗЮЛЯ

Кукуеш ты, здаецца, нам адвеку,
Крадком лятаючы ў задумлівых лясах,
Вясёлкаваю ранню чалавеку
У цішыні звініць твая краса.

І харашэе дом, і вуліца, і сад,
І ціхія дымы, што цягнуцца пад неба,
І кожны ўпотай певымоўна рад
Жыццю свайму, і хараству, і хлебу...

У чым жа твой сакрэт, лайдачніца, скажы?
Ты ўсіх чаруеш радасцю сустрэчнай,
Каб чалавек у струджанай душы
Пахарашэў, гадаючы пра вечнасць.

Ці ж для таго па гнёздах па чужых
Кідаеш дзетак часта ў небяспечнасць?

КАЛУМБЫ

«Зямля! Зямля!» — няшчасныя гукнулі,
І тут жа шчасце абняло усіх,
Ужо ніхто у хваляў не прасіў
Хоць трошкі літасці, каб іх не праглынулі...

І да зямлі прысталі, аб якой не чулі,—
Да новае, нязнанае красы.
Гасціння кожны ў шчасці закусіў
Пры тым агні, дзе ноччу не заснулі.

Вось так і вы, што першыя ў Сусвет
Паплывяце бязмежным зорным шляхам
Да неспазнаных сонечных планет...

І там, рулюючы без страху,
Вы першыя Зямлі прывет
Перадасце мо людзям, а мо птахам...

ЗАПАВЕТ МАЛАДОСЦІ

Я помню сцежкі вернай маладосці,
Яны ішлі з далін да стромых гор,
Туды высока — да арлоў у госці,—
І клікалі ў нязведаны прастор.

Па сцежках крокам мералі ва ўпор
Вышэй, вышэй, што аж трашчалі косці,—
Так мецілі да сонца, і да зор,
І да арлінай гордай высакосці,

Каб дасягнуць сваіх крыштальных мэт,
Дыхнуць надакіянскімі вятрамі
І спалучыць у сэрцы цэлы свет
З будучымі вернымі сябрамі...

Я помню тої юнацкі запавет —
Імкнуцца ўвысь, каб стаць самім арламі!

СІРЭНЫ

Латвія... Шчаслівы я ў тваёй гасціне,
Стаю на беразе марскім,
Дзе небасхіл бязмежны, сіні
І тоне сонца круг у ім.

Блакітнасць вод паволі стыне,
Каб даць пачуць цудоўны гімн —
Звон галасоў напеўнай плыні
Пад кругам сонца залатым.

Спявае хто там? Мо сірэпы
Карагодам усплылі
У бляску серабрыстай пепы?

Успышкі-зоры навялі...
Так па краіне шляхам спеўным
Латышкі песню пачалі...

КВЕТКІ

Латышскія кветкі... І ты у калёрах.
Суровая сціпласць, усмешка ў вачах,
І ціхаю шчырасцю вочы гавораць
Аб нашых мінулых і сённяшніх днях.

Кветкі паднесла, раскошныя кветкі,
І я ўжо не чую, што шумна вакол,
Бо нехта па сэрцы мне гладзіць прыветны
Пад сонцам у бляску срабрыстых вянкоў.

Цябе я душою сваёй пазнаю,
Як роўную долю сваю...

СЫН РЫБАКА

Я даўно цябе знаю, хлапчына,—
Светлы чуб над марскімі вятрамі
Мяне клікаў не раз, бедачыну,
Уцячы пад тваймі парусамі.

І на беразе Латвіі братняй
Я руку табе цісну да болю
Пад марскою апекаю хатняй,
Пад тваім паднябессем прывольным.

Ты ад рыбнай лускі абтрасіся,—
Зойдзем, возьмем, сілішча, па чары,

Каб шчаслівыя дні не звяліся,
Каб свабодныя песні ліліся! —
Човен твой пастаіць на прычале...

РАЙНІСА СТРУНЫ...

1

Райніса струны, пявучыя струны
Сказ аб нядолі народнай вялі,—
Шляхам шырокім у свет мпагадумны
Заклікі ў сэрцы людскія плылі.

2

Струны звінелі з узгоркаў латгальскіх,
З глухіх пералескаў, блакітных азёр,
Сэрцы жывілі чароўнаю казкай,
Шлях пракладалі да сонца, да зор.

3

Райніса струны, грымучыя струны
Волатным рэхам будзілі ў глушы...
Разам з Купалам тоїі голас садружны
Дораг і міл нашай братняй душы!

КОКЛЭ

Хай бушуе прыбой за сцяною,
Рыбакі ўжо вярпуліся з мора,
Дык ласкаваю, цёплаї струною
Пяхаї коклэ цяпер загавораць.

У рыбацкаї прыціпанаї хаце —
Твары добрыя ў цепях суровых,
І сямеїкаю цешыцца маці,
І не хмурацца бацькавы бровы.

Над рукою рыбачкі-нявесткі
Коклэ родныя сказы выводзяць,
І да сэрцаў чаканыя весткі
З даляў ветраных песняй прыходзяць.

І у зорным, абветраным прыску
Льюць задумныя, ціхія тоны...
А мне сняцца у хатнім зацішку
Беларускіх цымбал перазвоны...

Пад небам
Францыі

*

ЧЫРВОНАЯ КУРТКА

З адзежай вешалы стаяць
На тратуары шчыльна збоку,
Пры іх жа прадаўцы глядзяць
І запрашаюць пільным вокам.

Парыж, гуляючы, міне
Нямое гэта запрашэнне,
А я прыстаў, хоць у мяне
Так мала франкаў у кішэні.

Чагось шукаю і гляджу
На куртак розныя калёры,
Яшчэ нічога не кажу
І мне нічога не гавораць.

І вось сярод усякіх фарб
Мільгнуўся колер мне чырвоны...
Кажу я: «Мсье, вось гэта скарб!
Якіх жа варты ён мільёнаў?»

Застыла люлька ў руцэ,
Пагляд усмешкай заіскрыўся,
Свайго ён кліча: «Пэрмэтэ...
Ідзі сюды і падзівіся.

Не хоча іншага — ні ў зуб —
Яму — савецкаму турысту —
Чырвоны колер толькі люб.
Вядома, гэта... колер чысты...»

Руку працягвае ён мне
З вясёлым тварам сімпатычным,
З прызнаннем нашай старане
Пад зоркаю камуністычнай!

НЕГР У АТЭЛІ

Наш кухар кланяецца ніжка,
Кладзе далоні да ілба,
Усмешкі беласнежным бліскам
Жадае нам дабра, дабра...

Запрацаваны, ціхі, сціплы,
З любоўю нам гатоў аддаць
Свае найлепшыя малітвы —
Сваё нам сэрца паказаць.

На развітанне апрануўся
Як след: з палоскамі касцюм;
Наўкол паціху азірнуўся
І ўзяў бакал пад шчыры шум.

Ён глянуў чорнымі вачыма,
Вялікімі, як тоні Чад,
І так ён разам з намі ўсімі
Быў радасцю вялікай рад.

І насцярожана глядзела
Начная ціша праз акно,
І слухала, як пасівелы
Для нас благаславіў віно.

Ўзнімаў ён тост... Мы помніць будзем
Аб тым, што многа барацьбы...
Аб тым, што ёсць на свеце людзі,
Людзьмі ж усе павінны быць...

ВЕТЭРАН

Потам прамокла кашуля,
Кроплі сцякаюць з вусоў...
Спёка парыжскага гулу
Глушыць паток галасоў...

Ён — непакорны, суровы —
Кіркай дзяўбе тратуар,

І папахмураны бровы,
На струджаным твары загар.

Спыніцца часам на момант,
Твар рукавом абмахне
І, пастарэлы ад стомы,
Цяжка навокал зірне.

Потым бадзёра адразу
Для хараства парыжан
Кіркай пракладвае трасу
Сівы, стары ветэран.

Думкі плятуцца паволі...
Не, не сціхаюць ад бед —
Колькі ж рабочага болю
Францыя посіць ў сабе?

Дзень дагарыць. І пад вечар
Ў пейкі закінуты бар
Пойдзе, распростаўшы плечы,
Сівы, нястомны змагар.

З люлечкай там падружыўшы
Ў гомане, горачы тэм...

. . . . . .

Будуць заўзята кружыцца
Словы над «Юманітэ».

І на маршчыністым твары
Блісне кіпучы парыў —
Поступ байцоў-камунараў
Пачуецца ў бляску зары.

«Ў ногу вы, хлопцы, бадзёра!
Не забывайце ахвяр!» —
Крыкне, парэшце, з задорам
Ён — нашых дзён камунар.

ПЭР-ЛАШЭЗ

Навіснуў над сцяною
Каштанаў ціхі лес...
Як рукі, вецце ўзнятае,
Дзе мукаю нямою
Глядзіць яна — распятая —
Камуна...
Гэта — Пэр-Лашэз...

Здаецца мне, мае гады ішлі
Сюды даўно-даўно,
Дарожку ўсё тапталі і няслі
Вялікае адно,
Што ў сэрцы накіпала,
Што сілаю ўзгадованаю стала
У зараве агнёў.

Гады і віхры над мацерыкамі
Праходзяць гоманам народных барыкад,
Будуюць помнік тым, хто шчыльнымі радамі
Першыя сустрэлі куляў град

І паляглі пад кулямі патоўпам,
Як вестуны вялікае вясны,
За неба яснае і чыстае пад сонцам,
За чалавецтва залатыя сны.

І я прыйшоў з любоўю пакланіцца,
Да дзёп змагарных сэрцам прытуліцца
І ўспомніць полымя пажараў,
Калі ішлі палкі парыжскіх камунараў...

МАНМАРТР

З Манмартра ўвесь, увесь Парыж,
Ад самых ад ускраін,
Сцелецца да нашых ног...
Вядома, з гэтае гары
Некалі, ужо даўно,

Пушкі камунараў
Давалі ядрам свой разбег,
І ад тых удараў
Каваўся так у барацьбе
Нязнаны, новы свет...

І я напружана гляджу
На шэрыя абрысы,
Каб які хоць трохі след
Знайсці тых даўніх рысаў...

Якое ж бачым утрапенне —
Няшчасця прыгавор —
Мастацкае зіхценне —
На гэтай вось гары сабор
Святога, кажуць, сэрца —
Каму на аглупенне
Стаіць і хоць бы што?
Відаць, што ўсім бязверцам
Каранне надышло.

А поччу на Манмартры
Побач ля сабора —
Хто чаго тут варты?
Шумяць катлом вар'яцкім
Садома і Гамора.
Балаганчыкі,
Папойкі,
Жабракі
І вандроўныя мастакі.

Багема тут, багема там —
Напісана плакатам,
Што можа нават і Хрыста
Прыцягнуць без шатаў —
Ў вузкіх штанах, пад гальштукам,
З бародкай па-мастацку,
Святое сэрца наступам
Абліюць па-брацку.
Будзе падыгрываць скрыпач,
Вандруючы, вядома,
І Хрыстос не пойдзе спаць
Да святога дома.

Задрэмле смутак на гары
Ў свiталыным змроку,
I да вячэрняе зары
Багема стуліць вока...

«ЮМАНІТЭ»

За акном шуміць Парыж...
Мы на паверсе трэцім —
Прыйшлі сюды пагаварыць,
«Юманітэ» прывеціць.

У шэрай блузе гаспадар —
Рэдактар ён галоўны —
Нам кожнаму руку падаў,
Ды з позіркам вымоўным,

Каб разумелі плыні знак,
Заўсёды салідарнай,
Калі сціскаецца кулак
У поступе ўладарным.

Упэўнена ў вачах гарыць
Работніцкая вера,
Якою дыхае Парыж
Ад часаў Рабесп'ера.

Дыханне полымем расло,
Як штурмавалі неба,
Хоць мараю для ўсіх было —
Зямны кавалак хлеба.

I вось цяпер трывожны тэкст
Гатоўнасці суровай
Гудзе ў радках «Юманітэ»
Набатным, гордым словам.

Аб гэтым нам сказаць быў рад,
Ды з позіркам вымоўным,
Французскі наш таварыш, брат —
Рэдактар ён галоўны.

ПРЫКМЕТЫ

Дарожкаю самотнай
Пляцецца быль старая,
Задумна і журботна
Па восені ўздыхае.

Нікога на прасторах —
Заціхлі ўсе травінкі,
І толькі ціхі шорах
Атульвае былінкі.

Паміж скарчэлых вішань —
Вось цэркаўка крывая,
Замшэлая ў зацішшы,
Задума — быль старая.

Знаёмыя прыкметы...
Вятроў былых дарогі,
Дзе, чырванню адзеты,
Віхрыліся трывогі.

Сагнутая знямогай,
Бабулечка старая
Тут жалілася богу,
Што долечка ліхая.

І хочацца спыніцца
З маўкліваю трывогай
І нізка пакланіцца
Тым ветрам на дарогах.

ЛІСТ СА ШВЕЙЦАРЫІ

Цёмна ў шэрай хаце.
Нудна... Адзінота
Нема затаілася
па сырых кутках.
Села з доляй-прасніцай,
з вечнаю турботай

Маці пасівелая думы-мары ткаць.
Плынь цячэ кудзельная
той цярплівай ніткі,
Што спавіла горкае,
сумнае жыццё
Зрэбнінай калючай
ад самой калыскі,
Пра жыццё гаворыць ёй,
пра незабыццё.
Тое ж не забудзецца,
што ў душы сплялося
Ва ўсе дні і ночанькі
ад жахлівых дум,
Што квітнела ў сэрцы,
але не збылося,
І цяпер у мроях,
быццам светлы сум...
Родны сын не піша,
кінуты за краты,
Не пазбыць трывогі і тугі павек...
Белы цар лютуе,
і катуюць каты,—
За свабоду ў лёхах
гіне чалавек.
Пры кудзелі здрэмлецца
стомленай душою,
Галава пахіліцца
у знябытым сне,
І акенцы жураццa
пад сівой страхою —
Прыгалубіць матчыны
сны задумны снег...
Ціхасць адзінокая
адзінокай хаткі
Спавіла над маткаю
ціхі рой надзей,
Недарэмна коцік
мые свае лапкі —
Можа, шлях завеяны
госця прывядзе...
Недзе пешта рыпнула,
маці ўраз ачнулася...
«Божа, што за сон такі —
аж душа дрыжыць...

Хтось дзвярыма стукнуў —
можа, так пачулася?»
Гляпула —
на століку
белы ліст ляжыць.
І пісьмо чыталі
той гадзінай шараю,
І пазнала матка:
сын уцёк з турмы,
На канверце значыцца
нейкая Швейцарыя,
І ў пісьме пра Леніна
прачыталі мы.

ЗОРНАЯ БЫЛЬ

Зорнае неба над Волгай —
Зорная быль у глушы
З болем, імклівай трывогай
Грэлася, спела ў душы.

Зорнае неба над Волгай,
Рускіх прастораў туга
Ў цемры пустыннай дарогаї
Слалася ўдаль, як смуга.

...Стаў на абрыве мурожным
З шэрым плашчом па плячы
Рускай зямлі падарожны
З воклічам: «Русь, не маўчы!»

Пільна ўслухаліся зоркі
Ў стогны вялікай ракі...
Слухай, затужаны Горкі,—
Гэта пяюць бурлакі...

Мары над зор карагоды
Хай расквітаюць, як мак,
Споўняцца — з песняй свабоды
Рухне народаў турма!
. . . . . .

Зорнае неба над Волгай...
Зорная быль у глушы
Стала крылатаю, вольнай —
Гімнам народнай душы!

У ЦІХІМ ГІМНЕ

Лес шуміць задумна, адзінока,
Нібы згадкай ціхаю пяе,
І глядзіць наўкол людское вока,
Нешта роднае балюча пазнае.

Раптам людзі чуюць гром далёкі,
Гром гарматны і ў нябёсах гул,—
Бачаць людзі: полымем высокім
Хаткі ўспыхнулі ў цямрычную імглу.

Ў хатках тых бацькі застольным святам
Абдымалі дзетак чараду,
Дзеткі шчабяталі: «Мама, тата,
Сёння школу нашу павядуць
Ў лес зялёны,
дзе так многа птушак,
Дзе растуць прыгожыя грыбы...»
Дзеткі йшлі,
каб радасці паслухаць
У лясных праменістых глыбінь.

Помніць кожны —
паспявала жыта,
Сонцам расцвітаў калгасны шлях,
Цешыліся ўсе,
што ўсё здабыта
Залатою дружбай на палях...

Вось так было, паляна міжляспая,
Вось так, Хатынь —
сірочыя званкі,—
Твая трывога болем далятае,
Яна ў народы пойдзе праз вякі...

А людзі йдуць,
шібыта ў ціхім гімне,
І пілігрымную зямельку у руках
Нясе з іх кожны —
дар святы, радзімны
Кладзецца на магільны прах.

ЧАС

Час! Не прыходзь да мяне з лёгкім
поступам,
Абяцанкаю птушкі ў бары,
Бо на свеце жыве ціхім россыпам
Тое шчасце, што ўмее дарыць
Скарб надзей, веры скарб і магутную
Недзе ў пошуме людскім красу,
Што змывае ў паходзе пакутную
Пражыткаў людскіх паласу.

Часу крок — цяжкі крок і няўрымслівы
Ад малюткіх да волатных сіл.
Ён узброен сусветнымі мыслямі —
Шчасцем-дарывам, хто б ні прасіў.

Заклік часу мы чуем нястомлены —
Кожны дзень нам ісці і хацець —
Разбіваць ланцугі паняволеных
І ў Сусвеце зарой харашэць.

ЁН І САМАЛЁТ

Прасторы неба... Неабсяжнасць...
Ён і самалёт ляцяць...
Паведаць хочуць свету радасць
І толькі радасці страчаць.

Свайй адзінае планеты
Занесці хочуць спеўны шум
У неабсяжныя сусветы,
У далячынь, у вечнасць дум.

ПОШУМЫ

Ціха калышуцца нівы палоскі —
Гэта размовы маёй роднай вёскі.
Гутараць свету аб сонцы-світанні
І заціхаюць у зорным змярканні.

Дыхаюць людзям цяплом асалоды,
Дарам здабытай жыццёвай свабоды,
Ёю вясёлыя цешацца дзеткі
І расцвітаюць, як шчасныя кветкі.

Ёю і я маладзею душою —
Дума жыве нераможнай красою
Плужнай зямлі і юпацтва паходняй —
Сілаю песеннай, сілай народнай.

НЕСПАКОЙ

Іду нястрыманы, ахвотны
Дарожкай снежнаю, лясной,
Такі, здаецца, бестурботны,
Як тоій далёкаю вясной,
Што некалі давала крыллі
Для мар, жаданняў залатых,
Што і цяпер гады не скрылі
Маіх узлётаў маладых.
Здаецца, іх пільнуе радасць
Жаданняў родных... Іх прастор
Даюць загад — ісці, не падаць,
Ўздымаць імкненні аж да зор.

Такі паказ свабодных ніваў
Ад едкай пошасці акоў —
Такі праслаўлены, шчаслівы
Наш пераможны песпакой.

КЛІЧ СВАБОДНАЙ ЗЯМЛІ

Новы час завітаў на прасторы краіны,
Каб дарогаю быць для вялікіх падзей,
Каб у ім кожны крок, подых кожнай часіны
Быў даспелай красою ў задумах людзей.

Мы у працы мацуем сваю перамогу,
Каб вялікіх здзяйсненняў ярчэла зара.
Для узлёту душы нам адкрыты дарогі,
Для вялікай работы настала пара.

Не стамляйся ў паходзе, маё пакаленне,
Хай натхняе цябе кліч свабоднай зямлі,
Кліч сусветны і вечны, што выгукнуў Ленін,
Каб у цемры й няволі нідзе не жылі!

ПАЭМА

СЛОВА ПРА МІНСК

50-годдзю
Савецкай Беларусі
прысвячаю

I

Даўпасць ціхая сэрца варушыць
І вядзе, як да вешчых былін...
Бачу — едзе абоз беларусаў
У свой даўні застоены Мінск.

Мне і вокам ніяк не абмераць
Гэты дзіўны сяляпскі абоз,
Што вось цягнецца ў кураве шэрым
Па шляху між зялёных бяроз.

Саматканыя шэрыя світкі,
Хто ў лапцях,
а хто ў ботах, хто — так,
Кожны конік такі невялічкі
Цягне воз, як цярплівы бядак.

Хто з глухое, забытае пушчы,
Хто з далёкіх жвіровых палёў,—
Везлі дзежкі, цабры і кадушкі,
Везлі выраб сваіх ганчароў.

Абады ясянёвыя, колы
Гурбай, скруткамі цяжка плылі —
Вытвар працы майстэрскай, мазольнай
У лясах беларускай зямлі.

І што хатняя рупнасць прыдбала
Ў закарэлым бядпячым кутку,—
Везлі трохі духмянага сала
З пахам кмену і часпаку.

Сустракалася часам і масла —
Мо паймепш... Бо ад нашых кароў
Мо підзе пе было больш няшчасных,
Хоць і шмат было лесу, лугоў.

А у кошыках круглых, лазовых
Можна яйкі было прыкмячаць...
Гэта ўсё той ашчадак вясковы,
Што так пільна збіраўся на час.

Не шукайце на продаж пшаніцы,
Не шукайце вы тут табупоў —
Ехаў плён саматужнай зямліцы,
Абяссіленай з ласкі паноў.

І яшчэ не ад кожнае хаты
Было трохі жывёлы на торг —
Дзесь вішчалі ў мяшку парасяты,
Дзесь карова рыкала ў прастор.

Бульба ехала — наша скарбніца,
Жыта — першы з-пад цэпа ўмалот,
Былі яблыкі, грушы, бруспіцы,
Сустракаўся часамі і мёд.

Так хадою скрыпучай, пяхуткай
Ўсё плылі і плылі ў далягляд...
І мільгалі жаночыя хусткі,
Быццам макам расквечапы шлях.

За абозам у кураве шэрым
Людзі пешшу ішлі талакой —
Хто з пілою, хто з гэблем, сякерай,
А хто так — толькі з доляй ліхой.

У шуканні надзённага хлеба
Гнала іх злыбяда кожны год...
Ўсе апрапуты ў світкі і зрэб'е,
Сваю працу пяслі на завод.

За плячыма у кожнага клунак,
А ў душы роі няясных надзей —
Дзе ж ім трапіцца ў Мінску прытулак,
Лёс няшчасны куды завядзе?

Мо прыйдзецца папасці ў гарбарню,
Ці ў дражджовы завод, ці куды,
Ці ў якую мо там сыраварню,
Ці мо сторажам дзе ад бяды.

Так ішлі, ажыўлялі размовай
У бярозах уквечаны шлях...
Эх, скажы ты нам цёплае слова,
Прытулі нас, радзіма-зямля!

* * *

Заціхаў аддалёны іх гоман...
Адышлі і знікаюць ўдалі —
Ім услед у задуме на момант
Сіратой пазіралі палі.

Са звапочкам вось тройка прамчыцца
Наўздагон за абозам паспець,
У карэце кукарда ільсніцца
І жандарскі мільгнуў партупей.

Потым зноў апусцела дарога,
Знік лавінаю шумнай народ...
Ціха зноў. Мо не будзе нікога,
Можа, скончыўся гэты паход?

Але не... Бо вось нехта паволі
Выпаўзае, брыдзе з-за гары,—
Можа, людзі адменнае долі,
Можа, з казак там багатыры?

Ўсе без шапак і вочы сляпыя,
Накрыж торбы вісяць па баках,
І паплёў валасы ім сівыя
Розны вецер на розных шляхах.

Раптам ліры жабрачае струны
Хтось крапае прывычнай рукой...

Хто ж не знаў гэты голас пануры,
Хто ж не ведаў у нас жабракоў?

Былі гэта яны — не іначай,
Доўгім, ціхім натоўпам ішлі,
Па краіне хадою бадзячай
Скаргі людскай нядолі няслі.

Спачувалі ім бедныя людзі,
Разважалі і гэтак, і так,
Што мо з іх не адзін заўтра будзе
Такі самы на свеце жабрак.

* * *

Эх, забытай была ты, старонка,
Сумны быў твой цярплівы пагляд,—
Недарма роднай песняю звонкай
Ліўся боль на квяцістых палях.

Па прыгожых лясах і палетках
Ўсё тырчалі палацы паноў,
А паны раз'язджалі ў карэтах,
Палявалі на людскую кроў.

Падпявалі у тон «дабрадзеі»,
Спраў прыгнечання вартаўнікі,
Што бяздольным няма ўжо надзеі,
Запануюць яны — кулакі.

Ці ж не мела ты скарбаў, багаццяў,
Ці ж не мела, краіна, скажы?
Хто ж зрабіў цябе краем няшчасцяў
І нядолі кляймо налажыў?

Ад сахі быў твой скарб саматужны,
Але кожны павёз селянін
Яго з верай, імклівасцю дружнай
У свой даўні застоены Мінск.

Бо глядзіш на абоз, і здаецца,
Пакідаецца гора ў палях,
І надзеяю поўняцца сэрцы
На той светлы, на заўтрашні шлях.

Раздаюцца бадзёрыя гукі,
Пераклікам плывуць на прасцяг,
І дымяцца цыгаркі і люлькі
У вусатых дзядзькоў у зубах.

Пазбыліся, здаецца, нядолі
Хоць на момант свабодны адзін,
Як пакінулі хаты і поле
І паехалі шумна у Мінск.

Кожны з тайнаю думкай-надзеяй
На удачу, на літасны лёс,
Кожны бога маліў, «дабрадзея»,
Каб ён шчасце на рынку прынёс.

Так імкліва плылі... Ужо блізка
Быў чуцён паравозны гудок...
Сустракала іх сонца пад Мінскам,
І спыняўся паволі паток.

Паязды... Гэта ім не да твару —
Земляробам сярмяжным, касцам,
Ім чыгунку ўкладаць — гэта справа
Для раскошы панам і купцам.

Пазіралі з гары урачыста
З-пад рукі на нізіну ўдалі,
Дзе ў смузе па-над Мінскам імглістым
Гулы раннія ў неба плылі.

І з трывогай святою у сэрцах
Адбіваўся няведамы гул...
Што там кожнаму зведаць прыйдзецца?
Што здабыць на жыццёвым шляху?

Так часамі ішлі й пілігрымы
З невядомых якіх далячынь
І спыняліся з тайнай любімай
Перад горадам даўніх святынь.

* * *

Горад, горад! Ты свежасцю нейкай
Патыхаеш у вочы сялян,

Ажыўляеш часовай уцехай,
Навіною для ўсіх, дзе ні глянь.

Тут не хаты, саломаю крыты,
Не збуцвелы, пахілены плот,—
Вось у цэнтры стаяць камяніцы,
І жыве тут іпачай народ.

Непазнаваю нейкаю тайпай
Гэты свет гарадскі апавіт —
Чаму ўсё так багата і спраўна?
Як здабыліся людзі на спрыт?

Вось пытанні, што думкаю цяжкай
Ўсё кладуцца усім на душу...
І стаіць селянін, як мурашка,
Акунуўшыся ў велічны шум.

І з павагай, здзіўленнем ён рады,
Хоць са страхам, няведай, а ўсё ж
Ён як быццам знайшоў Эльдарада,
Дзе купляецца шчасце за грош.

Недарма мо і быў так імклівы
У няяснай надзеі іх марш,
Што блісне, можа, доляй шчаслівай
Родны Мінск і жаданы кірмаш.

* * *

А кірмаш... Не акінуць і вокам...
Як шуміць і клякоча прыбой,
Стогалосая мова шырока
Ўсё ўбірае і тлуміць сабой.

І чаго тут няма для прыманкі —
Стужкі, пацеркі, хусткі вісяць.
І «Разлуку» іграе шарманка
Сярод віску свіней, парасят.

На шарманцы заморская птушка
Пазірае звысоку вакол,
Вабіць людцаў шарманшчык-дакука:
«Падыходзьце, хто з лёгкай рукой!

Вам заморская птушка, пабачце,
Ўсё раскажа, хоць што запытаї,
Дасць у рукі білецікі шчасця,
Разгарні, пра свой лёс прачытаї».

Падыходзяць дзяўчаты і хлопцы,
Маладзіцы, старыя ў чаргу,
Кожны шчасця даведацца хоча,—
Мо там злыдні каго сцерагуць?

Ці мо трапіць ў кішэню капейка —
Станеш раптам шчаслівы, багат,
Хлопцу трапіцца мілая дзеўка,
А к дзяўчыне навернецца сват?

Так пісьменны чытае галосна
Непісьменным на школьніцкі лад...
Эх, наіўная, цёмная вёска,
Да чаго ж ты была дажыла!

* * *

Прадалі свае скарбы сяляне...
Што ж далей? Трэ падумаць крыху,
Бо ніколі даходаў не стане,
Каб дзіравую згораць страху.

Гэтых дзірак вялікая колькасць —
На адзежы, у пупі, ў хляве,
І дзесятнікі ў вокны галосяць
Несці грошы у воласць, павет.

Расплаціцца з царом за падаткі,
Доўг па вэкслях аддаць ліхвяру,
Даць ураднікам добрыя ўзяткі,—
Што ж застанецца гаспадару?

Але як ні было там, а трэба
Штось для радасці дзецям купіць —
Трохі мінскага сітнага хлеба,
Абарапкаў узяць — не забыць.

А пасля трэба чаркаю горкай
Свае ў корчмах заліць «барышы»

І прыяцельскай п'янай гаворкай
Выліць скаргі збалелай душы.

І пайшлі так сусед і знаёмы
За карчомпы, гарэлачны стол,
Загудзелі ўсе корчмы, як звоны,—
Даў парод свайму сэрцу прастор.

Дзе гаворка, дзе песпя, дзе сварка,
Дзе абдымкі ў слязах, дзе праклён,—
Ўсіх жаданні, як клятва, над чаркай
Новых лепшых і радасных дзён.

Потым п'янай ішлі талакою
Па выбоях, каменнях-ілбах,
Ўсё шукалі для сэрца спакою,
Пазіралі чагось па баках.

Розных крамаў з таварамі столькі —
Ўсё мінаюць, ідуць напралом,
Ім патрэбны яшчэ манапольскі
З гэтым царскім двудзюбым арлом.

Падымаліся к роту бутэлькі,
Разбіваліся потым аб брук,—
Манапольныя царскія меркі
Дадавалі ім сілу і рух.

Загараліся сэрцы пажарам,
Рвалі к бунту мяшчанам на здзіў,
Аж на конях звісалі жандары —
Свіст пагаек і крык: «Разыдзісь!»

Хто пабег, хто пайшоў, а хто падаў,
Ад каменняў згінаўся жандар...
Не адзін адпукаў «Эльдарада»
У турме «за публічны скандал».

Дзесь хілілася ў полі бярозка,
Слёзы ціхія доля ліла...
Эх ты, царская цёмная вёска,
Да чаго ж ты была дажыла!



П. Пестракъ — студэнт універсітэта.

Самара, 1920 г.

КРАСНАЯ АРМИЯ ПОБЕДОНОСНО ИДЕТ НА ЗАПАД

ТРУДЯЩИЕСЯ БЕЛОСТОКСКОЙ ОБЛАСТИ!

Раздувайте пламя народной борьбы против немецких захватчиков!

Боевые действия белостокских партизан

Смерть и разорение принесли белорусскому народу немецкие оккупанты. В ответ на зверства фашистов всё шире разворачивается пламя партизанской борьбы в Белостокской области. Только за последние дни народные мстители Белостокской области

ИСТРЕБИЛИ 1331 НЕМЕЦКИХ СОЛДАТ И ОФИЦЕРОВ;
ПУСТИЛИ ПОД ОТКОС 27 ВШЕЛОНОВ ПРОТИВНИКА,
ВЗОРВАЛИ ТРИ ШОССЕЙНЫХ МОСТА,
УНИЧТОЖИЛИ 4,99 КИЛОМЕТРА ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНОГО ПОЛОТНА
УНИЧТОЖИЛИ 31,7 КИЛОМЕТРА ТЕЛЕГРАФНО-ТЕЛЕФОННОЙ СВЯЗИ
СОЖГЛИ ДВА МЕСТНЫХ НЕМЦЕВ;
СОЖГЛИ 5 ЛЕСНЫХ СКЛАДОВ,
ВЗОРВАЛИ 3 МАСЛОЗАВОДА И 1 ЛЕСОПИЛЬНЫЙ ЗАВОД

Смерть немецким оккупантам!

Растёт и ширится партизанское движение

Партизанское движение растёт и ширится в тылах гитлеровских войск. Не исключение и Белостокская область. В лесах Белостокщины белорусские русские и украинские и словацкие патриоты немецкого плена вместе ведут беспощадную борьбу против немецких захватчиков. Не дают покоя фашистам славные партизаны Белостокской области.

Так недавно партизанский отряд, где командиром товарищ В., группа под огнем немецких стервятников убито более 50 немецких солдат и офицеров.

Партизанский отряд товарища К. уничтожил около 60 немецких солдат и офицеров. В стычке с немецкими карателями в деревне [illegible] партизан из деревни Дубовка, [illegible] отряд [illegible] немецких [illegible] убито 50 немецких солдат и офицеров.

Фазиль ПЕРЕТРАК

СЛУХАЙЦЕ, ПУШЧЫ...

Пачнём мы атаруна
Пушчы наўсе тлом.
Ад вёсак не застанецца
Нічога на родной зямлі

Так на лясах непраходных
З нявечнай да ранней зары
Польмя мсціўцаў народных
Кладзе вечаў гарыць

Слухайце, пушчы, вятры,
Гукніце нам маланкі!—
Гатуй гатуй партызаны
Сцены беларускай хаты

Трубіць вораг адбоем,
Трымціць мячом, як зверр
Ноч для яго—гэта зброя,
Ноч для яго—гэта сховіш.

Крыва запэцкала сцяжы
Застыў на крыжы рукі
Гатуй помсціць сакеры
У Куніх варожай крыві

За крыў за муліны, за раны
Слухайце Зорныя ў дол...
Помсціць нашчі партызаны,
Сцены беларускай хаты.

Бацькі, маці, матары, дзеці...
Вам не забыць іх вякамі —
За іх нам пакінуты на свеце
Усе гітлераўскія да знікнення

У вогнішчах гнеўнай і магутнай
За хаты спаленыя сяру
Паўночны вецер беларускі
За сэрцам сэрц край —
Беларусь

Пры пушчы, вятры, маланкі
Гатуй гатуй мсціўцаў
Гатуй грамніць партызаны,
Сцены беларускай хаты

Вручение ордена Суворова



НА ОСВОБОЖДЕННОЙ БЕЛОРУССКОЙ ЗЕМЛЕ. Партизанский отряд, где командиром тов. Рабцев, с первых дней оккупации успешно действовал в немецком тылу. В боях за город Лепель партизаны оказали Красной Армии большую помощь.

НА СНИМКЕ: Партизанский отряд возвращается в Лепель.

ЗА ГРАНИЦЕЙ

Опустошительные последствия бомбардировок Берлина

[illegible]

Английские бомбардировщики [illegible] подвергли бомбардировке [illegible] в Берлине. В ночь на [illegible] в районе [illegible] в Гитлеровские [illegible]

Старонка газеты «Белостокская правда»,

у якой упершыню быў надрукаваны верш

«Слухайце, пушчы...».

1943 г.

* * *

У гэты час па Захар'еўскай, можа,
Ехаў сам губернатар адзін,
Ехаў царскі надзьмуты вяльможа,
Тае «знаці» дварапскае сын.

Мо патомак які Мураўёва,
Што для шыбеніц майстар слупоў,
Ці пагромца свабоднага слова —
Яры шчэдрынскі барын Глупоў?

За ім світа жандараў на конях
Капытамі выляскала ў брук,
Каспікі чырванелі, пагоны,
І спыняўся на вуліцы рух.

...Нам цяпер вось блішчаць прад вачыма
Даўніх вуліц каменні-ілбы,
І якаясь у сэрцы прычына
Хіліць думкі мае да кляцьбы.

На тых плошчах ілбастых, няўклюдпых
Загараліся волі агні —
Тут народ сваім гоманам дружным
Біўся горда за лепшыя дні.

Нараджаліся воі-трыбуны,
Аддавалі сябе за народ,
Ў дзень расправы крывавае судны
Падымаліся на эшафот.

Тут свісталі нагайкі на спінах,
І дыміла рабочая кроў,
Як расстрэламі царская сіла
Забівала не раз змагароў.

І як гляну на брук, дык часамі
Мне здаецца на момант, на міг,
Што галовамі плошчы усланы,
Чалавечымі свецяць касцьмі.

І таму зараз родзяцца топы
Ад закураных мінскіх руін —

У асфальце і плітах бетонных
Сніцца мне адбудованы Мінск.

Каб у ім наша гордае племя
Расквітала ў душы хараством —
Ідучы па бліскучай панелі,
Песняй славіла кожны свой дом.

А на даўнасці бруку хай едзе
Па Захар'еўскай вуліцы ўдаль,
Самадурныя вусы цярэбіць
Царскіх часаў сібірны ўладар.

Нешта, мусіць, яму неспакойна,
Хоць не ведае, дзе гэты стан,
Скуль плыве сіла думкі народнай
З грозным заклікам: «Брацця,
паўстань!»

* * *

Там над Свіслаччу ціхай, журботнай,
Прыхаваны у зелені дрэў,
Стаіць домік звычайны, работны,
Дзе агонь незвычайны гарэў.

Там кавалася зброя для Мінска,
Для працоўных усіх гарадоў,
Стуль агністая Леніна «Іскра»
Далятала да фабрык, палёў.

Закладалася гмаху цаглінка,
Шляху слаўнага ВКП(б),—
Гэты дом, запаветны для Мінска,
Стаў нам гордасцю у барацьбе.

...Насцярожана сочаць жандары,
Непакоіць іх вулічны рух,
Не пазбегнуць «крамольнікам»
кары —
Чуе штось губернатарскі нюх.

Знаем, знаем — былі адшукапы
Тыя веснікі новых дарог,

Губернатарам арыштаванні,
Пад канвоем пайшлі у астрог.

Але ўсіх губернатараў сіла
Гэты домік здалець не змагла —
Яго песня аковы скрышыла,
Да свабоды народ давяла.

Нават той, што расстрэламі сыпнуў
У паўстаўшы у Мінску народ,
Калі песняй свабоднаю клікнуў
Да баёў дзевяцьсот пяты год,—

Нават той не здалеў домік знішчыць —
Самадур-губернатар Курлоў,
Ў яго Пуліхаў бомбаю пырснуў —
Наш між соцень другіх змагароў.

Тут зламаўся і Гітлер-пачвара
Аб цвярдынны савецкі уцёс —
Вырас домік нанова з пажараў,
Сваю славу патомкам панёс.

І на вуліцах новага Мінска
Ўжо не б'е капытамі жандар —
Гэты домік, як першая іскра,
Як па царскіх цвярдынях удар,

Гаварыць будзе нам аб тых вехах
Шляху слаўнага ВКП(б),
Аб народных змаганнях, уцехах,
Аб вялікай народнай жальбе —

Ў час цямрычны, глухі, жывадзёрскі,
Што трывожыў, як жудасны сон,
Гарады нашы, цёмныя вёскі —
Даўні час губернатарскіх дзён!

II

Я блукаю ўспамінам па Мінску,
Юнаком сябе бачу у ім,
Помню, промень знаёмы мне бліскаў,
Пахнуў вогнішча роднага дым.

З аддалення званкі, быццам гонгі,
Даляталі у вуліцы ціш,—
Гэта дзесь мітуслівая конка
Ад вакзала у горад ляціць.

Штось забаўнае ў гэтай карціне,
Штосьці свойскае ў нашай бядзе:
Людзі цешацца — што за навіны,
Што за выдумка хітрых людзей!

Конка пнецца... Як бачу сягоння...
Мне так смешна цяпер ўспамінаць,
Як хвастамі вымахвалі коні,
Як галёкаў на іх паганяч.

Ах, забаўная ты, саматужнасць,
Як ты цешышся гэтай яздзе,
Ты не знала, што ў будучым мужнасць
Да навін не такіх прывядзе.

Што не будзе драмаць тут заціша,
Дзе тады юнаком я стаяў,
У застоепых подыхах Мінска
Лёсу знак навакол адчуваў.

Ўдаль на вуліцы ціхай, жвіровай,
Па размытым дажджамі пяску
Нехта шчыльна рукою суровай
Ўсё сляды свае клаў на вяку.

І адкуль цішыня ў свежым ранку?
Нават пуста, людзей не відаць...
Часам пройдзе ў задуме мяшчанка,
Як аскеткі маўклівая здань.

Недзе глуха пастуквалі кросны,
Праспяваў сопна певень адзін...
І пад гонтамі, мохам аброслымі,
Сніў аб чымсьці задуманы Мінск...

Эх ты, доля, нашто ж тыя звоны
Пераліўна плылі ў перабой:
Праваслаўны — басісты, знаёмы,
І касцельны выепкваў жальбой.

Йшлі яўрэі ў свае сінагогі,
Неслі рабіну модлы на здзіў,
А з мячэці свой голас убогі
Недзе зводдалі ліў муэдзін.

Ці ж па тое, каб вечна ў паклонах
Чысцішю ўсю аддаць алтарам,
Каб пасля ў сваім быце пакорным
Спадзявацца дарма на цара?

«Непатрэбна нам спадчыны бруднай,—
Адказала ліхое быллё,—
Мы ў паходзе вялікім, культурным
Змыем ўсё, што на ка́рак лягло!»

III

Вецер, вецер, Кастрычніцкі вецер
На бязмежных расійскіх палях!
У вялікім народным прывеце,
У вялікіх народных баях.

Прада мною тамы думак зорных —
Кнігі слаўных вялікіх падзей,
Кожнай літары подых дазорны
Да гісторыі нашай вядзе.

Гэта крокі і дні эпапеі,
Векапомны для ўсіх летапіс,
Дзе ў народнае мужнасці спеве
Сэрца Леніна клічам кіпіць.

Помню, помню цярпенні салдата
У пажарышчах царскай вайны,
Помню, як беларускія хаты
Ўсім прытулкам былі ў тыя дні.

Па шляхах плылі маршы і маршы...
Іх праводзіла жонак сляза...
Эх, салдацікі родныя нашы,
Многа можна пра вас расказаць!

Цераз грудзі шынелі у скатку,
А ў руцэ ён — суворaўскі штык,

На рамні кацялок і лапатка,
А пад ногі... спадалі лісты

Нашай восені, ціхай, задумнай,
Ў прыдарожных бярозах, лясах...
І васпаю песняю дружпай
Надрываліся грудзі ў пясках.

Помню, помню трывожную муку,
Нібы што перад тайнай якой,
Як аркестры ігралі «Разлуку»
Для паходу ў няведамы бой.

І ішлі з гэтай песняю горкай,
Выліваючы болі да дна...
«Эх, нашто разлучыла з старонкай
Нас нямецкая пошасць-вайна?!»

І тады вось найшлі нашы хлопцы,
Цягнікамі паехалі ў Мінск,
Каб у гэтай нахлынуўшай бойцы
Стаць на фронце пад кулі грудзьмі.

А вятры ім прадказвалі глуха:
«Вам далёкі прадбачыцца шлях,
Пойдзе іншая ў свет завіруха,
Хоць дрыжыць яшчэ ў громах зямля».

* * *

Вось бяскопцыя едуць абозы
Ўсё на ўсход і на ўсход — ад вайны,
Іх услед наганяюць пагрозы,
Томяць душныя роспачы дні.

І ўкрадаецца ў сэрца трывога —
Немец люты на край наступіў,—
На якіх жа шляхах і дарогах
Наша доля народная спіць?

«Не сумуйце, народы Расіі,—
Кажа вецер пры ўсходах зары.—
Есць! Не дрэмлюць вялікія сілы,
Заўтра нашага гаспадары».

Нехта чуе парода тамленні,
Нехта ў сэрцы трымае дазор —
Па народных слядах ходзіць Ленін,
Піша грозны панам прыгавор.

Ці ў Швейцарыі дзе ён спыніўся,
Ці ідзе у магутнай красе —
У паходзе Камуны Парыжскай
Ціхім поступам па Пэр-Лашэз?

Усё роўна чуцёп яго подых
На прасторах радзімай зямлі,
Дзе чакаюць збаўлення народы
Ад памешчыцка-царскай пятлі.

І ў кварталах забытага Мінска
Тлелі іскры на кліч агнявы —
Піцер ленінскі стаў нам калыскай
Разам з песняй рабочай Масквы.

* * *

Знаю, знаю,— прыйшло тое «заўтра»,
Той чаканы народамі дар —
Ў Магілёве хіснулася Стаўка
І пакінуў прастол гасудар.

Знаю, знаю,— казацкія сотні
Абкружалі узбураны Мінск,
Калі спешна чырвопыя роты
Да баёў рыхтаваў бальшавік.

Чую голас трыбуннага грома,
Звоп парвапых пяволі акоў —
На трыбуне кіпучы, знаёмы
Бальшавік Аляксандр Мяснікоў.

І па кожнай краінпай акрузе
Да сяляп, пакідаючы Мінск,
Ездзіў з словам прыветлівым Фрунзе —
Гэты сціплы мудрэц-бальшавік.

Так прыйшлі яны, дні веспавыя,
Чарпасоценпым зграям на скоп...

Так, з'яднаўшы рады баявыя,
Стаўся Міпск сцягам ленінскіх дзён.

Уцякаў авантурны Карнілаў
Ад чырвоных наўстаўшых байцоў,
Хоць уся мешшавіцкая сіла
Ратавала яго «храбрацоў».

Генеральскія зпіклі пагопы,
Разгубіў у дарозе палкі,
Правакатар-святошка Духопін
Смерць знайшоў ад матроскай рукі.

А ўжо ў Міпску, сцягамі аздобным,
На чале перамогшых палкоў
Сталі горда прад вечам народным
Фрунзе, з ім бальшавік Мяспікоў.

Па Захар'еўскай болей не ехаў
Царскі кат — губернатар-сатрап,
Ён, астрашаны вольпасці рэхам,
Змыўся ў свіце цара ў Петраград.

А той домік над Свіслаччу ціхай
Святкаваў, што у сэрцы таіў,—
Ведаў ён, што пазбудзецца ліха
Родны Мінск у апошнім баі.

IV

То не хмары павіслі, як пошасць,
Над краінаю стомленай зноў,—
Загуляла шляхецкая Польшча,
Заблішчалі жупапы папоў.

З сваіх логаваў выйшлі магпаты
Шавішізмам атручваць пород,
На паслугі крывавай Антапты
Стаў шляхецкі раз'юшапы зброд.

Пацярпеў наш народ беларускі
Ад знаёмых яму бізуноў,
Калі шабляй вымахваў Пілсудскі
На чале бутафорпых папоў.

Польшчу прагнуў зрабіць да Смаленска —
Мо вярнуць нам шаснаццаты век,
Каб ізноў над зняволеным Мінскам
Езуіцкі паношыўся здзек?

З языком самадурным, шляхецкім
Ён у Мінску пакручываў вус,
Называў горад «Мінскам Літэўскім»
І з гразёю таптаў Беларусь.

Ды не тое, паны дабрадзеі,
Рыхтаваў вам вякамі народ —
Для яго ў змаганні, надзеі
Надышоў перамогі чарод.

Не кружыся ты хцівай назолай,
Воран, воран... Не вырвеш наш плён —
Мудры Ленін — гісторыі волат
Даў шляхі нам да радасных дзён.

І у нашай пакутлівай кнізе,
Як у сэрцы, запісан той час,
Як прыехаў Арджанікідзе
З воляй ленінскай, шляхта, на вас.

Ў сваёй працы магутнай, штодзённай
Наш народ славіць песняй-хвалой,
Як змагаў вас у стэпах Будзённы
Штурмам конніцы слаўнай сваёй.

Эх вы, мары, шляхецкія мары,
Атруцілі вы польскі народ —
Ў нас палову краіны забралі
Аж на дваццаць пакутлівых год.

Так закончыўся бой... Адгрымелі
Ўсе франты грамадзянскай вайны,
Сэрцы шчасцем жыцця праяснелі,
Вольным гімнам народнай вясны.

Гэта крокі і дні эпапеі,
Векапомны для ўсіх летапіс,
Дзе ў народнае мужнасці спеве
Сэрца Леніна клічам кіпіць.

* * *

Помню... Навалач нехта мне кінуў
На душу... Як атрутным нажом,
Нехта ў сэрцы разрэзаў краіну,
Нехта штучным разбіў рубяжом.

І з вачэй задуменных, трывожных...
Помню, Мінск светлай мараю знік,
Калі спешна ў завеі дарожнай
Паімчаў нас на захад цягнік.

Заняслі мяне ветры змагання
Да народнага гора глыбінь...
Кожны чуўся там як на выгнанні,
Свайго краю і сын і не сын.

І ці ўвечар, ці ў роснае ранне,
Ці у шуме баёў-барыкад,—
Нам, як сцягам, на прывітанне
Сніўся Мінск, новы ленінскі лад.

І праз турмы, этапы, кайданы,
Праз баі, што ўзнімаў наш народ,
Я вярнуўся у Мінск скатаваным
Цераз дваццаць пакутлівых год.

Ціха стаўшы на плошчы ўжо новай
Пасля зморы крывавых трывог,
Кветкі радасці, клятвы суровай
Палажыў я да ленінскіх ног.

...Па дарогах, крывёю палітых,
Я прыйшоў да цябе, родны Мінск...
Я гляджу новым сэрцам адкрытым
І прашу: «Свайго сына прымі!..»

АПАВЯДАННІ

Партызанскімі сцежкамі

*

АЎДОЦЦЯ І ЯЕ ЎНУЧАК

І нашто такое хараство на свеце? Сонца ўзышло над лесам вогненнае, трапяткое... Лес ціхі, бадзёры, свежы. Кожны лісточак на дрэве п'е росную свежасць ранку. А сіняя дымка тонка спавівае ўвесь лес, які непраглядную гушчынёю абступае вёску.

Нашто такое хараство? Нашто яно, калі ў хаце на лаве сядзіць старая Аўдоцця і ціха плача. У печы палаюць дровы. Хата і сенцы чыста падмецены. Дзверы парасчынены насцеж. На ложку каля печы відаць з-пад коўдры русая галава хлопчыка. Гэта ўнучак Аўдоцці. Хлопчык, прыпаўшы да падушкі, спіць так салодка, што, здаецца, і не дыхае. Аўдоцця час ад часу паглядае на яго і ціха выцірае слязінку за слязінкай канцамі хусткі. Апусціць рукі ў нейкай роспачы і ціхенька ківае галавою ў такт сваім думкам.

Неяк незвычайна ціха ўсюды: не чуваць ні мычання кароў, ні бляяння авечак. Толькі часам убяжыць у сенцы певень і, асцярожна зірнуўшы адным вокам у хату, палахліва адскоквае.

Але гэта мо так здаецца Аўдоцці, што ўсюды ціха? Яна толькі ўчора цёмным вечарам прыйшла дадому. Два тыдні хавалася ад немцаў. Пачула, што яны забілі нявестку, вывеўшы за калгасны хлеў, што сын-партызан Кастусь прыходзіў дадому, але ўцёк, падстрэлены, у лес, і рашыла вярнуцца дамоў.

«І вось няма сям'і. Што цяпер будзе? Галава ты мая пяшчаспая!»

Ад старасты прыйшоў суровы паказ Аўдоцці — з'явіцца ў жандармерыю. Яна насіла партызанам есці ў лес. Неца ў час варожае вока падгледзела, і паліцыя шукала старую Аўдоццю.

Аўдоцця ўстала з лавы, глянула ў печ, адсупула вілкамі ад агню невялічкі гаршчочак з маладою бульбай, які пачаў закіпаць, і выйшла ў сенцы.

Глянула па свет, і сэрца заныла ад болю. Дымы з комінаў — гэтыя свежыя дымы — напомнілі ёй аб іншым. Прад вачыма ўявілася поле. У якой буйной расе цяпер застаіць нерухома залатое жыта, якое просіць сярпа! І заныпілі рукі Аўдоцці па працы. Як жа прайшлася б яна цяпер расянай дарожкай па вільготным пясочку, як бывала, калі ўсё табе ўсміхаецца — і поле, і лес, і неба. Недзе срэбнымі званочкамі пераліваецца па лесе песня дзяўчат. Усе спяшаюцца на поле, усе бадзёрыя, смяюцца, жартуюць, і здаецца, што сонца і лес красуюць толькі для іх.

А цяпер? Не чуваць ні смеху, ні песень. Маўчыць лес. Аўдоцця сумная вярнулася ў хату. Заплакала на ўвесь голас, заліўшыся гарачымі слязамі.

«І нашто такое харапство на свеце? Для каго яно цяпер? Для злыдняў? Ворагаў ліхіх? Хай бы лепш спусцілася вечная ноч, то лягчэй было б...»

Ад зычнага плачу Аўдоцці прачнуўся Юрачка.

— Чаго ты, бабка, плачаш?

— А як жа, унучак, не плакаць... А ты спаў бы яшчэ, спі... Яшчэ рана. Зараз зварыцца бульба, я цябе збуджу.

Але Юрачка не мог спаць... Ён ляжаў, і сумна рабілася яго дзіцячаму сэрцу. Юрачку восьмы год. Ён шмат разумее. Ён плакаў па маме дзень і ноч, і ніхто не мог яго ўцешыць.

Яго дзіцячыя, заўсёды жывыя вочы былі цяпер сумныя, сур'ёзныя.

Ён устаў, апрануўся і пайшоў да вядра з вадою, каб памыцца, як вучылі яго тата і мама.

Бабка Аўдоцця наліла яму кубачак пазычанага малака (іх карову забралі паліцаі), насыпала бульбы ў міску. Сталі есці абое. Аўдоцця праганяла бульбу вадою.

«І што цяпер рабіць? Ці ісці на поле жыта жаць, ці павесіцца дзе на суку?»

Цяжкія крокі пачуліся па падворку, і ў хату ўвайшоў староста. Даў «добры дзень». Боты скрэблі па падлозе,

пакуль дайшоў да лавы і сеў. Вачыма ўскідваў на Аўдоццю і Юрачку, соп у пос, скручваючы цыгарку. Усе маўчалі.

Аўдоцця чакала. Пусціўшы клубок дыму і закідваючы нагу на нагу, стараста прамовіў:

— Учора прыйшла?

— Учора.

— Дзе была? У сястры?

Аўдоцця ўскінула вачыма на старасту, думаючы, ска-заць ці не.

— Які там чорт — у сястры? Збірала кожны дзень ягады ў лесе і насіла ў мястэчка прадаваць. А цяпер прыйшла дадому, бо фашысты гвалтам адбіраюць ягады, абы толькі хто з'явіўся ў мястэчка.

Стараста пляснуў губамі і заварушыўся на месцы.

— Гм... Дык вось што... Ёсць строгі наказ табе, каб з'явілася ў жандармерыю.

— А чаго я туды пайду? Чаго я там не бачыла?

— Чаго — я не ведаю, не мая справа. Мне загадана цябе паслаць. Не пойдзеш — будзе горш. Я за цябе адказваць не буду.

— Нікуды я не пайду. Хай ідуць і забіваюць тут. Забілі ж нявестку... Іх жа ўлада.

— Хто цябе там будзе біць? Каму ты патрэбна? Каб хацелі забіць, то прыехалі б і забілі. А калі патрабуюць. каб ты прыйшла, значыць, толькі на які-небудзь допыт.

Стараста кінуў недагарак цыгаркі, устаў, ступіў пару крокаў да парога і, агляпуўшыся, буркнуў цераз плячо:

— Каб я больш не хадзіў... Ясна?

Аўдоцця сурова глянула на старасту.

— Яшчэ і як ясна... Ясней быць не можа.

— Ну, то глядзі,— буркнуў зноў стараста і выйшаў з хаты.

Аўдоцця жавала бульбу і аб нечым ціха думала. А над грудзі лезла трывога. Яна праймала сэрца. У які-небудзь соты раз змушала ўсведаміць сабе, што сталася з жыццём і з усім светам.

Яна баялася глянуць на Юрку, а той напружана сачыў за сваёй бабкай, як бы намагаючыся адгадаць яе настрой, яе намеры.

Дапіваючы малако, Юрка, нарэшце, спытаў:

— То пойдзеш, бабка, ці не?

Аўдоцця не адразу адказала. Працягнула руку да міскі, каб узяць бульбіну...

Мімаволі глянула ў акно, зусім спакойна, як заўсёды, і нарэшце знайшла ў сабе сілу сказаць неяк суровым тонам:

— А цябе з кім пакіну, Юрачка?

Юрка апусціў вочы і ціха сказаў:

— Я не хачу адзін заставацца...

— Вось у тым-то і рэч, унучак...— як бы сама сабе сказала Аўдоцця.— Што ж... пойдзеш са мною. Будзем разам. Будзеш бачыць і чуць, што са мной будуць рабіць злыдні. Як мяне не пусцяць дахаты — прыйдзеш і раскажаш людзям аба мне. Цябе яны, можа, не крануць...— Аўдоцця змоўкла, стрымаўшы гарачую слязу: «Раз яны самі выклікаюць у раён, значыць, можа, адпусцяць».

Уздыхнуўшы лягчэй, яна ўстала. Прыбрала міску са стала, змахнуўшы ў яе крошкі.

— Ну, Юрачка, абувайся, пойдзем...

Затым адчыніла скрыню, стала перабіраць рэчы. Дастала новую спадніцу, новы кантан і жоўтую хустку з вішнёвымі кветкамі. У скрыні ляжала і адзежа нявесткі. Патрымала яе ў руках, паківала галавою.

— Ох, мая саколка... не будзеш больш убірацца...

Выняла кніжкі сына, паглядзела і палажыла назад.

«Нічога больш не трэба... Усё злыдні патапталі...»

Пырснула сабе вады на твар, уцерлася, умыла ўнучка, стала апранацца. Завязваючы хустку, нават зірнула ў люстэрка.

У апошнюю хвіліну паглядзела, ці ўсё ляжыць на сваім месцы ў хаце. Падкінула пад печ апошняе палена дроў, лепш павесіла ручнік, паправіла коўдру на ложку і толькі тады пайшла за парог. Юрка падаўся за ёй.

Замкнуўшы дзверы на ўнутраны замок, яна паклала ключ пад страху.

Сонца падымалося над лесам, але пясчаная дарога была яшчэ сырой. Хутка выйшлі з вёскі. Ішлі праз сасновы лес, дзе шчабяталі птушкі. А потым міналі верасовыя паляны са старымі бярозамі. Дзе-підзе пры дарозе стаялі карабастыя дубы.

Гэтыя дзве постаці — адна большая, а другая маленькая — здаваліся ціхімі, згубленымі ў велічы лесу.

Адзіпока і ціха плывуць думкі Аўдоцці, палахліва бягуць дзіцячыя думкі Юркі.

Хоць няма ветру, а ўсё роўна лес шуміць. Ён шуміць аднастайна, роўна, нявуча. Потым гэты шум пераходзіць

у цягучы тонкі звон. Ён, здасцца, і вядзе за сабою пада-рожных далёка-далёка...

Многае праплывала ў галаве Аўдоцці. І маладосць яе, і старасць.

Як чабровыя кветкі пры дарозе, так смяяліся некалі яе вочы. Мяккі мох над нагамі... З ёю Ігнат... Яны бегаюць на лесе... У яе распушчаныя валасы... звонка нясецца іх раскацісты смех у гушчыні...

— Ах, Ігнат, Ігнат, шчаслівейшы ты за нас, ляжыш у сырой зямлі і нічога не бачыш,— гаворыць сама сабе Аўдоцця.

— Што ты, бабка, гаворыш?

— А, так сабе... Вось бачыш гэтую яму? — ткнула Аўдоцця пальцам убок.— Як я ехала вяшчацца з тваім дзедам Ігнатам, то былі вывернуліся ў яе.

Ледзь прыкметная ўсмешка заблукала на вуснах Аў-доцці, і вочы жыва глянулі ўдаль.

— Коні неслі нас тады, як віхор,— дакончыла Аўдоцця і задумна змоўкла...

— Як твая мама цябе нарадзіла,— зноў пачала яна ўспамінаць,— быў такі самы ранак, як сягоння... Помню, ездзілі па дохтара ў мястэчка для мацеры і для цябе, бо ты быў слабенькі. Дохтар сказаў выносіць цябе на па-ветра. І я ішла палоць лён вось гэтай дарожкай, несучы цябе на руках. Ты спаў і дыхаў вольна. Аж бачу — зусім недалёка наперадзе выбег на дарогу воўк... Такі сівы, стары, калматы... Я стала, атрупянеўшы... Што рабіць? Ісці назад боязна, каб не пагнаўся, ісці наперад немагчы-ма... І я стаяла... Глядзела на ваўка, а ён на мяне... Я пра-сіла бога, каб ён адвярнуў яго ад нас. Воўк стаяў, стаяла і я... Ты прачнуўся і стаў плакаць тоненькім галаском... І сталася дзіва, унучак, воўк адвярнуў ад нас сваю калма-тую галаву і трухам пабег у лес. Я пачакала трохі і пай-шла далей. Ішла не сваімі нагамі, нейкі вецер мяне нёс... Я думала: «Што ж гэта сталася ваўку, што ён пабег у лес?» Я здагадалася... Мусіць, воўк пашкадаваў цябе, калі пачуў твой тоненькі галасок...

Аўдоцця змоўкла, адганяючы нейкія думкі. Вочы яе сталі злоснымі. Ізноў сама сабе мармытала:

— А цяпер ваўкі не такія, ох, не такія... Двуногія...

Цяжкую думу неслі ў сабе Аўдоцця і Юрка. І калі ж будзе той шлях? Стала неяк крыўдна і горка на душы ў Аўдоцці — ці то ад наплыву ўспамінаў, ці ад таго, што думкі павярнулі да нямілага сягонняшняга дня.

— Ах, хутчэй бы той шлях — можа, лягчэй было б.

А шлях віўся таксама лесам, толькі дзе-нідзе перасякаў прагаліны поля. То ўздымаўся на ўзгорак, то ападаў у даліне, то ўрываўся ў імшары або ў ціхія, паважныя дубровы. Перараэалі яго цяністыя крынічныя рэчкі. На іх былі мосцікі, у некаторых месцах ужо разбураныя. Ціхі, глухі шлях. Не гудуць тэлеграфныя правады — яны вісяць паабрываныя. Людзі цураюцца шляху цяпер. Не чуваць на ім чалавечага гоману. Толькі ідуць па ім маўкліва бабка Аўдоцця і ўнучак Юрка.

Праводзяць іх ляспыя шумы, трывожныя, неспакойныя шумы. Яны, здаецца, хочуць спытацца ў бабкі Аўдоцці і ўнучка: «Куды ж вы ідзяце, такія адзінокія? Ці вы ведаеце, куды вы ідзяце?» І параіць: «Вярнецеся, вярнецеся...»

...Кастусь прыйшоў у цёмную ноч, калі вёска спала ў мяккай цішыні. У яго за плячыма паблісквай аўтамат. Ягоныя чатыры таварышы, таксама ўзброеныя аўтаматамі, ішлі за ім. Прыпыніліся на сярэдзіне вуліцы, якраз там, дзе яе перасякала дарога. Паглядзелі ва ўсе бакі. Цішыня, нікагуткі.

— Самы добры час,— сказаў Кастусь.— Ідзіце. Пяты дом ад вугла на левым баку вуліцы. Толькі асцярожна. Будзеце пытаць Сцяпана Кавальчука. Двое пойдуць у хату, а двое застануцца на двары. Ідзіце, а я падыду да сваёй хаціны.

Яны разышліся ў процілеглыя бакі.

Кастусь ішоў, і яго сэрца напаўняла не то радасць сустрэчы, не то нейкая трывога.

Вось і хата, ахутаная цемраю, таемна ціхая, адзінокая. Весніцы зачынены. У агародчыку вырысоўваюцца з цемры фасольныя тычкі, а ля самага акна пад подыхам вецярка шапоча высокая статная таполя.

Кастусь стукнуў у дзверы. Замкнёны. Падышоў да акна і прыхіліўся да шыбіны. Ніхто не варушыцца ў хаце, ніхто не аклікае, як раней.

Кастусь бліснуў батарэйкай у акно і з трывогаю стаў разглядаць сваю хату. Хата падмецена — усё прыбрана, усё не крануга. Толькі няма нікога.

Кастусь падаўся на вуліцу. Ступіў пару крокаў і прыпыніўся: таполя то зашэпча густа, то сціхне, то пахіліць сваю вострую вяршыню, то зноў яе выпрастае і шуміць пояк трывожна-трывожна...

Кастусь мімаволі заслухаўся. У парывістых шэптах

таполі, у яе прылівах трывогі і задумы ён пачуў, што яго маці і сын не вернуцца ніколі...

А праз хвіліи дваццаць у густым лесе каля глыбокага рова ля ног Кастуся поўзаў стараста Сцяпан Кавальчук.

У адказ на яго просьбы і прычытанні цішыню лесу злосна прарэзала чарга аўтамата.

ПАД СЛАВАЦКІЯ ПЕСНІ

Гармонік іграў полькі, вальсы... Зыкі хвалямі плылі ад прызбы за вёску, расплываліся па шырокім, як вокам глянуць, полі і гіпулі ў лесе. Стомлена садзілася сонца.

Нядзельны дзень. Дзяўчаты, прыбраныя па-святочнаму, танцуюць з партызанамі на падворку. Пры гармоніку шалёстае бубен. Жанчыны стаяць ля плота, а побач курацъ мужчыны. Як у старыя добрыя часы,— здаецца, што і вайны няма. Так то ёсць у партызанскім краі.

Але калі глянуць навокал на полі, то ўбачыш сям-там групкі ўзброеных партызан, вартавога пры шалашы на ўскраіне лесу. У паветра, поўнае зыкаў гармоніка, урываецца цень трывогі. Усё ж такі на свеце вайна!

У сенцах на скрыні сядзяць славацкія салдаты, цяпер партызаны, і, жартуючы з дзяўчатамі, пяюць свае родныя славацкія песні. Якая задушэўная меладычнасць у гэтых песнях! Вы седзіце ля сцяны пад страхою і слухаеце. Хоць грае гармонік, але вы нічога не чуеце, апрача гэтых меладычных гукаў, якія даносяцца быццам з нейкай глухое далі і, як сінь нябёс, гаюча ласкаюць сэрца нейкаю надземнаю красою. Пачуеце знаёмыя словы — славянскія, адкрытыя, як родная даўнасць, якая прыходзіць, каб пазнаць цябе. Даходзяць словы: «краіна», «гай»... і кожная строфка песні канчаецца аксамітным:

Ку-ку, ку-ку, ку-ку...

А ў хаце на ложку ляжыць малады партызан. Адны называюць яго Ванькам, а другія Янкам. Учора прывезлі яго сюды на аэрадром, цяжка параненага. Чуб жытніх валасоў раскінуўся па белым ілбе. Толькі адна маршчынка на ім — паміж бровамі. Ён адкрые павекі, і тады глянуць чыстыя шэрыя вочы. Мусіць, маці парадзіла яго ў полі ў час жніва. Гэты твар цяпер неспадзявана раптам пасур'ёзнеў.

У хаце стаяць і сядзяць жанчыны-маладзіцы са святочнымі тварамі, у белых хустках. Яны цяпер задуманы і рукі скрыжавалі на сваіх пухлых грудзях. Уздыхаюць. Над партызанам схілілася, толькі што ўвайшоўшая ў хату, бабка. Пытаецца, як яго завуць. Сказалі — «Ванька». Бабка палажыла сваю касцістую, загарэлую руку на лоб параненага і сказала: «Ванька, Ванечка...» Партызан маўчаў. Толькі прыадкрыў вочы. Бабка з Ванькі перайшла на Яшку: «Япачка, я табе прынесла выпіць памоцнага зелля. Можа, бог выратуе тваю маладую душачку...» Янка прастагнаў і ціха сказаў: «Не, тут трэба аперацыя...» І змоўк, закрыўшы вочы. Бабка пальцам паклікала жанчын да ложка. Наліла з бутэлькі ў лыжку настойкі нейкага зелля. Жанчыны прыўзнялі галаву Яначкі, і бабка ўліла яму ў рот настойку. «Праглыні, праглыні, саколік...» Япачка праглынуў. Бабка тры разы яго перахрысціла і доўга паглядала яму ў твар.

— Маладзенькі... хоць ты вады напіся,— прамовіла.

За акном шумела моладзь, зыкі гармоніка плылі ў ціхі пагодны блакіт. А з сенцаў урывалася аксамітнае, шырока-ласкавае:

Ку-ку, ку-ку, ку-ку...

Ніхто не чакаў такога павароту ў ранені Яначкі: яшчэ ўчора была надзея на паправу, яшчэ гутарыў хлапчына, а цяпер... змоўк. Рана цяжкая. Перавязка прысохла — няма каму змяніць. Сястра-санітарка паехала ў штаб па ўрача. Праўда, гэта зубны лекар, але ўсё ж такі лекар. Чакаюць лекара.

Сонца спускаецца за вяршыні лесу. Хутка на аэрадроме распаляць сігнальныя кастры. Да іх прыляцяць скора жалезныя птушкі з Вялікай зямлі. Яны многа чаго прынясуць — і рэчаў, і вестак. Яны забяруць Яначку з сабой і над зорамі запясуць яго аж у далёкую Маскву. Каб як хутчэй той лекар. Усё ж такі лекар...

Ніхто не знае, што Япачка маўчыць. Можа, перастаў бы граць гармонік і прыціхлі б скокі. Але заўтра не будзе свята, заўтра будуць будні, і дзяўчаты пакладуць свае ўборы ў куфры. Дзядзькі пойдуць за плугам, а жанчыны — да льну, да бульбы. І людзі будуць ізноў гаварыць пра вайну і праклінаць немцаў. Хай выбачыць Япачка, бо ўсе вераць у яго выздараўленне.

Яначка пачынае трызніць. Ён кліча маму і дзеда. Зыкі

гармоніка і зыкі пейкай нязнанай, але чамусьці блізкай цудоўнай песні падымаюць салодкія слёзы ў грудзях.

«...Я вярнуся, мама...» Замігацелі перад вачыма немцы. Рэдкі сасновы лес, парахавы дым... І высокі немец, збіты з тропу, бяжыць без шапкі між сосен якраз на аўтамат Яначкі. Яначка бачыць толькі, як немец захістаўся і ўпаў на сасновыя карэнні. «Але чаго так баліць у паясніцы? Баліць і не адпускае. Хутчэй бы той лекар».

Сігнальныя кастры ўжо гараць па аэрадроме, а ў цішхім небе дрыжаць зоры.

Хутка, хутка прыйдзе збаўленне.

І вось гармонік заціх. Разам з людзьмі ўвайшоў у хату плячысты, з медалём «За адвагу» на грудзях, Мікола Дзям'янавіч — лекар. Добры твар з блакітнымі вачыма і з напускною суровасцю. Гэта ўсё ад вусоў. Яны сёння глядзяць уніз. Распіхвае людзей рукамі: «Дайце прайсці, дайце прайсці...» Бярэ паранепага за руку, мацае пульс, а сам глядзіць недзе ўдаль, прыслухоўваецца. Здаецца, разам з ім прыслухоўваюцца і ўсе прысутныя. Мікола Дзям'янавіч пераводзіць вочы на Яначку. Мацае пульс, бярэ другую руку. Глядзіць у твар Яначкі, глядзіць... І раптам як бы скокнуў, сказаўшы: «Ціха!.. Гудзяць самалёты... Не памрэ, будзе жывы... Скарэй на воз, на самалёт!» І цень трывогі знік з твару Міколы Дзям'янавіча. Яначку вынеслі пад зорнае ціхае неба. Недзе прыглушыўся боль, калі яго вочы глянулі на зоры. І ўслед яму, як далёкая незабыўная знаёмасць, плыло ціхае, аксамітнае пра Ясеньку, пра гай:

З гары спускаліся авечкі,
Ты падавала мне руку,
Лілося з гаю па-над рэчкай:
Ку-ку, ку-ку, ку-ку...

ЛЯСНАЯ ПЕСНЯ

Партызан Сцяпан Хомчык, ідучы з вёскі ў лагер, сеў ля дарогі пераабуцца. Дарога вілася праз густы высокі лес. Сосны перамешваліся з дубамі і бярозамі, а ўнізе — арэшнік, шыпшына і, урэшце, ягадпік ростам па калені. Пераабуўшыся, Хомчык прылёг, закурыў, і яму прыемна было адчуваць веліч, дрымучасць лесу.

Быў позні ранак, але ў лесе яшчэ стаяла свежасць — тумапы сплылі пядаўна.

Недалёка, па той бок дарогі, пехта заспяваў. Пачуўся жаночы пераліўны голас. Хомчыку здалося, што ён ужо слухаў падобныя напевы нодзе ў далёкім мінулым. Цяпер гэты напеў стаў выклікаць у яго памяці знаёмыя вобразы з жыцця ў родпай вёсцы.

«Як гэта ўсё здаецца даўпім...» — падумаў ён, ловячы мелодыю.

А песня набліжалася. І, урэшце, з гушчыні лесу на ягадную паляну пры дарозе выйшла маладзіца з шляцёнкай за плячыма і прывязаным да фартуха збанком. Япа павесіла шляцёнку, засланую лістамі папараці, на галіну невялікай бярозкі і сама нагнулася да ягад.

Хомчык ляжаў, не варушыўся. Маладзіца, збіраючы ягады, спявала ўпаўголасу.

Хомчык прыглядаўся да яе і слухаў. Слухаў не толькі мелодыю, але і словы. Нейкая дзіўная песня — і ласкавая і разам страшная.

Не шумі ты, лес, цё-ёмнай по-очкаю...
Не заві мяне-е-е, муж, сваёй жонкаю-ю-ю...

«Фу, гэта дык песня»,— падумаў Хомчык.

Я й прыгожая, я й удалая,
Як бярозанька, маладжавая...

Хомчык змераў вокам маладзіцу з галавы да ног і ўсміхнуўся: «Так, яна як бярозанька».

А ты б'еш мяне, колькі хочацца,
І з вачэй маіх слёзы коцяцца...

«Гэта ўжо ні к чаму,— думаў Хомчык.— Які дурань можа біць такую?» Як бы нешта вострае кальнула ў сэрца Хомчыку. Ён хацеў падняцца, але яна спявала далей:

Ой, пайду я ў лес, там загінуся,
Ад цябе навек я адкінуся.

— І правільна...— амаль не ўголас сказаў Хомчык. Маладзіца выпрасталася і спявала ўжо на ўвесь голас, вось зусім блізка ля Хомчыка:

Не шукай мяне ты з расіцаю,
Не гукай мяпе над крыніцаю...

— Аб кім жа так спяваеш? — рантам спытаўся Хомчык.

Маладзіца крутпулася ўбок, крыкнуўшы «ой», і збялела:

— Хто вы? Ой, як жа я спалохалася... сэрца калоціцца... Хто вы, пытаюся?

У Хомчыка ад усмешкі прыгпуўся яго крыху дзюбаты нос, шэрыя вялікія вочы жыва забегалі.

— Не бойся, не бойся,— нібы разважаючы, сказаў Хомчык.— Я свой, свой. Сама ведаеш, што тут ні паліцыі, ні немцаў няма, а толькі партызаны.

Маладзіца паглядзела на тую чорную мецінку на выцвілай шапцы Хомчыка, дзе была некалі пяцікутка-зорачка.

— А хто ж вас адразу разбярэ? Але ж і спалохалася... Проста як у зямлю ўрасла...

Яна паправіла хустку, абцягнула кофтачку. З-пад хусткі відаць былі цёмныя валасы. Даўгаваты твар з выпуклым ілбом, а пад тонкімі доўгімі бровамі — вялікія вочы невыразнага колеру. Яны, здаецца, мянялі свой колер — то цямнелі, то рабіліся шэрымі. Моцны румянец на шчоках, змешаны з загарам, нагадваў лясную прыроду, поўную паху траў і дрэў. Сакавітыя вусны пры ўсмешцы пад крыху задзёртым носам паказвалі радок белых зубоў.

Гэта была сіла і краса ад зямлі і лесу.

— Прысядзь,— сказаў Хомчык.

— Няма часу. Трэба спяшацца дадому. Позна ўжо, хату адну пакінула.

— А што, хіба ў цябе нікога няма?

— Няма. Жыву адна, як ведзьма, у лесе.

— Як у лесе? А не ў вёсцы?

— Мая хата ў самым лесе, крыху ў баку ад вёскі.

— Ты замужняя?

— Была. А цяпер — не.

— А дзе муж?

— Памёр...— сказала і нахмурылася.— Туды яму і дарога.

— Што так?

— Дрэнны быў... Не любіла я яго. Шалёны быў, брыдкі. Біў мяне часта... Маладосць папсавала праз яго.

— Ага, вось чаму ты і песню такую спяваеш.

— Песня не мною зложана... Старая гэта песня. Яшчэ мая маці яе спявала. Трэба ісці дахаты...— сказала і пайшла да бярозкі па пляцёпку, амаль што поўную ягад. Затым вярпулася да Хомчыка, які ўвесь час пазіраў за ёй. І дзіўнае рабілася ў душы Хомчыка. Уварвалася нейкая цеплыня і прыціхла там, стаілася. Былі такія хвіліны, што яму хацелася ўзяць гэтую ляспую жанчыну на

рукі і паесці невядома куды, але Хомчык зараз жа засаромеўся такіх думак.

— А чаму не выходзіш замуж? — спытаўся ён.

— Не хачу. Астрапылася адпаго замужжа і больш не хачу. Мусіць, мая доля такая. Ну, бывайце. Наце вам ягад на дарогу!

Хомчык устаў. Па салдацкай звычцы працягнуў пальцамі па поясу і паправіў гімнасцёрку. Ускінуў на плечы аўтамат і ўзяў ягады з рук маладзіцы.

— Э-эх ты...— уздыхнуў,— марнуеш сваю маладосць...

— Не я вінавата... Скаламуцілі жыццё бацькі, радня... Ну, бывайце, шчаслівай вам дарогі... Баюся, каб хто ў хату не ўлез. Пабягу...

— А як цябе завуць?

— Мяне? Аксеня... Дземяновіч...

— Ну, бывай... Дзякую за ягады.

Разышліся ў процілеглыя бакі. Хомчык ішоў адзін лясной дарогай, задумёны. Часамі паціраў сабе лоб і разважаў: «Праўда гэта ўсё было ці казка?» Здалёку данеслася песня. Хомчык стаў і паслухаў. «Так, тая самая песня...» — падумаў ён і пакруціў галавою.

* * *

Група партызан — дзесяць падвод — ехала ў вёску памагчы сялянам заараць зямлю пад жыта. Сярод іх быў і Сцяпан Хомчык. У яго на возе нават ляжаў плуг. Калі толькі наблізіліся да вёскі, Хомчык у першага сустрэчнага хлопца-пастушка папытаўся, дзе жыве Аксеня Дземяновіч. Хлопец паказаў дарогу, і Хомчык зараз жа звярнуў паправа краем лесу. Сама вёска засталася ад дарогі ўлева. Уехаў ў малады сасоннік і падумаў нават, можа, хлопец яго ашукаў, бо некранутасць, гушчыня маладога сасонніку ніяк не нагадвала таго, каб тут было якое-небудзь жыллё. Але сасоннік скончыўся, і паказалася паляна. На ёй — агарод, абнесены плотам з жэрдак. Грушкі, слівы, вішні стаялі пры травяністай дарожцы, якая вяла на падворак. Тырчаў журавель студні, а збоку хлевушок амаль што хаваўся ў слапечніках. Злева ад яго — хата з увагнутай саламянай страхою, маленькімі аконцамі і шырокай прызбаі. Гэта была не хата, а хатка, як з казкі,— па курыных ножках. Яе аконцы глядзелі праз агарод проста ў лес, які пумеў тут жа за хлевушком. Па другі бок хаты, за яе глухою сцяною, адкрывалася по-

ле. Супроць пярэдняй сцяны, дзе было толькі адно акно, стаяла старая разложыстая груша, а над самым акном — кветкі, збоку лапушыўся куст бэзу, а недалёка ад яго харашылася мальва. Збуцвелы плоцік агароджваў гэты сцішны гародчык аж па самую грушу.

Ля парога расла высокая бяроза, якая сваім галлём завешивала амаль усю шырыню падворка. Сюды і над'ехаў Хомчык. Дым віўся з ледзь прыкметнага над страхою коміна. На бярозе і грушы шумела птаства. Блішчала раса на гародніне: на агурках, гарбузах, моркве, на чырвоным маку.

З хаты выйшла Аксеня. Яна была ў саматканай сарочцы з вышытымі рукавамі вышэй локця і босая; белая хустка, завязаная паспех, спаўзала на патыліцу. Усё гаварыла за тое, што гаспадыня ўвіхаецца ля печы і спяшаецца.

— Добры дзень!..— прамовіў Хомчык.

— Добры дзень... Куды ж гэта так рана? — спыталася Аксеня і зараз жа пальцамі памацала гузікі на грудзях, правярала, ці зашпілена сарочка. Аксеня была крыху збянтэжана. Вочы яе з бляскам бегалі пад густымі бровамі. Хомчыку не зусім спадабалася такое пытанне,— ну як гэта яна не здагадаецца, чаго прыехаў?

— Зямля ў цябе ёсць? — спытаўся.

— Ёсць...— адказала.

— Араць яе трэба?

— Трэба,— кіўнула, і вусны расплыліся ва ўсмешку.

— Ну, дык вось я і прыехаў араць,— сказаў Хомчык засмяяўшыся.

Аксеня яшчэ больш зачырванелася.

— А божа, адкуль такое шчасце? Ці ж я спадзявалася? Злазьце з воза хутчэй, распрагайце коні, няхай пасуцца на падворку.— Яна кінулася была распрагаць сама, але Хомчык ёй не даў.

— Распрагу сам. У цябе ёсць свая работа.

Распрогшы коней і прывязаўшы іх між слівак і вішань, Хомчык зайшоў у хату. За маленькаю адгародачкай была кухня. Праход у пярэднюю быў завешан кужэльнай занавессю. Туды папрасіла прайсці Хомчыка Аксеня. Хомчык увайшоў у паўзмрочную, таксама невялічкую, пярэднюю, чыста прыбраную і ўтульную. Насупраць на сцяне вісела вялікае люстра, за яго былі заткнуты пучкі засушаных кветак, перамешаных з канопляміі і лёнам. Збоку — фатаграфіі ў рамках. У пярэднім кутку над ста-

лом — невялічкі абразок, прыбраны ручніком. Пры сцяне — жалезны ложак, засцелены саматканай коўдрай у светла-блакітных колерах. Хомчык павесіў аўтамат на драўляны крук і, распрацуўшыся, стаў перад люстрам прычэсвацца. Калі ён пачуў, як Аксеня на падворку клікала курэй, і ўбачыў, як яна мільгапула ў акне, выйшаў з хаты.

— Вось што, Аксеня... У мяне коні і плуг. Ад цябе патрабуюцца пастронкі і ворчыкі.

— Знайду, усё знайду,— сказала яна прыпыніўшыся.— А вы адпачывайце, яшчэ маем час. Як паспедаем, тады...

— Не, не, давай зараз... Адпачываць мы, дарагая, адвучыліся.

Праз хвілін пяць Аксеня вынесла з хлява пастронкі з ворчыкамі. Хомчык пачаў рыхтаваць плуг.

На снеданне яна паставіла на стол салёныя агуркі з бульбай, потым сала з блінамі, сырам і малаком. Прынесла з каморы бутэльку гарэлкі, настоенай на вішні.

Хомчык не хацеў адзін есці, пратэставаў, аж пакуль не прымусіў Аксеню снедаць разам.

— Ну, то добра, зараз сяду, зараз.— Яна выйшла ў сенцы і хутка вярнулася, прыбраная па-святочнаму. І белая кофта з рукавамі на локці, і чорная шарсцяная спадніца, і белая хустка надавалі ёй прывабны выгляд. Села яна за стол, заружавелася, як кветка. Спачатку Хомчык не адважваўся ўзняць на яе вочы — быў неяк прыдаўлены яе прысутнасцю... З гэтага ўсяго заўзята рвануў чарку гарэлкі, чокнуўшыся з Аксеняй.

— А вы ешце, ешце...— запрашала яна.

— А ты мяне не заві на «вы»,— сказаў Хомчык,— а проста, на «ты».

— Як жа... Я вас паважаю. Вы ж нашы і абаронцы і аратыя...

Хутка выехалі ў поле. Аксеня паказала, дзе араць, Хомчык закінуў аўтамат за плечы і ўзяўся за плуг. Коні, адвыклыя ад плуга, сталі крывіць баразну.

— Давайце я буду паводзіць,— сказала Аксеня і ўзялася за павадкі аброці.

Плуг пайшоў роўна, адвальваючы скібы цёплай бурай зямлі. Аксеня, адвярнуўшыся, сказала:

— Нашто ты стрэльбу павесіў на плечы? Гэта ж цяжка...— Сказаўшы «ты», яна крыху сумелася. Бліснула вачыма, усміхнулася.

— Зброі нам кідаць пельга. Вайна.

— То дай хоць я паднясу трохі...

— Каб ты ўмела страляць, даў бы, а так — не магу. Стрэльба,— усміхнуўся Хомчык,— мне не перашкаджае...

Коні ступалі бойка, а побач ішла Аксеня, ішла роўнаю, павольнаю хадою.

Вецер раздуваў грывы копей і свежым струменем плыў ля вушэй Хомчыка. Прад яго вачыма мільгацеў белы фартушок Аксені.

Шуршэла зямля пад плугам.

Хомчык, ідучы за гэтай жанчынай, мог бы і забыцца, што ён партызан, што на свеце вайна. Але плечы муляў аўтамат. Час ад часу даносілася страляніна: партызаны ў лагеры выпрабоўвалі зброю. Ззаду ў свежай баразне дзяўблі раллю вароны, вецер падуваў недзе, здаецца, з сінявы нябёс. Цёмны лес атуляў поле высокаю сцяною. Здавалася, што гэта мірны куточак зямлі, які адрэзаны ад свету і жыве сваімі законамі, сваёй штодзённай ціхай плынню. Каб не далёкі недзе гул самалётаў, каб не праезды партызан, не страляніна, можна было б сказаць, што на свеце ўсё ідзе ціха і мірна.

Калі сонца паднялося высока над лесам і сагнала расу, верхам на кані аб'язджаў поле камісар атрада — правяраў, як працуюць партызаны. Едучы ўскраінай лесу, ён наблізіўся да Хомчыка і Аксені.

— Як працуецца, Хомчык?

— Добра, таварыш камісар.

Камісар глянуў на Аксеню і, усміхнуўшыся, сказаў:

— Ну, я думаю, што добра... Маеш такую гаспадыню, што ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць...

Аксеня пачырванела і адказала:

— Жартуеце, таварыш...

— Вось што,— зварочваючыся да Аксені, сказаў камісар сур'ёзна,— калі ён вам дрэнна будзе рабіць, прыйдзеце і заявіце мне...

— Ды ў мяне і работы нямнога...

— Усё будзе як мае быць, таварыш камісар.

— Ну, глядзі...— Камісар сцебануў каня.

Хомчык завярнуўся, усадзіў плуг у зямлю і спыніў копей.

— Адпачнем, Аксеня, вось пад гэтым дубком, закурым, хай копі перадыхнуць,— і, узяўшы Аксеню пад руку, ён павёў яе ў цянёк. Ямы селі.

— Ты бойкая песні спяваць, а вось мужчын баішся...

— Дый такі баюся...

— Ты вырасла, як дзічка ў лесе... Яна і цвіце і калючая...

— Не, я не калючая...

Скруціўшы папяросу, Хомчык стаў красаць агонь. Яна склала паперу і завязала яго капшук.

— Нехарошы ў цябе капшук...

— Гэты капшук, як маё жыццё... Бачыш, не пажыў сабе яшчэ ніякай Аксені, каб пашыла лепшы...

— Ой, у вас можа многа было гэтых Аксеняў...

— Кляпуся, галубка, што не... Не было часу. То навука, то ваенная служба, то вайпа вось... Так і памрэш без Аксені.

— Ну, яно можа быць і так, але штосьці не верыцца.

— Вер не вер, а гэта так... Вось скончым вайну, тады ажанюся.

Аксеня агляпулася ў лес і сказала:

— Трэба ісці чабру, супічніку назбіраць, увечары чаю наварым.

— А цукру дзе возьмеш?..

Аксеня ўскінула вачыма па Хомчыка і хутка іх адвяла ўбок.

— Для цябе знойдзецца,— сказала гулліва і скочыла з месца. Хомчык ляжаў і курыў. І зноў, як тады, данеслася песня. Хомчык заварушыўся і азірнуўся на лес. Чамусьці пацягнуў шапку за казырок і, націснуўшы цясней на лоб, устаў і падаўся на песню. Зноў спалохаў Аксеню, як тады. Але цяпер абое рассмяяліся.

— Прыйшоў памагчы табе рваць... Не пярэчыш?

Яна прадаўжала песню:

Ой, за лесам, за ракою,
Там Марыся жыта жала,
У правай ручцы серп дзяржала...

Хомчык, забегшы за куст, трапіў на шырокую купіну чабру і стаў ірваць яго спрытпа. Хутка парваў цэлае бярэмя.

— На, бачыш, як скора...

— Ой, ці ж так ірвуць? Цэлае бярэмя з травою.

— Нічога, дома перабярэш. Хадзем да коней... Давай бягом, хто хутчэй...

Аксеня зірпула, адвярпуўшыся, па Хомчыка і з месца шугапула праз кусты. Хомчык за ёю. Перад вачыма мільгапула ў лісці белая хустка. Хомчык прыбавіў ходу і, даганяючы Аксепю, абхапіў яе рукамі. Яна ўскрыкпула і

затрапяталася, як вялікая птушка, у дужых руках Хомчыка...

Увечары, калі над лесам і над хатай застыў статак хмурынак, Аксеня падала Хомчыку чыстую бялізну. На каўняры сарочкі і на грудзях цягнуліся стужачкі вышывак. Прынесла яму чыстыя, мяккія анучы на ногі. Запрасіла памыцца ля студні.

— Або, як хочаш, ідзі ў крыніцу. Тут у лесе ёсць брод недалёка... Але цяпер камароў многа, так што мыйся тут.

Памылася і сама. Хомчык бачыў, як яна распусціла свае багатыя валасы, якія закрывалі спіну. Расчасала іх у просты радок, сабраўшы на патыліцы ў вялікі скрутак. Хадзіла без хусткі.

Распалілі агонь на падворку і варылі вячэру, седзячы пад грушай-дзічкай ля плота.

— Ну, як мог цябе не шанаваць твой муж? — сказаў Хомчык.— Я яго застрэліў бы, нягодніка.

— Мой муж — гэта было цэлае няшчасце. Такі гультай і раўшівы... Не жыў, а гніў... і мяне хацеў згнаіць. Я ўцякала ад яго...

У цэбры ля студні мокла лаза. Хомчык узяўся абрэзваць яе, раўняць і плесці лапці.

Рабіў ён гэта хутка і спрытна. Аксеня аж здзівілася:

— Хутка робіш, хутка... Рукі твае ўвішныя...

— Дай памераю,— сказаў Хомчык і прымераў ёй лапаць да нагі.

— Ой, не чапайся! — крыкнула Аксеня.

— Што з табо-о-ю? — працягнуў Хомчык у нос.

Яна патузала яго за вуха:

— А казаў, што ніякіх Аксеняў не меў...

— Не меў, даю слова, не меў,— сур'ёзна глянуў на Аксеню Хомчык.

...Так прайшло некалькі дзён. Аксеня звала Хомчыка ўжо не Сцяпанам, а Сцяпанкам. «Можа табе, Сцяпанка, тое, можа другое. Хадзі сюды, сядзь, адпачні трохі. Ух, як жа ты ўспацеў...» — і абцірала яму твар сваім фартухом. А Сцяпанка, узараўшы поле Аксені і яшчэ тром сем'ям, стаў хадзіць з ёю на касьбу. Касілі недалёка ад хаты. Там Хомчык пабудаваў шалаш. Дома агледзеў хлевушок, направіў комін у хаце, дзе што прыгарадзіў. Калі Аксеня, напрыклад, мыла бялізну, ён рыхтаваў ёй ваду. Нават грады палолі разам і тачок зрабілі на падворку для малацьбы, абгарадзіўшы яго дошкамі. Адзін раз Аксеня сказала:

— Сцяпанка, зрабі дзве грабёнкі на ягады — мне адну і сабе.

— Што за грабёнкі? Не ведаю... У нас ягады збіраюць проста рукамі.

— А ў нас робяць і грабёнкі. Я табе пакажу як.

Ён зрабіў дзве грабёнкі, і яны аднойчы раніцай пайшлі па ягады.

Сонца плыло яшчэ за лесам. Яно прасочвала свае праменні праз гушчыню і пырскала іх на росныя травы.

Калі яны выйшлі на дарогу, Аксеня, прыклаўшы далоні да вуснаў, гукнула на ўсю моц сваіх грудзей. Рэха пакацілася на тысячу таноў і замерла недзе ў далёкай гушчыні. Аксеня ўдарыла ў прышеўкі:

Не дай божа, не дай божа
Недаростачка любіць,
Нагінацца цалаваццa
Ажно спіначка баліць.

Хомчык зарагатаў, а з ім і яна.

— Хіба ж гэта не на мой рахунак? — сказаў Хомчык і абвіў рукою яе моцны стан. Яна не баранілася, а толькі сказала: «Пусці, а то хто ўбачыць». І спявала далей:

З-пад бярозы маёй
Пазірнула сонца,—
Ой, ці ты, ці не ты
Глянуў у аконца?

Ішлі бадзёра, не чулі ног пад сабою.

— Нутро ты выварочваеш сваімі песнямі,— сказаў Хомчык, які ішоў побач з паднятай галавой і адчуваў, як яму робіцца хораша.

Аксеня раптам сціхла і абвіла рукамі яго шыю. Хомчык толькі паспеў адчуць дотык яе рук — свежых, крамяных, як і яна уся.

...Збіраючы ягады, у гутарцы і смеху яны не заўважылі, што неба стала зацягвацца хмарамі. Парнасць паплыла па зямлі. Далёка глуха прагудзеў гром. Толькі тады яны сталі прыслухоўвацца, але збіралі ягады далей. У лесе зрабілася ціха. Гром прагучаў бліжэй.

— Хадзем, Сцяпанка, а то будзе дождж,— сказала Аксеня і хутка пайшла па пляцёнку, якая вісела на галіне дубка.

— Ды пачакай крыху... Бачыш, колькі ягад. Адыходзіць нават не хочацца. І «машынка» добра рве.

Вецер здалёк шолахам праляцеў па лісцях, і на хвілі-

пу зноў зрабілася ціха. Затым другая хваля рванула і нагнула дрэвы.

— Ці я не казала? — прамовіла Аксеня.— Хутчэй хадзем...

Пачалі падаць вялікія кроплі дажджу.

— Бяжым у шалаш! — крыкнуў Хомчык, і яны павярнулі ўправа напрасткі праз лес.

Па лесе ўжо імчаўся гул — пачалася навальніца. Чорная хмара пагрозліва плыла над галовамі. Маланка разрэзала неба залатым зігзагам. Прарваўся, аглушаючы, гром, і лівень хлынуў на лес.

— Хутчэй да шалаша! — крычаў Хомчык, бегучы між кустоў з пляцёнкай за плячыма.

Убеглі ў шалаш і пападалі на сена. Аддыхаліся...

— А што... Я казала хутчэй, не паслухаў. Вось і намыліся.

— Ну, падумаеш. Глупства!..

А лівень паласаваў па сепажатнай палянцы, і вецер гнуў дрэвы на дрэвы.

У Аксені шчокі сталі свежымі, злёгку ружовымі, мокрыя пасмы валасоў прыліплі да скроняў. Вочы пацямнелі, а бровы былі быццам насвежа праведзены тонкім мазком мастака.

Хомчык выцер рукавом гімнасцёркі свой твар, пачаў раўняць сена, больш падсцілаючы пад бок. Скончыўшы, абхапіў Аксеню рукамі і загляну ў вочы, як у бездань ляснога возера.

— Дзе ты такая радзілася, скажы? У сне б цябе толькі бачыць! І мне часам не верыцца, праўда гэта ці сон.

— Табе толькі здаецца. Я такая, як і ўсе,— адказала яна, папраўляючы яму валасы за вухам.— Ты вось прыйшоў і ажывіў маё жыццё. Я думала, што ўжо застыну.

— Чаму да цябе ніхто не заляцаўся?

— Заляцаліся. От, я не папускалася. У вёсцы казалі, што я першага мужа звяла са свету, што жыву, як ведзьма-чараўніца, у лесе... Ты вось нейкі не такі, як іншыя, не хуліганіў са мною...

Яна пяшчотна пагладзіла яго па шчацэ. Хомчык глядзеў, анямеўшы, а вусны самі расплываліся ва ўсмешку. Раптам, забыўшыся на ўсё, ёп стаў цалаваць яе...

Дождж ліў струменямі, недзе ў лажбінках булькала вада, шуршэлі мокрыя лісці дрэў за шалашом. Хмары хуткаплылі на небе, а з імі ўцякаў і дождж з далёкімі раскатамі грому.

* * *

Пад вечар таго самага дня, калі напоеныя вадою зямля і дрэвы ў цішыні грэліся пад сонцам, прыйшоў да Хомчыка старшы групы, якая працавала з конькмі на полі.

Хомчык толькі што вярнуўся ад коней з лесу і прысеў ля Аксені, якая рыхтавала агуркі да засолу.

— Ну, Хомчык, канец, брат, нашай рабоце,— сказаў старшы, смуглявы чорнавалосы дапскі казак Кавягін.— Так мы і ваяваць забудзем, адвучымся...

Аксеня глянула знізу ўверх на Кавягіна і апусціла галаву.

— Хадзі, брат, сюды на хвіліну, штосьці табе скажу,— паклікаў Кавягін Хомчыка.

Яны адышліся аж на дарожку пад сліўкі і некаторы час аб нечым гутарылі.

Аксеня час ад часу паглядала ў той бок. Трывога адбілася ў яе на твары, і рукі ўжо неяк неахвотна гарнуліся да працы.

Кавягін развітаўся з Хомчыкам і спешна адышоў.

— Іду па коні, Аксеня! — сказаў Хомчык падыходзячы.— Зараз жа трэба ехаць у лагер. Такі загад камандавання.

Аксеня зірнула на падворак і маўчала, апусціўшы вочы. Урэшце найшлася на словы:

— Ну што ж... Вайна ёсць вайна, саколік... Нічога не зробіш.

Хомчык адчуваў, што адбывалася ў яе душы. Бачыў, як яна змагаецца з наплывам пачуццяў. Яму зрабілася неймаверна шкада гэтую цудоўную жанчыну. Сеў, абняў яе, ціха і моцна прыгарнуўшы да сябе, пацалаваў...

— Не тужы, Аксеня...— ціха прамовіў ён і, ускочыўшы з месца, накіраваўся ў лес.

Аксеня выцерла слёзы фартухом і пайшла ў хату.

...Коні стаялі запрэжаныя. Аксеня клала на воз мяшок і торбы: быў там хлеб, сала, сушаны сыр, дзве змены бялізны і нават клубочак нітак з іголкай.

Праводзіла яго праз увесь сасоннік аж да канца. Пры развітанні спыталася:

— Няўжо ж такі ніколі не загляпеш? Хіба куды ад'едзеце адгэтуль?

— Добра яшчэ не ведаю. Здаецца, што ад'едзем, дарагая. Але гэта ненадоўга. Сюды потым усё роўна вернемся.

Чуваць пешта пра блакаду, Аксеня... Але яшчэ добра не ведаю...

— Забяры мяне з сабою. Чаго мне цяпер жыць адной?

Хомчык падумаў: «Цяжка гэта...»

— Пагавару з камандзірам... Бывай, дарагая, не тужы. Я заўтра пастараюся падскочыць да цябе.

Аксеня ішла назад праз сасоннік, і крыху блыталіся яе ногі. Не чула шуму птушак, якім абгалошваўся абмыты дажджом сасоннік. Калі яна апынулася на сваім падворку, упершыню адчула цяжар адзіноцтва.

І бяроза, і груша, і хатка — усё глядзела на яе ціхім сумным вокам. Яна ўвайшла ў хату, упала галавою на падушку і заплакала.

Назаўтра быў ветрапы дзень. Вялікія белыя хмары плылі адна за другою і часам закрывалі сонца. Хомчык прыехаў да Аксені пасля абеду верхам. Спяшаўся, павят не хацеў паесці, але Аксеня ўпрасіла. Сама яна выглядала прыбітай, схварэлай.

— Цяпер, дарагая, і не ведаю, калі да цябе вярнуся,— сказаў Хомчык, развітваючыся з Аксеняй.— Сіла вялікая немцаў ідзе на блакаду, аж сорак чатыры тысячы. Будзем разбівацца на дробныя групы і манеўраваць... Трэба насельніцтва падрыхтаваць, каб закопвалі ў зямлю сваё дабро. І ты зрабі тое самае. Старайся схавацца, каб немцы не забілі... Яны будуць паліць вёскі... Трэба, каб усе ведалі аб гэтым.

Аксеня тулілася да грудзей Хомчыка і казала:

— Вазьмі мяне з сабою...

— Не тужы... Сустрэнемся... Я цябе не забуду.— І, тулячы апошні раз Аксеню да сябе, ён прыклаў свае вусны да яе вуха і шапнуў: — Не забудзь, дарагая, што я табе казаў учора... Глядзі, не губі... Радзі...

Яна прыпала тварам Хомчыку да грудзей і слухала яго сэрца.

— Яшчэ раз кажу, не забудзь. Я вярнуся...— сказаў ён перад тым як ускочыць па каня.

Конь з месца паплыў па дарожцы між вішань і слівак шырокаю, плаўнаю рыссю... Яго праводзіў засмучаны позірк Аксені.

ГЕНЕРАЛ

Конны атрад заносіць завея, ахутвае снежным пылам. А ноч цёмная, стогне, вые. Нават няма як паглядзець на компас.

Коні грузнуць у снег па калені. Генерал туліцца ў бурку, працірае вочы. Па хадзе каня ён усё ж такі адчувае, што атрад на бітай дарозе. Аб гэтым папаміпаў і ледзь прыкметны збоку нізкі хмызняк, хоць за ім была паласа снежнага пылу і цемра ночы.

Генерал пасылае ад'ютанта праверыць ар'ергард.

«Вось дык пагодка... Усе тылы ворага замяло... Можпа нямецкі гарнізон разбіць у пяць хвілін, але можна і наткнуцца. Як дойдзем да Пяскоў, гэта будзе ўдача. Немцы нас будуць шукаць у Дзікім балоце. Так і трэба. Мы ім зойдзем з другога боку,— думаў генерал.— Але як доўга будзем ехаць?»

Генерал нават падумаў аб прывале — перадыхпуць, выслаць разведку ўперад... Праз хвіліну ён адкінуў гэтую думку.

Ехалі далей. Завіруха сляпіла вочы. І вось нечакана фыркнуў конь генерала. Генерал быццам абудзіўся ад дрэмы і, невядома каторы раз працёршы вочы, падабраў павадкі.

— Блізка жыллё,— сказаў ён і паляпаў каня па шыі.

Неўзабаве з дазорнай групы данеслі, што на шляху — вёска. І сапраўды, з цемені вылучалася пешта накшталт копкі сена. Гэта была першая хата, а за ёю ледзь прыкметна вызначалася вуліца. Завея круціла, свістала ля вуглоў і ў платах. Генерал падумаў зайсці ў якую-небудзь хату і запытацца дарогі, але ў гэты час пешта мільганула недалёка і згасла. Затым бліснула зноў.

— Агонь,— зазначыў генерал,— яшчэ пехта не спіць.

Ён падаў каманду спыніцца і сам злез з каня. Зайшоў на падворак і загляпуў у залепленае снегам акно. Бачыць: гарыць камінок і пехта сядзіць, схілены, над работай. Генерал, прыгпуўшыся да нізкага акна, прыпаў да шыбіны. Адагнуўся — рука вобмацкам пайшла па сцяне і адшукала дзверы. Генерал пастукаў. Глуха, цяжка адчыніліся недзе ў глыбіні хатнія дзверы, і ў сенцах пачуліся асцярожныя крокі.

— Хто там?

— Падарожныя. Адчыні, дзядзька...

П. Пестрак.

Москва, 1943 г.

У час адпачынку. *Злева направа:* К. Кірэенка,

І. Грамовіч, А. Вялюгін, П. Пестрак, П. Панчанка.

Каралішчавічы, 1948 г.

Грукнула засаўка, і генерал ступіў праз высокі парог у сенцы, як у яму.

Пад акном застаўся стаяць вартавы.

Генерала ў хаце абдаў прыемны пах смалы і цеплыня.

— Добры вечар,— прамовіў генерал. Ён зняў папаху, абтрос яе і надзеў зноў. Затым скінуў бурку і таксама стаў абтрасаць. Язычкі полымя з камінка ўпалі на прозалаць пагопаў і асвяцілі зорку...

Дзядзька з калматай галавой і расхрыстанымі грудзьмі стаяў апямеўшы, трымаючы педаплецены лапаць у руцэ.

— Божа мой... Адкуль гэта? — шаптаў ён.

Генерал мелькам зірнуў на дзядзьку і, нічога не сказаўшы, абтрэсваў бурку.

— Дайце... Дайце я...— кінуўся дзядзька.— Адкуль жа гэта?

Генерал, паклаўшы бурку на лаву, прайшоўся па хаце. Гэта быў чалавек год за сорак, бязвусы, чарнявы, з пасівелымі скронямі. Яго постаць у шынялі стала зграбнай і жвавай. За печчу на палку, засланым дзяругай, спала жанчына і двое дзяцей. Над іх галовамі на жэрдцы віселі новыя лапці і нейкая вопратка. У покуці стаяў невялікі стол, пры сценах — лавы... Твар генерала стаў важна-задуманым. Яго шэрыя вочы нібы шукалі чагосьці ў кутках, калі ён праходзіў па хаце, заклаўшы рукі назад.

«Усё нібы забытае, але знаёмае»,— падумаў ён і, ціха ўздыхнуўшы, прайшоўся назад да парога.

— Сядзі, сядзі, дзядзька, не турбуйся. Мы — людзі свае...

Дзядзька са здзіўленнем углядаўся на генерала, і ад яго нясмелай усмешкі дрыжалі вусны пад апушчанымі вусамі. Дрыжаў таксама і лапаць у руках.

— Толькі двое дзяцей? — спытаўся генерал.

— Не... два сыны яшчэ ў арміі. І дачка яшчэ...

— А дзе дачка?

Дзядзька сумеўся. Хто ведае, казаць ці не. Розны люд цяпер ходзіць.

— Начуе ў суседкі...— адказаў дзядзька і схіліўся над лапцем.

— Баішся казаць? Не бойся... Я савецкі генерал. Еду з атрадам. Пакажы нам дарогу на Пяскі...

— Я ж бачу — пагоны рускія... Чулі мы трохі пра іх... Вярнулі, бачыш... Дарога? Дарога вось проста. Пяць кіламетраў да Пяскоў.— Дзядзька казаў пра дарогу, а сам

верыў і не верыў, свой гэта генерал ці не свой. Генерал гэта заўважыў і таму звярнуўся да дзядзькі:

— А ну, дай мне лапаць!..

Ён сеў на калодачку і стаў падплятаць лапаць. Спрытна падкалупваў, саджаў палосінку, браў яе ў зубы, тады зноў падкалупваў...

Дзядзька глядзеў як сам не свой.

— Немцаў тут не было? — прадаўжаў генерал.

— Прайшлі ўчора рапа. Кажуць, у Дзікае балота на партызан. Карову ў мяне забралі і жыта, што было намалочана. Усё дапякалі мяне, што мая дачка ў партызанах... Даказаў нехта.

Палосінка жвава шуршэла ў руках генерала і зацісказлася ў адпаведным месцы.

— Не так даўно забралі ложак,— гаварыў дзядзька,— мусіць, для лазарэта. Казалі, што рускім невыгодна спаць у ложку.— Дзядзька змоўк, затым дадаў: — Спаляць нашу вёску, няйначаі.

Генерал панура ўскіпуў вочы на дзядзьку.

— Бачыш? — сказаў ён, аддаючы лапаць.

— Умееце... Умееце.— з радасным бляскам у вачах паўтараў дзядзька.

Генерал устаў, і ценем пакрыліся пагоны на шынялі. Ускінуў бурку на плечы і яшчэ раз азірнуўся на хаце.

— Бывай, дзядзька. Скора чакай у госці з добрай навіной,— сказаў ён і накіраваўся да дзвярэй, махнуўшы рукавом па твары. Што ён там змахнуў — кроплю расталага снегу ці што другое, хто ведае...

Генерал выйшаў у завіруху і крыкнуў: «На конях!» — хоць усе былі імепна на конях.

Дзядзька стаяў пры весніцах у адной сарочцы, аж пакуль не праехаў атрад. Вярнуўшыся ў хату, ён стаў у задуме, развёўшы рукі:

— Да галавы не прылажу... Што гэта за генерал?.. І лапці плесці ўмее, і гаворыць па-нашаму... Наш, відаць.

Ён раптам кінуўся да акна і глядзеў у цемрадзь ночы, сам не ведаючы чаму, потым адвярнуўся ад акна і стаў будзіць жопку: «Ганна, устань, я табе нешта раскажу...»

ГАРАЦЬ ВЁСКІ

Снег не падае, як звычайна,— ён сыплецца з вышыні цёмнага начнога неба лёгкаю завейкай, якая, здаецца, вось-вось гатова перайсці ў снежную буру-завіруху. Сыплецца над вяршынямі неабсяжнага лесу, круціць у яго сплеценых галінах, засыпае гурбамі дарогі і нетры; імгліць у заравах пажараў, якія палыхаюць з усіх бакоў высокімі слупамі полымя. Яно жахае, дрыжыць на фоне шэрага неба; то праясняецца, то зацямняецца. Гэта гітлераўцы паляць вёскі.

Снег асядае на галінах сосен. Ён асядае і на людзях, якія забіліся ў трушчобу і, расклаўшы агні, сядзяць, як прывіды, ахутаныя хто чым папала — хто хусткаю, хто дзяругаю; хто ў цёплай шапцы, а хто ў кепцы. У Паўла Карпевіча, яшчэ маладога русавалосага чалавека, дык і шапкі няма. Ён закруціў галаву хусткаю і курыць, седзячы ля агню. Хто свежы падыдзе да агню, абавязкова падумае, што гэта жанчына. Павел Карневіч — калека, прыкульгваючы на адну нагу, толькі што прыйшоў з ускраіны лесу, прысеў і грэе рукі над полымем. Усе скупіліся каля яго.

— Наўкол гарыць... Куды ні глянь...— прамовіў ён.— Гарыць, як па заказу...

— Прыйдзецца прапасці...— сказаў жаночы голас ззаду.

— І дзе я падзенуся са сваімі дзеткамі? — праз плач прамовіла другая жанчына.

— Вось праклятый фашыст, прыйшоў на нашу пагібель...— суровым голасам, амаль басам, прабубніла нейкая старая.

— Вось дык вайна, яшчэ свет не бачыў такое. Гэта ж не жарты — знарок паліць сёлы, людзей, забіваць дзяцей... Няўжо яму не зложаць канцоў? — пытаецца дзядзька Арсен, каржакаваты, з рыжаватай барадой, стоячы блізка ля агню і склаўшы рукі на жываце.

— Зложаць, быць не можа,— працяжна сказаў Іван Дропік, смуглявы чалавек з дзюбатым носам і пасівелымі скронямі.

Агнёў гарыць цэлы рад, ля іх шалашы, накрытыя сенам, на якое тонкім слоем нападаў снег.

Недзе ля аднаго агню час ад часу гудзе голас старой Цыруліхі (так яе завуць па-вулічнаму), якая сядзіць на паслапай саломе і выглядае, як копка:

— А лою, лою засталося... Цэлыя пачоўкі. І трэба ж было мне яго не схапіць. Ой, божа ж ты... А...— і старая ў роспачы махнула рукою ў паветры.— Што — лой? Цэлага заколатага парсюка пакінулі. Хавалі ў матрацы, каб немцы не знайшлі... На, усё прапала, пайшло з дымам...

Старая застагнала. Здавалася, яна кінула гаварыць, але боль утраты штурхаў яе да слоў:

— Ды дзе ты што пахопіш? Бачу, канец сяла ўжо гарыць, страляніна навокал. Я ж такі і думала пра гэты лой, але падлюга як аперазаў па галаве нечым цвярдым, я і скруцілася на месцы...Ох, божа, паўзла затым па снезе...— Цыруліха ўсхліпнула, і слёзы заблішчалі на яе вачах. Усе, хто сядзеў і стаяў, спаважнелі, паціхлі.

Ніхто не спаў, апрача малых дзяцей, якіх маткі палажылі блізка ля агнёў у шалашах.

Сцяпан Струк, былы будзёнавец, высокага росту мужчына, з доўгімі шэрымі вусамі, у шапцы з цялячай шкуры буланага колеру, гаварыў, як аратар:

— Зброю дайце! Камандзірам стану... Зараз стану!..

Сцяпан Струк быў у паношанай шэрай суконнай куртцы сваёй работы. Ён паспеў схапіць з хаты толькі сякеру і табаку ў мяшэчку... Жонка — стары кажушок, які Сцяпан і падапрануў пад куртку. Інакш — акалеў бы ад холаду. Тут жа побач ціха плакала, стоячы, прыгожая стройная маладзіца, у якой гітлераўцы забілі бацьку і дачку.

— Не плач, Алена, яшчэ мы сваё возьмем! — крычаў на ўвесь лес Сцяпан.

— Калі ты камандзір, дык табе чарга ісці ў разведку! — гукнулі жанчыны.

— Ну што ж, і пайду! — адказаў Сцяпан, і праз хвіліны тры ён з сякерай на руцэ накіраваўся ў бок вёскі.

Але найгорш, мусіць, ціхаму і папураму Петрусю Капановічу. Год таму назад памерла яго жонка і пакінула двое дзяцей-блізнят па году. Пятрусь іх выхапіў цяпер амаль што з агню. Нёс на руках, голых, босых. На правай руцэ — хлопчыка і буханку хлеба, а на левай — дзяўчынку. Ворагі гналі іх па шляху на Мазыр. Хто адставаў — білі прыкладамі. Некалькі паспелі застрэліць. Куды гналі і нашто — невядома. Няйпакш, як толькі пастраляць па дарозе. Завіруха з марозам спыняла дыханне. Пасля дагнала патоўп машына, з якой вылез нямецкі афіцэр паліцыі і сказаў стаць. Нейкая небяспека, відаць, ім пагражала, бо афіцэр забраў усіх канваіраў, сказаўшы патоўпу, каб самі ішлі ў Мазыр і ніхто не пасмеў варочацца... Як толькі

машына павярнула назад і дала газу, патоўп людзей у адзін момант разбегся па лесе. Тады вось і памерзлі дзеці Канановіча. Пятрусь, аброслы чорнаю шчаціною, сядзіць цяпер, сагнуўшыся, пры агні, курыць, ні з кім нічога не гаворачы. Туга глядзіць на агонь. Толькі часта глуха кашляе. Вось тут непадалёку, за тым месцам, дзе фыркаюць некалькі коней пры санях, учора пахаваны яго дзеці.

Гутарка людзей мала-памалу перайшла ў ціхі гул, з якога часам вырываўся голас ужо знаёмай скаргі:

— Ой, ды ж лою-лою... Гэта ж не жарты — цэлыя начоўкі... І чаму ж такі я яго не схапіла?..— з ціхім усхліпваннем канчала Цыруліха, пакалыхваючы галавою ў такт свайму бедаванню.

Дровы трашчаць. Полымя шыбае ўверх роўна, бо ў густым бярэзніку не праймае вецер. Людзі не ведаюць, што будзе з імі заўтра.

— Дзе ты возьмеш цяпер лесу на хату? — гаворыць энергічная Настуся Говар, якая любіць весці баявыя гутаркі з мужчынамі. Яна і цяпер стаіць ля агню ў ваяўнічай позе, адставіўшы левую нагу ўперад. Яе чорныя бровы сышліся ў вузялочак над пераноссем.

— Бывала, калі нават ідзеш на работу, дык лепш прыадзенешся, а цяпер... усё пайшло прахам...— сказала мілавідная Мар'я Чарняўская.

— Колькі часу зубы паскаліш, бывала... дый яшчэ з калгасным старшынёй пасварышся, і ўсё было добра,— дадала суседка Каця, з кірпатым носам на круглым твары.

Усе жанчыны пераглянуліся і падтакнулі. Па іх задумёных тварах злёгку прабегла ўсмешка. Гатовы былі, здаецца, жартаваць, але... было не да жартаў.

Сцяпан Струк вярнуўся з разведкі праз гадзіны тры. Усе чакалі яго з нецярплівасцю. Трывожыліся, што доўга няма, і хацелі нават пасылаць за ім. Але ён вось прыйшоў. Усе, як па камандзе, глянулі на яго, уздыхнулі і прытаіліся. Што ён скажа?

Расступіліся і далі яму месца пры агні. Сцяпан Струк маўчаў, не спяшаўся, крактаў, грэючы рукі над агнём... Стала абсалютна ціха. Сцяпан выпрастаўся, выцер вусы, разгладзіў іх і тады глянуў навокал.

— Ну, адгадайце, што скажу?..— прамовіў ён і пасля паўзы дадаў: — Збірайцеся дадому, немцы ўжо ўцяклі...

— Што ж, можна і пажартаваць...— сказаў пехта.

— Дык вось...— пачаў разведчык,— ішоў я зарэчпаю дарогай... Не сюдою... —і Сцяпан махнуў рукою направа.

— А чаго цябе пагнала туды? — спытаў Арсен.

— Гэта, брат, была мая дагадка... так яно і выйшла... Натрапіў на заблудаўцаў... таксама сядзяць, як і мы. Чуў, што фашыстаў, якія палілі нашы вёскі, перасцілі партызаны, не даходзячы да жалезнай дарогі, і ўсіх перабілі да аднаго! — Нос Сцяпана быў задзёрты ўгору, а з ім разам і доўгія вусы. Сцяпан горда аглядаў усіх.

Лёгкі шэпт прабег па людзях... Нехта аблегчана ўздыхнуў, нехта кашляпуў. Пятрусь Кананоўіч устаў і падышоў да таго агню, дзе стаяў Сцяпан Струк. Мужчыны загудзелі ў адзін голас: «Го-го... гэта здорава...»

— Адкуль жа бог прыслаў тых партызан? — наперабой пыталіся жанчыны.

— Гэта, бабкі, не нам з вамі знаць! — крычаў Сцяпан.— Гэта партызаны Сабурава. Сабураў — камандзір. Кажуць, вельмі адважны...

Вымаючы кісет, ён гаварыў далей:

— Сядзім вось у лесе і нічога не ведаем... Учора другі камандзір, Каўпак, разбіў нямецкі гарнізон у раёне... Бой ішоў, кажуць, тры гадзіны. Было забіта восемдзесят немцаў і трыста паліцаяў. Каўпак пайшоў далей, а тыя гітлераўцы, што ўчора спяклі нас, сёння спалілі наша раённае мястэчка... Але папаліся ў рукі Сабураву...

Усе слухалі, затаіўшы дыханне.

— Цябе толькі і пасылаць у разведку,— сказаў нехта.

— Сцяпанка, то, можа, тыя партызаны і к нам прыйдуць? — спыталася Настуся Говар.

— Гэта... нават можа быць.. трэба чакаць...

Пасля апавядання Сцяпана ўсім раптам стала лягчэй, весялей глянулі вочы, і надзеяй на ратунак напоўнілася душа кожнага. Цыруліха, падпёршы шчаку кулаком, сама сабе мармытала:

— І дзе ж гэта я чула пра таго Каўпака? Ці хто казаў, ці, можа, у спе мне прыдалося...

Вылез з шалаша і заспаны Мікалай Пятрэнка, з русымі пушыстымі вусамі і посам, як бульбіна. Прысадзісты, непаваротлівы, ён праціраў вочы, грэў рукі над полымем і павольна, як бы перакідаючы што цяжкае з месца на месца, казаў: «Так іх пе-ра-ма-ла-ці-лі...— І закончыў хутка, усё роўна як саскочыў з чаго-небудзь: — О, гэта работа! Ай-яй... Малайцы такі партызаны.— Пасля з выглядам грэчаскага аракула ён дадаў: — Ну, цяпер я ўжо добра ведаю, што ворагу — капут... Прайграў вайну... Цяпер мяне ніхто з толку не саб'е...— Падняўшы палец па

вышыню галавы, як бы каму пагражаючы, ён амаль крыкнуў: — Гэта табе Расія, сукін сын, людаед, а не што-небудзь... Го-го-го!.. Гэта табе не хаханькі...» — і ён доўга глядзеў, паставіўшы вочы, у цемру аснежанага лесу, як бы там недзе хаваўся аб'ект яго абурэння.

Снег амаль перастаў. Якая ж неймаверна доўгая ноч! Здавалася б, калі людзі ў гурце, з'яднаныя адным горам, пяшчасцем, калі не сціхае гутарка, у якой чуюцца часам і слёзы і параканні, успаміны, а зрэдку і смех,— дык ноч павінна прамільгнуць, але ўсё роўна няма ёй канца. Хто ні выйдзе на паляну, дык убачыць, як ад навакольных пажараў застывае на небе паласа крывавага зарава. Яно злавесна палыхае чырвонай меддзю. Людзі кажуць, што гэта застыла чалавечая кроў; доўга глядзяць на зарава, глядзяць маўкліва, панура і адыходзяць з уздыхам.

Ужо і ў табары стала ціха. Дзе-нідзе прарываецца гутарка, але ўжо з пазяханнем. Сон узяў сваё. Ля агню сядзяць толькі Мікалай Пятрэнка і Пятрусь Кананавіч. Мікалай крыху звёў вочы, а Пятрусь ніяк не можа заснуць. Пыхкаючы люлькай, Мікалай угаворвае яго:

— Прылёг бы крыху, Пятрусь... Паспаў бы — паздаравеў... Што ты зробіш... Не вернеш... Годзе думаць... Чалавеку, жывучы на свеце, усяго прыходзіцца паспытаць... Каб ты іх адзетымі вынес, засталіся б жывымі... А так і дарослы можа не вытрымаць...

— Каб то ж адзетымі... У тым жа і бяда... Не магу глядзець, як паміраюць дзеці,— раптам са стогнам сказаў Пятрусь,— каб можна было, сам памёр бы, абы толькі не бачыць... Калі дарослы памірае, дык ён усё ж такі пажыў крыху, пабачыў свету, а дзіця... Яно ж толькі пачынае жыць...

Пятрусь сціх і доўга нерухома глядзеў у полымя.

— Пакінь, пакінь, Пятрусь, даволі, вазьмі сябе ў рукі. Ты яшчэ малады, трэба жыць, трэба дачакацца смерці на гітлераўцаў... Бачыш, усяму народу выпала...

Нешта трэснула ў лесе, і сябры адначасова гляпулі ўбок, у гушчыню. Трэску больш не было чуваць, але Мікалай Пятрэнка ўсё роўна сказаў ціха:

— Нехта ідзе...

Трэск пачуўся зноў, ужо бліжэй.

Пятрусь і Мікалай усталі, насцярожыліся.

— Хто б то мог быць? — амаль зашаптаў Мікалай.

Ужо быў чуцен не толькі трэск, але і крокі па снезе. Нарэшце на святло з цемры выпырнулі дзве постаці з аўта-

матамі за плячыма. У сонную цішыню табара ўварваўся моцны, нічым не стрыманы, голас: «Добры вечар!»

— Добрае здароўе,— адказалі Мікалай з Петрусём і з цікавасцю спалоханымі вачыма ўставіліся на прыбылых.

Тыя выглядалі як лесупы. З ног да галавы былі абсыпаны снегам, быццам яны капаліся ў ім. Адзін — у калматай чорнай шапцы і ў шынялі — быў сталы і высокі, другі — у вушанцы і кароткай ватоўцы — малады, з круглым тварам. У першага чорны парост на барадзе і чорныя вочы прыдавалі твару папуры выгляд.

— Што, спяць? — спытаўся вышэйшы.

— Ага, спяць,— адказаў Пятрэнка,— намучыліся людзі за дзень.— А пасля спытаўся: — А вы хто будзеце?

Невядомыя не спяшаліся з адказам. Скруцілі цыгаркі, прыкурылі ад агню, і тады той, што ў шынялі, стаў гаварыць:

— Мы — разведчыкі-партызаны... Чулі пра такіх?

— Чаму не чулі? Чулі,— адказаў Мікалай, набіваючы люльку табакай і пільна прыглядаючыся да партызан. Глядзеў на шапкі — можа, там будзе які значок. Не, апрача чырвоненькай стужачкі, нічога не было. «Хто яго знае, бывае, што і паліцаі адзяваюцца так, як партызаны»,— думаў дзядзька Мікалай. І толькі тады стаў верыць, што гэта партызаны, калі яны разгарнулі невялікі не то план, не то карту,— адпым словам, нешта накрэсленае,— і сталі вылічваць, адкуль выйшлі, кудою ішлі і дзе знаходзяцца цяпер.

— Куды ідзе дарога, што тут недалёка? — спытаўся старэйшы, паказваючы рукою на ўсход.

— На Сівы Мох. Адгэтуль будзе да яе кіламетраў сем.

— Бачыш, як мы паблудзілі,— сказаў той самы, звярнуўшыся да таварыша.— Нам трэба было іменна ісці праз Сівы Мох. Так нам і гаварылі ў штабе. Ці немцы Сівы Мох таксама спалілі? — спытаў ён дзядзьку Мікалая.

— Мяркуем, што спалілі, бо зарава на небе ў тым баку было,— адказаў Мікалай Пятрэнка.

— Вось што, дзядзька, хоць людзі спяць, але няма часу чакаць, пакуль выспяцца. Трэба будзіць. Гутарку невялікую будзем мець да вас.

Мікалай з Петрусём сталі паднімаць людзей. Першым да агню прыйшоў, праціраючы вочы, Сцяпан Струк, за ім — Іван Дропік, пацягваючы шапку на вушы, а там і іншыя.

Жанчыны, пазяхаючы, падыходзілі і адна ў адной

з трывогай пыталіся: «Хто гэта?» Другія ў адказ паціскалі плячыма, а некаторыя адказвалі шэптам: «Мусіць, партызаны...»

— Вось што, таварышы,— пачаў старэйшы,— мы — разведчыкі-партызаны злучэння генерал-маёра Сабурава. Вось пару дзён таму назад наша злучэнне прыйшло на тэрыторыю вашага раёна. Разведкай нам удалося ўстанавіць, што эсэсаўцы за два дні ў вашай аколіцы, калі лічыць і Сівы Мох, спалілі чатырнаццаць вёсак. Каб не наш прыход, яны палілі б і далей — увесь раён. Але тыя падпальшчыкі перахвачаны намі і знішчаны. Нам трэба ўзяць пад абарону людзей, якія засталіся ад пажараў, дапамагчы ім, бо гітлераўцы яшчэ будуць прабаваць прабірацца сюды. Мы хочам стварыць сямейныя атрады, перавесці вас крыху бліжэй да стаянкі адной з нашых брыгад. Там пакапаеце сабе зямлянкі, і будзем ваяваць разам...

Аратар прыпыніўся, агледзеў вокам увесь натоўп і, крыху ўсміхнуўшыся, прадаўжаў далей:

— Вам трэба будзе выбраць камандзіра свайго сямейнага атрада...

Усе ў адзін голас загудзелі: «Сцяпана Струка... Сцяпана...»

Сцяпан Струк разгладзіў вусы і звярнуўся да партызан:

— А скажыце, што гэта за сямейны атрад, гэта што — разам з бабамі ваяваць? Я так разумею...

Партызаны засмяяліся, а за імі і мужчыны.

— Так, пільнаваць людзей, трымаць парадак, арганізоўваць разведку, зямлю араць, сеяць і так далей,— адказаў партызан.

— Не,— адказаў Сцяпан Струк, развёўшы рукамі,— вызвальце мяне ад гэтага, я тут не ваяка... Вы мне дайце зброю, я баявы атрад сабяру і камандаваць буду, я ў Будзёнага ўзводам камандаваў...

— О, то тым лепш,— гукнулі партызаны.— Збірайся, пойдзеш з намі ў дарогу. А вам,— звярнуўся да ўсіх,— трэба выбраць другога, раз так.

— Мікалая Пятрэнку,— запрапанаваў Пятрусь Канановіч.

Усе ў адзін голас падтрымалі:

— Правільна! Правільна... Харошы будзе нам камандзір...

Па людзях пайшло ажыўленне. Мікалай Пятрэнка ўсміхаўся і гаварыў:

— Дзякую за выбары... А цяпер трымайцеся, я вам дам газу...— і чамусьці прыўзняўся на пальчыках.

— Арганізуйце пакуль што рэгулярную разведку,— гаварыў той самы партызан.— Калі будзе пагражаць небяспека, кіруйцеся на Сівы Мох. Заўтра будзе вядома, што вам рабіць...

Партызаны збіраліся адыходзіць. З натоўпу раптам падскочыла да іх Настуся Говар і з імпэтам засакатала:

— А скажыце, дарагія таварышы партызаны, ҳачу спытацца, ці то праўда, што ў Маскве выдумалі магніт, які сцягвае нямецкія самалёты на зямлю?

Натоўп заціх у напружанні. Партызаны стаялі з вясёлымі ўсмешкамі на тварах.

— Так... ёсць такі сродак...— павольна прамовіў старшы, і яму зараз жа падтакнуў і другі партызан: «Правільна, ёсць, і я гэта чуў...»

Настуся з трыумфам глядзела на натоўп, прыўзняўшы галаву:

— Што — ці ж я не казала? Такі мая праўда!..

— Твая, твая,— нехта адказаў з натоўпу.

— Ну, нам пара,— сказалі партызаны.— Бывайце здаровы, да світання нам трэба быць на месцы.

...Яны ішлі вошчупам, некранутымі снежнымі дарогамі, якія віліся праз ціхі, засыпаны снегам лес. Калі ў адным месцы выйшлі на поле, прад вачыма стала ўся ў агні дагараючая вёска, а навокал з-за лесу падымаліся ў неба палосы зарава. Партызаны і Сцяпан Струк спыніліся. Водбліск пажару вогнікамі адбіваўся ў іх вачах. Нешта цяжкае, прытоенае было ў іхніх поглядах, постацях...

З такім настроем партызаны ўвайшлі і ў зямлянку камандзіра брыгады. Яшчэ вісела ноч над лесам і падаў снег. Камандзір, у гімнасцёрцы і кубанцы на светла-русай галаве, сядзеў схілены пры газнічцы над нейкімі паперамі. Прыўзняўшыся, ён глянуў на партызан. Твар яго выдаваўся белым, з цёмнымі кругамі пад вачыма.

— Таварыш камандзір! Партызаны Агароднік і Сідарэнка вярнуліся на выкананні задання...

— І што ж скажаце? — з таварыскай прыхільнасцю спытаўся камандзір. Яго вочы глядзелі на партызан і яшчэ думалі аб нечым другім.

Партызан Агароднік хвіліну маўчаў, чорнымі гарачымі вачыма гледзячы ў твар камандзіру, а пасля, як падземным голасам, кінуў у змрок зямлянкі:

— Гараць вёскі... таварыш камандзір...

*

ЯК ДЛЯ СКРЫПКІ СТРУНЫ...

— А кыш, а кыш!.. Каб на вас... Адбою ад вас няма... Абы толькі адчыніў дзверы, так і вы тут...— крычаў на курэй стары Іван Кляшчэвіч, кладаўшчык калгаса, адчыняючы кладоўку.

Куры і сапраўды, мусіць, пазнавалі шэрую куртку Івана, апранутую на кажух, гаспадарскія боты з падкоўкамі, ад якіх на снезе адбіваўся чысты, выразны след. Крыху схіліўшы галаву ў шапцы-вушанцы на правы бок, ён кожны раиак ішоў у кладоўку. А куры розных масцей і парод — з грабянямі, з шышачкамі на галовах, нават дзюбастыя пеўні з імі — усе чарадою беглі за ім.

— А дзе я вам набяруся? Кыш да сваіх гаспадынь!.. Вось скора птушкаферму сарганізуюць, тады... тады будзе вам воля... А кыш!..

Куры на момант разбягаліся ў бакі, але потым ізноў асцярожна збіраліся, сакочучы, і імкнуліся за кладаўшчыком.

Нешта не ў пастроі сёння Іван Кляшчэвіч, бо зачаста пакрыквае на курэй. Дзверы ў кладоўцы адчынены насцеж, бо ад аднаго закратаванага невялічкага акна мала святла.

А адчыніш дзверы, тут табе вясёлае сонца бухне снапом праменняў на падлогу, і ўвесь калгасны двор відзён як на далоні.

Праца ў кладоўцы такая, што сядзець на месцы не даводзіцца, ды часам у старога Кляшчэвіча нават пот выступае на лбе. І ўсяму віною гэты праклятый бязмен...

— Цьфу! Вось кара... А кыш, каб на вас!

І стары Кляшчэвіч часам, даведзены да сапраўднай злосці, гатоў схапіць мятлу і адагнаць курэй на кіламетр ад кладоўкі. І ўсё гэты бязмен... «Вось знайшлі вагу... Калі бабе трэба хлеба фунт пазычыць у суседкі, ну тады ён яшчэ можа служыць сваю службу... А тут? Столькі ж народу прыходзіць, пудамі трэба з людзьмі разлічвацца...

Хочацца, каб галава бязмена заўсёды трошкі ўніз глядзела, а калгаснік наровіць, каб тырчала ўверх. Вось і спрэчка, заўсёды спрэчка... Не дадаю ім, бачыш... А дзе я вазьму, як не хопіць?.. Хіба ж гэта вага? Хіба ж можна ёй давяраць?..»

Стары Кляшчэвіч, адважыўшы калгасніку збожжа на працадні, падзяваў па нос акуляры ў драцяной аправе і алавіком, што піткай быў прывязаны да пераплёту кніжкі, запісваў у «расход». І тады з палёгкай уздыхаў. Хапаўся за мятлу, падмятаў у куток рассыпаныя зярняты жыта або ячменю. І калі доўга ніхто не прыходзіў, Іван зусім супакойваўся, пускаючы дым з цыгаркі. Звяртаўся да кусурэй: «На бязмен спадзяецеся, га? Падбірайце, што рассыпана ля кладоўкі... Гэта — ваша...» А на сцяне, як чорпы вужака, вісеў ён — вораг Івана — пудовы бязмен. Іван крыва паглядаў на яго, думаючы: «Наробіць ён мне бяды, паробіць...» — і пакручваў галавою. Калі ж хто падыходзіў і трэба было важыць, Іван быў незадаволены, калючымі рабіліся яго шэрыя вочы, і ўвесь ён выглядаў непрыступным. Здымаючы бязмен са сцяны, крактаў, і цень суму прабягаў па яго твары. Што зробіш — нідзе не дзенешся ад гэтага бязмена.

Часам заходзіў у кладоўку старшыня калгаса Ціхончык, шмат маладзейшы за Івана, і тады між імі ўздымалася сапраўдная сварка.

— І дакуль я буду смыкацца з гэтай бабскай вагою? — абураўся Іван.— Калгасу нашаму ўжо год. За гэты час ці ж няможна было купіць сапраўдную вагу?

Старшыня ўсміхаўся і пачынаў:

— Знаеш, не ўсё зразу... Знаеш, колькі калгасаў натварылася ў нас, у Заходняй, скажам, за адзін год. Дык гэта, калі кожнаму адразу даць вагу, трэба цэлы завод сюды прывезці і паставіць...

— Не веру я ў гэта... Не гэтае робіцца. Толькі пастараццца трэба...— І, махаючы рукой, Іван крычаў: — Вага для калгаса, як для скрыпкі струны. На кожны раз не напазычаешся, за ўсё плаціць трэба, чаму ж не мець сваё?..

Сварка канчалася тым, што кладаўшчык Іван Кляшчэвіч абзываў старшыню Петруся Ціхончыка пяхлюем. Старшыня адыходзіў, а стары Іван зноў, важачы, пыхцеў над бязменам і спрачаўся за тое, каб жалезная галава бязмена была хоць тропачкі апушчана ўніз. І запісваў: пуды, фунты, пуды... Дабрацца да кілаграмаў — ого-го... Трэба яшчэ

папацець. Добра, што Іван Кляшчэвіч скончыў курсы і наогул любіць кніжку, газету. А каб не ведаў гэтага «прэўрашчэння», што тады было б? Тады машына стой... І рабі, што хочаш... І тут Іван усміхнуўся ў вус ужо ад пачуцця ўласнай годнасці. «Ну, на тое ж мяне і паставілі кладаўшчыком... Ведалі, каго паставіць...»

Прыйшоўшы дахаты, Іван пасля вячэры садзіўся за сваю «бухгалтэрыю» — пераводзіў фунты ў пуды, а пуды ў кілаграмы. Спачатку яму гэтая праца нават падабалася — адчуваў задаволенне, што вось робіць такія цуды — з пудоў кілаграмы. На ўсё трэба навука. «Навука і прыроду адольвае»,— часта казаў Іван. І ўпуку сваёму, вучню Пецю, нават даваў заданне са сваёй «бухгалтэрыі», аж пакуль не ўмяшалася старая Кацярына, жонка Івана:

— Што ты мучыш хлапчанё гэтымі пудамі? Нашто яны цяпер? Каму яны патрэбны? Цяпер жа ўсё на кілаграмы, куды ні пайдзі... Адзін ты вось яшчэ калупаешся з пудамі ды фунтамі.

— Ведаем без цябе, што так,— агрызаўся крыху пакрыўджаны Іван і схіляў сваю сівую галаву над паперамі.

А пасля, калі фунтоў і пудоў наплывала ўсё больш і больш, Іван стаў пратэставаць, праклінаць і работу і бязмен. Што наплывала пудоў, гэта вельмі добра, але паспрамен. Што наплывала пудоў, гэта вельмі добра, але паспрабуй наважыць на такой балдавешцы! І стары Іван, закапаўшыся з галавой у гэтыя «прэўрашчэнні», пачынаў рабіць памылкі. Пералічваў часам і па тры разы. Скроб сваю сівую галаву і казаў: «Дык яны замучаць, гэтыя фунты і пуды. Гэта ж толькі пачатак...» Моташна рабілася па душы ў Івана. Тады позірк яго падаў на сцяну, дзе ля адрыўпога календара вісела старая скрыпка са смыком. Іван Кляшчэвіч у маладосці быў нядрэнным скрыпачом — іграў не толькі моладзі на вуліцы па пядзелях, але і на вяселлях. Цяпер ён іграў часам толькі для сябе ды школьнікам, якія талакою набягуць у пядзелю ў хату. Беручы скрыпку ў цяжкія хвіліны, калі пуды не хацелі ператварацца ў кілаграмы, Іван гаварыў уздыхаючы:

— Эх... вага для калгаса, як для скрыпкі струны... Скрыпка ж ёсць, а струн нестае... Як жа ты будзеш іграць? Гэта ж, каб вага, можна было б кожную саломінку паважыць, не толькі што... Тады табе было б усё ясна як па далоні... А так што? Гэтым бязмепам, як пугаю па вадзе...— і Іван тромкаў сухім пальцам па струне, правяраючы скрыпку. А пасля, старым звычаем, з-за вуха ўда-

раў смычком па струпах, з-пад якіх, як жывая, пачынала скакаць залівістая беларуская полька.

Але пядоўга яна цешыла Івана — ён чамусьці хутка канчаў польку і, зрабіўшы невялічкі перапынак, пачынаў навыводзіць сумную мелодыю якой-небудзь старой песні. Навават жонка Кацярына, слухаючы, часам уздыхала. Ад гэтай мелодыі і ёй, мусіць, успаміналася мінулае, цяжкае, бо топам спагады казала Івану:

— От, не верадзіў бы сэрца... Лёг бы ўжо спаць, а то заеўся з гэтымі фунтамі і пудамі...

Іван Кляшчэвіч не прапускаў ніводнага пасяджэння праўлення і там, настойваючы, каб купілі вагу, крычаў, узняўшы руку, сваё ўлюбёнае параўнанне: «Як для скрыпкі струны...» Да некаторых членаў праўлення не даходзіла параўнанне Івана, і яны збівалі яго жартамі.

— От, сам скрыпач, дык і вярзе невядома што... Пры чым тут скрыпка?

Але некаторыя ўсё ж такі задумваліся над довадамі Івана і ставіліся да іх па-сур'ёзнаму. Калі ж пра гэтую скрыпку сказаў адзін раз Іван на агульным сходзе калгаса, натоўп зварухнуўся, як бы вецер пранёсся па лісцях дрэў. Але і тут не было поўнага ладу. Адны казалі: «О, гэта трапіў дык трапіў... У самы раз...» А другія крычалі: «Паважыш яшчэ на бязмене... Такая бяда... Нашы дзяды і бацькі...»

І, на вялікі жаль для Івана, старшыня калгаса Ціхончык, хоць па-свойму, далучаўся, аднак, да апошніх.

— Не ўсё зразу, Іван Апанасавіч, не ўсё зразу...

І ўрэшце не выцерпеў Іван — падумаўся сам дабівацца... Нікому нічога не кажучы, у базарны дзень паехаў у райцэнтр. Там заявіўся ў сельскагаспадарчы аддзел райвыканкома. Яго выслухалі, паабяцалі, што нешта зробяць. Крыху задумаліся над яго «скрыпкай» і правялі да дзвярэй, супакойваючы. Іван і сапраўды выйшаў заспакоены. Рухавей ішлі яго ногі, і ўвесь ён як бы падцягнуўся і весялей глядзеў на свет.

Але мінуў тыдзень, другі, трэці, месяц — вагі ўсё не было. Толькі старшыня Ціхончык змяніў свае адносіны да кладаўшчыка Івана. Калі раней быў ахвотны і пажартаваць і пагаварыць, выбачаў Івану яго дамаганні, то цяпер прыходзіў у кладоўку пахмураны, маўчаў і нават стаў дзе да чаго прычапляцца.

Гэта не прайшло міма ўвагі Івана. Іван усміхаўся сам сабе і думаў: «Мусіць, папала табе, пяхлюю... А як ты ду-

маў? Вага табе не абы-што...» Калі здаралася сварка зноў за вагу, яна мела ўжо востры характар. Старшыня стаў нават махаць пальцам на Івана і пагражаць: «Заскрыпіш ты са сваёю скрыпкай... Будзе табе вага, задаволішся...»

І сапраўды хутка недзе пазычылі і прывезлі старую заржавелую вагу. Але разам з ёю прыйшла ў кладоўку і рэвізійная камісія. Іван спачатку быў усцешыўся вазе, але, агледзеўшы яе дакладна, выкрыў, што гэта — вага царская.

— Бачыце, што напісана: «Завод Калашнікава. 1890 г.» Вязіце яе назад. Яна мне тут так паважыць, што... На ёй таксама недалёка заедзеш... Яна была ў тысячах рук... Дайце мне вагу, вартую калгаса... Тады рабіце рэвізію... І трэба ж недзе выкапаць такое барахло...

Старшыня Пятрусь Ціхончык, невялікага росту, ужо мо тыдзень, як непаголены, аж у крук згінаўся, даводзячы «дзівацтва» Івана Кляшчэвіча, і крычаў на камісію: «Пачынайце работу. Няма чаго... Яму ніхто не дагодзіць...» Члены камісіі пераглядаліся паміж сабою, усміхаліся і нарэшце, праўда, без асаблівай ахвоты, узяліся за праверку прыходна-расходнай кнігі.

Іван Кляшчэвіч тупаў, маўчаў, як бы не ведаючы, што рабіць. Да сэрца падвальваўся бунт супроць такой абыякавасці. Скруціў цыгарку, закурыў, крыху супакоіўся. А пасля хваля пачуцця непрымірымасці зноў напоўніла ўсю яго істоту.

— То як жа гэта, таварышы? — прамовіў ён з горыччу ў голасе.— Што ж вы, хочаце мяне абясчэсціць? Ці я перад народам у чым правініўся, ці што? Ці я ў партызанах не быў? Ці ж не ўзнагародзілі мяне медалём за службу? Што вы робіце? Прывезяце сапраўдную вагу, тады важце... Гэта тое самае, што бязмен...

Назаўтра Іван Кляшчэвіч у кладоўку не прыйшоў. Хутка паснедаўшы, сеў з суседам у санкі і зноў паехаў у райцэнтр.

Павольна падалі сняжынкі на навакольныя палі, на дарогу, укрывалі грыву каштанавага каня, асядалі на шапку-вушанку Івана Кляшчэвіча, мігцелі перад вачыма, засцілаючы яму часам краявід... Многае давялося перажыць Кляшчэвічу на сваім веку — найбольш, вядома, цяжкага. Дарогі першай імперыялістычнай вайны... Пасля рэвалюцыя, барацьба з белагвардзейшчынай на прасторах Паволжа ў Расіі... А вярнуўся на радзіму — ці ж ён не быў актывістам, старэйшы сярод моладзі, у барацьбе з панамі?

Ці ж ён не хапаўся за кожную свежую кніжачку, газету, каб пачуць, што робіцца ў Савецкім Саюзе? Усюды быў чэсны Іван, усюды змагаўся за праўду... І вось цяпер, калі дачакаўся калгаса, калі на старыя гады паслужыць хочацца, тут не даюць разгарнуцца на ўсю калгасную моц... Не, ца, тут не будзе... «Я пры папах не мог знайсці праўды і не гэтага не будзе... чакаў яе ад папоў, дазнаваў толькі крыўду... А цяпер... не... Я знайду праўду, знайду ўправу...»

Іван заварушыўся, працёр вочы. Знікла снежная імгла, праясніўся далягляд. Штурхнуў суседа локцем і крыкнуў: «Падгані! Дарога харошая...»

...На сценным гадзінніку прабіла дзесяць, калі Іван Кляшчэвіч увайшоў у кабінет сакратара райкома партыі.

— Вы будзеце... таварыш сакратар? — спытаўся, прывітаўшыся, Іван.

— Я, сядайце...

Іван пачаў выкладаць усю сваю справу з пачатку да канца. Сакратар уважліва слухаў, часам перапыняў Івана, пытаўся дзе пра што для ўдакладнення, а пасля кідаў: «Прадаўжайце...»

Калі ж Іван Кляшчэвіч дайшоў да свайго параўнання і, узняўшы палец уверх, сказаў, што вага для калгаса, «як для скрыпкі струны», сакратар заварушыўся, усмешкай праясніўся яго твар. З бляскам у шэрых вачах утаропіўся ў Івана, нават крыху прыадкрыўшы рот. Маршчыны разышліся на лбе. Твар, перад гэтым засяроджаны, крыху цемнаваты, памякчэў, прасвятлеўшы. Памаўчаўшы, сакратар прыгладзіў прывычным рухам рукі свае русыя валасы і ўстаў.

— Дык вось што, таварыш Кляшчэвіч... Едзьце дахаты і будзьце спакойны... Працуйце... Вага ў вас будзе, ды яшчэ якая... Праўда на вашым баку... Каму патрэбен цяпер бязмен або вага 1890 года?.. Правільна... Сацыялізм — гэта падлік. А пра скрыпку вы добра сказалі. Гэта я ўжо запомню назаўсёды... Правільна, што прыйшлі і расказалі... Дзякую... Аб вазе мы падумаем. Едзьце дахаты, будзьце спакойны, працуйце... Зайграе ваш калгас, як скрыпка. Будуць струны, будуць...— усміхаўся сакратар, паціскаючы на развітанне руку старога Івана.

Вярнуўшыся дамоў, Іван неяк незвычайна ўвайшоў у хату. Моцна бахнуў дзвярыма, зачыняючы іх, і гучна прамовіў: «Добры вечар!» Старая Кацярына думала, што, можа, ён выпіў горкай. Не, Іван быў цвярозы. Яго душа іграла, як скрыпка, ад таго, што ён дабіўся праўды. Выняў

з кішэні папяровы пакецік, кніжачку з малюпкамі і перадаў унукам. У пакеціку былі цукеркі, перамешаныя з валоскімі арэхамі.

Вячэраючы, ён несціхана размаўляў, смяяўся, еў з апетытам і хваліў капусту.

— Нешта ты як выпіў сягоння,— не вытерпеўшы, сказала Кацярына.

— Што выпіў... Я ў самога сакратара быў, душу яму адкрыў... Праўды дабіўся... А ты... выпіў...

Павячэраўшы, ён усеўся за свае паперы з тою думкай, што даводзіцца апошнія фунты і пуды перарабляць у кілаграмы. Яго лагодны, радасны настрой не ўлягаўся. Крыху папрацаваўшы, ён схапіў скрыпку са сцяны і ўдарыў увішную польку...

ВЯРНУЎСЯ

Як у пашпарце, так і ва ўсіх канцылярскіх паперах гэты дзядзька пісаўся Даніла Цецярук. Але людзі перахрысцілі яго па-свойму. Відаць, яны зыходзілі з таго, што да такога шчабятлівага прозвішча, як Цецярук, не падыходзіць гучнае імя — Даніла. І таму Даніла ператварыўся ў Данілку. Ды як жа не назваць так дзядзькі Цецерука, калі ён, апрача ўсяго, нізкі ростам, нават вельмі нізкі, з круглым тварам, такім круглым, што каб яго памераць удоўж і ўшыркі, то меркі, напэўна, выйшлі б роўныя. І на гэтым твары, пад носам, размясціліся вусы... Ой, што ж гэта за вусы... Прадмет насмешкі жартаўнікоў, якія празвалі іх кітайскімі.

Дзядзьку Данілку ўжо год пад шэсцьдзесят, але, нягледзячы на гэта, ніхто ніяк не хоча згаджацца з тым, што ён сур'ёзны. Як ні хмурыць бровы ў гутарцы Данілка, як важна ні разводзіць ён рукамі, усё роўна Цецярук ёсць Цецярук...

Арганізоўваўся ў вёсцы калгас. Хто першы запісаўся ў яго? Данілка. Хадзіў гэты маленькі чалавек па вуліцы ад адной грамадкі людзей да другой і ўсё размахваў рукамі, як ветрачок крыламі,— угаворваў уступаць у калгас. А людзі насцярожваліся і казалі: «Вецер у галаве Данілкі... Ці ж нам патрэбны яго ўгаворы?»

Але вось прыехала з раёна начальства. Данілка, на-

браўшыся духу, апрануўся, каб ісці на сход. Тут жонка яму наўпоперак:

— Ты куды?

— Як куды? Не ведаеш? — сурова ўставіўся на жонку Данілка.— Начальства прыехала, у калгас будзем запісвацца.

— У калгас? Навошта ён табе? Хай хто іншы пішацца. А то, як той матыль...

— Дурная ты,— разважліва гаварыў Данілка, павучаючы сваю жонку,— начальства прыехала. А каля яго заўсёды можна пажывіцца.

Гэтае «пажывіцца» было для Данілкі нібы лозунгам, здаецца, праз усё яго жыццё. Часам і сапраўды здаралася Данілку пажывіцца. Калі жылі яшчэ пры панах, аднаго разу прыехаў шляхціц Чвартоўскі наймаць людзей выкарчоўваць лес. Хто ўгаворваў усіх ехаць? Данілка. Сам першы запрог каня. Людзі паехалі, поўзалі на каленях увесь дзень са стогнам і пракляццем навокал грабовых кустоў і зарабілі толькі тое, што паклалі сабе галлё на калёсы і павезлі. А Данілку перапала ад Чвартоўскага не толькі грошыкаў, але і чарка гарэлкі. Данілка ехаў дахаты вясёлы і ўсё хваліў шляхціца:

— Гэта, брат, не нам роўня... Гм... Галава, брат, галава...

Некаторыя адказвалі:

— Вядома, крыху разумнейшая за тваю.

Прыехаў другім разам акапом з маёнтка наймаць на жніво — тое самае атрымалася з Данілкам. Судзілася вёска з панам за сенажаць — Данілка падбухторваў усіх «стаяць гарой», а сам упачы, крадучыся, бегаў да папа для нейкіх перагавораў. Калі ў вёсцы ніхто не хацеў быць намеснікам солтыса, Данілка згадзіўся. Аціраца каля начальства — ого! Карысці можа быць нямала.

Ну а цяпер, пры савецкай уладзе, таксама ёсць начальства. «Чаму ж і з ім не падружыць? Як кажуць, рука руку мые,— разважаў Данілка.— Дагаджу я, дагодзяць і мне». І ён шпарка пакрочыў на сход з намерам крычаць, каб людзі ўступалі ў калгас.

На сходзе, задраўшы галаву, Данілка сапраўды крычаў:

— Што вы страціце? Вы нічога не страціце, усё будзе ваша — і зямля, і коні, і бароны, і плугі. Ды яшчэ трактар дадуць. Нашто нам гэтыя палоскі?!

Данілка крычаў і адным вокам час ад часу паглядаў

на начальства — сакратара райкома і старшыню райвыканкома, хочучы пазнаць, якое ўражанне робіць на іх такая хвацкая яго агітацыя.

Было прыкметна, што начальства задаволена Данілкам — вось знайшоўся актывіст!

Але людзі толькі пасміхваліся... Пехта з кутка крыкнуў Данілку:

— Мы-та запішамся ў калгас, але пабачым, ці запішашся ты. Дарма, што так распінаешся...

— Хто? Я не запішуся? Хто табе казаў? — адсек Данілка і тут жа звярнуўся да сакратара райкома: — Таварыш сакратар, дайце паперы, я першы падаю заяву...

Сход заціх. Людзі затаілі ўсмешкі, гледзячы на Данілку. А Данілка, наморшчыўшы лоб, ставіў каракулі на паперы: «Я прашу прыняць мяне ў калгас першым». Скончыўшы, узняў заяву над галавою і паказаў усім:

— Глядзіце! Напісаў ці не?

Сакратар райкома запрасіў Данілку сесці за стол. Данілка сеў, і трыумф пераможцы разліўся на яго круглым твары.

А ў далёкім кутку хаты пехта перашэптваўся і хіхікаў.

У гэты вечар многія сяляне запісаліся ў калгас. Данілка думаў, што на гэтым уся цырымонія і скончыцца, ва ўсякім выпадку, для яго. А там бог-бацька. Як хвосцік, ён валачыўся за сакратаром райкома след у след.

Але падышоў час абагульнення інвентару. Данілка падтрымліваў:

— А як жа! Трэба... Што трэба, то трэба...

— Дык вось пачнем з цябе,— сказаў абраны старшыня калгаса.— Ты першы запісаўся ў калгас, у першага ў цябе і абагулім інвентар.

Данілка нахмурыўся, як быццам аслупянеў ад нечаканасці. Глянуў на сакратара райкома, чакаючы ад яго ратунку. А сакратар дадаў услед за старшынёй:

— Так, так, таварыш Цецярук, ты выявіў сябе як добры актывіст. Паслужы прыкладам.

Чырвань раптам заліла твар Данілкі. «Няўжо гэты сакратар нічога не разумее — што і да чаго? Я яму дапамог, а ён мне дапамагчы не хоча. Якемісты сакратар. Ці ж калгас не мог бы абысціся без майго інвентару?»

— Таварыш сакратар,— паважыўся сказаць Данілка,— пяхай ужо хто другі паслужыць прыкладам. Я ж за ўсіх не павязу.

— Павязеш, павязеш,— адказваў сакратар.

— Тады дазвольце мне адлучыцца дахаты.

Дома Данілка абходзіў павець і сам з сабою гутарыў:

— Барана новая — ды аддаць! Не... Пастронкі пядаўпа павіў... Аддаць? Не... Яшчэ і калёсы забяруць. Дык што тады застанецца? Ну і сакратар... Някемісты. Не зварыш з ім кашы. А я думаў, што... Эх!..— уздыхнуў Данілка і паплёўся ў хату.

У хаце сеў за стол, падумаў, потым выняў сшытак з школьнай сумкі дачкі, вырваў адтуль лісток паперы. Наслініў карандаш і пачаў пісаць... Дачакаўся Данілка вечара і пайшоў на сход у капцылярыю калгаса. Цішком прабраўся праз натоўп сялян да стала. Там паклаў перад сакратаром райкома сваю заяву і сказаў:

— Таварыш сакратар, звольце мяне з калгаса...

— Чаму? — здзівіўся сакратар.

— Як пайшоў тады ад вас дахаты, дык так закалола ў бакі, што думаў — капцы будуць мне. Вось каб я з гэтага месца не сышоў, што гэта праўда...

Увесь сход грымнуў смехам, аж вокны задрыжалі. Нехта крыкнуў з кутка:

— Таварыш сакратар! Мы ведалі, што так будзе!

А сакратар і не згледзеў, як Данілка прапаў з вачэй. Дзе ён падзеўся? А людзі крычалі: «Дайце яму дарогу!»

Данілка ўцёк.

...Непакояць Данілку ў сне каровы. Розных масцей, яны праходзяць перад вачыма чародамі і не даюць спаць.

Ужо тры месяцы працуе Данілка на бойні ў мястэчку — падводзіць каровы пад нож. Пасля свайго правалу ён уцёк з вёскі.

Праўда, тут, у бойні, можна пажывіцца, але... вось гэтыя сны. Сварыцца часта з жонкаю Данілка:

— Гэта ўсё праз цябе...

А жонка сваё:

— А ці ж я цябе выганяла з вёскі?

Мінуў год, мінуў другі. Крыху абжыўся Данілка на бойні, але ўсё роўна думка аб вёсцы не давала спакою. Як там? Што там? Калі сустрэнецца з адпасяльчанамі, гутарцы няма канца. А калгаснікі гавораць яму і пра капюшні, і пра такі, і пра трактары, і пра тое, што хутка ў вёсцы будзе школа-сямігодка.

— Здорава ў вас паіншло,— круціць галавою Данілка і вушам сваім не верыць.

— Па тры кілаграмы жыта атрымалі на працадзень,—

кажуць яму калгаснікі,— кожны мае досыць хлеба і да хлеба.

— Няўжо так? — дзівуецца Данілка.— Гэта ж столькі ідзе і не заробіш.

— Вяртайся, Данілка,— кажуць яму сябры.

Данілка слухае, раздумвае, уздыхае, але нічога не кажа. Як яму вяртацца, калі ён там стаў пасмешышчам? Як яму на вочы паказацца людзям?

І з таго часу стала грызці Данілку туга. Уначы прачынаецца, думае, пераварочваецца з боку на бок, уздыхае. Пасяліўся тут у мястэчку з сям'ёю ў такой маленькай бакоўцы, што і павярнуцца няма дзе, а ў вёсцы стаіць хата прасторная. І садок пры ёй, і гарод. Людзі добрыя спажываюць. «Эх... парабіў я сам сабе»,— уздыхае Данілка.

Адзін выпадак на бойні зусім вывеў Данілку з раўнавагі. Давялося яму падводзіць адну карову пад нож, ды такую, што проста кропінка ў кропінку падобна да той, якую некалі меў сам. Рукі аслабелі, калі ён яе вёў, нібы сваю колішнюю кармілiцу Кветку.

Прыйшоў Данілка з работы дахаты і ўсё расказаў жонцы. Бедаваў, паракаў на сябе, на другіх і казаў:

— Не, цяпер начальства іншае, не такое, як пры нах. Дагэтуль здавалася, што ўвесь свет па няпраўдзе пабудаваны... А цяпер... не, пешта не так...

І пасля дадаў:

— Ого, каб усё папраўдзе рабілася, не тое было б! А можа ядо так і выйдзе? Што ж, дай божа...

Уздыхнуў Данілка і зноў успомніў пра сваю Кветку. Нямілай яму стала бойня. Вочы хацелі глянуць на поле, рукі хацелі ўзяцца за плуг. Але... як тут адважыцца вярнуцца назад у вёску?

Назаўтра зайшлі да Данілкі аднавяскоўцы. У гутарцы расказалі, што цяпер такі ўраджай збіраюць, колькі людзі жылі — не бачылі.

— А там, Данілка, дзе быў твой хутар, шуміць канюшына, роўная з ячменем.

— Няўжо? — усхапіўся Данілка.— Колькі я ні стараўся развесці канюшыну, не расла, а цяпер — бачыш...

— Так, брат, шуміць, хутка касіць пойдзем...

— Гэта дзіва... Гэта дзіва...— пакручваў галавою Данілка і думаў, які тут ход знайсці, каб вярнуцца ў вёску. Мацаваўся, мацаваўся перад сваімі аднавяскоўцамі і ўрэшце сказаў:

— Ну... Мусіць, трэба пазычыць вачэй у сабакі і вярнуцца назад.

...Дапілка вярнуўся ў вёску, каб жыць па-новаму.

РАЗДВОЕНЫ

Не толькі дрэвы, а, здаецца, нават і неба ўкрылася свежым, ядраністым інеем. Урачыста ўзвышаюцца над будынкамі бярозы ў пушыстай белі. Тэлеграфныя драты прыціхлі — не гудзяць, прыбраліся ў серабрыстыя пацеркі. І толькі калі непаслухмяны, гэты няўрымслівы сваволнік верабей дакранецца да драціны, тады ішей сыпнецца сіне-ружовым пылам на галовы людзей, што едуць і ідуць па нешырокай вуліцы, якая лічыцца тут, у мястэчку, галоўнай. Стаяць адна каля адной драўляныя хаты, і ўсё найболей з простымі вуглямі. Зроблены, відаць, да часу пасля пажару.

Па вуліцы рыпяць сані, ідуць людзі. І ўсё прыбралася ў іней.

Можа, таму ледзь прыкметна і выглядае ў заінявелай ранняй смузе белая вежа невялікага местачковага касцёла, які стаіць за плотам, крыху воддаль ад вуліцы. Недалёка ад яго, блізка каля скрыжавання вуліц, маячыць, як заўсёды, постаць міліцыянера Станіслава Бутрымовіча. Адразу бачна, што пад шынель у яго нешта падапранута, відаць кажушок без рукавоў, бо Станіслаў Бутрымовіч выглядае таўставатым. Шапка з кукардай прыдае яго шырокаму твару выгляд яшчэ шырэйшага. На вушах у Бутрымовіча чорныя замшавыя навушнікі, на руках — скураныя чорныя пальчаткі.

Так вось і стаіць Бутрымовіч з адстаўленай наперад нагою і глядзіць уздоўж вуліцы — то ў адзін бок, то ў другі, праводзячы вачыма падводы, людзей... Усё трэба ўбачыць міліцыянеру — якія людзі ідуць, едуць, на якіх конях, якая праехала машына, грузавая ці легкавая, і нават які прабег, скажам, сабака.

Нельга сказаць, каб падакучыла Бутрымовічу гэтая службовая стаянка, бо вуліца ўсё ж такі шумная, асабліва раніцамі. А калі схлыне народ і навокал стане ціха, тады з шумам каля Бутрымовіча садзяцца неўгамонныя вераб'і. Жартаўнікі, яны прывыклі да яго, не баяцца. Набліжаюцца, лезуць пад ногі, некаторыя нават падымаюць дзюбкі,

нібы хочуць заглянуць у вочы Бутрымовічу — праверыць, можа, ці не сумнавата яму. І Бутрымовіч, з свайго боку, падружыў з імі. Выходзячы з дому, бярэ кавалачак хлебамякішу ў кішэню, каб вабіць шэрых свавольнікаў да сябе.

Знаёмых Бутрымовіч бачыць найчасцей ранкамі, калі яны ідуць — хто на працу да сваіх устаноў, а хто на рынак.

Стаіць Бутрымовіч, увесь заінявелы. Паспеў ужо аддаць чэсць, напрыклад, старшыні выканкома — дзябёламу, чарняваму чалавеку, які яму не зусім падабаецца хоць бы за тое, што не голіцца па тыдню і больш. «Займае такое становішча,— думае Бутрымовіч,— а не ўмее за сабою дагледзець...»

Успомніўся яму адзін выпадак, аб якім ніколі не хацелася ўспамінаць, як аднойчы ўвечары напаткаў ён гэтага старшыню п'яным і давёў дахаты. Ну што ж, чаго не бывае на свеце?..

Стаіць міліцыянер Бутрымовіч і час ад часу пружыніста падскокне, ляпне з размаху абцасамі змерзлых ботаў і аддасць чэсць — ці то знаёмаму, ці якому яшчэ начальніку.

Вось едзе на «вілісе» сакратар райкома Трошчанка. Яго Бутрымовіч заўважыў здалёк і падрыхтаваўся, як заўсёды, прывітаць асабліва, адменна. Як жа! — галава раёна. І Бутрымовіч так ляснуў абцасамі міліцыянерскіх ботаў, што аж вераб'і, што сядзелі над ім на тэлеграфным дроце, спалоханыя, фыркнулі і селі на страсе процілеглага дома.

Сакратар адказаў кіўком галавы і нават злёгку махнуў рукою ў бок заінявелага Бутрымовіча, які, трымаючы далонь пры шапцы, павольна праводзіў вачыма машыну сакратара. Потым міліцыянер зноў застыў, апусціўшы рукі і адставіўшы нагу ўбок. Яму вельмі падабаецца назіраць за вуліцай, і ў такія хвіліны здаецца, што ён не міліцыянер, а проста вясковы хлопец, які ранкам пайшоў са свайго падворка і назірае за ўсім, што робіцца ў вёсцы.

Але вось Бутрымовіч раптам схамянуўся. Злева недалёка заскрыпелі палазы, ля касцельнай брамы спыніліся санкі, запрэжаныя ў пару чорных, сытых коней. Фурман, утыркнуўшы нагу з доўгім пугаўём у перадку сапак, адчыніў веспічкі і пайшоў у касцельны падворак. Неўзабаве разам з ім выйшаў да сапак высокі, белабрысы мужчына ў доўгім чорным паліто, у зімовай шапцы і сеў у санкі. Гэта быў ксёндз Аскерка. Коні рушылі, і калі параўняліся з Бутрымовічам, міліцыянер падскочыў, ляснуў абцасамі

і аддаў чэсць. Ксёндз у адказ ніжка схіліўся ў паклоне. Бутрымовіч адняў руку ад шапкі і, усхваляваны, не заўважыў, як тут жа, размінаючыся з ксяндзом, праехаў на «вілісе» сакратар райкома. Бутрымовіч паспеў пазнаць яго, але не ўправіўся аддаць чэсць. Усхваляваны, пачаў хадзіць — тры крокі ў адзін бок, тры — назад.

Не першы раз аддае чэсць ксяндзу міліцыянер Бутрымовіч. Ён ведае, што ў народзе ідзе нядобрая пагудка пра ксяндза, але ўсё роўна ніяк не можа не аддаць яму чэсці. Як жа гэта? Ён жа, ксёндз, ведае ўсялякія таямніцы свету. Ад яго многае залежыць.

Так думаецца Бутрымовічу. Так вучыў яго забіты каталіцызмам бацька, парабак пана Кушлэйкі, у былым маёнтку якога цяпер, пры савецкай уладзе, створаны саўгас. Бацька працуе там, жыве з сям'ёю ў той самай хаце, у якой жыў пры пану, і баіцца ксяндза таксама, як пры панска-польскай уладзе. Моліцца перад іконамі розных матак боскіх і ходзіць да ксяндза на споведзь. І вось гэты страх перад ксяндзом, гэтую боскую пашану да ксяндза прывіў бацька змалку і свайму сыну Станіславу. Вадзіў заўсёды яго ў касцёл, а дома вучыў маліцца перад іконамі. Станіслаў праслужыў у Савецкай Арміі, затым паступіў міліцыянерам, жыве ў мястэчку з маладою жонкай. Здавалася б, нашто яму той ксёндз? У мястэчку ёсць бібліятэка, кінатэатр, чытаюцца лекцыі. Праўда, Станіслаў любіць кніжкі, ходзіць у кіно, але ўсё роўна аддае чэсць ксяндзу. Усё ад бацькі, ад маткі, ад суседзяў, ад тых паноў, што некалі гулялі разам з ксяндзамі. Паноў ужо няма, а ксяндзы засталіся, ды і людзі яшчэ некаторыя ходзяць у касцёл. Дык чаму ж не аддаць ксяндзу чэсць? Некалі даводзілася і руку цалаваць.

Ажаніўся Станіслаў не так даўно. І калі жонка, вясковая дзяўчына, пераехала жыць да яго на кватэру і павесіла на сцяне падарунак маці — невялічкую ікону маткі боскай,— Бутрымовіч не пратэставаў. Маліцца, праўда, ён ужо не маліўся, але калі садзіўся снедаць, клаўся спаць — на тры разы хрысціўся перад тою невялічкаю ікопаї...

Стаіць Бутрымовіч на сваім пасту і аднолькава аддае чэсць і сакратару райкома, і ксяндзу. Направа, у аддаленні, відпееццa над гапкам чырвоны сцяг. Там месціцца раённы камітэт Камупістычнай партыі. А налева праз імглу паглядае белая вежа касцёла. Паміж імі стаіць раздвоепы Станіслаў Бутрымовіч, дакладны на службе міліцыянер, вясковы хлопец, які палюбіў савецкую ўладу, але які не

ведае, як пазбыцца страху перад ксяндзом, як адчапіцца ад яго. Бо што ж скажа бацька, калі пачуе, што яго сын не шануе ксяндза, што скажуць суседзі, знаёмыя, што скажа ўся тая аколіца былой засцянковай шляхты, для якой ксёндз быў, як кажуць, і цар і бог? Данясуць ксяндзу, і тады, хто ведае, што можа быць? Пры такіх думках яшчэ больш раздвойваецца душа Станіслава Бутрымовіча.

Ён задумаўся, пахаджваючы, і не заўважыў, як да яго падышоў яшчэ малады мужчына ў кажушку, у шапцы-вушанцы і ў белых валёнках.

— Здароў, Стась,— прамовіў ён.

— А-а-а... Здароў, Алесь... здароў. Даўно не бачыліся. Адкуль? Куды?

— Ды адкуль жа? З дому, з саўгаса. Назначан, брат, аграномам туды. Прывітанне табе ад бацькоў. Маю трошкі што табе перадаць. Ляжыць там у санях. Добра, што сустрэў цябе тут, а то хацеў ужо ісці шукаць тваёй кватэры.

— Я праз дзве гадзіны звольнюся... Можа, будзеш начаваць тут?

— Ды прыйдзецца... Усяго ў раёне за адзін дзень не зробіш.

— То прыходзь начаваць да мяне, абавязкова прыходзь...

— Добра, прыйду.

Той, каго Станіслаў назваў Алесем, адышоў.

І тут жа на поўную рысь пад'ехала пара чорных ксяндзоўскіх копей. Ксёндз вяртаўся назад.

Станіслаў Бутрымовіч, захоплены знянацку, зноў падскочыў і ляснуў абцасамі ботаў, імкліва прыкладаючы руку да правай скроні...

Ксёндз паспеў кіўнуць носам, і сапкі прамільгнулі, абдаючы Бутрымовіча ветрам. Сэрца пад шынялём: тук-тук, тук-тук...

Не паспеў Станіслаў павярнуцца, як перад ім невядома адкуль з'явіўся не хто іншы, як сам сакратар райкома Трошчанка.

Бутрымовіч стаў навыцяжку, як скамянелы. Стаяў і сакратар. Станіслаў то падымаў вочы, то апускаў, а сакратар увесь час упарта глядзеў у твар застыламу ў паставе «смірна» міліцыянеру Бутрымовічу.

— Ну што, Бутрымовіч, як справы?

— Нічога, добра, таварыш сакратар.

— Добра, кажаш? Колькі разоў сягоння аддаў чэсць ксяндзу?

— Два разы, таварыш сакратар,— адказаў Бутрымовіч і пачырванеў.

— А ўчора?

— Учора таксама два разы...

— Значыць, кожны дзень кланяемся ксяндзу?

Сакратар усміхнуўся, падышоў блізка да Бутрымовіча і палажыў яму руку на плячо.

— Колькі засталося стаяць?

— Яшчэ гадзіну, таварыш сакратар.

— Вось як звольнішся з паста, зойдзеш да мяне ў райком. Добра?

— Добра, таварыш сакратар.

Праз гадзіну сакратар Трошчанка вёў гутарку з міліцыянерам Станіслававам Бутрымовічам. Тут жа сядзеў начальнік раённага аддзялення міліцыі ў пагонах старшага лейтэнанта.

— Ты, не падумаўшы, аддаеш чэсць ксяндзу,— гаварыў сакратар.

Бутрымовіч заварушыўся. Цяжкім, збалелым голасам сказаў:

— Таварыш сакратар, выбачце мпе, больш не буду... Ну вось не ведаю, як гэта ў мяне здараецца...

Тады сакратар звярнуўся да начальніка міліцыі:

— Таварыш старшы лейтэнант, папрацаваць з ім трэба, хлопец старанны, зразумее.

На гэтым гутарка скончылася.

Увечары таго ж дня Станіслаў Бутрымовіч сядзеў у сваёй невялічкай кватэры з другам свайго старэйшага брата Яна, які загінуў на вайне, Алесем Крывіцкім. Сядзелі, грэліся каля чаркі, гутарылі. Станіслаў вельмі паважаў Алеся — не толькі за тое, што ён быў другам яго брата, а таму, што Алесь многа год сядзеў у польска-фашысцкай турме, быў афіцэрам на фронце Лічыпнай вайны, пяць разоў паранены, хлопец з узнагародамі. Вярнуўшыся з вайны, скончыў трохгадовую сельскагаспадарчую школу. І вось цяпер назначан аграномам у саўгас, у «свой» саўгас. Алесь Крывіцкі прайшоў суровую школу жыцця. Нарадзіўшыся ў беднай, многалюднай сям'і, гадаваўся босы і галодны. Трохі падняўшыся на ногі, пайшоў у наймы да кулакоў, пасля ў горад да багатых ляшскіх купцоў грузчыкам. Бацька дазволіў хадзіць у школу толькі тры гады. Здольны хлопец, Алесь давучваўся ўжо ў турме, куды трапіў за камуністычную прапаганду. А цяпер, вярнуўшыся з вайны, вывучыўся на аграпома.

Некаторыя з аколіцы і да гэтага часу не могуць дараваць Алесю Крывіцкаму таго, як ён пасля вызвалення Заходняй Беларусі быў старшынёю сельсавета і зрабіў вобыск у ксяндза... Гэта не жарты! Хто калі памятае, каб у ксяндза быў вобыск? Вобыскі, наогул, некалі адбываліся, але толькі ў камуністаў і іншых бязбожнікаў. А каб у ксяндза?.. Ніколі гэтага ніхто не дапускаў. А тут, бачыце, гэты свістун Крывіцкі... Больш таго, ён надзяляў фальварачнай зямлёю сялян, загадаў з асадніцкіх хутароў разбіраць хаты і звозіць на пабудову школы... Многа чаго непрыемнага для багацеяў рабіў Алесь. А як прыйшла калектывізацыя, то тут і гаварыць няма чаго... Грызлі зубы на яго, ой грызлі...

Так і сядзяць Станіслаў з Алесем і жонка Станіслава пры іх, гутараць, успамінаюць мінулае, гавораць пра цяперашняе калгаснае жыццё,— што яно яшчэ не ўпарадкавана, што ёсць яшчэ шкоднікі, ёсць п'янства... Алесь, у сваю чаргу, расказаў аб адным бандыце Брандоўскім — сыне былога хутаранiна-кулака. Гэты бандыт адзін нападае на людзей. Нядаўна забіў старшыню калгаса ў суседняй вёсцы, выразаў сям'ю былога бедняка, якога ў свой час падзялілі яго, кулацкай, зямлёю...

— І кажуць,— прадаўжаў Алесь,— што людзі нешта ківаюць і на вашага местачковага ксяндза...

Сэрца ў Станіслава ёкнула. Ён апусціў вочы і стаў глядзець пад стол.

Вядома, нічога Алесь не ведаў пра аддаванне Станіславам чэсці ксяндзу Аскерку і гаварыў далей, што ўсе сілы трэба напружыць, каб ліквідаваць бандытызм і шкодніцтва... Станіслаў, слухаючы, думаў: «Божа мой, ксёндз — шкоднік. Ну, гэта нешта не так, гэта не можа быць...» Але нічога не сказаў Алесю і слухаў далей.

Ад'язджаючы назаўтра дахаты, Алесь Крывіцкі запрашаў Станіслава прыехаць калі-небудзь у саўгас: «Пойдзем у лес на паляванне, возьмем лыжы...»

Станіслаў паабяцаў, што паспрабуе пагаварыць аб гэтым са сваім начальствам.

Зноў стаіць на сваім посту міліцыянер Станіслаў Бутрымовіч. Таксама глядзіць ён, сочыць, як па вуліцы ідуць і едуць людзі, як па тэлеграфныя драты чародкамі садзяцца цвыркуны-вераб'і. І зноў імчыцца тая самая пара чорных коней, і ў санках у завостранай шапцы сядзіць ён, ксёндз. Бутрымовіч стаў навыцяжку. І тут жа, у гэты момант, замітусіўся, зазлаваў на сябе, але ўжо было позна —

выпрастаная далонь дакранулася да скроні. Ксёндз, відаць, заўважыў замяшанне Станіслава, бо, пакланіўшыся, зірнуў на яго і, нібыта зразумеўшы ўсё, усміхнуўся.

«Ах, каб мяне халера ўзяла,— шаптаў сам сабе Станіслаў, азіраючыся навокал,— ці няма каго наблізу з начальства? Здаецца, няма...» — падумаў ён і стаў астываць ад хвалявання. Начальства, вядома, было, але ён яго не бачыў,— за варотамі адной хаты наўскос ад Станіслава стаяў сам начальнік раённага аддзялення міліцыі.

Хутка за ксяндзом праехаў у лёгкіх санках сакратар райкома і, адказаўшы на прывітанне, уважліва паглядзеў на Бутрымовіча.

Праз два дні Бутрымовіч быў зняты з гэтага паста і пераведзены на другі, на больш ціхую вуліцу.

...Глухою поўначчу ў акно кватэры Бутрымовіча моцна пастукалі.

— Хто там? — крыкнуў спрасонку Станіслаў.

— Гэта я, з міліцыі...

Станіслаў адчыніў дзверы. У хату ўвайшоў малады міліцыянер і адразу прамовіў:

— Хутчэй адзявайся... Да начальніка... Выезд!..

Сапраўды, начальнік раённага аддзялення сабраў амаль цэлы атрад міліцыі, які неўзабаве і рушыў на конях пад камандай яго намесніка. Ніхто з міліцыянераў не ведаў, у чым справа. Калі выехалі далёка за мястэчка, намеснік начальніка міліцыі спыніў свой атрад і растлумачыў задачу:

— У зоне саўгаса знойдзен у лесе забіты чалавек — аграном Крывіцкі. Ён быў на паляванні, і там яго нехта забіў. Падазраюць, што гэта работа Брандоўскага. Нашай задачай будзе прачасаць лес. Можа, гэтую звярыну мы і ўпалюем...

Ні ў кога так не загарэўся твар, не задрыжалі рукі, як у Станіслава Бутрымовіча. «Няма Алеся... дарагога Алеся...» — шапталі вусны. Станіслаў адчуў, як слёзы пацяклі на шчоках. Ён падставіў твар ветру і з усёй сілы сціснуў нагамі бакі каня. Хутчэй, хутчэй у пагоню за бандытам.

Яны не заўважылі, як у пошуках бандыта прайшла ноч і кароткі зімовы дзень. Міліцыянераў, раскіпутых па лесе, урэшце агарнула другая ноч. Трэ было ўжо кожнаму пасобку вяртацца ў саўгас.

Станіслаў Бутрымовіч адзін выехаў на ўскраіну лесу, на бітую дарогу. Цемра ўсё больш і больш ахутвала поле, а лес збоку ўжо здаваўся зусім цёмным. З яго сям-там,

як прасекі, праглядалі дарогі, якія ўпіраліся вось у гэтую бакавую, на якой схаў Станіслаў. Конь іншоў хуткаі ступою і стрыг вушамі, прыслухоўваючыся да лесу.

Прыслухоўваўся ён, відаць, недарма, бо хутка на дарогу выскрнула падвода і павярнула насустрач Бутрымовічу. Станіслаў падцягнуў павадкі і пагнаў каня паволі-най рыссю. Яшчэ зводдалі праз цемру ён заўважыў, што падвода паракошная. Наблізіўшыся, ён крыкнуў: «Стой!» Але падводчыкі не паслухаліся, а наадварот — фурман ударыў на конях, і яны рванулі віхрам. Бутрымовіч даў прарэзлівы свісток, клічучы таварышаў на падмогу. Не перастаючы свістаць, ён памчаў галопам услед за падводаі.

Вось ужо ён блізка, крычыць: «Стой!» Замест таго каб падвода спынілася, з яе пачуўся стрэл. Бутрымовіч зразумеў, што тут справа сапраўды нячыстая. У адказ адкрыў страляніну, але не па людзях, а па конях. Пасля трох стрэлаў адзін конь з разбегу ўпаў на калені, а потым лёг на бок. Другі скокнуў і стаў.

Бутрымовіч крыкнуў: «Рукі ўверх!» — і не заўважыў, як насустрач падскочылі на ўспененых конях два міліцыянеры. Уцекачы паднялі чэцвера рук. Як жа здзівіўся, нават зжахнуўся Станіслаў, калі пад праменнем батарэйкі ўбачыў... ксяндза Аскерку. Другі быў фурман. «Дык вось як...— закіпела ў душы Станіслава,— вось якая сустрэча. Цяпер я табе аддам чэсць, што горка стане...»

— Хто страляў? — спытаўся Станіслаў, наставіўшы рэвальвер у грудзі ксяндза.

— Хто страляў, таго няма. Уцёк у лес. Гэта быў незнаёмы нам чалавек. Папрасіўся, каб падвезлі. Бажуся, што так. Мы ж не думалі, што ён будзе страляць. Каб мы гэта ведалі, то нашто нам яго браць у санкі.

— А чаму не спыніліся, як я крыкнуў?

— Мы не ведалі, хто едзе, пабаяліся... Адпусціце нас, я вас прашу... Мы з вамі заўсёды віталіся,— сказаў ён Станіславу.— Ці мала што бывае... Адпусціце, людзі добрыя...

Міліцыянеры старанна абшукалі ксяндза і фурмана, заставіўшы іх вылезці з санак. Як толькі яны вылезлі на снег, два міліцыянеры кінуліся да саней. Адзін з іх зараз жа крыкнуў: «Тут нешта жывое!» Але стрэл заглушыў яго словы. Міліцыянер упаў, застагнаўшы. Станіслаў з другім упалі на снег, загадаўшы ксяндзу і фурману зрабіць тое самае.

Міліцыянеры наўзлі да санак і крычалі: «Бандыт, зда-

вайся, а то застрэлім!» Той тым часам стаў ва ўвесь рост, але тут жа быў прашыты куляю Станіслава.

Калі яны падняліся з зямлі, Станіслаў надышоў да ксяндза і ва ўпор сказаў:

— Цяпер, ойча, я табе адсалютую інакш... Больш ужо не сустрэнемся... Мне ўсё зразумела...

КОЛЕНЬКА

Яго празвалі Коленькам тады, калі ён на руках акушэркі ў радзільным доме першым крыкам заявіў права на жыццё.

— Мар'я Іванаўна,— гаварыла акушэрка,— каб хоць ён не быў у вас капрызны. Усё носікам нечага шукае і шукае... Наце яго вам.

Мар'я Іванаўна туліла да сябе маленькую істотку ў пялёнках і была задаволена ім і сама сабою. Яна ўжо тады паціху пачынала марыць аб будучым свайго Коленькі, што, вядома, трэба лічыць зразумелым і натуральным.

У пялёнках прамінулі першыя тыдні, а потым і доўгія месяцы дзіцячага жыцця, а пасля на змену з'явіліся сарочачкі, кашулечкі, штонікі, світэркі, а на ножкі — туфелькі, чаравічкі, валёнкі з галошамі. Пачалося сапраўднае дзяцінства Коленькі. Ён бегаў, ён многа чаго прасіў у мамы, і мама — ціхая, нядаўна вясковая жанчына сярэдняга веку — намагалася задавальняць жаданні сыночка. «Ён жа яшчэ маленькі...» Бацька Коленькі, Авяр'ян Міхайлавіч Падлесны, працаваў бухгалтарам у міністэрстве і ў выхаванні сына ўдзелу, можна сказаць, і не браў. Толькі ўсяго і было сустрэчы з хлопцам, калі Авяр'ян Міхайлавіч прыходзіў з работы. Ён браў сына на рукі, садзіў на калені і кожны раз пытаўся ў жонкі, нашто гэта на малым надзеты два суконныя світэры. У кватэры ж цёпла. Жонка даводзіла, што дзіцяці можа быць холадна, і казала: «Каб ты, мужанёк, не чапляўся да чаго не трэба».

Але вось аднаго разу сынок, седзячы ў бацькі на каленях, мацаў рукой гузікі ў пінжаку і раптам закрычаў: «Хачу гузіка!» Мар'я Іванаўна ўзяла з бляшанай скрынкі ад цукерак вялікі бліскучасты гузік ад жаночага паліто і працягнула сыну:

— На вось табе, Колепька, гузічак, бачыш, які харо-

шы. А ў таты нельга браць гузік, сыночак, тату трэба ісці заўтра на работу... На гузік, Коленька...

Коленька адпіхаў руку мамы, пачынаў крычаць: «Не хачу гэты, хачу татаў!» І цягнуў, ірваў гузік на пінжаку пачцівага Авяр'яна Міхайлавіча. Што рабіць з гэтым малым? Ён пачаў ужо крычаць: «Давай гузік!» Авяр'ян Міхайлавіч спускае сынка з каленяў на падлогу, сынок пачынае біць тату дзіцячымі кулачкамі, а потым падае і пачынае качацца па падлозе з крыкам: «Хачу гузіка!» Пачцівы Авяр'ян Міхайлавіч хмурнее, злосна пазірае на жонку, а сынок усё верашчыць, патрабуе бацькавага гузіка. Авяр'ян Міхайлавіч урэшце ўстае, падымае сынка з падлогі... Жонка прыкмеціла, што яе зраўнаважаны мужанёк задумаў нешта ліхое, і кінулася перахапіць Коленьку, так што Авяр'ян Міхайлавіч паспеў даць сыночку ў попачку толькі аднаго шлёпанца.

Сыночак заверашчаў на ўвесь голас, хоць ты затуляй вушы і ўцякай з кватэры.

— Звер ты! — гнеўна кінула па мужанька Мар'я Іванаўна.— Ці ж можна так дзіця?..

Пачуццё правіны калыхнула пачцівае сэрца Авяр'яна Міхайлавіча, і ён пачаў гаварыць жонцы перапрашальным тонам:

— Хіба ж я моцна? Дурпая ты...

Пасля гэтых слоў сынок залямантаваў яшчэ мацней. Мар'я Іванаўна і туліла і лашчыла яго, але жаль ад бацькоўскай крыўды не заціхаў. Авяр'ян Міхайлавіч распрануўся і павесіў пінжак у шафу, каб схаваць ад вачэй сына гэтыя праклятыя гузікі. Але сын, заўважыўшы такі «маневр» бацькі, з крыкам нацягнуўся з рук мамы за татам і не змяніў сваіх памераў. Крычаў далей: «Хачу гузіка!» Авяр'ян Міхайлавіч сказаў Мар'і Іванаўне, каб яна адышла з сынам на кухню, што тая і зрабіла. Бацька пачаў шукаць у той жа бляшанцы гузік, падобны да тых, што ў пінжаку. Знайшоў. Вось перамога! Урэшце перастане крычаць сынок. Паклікаў маму і сына з кухні і насустрач ім працягнуў гузік. Сын раптам заціх, разглядаючы цацку, і пры супольнаі уцесе бацькоў прыняў яе. Мама пусціла малога на падлогу. Ну... канец. Бацькі з палёгкаю ўздыхнулі.

У кутку на круглым столічку зазваніў тэлефон. Авяр'ян Міхайлавіч падышоў і зняў трубку. Клікаў яго сусед, таксама бухгалтар, зайсці на хвілінку.

— Просіць Смірноў чагосьці, каб зайшоў.

Авяр'ян Міхайлавіч стаў адзявацца. Колепька ўзняў вочы на тату і прашваргатаў:

— Ты пойдзес да сівабародага!.. Га?

Бацькі пераглянуліся.

— Няможна так гаварыць, сынок. Дзядзя Ваня харошы, ён табе цукеркі прыносіў. Помніш?

— А мама казала — сівабароды...

— Калі ж гэта я казала? Што ты выдумляеш? От...— Мар'я Іванаўна дакорліва паківала галавою. А сынок тым часам разглядаў на піжаку Авяр'яна Міхайлавіча не што іншае, як тыя самыя гузікі, зноў застукаў ножкамі, кажучы, што той гузік, які ў яго ў руцэ, не ад піжака. «Хачу ад піжака!»

Бацькі зноў пераглянуліся. Што гэта за назола? Яны пачалі перакопваць сыночка, што гузік у яго руцэ такі самы, як у піжаку, але сынок стаяў на сваім.

— Хадзі сюды, Колепька,— паклікала сына Мар'я Іванаўна і ўзяла на рукі, стала выціраць яму твар і гапарыцца сынам: — От дзіця... І як гэта можна здагадацца, што гузік не ад піжака? Маё разумнае дзіцятка...

За гапарэннем быў моцны пацалунак у шчочку ўжо больш як трохгадовага малога. А малы ныў... ныў цягучай нотай і верадзіў сэрца. Авяр'ян Міхайлавіч ужо гатоў ісці да суседа Смірнова, думаючы, што, можа, сын уціхамірыцца, калі сыдуць яму з вачэй гузікі.

— Ну, я пайшоў...— прамовіў ёп.

Сынок закрычаў дзікім голасам: «Хачу гузіка!»

— Ён мяне тут замучыць, калі ты пойдзеш,— сказала Мар'я Іванаўна і ўзяла са століка сцізорык.

— Дай адрэжу, бо тут цішыні не будзе,— звярнулася яна да мужа.

Авяр'ян Міхайлавіч паставіў на жонку вочы.

— Ты што? Звар'яцела?

Пачалася слоўная перапалка паміж імі. Мар'я Іванаўна сваё: «Дай адрэжу!» Авяр'ян Міхайлавіч сваё: «Не дам!»

З боку Мар'і Іванаўны пайшоў у рух так знаёмы і мілы нашым сялянскім вушам моцны каларыт роднай вёсачкі недзе з-пад Бярэзіны:

— Халера не возьме твайго касцюма!..

— Трэба здурэць, каб рабіць штосьці такое! — разоніў сваё Авяр'ян Міхайлавіч.

Мар'я Іванаўна ўрэшце выпусціла малога з рук, учапілася за гузік мужавага піжака. Сынок змоўк і з цікавасцю назіраў за мітуснёй бацькі і маці.

Пачцівы Авяр'ян Міхайлавіч аж абліўся потам — гузік быў у руках жопкі. Яна яго працягвала ўжо ўсцешанаму сыну. Авяр'ян Міхайлавіч зазлаваў, моўчкі распрануўся і дастаў з шафы другі пінжак.

— Ну, а ад гэтага не будзеш адразаць? — тонам дакору спытаўся ў жопкі.

— От дурны... Яму шкада гузіка дзіцяці.

Авяр'ян Міхайлавіч пайшоў. Мар'я Іванаўна села за шыццё. Добра стала на душы, што ўрэшце малы знайшоў сабе супакой. Стукацела швейная машына, Мар'я Іванаўна, здаецца, забылася за ёю пра ўсё. Машына строчыць сваё, а думкі Мар'і Іванаўны — сваё. Але пешта надта стала ціха. І толькі ў адным моманце, калі нага спыніла кола машыны, Мар'я Іванаўна аглянулася і раптам ахнула ад таго, што ўбачыла. У адчыненай шафе між павешаных касцюмаў і іншай вопраткі стаяў яе Колепька і з сапепнем, нават з прыстогваннем, працаваў з пожыкам ля бацькавага пінжака. Ён адразаў гузікі. Мар'я Іванаўна ўскапілася, вырвала з ручкі сына пожык, які яна ў свой час не схавала, ударыла сына па руцэ. З другой зашчэмленай ручкі стала вырываць гузікі.

Зноў пачалася крыклівая, назойлівая пакута.

Не сцярпела Мар'я Іванаўна, дала аднаго шлёпанца любімчыку. Той паказаў, як і заўсёды, сілу свайго голасу. Мар'я Іванаўна ўжо брала яго на рукі, а сыночак пакаціўся па падлозе з крыкам. Ляжаў і верашчаў аж да хрыпу. Мар'я Іванаўна села, склаўшы рукі на калені, і заплакала. Што рабіць? Трэба ж учапіцца яму да гэтых гузікаў. Сыночак плакаў — то з павышэннем тону, то з паніжэннем. А Мар'я Іванаўна плакала ціха. Потым расшчаміла свой кулак, паглядзела праз слёзы на чатыры шэрапькія гузікі і падышла да песціхаючага сына.

— Сціхні, сынок, сціхні, Коленька, на твае гузічкі.

Коленька плакаў з закрытымі вачыма, не верыў, што мама хоча аддаць яму з пінжака Авяр'яна Міхайлавіча жаданыя гузікі.

— На, сынок, паглядзі... Не верыш?

Сынок глянуў, пераканаўся, што мама сапраўды хоча аддаць яму жаданыя гузікі, сціх, сеў і забраў іх з рукі мамы. А мама ўжо выцірала яму твар, гладзіла па русай галаве і падзявала яшчэ адзін, трэці, світэр...

* * *

Ішоў год за годам. На свет прыйшла яшчэ Леначка. Коленька, заўсёды апранены ў дзве кашулі і палітопчык, хадзіў па двары з кіёчкам і намагаўся дастаць ім шыбіны самых ніжніх акон. Кожны тыдзень патрабаваў новых цацак. Яму іх куплялі. І набралася іх бадай-што воз — розных машын, верхавых коней, калясак, веласіпедзікаў, заводных кракадзілаў, жаб, катоў — на некалькі штук кожнага гатунку. Авяр'ян Міхайлавіч не мог пагадзіцца з такім парадкам выхавання сына і не раз бунтаваўся. Але супроць яго станавіліся ўжо больш моцна яна — Мар'я Іванаўна — і сын. І такім чынам клалі пачцівага бацьку, як кажуць, на лапаткі. Са сціснутым сэрцам даваў ён грошы Мар'і Іванаўне на ўсялякія адмысловыя цацкі, а тая ўсё гаварыла:

— Хіба ты ўмееш выхоўваць дзяцей?

І зараз жа да сына:

— Зараз пойдзем купляць, Коленька...

І ішлі купляць. А Авяр'ян Міхайлавіч браў газету, каб дачытаць яе, але чытаў там ужо не тое, што ў ёй напісана. Усё зліваласа ў мярэжку, на якой выскаквалі чорныя словы: «Нельга пагадзіцца з такім выхаваннем...» Адкладаў газету, уздыхаў, і пасля дым папяросы, павольна расплываючыся па пакоі, разносіў яго ўздыхі. На дварэ вясна ў поўнай квецені, усе людзі рады паказаць сопечнаму павет-ру свае расхрыстаныя грудзі. Дзеткі бегаюць у адных кашульках, у тапачках, без шапак, а яна... Яна, Мар'я Іванаўна, нацягвае сыну на ногі доўгія, за калені, панчохі, надзяе суконны світэр і суконную шапку з вушамі. Хоць бы кепку, а то — шапку... Адкуль яна ўзяла гэтую шапку, нейкую зялёную, ды яшчэ з вушамі? Цьфу!

Раздумвае Авяр'ян Міхайлавіч і не бачыць магчымасці, як усё выправіць. Замоцныя пазіцыі занялі маці і сын супроць яго. І недарма Авяр'ян Міхайлавіч, прыйшоўшы з работы, найбольш хіліцца да Леначкі, да дочачкі, якая ўжо ходзіць, тату трэпле за валасы, абдымае, слініць (цалуе) у шчаку. Залатое дзіця! А гэты! Гэты Коленька... невядома, што з яго будзе. Але ж ён сын, нічога не зробіш. Можа яшчэ як-небудзь выправіцца.

Так думаў Авяр'ян Міхайлавіч і не вельмі верыў сваім спадзяванням.

КУФЭРАЧАК

Шэсцьдзесят мінула. Ідзе сёмы дзесятак. Але, відаць, не ў гэтым справа для Пятра-майстры. Як ты ні круці, як ні думай, а гады ўсё роўна ішлі і будуць ісці...

Другое займае майстру Пятра. Вось ужо хутка вечар, а ў хату ніхто з сям'і не загляне. Сямейка, дзякаваць, немалая — тры дачкі, два сыны. Засталіся толькі меншыя — дачка і сын, а тыя ўжо жывуць асобна. Дочкі замужам, а сын паехаў на Украіну. Усё гэта добра. Сын, вядома, вернецца. Прыязджаў вярбоўшчык — ну, ён і паехаў... Але жонка... Усё яна... Што ёй трэба? Ну, што ёй трэба?!

Так пытае сам сябе майстра Пятро, седзячы адзін у хаце. На ім скураны рабочы фартух. На шэрым ілбе выступіў пот. Пятро курыць, адпачывае. Побач з ім адпачывае і такарны станок, на якім можна выточваць утулкі для колаў, верацёны, таўкачыкі таўчы бульбу, чаранкі для нажоў і іншыя рэчы. Пятро ў апошнія часы робіць найбольш чаранкі для нажоў і самыя нажы, бо ў станку ёсць і тачыльныя кружкі. Нажы гурбачкай ляжаць вось недалёчка на лаве — новыя, блішчастыя, свежанавостраныя. Ёсць з грушавымі, а ёсць і з дубовымі чаранкамі. Работа гладкая, чыстая. Людзі ахвотна купляюць яго нажы.

Змрокі ўсё гусцей кладуцца па кутках старой, яшчэ бацькаваї, хаты. З вуліцы час ад часу даносяцца дзіцячыя галасы. То зарохкае свіння, то заспявае певень... І зноў ціха. Хоць бы хто прыйшоў перакінуцца словам.

Пятро любіць гутарыць, субяседнічаць. Наведвае яго найбольш моладзь. І тады Пятро пытаецца, што чуваць у праўленні калгаса, ці не вырашылі часам, калі будуць перасяляць вёску ў лепшае месца — у вышэйшае, дзе і сонца больш і восенню сушэй. А ўчора крэсліў хлопцам на паперы, якія павінны быць новыя дамы на новым месцы.

А яна, жонка, усё вохкае ў кутку зняважліва, называючы Пятра пустазвонам.

— Век, колькі ты жывеш, усё плешчаш языком... Ты ўжо і дарогі даўно пабудаваў і масты вунь над рэчкай паклаў. Усё будуеш, а як не было ідзе нічога, так і цяпер няма... А ён усё пляскае і пляскае... Людзей смяшыць...

Пятро толькі гляпуў у бок жонкі Тацяны, сказаў «не перабівай» і далей прадаўжаў выкрэсліваць чарапічныя стрэхі і балконы. Як жа можа быць інакш? То ж Пятро, майстра-летуценнік, яму хочацца, каб на свеце было лепш. Жонка гэтага ніколі не разумела.

Але вось хутка вернецца яна з поля з дачкою.

У калгасе капаюць бульбу. Восень. Адважылася лішні раз пайсці і жонка, а так увесь час крычыць:

— А чаго я пайду? На цябе працаваць?

— Я на сябе сам зараблю,— бароніцца Пятро.

І вось робіць. Хто ў калгасе рамантуе калёсы? Пятро. Хто вяжа мётлы, венікі? Таксама ён. Хто крычыць часам на вуліцы, каб адкрылі чарапічны завод вунь там на гары, дзе многа жвіру? Усё ён. А ў вольны час ад такой работы Пятро майструе і вострыць людзям прыгожыя кухонныя па-гаспадарску зроблены нажы.

Жонка высмейвае і гэтую ягоную работу.

— Учапіўся за гэтыя нажы, як маленькі...

Так дзень за днём і дайшло да таго, што жонка стала адкрадвацца да дачкі — спярша вячэраць, а потым абедаць і снедаць. Павалакла за сабою і меншых — дачку з сынам. Так застаўся Пятро жыць у хаце амаль адзін. Праўда, дзеці, ды і сама яна, вядома, заходзяць ў хату. Дачка нават пытаецца, што тата еў. А жонка робіць выгляд, што ўсё ў парадку.

І пайшла тады па вёсцы гутарка ўсякая пра куфэрачак Пятра.

Гэта быў невялічкі куфэрачак, з якім Пятро аб'ехаў нямала дарог яшчэ царскай Расіі, з якім, калі Пятру пекалі стукнуў дваццаць адзін год, ездзіў ён у далёкі Пецярбург, каб адбыць ваенную службу.

Пятро высокага росту, ён і зараз не сагнуты, не згорблены, яшчэ засталася тая гвардзейская выпраўка. Яна, відаць, не гіне, жыве ў чалавеку заўсёды.

На сцяне вісіць партрэт маладога Пятра ў мундзіры салдата лейб-гвардыі Стакгольмскага пяхотнага палка. Вінтоўка гранёным штыком кранаецца шапкі-бесказыркі, зухавата ссунутай на правае вуха.

Дзве памяткі маладосці — партрэт і куфэрачак.

Куфэрачак быў афарбаваны некалі ў зялёны колер, які зрабіўся цьмяным, абцёрся з часам, але ўсё роўна зеляніў на покуці. У куфэрачку заўсёды ляжала некалькі кніжак, нядаўна куплены невялікі сшытак, два-тры канверты (трэба ж часам і ліст напісаць), у прыскрынячку ляжала заўсёды добра наведзеная брытва ў старым, ужо дзіравым чахле, мыльнічка, намазок, кавалак лепшага мыла, розная дробязь: гузікі, гузічкі, клубочак нітак з іголкай, кавалачак воску і нават напарстак. Па такіх рэчах у куфэрачку

можна зразумець, што Пятро быў некалі акуратным салдатам, як і цяпер акуратны майстра.

З кніжак у куфэрачку былі: Леў Талстой — «Так што ж нам рабіць?», і, мусіць, выпадкова трапіла сюды аповесць Караленкі «Без языка». Але на дне пад гэтымі кніжкамі хавалася тоўстая кніжыца, для якой Пятро нават парабіў палатняныя вокладкі, бо кніжка была даўняя, запошаная. Гэта быў песеннік, багаты зборнік рускіх песень — выданне яшчэ добраї памяці Сыціна. Насіў песеннік прыгожую назву: «Ах, зачем эта ночь...». Некалі на маляўнічай вокладцы сядзеў на лавачцы ў месячную ноч чалавек з чорнымі вусамі, у каўпаку, схіленым на правы бок, і іграў на гітары... Хавае Пятро гэты песеннік, хоць ужо рэдка, рэдка калі спявае.

Толькі часам у дзень адпачынку адкрые Пятро гэты запаветны песеннік і прачытае, што яму падабалася некалі:

Что так жадно глядишь на дорогу
В стороне от веселых подруг?..

А цяпер да сталых рэчаў у куфэрачку паступова прымасціліся і іншыя рэчы. Яны і некалі займалі месца ў ім, але толькі ў час далёкага падарожжа. А зараз, седзячы дома, трэба хаваць іх у куфэрачак. Што за прычына? Што гэта за рэчы? Ды звычайныя, самыя звычайныя: пакушачка чаю, пакецік цукру, буханка купленага ў сваім мястэчку хлеба. Часам, хоць рэдка, трапляе ў куфэрачак на адзін дзень два звараных яечкі. Калі жонка ўсё менш і менш даглядае яго, усё хавае ад яго,— дык што ж рабіць Пятру? Трэба неяк пражываць аднаму. І ён жыве.

Пятро ўстае кожны дзень у адзін і той жа час — вельмі рана. Умыецца, прычэша сваю «польку». Жонка ўстае пазней. Наварыць таго-сяго. Прыбягуць унукі. Яна з дачкою, сынам і ўнукамі паснедае. А што з ежы застанецца, паставіць на прыпек — хай «ён» хоча есць, хоча не. На час іхняга снедання Пятро выходзіць з хаты што-небудзь рабіць на падворку. Як жа можна інакш, калі пра яго ўжо не турбуюцца?

Калі ўсе разыходзяцца з хаты, тады Пятро вяртаецца і бярэцца за снеданне. Загляне ў гаршчок на прыпеку, а там толькі тры бульбіны. Спачатку ён гэтыя «астаткі» еў, а потым крыўда ўзяла за душу, перастаў і цалкам перайшоў да куфэрачка.

Адчысціў сіні паліваны чайнік, ужо стары, абабіты, які вісеў у каморы над страхою як непатрэбны, і стаў варыць у ім сабе чай. Дачка сцяміла намеры бацькі і кожны ранак, не пытаючыся маці, ставіла напоўнены вадою чайнік на пліту.

Сняданні кожны дзень сталі адпольскавымі. На покуці — адкрыты куфэрачак. Века яго ўнутры абклеена карцінкамі з нейкіх часопісаў. Там ёсць партрэт Льва Талстога з сівой раздвоенай барадою, побач — адмірал Нахімаў, і ўрэшце вялікая каляровая карціна — ляцяць буслы над зялёным лугам. На табурэтцы, на рассцелепай газеце, стаіць чайнік з варам і кубачак на сподачку. Пятро бярэ з куфэрачка хлеб, адразае скібку вострым бліскучым ножыкам сваёй работы, адразае асцярожна; схіліўшы галаву, глядзіць з замілаваннем за рухам нажа. Адзін кавалачак цукру кідае ў кубачак...

Часам хто-небудзь з аднавяскоўцаў зойдзе да яго ў гэты час і застане за сняданнем. Пасядзеўшы, спытаецца:

— Так і харчуешся адзін?

— Ага... А што зробіш? Так і харчуюся...

— І доўга гэтак будзе?

Пятро пацісне плячыма, пачакаўшы, адкажа:

— Я ёй не падабаюся. Што ж... Учора нават гультаём назвала. А што было да гэтага, на валовай шкуры не спішаш. І стары, і затабаканюханы, і непаваротны, і дурны, і неахайны... Ну, а ўчора ўжо і гультая заслужыў...— Пятро махне рукою і дадасць: — Хай робіць, што хоча...

А жонка ў сваю чаргу апраўдвала перед людзьмі свае паводзіны:

— Нашто ён мне здаўся такі? Абрыд ён мне са сваёй гэтай круцёлкай... Толькі людзей смяшыць заўсёды.

«Круцёлкай» жонка называла такарны станок.

Выдаўся цёплы дзень. Не, не дзень, а лагодны, спакойны асенні дзянёк, калі сонца грэе мякка, ласкава, калі ўсё ў маўчанні недзе занята сваёй працай — не толькі людзі, але і жывёла, птушкі. Усё рыхтуецца да зімы. Глуха чуваць, як недзе далёка курлычуць жураўлі.

Пятро выйшаў са сваёй «машынай» на двор, за сенцы, каб не відаць было яго з вуліцы. І так задумаўся за сваёй работай, што аж здрыгануўся, калі раптам пачуў гутарку ў сенцах. Гутарылі дзве жанчыны. Адна з іх была жонка Пятра. Яны, відаць, гутарылі, ідучы, і так з гутаркай зайшлі ў сенцы. Пятру даляцела да вушэй толькі некалькі слоў:

— ...Ну чаго ты хочаш? Ён жа на дваццаць пяць год старэйшы за мяне. Дзе ўжо яму...

— Шкада ж чалавека... Падумаі.

Хатнія дзверы рыпнулі і зачыніліся. Стала ціха.

Для Пятра яшчэ больш пацішэла на свеце. Кінуў работу, сеў на калодачку, прыпёрся спіною да сцяны і выпрастаў ногі. Некаторы час сядзеў, прымкнуўшы вочы. Думаў. Потым зняў кепку, палажыў побач. Якраз хадзілі блізка дзве курыцы. Ён паклікаў іх і пасыпаў ім пяску, як зярнят. Пасля закурыў і пайшоў у вёску.

...У хаце Пятро адзін. Усе пайшлі глядзець кіпакарціну. Ён не запальвае газпічкі. Добра, сціпна сядзець яму і так, глядзець, як вясёлым полымем гараць у печцы хмарасцінкі. На пліце грэецца чайнік. Глядзіць Пятро на полымя, ад якога языкі падаюць на сцены і там калышуцца, дрыжаць. І падчас здаецца Пятру, што гэта жывыя людзі скачуць недзе ў светлай хаце. Скачуць... Бо гэта яго, Пятра, вяселле. Ён жэніцца на маладзенькай Тацяне. Яна ростам яму пад руку. Людзі глядзяць і дзівуюцца. Так ужо склалася — ваенная служба, адна вайна і другая. Звалот з бежанства, з Расіі... Сама ж заляцалася... ах, ах, ах... А цяпер?

Думае Пятро — то спахмурнее, то ледзь усміхнецца, то зробіцца сумным і абапрэцца тварам на рукі. А па кутках усё ўвіхаюцца, усё скачуць нейкія белыя жанчыны. Часам Пятро схопіць вокам, непрыкметна павярнуўшы галаву, і кожны раз пазнае яе, Тацяну,— у белым, вясельным убранні...

На пліце зашыпела. Пятро абудзіўся ад задумы і адставіў чайнік. Тады запаліў газпічку на кухонным стале перад печчу і падаўся к покуці, да куфэрачка. Выняў з кішэні ключык і адамкнуў яго. Века лёгка, прывычна адчынілася пад рукой Пятра. Адтуль запахла чаем і яблыкамі.

— Ну, куфэрачак,— прамовіў Пятро,— будзем жыць з табой, стары таварыш. Мо дажывём да другой маладосці?

ДЗІЦЯ

На кухні амаль змрочна. Ці то ад мутных, невялікіх двух акон, што глядзяць на падворак з-пад навіслай страхі, ці ад задымлепай чэлюсці печы, дзе над прыпекам час

ад часу схіляецца гаспадыня, каб падкінуць пару трэсак на вуголле.

На дварэ, наадварот, палыхае ранак — сонечны, іскрысты. Навокал вёскі, што прыпала да зялёнай даліны, на ўзгорках цягнецца лес, у якім застыла ранняя вільготная дымка.

— От, пайшла і няма... І дзе ж яна так? — прамовіла сама сабе гаспадыня, адвярнуўшыся ад печы.

Гэта пра дачку Ядвісю, якая выйшла па ваду да студні.

Гаспадыня Таццяна была на кухні не адна. Тут жа на падлозе, у стоечцы, стаяла дзяўчынка месяцаў, можа, сем, можа, восем і ўвесь час задзірала галоўку, каб сустрэць шэрыя, нібы крыху спалоханыя, вочы бабусі. Дзяўчынка трымала ў пульхным дзіцячым кулачку зялёнага папугайчыка — бразгаўку — і час ад часу памахвала ім і мармытала па-дзіцячаму, шукаючы вачанятамі зноў-такі сваю бабусю. Надакучыла ўжо стаяць маленькай, бо яна пачынае нецярпліва тупаць босымі ножкамі і гатова вось-вось кінуцца ў плач. Але маленькая яшчэ не плача. Яна тыча ў бяззубы роцік папугайчыка і па-свойму напявае, у такт пагойдвання калыскі:

— А-а-а!.. А-а-а!..

На пульхныя, круглыя шчочкі маленькай садзяцца мухі. Трэба было б памыць дзяўчынку, але гаспадыні няма часу. Яна толькі мімаходзь, каб адмахнуцца, час ад часу прамовіць:

— Зараз, зараз... Пачакай...

Гаспадыня змахнула анучкай са стала. Хутка стане тут гаршчок бульбы і яшчэ што-небудзь, хутка прыедзе сын — шафёр рыбгаса — Антось і, можа, падыдзе з мястэчка яна — нявестка Хрысціна. Будуць снедаць.

Маленькі, шэранькі, у белых лапінках каток гуляе з сырой бульбінай, драпае яе лапкай, і калі бульбіна накоціцца на падлозе, ён бяжыць за ёю. Часам маленькая ўтаропіцца ў катка сваімі вачаняткамі, прыціхне бразгаць папугайчыкам, насцярожыцца, а потым зазвініць дзіцячым галаском, змешаным з рогатам і шчэбетам, яшчэ зусім невыразным. І здаецца, так і толькі так гучаць першыя дзіцячыя радасці.

Каток не застаецца ў даўгу — ён час ад часу чапляецца за стоечку, цягнецца сваёй шэранькай мордачкай да маленькай. А маленькая віскунка на міг спалохаецца і хоча ібы адштурхнуцца ад шэранькай пазолы, уцячы.

Але, бачачы, што каток нічога дрэннага ёй не робіць, узвізгвае ад захаплення і раптам ушчаперыцца з крыкам за вуха гуллівага звярка...

Але вось гаспадыня ўжо ўправілася на кухні, наліла з кубка сабе вады на рукі, выцерла іх ручніком і, падышоўшы да маленькай, працягнула ёй рукі і прамовіла:

— Ну, Валечка, хадзі ка мне...

У Валечкі замахалі ручкі, заскакалі вачаняты, і ў той жа міг яна апынулася на руках у бабусі.

Бабуся фартухом выцерла ёй носік і сказала:

— Уй, якая ты... Хадзем памыю цябе трошкі...

Памыўшы і выцершы насуха пульхныя шчочкі, Таццяна падышла з Валечкай да акна. Там трымала малую, крыху адставіўшы ад сябе, і пры святле разглядала чысценькі, нявінны дзіцячы тварык. Разглядала ўважна, пільна. Часам сур'ёзнеў яе твар, на яго набягалі цені, і тады галава пахіствалася ў раздумлівым бедаванні. А Валечка глядзела сабе ў акно,— там на падворку хадзілі куры, парасятка скубла траву, а за плотам лапушылася бульба, і ўсюды было многа сонца.

Малая захаплялася акном нядоўга, затым адвярнулася, працягнула рукі да бабусі, учапілася ёй за шчокі, за хустку і прасіла, чагосьці прасіла сваёй неперадаваемай мовай — аднымі гукамі, і цягнулася да кубка на стале.

Весялеў тады твар Таццяны, але ў вачах усе ж такі заставалася нейкае нямое пытанне.

— Есці хочаш? — прамовіла яна.— Зараз дам, дам...

Потым зноў прыгледзелася да тварыка і спытала маленькую:

— Чыя ж ты, Валечка? Ну, скажы...

Валечка прыціхла, паравяла вачаняты на твар Таццяны і лавіла яе вочы, нібы, здавалася, чымсьці заклапочаная, а потым пачала цягнуць лыжку з рукі Таццяны.

Таццяна ўздыхнула, сеўшы, і стала карміць малую параным малаком.

Увайшла Ядвіся з поўным вядром вады.

— І дзе ты так доўга? — накінулася на яе Таццяна.— Гаршчок трэба падліць з крупнікам, а яна...

— Дзе была? Антосю намагала рыбу збіраць. Ад штуршка пляцёнка перакацілася...

— А дзе Антось?

— Паехаў у мястэчка, рыбу павёз у сталоўку. Зараз прыедзе.

Настала цішыня. Ядвіся, модная дзяўчына з хвалісты-

мі, каштанавымі валасамі, поркалася ля печы — то падлімала гаршчок, то падкладала трэскі ў агонь. Тацяна ставала гаршчок, то падкладала трэскі ў агонь. Тацяна ставала гаршчок, то падкладала трэскі ў агонь. Тацяна став

пераходзіць да шчэбету-рогату, Таццяна стала задумвацца. То ёй вочы здадуцца не такімі, як у сына Антося, то нос не такі, «не свой», то валосікі інакшага колеру. Таццяна яшчэ не адважваецца выказаць свае прыкметы адносна бровак Валечкі. А яны, як ужо відаць, будуць прыгожанькімі, будуць разам з вочкамі глядзець-трапятацца ва ўсмешцы, як тыя ластавачкі. Але броўкі ў Валечкі яшчэ толькі намячаюцца.

Так Таццяну пачало грызці сумненне. Хто з вёскі ні ўвойдзе ў хату, Таццяна ўрэшце не выцерпіць, каб не спытацца, да каго больш падобна Валечка — да бацькі ці да маці. Людзі — як хто. Адны кажуць, што Валечка больш падобна да Антося, другія — наадварот — да Хрысціны. А ў заключэнне ўсе амаль гаварылі адно і тое самае, што Валечка яшчэ малая, што яшчэ нічога не пазнаеш. Можа каму што і здавалася, але ці хочацца псаваць людзям настрой такою справай? З уздыхам дзе-хто казаў: «Дзіця — яно і ёсць дзіця, пяхай расце!»

На падворку зашумела грузавая машына і раптам сціхла. На кухню з нейкім паспешлівым тупатам увайшлі Антось і яна — Хрысціна.

— О, адразу абое,— прамовіла Таццяна,— мусіць, сустрэліся. Ну, давайце будзем снедаць.

Антось, у расхрыстанай, замазучанай кашулі, высокі, смуглявы хлапец, пачаў мыцца ля вядра з вадою, закасаўшы рукавы. Да яго далучылася Хрысціна. Памыўшыся, яна адышла ў бакоўку і зачыніла за сабою дзверы.

Увайшла Ядвіся з Валечкай на руках.

На стале ўжо ўсё пастаўлена — і бульба, і агуркі, і нарэзаны хлеб, і на патэльні падсмажана некалькі скварак.

Выйшла з бакоўкі Хрысціна — прычэсаная, прыбраная. Залацістыя валасы льснілі дзвюма тоўстымі косамі, якія спускаліся ніжэй паясніцы. Статная, танклявая, з шэрымі вялікімі вачыма... Здавалася, што стаіць Хрысціна не пасярэдзіне змрочнай кухні, а недзе сярод сонечнага лугу, сярод кветак і зялёных траў.

Снедалі паціху. Часам хто ўставіць адно-два словы — то пра надвор'е, то пра гарод, што вось трэба выбіраць агуркі. Валечка таксама прымала ўдзел у спеданні і гутарцы. Яна шваргатала, седзячы на каленях у Ядвісі, час ад часу ловячы роцікам лыжачку з парашым малаком.

Раптам неяк павольна адчыніліся дзверы і ў кухню ўвайшоў незнаёмы чалавек у саламяным капелюшы, з кіем

у руцэ і з дарожным мяшком за плячыма. Незнаёмы даў «добры дзень» і пачаў праціраць вочы ад змроку, што ахапіў яго пасля сонечнага святла.

Ён расказаў, што іх група — чатыры чалавекі — прыехала на возера павудзіць рыбу, што вось ён шукае, дзе б купіць агуркоў на снеданне, і зайшоў сюды, бо так параілі людзі ў вёсцы.

Ядвіся аддала Валечку Хрысціне і ўстала, каб ісці ў камору па агуркі. Тым часам гаспадыня Таццяна думала сваё — яна не выцерпела, каб не задаць свайго пытання зусім незнаёмаму чалавеку.

— Выбачайце, я хачу ў вас нешта спытацца. Толькі вы скажыце праўду.

— Ну што? — азваўся незнаёмы.

— Вось паглядзіце на гэтую дзевачку. Да каго яна больш падобна — да бацькі ці да маці?

Такое пытанне для незнаёмага было нечаканым. Ён глядзеў на Валечку нясмела, нават сарамяжліва, паглядаў на Антося і Хрысціну і толькі паціскаў плячыма. Таццяна, затаіўшы дыханне, чакала адказу.

— Хто ведае,— адказаў незнаёмы.— Быццам больш падобна да маці, але ёсць, відаць, нешта і ад бацькі...

— Пакінула б ты гэтую гутарку,— амаль у адзін голас сказалі Антось і Хрысціна,— а то толькі людзям надакучаеш.

Незнаёмы, купіўшы агуркі, выйшаў. Як толькі заціхлі яго крокі за дзвярыма, Хрысціна пакінула есці і ўстала. Звяртаючыся да Антося, сказала:

— Больш тут жыць не хачу. Я табе ўжо не раз казала, што трэба аддзяліцца і пераязджаць у мястэчка, бліжэй да мамы.

— Калі табе тут нясоладка, можаш ісці,— буркнула свякроў,— я чыіхсьці байструкоў гадаваць не хачу.

— Адкуль вам вядома, што гэта чыйсьці байструк? Гэта байструк вашага сына...

— Вось людзі бачаць...— махнула недзе за акно Таццяна.

Антось маўчаў, панурыўшы галаву. Ён любіць Хрысціну і таму, хоць з болем, але вымоўчвае. Ядвіся зыркала вачыма — то на маці, то на Хрысціну, гатовая вось-вось умяшацца ў спрэчку.

Тым часам Хрысціна пасцяліла коўдру на падлозе, пасадзіла Валечку, даўшы ёй у ручку таго самага зялёнага папугайчыка, і стала апранацца.

— Куды ж гэта? Прывыкла кідаць дзіця...— кінула Таццяна.

— Калі табе цяжка, дагледжу я,— сказала Ядвіся.

Таццяна кінулася на Ядвісю з лаяшкай: і халера, і пачвара, і гультай, і ўсялякія іншыя славечкі пайшлі ў ход. Умяшалася Хрысціна, і пачалася такая крыклівая мітусня, што аж маленькая Валечка, задраўшы галоўку, стала крывіцца і ўрэшце расплакалася. Антось узяў яе на рукі і крыкнуў на жанчын, каб сціхлі.

Праз некаторы час кухня апусцела. Антось паехаў недзе на сваім грузавіку, Хрысціна пайшла да мамы ў мястэчка, Ядвісю паклікаў брыгадзір, а сама Таццяна пайшла ў грады выбіраць агуркі. Маленькая Валечка засталася ў кухні адна са сваёй бразгаўкай-папугайчыкам. Яна вымахвала ім, брала ў роцік, сама сабе нешта выкрыквала. Маленькая бавілася адна, не заўважаючы свайго адзіноцтва.

Невядома, як бы гэта было доўга, каб не падышоў вусаты дзядзька, брат Таццяны — Апанас. Казалі людзі, што ва ўсёй вёсцы няма такога маўклівага чалавека, як гэты дзядзька. Ён служыў сторажам у калгасе, і людзі кожны вечар бачылі, як ён сядзіць над страхою калгаснага свірна разам з сабакам — сядзіць, як застыглая статуя, аберуч узяўшыся за дубальтоўку.

Дзядзька Апанас увайшоў у кухню, глянуў туды-сюды — няма нікога з дарослых. Клікнуў Таццяну. Няма. Маленькая спалохана ўтаропілася ў вусатага дзядзьку і ў момант заплакала.

— Цябе адну пакінулі, малую... Ах, ах,— нейкім неправаротным языком прамовіў дзядзька, нахіляючыся да Валечкі.— Ну, то хадзі ка мне...

Дзядзька Апанас пасадзіў малую на калені, а яна ўсё плакала, палахліва гледзячы на пажоўклыя вусы дзядзькі. І папугайчыкавая бразгаўка не памагла, як ні стараўся бразгаць дзядзька. І што рабіць з малою? Усе разышліся невядома куды. Вось трапіў чалавек у бяду! А Валечка не сціхала.

— Ну ціха, котачка... Ну ціха...— скрыпучымі словамі суцяшаў дзядзька Валечку.

Урэшце на маршчыністым ілбе дзядзькі бліснула нейкая здагадка. Твар павесялеў. Дзядзька палез у кішэню і выняў адтуль не што іншае, як свісток — свой старажоўскі свісток з гарошынкай. Ён злёгку свіснуў, і Валечка сціхла раптам. Цяклі па шчочках апошнія слёзкі, а руча-

няты цягнуліся да дзядзькавага свістка, які так нечакана памог скупым словам дзядзькі.

Уваішла Таццяна з мяшком агуркоў за плячыма і ўсё ж такі войкнула:

— Оій... Вось хто нам дзіця няньчыць...

— А што гэта ў вас за прывычка кідаць адно дзіця? Усякае можа быць.

Таццяна села, апусціла рукі, адпачывала. Глянула на Валечку і паправяла позірк на брата.

— Што ж, Апанас... не нашае гэта дзіця...— сказала яна бядуючы.

— Пустое гэта, Таццяна, выкінь з галавы...

— Вадзілася ж яна, Хрысціна, з тым, што паехаў на Урал, у шахты,— з Юркам...

— Мала хто з кім вадзіўся... Але прыйшло дзіця ў хату — лічы яго сваім. І няма чаго... Мала хто што...

Маўклівы брат хацеў яшчэ нешта сказаць, але сарваўся на паўслове і змоўк.

Валечка сядзела ў яго на каленях і бавілася свістком, які прынёс ёй такое шчаслівае супакаенне.

«ПУТАВОД»

Дзень урэшце скончыўся, ды такі дзень, што думалася — вось выйдзецца на ганак праўлення і тады ўздыхнецца на ўсе грудзі. Навокал вёскі — лес, адкуль патыхаюць розныя водары, з якіх найвастрэй адчуваецца пах жывіцы і чабру. Жонка наварыць вячэры — сопкай бульбы, да якой падасць кубак малака. Пасля вячэры можна будзе пасядзець на лавачцы пад страхою, выкурыць цыгарку, пасачыць за хмаркамі на небе, адгадаць пагоду на заўтра. Канчаецца сяўба яравых. Яшчэ думаюць пасадзіць бульбу на свежых тарфяніках. Работы, работы ўсюды — не толькі на полі, але і ў бухгалтэрыі. То тое, то другое, то трэцяе. Людзі кажуць — няма калі носа ўцерці.

Так думаў галоўны бухгалтар Сцяпан Чаравака, канчаючы свой рабочы дзень. Упарадкаваўшы крыху паперы на стале, ён сказаў сваім памочнікам, што ідзе вячэраць і больш сягоння не вернецца.

Ён спакойна павячэраў і думаў наогул хутка легчы спаць. Аднак выйшаў яшчэ на вуліцу, бо пачуў там нейкі гоман. І тут ён неспадзявана ўбачыў, што перад хатай,

абапершыся на веласіпед, у хмары камароў стаяў малады хлапец. А яны — гэтая пошасць — аж звінелі над ім і, нагул, дакучалі людзям у вёсцы як хацелі.

— Я да вас, таварыш Чаравака,— сказаў хлапец і працягнуў Сцяпану пакет.— З райвыкашкома,— дадаў ён.

Чаравака распячатаў пакет і выняў адтуль паперы. Адну з іх, якую сёння рана адсылаў у земаддзел як тэрміновую, ён пазнаў. І вось чамусьці вярнулі. У другой паперцы пісалася, якія трэба даць матэрыялы і па якой форме.

— Гм...— мармытаў Чаравака,— па форме дваццаць восьмай... Чорт ведае — каму што...

— Трэба, каб да ранку было гатова,— прамовіў пасланец,— і каб было ў выканкоме...

— Да ранку? — жахнуўся Чаравака і ціхенька засвістаў.— Да ранку? — перапытаў ён яшчэ раз.— Ці яны падурэлі там?

Чаравака пачасаў за вухам так, што кепка казырком раптам ссунулася аж на нос, і неяк неўзаметку нават прастагнаў. Затым паправіў кепку. І з гэтым рухам нібы прыйшло пераадоленне той раптоўнай дакукі, што вось неспадзявана навалілася на душу.

— Добра, будзе,— сказаў ён прымірэнчым ужо тонам,— скажы ім, што будзе гатова.

Пасланец развітаўся, сеў на веласіпед і хутка знік у змроку вуліцы.

Чаравака адразу, нікому нічога не кажучы, пайшоў у праўленне калгаса.

Вялікая бярвеністая будыніна гулкім рэхам адбівала яго крокі ў змрочнай пустаце пакояў, калі Чаравака, адчыняючы адны дзверы за другімі, дабіраўся да свайго стала.

Запаліў лямпу, сеў, палажыў перад сабою паперу з мноствам надрукаваных пытанняў. Вось на іх трэба даць сягоння адказы.

Так пачалася працоўная ноч пасля гарачага працоўнага дня. Чаравака то піша, то доўга ляскае лічыльнікамі, то корпаецца ў паперах, чагосьці шукаючы. А за акном усё больш і больш гусцее ноч. Але Сцяпан яе не бачыць.

Затое ўглядаецца ў вокны яго жонка Кацярына, рослая, чарнявая. Яна гляне то ў адно акно, то ў другое, доўга пастаіць, прыслухаецца. Потым пройдзецца па хаце, сядзе на пасцель, пазяхае. Карціць ёй нешта, гэтай Каця-

рыне, і думка думку наганяе. «Куды ж падзеўся Сцяпан? Выйшаў на хвілінку і няма. Такі ж чула мая душа, што тут нешта не так»,— думае Кацярына, усхопіцца, падыдзе да акна і ўглядаецца на вуліцу.

А ноч агортвала вёску цішынёй. Ні адна яблынька за акном не паварухне лісточкам.

І раптам прыйшла Кацярыне злосная думка: «Хіба пайсці ды пабіць ёй вокны?» Каму? Ды ёсць у вёсцы тая ўдава Аляксандра, даяркай працуе. Два разы западокая зразрыла Кацярына сваіго прававернага Чараваку ў сімпатыі да гэтай удавіцы. Першы раз — калі гулялі вяселле брыгадзіра і Сцяпан некалькі разоў запрашаў Аляксандру на танец, а другі — як малолі ў млыне, то мужанёк Кацярыны насіў Аляксандрына жыта наверх да каша. Чаго ж бы яму, здаецца, насіць? Няхай бы папасіў хто іншы. Не, тут нешта ёсць. Думае, думае Кацярына, хоча сарваца, пабегчы і пабіць ёй, «гэтай зводніцы», не толькі вокны... Але, ломячы рукі, падае на пасцель і на момант прыціхае са сваімі развагамі.

Кацярына знямела, змоўкла, чакала шораху крокаў на падворку, стуку ў дзверы. Але не пачула ні таго, ні другога. За вокнамі плыла толькі цішыня.

...Чаравака спіць, палажыўшы сваю валасатую галаву на бухгалтарскі стол. Запячатаны пакет з напісаным адрасам у выканком ляжыць свежы, пукаты. Трэба было б ісці дамоў пасля запаўнення бланка, а яму на хвілінку захацелася даць галаве адпачыпак — і вось заснуў, забыўшыся пра ўсё. Гучны храп раздаецца ў бярвеністым пакоі, і час ад часу скача агапёк у лямпе. Ён павольна бялее, бо з акна прасочваецца дзень. Світае...

Сцяпан не чуе, як пракрадваюцца праз акно першыя праменьчыкі сонца, лашчаць яго галаву цёплым, ласкавым дотыкам. То там то сям... Тонепька рыпнулі дзверы ў канцылярыі, і першым увайшоў намеснік Чаравакі. Спыніўся над сваім галоўным, усміхнуўся, пагасіў лямпу і, паставіўшы яе на акно, сеў за свой стол.

Пасля прыйшлі другія работпікі, таксама агледзелі галоўнага з усіх бакоў, і кожны ціха сеў на сваё месца, бо намеснік сказаў: «Няхай спіць, сам прачпецца...»

Увайшло некалькі калгаснікаў па справах. Пачалося шуршэнне паперы, стук лічыльнікаў, гутарка. Чаравака нічога не чуў, заліваўся храпам, як кажуць, на ўсе застаўкі.

І вось, чаго яшчэ не хапала, уварвалася разам з ляска-

там дзвярэй жонка Кацярына. Толькі заікнулася спытаць-ца: «Ці няма тут?..» — як раптам сціснілася над галавою «свайго» і ляснула ў далоні.

— Вось дзе ён!..— ускрыкнула яна збянтэжана і зараз жа, нічога не пытаючыся, схапіла за валасатую галаву «свайго» і, тузануўшы, крыкнула яму ў вуха: — Ці ў цябе жонкі, хаты няма, што ты тут спіш?!

Чаравака прыўзняў галаву і, як беспрытомны, паглядзеў навокал чырвонымі ад бессані вачыма. Ён доўга не мог зразумець, дзе ён і чаму ён тут. А потым, не звяжаючы на дакоры жонкі, сказаў, пакрэктваючы:

— Пакет... Дзе пакет? Трэба зараз жа адправіць у райвыканком.

А жонка сваё:

— Во!.. Я яму адно, а ён другое... Нейкі пакет...

Тады Чаравака спыніў пахмураны позірк на жонцы.

— Пакет тэрміновы! Разумееш? Я — рахункавод і павінен...

Жонка не дала яму дакончыць. Стукнуўшы кулаком па стале, яна заверашчала:

— Ты не рахункавод, а путавод! Калі ты мяне перастанеш путаць?

Усе, хто быў у бухгалтэрыі, заліліся смехам. А Кацярына разышлася не на жарты:

— Путавод! Путавод! Путавод! Каб цябе спутала...

Чаравака ўжо не слухаў. Паклікаўшы калгасніка, ён уручыў яму пакет, даўшы наказ хутчэй, любымі сродкамі даставіць яго ў раён.

Ляскалі лічыльнікі, шуршэлі паперы, гамапілі людзі, але ўсё перавышаў адзін жаночы голас:

— Путавод! Путавод! Путавод!

А гэты «путавод» урэшце ўзяў сваю крыкуху над руку і з лагоднай усмешкай над агульны гоман адабрэння прысутных накіраваўся да дзвярэй.

ІМУНІТЭТ

Мы ішлі ў той сонечны яблыневы сад. Пясчаная палявая дарога, парослая па абочынах травою-паўзуном, непрыкметна вяла ў палі. Хацелася ісці і ісці без гутаркі, без слоў і ўдыхаць ласку гэтай, здаецца, да кожнай ба-

разны знаёмай зямлі ў жытнёвых і аўсяных хвалях і адчуць ва ўсім уцеху і цану чалавечай працы.

Са мною ішла побач у белай хустцы, завязанай пасяляніску, пад бараду, маладзіца Алена Рыгораўна. Гэта — аграном, выхаванка Горацкай акадэміі. Яе плаўная хада быццам зліваласа з лёгкім пакалыхваннем жыта, і можна было падумаць на хвіліну, што яна не ідзе, а плыве.

Гаварылі мала. Аб ураджаі, аб вапнаванні глебы, аб тым, што кароўнікі і свінарнікі нельга будаваць блізка ля чалавечага жылля, бо гэта негігіенічна, і аб іншых справах.

Усё было як трэба. Выйшлі на сенажаць, якую перасякала рэчка ў лазовых кустах. Нічога не кажучы, мы спыніліся на мосціку. І тады я мімаволі глянуў на яе постаць у цёмна-чырвонай кофце, на яе ружовы профіль, які здаваўся мне сонечным.

— Стойце, ні з месца! — сказаў я і сышоў з дарогі на сенажаць. Нарваў розных кветак — і белых, і чырвоных, і жоўтых, і сініх — і паднёс ёй, жанчыне.

Кветкі ўсе былі пахучыя, мядовыя. Яны напаміналі аб маладосці, аб трыумфе жыцця. Я нешта сказаў пра гэта, а Алена Рыгораўна, як быццам чакаўшы такіх слоў, задумна паглядзела ў даль сенажаці і сказала, стрымліваючы ў сабе нешта ласкавае:

— Вось вяду ж вас іменна да трыумфатара жыцця. Вы ў ім адчуеце нават філосафа. Ён вам спадабаецца — наш дзядзька Іван Падабед.

Мы рушылі, мы пайшлі не спяшаючыся. Так маглі б ісці па гэтай зямлі ў бясконцую дарогу, гаварыць аб гераізме тых, хто яе ўпрыгожвае. І хто ведае, можа дзе на нейкім далёкім, прыгожым прыпынку ці не зрабіўся б я аграномам, вядома, назаўсёды?

Але прыпынак якраз быў блізка. Вось ужо ён, гэты сад, абсаджаны ліпамі. Мы ўваходзім у пчаліную дзяржаву. Яе пільны вартавы — дзядзька ў чорным, таямнічым каўпаку з сеткі — убачыў нас здалёк і бадзёраї хадой накіраваўся нам насустрач. Гэта і быў Іван Падабед.

— Добры дзень, Іван Максімавіч! — паўжартам нараспеў сказала Алена Рыгораўна.

— Добры дзянёк, добры дзянёк! — адказваў дзядзька, ціснучы нам рукі.— Ды ён і сапраўды гэты дзянёк добры сягоння. Глядзі ды любуйся. І ўзятак сягоння х-а-а-рошы! — дадаў ён.

Перад намі стаяў, узяўшыся ў бокі, высокі, танклявы чалавек, адкінуўшы свой чорны каўпак на патыліцу, як рыцар ілбіцу шлема. Гэта быў адзін з тых пчаляроў старога пакалення, якія пчаляры не толькі па сваёй прыродзе, так сказаць, але і па сваёй саматужнай адукацыі. Дзядзьку Падабеду, аказваецца, шэсцьдзесят год, але ні на лбе, ні на шчоках амаль што няма маршчын. І калі б не пасівелыя валасы на скронях, хто б сказаў, што пчаляру Івану Падабеду шэсцьдзесят год?

Я ў гутарцы дзівавaўся такой захаванасці дзядзькі, а ён расплываўся ва ўсмешцы, і яго шэрыя разумныя вочы, здаецца, пранізвалі мяне наскрозь.

— Чаму вы не пакусаны пчоламі? Чаму вы не апухлыя? — пажартаваў я.

— Імунітэт! — шпарка адказаў дзядзька.

Я здзівіўся такому адказу, глянуў ў твар дзядзькі і адчуў, што гэтае слова для яго даўно не павінка. Прыгадаліся словы Алены Рыгораўны, сказаныя ў дарозе, пра пчаляра-філосафа.

— Ну хадземце, пагледзяце маю гаспадарку. Вы ўсё пішаце...— звярнуўся ён да мяне.— А ці пісалі вы аб цудах жыцця калі-небудзь?

Міма нас са звонам праляцела пчала. Дзядзька паказаў пальцам услед ёй і дадаў:

— Вось яна, цудадзейка! Паляцела...

Шасцідзесяцігодні Іван Падабед не меў сутуласці. Высокі, статны, танклявы, ён рухава, энергічна ішоў наперадзе нас у белай сарочцы і ў белых штанах. Часам спыняўся, недзе нешта заўважыўшы перад сабою, і, зноў узяўшыся ў бокі, неяк па-сакалінаму і разам з тым дбайліва аглядаў сваю мядовую гаспадарку. А потым ішоў далей.

Вялікі яблыневы сад, застылы ў летняй цішыні, грэўся над сонцам. Тая, здавалася б, адпастайная, але тонкая музыка — пчаліная сімфонія — не парушала гэтай цішыні, а, наадварот, яшчэ больш яе навявала. Ад гэтага вісела ў паветры сонечная дрэма — вісела над садам, над усім навaколлем.

Пчаліныя хаткі стракацелі рознай афарбоўкай між пабеленымі ствaламі яблынь. Іх, хатак, здавалася на першы погляд, незлічоная колькасць, бо, у які бок ні глянь, усюды яны аддаляюцца ў зялёную таемную глыбіню саду.

Выйшлі мы ўрэшце на ўскраіну пасекі, дзе сярод вы-

сачэзных ліп, клёнаў і каштанаў будавалася пчалінае жыллё.

— Людзі так лёгка адносяцца да пчол,— вёў сваю гутарку дзядзька Падабед,— думаюць, што пчала, як муха тая, ды ўсё... Не, недарма некалі людзі празвалі яе божай.

Тут дзядзька зараз жа агаварыўся:

— Вядома, цяпер яно з богам людзі не дружаць, бо яго няма. І я за тое, што — няма... Прырода — вось што! Яна для мяне ўсё. Дружыць з прыродай, дружыць з пчолкай, бо і яна таксама прырода.

Мы пераглянуліся з Алепай Рыгораўнай і ўсміхнуліся. Я сказаў:

— Добра дружыць з пчолкай, бо яна — прырода. Гэта так. А вось тыгр, кракадзіл — таксама прырода. Можна з імі дружыць?

Дзядзька Падабед крыху задумаўся, а пасля, як бы прыняўшы нейкае рашэнне, кіўнуў галавой і сказаў:

— Можна! Усё можна! Усё залежыць ад чалавека, як ён сябе павядзе. Калі будзе імунітэт — усё ў парадку.

Алена Рыгораўна і я рассмяяліся.

— Вось вам смешна,— крыху дакорліва вымаўляў дзядзька.— Прывучыў жа чалавек сабаку, каня, карову... Чаму ж не можа прывучыць тыгра, кракадзіла? Можа! Абы толькі ўвагнаць імунітэт... Імунітэт...

Мы ўжо з Алепай Рыгораўнай пераглянуліся між сабою больш сур'ёзна.

Дзядзька, Іван Максімавіч, змоўк на момант, задумліва пазіраючы навакол. Усе мы стаялі, абапершыся локцямі на невысокі зруб амшаніка, дзе зімою павінны будуць жыць дзядзькавы ўлюбёныя пчолы.

— Калі я,— распачаў дзядзька знячэўку,— прылягу часам адпачыць пасля абеду на лавачцы ля свайго шалаша, я праз сон чую гэты звон і праз сон адчуваю, што я дыхаю, жыву. Гэты звон закалыхвае мяне да сну...

Мы некаторы момант слухалі гэтую, крыху аддаленую, пчаліную музыку, гэты звон, што навяваў спакой. Ён роўна пераліваўся ў гушчары саду, не сціхаючы ні на секунду, дзе адны ноткі быццам спаборнічалі з другімі. У гэтым звоне адчувалася няспынная, няўмоўкная, упартая, гарачая праца.

— Вось дзе праца! Чулі? — узняўшы палец уверх, сказаў дзядзька.— Калі я зайду ў праўленне свайго кал-

гаса, я там толькі сваруся... Трутні! — кажу.— Трутні! Дзе ваш імунітэт? Дзе?

І дзядзька пачаў расказваць пра грэчку, пра тую мядовую грэчку, якая вырасла напалавіну з травою.

— Вось дзе работка! Ці ж гэта не трутні? Каб не гэтыя пчолкі, што вось гудзяць, гэтая грэчка не мела б ні аднаго зярняці. Але паспрабуй скажы ім, што гэта так, яны вочы заплююць. Ці ж яны чым цікавяцца? Дзе ім што ведаць?

У апошніх словах дзядзькі чуцён быў гонар за самога сябе і за свае веды.

— Як жа можа быць інакш? Пасека — гэта ж цудоўная гаспадарка, дзе дружба чалавека з прыродай яднаюцца недзе ў самым сопцы. Гэта ж падумаць, цудоўныя таямнічыя сокі, што сочацца, плывуць з жыватворных крыніц зямлі, знанымі і нязнанымі шляхамі асядаюць у кветках і кветачках розных траў і палявых раслін, лясных кустоў і дрэў — іглістых і лісцястых. І ўсюды дасягае яна — пасечная жыхарка, рупная работніца-меданосіца, тая маленькая пчолка, якая так пільна стараецца над узбагачэннем зямлі. Пчолка ўсю сябе аддае вялікаму зямному жыццю.

Мы слухалі шасцідзесяцігадовага пчаляра і ўнутрана захаплялiся яго бачаннем «красы жыцця». Не хто іншы, як пчолкі, далі яму магчымасць адчуць глыбінны яго сакрэт, якім прасякнута ўсё, што жыве.

— Ці маюць яны пашану да таго, што калі пчолка сядзе на кветачку грэчкі, дык там мусіць нарадзіцца зярнятка? Калі сядзе на кветачку яблыні, мусіць нарадзіцца яблычка... Ну на што ні сядзе — на ліпу, на сасну, на верас,— усё пасля яе родзіць, жыве... Вось што! Вось дзе імунітэт!

Дзядзька паправіў свой каўпак, ссунуўшы яго больш на патыліцу, і дадаў:

— Я як пабуду ў калгасе, у праўленні, уцякаю сюды да пчолак. Тут згода, тут праца, дысцыпліна, тут імунітэт! А то што? Яны ж там яшчэ імунітэту не маюць! — развёўшы рукамі, вывеў дзядзька.

Пры апошніх словах дзядзька дабрадушна рассмяяўся.

— Жартуеце, дзядзька,— сказаў я.

— Вы хочаце, каб так было спраўна ў калгасе, як у вуллі? — умяшалася Алена Рыгораўна.

— А хіба ж дрэнна было б?..

— Можа нават і дрэнна...

— Ну вось табе і мой аграном — ну, што ён кажа?

— Зразумейце, што людзі — гэта людзі, а пчолы — гэта жывёлінкі. Вось вы, чалавек, кіруеце імі, а не яны вамі.

— Чалавеку дадзен розум, а ён ім карыстацца не ўмее. Эх, не ўмее! — закруціў галавою дзядзька.

Алена Рыгораўна, каб перабіць «скептыцызм» дзядзькі Падабеда, сказала:

— Не бядуйце, наш калгас у гэтым годзе ўжо будзе мільянерам.

— Го-о! — ускрыкнуў дзядзька, правёўшы рукою навокал.— Вось яны, мільёны, ляжаць. Чаму ж іх не падымаюць? Яны б штогод радзілі.— Ён стукнуў кулаком па цагляным зрубе, як па стале, і дакончыў: — Добра! Няхай жывуць калгасныя мільёны! Я не супроць, не, я не супроць! А цяпер хадзем да маёй хаткі, пачастую вас мядком.

Мы не маглі ісці так упэўнена паміж вулляў, як ішоў дзядзька Падабед. Ён свабодна ўвіхаўся ля стракатых хатак, час ад часу даверліва нахіляючыся на момант да каторай-небудзь з іх.

Ля хаткі, пабудаванай з дошак, мы засталі чалавека сярэдніх год, які на сталярскім варштаце пад яблыняй габляваў дошкі.

— Гэта мой брат...— сказаў дзядзька.

Хатка была падзелена на дзве палавіны. У большай ляжалі розныя прылады для вулляў, пачынаючы ад дошак; гатовыя рамкі для сотаў віселі на сцепах. У цяняным кутку ляжаў цэлы стос рамак з мёдам. У меншай палавіне было жыллё дзядзькі Івана і яго брата Васіля, з якім мы толькі што пазнаёміліся.

За столікам у ценявой яблыневай прахалодзе частаваліся дзядзькавым мёдам.

— Молада вы выглядаеце на шэсцьдзесят год, Іван Максімавіч,— сказаў я,— у вас жа няма маршчын на твары.

— Вось ешце часцей мёд, то і вы такімі будзеце. Усё ад мёду. Яшчэ людзі да канца і не разгадалі яго моцы. Глюкоза тут ёсць? Ёсць. Вітаміны ёсць? Ёсць, ды яшчэ якія... Увесь мёд, можна сказаць, з глюкозы.

Дзядзька пачаў, як на лічыльніках, падлічваць лясавыя вартасці мёду, за кожным разам загінаючы палец на левай руцэ:

— Ці табе рана якая, ці сэрцаїка забаліць, ці вочы, ці

ногі, ці грудзі, печань, почкі, жывот... Ну ўсё, усё. Пра што ні падумаї, усюды лекарам — мёд. Вось вам і глюкоза, і левулёза...— усміхаючыся, закончыў дзядзька Іван, а пачакаўшы, прадаўжаў:

— Вось брат у мяне...— Дзядзька кіўнуў у бок брата, які, не ўступаючы з намі ў гутарку, ціха поркаўся ля свайго варштата.— Узяў я яго да сябе. Няхаї пажыве тут. Вылечыць яго хачу...

— А што з ім?

— Што? Гм... Як вам сказаць? — Дзядзька выцер губы, разгладзіў невялікія шэрыя вусы і прадаўжаў: — Дзвесце ўдараў нагаечных... далі яму паліцаі пры немцах і кінулі ў халодны хлеў у адной сарочцы... Ужо была восень. За ноч ён выбраў яму пад подрубам і ўцёк... Уцёк у партызаны. Жонку і дваіх дзяцей немцы знішчылі... Вось як! І Васіль мой застаўся адзін... Не мае здароўя... Баліць у грудзях... Вось я і ўзяў яго да сябе... на лекі... мядок павінен усё зрабіць.

Маўчанне нашае пасля дзядзькавых слоў было нават доўгім. Мы з Аленай Рыгораўнай адначасова глянулі ў бок брата. Дзядзька Іван нібы зразумеў нашае жаданне і паклікаў яго:

— Ідзі, Васіль, пасядзі з намі трошкі. Работа не ўцячэ.— І, звярнуўшыся да нас, дадаў: — Рамкі робіць для вулляў... і самі вуллі... От, тое-сёе... Недарма жыве.

Васіль, з руса-жаўтаватымі валасамі, зачэсанымі назад, з выглядам чалавека, які вось толькі адарваўся ад працы, нібы ад задумы, сеў за столік і пачаў выціраць рукавом пот з ілба.

Нясмелы Васіль хутка, аднак, разгаварыўся. І мы праслухалі расказ пра тое перажытае, што ніколі не можа забыцца. Яно, поўнае рап, слёз і гераізму, заяўляла аб сабе ў кожным позірку пчаляровага брата — позірку цярплівым, які ніколі не выбачыць тым, хто так крывава паглуміўся над нашай любоўю да жыцця.

— Цярплівасць каменная...— міжволі вырвалася ў мяне.

— Так! — падхапіў дзядзька і, глыбока ўздыхнуўшы, даказаў: — Трэба ж чалавечай душы такое вытрымаць... Ах, ах...— Дзядзька доўга качаў галавой.

Алена Рыгораўна нахілілася да дзядзькі:

— Гэта што? Таксама імунітэт ці не? — запытала яна.

— Імунітэт! — паўтарыў сваё ўлюбёнае слова дзядзь-

ка.— Гэта наш імунітэт! — І стукнуў сябе ў грудзі кулаком.

Пачало ўжо зусім цямнець. Мы ўсталі, каб падзякаваць за пчаліны нектар, паціснуць на развітанне двум братам рукі — пчаляру і партызану.

Дзядзька Падабед падышоў да мяне і крануў за локаць.

— Глядзіце, каб напісалі аб цудах жыцця... Помніце! Ну вось, буду чакаць. Не забывайце пра імунітэт. У ім усё. Шчасліваї вам дарогі!

Мы выйшлі з саду на сенажатную дарогу і акунуліся ў сінія, шаўковыя туманы...

ГУМНО БЕЗ ВАРОТ

Сядзелі за сталом у шумпай бяседзе. Час ад часу падымалі чаркі, чокаліся, жадалі адзін аднаму расці, квітнець, жыць, больш сустракацца. І ўсім было прыемна адкрыць хоць краёчак сваёй душы, дзе пасумаваць, дзе пасмяяцца. Усім было прыемна глядзець на госця, які з'явіўся так нечакана, быццам з далёкай шматгадовай вандроўкі.

Вандроўка сапраўды была вялікая. Трыццаць год мінула з таго часу, калі Сяргей Баравы, «студэнт», як яго празвалі ў навакольлі, пакінуў купецкі лес, дзе служыў лесніком. Камуністы падхапілі яго ў сваё падполле, і пайшла тады гэтая самая вандроўка ад сваёй вёскі да турмы і наадварот пад канвоем паганятых Пілсудскага. Так і навандравалася дванаццаць гадочкаў турэмных.

І цяпер вось ён сядзіць, гэты госць, сярод сваіх былых знаёмых самай блізкай вёскі ад колішняга лесу, сядзіць з планкамі ўзнагарод па грудзях, пасівелы, але з маладымі, чорнымі вачыма, як і дванаццаць гадоў назад.

— Пастарэў, студэнт, пастарэў,— час ад часу гаворыць Оля, сакатуха, як называе яе Сяргей.

Яна сядзіць насупраць яго, па другі бок стала, разружавелая, і сюд-туд заліваецца смехам. Русыя яе валасы яшчэ не згубілі прозалаці. Спрытная галава трымаецца на асапістай шыі, якую і цяпер мо хто-небудзь яшчэ назваў бы лебядзінай. Але паўната твару і рысы зморшчак навокал вялікіх шэрых вачэй гаварылі не толькі аб сталасці, але і аб набліжэнні таго, што завецца старасцю.

Што ж дзіўнага! Оля ўжо выгадавала чацвёра дзяцей, якія паішлі ў свет. Побач з ёю сядзіць яе муж Аляксандр Бараноўскі, колішні друг Сяргея. Тая ж самая цёмна-русая прычоска з завітком ля скроні, толькі валасоў стала менш. І зморшчкі рассыпаліся па ўсяму худаватаму твару з шырокім ілбом і вузкім падбародкам.

— Кажаш, Оля, пастарэў я? — адказаў запытаннем госць.— І ты папаўнела. Выглядаеш, як галоўная каравайніца на вяселлі. Помніш, як уцякалі ад дажджу ў тую лесніковую хату, дзе я жыў?

— Ой, як жа не помніць! Тады ж якраз лес ачышчалі. Помню. Я і палец тады збіла, і вы мне ёдам лячылі. От, такі ж вы нічога не забыліся... От, памяць! Даўно ж гэта ўсё было!

— А помніш, як ты не пускала Аляксандра ўцякаць са мной у Саветы?

— Ну і сярдзітая ж я была тады на вас абодвух. Як жа? Страціць кавалера...— І Оля залілася смехам.

— Калі сам не гам, дык нікому не дам? Так ты падумала пра мяне?

Оля прыклала палец да вуснаў і прыгразіла: «Ціха...» Хоць трыццаць год мінула, а ўсё роўна сказала «ціха» і жартаўліва глянула ў бок Аляксандра.

Так пачаліся салодкія і горкія ўспаміны. Аб тым, як Сяргей прыйшоў адпекуль здалёк, паступіў на службу да купцоў-лесапрамыслоўцаў лесніком, прыйшоў у скамечанай студэнцкай шапцы з сінім аколышам, чаму і празвалі яго студэнтам. Як быў Сяргей худы ад голаду, у палатанай куртцы, у чаравіках, дзе-нідзе счэплены дротам; як ён нікому не шкадаваў дроў, і людзі дзівавалі, што такога лесніка яшчэ піколі тут не было; як потым бабы хацелі «выдаць замуж» Сяргея за багатую дзяўчыну з жарабіцай. Так і казалі: за дзяўчыну з жарабіцай. Але атрымаўся канфуз — жарабіцу нехта ўкраў, і Сяргей уздыхнуў з палёгкай — не будуць прычапляцца з жаніцьбай. Думка ляцела на ўсход, туды, за мяжу. Не да жаніцьбы, не да лесу было. З Аляксандрам усё рыхтаваліся, усё рыхтаваліся. А потым... а потым сталася тое, на што Сяргей нават зазлаваў,— Аляксандр закахаўся ў Олю, у статную, рослую дзяўчыну, што закаціста смяялася. Здрадзіў Аляксандр «вялікім намерам». Некалі ж чатыры месяцы вучыліся разам па рабфаку — там, у бежанстве на Паволжы. Сяргей пайшоў вучыцца вышэй. Вось і хацелі вярпуцца туды. І вось на дарозе стала япа — Оля з ле-

бядзінай шыяй, тая Оля, што кожны дзень хадзіла ў гобядзінай шыяй, тая Оля, што кожны дзень хадзіла ў горад палоць з рапку да вечара мяшчанскія агароды, каб як-небудзь пражыць з бацькам, бо маці ўжо не было.

І той памятны вечар вырашыў усё. Ах, што ж гэта быў за вечар! Оля стаяла ў канцы вёскі ля могілак і чакала, думала: «Чаго ж ён прычапіўся да яго, гэты студэнт? Да яго, да Сашы. Вось пайшлі недзе з бясконцымі гутаркамі. Гавораць такое, што ўсяго схапіць і ўцяміць нельга. Ужо цямнее, і крыжы між сосен і кустоў пачынаюць рабіцца страшнымі. Казаў жа прыйду, і няма... Божа, божа...»

Вольга выцерла тады няпрошаную, гарачую слязінку фартушком, абшытым карункамі, і ціха пайшла ў вёску.

А вёска — якая ж яна панадная была ў той вечар! Гудзела музыка — гармонікам, скрыпкамі, бубнам, несціханымі песнямі дзяўчат і хлопцаў. Усё гэта меладыйнымі хвалямі пералівалася з канца ў канец. То сціхала на момант, то ўздымалася зноў раскаціста, шырока і далёкім рэхам замірала пад ціхімі, заслуханымі зорамі. Гарачая ласка распірала грудзі Олі, хацелася адкрыць душу гэтаму вечару, зорам, другу міламу. Хацелася сысці праз агароды ўніз да рэчкі і акунуцца ў малочны, цёплы туман, што хвалямі, як воблачкамі, плыў і застываў, прыпадаючы да зямлі. Мо тады палягчэла б на сэрцы?

Сяргей прыпамінае той момант, як ён не мог заўважыць, якім чынам адарваўся ад яго Аляксандр і недзе знік. Абодва ж глядзелі, як на вуліцы ў крузе танцавала Оля. Спынілі гутарку пра Талстога і Дастаеўскага і, нічога не кажучы, сачылі вачыма за Оляй. Як адышоўся ад яго тады Аляксандр, Сяргеї і цяпер не можа сабе ўявіць. Ён хутка заўважыў толькі адно — не стала Олі ў танцах. Яшчэ раз прапусціў вачыма пары, каб перакапацца... Не, няма. Павольна пачаў Сяргей праціскацца праз натоўп моладзі, што стаяла ля плота пад навіслымі галінамі вішань. Няма. Цікава і дзіўна. Зайшоў на падворак і заўважыў, як парачка — ён і яна — падняліся з прызбы і падалася ўніз на агароды, туды, да сенажацінага туману. Там, у даліне, блізка ля сенажаці, ля агародпай мяжы-разоры стаяла гумно. Няўжо туды? Гумно належала гаспадару хаты, з прызбы якой яны падняліся. Гумно... Ну што такое гумно? Гэта — будыніна, дзе гаспадар кладзе снапы, сена, зялёнае, духмяпае. Але ўся бяда (а можа, і не бяда) гэтага гумна была ў тым, што яно не мела варот. Відаць, салдаты — свае ці нямецкія —

у часе царскай вайны спалілі іх на агні, варачы ў кацялках салдацкую вячэру. Пасля звароту з бежанства з Расіі нялёгка было зрабіць і вароты для гумна або нават дзверы ў хату. Дзе тут да дзвярэй, калі голад сціскаў за душу. Добра, што сцены ёсць...

І моладзь палюбіла гэтае гумно. Яго ж там ніхто надта не правяраў, пакуль не было спапоў. Гаспадар толькі часам пакрычыць, павыганяе ўсіх, калі ўжо вельмі пачне весяліцца моладзь у гэтым гумне, што здаралася толькі сонечнымі летнімі нядзелямі.

Па абодвух баках тока заўсёды клалася сена —зялёнае, лугавое, ад паху якога кружылася галава. Над сенам, пад страхою з павуцінне, увіхаліся і шчабяталі ластаўкі-белагрудачкі. А па кутках у сене таксама шчабяталі... не, не шчабяталі, там шапталіся парачкі... парачкі... Шэпты цёплыя, гарачыя... шэпты мілыя — з дакорамі, з пацалункамі... Часам прарываўся пястрыманы смяшок і раптам заціхаў, як быццам прападаў у цёмную бездань. Здараліся і яны — горкія слёзы, калі ведзьма-нязгода клалася ўпоперак і атручвала радасць пакутамі. Іншы раз збіраліся сюды смельчакі на сходку, каб пачытаць рэвалюцыйную літаратуру, пагутарыць аб тым, што пачулі ад падпольшчыкаў. Колькі жыццёвых мар-дарог намячалася ў гэтым, Сцяпанавым, як звалі яго, «гумне без варот»!

І калі якая-небудзь маці дакарала дачку, то не ўпускала, каб не сказаць: «Вылежалася ў Сцяпанавым гумне, а цяпер будзеш мне...»

Сяргей зразумеў, куды пайшлі Аляксандр з Оляй. Пастаяў за хлявамі ў тычкавай фасолі, паглядзеў ім услед і вярнуўся на вуліцу — асалавелы, задуманы.

Гэта было так даўно і разам з тым здавалася цяпер, што адбылося толькі ўчора. Так свежа ўсплылі ўспаміны за гэтым бяседным сталом, дзе насупраць Сяргея сядзела яна — разружавелая віноўніца успамінаў.

Так і развітаўся тады Аляксандр з думкай уцякаць у Саветы. Сяргей сустрэў яго назаўтра і ўсё гэта зразумеў, не пытаючыся. Нічым яму не дакараў, а толькі расказаў пра старажытнарымскага палкаводца Антонія і егіпецкую каралеву Клеапатру. Гутарка адбылася на жытнёвай дарозе ў Сяргееў лес. «Антоні» слухаў, прагна курыў, упарта глядзеў сабе пад ногі. Усё збіраўся нешта сказаць, але не мог. Заняло яму.

Так, ідучы за ўспамінамі, Сяргей раз-пораз паглядаў

на Олю, якая харашылася за сталом, як нава, і давала во-лю свайму смеху, як некалі сярод дзяўчат і хлопцаў.

— А як з тым гумном, Оля? Не забылася?

— З якім гумном? — Оля хвіліпку ўспамінала, змор-шчыўшы лоб, а потым пляснула ў далоні і закрыла імі твар.— Ох, чаму не помніць? Ой, гумно, давяло яно...

Стары дзядзька, сусед Сцяпан Мароз, гаспадар гэтага гумна, добры выпівака, адгукнуўся з покуці:

— Гэта ж быў клуб... клуб... Як нядзеля прыйдзе, бы-вала... Адгону не было... Бывала, усё сена здратуюць...

— Які там клуб? — крыкнула Оля.— Хіба для цы-ганоў!..

Усе зарагаталі так, што гаспадар хаты Васіль Васільевіч, які некалі служыў леспіком разам з Сяргеем, аж «спалохаўся», бо прыўстаў і глянуў на вокны — відаць, хацеў упэўніцца, ці цэлыя яны.

Васіль Васільевіч, некалі прыгожы, здаравецкі мужчына сажнёвага росту, цяпер пасівелы ўжо, але таксама па-бываламу ветлівы, пахіляецца да сваёй невялічкай жонкі Наташы, у якой паабапал курносага носіка леглі маленькія маршчынкі. Яна таксама бліснула прарэджа-нымі ўжо зубкамі ў агульным смеху і зашаптала пешта свайму Васю на вуха.

Калі крыху прыціхлі, Васіль Васільевіч, нібы ўтай-моўваючы рухам рукі апошнія хвалі смеху, сказаў:

— Ну і дало пытлю гэтае гумно!

А Сяргей, госць, тут жа над яшчэ не астылае захап-ленне тым бывалым, мінулым, маладым падымае чарку і, азіраючы ўсіх іскрыстымі вачыма, гаворыць:

— А ўсё ж такі, як бы яно там ні было, давайце вы-п'ем за тое гумно без варот! Яно адыграла, як бачыце, сваю, і немалую, ролю. Аб гэтым можа расказаць не адна пара ў вёсцы. Ітак, за гумно без варот!

— Харошае было гуменца, што і казаць,— прамовіла, чокаючыся, суседка-ўдава цётка Мар'я, сястра Васіля Ва-сільевіча, у якой некалі паўгода Сяргей жыў на кватэ-ры,— дый сам Сяргейка заглядаў туды...

Мар'я ўсміхнулася, захіпаючы вусны ражком хусткі. А ўсе адзін за адпым паўтаралі: было... было... было...

Оля ўсхапілася:

— Дык за тое, што было і што яно дало... яшчэ раз за гумно без варот!

І ўсе выпілі дружна да дна, з асалодай, з пакрэктван-нем. Мужчыны замашыста выціралі губы ручнікамі, якія

Наташа паклала на калені кожнаму. Жапчыны закрывалі на момант твары рукамі, смяяліся, расстаўлялі талеркі з закускамі, што падавала Наташа, і, між іншым, бедавалі, што немцы спалілі тое гумно.

— Вось старшыня,— тыцнула пальцам у сваіго «Антонія» Оля-«Клеапатра»,— усё ніякага клуба не пабудуе для маладых. А ці ж не пара?

І пачалі дакараць Аляксандра, старшыню калгаса, не толькі за клуб, але і за саломy, што ў полі засталася ад камбайна, што бульбу нячыста капаюць, што ў магазіне тканін мала, што дарогу не выбрукавалі да горада, што дрэва цяжка дастаецца на хаты тым, чые сыны загінулі на вайне...

Стары сівы Сцяпан аж крыкнуў з покуці:

— Ну, раскудахталіся! Усё ён вам зробіць!

Гутарка хваляй пераключылася на кароўнікі, якія трэба перакрываць, на сховішча для гародніны, у якім нехта зламаў замок. І так далей, і так далей... што лепшай рэвізійнай камісіі і не трэба.

Аляксандр устаў. Усе прыціхлі.

— Так...— загаварыў ён,— пачалі ад гумна без варот, а перайшлі да гумна з варотамі. Бо цяпер гумен без варот у нас ужо няма. Клуба просіце — будзе клуб. Але мы яшчэ не пабудавалі як след клубаў для кароў, свіней... Праўда ці не? Вось калі скопчым клубы для іх, тады... Я ўзношу гэтую чарку за нашы гумны з варотамі і каб яны спрыялі нашай моладзі яшчэ лепш, чым некалі спрыяла нам Сцяпанава гумно без варот...

— Вось вывеў! — гукнулі жанчыны.— Вось гэта вывеў!

— Усё роўна тое гумно без варот не прападае! — даказала Оля.— Вось мой старшынька да чаго дагаварыўся.— І «Клеапатра» цмокнула свайго «Антонія» ў галаву.

Чаркі ў завірусе павіслі над сталом.

А сівы Сцяпан, цмокнуўшы губамі на покуці, мармытаў:

— Ці ж я думаў, што маё гумно дачакаецца такой пашаны? — і паківаў галавою.

— Яшчэ не так паківаеш, як вось пабудуюць клуб,— зноў вяла сваё Оля,— што вы, дзядзька, тады скажаце? Гумно — яно і ёсць гумно. Што ж было рабіць тады нам, бедным? — Оля штурханула Аляксандра локцем і дакончыла: — Як не пабудуеш клуба, скінем цябе са старшыні! Чуеш?

Л ГУДОК ГУДЗЕЎ...

Гудок гудзеў працяжна, залівіста. Хоць да горада, можна сказаць, больш пяці кіламетраў, а ён даносіцца ў вёску Буды, у хату Максіма Ткача, быццам вось з-за лугу. Гудок кожны дзень будзіць Максіма, кліча да працы, туды ў дэпо, дзе палае горан, дзе Максім праз цэлы дзень, закасаўшы рукавы, гваздае молатам па распаленым іскрыстым жалезе...

Максім — малады і дужы, ужо тры гады як ажаніўся,— заўсёды падганяе сваю маладую жонку Юстыну, каб хутчэй згатавала яму снеданне. Жонка, тонкая, як тычка, з гнедаватым тварам і к таму гнусавая, не вельмі спяшаецца са снеданнем — пазяхае, вохкае, ахкае, пачухвае патыліцу пад хусткай і ўсё ніяк не збярэцца з думкамі, з чатыліцу пад хусткай і ўсё ніяк не збярэцца з думкамі, з чаго пачаць. За танклявасць ды не толькі за гэта людзі ў вёсцы празвалі яе «сухецкай». Юстына была скупая. Прыхарошвалі Юстыну вялікія цёмна-шэрыя вочы з густымі чорнымі бровамі. Мусіць, некалі юнак Максім непарокам глянуў у іх больш, чым трэба, і гэта вырашыла яго лёс.

Максім цярплівы чалавек, ён любіць сваю Юстыну, толькі часам паспрачаецца іменна адносна гэтай паскудонай, як ён называе, скупасці. Пойдуць у нядзелю ў горад,— трэба ж купіць тое-сёе,— грошы трымае пры сабе жонка. Няхай трымае, яно, можа, і лепш, бо як сустрэнецца Максім з дружбакамі, тады... Што тады? Можа загуляць казак, і грошыкі — кыш з кішэні. Гэта ўжо не раз было... Няхай яны ляжаць за пазухай у Юстыпы. Не хочацца мець з бабай калатні. А то як загнусавіць, хоць ты ўцякай на край свету. І самае непрыемнае тады для Максіма тое, што жонка праз сваю гнусавасць словы «можна» і «няможна» вымаўляе ў нос: «мона» і «нямона». Літара «ж» недзе засядае і ніяк не злятае на язык.

— Я табе не раз казала і кажу, ці ж так мопа?.. Людочкі — капеечка да капеечкі, а ты... Ці ж мона так?

Максім апранае дабротны шынель чыгуначніка, чорную суконную кепку і маўчыць. А яна ўсё заліваецца гнусам:

— Ой, божа, ці ж так мопа?

Максім, не спяшаючыся, змерыць павольным позіркам сваю суджаную і цвёрда, з прыціскам скажа:

— Можна!

— Не, нямона! Я табе кажу, што нямона...

— А я табе кажу — можна! — тупне Максім нагою і выйдзе.

Але гэтае тупанне для Юстыны глупства. Наадварот, людзі кажуць, што яна Максіма падабрала пад свой башмак. Такога жылістага каваля ды такая сухецкая муха... Чаго не бывае на свеце!

Максім карыстаецца на рабоце вялікай пашанай у таварышаў і ў самога начальніка дэпо. Ён кожны раз к Новаму году атрымлівае нахвалы і прэмію. Тое, што гаворыцца на сходах калектыва дэпо, для Максіма не жарты, ён успрымае ўсё так, як трэба ўспрымаць рабочаму.

Ён нагваздаецца молатам за ўвесь дзень, прыходзіць дахаты, умыецца, сядзе вячэраць, узяўшы хлопчыка на калені, і расказвае сваёй Юстыне, як ён выкоўваў нейкую вялікую шрубу і як гэта было цяжка. Але ён не зрабіў, што не кожны зможа.

А жонка нібы слухае, нібы не, а потым плаксівым голасам як пачне выводзіць сваё:

— Ты там шрубы робіш, табе нішто, а ў мяне вось курыца недзе загінула, шукала цэлы дзень і няма.

— Курыца?

— А што табе курыца? Яечкі, нябось, любіш...

Максім ніякавата махне рукою і скажа:

— Цьфу! Курыца... Ці варта пра яе так многа беда-ваць? Можна другую купіць.

— Ага, ты такі багаты, табе ўсё мона...

І зноў пайшло гуляць гэтае гнусавае «мона».

Максім ад лішняга скавытання жонкі пачынае траціць цярплівасць. Шчокі яго чырванеюць, блакітныя, чыстыя, амаль паіўныя вочы наліваюцца злосцю, маршчына над пераноссем паглыбляецца. Вось зараз ён стукне кулаком па стале, як молатам па кавадле... Вочы бліскаюць... Вось зараз нешта будзе...

— Сціхнеш ты ці не?! — грымпе Максім.

І вочы яго ярасна заморгаюць, а потым закамянеюць, уставіўшыся на жонку.

Юстына тут жа фіць з кухні ў пярэднюю.

У Максіма маршчыны разыходзяцца, астываюць шчокі, вочы прымаюць свой напаўнаіўны, шчыры выгляд. Ён прадаўжае есці бульбу з малаком.

Юстына пайчасцей для свайго Максіма на снеданне падсмажыць сала або паставіць збанок з малаком. Рэдка калі халоднага мяса — цяляціны або бараніны. У торбу з сабою Максім заўсёды бярэ кавалак хлеба і сала, а бараніну толькі ўвосень.

І вось аднаго разу прыйшло Максіму да галавы, чаму

Юстына не падсмажыць яму ясчак або не зварыць і не паложыць іх у торбу на полудзень.

Так адпойчы цёмным зімовым рапкам, калі гудзеў гудок, Максім звярпуўся да сваёй прававерпай:

— Юстына, ці ў пас яйкі ёсць, ці не? Чаму ты ніколі не падсмажыш мпе? Зварыць у торбу таксама можна... Падсмаж хуценька, я закушу і пайду. Сёння трэба трошкі раней пайсці...

— А дзе я табе вазьму тых яек? Дзе? Многа ў пас курэй? Адпа прапала, шуляк задраў вунь у кустах... А што я прадам на рынку, га? Трэба ж прадаць, капейку якую дабыць...

Максім сваё:

— Падсмажыш ці не?

Юстына, зачырванеўшыся, выйшла на кухню. Значыць, відаць, падсмажыць. Максім чакае.

Уваходзіць Юстына з патэльняй, ставіць яе на стол. Максім бачыць, што падсмажана толькі адно сала.

— А дзе яйкі? — спытаўся ён.

— Я ж табе казала...

Максім пахмурыўся.

— А што я прадам? Прадаць трэба. Там ёсць толькі пара яечак.

— Мне пара толькі і трэба!..

— От, садзіся і еш... Няма яек...

Максім устаў, адпым узмахам рукі прыгладзіў сваю русую чупрыну і сказаў:

— Добра. Я пайду пашукаю яек сам.

І выйшаў у камору.

Юстына закідалася па хаце, засаплася, закрычала:

— Вярніся! — Потым раптам прыкруціла кнот у лямпе, зрабіла яго, як у газнічцы, бо, бачыце, многа газы гарыць.

Недзе бахнулі дзверы, загрукала ў кухні, і з уздыбленай чупрынай увайшоў ён, Максім, ледзь несучы перад сабою вялікі кошык, поўны яек (у кошыку месцілася наўтары капы).

— Гэта што? — бліснуў ён вачыма на жопку.

Юстына маўчала.

— То ты мне нават двух ясчак шкадуеш? Добра, жопка, добра...

І гэтая жопка не паспела ахпуць, як Максім перавярнуў кошык уверх дном. Белыя яечкі — адно ў адно — паляцелі па падлогу.

Вялікім падкаваным ботам Максім наступіў на іх. Яны хруснулі. Потым стала на іх другая нага. І так пайшло з прыказкай: «Вось табе! Вось табе! Я ў цябе не варты двух яечак. Вось табе! Я ўсе сілы аддаю, а ты...» І за кожным разам: хрась, хрась...

Юстына закрыла твар фартухом, упала на ложак і бяссільна верашчала: «О-о-й... О-о-й... Разбойнік, разбойнік!..»

Максім скончыў расправу з яйкамі, тупнуў ботам па апошнім і сказаў: «Вось табе твае яйкі! Бяры іх, нясі на рынак!»

Засопшыся, адвярнуўся і адразу глянуў на лямпу:

— Гэта чаму такі агонь?

Жонка маўчала.

Ён падкруціў кнот, апрануў свой шынель, надзеў кепку і выйшаў, бахнуўшы дзвярыма.

Юстына, схаваўшы твар у падушку, быццам канаючы, толькі пастогвала: «Ох, ох...»

А гудок гудзеў...

ДЗЕД ЗА СЦЯНОЮ

Мяне пакінулі ў кватэры аднаго. Гаспадар дома, брыгадзір Мікола Падабайскі, пайшоў на работу, жонка яго паехала ў горад за дваццаць кіламетраў. Я сяджу адзін у пакойчыку, у якім адзінае заснежанае акно ад вуліцы. Цішыня. Адчуваю сябе занесеным снегам у гэтым невялікім мястэчку сярод поля. Я тут толькі другі дзень. Учора пасля абеду хадзіў па вуліцах, нават быў на ўскраіне, дзе на ўзгорку сярод дрэў размясціліся могілкі і цэркаўка сярод іх. Яна, цэркаўка, старая, недзе з васемнаццатага веку. Навокал — узгоркаватае поле ў снягах. Лесу нідзе і не відаць. Новыя, ужо сцямнелыя дамы, большыя і меншыя, пабудаваныя пасля вайны на попелішчах на мястачковы лад, пагрузлі ў снезе па вокны.

У тым пакойчыку, у якім пасялілі мяне, жыве кватарантка — фельчарка тутэйшай бальніцы. Бо дом брыгадзіра Падабайскага вялікі, на тры пакоі — два большых і кухня. Сцены ўсюды, апрача кухні, абклеены квяцістай паперай. З кухні відаць у пярэдні пакоі ў кутку высокі, аж да столі, фікус.

Я яшчэ не ведаю, як завецца гэтая фельчарка — высокая зграбная жанчына год пад трыццаць, хоць яна мяне сягоння рана частавала бульбяным супам.

Сяджу, думаю, і такі ў мяне настрой, што не ведаю, што рабіць, з чаго пачаць. Урэшце адкрываю партфель і вымаю свой дарожны сшытак. Трэба прычапіцца да паперы, можа што і выйдзе.

Выпісваю каліграфічна загаловак: «Ад адсталых да перадавых». Потым яго ўпрыгожваю рознымі круцялямі — зверху, знізу. Чакаю, калі прыплыве думка.

Думка плыве, але не з таго боку, з якога мне трэба. З галавы ніяк не выходзіць расказ гэтай высокай грудастай фельчаркі, расказ аб сабе.

Яна з другога, далёкага раёна Беларусі, працуе тут ужо тры гады. Я здзівіўся яе расказу, здзівіўся ў тым сэнсе, што яна, прыгожая жанчына, дагэтуль незамужняя. Яна расказала мне, што ўвосень вось гэтага года заручылася з хлопцам, які жыве там, на сваёй і яе радзіме. Запісаліся ў загсе. Запісаліся і жывуць паасобку. Дзіўна. Я сказаў ёй пра гэта:

— Калі запісаліся, то трэба жыць разам. Інакш ён, ваш заручаны, можа пра вас забыцца.

Яна махнула рукой і закруціла галавой:

— Уй... Не... Ён такі, што гэтага не зробіць.

— А вы?

— І я не...

Я ўсміхаўся, гледзячы на яе, і круціў галавою. Я сумняваўся.

— Глядзіце... — перасцерагаючы, сказаў я, і нашы погляды на нейкі міг перакрыжаваліся.

— Вось вясною ўжо... Кіну працу тут і паеду... У яго ж там гаспадарка... хата і ўсё...

Я нешта зразумеў з гэтага, але не да канца, і, прызнацца, штосьці мне тут не спадабалася.

— Як ён служыў у арміі, я ж яго чакала, няхай і ён пачакае мяне...

Гэтая гісторыя мне паказалася вельмі дзіўнай — «служыў ён у арміі, яна чакала», а цяпер «няхай ён пачакае».

Але ў кожнага свае справы, і няхай людзі спраўляюцца з імі, як ім выпадае. Мне трэба пісаць нарыс пра калгас, пра людзей у кажухах і вушанках, у кажушках і хустках, і я пачынаю пісаць.

Нешта застукала не то па кухні, не то дзе, як малаточ-

кам, і сціхла. Праз пекаторы час у дзвярах пешта зашуршала.

Я аглянуўся. У пакоі увайшоў хлопчык год трох. А я лічыў, што ў доме нікога няма. Аказваецца, ёсць. Я трошкі падумаў, што не зусім добра пакідаць малое адно дома, без догляду. Потым даў хлопчыку зломак алавіка, што ляжаў на стале, кавалачак паперы і сказаў, каб ён ішоў на кухню, сеў за стол і пісаў.

Хлопчык адказаў:

— Паду да дзідзі...

Я доўга намагаўся здагадацца, што азначае гэтае «дзідзі».

Белагаловы хлопчык паўтараў некалькі разоў гэтае «дзідзі» і ручкай нават махаў на сцяну. Я перапытаў:

— Да каго? Да дзеда?

Хлопчык стаў прытакваць: «Мугу... мугу...»

— Ну што ж, ідзі сабе да дзеда,— сказаў я і не падумаў, дзе мог быць той дзед і ці можа хлапчанё зайсці да яго само.

Хлапчанё адышло, я зноў сеў прадаўжаць сваю пісаніну.

Мінула, можа, паўгадзіны ці больш, як я пачуў за спіною: тух, тух, тух... Нехта не то ішоў, не то глуха стукаў недзе ў падлогу.

Дзверы з шоргатам адчыніліся, і ў пакой неспадзявана ўвайшоў сівы дзед з чырвоным тварам амаль без маршчын. Калі ён загаварыў, я ўбачыў з'едзеныя зубы. Мяне здзівіла чырвань твару старога і шальмаватыя мутныя вочы. Стары быў «местачковы» — гэта значыць, падстрыжаны «пад польку». У памятай, палатанай шэрай кашулі і суконных штанах, пажоўклых ад часу, ён стаяў пасярод пакойчыка і ўсміхаўся, затым пачаў гаварыць таямніча, нібы за перагародкай былі людзі. Яго ўзмахі рук нагадалі знакі заклінання.

— Як? Яны запісаліся? — спытаўся дзед.

— Хто?

— Ды япа... фельчарыца...

— З кім? Дзе?

— Ды са сваім нарачоным... Запісалася?

Мяне вельмі здзівіла такое раптоўнае пытанне. І, урэшце, што мне да іхніх спраў! Я ўжо забыўся, ці запісалася яна, ці не. Але трэба ж цікавасць дзеда ўсё ж такі задаволіць.

— Кажа, што запісалася...— прамовіў я.

— Ага... Такі запісаўся,— з палёгкай, як мне здалося, адказаў дзед.— А... а ці сказала вам, як яна завецца?

— Не, не сказала...

— Аўгеня Іванаўна Зубановіч... Зубановіч,— паўтарыў дзед.

— Добра, дзякую вам, буду ведаць... Дзякую... Колькі вам год?

— Восемдзесят трэці...

Я яшчэ раз здзівіўся такому маладому выгляду сівога дзеда.

Мне ўжо хацелася, каб дзед пайшоў. Ён і сапраўды пачаў кланяцца і, урэшце, знік. Глухія крокі ад яго скураных лапцяў сталі аддаляцца.

Я сяджу пад уражаннем дзедавых адведзін і ўсміхаюся. Цікавы дзед. Ён чуў нашу гутарку з фельчаркай з-за перагародкі. Дзед, відаць, жыве за сцяною і прыслухоўваецца да хатніх гутарак і шорахаў. Гм...

К вечару прыйшла з работы фельчарка. Я толькі што вярнуўся з чайной, з абеду, і знарок прывітаў яе на імені і па бацьку:

— Вітаю вас, Яўгенія Іванаўна...

— Адкуль вы ведаеце маё імя?

— Не толькі імя, але і прозвішча... Зубановіч...

— Не Зубановіч, а Зубровіч... Хто вам так сказаў?

— Зубровіч? А дзед казаў, што Зубановіч.

— Дзед?

— Ага...— Я расказаў пра адведзіны дзеда.

Фельчарка махнула ніякавата рукамі, як бы ад чаго адпіраючыся, і пачала гаварыць:

— Гэты дзед усім абрыд у хаце. У яго тры сыны. Ого, гэты дзед! Адсудзіў у сыноў, каб яны яму плацілі штомесяц па пяцьдзесят рублёў. Два сыны плацяць, а адзін, сярэдні, не, бо дзед да яго ходзіць есці. У сына, з якім жыве, адсудзіў палавіну дома. Вось гэты пакойчык і што побач належаць яму...

Я слухаў з цікавасцю, як той казаў, паставіўшы вушы, і не выцерпеў, перабіў расказчыцу:

— Яму ж восемдзесят трэці год... Нашто яму гэта?

— У тым-то і справа... Карову прадаў вось гэтаму сыну, з якім жыве, за дзве тысячы з палавінай... Вось які гэта дзед...

— Ён жа адзін. Бабы няма. Як вы думаеце, нашто ён гэта робіць?

— Пачаў быў піць гарэлку... Кожны дзень быў п'яны.

Але пехта яму сказаў, што калі будзе так піць, то хутка памрэ. Тады адразу перастаў... Пытаецеся, чаму ён гэта робіць? Ад старой дурасці...

— Ці не хаваецца тут што-небудзь глыбей? Як па-вашаму?

Фельчарка адказала, што, можа, тут крыецца што і глыбей,— ва ўсякім выпадку, на ўсё ёсць прычына.

Пасля, увечары, я даведаўся і ад сына, гаспадара дома Міколы Падабайскага, што дзед ні з кім у доме не гаворыць, толькі з малым унукам, што ён увесь час жыве за сцяпою, у сваёй бакоўцы. Ніякай прычыны няма на тое, каб крыўдзіцца на таго ці другога сына. Аднак... дуецца, не гаворыць.

— Мы яму выбачаем,— гаворыць Мікола,— няхай...

На другі дзень я зноў сядзеў у пакойчыку адзін і займаўся сваёй пісанінай. Таксама, як і ўчора, спаквапя ўвайшоў дзед і папрасіў газету. Я даў. Дзед пастаяў, памаўчаў, павярнуўся, каб выйсці, але зноў наблізіўся да мяне і спытаў:

— То яны ўчора, мусіць, вам казалі пра мяне?

— Трохі казалі...

— Чаго ж яны хочуць? Я ж таксама хачу жыць і мець сабе выгоды... А што? Толькі ім... А дзе маё? Хіба ж мне нічога не належыць? Я з чужой ласкі жыць не хачу. Што буду мець, тое будзе маё... А там...— дзед махнуў рукою, сказаў «выбачайце» і пайшоў у сваю бакоўку, за сцяну.

Я прабыў у калгасе каля двух тыдняў. У дзень ад'езду пачуў, што дзед зноў падаў у суд на сваіх сыноў за нейкую крыўду.

Усю дарогу ў газіку я думаў: «Гэты дзед за сцяною, мусіць, будзе падаваць у суд аж да смерці...»

АПОШНІ КРЫЖ

Здзіўляла ўсіх яго высокая, спакойная постаць. Спакой плыў з яго рухаў — ураўнаважаных, па-жыццёваму стомленых; сівізна выглядала з-пад шэрага капелюша. А ў вачах паміж густых, загарэлых маршчын застыла глыбока схаваная туга, відаць, зусім нікому не адкрытая. І калі ён нёс у левай руцэ чорны, крыху пацёрты чамадан, а правай абапіраўся на блішчасты кій, можна было

падумаць на першы погляд, што гэта бадай што неўкі коміваяжор.

Усе ў вёсцы сказалі, у першую чаргу старыя: «Прыехаў Дзяніс Калывайка, «амерыкапец», што азначала — прыехаў чалавек, які жыў у Амерыцы. Так, Дзяніс Калывайка сапраўды жыў у Амерыцы і жыў вельмі доўга — сорак пяць год. І калі яму стукнула восемдзесят, захацелася паглядзець на сваю родную беларускую вёску Ціву-ны, паглядзець, як кажуць, перад смерцю, хоць мог бы ўжо махнуць рукою на яе, мог бы забыцца, так шмат пражыўшы на чужбіне. Але нешта пацягнула на радзіму. Што? Можа, далёкае дзяцінства, беднае, у саламянай хаце, якую так рана для яго пакінуў бацька, перасяліўшыся пад крыж на вясковыя могілкі, што туляцца ў кустах і соснах? Можа, стары бор за вёскай, там, дзе і цяпер крыжуюцца дарогі, пах і шум якога так часта чуцеп быў у снах? І шум здаваўся заўсёды чамусьці трывожным. А можа, той ветрапы млын, што ўзабраўся па пясчаную гару на другі бок вёскі і заўсёды махаў крыламі, нібы адганяючыся ад навалы хмар, што ўсё плылі з вышыні і асядалі на яго? Пясчаная жоўтая дарога, зялёпая па абочынах, вілася ўверх да млына, па якой людзі з падводамі ўвіхаліся, як мурашкі, памагаючы сваім конікам цягнуць згарованы сяк-так пуд жыта. Часта і Дзяніс — тады пастушок у наймах — разам з другімі пастушкамі памагаў якому-небудзь худому дзядзьку і яго слабай кабылцы.

Ды многа чаго захавала памяць: і самую вёску, і людзей — такіх бедных, як была беднай сям'я іх, Калывайкаў, і заможных, якія пасміхаліся над імі, над іх беднасцю, нават над прозвішчам. І гэта было балюча і крыўдна да слёз. Маці — тая заўсёды ціха плакала пасля кожнай крыўды. І калі Дзяніс, пакінуўшы сям'ю ў свой час, уцякаў у Амерыку, то ўцякаў не толькі ад беднасці, але і ад розных здзекаў, ад пасмешак. З болем у душы папёс ён гэтыя крыўды за акіян, каб там забыцца пра іх, ачысціць душу повымі ўражаннямі. Думаў, заробіць грошай у тої багатай Амерыцы, вернецца, і тады... тады ён пакажа гэтым пасмешнікам, у якіх у сэрцы няма ні пашаны, ні спачування да беднага чалавека, якое б ні было яго прозвішча.

Ішоў 1911 год, калі Дзяніс Калывайка меў за плячыма трыццаць пяць. Вырашылі ў сям'і ажаніць малодшага брата, менш кемлівага, менш вопытнага. Няхай робіць на гэтай ліхой гаспадарцы, куды ж ты ад яе дзенешся? А Дзя-

ніска адзін раз, позна прыйшоўшы з вечарніц і навячэраўшы халоднай заціркай, што пакінула яму сям'я на лаве ў гаршку, сказаў, падумаўшы:

— Давайце прадамо карову, і паеду я ў Амерыку.

Так і паехаў, на здзіўленне ўсім у вёсцы. Гэта ж не жарты — за акіян, за тое невядомае мора сіняе...

У Амерыцы тут жа пры высадцы з парахода ў нью-йоркскім порце падхапіў Дзяніса агент-вярбоўшчык — такая табе бестыя, што нават па-руску ўмела гаварыць. Так і трапіў Дзяніс Калывайка з беларускай вёскі Цівуны ў лапы капіталістычнага агента, які павёз яго ў поездзе па незвычайнай чыгунцы — яна, гэтая чыгунка, бачыце, вісіць на слупах, аж страшна, і поезд амаль што абціраецца аб задымленыя вокны высачэзных дамоў, верхнія паверхі якіх хаваюцца ў хмарах.

З рук агента Дзяніс трапіў на тэкстыльную фабрыку, ды ў такое цяжкае для працы аддзяленне, што каб ведаў англійскую мову і ўсе павароты ў гэтай страшна незнаёмай краіне, то ніколі не згадзіўся б там застацца. Але што зробіш, калі рабочы чалавек тут адразу робіцца няволькам? Недарма кажуць — наняўся, як прадаўся.

І стаў Дзяніс Калывайка, чалавек з русымі валасамі і шэрымі крыўдна-недаверлівымі вачыма, працаваць там, дзе трэплюць лён, пяньку, дзе расчэсваюць воўну. Адным словам, перш чым зарабіць на кавалак хлеба, трэба наесці-ся горкага пылу. І за шэсць год пыл так заткнуў яму вушы, лёгкія, што ён, ужо аглохлы, надоўга захварэў, злёгшы ў бясплатнай брудной бальніцы на ўскраіне горада, дзе лекары ачышчалі яму вушы, лячылі лёгкія і за гэта дамагаліся платы.

Дзяніс выпісаўся з бальніцы і застаўся на вуліцы без работы. Пайшоў на біржу працы, занеслі яго там у спіс, чакай, мо што і прыбудзе. Кожную ноч хадзіў начаваць на рыбацкія баржы на прыстань, дзе часам здаралася зарабіць на пагрузцы, а адтуль ішоў на біржу нанава. Але працы ўсё не было.

І вось урэшце пасля чатырох месяцаў беспрацоўнага блукання напаткала яно — жаданае «шчасце». Зноў трапіўся вярбоўшчык, які, між іншым, цікавіўся спецыяльна славянамі. Відаць, амерыканскія буржуі чамусьці ўцямілі сабе, што славяне, пераважна з Расіі, матэрыял найбольш падатны для эксплуатацыі. Вярбоўшчык быў бліскучы з галавы да ног і ўсміхаўся неяк не па-панску. Ён з задавальненнем пахлопваў Дзяніса па яго шырокіх плячах і,

смеючыся, прыгаворваў: «Ол райт! Ол райт!» Ён адразу даў Дзяпісу білет на дарогу і друкаваную запіску ў канверце, на якім стаяла слова «Дэтройт».

Дэтройт... Гэта ж сталіца амерыканскага аўтамабільнага караля Форда. Вось куды!..

У Дэтройце, ва ўладаннях Форда, Дзяніс прайшоў лекарскую камісію, бо Форд хоча мець рабочых здаровых. Дзяпісу адвялі пакойчык у фордаўскім доміку для рабочых, і ўжо пазаўтра ён пайшоў на пагрузку фордаўскіх аўтамабіляў.

У фордаўскім бюро Дзянісу сказалі, што ён павінен вывучыцца англійскай мове, на што ў містэра Форда ёсць школа, дзе выкладаецца не толькі мова, але і азнаямленне з вытворчасцю аўтамабіляў. Хто не ведае англійскай мовы, той рызыкуе страціць працу.

Ого! Вось дзе Амерыка! Сапраўдная Амерыка! Усё даецца чалавеку, толькі працуй. І Дзяпіс пасля школы стаў працаваць на такарным станку. У першыя дні здавалася: якая ж выгода! Кватэра табе, як кажуць, і святло, і цяпло, і шэсць долараў у дзень. Калі ты пра гэта сніў, Дзяніс, сын Мікіты Калывайкі з беднай, закіпутай беларускай вёскі, ды з такою яшчэ прыгонніцкай назвай — Цівуны?

Мінаў месяц за месяцам у напружанай да апошніх сіл працы — кожны рух трэба разлічыць да секунды, каб не было ніякіх, самых найменшых, паваротаў. Ды не толькі гэта, а каб і тваё вока не пасмела гляпуць куды-небудзь убок. А каб перакінуцца з суседам словам, аб гэтым забывай назаўсёды. Так сказаў усім рабочым Амерыкі інжынер Тэйлар, жрэц капіталізму. Так ён сказаў і беларусу Дзянісу Калывайку. Твае вочы, Дзяпіс, павінны глядзець толькі на тое, што ты робіш, твае рукі павінны плаваць па стапку. Нічога, што пот залівае вочы і струменем сцякае па носе, па барадзе. «Чытай біблію,— кажа сам містэр Форд,— так, як чытаю я, там напісана: «У поце твару свайго ты будзеш здабываць хлеб свой». А па простай мове гэта азначала для Дзяпіса, што ён павінен, хоць лопні, сваімі рукамі ўкласціся ў памечаныя секунды, якія на таблічцы, як малітва, вісяць над станком. Цябе чакаюць шэсць праслаўленых фордаўскіх долараў у дзень. Дык напружвай свае славянскія мускулы мацней, каб сам патрон містэр Форд мог сказаць: «Ол райт!»

Калі рукі і ўвесь арганізм заўтаматызаваліся, стала, здаецца, лягчэй. Але Дзяпіс пры гэтым не мог здагадацца, чаму ў яго галаве стала неяк пуста, быццам пехта вы-

гнаў думкі адтуль. Дзе яны? Няўжо іх назад не збярэш? Відаць, што не, бо за станком думаць нельга. Думкі ўцяклі... Што ж?.. Мусіць, так трэба. Затое ў фордаўскай кватэры, як толькі Дзяніс увайшоў у яе ўпершыню, ён убачыў на століку ў прыгожых вокладках з залацістым крыжам біблію на рускай мове. Прыйдзе пядзеля — ты павінен яе чытаць, бо яе чытае сам патрон містэр Форд. Вось табе і будзе думаць пра што: ты, чалавек, пікчэмная істота перад богам. Ну а Форд, вядома, адзін з багоў на зямлі. Лёс наш у яго ных руках, пяхай думае ён. Нам толькі абавязкова патрэбна напружваць мускулы. Гэтага і толькі гэтага патрабуе ад нас Форд.

Аднаго разу, калі Дзяніс, нахіліўшыся над станком, не бачыў свету, да яго падышоў фордаўскі чыноўнік для дапамог. Такіх чыноўнікаў у Форда было каля ста чалавек. Гэта, вядома, не дурні, яны маюць нават шырокія веды і існуюць для таго, каб у патрэбны момант дапамагчы ў чым-небудзь рабочаму парадай. Апрача ўсяго, ён назірае за тым, каб не было сварак у сем'ях, каб рабочыя не п'янствавалі і не разбэшчваліся і г. д. Гэты фордаўскі пурытанскі інстытут выконваў і функцыі дэтэктыва.

Чыноўнік з гэтага «інстытута» ўсё ж такі доўга глядзеў на схіленага над станком Дзяніса, пазіраў на яго спацелы лоб, на тую напружаную зморшчку паміж броваў, у якой, здаецца, у вузел завязан увесь сакрэт сілы. Рукі Дзяніса працавалі спраўна, толькі недзе, як здалёк, часам адчуваліся прыступы лёгкай абамлеласці ў мускулах. Але высілак волі перамагаў іх.

Чыноўнік неўзаметку ўсміхнуўся з-пад навіслага над вачыма капелюша і адышоў. Праз хвілін пятнаццаць разам з ім прыйшоў сам Форд — высокі, касцісты, у ботах з доўгімі халявамі — і таксама стаў назіраць за Дзянісам. А Дзяніс больш адчуваў прысутнасць Форда, чым бачыў яго. Толькі рукі яго запрацавалі, здавалася, проста ліхаманкава. Дзяніс не помніць, ці гэта было наяве, ці ў сне, толькі ў грукаце і шуме цэха Дзяніс пачуў рэзкае фордаўскае «Ол райт!».

Форд з чыноўнікам адышлі. У чым жа справа? Што ім трэба было? Гэта выяснілася для Дзяніса ўвечары. Аказваецца, ад празмернай напружанасці ў працы ў фордаўскіх рабочых праз чатыры-пяць месяцаў дранцвеюць мускулы, і рабочыя тым часам пераходзяць на лягчэйшую працу, пераважна на палявыя работы па фордаўскія фермы, дзе Форд выпрабоўвае свае трактары. Зарплата, вядо-

ма, паніжаецца. А вось Дзяніс прапрацаваў не чатыры, а шэсць месяцаў і адчуў толькі лёгкія прыступы абамлеласці ў мускулах, за што заслужыў фордаўскае «Ол райт!».

Толькі праз сем месяцаў апруцянелі мускулы на руках Дзяніса Калывайкі. Прапрацаваць такі тэрмін дапамог яму яго «гаспадарскі» рэжым. Прыходзячы з работы дахаты, Дзяніс прымаў душ, абедаў і клаўся адпачываць. Асабліва аддаваўся адпачынку ў нерабочую суботу, а пасля — нядзелю. Па сваёй прыродпаї трываласці ды пры такім рэжыме Дзяніс мог кожны наступны дзень не адставаць ад імклівага, бязлітаснага руху машын.

Але, урэшце, і гэта не памагло. Цераз сем месяцаў мускулы здалі. Нягледзячы на гэта, фордаўскі чыноўнік, «спецыяліст ад выгад для рабочых», калі знімаў яго ад станка, з задавальненнем пахлопаў Дзяніса па плячы, пракартавіўшы сваё «Ол райт!». Чыноўнік цаніў трываласць свайго «цывілізаванага» раба. Ён не раз правяраў, колькі грошай расходуе Дзяніс, і раіў не расходаваць больш як пяцьдзесят долараў у месяц. А ўсе грошы, што застаюцца нерасходаванымі, раіў класці ў фордаўскі банк.

— Ты, Дзяніс Калівайко, будзеш таксама капіталіст. Зразумеў? З таго банка табе будуць даваць працэнты. Ты адразу робішся партнёрам містэра Форда. Зразумеў, містэр Калівайко? Гэта ёсць Амэрыка, містэр Калівайко! Ол райт!

Так і пайшло, так і стала ўсё жыццё ўкладацца ў пяцьдзесят долараў у месяц, нават тады, калі Дзяніс працаваў на фордаўскай ферме, дзе зарабляў ужо не шэсць долараў у дзень, а толькі два. Такім чынам, містэр Форд нічога не траціў на тым, што плаціў рабочым на сваіх заводах па шэсць і нават восем долараў у дзень. Яго прапаганда высокай заработнай платы ўсё больш і больш туманіла вочы тысячам пралетарыяў.

Так зажылося і нават прывыклася. Праўда, часта адведвала Дзяніса такое адчуванне, што нешта цягне за душу, за гэтыя самыя жылы, па якіх плыве кроў да тых трывалых мускулаў, якімі захапіўся Форд.

Хацелася б пайсці ў горад, пазабавіцца трохі, але праз некаторы час, як гэта бывала з другімі, тоі самы чыноўнік, які ўсё бачыць, прыйдзе і скажа, што пяцьдзесят долараў не хопіць па такое жыццё. А потым ёсць небяспека, што нежанаты Дзяніс можа заразіцца якімі-небудзь ідэямі, скажам, сацыялістычнымі. Такія рэчы ва ўладаннях Форда недапушчальныя. Ёсць на гэта дэтэктывы.

Яны не дапусцяць. Яны ўсюды нябачна прысутнічаюць, яны ўсемагутныя. Сам Форд ідзе па вуліцы ў акружэнні чатырох дэтэктываў. Гэта ж яны так зрабілі, што Дзяніс Калывайка і ажаніцца не змог. Амерыканскай жанчыны браць не хацеў; думаў, вернецца дахаты і тады... Але калі аднаго разу ў вячэрнім рэстаране да яго прычапілася нейкая пані, і ён не мог адмовіцца выпіць з ёю бакал віна, то назаўтра ў фордаўскай газеце быў здымак, як пачцівы Дзяніс Калывайка з беларускай вёскі Цівуны,— о, людзі! — цалуецца з капялюшнай дамай... Каб хоць ён сапраўды цалаваўся. А ўсяго толькі гэтага праклятага віна выпіў з тою, што прычапілася. Чаго не могуць зрабіць з нявінным чалавекам на свеце? Вось і паспрабуй, ажаніся. Ёсць адзін толькі выхад — хадзіць да жанчын, каб ніхто не бачыў,— на гэта глядзяць праз пальцы, гэта лічыцца законам. Але Дзяніс не квапіўся на гэта. І часам уначы адзінокаму Дзянісу так зробіцца цесна і душна, што ён быццам у нейкай пастцы задыхаецца. Так усё спрытна зроблена... Да кожнай жылы чалавека прыроблена невідочная трубка, якая ўсё цягне і цягне беспераныку. Што і казаць? У Форда нават школьнікі, дзеці яго рабочых, што вучацца ў фордаўскай школе, даюць даход — яны ў майстэрнях рамантуюць інструменты. Даюць даход, хоць Форд выплачвае кожнаму вучню чатырыста, а лепшым вучням і шэсцьсот долараў у год стыпендыі, аплачвае настаўнікаў, лабараторыі. А школа яму не абыходзіцца ні граша. Ды гэтая ж школа выклікана да жыцця жаданнем Форда адшукаць танную рабочую сілу для дэталёвага рамонту інструментаў. Ён гэтую сілу, як і належыць капіталісту, знайшоў у дзецях. Як гэта спрытна ўсё зроблена!

Яшчэ больш зжахнуўся Дзяніс ад спрытнасці Форда, калі ад аднаго рабочага-італьянца даведаўся, што нават хворыя ў фордаўскай бальніцы даюць Форду даход, што бальніца таксама нічога не абыходзіцца яму. Не робяць там толькі тыя хворыя, якія не могуць устаць. Ах, ах, як гэта спрытна ўсё зроблена!

Але затое ты, Дзяніс, хоць і апруцянелі твае мускулы за станком на восьмым месяцы, ходзіш чысты, вымыты, добра, нават прыгожа апранены, бо ты, Дзяніс, не старажытны раб, ты — раб капіталістычны, і таму ты павінен быць цывілізаваным. Плёны цывілізацыі дае эксплуатацыя рабочых, хоць я, Форд, лічу кожнага рабочага сваім партнёрам. Рабочаму для свабоды патрэбны ежа, адзежа

і хатняя дробязі. Палітыкай, ідэямі будзем займацца мы, форды, гэта наша функцыя, а ты, Дзяніс, павінен аддаць на наш алтар свае трывалыя мускулы, ты павінен быць паслухмяным. У апошнім ты павінен быць падобным да старажытнага раба, бо сутнасць рабства аднакавая, толькі формы розныя. Наша форма дае нам поўнасцю тое, што завецца цывілізацыяй. У Амерыцы кожны рабочы можа стаць капіталістам. Вось што такое мы!

Праўду сказаць, Дзянісу Калывайку сапраўды начала ўсміхацца гэтая думка. «А чаму ж? Забяру свае ашчаднасці з фордаўскага банка і паеду дахаты. А там я — гаспадар»,— думаў ён. Безумоўна, гэта ўсё можна. Але ў амерыканскіх фордаў многа розных «але»... Дзяніс спалохаўся толькі аднаго «але», аб якім штодзённа пісалі фордаўскія газеты, а іменна: у Расіі ўжо няма капіталізму, і за долары жаданага хутара не купіш. Людзі ў Расіі будуюць сацыялізм, гэта значыць, новы лад без капіталістаў. Не ўсё з гэтага разумеў Дзяніс, фордаўскі рабочы,— гэта значыць, рабочы без палітыкі, без ідэй, па-фордаўску адшліфаваны раб.

Што сацыялізм не жарты, Дзяніс пачаў пераконвацца значна пазней, калі выбухнула вайна ў Іспаніі і сёй-той з рабочых казаў, што там можа быць і будзе так, як у Расіі. Але Дзянісу тады пераваліла ўжо за шэсцьдзесят. Ці варта вяртацца дахаты?

Праз пяць год Дзяніс перайшоў на пенсію, адаслаў часціну грошай брату, часціну даў у фонд абароны супроць гітлераўскай Германіі, а сам застаўся жыць пры невялікай суме ў фордаўскай багадзельні, стаў, як кажуць, дажываць веку. Рабіць не мог: дрыжалі рукі, не бачылі вочы. Цывілізаваны раб быў знясілены да апошняга. Але паколькі чалавек яшчэ стаіць на нагах, можа хадзіць, дык у Форда ёп гуляць не павінен. І Дзяніс плёў кошыкі для дзевяці тысяч акраў фордаўскай фермы.

Скончылася вайна. Сацыялізм у Савецкім Саюзе не толькі не паслабіўся, а, наадварот, яшчэ больш умацаваўся. Час для Дзяніса праходзіў нудна, аднастайна — кожны дзень адно і тое самае. З дому, з Беларусі, ніхто не адказвае на лісты. Паслаў ужо некалькі, а адказу усё няма. Тады задумаў Дзяніс Калывайка паехаць на радзіму. Мала ўжо засталося жыць, то трэба хоць пабачыць тое, што не бачыў сорак пяць год.

Так вось і сказалі ўсе ў вёсцы Цівуны, што прыехаў Дзяніс Калывайка — «амерыкапец».

Ён ішоў па вёсцы, высокі, крыху ссутулены. Апрача чамадана ў левай руцэ і кія ў правай на левым плячы яго вісеў плашч.

Была другая палавіна мая. Там-сям квітнелі невялікія садочкі. Дзяніс помніць, што іх было некалі многа, а цяпер штосьці змяншылася. Хаты ўсё повыя, некаторыя нават не дакончаны як след — то сенцаў няма, то страха яшчэ не даведзена да канца. Думае Дзяніс, што такое? Дзе ж старыя хаты? Пачалі выходзіць людзі на вуліцу, якія яму і сказалі жудасную праўду, што вёску ў часе вайны спалілі немцы. Сказалі праўду, але не ўсю... А Дзяніс ішоў далей, каб дайсці да сваёй сялібы. Павінна там стаяць груша пры вуліцы над студняй, а далей — вішнёвы садок перад хатай. Вось гэта і будзе тая сяліба, на якой ён, Дзяніс, некалі гадаваўся.

Грушу Дзяніс пазнаў, хоць і абгарэлую. Пад ёю нахіліўся стары зруб студні, на якім упоперак ляжала жэрдачка з убітым у канцы цвіком. На гэты цвік чаплялі вёдры і бралі ваду. Дзяніс зірнуў у студню і ўбачыў у недалёкай вадзе свой пасівелы, пакрэмсаны зморшчкамі твар. Ён глядзеў з халоднай глыбіні, як з таго свету. Дзяніс мімаволі ўсміхнуўся; нешта з далёкага дзяцінства лёгкім струменем прабегла ў душы. Гэта і было сапраўднае вітанне з сялібай, а значыць, і з Радзімай, хоць ад сялібы застаўся толькі адзін успамін. Там, дзе стаяла хата, рос густы зялёны ячмень. Ну, а дзе брат Сяргей, яго сям'я? Відаць, пабудавалася па другім месцы. Стаяў Дзяніс, абапершыся на кій, глядзеў на абгарэлую грушу, а яго паволі пачалі абкружаць дзеці, потым і дарослыя. Апошнія падыходзілі асцярожна, нібы не хочучы. Падышлі і некаторы час маўчалі. Дзяніс як бы прачнуўся ад задумы, глянуў на ўсіх і спытаўся:

— А дзе ж хата? Дзе брат... Сяргей?

Людзі маўчалі.

— Чаго ж маўчыце? Кажэце...

Усе пераглядаліся паміж сабою, нібы пытаючыся, хто ж скажа? І тады выступіў адзін стары, які стаяў у белай кашулі, абапершыся на сукаваты кій. Ён падышоў бліжэй да Дзяніса.

— Помніш Несцера, Дзяніс? Помніш? Разам жа некалі пастухамі былі, у панскі сад лазілі, а потым і да дзяўчат хадзілі,— сказаў з усмешкай стары.

Дзяніс прыгледзеўся да сівога Несцера і сказаў, паківаўшы галавою:

— Дык гэта ты, Несцер? Як жа не помніць?

Дзяніс падышоў і, прывітаўшыся, нават пацалаваўся з Несцерам.

І тады пачалася гутарка.

— Бачыш, якім ты выглядаеш... Пастарэў...

— Ну не будзем пра гэта гаварыць. Абодва пасівелі. Скажы, дзе мой брат Сяргей?

Сівы Несцер пачухаў за вухам і, апусціўшы галаву, сказаў:

— Цяжка табе гаварыць, Дзяніс, пра гэта, але... трэба, нікуды не дзенешся. Як ведаеш сам, у твайго брата Сяргея было два сыны і дзве дачкі. Дык вось, саколік...— Несцер уздыхнуў.— Адзін сын, старэйшы, загінуў на фронце, другога павесілі гітлераўцы, у партызанах быў, а яго самога, Сяргея, з жонкай і дочкамі яны спалілі жыўцом, Дзяніска...

Стары Несцер, быццам папярхнуўшыся, выцер набеглую, ледзь прыкметную слязу. У жанчын таксама заблішчалі празрыстыя слязінкі на шчоках. Несцер прадаўжаў:

— Многа тады спалілі нашых, нешта каля пяцісот чалавек разам з дзецьмі. Хадзі сюды, трошкі набок...— Несцер адвёў Дзяніса пару крокаў да сярэдзіны вуліцы.— Бачыш вунь тую гару?.. Помніш, там стаяў вятрак?..

— Помню, а як жа...— падтакнуў Дзяніс.— Дык дзе той вятрак?

— Вось у гэты вятрак яны сагналі нашых людзей і падпалілі. Каго толькі знайшлі ў вёсцы, усіх набралі і туды... Застаўся толькі той, хто быў на полі. Якраз лета было... Вось табе і ўвесь, як той казаў, сказ, Дзяніска. Каля пяцісот чалавек. Там вось і загінуў твой брат з жонкай і дзвюма дочкамі. Што ты зробіш? — І стары развёў рукамі.

Дзяніс доўга глядзеў туды, за вёску, на тую далёкую гару, і ўрэшце спытаўся:

— А што гэта там чарнее, на тоі гары?

— А гэта крыжы, саколік...— адказаў Несцер і апусціў галаву.

Запанавала доўгае маўчанне. Кожны перажываў напова мінулыя жудасці і нібы баяўся чым-небудзь парушыць гэтае перажыванне.

Дзяніс адвярнуўся ад тоі гары, і яго вочы заморгалі хутка-хутка. Ён выняў хустачку з кішэні і паспешліва выцер іх. Несцер ужо стаяў пры яго боку і заглядаў яму ў твар.

— Хадзем, Дзяніска, да мяне. Бяры свої чамадан. Думаю, не адмовішся ад нашага хлеба...

— Ну, што ты, Несцер? Чаму гэта я маю адмаўляцца? Дзякую табе.

— Пойдзем, пагаворым, супакоішся. Перажылі мы тут усяго. Пажывеш — пачуеш. Добра, што калгас паставілі на ногі. Жывём ужо з хлебам. Хадзем.

І Несцер павёў Дзяніса ў сваю хату.

...Здзіўляла ўсіх яго высокая, спакойная постаць. Нешта суровае было не толькі ў яго руках, але нават і ў сівых валасах пад шэрым капелюшом. Яго хада была хадою чалавека, які нікуды не сыяшаецца. Восемдзесят год... Праўда, родная вёска ажывіла яго, ласкай дакранулася да душы.

Але за плячыма засталося столькі мазольнага на чужой заакіянскай зямлі, што думкі, як-ніяк, цягнуць назад. Усё роўна трэба вяртацца ў фордаўскае царства, дзе Форд бярэ ў палон не толькі рабочую сілу, але і душу, і там дажываць веку. Ён, Дзяніс, жыве на пенсіі, ён не можа яе пакінуць. Каб маладзейшы быў, справа іншая...

З такімі думкамі шэрай, цёплай раніцай Дзяніс ішоў за вёску, туды, на тую чорную гару. Прасіў Несцера завесці, паказаць магілы сваіх... А Несцер толькі горка ўсміхнуўся і сказаў:

— Дзіўны ты, Дзяніс... Косці... адны косці там... Людзей жа папалілі. Ёсць некалькі асобных магіл тых людзей, што засталіся недагарэлымі. Свае пазналі і пахавалі паасобку. А так... глядзі там, дзе густа-густа крыжы стаяць над вялікай ямай. Глядзі туды. Кожны паставіў для сваіх. Я паставіў чатыры і для тваіх. Колькі людзей, столькі крыжоў. Адзін ля аднаго, як палец пры пальцу...

Так і пайшоў Дзяніс на гару адзін. Калі выйшаў за вёску, гара воддаль пабольшала ў вачах і яшчэ больш пачарнела. Хмары, пушыстыя, цёплыя, павісалі над ёю. Дзяніс на нейкі момант здалося, што гэта вялікая хмара чорнага варання зляцела на гару і віецца, кружыцца на адным месцы над хмарамі. І чаго яно, гэтае стада, кружыцца? Там жа пяма спажывы. Калі наблізіўся, распазнаў, што гэта не вараннё, а высокія счарнелыя крыжы стоўпіліся пад шэрым небам. Крыжы і крыжы... То простыя, то пахіленыя, яны перапляліся густа, як у змрочнай роспачы.

Ціха шасцеў жвіровы пясок пад жоўтымі камашамі

Дзяніса Калывайкі. Ён набліжаўся да вяршыні гары, а перад вачыма выраставалі яны — крыжы.

Вось ужо Дзяніс на гары, вось ён падышоў да іх, змрочных, суровых. Яны быццам з жывым дакорам глянулі на яго, насупленыя. Дзяніс зняў капялюш. Цішыня. Адзінота. Нікога. Толькі цёплы, лёгкі вецер шалясціць бур'яном паміж крыжоў. Далёка ў даліне застыла вёска Цівуны... За вёскай Дзяніс пазнаў той «стары бор», цяпер моцна прарэджаны, але знаёмы. І адтуль павеяла маладою песняй, даўняй, але не забытай. Здаецца, недзе ўдалечыні мільганула белая хустка і дакаціўся сакавіты смех... Далёкі... Мінулы... А ён, Дзяніс, на восьмым дзесятку свайго жыцця стаіць адзін — высокі, засмучаны, і родны вецер лашчыць яго сівыя, суровыя валасы, яго паморшчаны твар «цывілізаванага» раба.

Сэрца б'ецца ўсё мацней і мацней. Яно ніколі, здаецца, так не білася, не мела ў сабе столькі любві і крыўды. О людзі, родныя! Колькі вы тут перажылі за вайну! Колькі вы папрацавалі... А мы?.. А я?.. Ох, лёс наш цяжкі, лёс нечалавечы!..

Дзяніс расправіў рукі, быццам да палёту, нібы хацеў абняць гэты бяскрайні прастор з жытамі, з дарожкамі, з лясамі, з пералескамі, з сенажатнымі далінамі. Усё ніби цягнецца да сэрца Дзяніса, каб паразмаўляць з ім, як са сваім, які вярнуўся з далёкага падарожжа, каб стаяць вось на гэтай Крыжовай гары, якая была гарою яго маладосці.

Рукі раптам сціснуліся ў кулакі, заскрыгаталі зубы, і твар з сурова-пакорлівага зрабіўся чырвоным, абураным. Твар памаладзеў. Вусны зашапталі: «Не, дарагія, я не... я не паеду ад вас...»

Дзяніс апусціўся на калені перад крыжамі і з абамлелым сэрцам прыпаў да зямлі. Недзе ўсярэдзіне кальнула, а пасля нешта хлынула ў горла... Дыху агарнула цёплая імгла забыцця, ад якога ўжо не было абуджэння...

Праз дзень на высокай Крыжовай гары людзі капалі свежую магілу. У ёй пахавалі сына вёскі Цівуны Дзяніса Калывайку, які ўсе свае жыццёвыя сілы аддаў Форду і вярнуўся на Радзіму, каб памерці тут.

На гары, між чорных насуплепых крыжоў, з'явіўся новы, высокі, дубовы крыж, пра які людзі потым казалі: «Гэта апошні крыж...»

НАРУЧНЫ ГАДЗІННІК

Валя Семашкевіч — сярэдняга росту дзяўчына з курносым носікам і жвавымі чорнымі вачыма, якія бегаюць над навіслым чубікам хусткі, як мышкі. Ёй, відаць, не больш як семнаццаць. Ужо больш года Валя тыпкуе, аглядаючы з паверхаў сталіцу і часам думаючы, што так і ўсе дамы былі пабудаваны, як вось гэты, з якім Валя неяк паспела ўжо зрадніцца, прывыкнуць. Кожны ранак яна разам са сваімі сяброўкамі па працы прыходзіць сюды, узбіраецца па засмечаных друзам сходках і бярэцца за кельму. У цёплыя дні яна распранае сваю праванненую ватоўку і надзяе белы рабочы фартух, а ў халодныя дні ёй ватоўка не перашкаджае. Калі Валя пачынала працаваць тынкоўшчыцай, аб многім марылася. Перад вачыма заўсёды стаялі маці, якую пакінула ў вёсцы, і малы брацік, які першы год пайшоў у школу. Яна думала з асалодай, што з першай палучкі яна пашле можа сто, а можа і дзвесце рублёў сваёй маме і напіша, каб браціку купілі палітончык. Як жа будуць рады там, дома! І як жа рада будзе яна сама! Вось тады яна пойдзе ў клуб свайго трэста на канцэрт без аглядкі, без шкадобы, што трэба нейкія два або тры рублі аддаць за білет. Калі надыходзіў выхадны дзень, Валя ўволю высыпалася, а пасля абеду ішла ў парк, калі з дзяўчатамі, а калі і адна, садзілася на лавачку на галоўнай алеі і гэтымі жвавымі, як мышкі, вачыма праводзіла людзей, што ішлі пара за парай. Вочы часта спыняліся з захапленнем — то на плацці той ці іншай жанчыны, то на прычосцы, а самае найбольшае захапленне выклікаў наручны гадзіннік на белай, як адточанай, жапочай руцэ. Якая ж краса, калі яно, гэтае кругленькае вочка — ды яшчэ на лапцужку,— пры ўзмаху рукі блісне і ў вачах Валі заіскрыць колерамі. Затаіўшы дыханне, Валя праводзіла такую жанчыну вачыма і казала сама сабе, што без гадзінніка на руцэ жанчына траціць нешта з сваёй красы. І паступова мара авалодала Валяй — прыдбаць гадзіннік, хоць бы давялося адкладаць па рублю ў тыдзень. І Валя, нікому нічога не кажучы, пачала адкладаць — не па рублю ў тыдзень, а пабольш. З таго часу, як пачала авалодваць Валяй гэтая мара, яна частавата прастойвала перад вітрынай ювелірнага магазіна або заходзіла і ў магазін. Там разглядала гадзіннікі, і ніхто не падазраваў, як білася яе сэрца. Пад шклом ляжалі розныя гадзіннікі, розных памераў, з цыферблатамі розных колераў — белымі, жоўтымі, чор-

ныміі, то ў абводках серабрыстых, то залацістых. Вочы яе прыкоўвалі залацістыя абводкі, але гэта былі дарагія гадзіннікі, і Валя выбрала сабе невялічкі, зграбны, з тонень-кай металічнай абводкай, з пукатым шкельцам. Сказала сама сабе: «Вось, каб гэты...» Выбар быў добры, з густам. Але такі Валін густ патрабаваў ад яе пяцьсот рублёў. Ляжалі ж гадзіннікі большыя і танейшыя, а гэты невялічкі, зграбны — ды такую суму. На момант зрабілася цяжка, пацямнела ў вачах. «Дзе мне дабрацца да такога гадзінніка!» — думалася Валі, але ўсё ж такі не — мара брала сваё. А танейшага Валя не хоча, бо яны, танейшыя, не ўзбуджаюць такога захаплення, як вось гэты невялічкі, які так прыкоўваў яе ўвагу, які найпрыгажэйшы за ўсе, што ляжаць над шклом.

Праходзілі тыдні і месяцы. Упэўненай рукою Валі тынкаваліся сцены. Многа іх стала гладкімі, як наглянцаванымі. Кельма — слаўны інструмент у слаўнай руцэ. Раствор кладзецца па сцяне ўзгорачкамі, а пасля пачынаецца другое майстэрства — разгладка мокрай кельмай і апошняе — мокрай дошчачкай. Валя заўважае, што з кожным днём прыспяшаецца яе работа. Узмахі рукой сталі больш дакладныя і разам з тым — хутчэйшыя. Нормы перавыконваюцца на вачах. Калі к вечару прыходзіць прараб, ён змервае сцены строгімі вачыма, а пасля змервае такімі ж вачыма і самую Валю — сярэдняга росту дзяўчыну ў заляпанай растворам хустцы.

— Гм...— мармыча прараб,— прамерым яшчэ раз...

Прамераўшы, ён падыходзіць да Валі, віншуе яе з перавыкананнем нормы і адразу падае ёй лічбы працэнтаў перавыкананння.

— Пойдзеш, пойдзеш на Дошку пашаны, дзяўчына! Далажу інжынеру. Як цябе... па бацьку?

Прараб запісвае ў блакнот: «Валянціна Цімафееўна Семашкевіч — на Дошку пашаны».

І вось надышоў дзень, які Валя мае права залічыць да пайлепшых дзён у яе жыцці. Яна купіла наручны гадзіннік, той самы, на які ўпала яе чорнае вока,— невялічкі, з блішчастаі металічнай абводкай, пад пукатым шкельцам якога глядзелі чорненькія цыфры, і кожная цыфра абведзена залацістым шнурочкам. Гэтыя цыфры, як жывыя, здаецца, варушацца, усміхаюцца да Валі. Вось яна трымае яго ў руцэ, просіць дзяўчыну-прадаўшчыцу завесці яго, паставіць стрэлкі на правільны час.

Няўжо яна яго купіла? Так, купіла!

Валя выйшла на вуліцу. Глянула на гадзіннік, падзеты на руку, як у многіх другіх, і ўсміхнулася. Гадзіннік здаўся ёй прыгажэйшым, як у магазіне, бо там прыцемак кідаў цень на яго белепькі цыферблат. А тут, на вуліцы, ён зззе, гарыць; чорныя стрэлачкі, як камарыныя лапкі, паказваюць час.

Ітак, Валя з гадзіннікам. У душы адчувалася паўната задаволенасці. Здавалася, што разам з гадзіннікам вырашыліся ў Валі ўсе жыццёвыя турботы. Як добра хадзіць з гадзіннікам, сяды-тады зірнуць на яго, праверыць час, палюбавацца!

Калі Валя прыйшла ў інтэрнат, сяброўкі па працы абкружылі яе, вокхалі ад захаплення, пыталіся пра цану. Валя сказала — пяцьсот рублёў, і ўсе ў адзін голас: «Ён гэтага варты! Ой, ды харошы!» А Валя намылася, прычасалася, змяніла плацце і надзела гадзіннік на руку. На душу зыходзіць такі спакой, як ніколі. Добра з гадзіннікам! Трэба некуды пайсці, спярша хоць бы толькі па вуліцу, а потым можна і ў кіно. Валя хоча ісці павольна па тратуары, ісці зграбна, з крыху ўзнятай галавой у сіняй касынцы. Так наказвае гадзіннік, які зарабіла доўгімі днямі. Сярод вапнавага пылу і мазкоў гліны нарадзілася мара аб ім. Валя пачынае адчуваць, як яе істоту напаўняе пачуццё ўласнай годнасці.

Валя расстаецца з гадзіннікам толькі на час працы. Хавае яго ў ватоўку разам з абедам. Яна не перастае перавыконваць нормы, яе ставяць ужо ў прыклад на вытворчых нарадах. Ёй зайздросцяць сяброўкі. Іх зайздрасць ёй не падабаецца. Бо і чаго зайздросціць? Рабі добра, і ты кожная будзеш мець дасягненні. А Валя робіць па-мастацку. Прараб не можа ёю нацешыцца. Нават сам інжынер прыйшоў паглядзець на яе работу. У добрым настроі Валя, і здароўя, сілы, здаецца, прыбыло. Калі заплаціла столькі за любімы гадзіннік, то трэба наганяць яшчэ больш. І Валя наганяла. Тыя папрокі, што часам аднекуль заляталі ў душу, папрокі ў такой вялікай растраце, заглохлі, больш не прыходзілі. Яна мае дарагі гадзіннік, яна жыве з гэтай красою кожны дзень, яна можа ісці з ёю па той паркавай алеі, як тыя многія, і ганарыцца сабою.

Але чалавечую душу, відаць, падсцерагаюць нейкія злыдні. Ім не падабаецца чалавечая радасць, яе перамогі. Злыдні шукаюць самага балючага месца ў чалавека. Знайшлі яны яго і ў Валі. Адпаго разу, скончыўшы працу, Валя, як заўсёды, сягнула рукою па сваю ватоўку, што ляжа-

ла на падлозе пры сцяне, развярнула яе, каб узяць гадзіннік, і не знайшла яго. Яе адразу абдало потам. Яна шукала далей, перамацала ўсю ватоўку, ператрэсла торбу, у якой прыносіла абед, і — не знайшла. Пацямнеў дзявочы твар, і слёзы, як боб, пакаціліся па шчоках. Упала тварам на падаконнік і доўга не падымала галавы. Але ж трэба ісці дахаты.

Як ісці? Валя сабралася з сіламі і пайшла, як не сваімі нагамі.

У інтэрнаце заўважылі яе асунуты, сумны твар; Валя не захацела ісці на вячэру ў сталоўку, лягла, як хворая. Сяброўкі пыталіся, мо ёй што баліць. Але нікому не прыйшло ў галаву спытаць пра гадзіннік. Можа і добра, што не пытаюцца, бо не ўсе будуць спачуваць. Валя думала, дзе ўсё ж такі гадзіннік, як ён мог знікнуць? Яна прыпамінала ўвесь той злашчасны дзень, дзе яна была. Бо часам пачынала здавацца, што яна яго не здымала з рукі, што яна яго тады не мела. Прыпамінанні нічога не далі. Толькі, калі думкамі дайшла да ватоўкі, што ляжала пры сцяне на падлозе, ёй уявілася — яна разгорнутая ў адным канцы, з якога тырчаў белы хвосцік торбы. Нехта цягнуў торбу і выцягнуў гадзіннік. Але хто? Так і засталося пакутлівай загадкай.

А потым пачалі блукаць думкі навокал людзей сваёй брыгады, з якімі яна жыла ў інтэрнаце. Няйнакш, хто-небудзь са сваіх спакусіўся. Вядома, спакусіцца можна. Такі гадзіннік — дай божа кожнаму. Нехта дабраўся, і ўсё. Ну, бо не мог жа выпарыцца, растаць. Гэта ж не вада, не лёд. Толькі чыесьці рукі маглі яго ўзяць. І Валя пачала прыпамінаць, куды яна адыходзіла ў абедзенны перапынак, пакідаючы ватоўку на сваім месцы, хто з брыгады прыходзіў да яе. Калі дайшла да апошняга, перад ёю стала Каця. Яна прыходзіла пазычыць дошчачкі для разгладкі тынку, бо яе папсавалася — адклеілася ручка.

Каця вымушана была крыху пачакаць, пакуль Валя скончыць разгладжваць сваю, намечаную самою, дзель. Відаць, вось тады Каця і зрабіла ёй гора, бо Валя, разгладжваючы, увесь час стаяла адвернена да яе плячыма. Так яно і выходзіць. Ну, бо ж не мог гадзіннік, скажам, палянцець — ён жа не мае крыл. «Трэба прасачыць за Кацяю ў інтэрнаце»,— вырашае Валя, хоць надзеі на тое, што гадзіннік знойдзецца, ужо не было. «Дзе ты яго знойдзеш? Не будзе дурны той, хто забраў, каб пасіцца з ім людзям напаказ».

Валя таксама, як і ў тыя дні, прыходзіла на работу, але рукі не хацелі за яе браццa. Па звычцы хацелася глянуць на левую руку і ўбачыць сваю ўцеху-красу — гадзіннік, з задавальненнем зняць яго і прыхаваць у ватоўку. Надыдзе капец працы, і тады гадзіннік зноў закрасуе на руцэ. А цяпер? Цяпер яго няма. Валя разводзіла раствор паволь-на, не спяшалася.

Нехта напёс ёй удар — цяжкі, неспадзяваны. Баляць рукі, ногі, баліць сэрца, у галаве мутнавата. Валя робіць, здаецца, так, як і рабіла, але... атрымліваецца зусім не так. Млеюць рукі.

Прараб, абмяраючы яе дзённую работу, глянуў на Валю загадкава. Не змаўчаў.

— Што з вамі, Валя? Хварэеце?

— Можа і хварэю... Не ведаю...

Валя не хацела прызнавацца ў сваім няшчасці.

У інтэрпаце ўжо ведалі аб прапажы гадзінніка, некаторыя з Валяю пагаравалі. Добра ўсё гэта, але гадзінніка як не было, так і няма. Нормы выпрабу ў Валі пачалі скакаць то ўверх, то ўніз, як у хворага тэмпература. Прараб быў збянтэжаны, пытаўся, у чым прычына. Валя або маўчала, або абяцала паправіцца з нормамі. Тады прараб пайшоў распытваць у сябровак Валі і там дазнаўся аб сапраўднай прычыне такога яе стану. Ён адкрыў рот ад здзіўлення, доўга думаў, пасля хлопнуў сябе па плашчы і памчаўся да Валі.

— Валя, прашу, вы нікуды не адыходзьце... Я зараз прыйду...

Валя канчала работу, не адыходзіла, чакала. Што ён хоча, гэты прараб? Можа, доктара прывядзе? Бо сапраўды баліць галава. Яна зрабіла апошнюю разгладку кельмай і села на кучу друзу. Сядзела, адпачывала, яе хіліла да сну.

Вялікі чорны кот-паддашнік прасунуўся павольна, падышоў, панюхаў ватоўку ў кутку.

— Апсік! — крыкнула на яго Валя.

Кот гляпуў насцярожанымі вачыма на Валю і адышоў у напрамку сходак. Насустрач яму ішоў прараб. Ён крыкнуў на ката:

— Ах ты, бадзяга!

Падышоў да Валі, у якой пачалі зліпацца вочы, і працягнуў ёй на далоні не што іншае, як яе гадзіннік.

Валя тупа глядзела на яго, не хацела разумець, не верыла сваім вачам, яна лічыла гадзіннік прапаўшым,

— Ну... чаго маўчыш?! Твой?

Валя пахілілася галавой да рукі. І ўсмешка... усмешка нябесная заззяла на твары. Яна гляпула ў вочы прарабу, дакранулася да гадзінніка і тады сказала, кіўнуўшы галавой:

— Мой...

Узяла гадзіннік. Схапілася з месца, стала дзякаваць прарабу.

— Вы мяпе ажывілі, Максім Пятровіч. Дзе вы яго ўзялі?

— Дзе? У ката..

— У ката?

— Так, у ката, вось у таго чорпага ката, які нядаўна прасунуўся тут.

У Валі стала даходзіць да розуму, стала праясняцца тая катовая кража. Прыйшло на думку: «Ах, нашто ж я так дрэнпа падумала пра Кацю?»

— Дык гэта кот? — зноў пыталася Валя.

— Кот...— адказаў прараб.— Я адабраў гадзіннік ад ката. І чакаў, хто будзе яго шукаць.

Па сходках падымаўся і ішоў да іх той самы чорны кот — паддашны мудрэц.

— Вось ён! — паказаў прараб.

Валя паглядзела на ката і прамовіла:

— Ах, зладзюга ты, зладзюга! Колькі ж ты гора мне прынёс...

У ЗМАГАННІ...

Гэты невялікі рэстаран быў трэцяга разраду. Тут падавалі селядцы з бульбай, харошы капусны боршч з мясам, бульбяпыя, грыбныя супы, гарохавы, фасолевы, грэцкую кашу, а пасля — добрае тушонае мяса, гуляш,— словам, стравы больш сялянскага густу і, галоўнае, даволі танныя.

Таму сюды заходзілі абедаць і вячэраць людзі сярэдняга дастатку: будаўнікі — хлопцы і дзяўчаты, шафёры, сакратаркі з устаноў, бухгалтары, студэнцкая моладзь і іншыя.

Ад некаторага часу стаў наведваць рэстаран высокі чалавек у асеннім чорным паліто, у такога ж колеру кепцы. Ён заўсёды ўваходзіў, абапіраючыся на палку,

іншоў павольна, паважна. Уваішоўшы, распранаўся, здаваў вопратку ў гардэроб і з палкаю ўваходзіў у адзіную залу гэтага рэстарана. Заўсёды шукаў месца ў кутку, каб быць незаўважаным, сядаў тварам да кутка, абапёршыся абедзвюма рукамі на палку. Гладка ляжалі на яго галаве прычэсаныя русыя, злёгку залацістыя валасы. Вочы нерухома глядзелі ў куток.

Наведвальнікі мала звярталі на яго ўвагу — у кожнага свае справы — паабедаў, павячэраў і хутчэй, як кажуць, на свой пост. Толькі дзяўчаты-падавальшчыцы ведалі гэтага чалавека, і часам падыходзіла да яго высокая статная маладзіца, знаёмым поглядам заглядала яму ў вочы, часам сурова нахмурыўшы бровы, а часам з раз'ясненай усмешкай. Ён маўчаў, прыкрываў вочы, не хочучы глянуць на яе. Тады маладзіца абрывістым тонам скажа, як ударыць:

— Што? Ізноў напіўся?

Сказаўшы так, адыдзе да сваёй працы, бо ж трэба людзям падаць — каму якой, але ўлюбёнай яды.

А ён сядзіць, прымгнуўшы вочы. І мроіцца яму партызанскі стан — начны гул сосен, далёкія разведкі, разгромы паліцэйскіх, гітлераўскіх гарнізонаў, пераплывы цераз рэкі, стаянкі ў сёлах, пачастункі за сялянскім сталом. І вось ён, Аляксандр Іванавіч Сідарчук, храбры камандзір партызанскага атрада, сядзіць цяпер у рэстаранчыку, дзе працуе яго жонка Ніна, пра якую шушукаюць яе сяброўкі па працы, што яна хоча пакінуць свайго Сашу, бо Саша не можа перастаць піць.

А Саша пасядзіць, пасядзіць, больш прымгнуўшы вочы, паслухае ў сваёй душы шуму партызанскіх лясоў, уздыхне недзе з самых глыбінь, тады ўстане і, апрануўшыся, пойдзе ў цёмную гарадскую ноч з дрэмлючымі ліхтарамі. Ніна, пачакаўшы крыху, выскачыць на вуліцу, часам паспее ўбачыць яго ў бляску блізкага ліхтара, тады пакліча. Саша паслухмяна вяртаецца, абнімае сваю Ніну, выцалоўвае яе бялявы прыемны твар, а яна заліваецца шчодрымі слязьмі, упаўшы тварам яму на грудзі.

Яго таксама падмывае яна — гаручая, але ён яе не дапускае да вока, хутка авалодвае сабою і толькі туліць да сваёй высокай мужчынскай постаці статную Ніну, падругу партызанскіх дзён.

А яна таксама ўрэшце выпростваецца і пытаецца ціха, сурова:

— Куды ж накіраваўся?

Ён паспешліва адказвае:

— Нікуды, Ніна, нікуды, толькі дахаты...

— То можа пасядзеў бы трошкі, пайшлі б разам?

— Ты псуеш мне часта настрой, калі я да цябе прыйду.

— Не буду псаваць. Ідзі, вярніся...

Бывала не раз, што Саша вяртаўся. Ніна давала яму што-небудзь павячэраць, прысаджвалася пагаварыць.

Але так было не заўсёды. Аляксандр Іванавіч пра-падаў пачамі ў дружбакоў — таварышаў па партызанскім лесе. Прыходзіў не раз у рэстран да Ніны ў нецвярозым стане і грубіў ёй, асабліва калі было мала людзей у зале. Ніна, вяртаючыся з работы дахаты, часта не заставала яго дома. Дачка спала адна. Калі ж ён прыходзіў позна, зноў-такі ў нецвярозым стане, то не звяртаў увагі на тое, што суседзі спяць, біў палкаю па дзвярах, каб гук быў мацнейшы. Ляскат раздаваўся вострым рэхам у пач-ной цішыні калідораў і сходаў так, што часам спрасонку выскаквалі людзі і, высунуўшы галовы з дзвярэй, бурча-лі з абурэннем.

Дзе працаваў Аляксандр Іванавіч? У людзей склад-валася ўражанне, што ён не працуе нідзе, бо прыходзіў дахаты ўдзень у розныя часы так, як і ноччу. Не, Аляк-сандр Іванавіч працаваў — займаў пасаду старшыні арце-лі шчотачнікаў. Туды прывяла яго недысцыплінаванасць на службе на іншых вышэйшых пасадах.

Ніна вырашыла ўрэшце яго пакінуць. Перайшла з дач-кою жыць тымчасова да сяброўкі, таксама работніцы рэ-старана.

Аляксандр Іванавіч прыходзіў вечарам у рэстаран, пе-рапрашаў Ніну, прасіў, каб вярнулася. Аляксандр Івана-віч быў добрай душы чалавек, але вось гэтая немач — немач, насланая вайною... Там на ваенных дарогах былі не раз крутыя гадзіны, дні, калі яна — гэтая га́ра — памага-ла перабыць не адно выпрабаванне і выйсці з перамогай. І тады прыяцелямі былі — і вятры, і пягоды, і слоты. А цяпер? Нават жонка не хоча быць прыяцелем, не толькі што. Таварышы паглядаюць на яго з маўклівым дакорам, хоць нічога не кажуць — шануюць Аляксандра Іванавіча за яго храбрае мінулае, за яго таварыскую душу.

Калі Ніна адкінула яго просьбы, Аляксандр Іванавіч запіў на некалькі дзён запавал. Спаў дома без прасыпу, аброс барадою, хадзіў вечарамі да дружбакоў, а пайбольш туляўся бязмэтна па горадзе і стомлены, а часта і прамок-лы, прыходзіў дахаты і валіўся з ног у касцюме, не разуты.

Так цягнулася два тыдні.

Частыя наведвальнікі рэстарана былі ўжо ў курсе спраў Ніны. Яна сяму-таму нават пажалілася на сваю долю. Аб Аляксандру Іванавічу пайшла тая раздвоеная слава, калі адны цікавіліся больш яго храбрым мінулым, а другія — яго цяперашнімі паводзінамі.

Але вось падышоў вечар, звычайны мокры асенні вечар, калі імглой дымяць ліхтары. У рэстаране людзі, групкамі па чатыры-пяць чалавек, там-сям паселі за сталамі. Павольна прахаджваліся падавальшчыцы. Ніна, абслужыўшы сваіх, села ля сцяны і, падпёршы шчаку рукою, задумалася. У рэстаране амаль зусім прыціх гоман.

І вось скрыпнулі дзверы і ўвайшоў ён — Аляксандр Іванавіч Сідарчук. Аддаў паліто і кепку ў гардэроб. Абапіраючыся на сваю нязменную палку, накіраваўся ў свой куток. Там сеў, як заўсёды, тварам да кутка, а спіною да валы. Усе, хто быў у гэты час у рэстаране, падпялі галовы і правялі Аляксандра Іванавіча вачыма. Усім кіпулася ў вочы, што твар у яго быў памяты, вочы запалі і выглядалі як выплаканыя. А касцюм? Ён выглядаў нібы стаптаны нагамі, са знакамі засохлай гразі на локцях.

Правяла Аляксандра Іванавіча вачыма і жонка. Убачыўшы яго ў такім стане, ірванулася з месца і ў адзін міг стала каля яго і тузанула за плячо. Ён прыўзняў галаву і скоса так глянуў на яе, як глядзяць глухія, якіх пехта штурхае.

— Ідзі за мной! — сказала Ніна ўладарным шэптам.

Аляксандр Іванавіч устаў і, як паслухмяпае дзіця, паплёўся за ёю — туды педзе ў службовыя пакоі рэстарана.

Ніна хутка вывела яго адтуль ужо ў ачышчаным касцюме, падвяла да гардэроба, апрапула, надзела яму кепку і паказала на дзверы. Аляксандр Іванавіч паслухмяна адышоў і ўслед за сабою пачуў смех, хіхікапне. Хтосьці нават сказаў: «Так яму і трэба...»

Ішоў ён дахаты павольнаю хадою, выпрастапы, нахмураны, і ў душы нараджаліся суровыя думкі. Яны былі настолькі суровыя, што, здавалася, змаглі б асудзіць увесь свет. «Ага...— думалася,— усе зашушукалі мпе ўслед... А вы хто? Багі? Не, я вам дакажу, хто я...»

Аляксандр Іванавіч ішоў, спыняўся, услухоўваўся ў глухі гул горада і рухаўся далей. Прыйшлі яму па памяць дакорлівыя позіркі ды нават і заўвагі сяброў. Потым слёзы Ніны, яе такая харошая, жапочая, цярплівая дружалюбпасць... Многа чаго ўсплыло... У душы варушылася

крыўда, пякло агнём і ніяк не сціхала. Яна, відаць, даўно набіралася — крыўда, можа быць, на самога сябе. «Чаму ж не могуць зразумець, што я... што я — чысты чалавек... Паблыталі нейкія дні, можа і недарэчнасці побач з сапраўднымі крыўдамі. Дык што ж? Так і будуць мне хіхікаць услед? Да чаго ж ты, Сідарчук, дажыўся? Няўжо твая слава не насіла цябе па крыллях па зямлі? Чым ты стаў? Гэтага табе ніколі не снілася...»

Сідарчук спыніўся ў цяньку сквера пад мокрым бязлісным клёнам і адзін сам з сабою гаварыў, гаварыў... Нелегка рэстарана — ужо не трэцяга, а першага разраду. Як магнітам пацягнула туды. Аляксандр Іванавіч нават памацаў кішэню для праверкі... І ўміг хацеў рынуцца наўпоперак вуліцы... запіць, запіць крыўду. Вось ужо ступіў адзін крок і — спыніўся, як на тармазах. Стукнуў палкаю аб тратуар, скрыгануў зубамі. Хацелася крыкнуць: «Ночмачыха недружалюбная! Ты бяссільна на лекі! Я толькі сам... Я толькі сам!..» І высокая постаць імкліва пакрочыла ў цёмную глыбіню сквера.

Назаўтра Аляксандр Іванавіч прыйшоў у рэстаран увечары ў той жа самы час, што і ўчора... Але ж якое было ўсіх здзіўленне! На Аляксандру Іванавічу блішчаў новы касцюм, як кажуць, з іголачкі. Твар Аляксандра Іванавіча паголены, памыты, русыя з залацістым налётам валасы блішчалі, прычэсаныя. У вачах іскрылася нейкая адвага. Ён цвёрдаю хадою пайшоў на сваё месца і сеў за стол, як і ўчора, тварам у куток.

Ніна падышла распагоджаная, ласкава зазірнула яму ў вочы, нешта спыталася. Аляксандр Іванавіч кіўнуў галавой. Яна паставіла яму гарачыя біткі і бутэльку нарзану. Потым аблакацілася на яго стол і неяк дапытліва, з усмешкай разглядала яго твар, час ад часу аб чымсьці гаворачы.

— Калі ёсць справы, ідзі,— сказаў Аляксандр Іванавіч,— не затрымлівай людзей.

Скончыўшы есці, партызанскі ванка абняў сваю галаву, паставіўшы локці на стол, і моцна заплюшчыў вочы. Потым выняў з кішэнькі, адкуль тырчала насавая хустачка, нешта, патрымаў у кулаку і прычапіў да лацкана касцюма. Хутка абапёрся аб палку і ўстаў — высокі, прыгожы, з разумным тварам. Неяк па-ваенпаму адвярнуўся да залы, да публікі, каб ісці к выхаду. Усе глянулі па яго грудзі і ахнулі. З грудзей Аляксандра Іванавіча асвячала залу Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза.

Яна прыгожка ляжала на яго грудзях, калі Аляксандр Іванавіч, былы храбры партызанскі камандзір, асаніста ішоў да выхада і адчуваў, што нават сталы адсоўваліся к сцепам, каб даць яму дарогу.

НЕ, НЕ ЗАГУБЛЕНАЯ...

Гэта быў, вядома, толькі выпадак.

Карэспандэнт адпаго з цэнтральных часопісаў Рыгор Лазовіч, чалавек ужо ў гадах, у цішыні вестыбюля новапабудаванага клуба калгаса «Рунь» разглядаў розныя аб'явы на вітрынах, лозунгі на палотнішчах, плакаты, табліцы дасягненняў ураджаяў і абавязацельствы. Ён чуў, як час ад часу далятала да яго вушэй ціхая гутарка. Але мала звяртаў увагі на яе, заняты разглядам фотаздымкаў з калгаснага жыцця.

Нарэшце абыдзены сцены навокал — аж да бакавых дзвярэй, якія вядуць невядома куды, бо на іх нічога не напісана. Лазовіч нават пабойваецца адчыняць іх, каб не паткнуцца на што-небудзь непажаданае. Але... за дзвярыма загаварыў ціхі жаночы голас. Значыць, тут нехта чымсьці займаецца. Карэспандэнт асцярожна пастукаў і, калі пачуў голас: «Так!» — увайшоў у невялічкую бакавачку з двума вокнамі. За столікам сядзела жанчына з памаршчыненым тварам, з вострым поглядам карых вачэй. З-пад хусткі пракідаліся пасівелыя ніці сярод цёмных валос з лёгкім карычневым адценнем. Перад ёю сядзела калгасніца, якая толькі што выцерла слёзы.

— Я — сакратар партаргапізацыі калгаса. Вам каго?

— Ды мне...— неяк разгублена пачаў карэспандэнт.— Мне б, вядома, старшыню...

Пранізлівы погляд карых вачэй з налётам не то крыўды, не то стомленасці (а можа, таго і другога разам) неяк упарта спыніўся на Лазовічу.

— Старшыню? Старшыня паехаў у горад. Будзе к абеду. Я зараз скончу. Можаце пачакаць тут. Сядайце — там...

І яна, як здалося Лазовічу, уладарнай рукою паказала на драўляную канапу пры сцяне.

Лазовіч сеў, выняў з кішэні брашуру пра севазвароты і пачаў чытаць, даючы абедзвюм жанчынам зразумець, што справы, якія яны абгаворваюць, яго не датычаць. Сак-

ратар пачала гаварыць ціхім, удумлівым голасам, паблі-жаючыся тварам да калгасніцы. А калгасніца гаварыла па-свойму — раздражнёна, тонам крыўды. Яе зноў забіра-ла на плач.

— ...Калі яна, нягодніца гэтая, не можа аддаць ка-цынтратаў назад, то няхай заплоціць у калгас. Я ж яе наймала. Цэлы ж мяшок, нягодніца, украла... Украла, Со-нечка, украла зладзейка і не хоча прызнацца...

Лазовіч, чытаючы, сяды-тады пазіраў з-пад акуляраў на жанчын, асабліва на сакратара, і сам сябе пытаўся: «Яна ці не яна? Няўжо гэта яна? Не можа быць. Так змар-шчынець... Толькі вочы...» А калі пачуў імя — «Сонечка», перастаў чытаць і па-сур'ёзнаму стаў разглядаць жанчы-ну з карымі вачыма. Вось такія вочы даўно, даўно — пека-лі — абдалі былі яго сваім цяплом.

І памяць, хоць хаатычна, але выразна, пачала аднаў-ляць перажытае.

Гэта было ў цяжкія часы Заходняй Беларусі. Соня Вярбіцкая, камуністка, па нацыянальнасці яўрэйка, уцяк-ла з-пад канвою, параненая, і тры дні блукала галодная па лесе. Селянін, якога яна напаткала, прывёў яе ў вёску да Лазовіча, сакратара акруговага камітэта КПЗБ. У той жа вечар пайшлі на акруговую канферэнцыю ў жыта, дзе інструктарка ЦК Соня зрабіла даклад аб сітуацыі ў краі-не. А потым пачалося туляние па вёсках, па хатах, дзе вясковыя жанчыны лісточкамі трыпутніку залечвалі ёй ра-ну на руцэ.

Да позняй восені «вандравала» тады Соня па краі, не раз вярталася да Лазовіча, не раз адыходзіла ад яго і зноў вярталася. А Лазовіч, русавалосы са сцятымі губамі хлопец, ужо выпрабаваны і падкаваны для працы-бараць-бы ў падполлі, праз адлегласць сачыў за ёю і вызначаў ёй яўкі ў розных месцах — ці то на хутарах, ці ў лесе. І яна прыходзіла, парывістая ў рухах, з вачыма, у якіх пералівалася сонца, абветраная дарогамі, і з усмешкаю на бялявым твары. Ціснула яму руку, станавілася пры ім блізка-блізка, так што вочы яе сустракаліся толькі з яго вачыма.

— Ну як — арыштаў няма? — пыталася.

— Ёсць,— адказваў Лазовіч,— і яшчэ трэба чакаць, бо нам удалося выкрыць правакатара і знішчыць яго.

Яна крыху насупліавалася, і тонкая маршчынка мільга-ла паміж цёмных броваў на гладкім, прыгожым ілбе.

— Ну што ж... Добра...

— Я цябе завяду да знаёмага лесніка на некалькі дзён. Сам — ды і ўсе нашы хлопцы — пойдзем у лес на работу. Трэба на час сысці з вачэй сышчыкаў.

Увосень па рашэнню ЦК Соня пайшла на ўсход, за мяжу, а Лазовіч хутка трапіў у турму.

Там, у лесніка, у глыбокім лесе, адбылося расстанне Сані з Грышам. Ляскыя шумы, можа, і цяпер расказваюць пра гэта...

...Лазовіч глядзеў у брашуру, ужо не чытаў, а толькі глядзеў. Ён вачыма душы быццам перачытваў сваю даўнюю быль, сваю і яе — Сані. Няўжо гэта яна? Так пастарэць?.. Што ж дзіўнага? Ты ж і сам, Лазовіч, пастарэў, засталося мала валос на галаве, ля куткоў вачэй прарэзаліся цёмныя рысы. Яны віюцца і на лбе — стомленым, задуманым. Так, так, гэта ўсё праўда.

Вядома, Лазовіч Рыгор можа пастарэць, але яна... яна не павінна... Яна павінна быць такою, як тады ў вёсках, як там, у лагодным лесе, які шумеў тады для іх і толькі для іх... Усё ж такі — няўжо гэта яна?

Калгаспіца, заспакоеная ціхімі, удумлівымі словамі Сонечкі, што зладзейка «кацынтратаў» будзе пакарана, пайшла. І ў пакоі для Лазовіча стала неяк напружана ціха. А Сонечка, як назнарок, утаропілася ў пейкую паперку, падкрэсліваючы ў ёй пешта алоўкам. Лазовіч палажыў сваю брашуру ў кішэню і чакаў, як выпадковы, звычайны наведвальнік. А сэрца міжволі пачало непакоіцца...

Сонечка адлажыла паперку ўбок і ўзняла вочы на Лазовіча. Ён адзін раз глянуў у іх, і вейкі яго апусціліся.

— Вы адкуль прыехалі? — спытала яна.

— Ды адкуль... З цэнтра. Вось езджу па калгасах. Прыехаў і да вас.

— Сядайце сюды, да стала,— запрасіла яна.

Лазовіч, неяк ацягваючыся, падышоў да стала.

Сонечка прыгладзіла валасы, падправіла іх над хустку і тужэй заціснула вузел пад барадою.

— Што ж... трэба вам паказаць камандзіроўку,— прамовіў Лазовіч і выняў кніжачку з бакавое кішэні касцюма.

Парторг, якую калгасніца назвала Сонечка, глядзела ў камандзіроўку, глядзела, не адрываючы вачэй, а яны, як спалоханыя, раптам пабольшалі, і маршчынка над пераноссем застыла ў перухомасці.

— Лазовіч? — прамовіла і ўзняла на Лазовіча праяснены твар.

— Так... Лазовіч... ён самы... Грыша.

Яна ўжо глядзела на яго, збялелая ад узрушанасці.

— Ну...— памкнуўся спытацца Лазовіч пра яе, але яна перабіла:

— А я?.. Я — Соня Вярбіцкая... Помніш такую?

Лазовіч прыўзняўся з крэсла, працягваючы руку. Яна падала сваю, а бель усё не сыходзіла з яе твару. У вачах — іскры.

— Як ты дзіўна пытаешся — помніш такую?

Лазовіч глядзеў на яе ўжо адкрытымі вачыма, ёп разглядаў яе шчокі, вочы і тыя рысы, што апусціліся ўніз ад куточкаў губ — знак горкіх перажыванняў.

— Дзе ж ты была так доўга? Я думаў...

— Дзе была? — перапытала яна і нават усміхнулася горка.— Была далёка, за дрымучымі лясамі, адкуль рукою падаць да Ледавітага акіяна...

Абое замоўклі. Адбывалася толькі маўклівая гутарка душ — гарачая, ласкавая, з прылівамі гневу.

За акпом, на высокай таполі, ля шпакоўні быццам шушукаліся шпакі...

Яна ледзь чутна ўздыхнула.

— Так...— працягнула,— журыцца не трэба. Наша ленінская рэвалюцыя вытрымала ўсё. Павінна вытрымаць. Інакш...

— Ух, якая ж ты...

— Такая, як была. Бачыш, не згубілася,— сказала Соня і засмяялася.— Ну, а ты? Дзе быў? Як дажыў да пасівелых валос?

— Прайшоў пямала. Перажыў усякага. Усё нічога. У гэтым нічога дзіўнага, вядома... Гэта — наш час, час барацьбы ў вялікім і малым...

— Дзе ты спыніўся? — спыталася.

— Ды нідзе... Хачу паглядзець вашую гаспадарку. Як ты апынулася ў калгасе?

Соня ўсміхнулася.

— Калі я вярнулася ў свой горад, звярнулася ў абком партыі і заявіла, што хачу працаваць у калгасе. Я ўжо не хацела жыць у горадзе. Абком падтрымаў. Тры гады я працавала загадчыцай свінафермы.

— Свінафермы? — перапытаў Лазовіч.

— І што думаеш? Я падняла ферму. За гэта мяне ўзнагародзілі ордэнам Працоўнага Сцяга. Вось нядаўна стала парторгам.

— Ты зноў з народам...

— Нас ніхто з ім не разлучыць.

Яна глянула на свой наручны гадзіннік і сказала:

— Ідзі, дарагі, аглядай гаспадарку. Я напішу запіску намесніку старшыні. Пойдзеш з ім. А сама надыду ў другую брыгаду. Там трэба разабраць адну справу. К абеду я цябе знайду. Будзем абедаць разам у мяне.

Яна жыла ў невялікім пакоі вялікай гаспадарскай хаты, якая танула ў садаўі. Ложак, столік з лямпаю і кніжкамі. Над ложкам — карціначка — кавалак дрымучага бору, і дзяцел стукае ў саспу. Над столікам — партрэцік Леніна, а ніжэй у чорных рамках яна сама — маладая, з прытоенай усмешкай...

Лазовіч аглядаў пакойчык, пакуль яна рыхтавала абед на кухні, глядзеў на яе фатаграфію і сам сабе паўтараў: «Такая, як тады... як там, у лесе...»

Вочы прымыкаліся на адно імгненне, і ўся істота акуналася ў нешта ласкавае да болю, у нешта, што адбылося, як у даўнім сне.

...Цёмным, ціхім вечарам яна праводзіла яго да хаты, прызначанай яму на начлег. Ішлі павольна, гаварылі ціха аб усім — аб мінулым — харошым і цяжкім, аб будучым — прыгожым.

Калі спыніліся пад павесам яблыні, што галінамі апусцілася на плот, яна сказала ціха, з прыпынкамі, як віноватая перад кімсьці:

— А хлопчык... пражыў тры гады і памёр...

Запала маўчанне. Грыша Лазовіч, як даўні той віхрасты хлопец з адкрытым сэрцам, абняў яе галаву і прытуліў да сваіх грудзей. Цалаваў яе змакрэлыя вочы...

ВОСЬ ЯК БЫЛО...

Ён толькі потым назваў сябе карэспандэнтам.

Наша гутарка вялася неяк павольна, не маючы акрэсленай тэмы. Гэта былі фразы без пачатку і без канца. Калі поезд уляцеў у лес і ценем пакрыла акно, мы абодва надоўга сціхлі, загледжаныя — то ў лісцяныя балотныя гушчы, то ў стромкія сосны, пад якімі слаўся і вабіў вока мяккі, зялёны, як мурава, мох. Невядома, ці гаварылі б мы, каб праз усю дарогу мінаў пас лес? Але вось поезд вынырнуў, як з тунеля, на залацістыя палі, дзе сярод жытоў сям-там яшчэ вытыркаліся застарэлыя хутары.

— Мякая, прыемная ваша Беларусь... Такая, як бы вам сказаць... лагодная,— прамовіў мой спадарожнік, на

момант адвярнуўшыся ад акна. Пасля зноў застыў вачыма на палявых краявідах, што плылі за шыбінай.

— А вы... калі можна ведаць, адкуль? — асцярожна спытаўся я.

— Я?.. Як вам сказаць? Родам-то я з Далёкага Усходу, а свядомае жыццё пражыў у розных месцах. Найбольш у Маскве...

Ён спыніўся на паўслове і глянуў на мяне дапытлівымі вачыма, глыбока асаджанымі ў арбітах. З вачэй праглядала стомленасць. Вельмі прыкметнымі былі прамянні маршчын, што ахілялі яго вочы, а ўвесь закрэплы, відаць, ад розных вятроў твар гаварыў аб перажытым, суровым.

Я ўкрадкам прыглядаўся да яго твару і намагаўся адгадаць, хто ён — гэты чалавек? Ён пачынаў здавацца мне папросту загадкавым. Я паглядзеў на вешалку, дзе вісеў яго летні зялянкавы плашч, паношаны, як запылены, капялюш і ў дадатак — абжытая ў руках, цёмна-карычневая, па-мастацку зробленая палка. Яна дадавала мне яшчэ больш пачуцця павагі да гэтага невядомага спадарожніка. Палка... абжытая да таго, што на загнутай дужцы-ручцы сцерлася палітура і фарба да самага дзерава, да сукаватага ядлоўцу. Многа ж яна пахадзіла з сваім гаспадаром! Пры розных пагодах, у розных краях — цёплых і халодных.

А вось і сенажаць. Загрукатаў мосцік пад коламі, і перад вачыма мільганула рэчка, адна з тых многіх, што віюцца, пятляюць, выводзяць у густых асоках свае раскошныя капрызы.

Мой спадарожнік схамянуўся. Локаць абапёрся на столік, і шчака лягла на далонь. У вачах ледзь прыкметна зайгралі скупыя бляскі ўсмешкі.

Урэшце ўказальны палец правай рукі паказаў на акно.

— Глядзіце... Вашы балотныя прыгажуны...— І задуменная суровасць растала на твары. Ён на імгненне неяк ласкава гляпуў на мяне.

У аддаленні па сенажаці хадзілі буслы.

Поезд імчаў. А гэты сівы, закрэплы на твары чалавек раптам вымавіў скорагаворкай, быццам выкінуў словы са сваіх душэўных глыбінь:

— Калі я быў карэспандэнтам на Далёкім Усходзе, мне давялося злавіць бусла...— Ён перачакаў хвіліну і дадаў: — Падстрэленага...

Адкінуўся спіною да сцяны і, перабіраючы пальцамі па століку, гаварыў ужо больш зраўнаважана:

— Я прынёс яго да хірурга, і мы пачалі перавязваць

Герої Савецкага Саюза, старшыня калгаса

«Партызанскі краї» Лушпецкага раёна

Васіль Захаравіч Корж і Піліп Пестрак.

1955 г.



Сустрэча з былымі членамі КПЗБ пасля мітынгу,

прысвечанаму памяці Веры Харужай.

Пружаны, 1959 г.

яму нагу. Яна была пакалечана ўверсе, ужо ў акрываўленым пер'і... Рабочы бальніцы хуцепька зрабіў яму такое седала, каб ён мог сядзець з перухома замацаванымі нагамі. Яго даглядалі ўсе сёстры... Уся абслуга бальніцы наведвала яго кожны дзень. Дзеці, пачуўшы пра такое, нават прынеслі яму ласунак у кошыку — некалькі балотных жабак...

Мы ўсміхнуліся адзін аднаму. Мы бачылі перад сабою жывую карціну догляду балотнага цара...

— Ну і што — вылечыўся бусел? — спытаўся я.

— Вядома, што вылечыўся. Толькі крыху прыкульгваў.

— І трэба ж было камусьці спакусіцца на такую птушку... ды такую, якую ў народзе называюць божай!

— Так... знайшоўся-такі хам,— стрыманым тонам абурэння адказаў мой спадарожнік.

Пасля хвіліннага маўчання я ўсё ж такі спытаўся пра тое, што мне карцела даўно:

— Дык вы былі карэспандэнтам?

— Так, быў,— з нейкай рашучасцю, павышаным тонам сказаў ён і пачаў первова паўтараць:— быў... быў... Мне здаецца, што я ўсё жыццё быў карэспандэнтам... Ды так яно і ёсць...— Праз хвіліну дадаў: — Я і цяпер карэспандэнт...

Поезд сцішыў ход. Мы наблізіліся да акна і ўбачылі звычайную станцыйку пад разложыстымі ліпамі і клёнамі.

Ні я, ні ён не мелі намеру выходзіць з вагона.

Раптам мой карэспандэнт замітусіўся — нават прыстукнуў кулаком па століку.

— Вы бачыце ці не? — паказаў ён па перон.

Я пачаў углядацца. Групка хлопчыкаў мітусліва разглядала пешта ў руках аднаго свайго сябра. І я заўважыў ластаўчына гняздзечка, поўнае птушынага пер'ечка-пуху. А ў ім... так... гэта былі яны — птушаняты.

— Бачылі? — паўтарыў мой спадарожнік і зараз жа ўстаў.— Выйдзем! — жвава кінуў ён.— Гэта цікава.

Мы выйшлі. Карэспандэнт узяў з рук хлопчыка гняздзечка, якое не мела адной сценкі. Але чацвёра людзь апераных птушанятак ледзь змяшчаліся ў ім і разяўлялі дзюбкі.

Выяснілася, што нехта спароў гняздо пад страхою, і яно ўпала. Дзеці наперабой расказвалі здарэнне, і ва ўсіх была адна турбота — дзе падзець гняздзечка? Да сцяны пад страхою яго не прылепіш.

Мой карэспандэнт пачаў тонам паказу раіць дзецям,

каб яны знайшлі баначку ад кансерваў, каб абвязалі яе дротам, каб убілі цвік у тым самым месцы пад страхою, дзе было гэтае птушынае жыллё, і павесілі на яго баначку з гняздзечкам. Тады ластавачка знойдзе сваіх дзетак.

Хлопчыкі ўважна слухалі сівога дзядзю, задраўшы ўверх свае загарэлыя носікі, і ўрэшце, як адзін, з палёгкаю ўздыхнулі. На тварах заззяла радасць.

— Зробіце? Патрапіце? — пытаўся сівы дзядзя, з замілаваннем гледзячы ў загарэлыя твары дзяцей.

— Зробім! — гукнулі ў адзін голас дзеці і рушылі ісці.

— Глядзіце зрабіце! — крыкнуў ён ім услед. І яны азірнуліся на бягу і паўтарылі:

— Зробім! Зробім!

Калі мы вярнуліся ў вагон, трэба было бачыць, як свяціліся вочы ў карэспандэнта, як не зыходзіла з вуснаў усмешка, быццам чалавек перамог нешта, дасягнуў чагосьці такога, аб чым марыў. І ўрэшце прамовіў:

— Добра, што мы падаспелі, а то...

Мне здавалася крыху залішнім яго такое хваляванне, і я сказаў:

— Птушанятам не далі б загінуць.

— Гэта яшчэ невядома. Мне здаралася бачыць, як дзе і хто ставіцца да такіх спраў. І гэта было для мяне не толькі дзікім, але нават і страшным.

Ён раптам змоўк, задумаўся. Пасля пачаў гаварыць:

— Мне ніколі не забыць таго, што я прачытаў аб ратаванні італьянскіх лётчыкаў, пасланых авантурыстам Муссаліні на Паўночны полюс, каб разбіцца. Помніце гэта?

— Помню,— адказаў я, ужо захапляючыся сваім размоўцам.

— Сярод усіх там трагічных здарэнняў мяне закранула і назаўсёды прыемна здзівіла адно здарэнне...

Я адкрыў пачку з папяросамі і працягнуў расказчыку, а ён, беручы папяросу, глядзеў на мяне і спяшаўся гаварыць:

— Вось паслухайце, паслухайце... што гэта было за здарэнне... Як вядома, наш лётчык-ратаўнік Чухноўскі меў вымушаную пасадку, і пакуль падышла помач, жыў на лёдзе, на пустыннай ледзяной прасторы. І вось да яго ў госці пачаў прыходзіць мядзведзь — гэты лагодны, непалоханы жыхар ледзяных пустынь. Ён спакойна абнюхваў спасці самалёта, потым нюхаў працягнутую руку Чухноўскага і яго самога. Чухноўскі падзяліўся з ім ядою. І з таго часу мядзведзь стаў прыходзіць кожны дзень.

Я слухаў, як кажуць, затаіўшы дыханне. Грэх было б перабіваць расказчыка, бо яго панеслі думкі ўжо па крыллях.

— І так кожны дзень яны сябравалі. Але... Але ўсяму бываюць канцы. Яны на свеце бываюць, вядома, розныя. Адны крыўдзяць чалавека, яго гуманныя пачуцці... ну, а другія паадварот. Ці зможаце вы адгадаць, які канец быў у Чухноўскага з мядзведзем? — уставіўся на мяне ў застылай усмешцы мой карэспандэнт.

Я паціснуў плячыма, не могучы сказаць нічога. Карэспандэнт працягваў:

— Помач усё не прылятала з Масквы. Прадукты ў Чухноўскага ўбывалі. І настаў урэшце такі дзень, што іх ужо зусім не стала.

Карэспандэнт ужо не заўважаў, што ён павысіў голас, што пачаў жэстыкуляваць.

— І прыйшоў ён — белы, лагодны сябар на чатырох лапах. Абнюхваў руку Чухноўскага і... прасіў вачыма — дай хоць крошку, чаму ж ты сягоння нічога не даеш?

Чухноўскі не даваў, бо не было чаго. І ён, доўга думаючы, вагаючыся, прыняў рашэнне, ад якога і сэрца і душа прасілі адмовіцца.

Я слухаў з напружаннем, чакаючы, якое ж рашэнне прыняў лётчык.

Карэспандэнт, здаецца, не спяшаўся з расказам. Ён зацягнуўся дымам з папяросы і абтрос попел у попельнічку. Нібы няўзнак, прыцішаным голасам сказаў:

— Чухноўскі вырашыў застрэліць мядзведзя...

Потым расказчык з нейкім пафасам маўчання пачаў глядзець у акно. Не адварочваючы галавы, гаварыў:

— Ён не меў чаго есці...

Я здагадаўся памагчы расказчыку дагаварыць думку:

— Чалавек вышэйшая істота за звера на зямлі. Дзякуючы ядою, пакуль мог. А калі не стала, права жыцця дыктуе, каб чалавек захаваўся для будучыні за рахунак, у дадзеным выпадку, звера... Гэта, бачыце, натуральны закон жыцця...

— У гэтым была, як бачыце, вялікая неабходнасць,— амаль перабіў мяне карэспандэнт.— Ці парушаны тут нормы гуманізму?

— Па-мойму, не,— адказаў я,— гуманіст — гэта не бесприпынны пацыфіст, каб на адну дошку ставіць чалавека і звера, калі чалавеку надыходзіць пагібель.

— Добра гаворыце! — нават ускрыкнуў мой субяседнік.— А я думаў, вы асудзіце Чухноўскага.

— Ну, не... Няма за што.

— Правільна. Няма за што,— заспакоена дадаў карэспандэнт.— І таму я часта сягаю думкаю ў той ціхі зачараваны лес — парк — недзе на мяжы Чэхаславакіі і Польшчы. Ён рабіў уражанне цішыні нават у часе вайны. І трэба было бачыць і чуць, калі гучалі гарматныя стрэлы над гэтым лесам, як уцякалі звяры і звяркі. Асабліва помнад гэтым лесам, як уцякалі звяры і звяркі. Асабліва помнілі пяцца маладыя, далікатныя козачкі... Яны, дурненькія, натоўпамі беглі на шашу. А эсэсаўцы спынялі свае машыны і ва ўпор... ва ўпор з аўтаматаў... Мы бачылі іх дражнежныя ўсмешкі. Мы бачылі, як цёплай, маладжавай кроўю жывёліп апырсквалася трава на ўзбоччы... Ці тут была неабходнасць страляць у жывёліп?! Гэта ж не тое, што было ў Чухноўскага.

Я... маўчаў... Дый нашто ж адказваць? І так зразумела.

Каб развеяць некалькі пануры настрой, які ахапіў нас, я запрапанаваў свайму расказчыку паабедаць і працягнуў руку да чамаданчыка.

— Паабедаць? Гэта добра...— адказаў ён і глянуў на гадзіннік.— Можна... Мая станцыя яшчэ далекавата.

Мы папрасілі ў правадніцы чаю, расклалі свае прысмакі на століку: кавалачкі вяндліны, халодную курыцу, сыр — і пачалі, як кажуць, частавацца. Гаварылі пра розпае, усякае, нават перайшлі на анекдоты, якія выклікалі ў нас і смех. Нам вярпулася раўнавага духу. Мой карэспандэнт нібы нават памаладзеў, з вачэй знікла стомленасць. Гэта ўжо быў выраз твару чалавека, які выгаварыўся, а значыць, споўніў свой абавязак перад кімсьці — абавязак, безумоўна, чалавечны.

Карэспандэнт усміхнуўся, глянуўшы цераз столік на мяне.

— А ўсё ж такі я вас расхваляваў... Ну, і сябе таксама. Та-ак... Бывае... Хутка будзе станцыя, на якой я сыду. Паеду ў палескія пушчы адведаць свае партызанскія сцяжынкі. Адведаю абавязкова і тую мясціну, дзе банда эсэсаўцаў расстраляла... Каго? Што? Як бы вы думалі?

— Ну, вядома, нашых людзей.

— Гэта зразумела... Тады была аблава. Эсэсаўцы плылі на некалькіх лодках па ціхай, здавалася, безыменнай рацэ, хоць і называецца яна — Лань. Мы сачылі з кустоў за імі. Плёскат вёслаў на зары чуўся так выразна, што гук ад яго, здаецца, абціраўся аб кусты, як жывая істота.

Карэспандэнт гаварыў ужо як паэт:

— Далёка ў лясных гушчарах успыхнула густая пера-стрэлка і хутка заціхла...

Мы ішлі, не адстаючы ад эсэсаўцаў...

Мы чакалі зручнага моманту, каб іх заатакаваць... І вось на берагавой палянцы мы ўбачылі ціхі статак жу-раўлёў. Яны стаялі касяком, гатовыя да адлёту, і свежае, асеняе сонца залаціла іх грудзі...

Эсэсаўцы, як адзін, ударылі па іх залпам. А мы... А мы тады ўдарылі па іх, па эсэсаўцах...

Папяроса дымілася між пальцаў майго пасівелага рас-казчыка. Яго маўчанне я адчуваў як працяг расказу.

А расказчык патушыў недакурак, глянуў на мяне зыч-ліва і сказаў, як прыстукнуў:

— Вось як было, дарагі таварыш!

З цыкла
«Сярод чаротаў»

*

У ПАЛОНЕ ПРАСТАТЫ

Глухі пескавы шлях нарэшце вывеў нас з гушчыні лясоў на шырокую паляну, дзе ў мяккай і ціхай цемры замаячылі хаты. Месяц з-за хмар, глухі і таксама ціхі, памог нам ясней разглядзецца ў навакольлі. Як толькі вынырнулі з лесу, шафёр спыніў машыну, каб распазнаць мясцовасць, а галоўнае — дарогу. Бо гадзіну таму назад нас вахацелі затрымаць у лесе напач зыбучыя пяскі, якія патрапілі ўсмактаць у сябе колы машыны амаль да рэшты. Змаганне з пяскамі каштавала нам нямала поту.

Стаім. Цішыня. Нейкая быццам яна знаёмая і разам з тым незнаёмая. Хочацца стаяць і слухаць гэтую, прасветленую скупым святлом месяца, цішыню, у якую затапіўся лес з яго жыццём-дыханнем. Недзе час ад часу тонепька папісквала нейкая птушачка, як насланае з таямнічых прастораў імгненне.

Рушылі — спакойна, асцярожна і хутка спыніліся ля дабротнай будыніны тут жа пры дарозе, каля двух кіламетраў ад сяла. Вырашылі пастукацца ў акно, спытацца, што за сяло наперадзе. Ці гэта яно, што нам патрэбна? Стукаць у акно пайшоў фотарэпарцёр. Навакольная глуш ахутвала гэты будынак, і стукі ў шыбіну здаваліся ніклымі, палахлівымі. Урэшце нехта адазваўся, як з-за тоўстай сцяны,— ледзь чутна і невыразна. Чакалі нядоўга. Выйшаў чалавек невысокага росту ў куртцы з настаўленым каўняром. Шапка, як грыб, спускалася на патыліцу.

Чалавек адарваўся ад плота і выйшаў на дарогу. Маўчаў. Доўга глядзеў у адзін бок дарогі, а потым у другі і — маўчаў. Мы чакалі, пакуль ён што-небудзь нам скажа.

— Дык вам патрэбен старшыня? Ён жыве ў сяле... пасярэдзіне сяла. Там стаіць пры вуліцы таполя. Ну, вось там... У новай хаце.

Я наблізіўся да гэтага чалавека, і мне ад яго дыхнула парнасцю не малака, вядома,— дыхнула густым, як з бочкі, самаробам.

Мы падзякавалі і паехалі, не ведаючы, з кім мелі гонар сустрэцца. Нас агортваў смех ад неспадзяваных пахаў, якімі абдаў нас гэты незнаёмы чалавек.

Месяц пачаў праясняцца, шыбуючы між хмар, і мы праз адкрытае акно мелі магчымасць ясна назіраць твар старшыні калгаса — генерала, апранутага ў паласатую піжаму.

Ён прыняў нас мала сказаць холадна, а нават закамянела-спакойна. Старшыня-генерал рабіў уражанне поўнай непрыступнасці. Крэпасць пейкая — дый годзе.

Ён нам параіў вярнуцца ў той самы будынак, ля якога мы толькі што былі, і там пераначаваць.

— Да вас выходзіў ляснічы. Там шры дарозе лясніцтва... Куды вы стукалі ў акно. Ад майго імя папрасіце яго, і там пераначуеце. А заўтра — пагаворым.

Вось і ўвесь сказ. Што ж, трэба слухацца. Мы, як кажуць, навярнулі аглоблі і хутка зноў спыніліся ля ахутанай глухменню даўгаватай будыніны. Справа пайшла на добры лад. Мы ўвайшлі ў вялікую кухню з пабеленай печчу, з плітkаю направа ў кутку. Кухня нагадвала пешта неабжытае, халоднае. Гэта адчуў і наш малады фотарэпарцёр, бо шапнуў мне: «Казёншчынай пахне...» На вялікай, нічым не занятай белай сцяне, як рэшата, вісела леснічоўская новая шапка з кукардай з двух дубовых лісткоў накрыж па зялёна-імшыстым аколышку. Яна вісела на доўгім цвіку адна-адненькая, павешапая, як на хаду, у спешцы. Але шэранькі пылок на ёй нагадваў, што яна тут пакутуе ўжо доўга. Усё б гэта яшчэ так-сяк, калі б яна мела ўсю сваю першабытную стройнасць. Не... На гэтай новай, ганаровай шапцы нехта або папоўзаў каленьмі, або, чаго добрага, трапіла яна пад бочку ці, скажам, пад дзяжу з цестам. Нехта без аглядкі, без літасці паламаў леснічоўскую шапкавую стройнасць. Мы пераглядаліся з фотарэпарцёрам і ўсміхаліся... Але вось выйшла з пакоя маладзіца ў чорным плацці, маладзіца ў поўным сэнсе гэтага слова. Наіўная краса разліта па бялявым твары. Вусны расплыліся ва ўсмешцы і паказалі на святло прыгожыя белыя зубы. Сарамяжліва моргаючы цёмнымі вачыма, яна просіць нас прайсці ў чыстую палавіну, трошкі там пачакаць.

Мы прасілі аднаго — начлегу. Прасілі даць нам месца дзе-небудзь на саломе, на сене. І хопіць. Але нашы просьбы не памаглі, і трэба было падпарадкавацца мілавідпаї гаспадыні.

Ляснічы, скупы на словы, падобны да агузка ці карча, перакідваўся з намі па славечку і ўсё азіраўся, ці дзе што не стукне, ці не ўвойдзе хто. Нягледзячы на яго няўклюднае, з твару праглядала нешта шляхетнае. Калі даведаўся прозвішча, стала зразумелым, што перад намі адзін з патомкаў герояў Дупіна-Марцінкевіча, апетых ім у сваёй славутай «Пінскай шляхце».

Раптам... мы і не згледзелі, як на стол спаўзла з рук гаспадыні, яшчэ кіпушчая, патэльня з салам і яечняй. Гаспадыня частавала ветліва і непасрэдна-шчыра, і гэта нас абрала ў палон. Якія рахманыя, чыстыя істоты ёсць на свеце! Мы запрашалі яе да чаркі. Яна адмовілася — баліць печань. Гэта навяло нас на сумныя думкі — мы шкадавалі маладзіцу, шкадавалі прыгажосць, якая, відаць, яшчэ не зведала ў жыцці ніякіх спакус. Я паабяцаў ёй пашукаць у лесе лекарскага зелля ад печані. Як яна шчыра была ўзрадавана, якая вера, упэўненасць гучала ў яе голасе.

— Ой, знайдзіце, калі ласка... А то мяне часам як схоніць...

Павячэраўшы, мы зноў прасілі начлегу на сене, саломе.

— Не, мы вас на саломе не паложым. Нашто гэта? — гаварыла гаспадыня.— Ляжаце на ложку.

Шафёр заявіў, што пойдзе спаць у машыну. І, накінуўшы кепку на галаву, выйшаў. А нас, як узяўшы ў палон, гаспадыня прывяла да ложка. Мы зразумелі, што павінны будзем спаць на адным ложку ўдвáіх... Паціснулі плячыма — што ты зробіш, пікуды не дзенешся. Гаспадыня абдорвае нас ласкай сваёй непадкупнай прастаты.

Стандартны партрэт яго і яе ў адной чорнай рамцы павіснуў над намі. Мяне асабліва цікавіў ён, бо глядзеў з партрэта на нас у капялюшыку набакір. Ну, ці ж гэта не моднік, не купалаўскі пан Быкоўскі?

* * *

Ранняе расістае сонца асвяціла нам раўніннае, ніколі намі не бачанае, поле, акаймаванае густым цёмным колам лесу. Дзе пескавыя, а дзе балотныя дарогі выныралі з сяла і хаваліся ў аддаленым лесе. Тыповае палескае поле, якое параўнаўча не так даўно было над лесам. Пяскі, падзолы, торф. Нечым аскетычна-бедным патыхала ад гэтага поля. Здавалася, у недалёкім мінулым ледзь-ледзь прайшлі па ім, залесеным, непраходным. І вось цяпер палыхае сонца на прасторы і ходзяць людзі, якіх ніяк не адарвеш

ад гэтай пяўдалаї зямлі, ад непраходных нетраў, дзе толькі плодзіцца і звонам звініць адна непалоханая заедзь. На тварах у старажылаў запяклася суровасць — хто сказаў бы, можа, і азлобленасць. Цяжка ж было людзям змагацца з прыродай. Аднак людзей ад яе і не адарвеш. Ніхто не прагне ўцякаць у невядомае. Старажыл-паляшук прывык жыць, як жыве сама прырода, якая яго і корміць, і пільпуе, і страшыць.

Мы намыліся каля студні пад ясным, чыстым небам, не закрануты м нават найменшаї хмарынкаї. Сонца палыхала, іграла вострымі праменнямі на ўцеху ўсяму жывому.

Мы спяшаліся. Аднак наш вартаўнік — гаспадыня — усё ж такі прымусіла нас паснедаць. Сам ляснічы надзеў прагарэлую ад сонца, скамечаную, ужо старую леснічоўскую шапку і падаўся на фурманцы ў лес. Гэта зразумела. Ён мае пад сабою чатырнаццаць тысяч гектараў лесу і атрад з дванаццаці леснікоў, не лічачы аб'ездчыкаў. Хто сказаў бы: «Гэта — сіла...» Вядома, сіла. Але, на жаль, дамарослая сіла, над якою мае ўладу лес.

Генеральская машына — усюдыход — павезла нас у лес, туды, дзе капаюць канал. Старая канава, зарослая асакой, трымала ў сабе ваду, як у карыце. Ніяк не распазнаеш — цячэ яна ці не. І вось два экскаватарчыкі яе паглыбляюць, ідуць насустрач адзін другому — адзін па цячэнню, а другі — супроць. Замаруднай здалася мне такая работа. Аднак пасля вайны, відаць, няма яшчэ пакуль што іншага выхаду — дый сама праблема асушкі Палесся яшчэ канчаткова не вырашана. Работа экскаватарчыкаў, на якія мы глядзім,— гэта патрыятызм старшыні мясцовага калгаса, партызанскага генерала. Яму ўрад зрабіў уступку і выдзеліў вось гэтыя дзве жалезныя птушкі, якія сваімі дзюбамі ўсё чэрпаюць і чэрпаюць, і, як бы яно ні было, пасоўваюцца наперад. Фотарэпарцёр у сваёй настойліваневўгамоннай працы, абліты потам, патрапіў залезці на стрэшку экскаватара і адтуль аб'ектывам вырываў з прасторы ўсё — і прыроду, і людзей. Генерала сфатаграфаваў у розных паставах, нават ляжачым. А потым пабег да дзяўчат, якія з шумам, пераклікамі і песпямі высякалі хмызы недалёка. Уздоўж берага капавы рыхтавалася поле, у першую чаргу пад капоплі.

Генерал гутарыў з намі яшчэ «па-генеральску». Найбольш увагі аддаваў рэпарцёру. А я быў для яго незразумелы — «Чаго, па што ён сюды прыехаў?». Аднак у гутарцы са мною выказаў свае мары, што вось патрэбен куста-

рэз, патрэбен трактар з ляспымі плугамі. Цяжка яшчэ пасля вайны.

Знаёміліся мы з ім вельмі павольна. Гумар прыйшоў тады, калі я ў абедзенную пару расклаў агонь па ўзлессі, куды і з'явіўся генерал. Ён выняў з сваёй торбы нарэзакі і ласкі сала, даў нам па порцыі і сказаў рабіць «вілачкі» з пруцікаў, насаджваць на іх сала і пячы па полымі. Гэта называецца пячы сала «па-партызанску». Гэта радавала генерала. І трэба сказаць, што пячэ ён сала «па-партызанску» ўмела.

Абедалі ў генерала, абедалі без гарэлкі. Сказаў, што няма,— і ўсё. Мы яе, вядома, не патрабавалі, усё залежыць ад гаспадара, і няхай будзе яго воля. Сам генерал зусім перастаў ужываць горкую. А ў партызанстве ўжываў. Жыве ён у новай хаце ў пляменніцы — маладое ўдовы, і яна — зграбная маладзічка — служыць яму, як богу. А самую лёс якраз і пакрыўдзіў — муж не так даўно стаў ахвяраю п'янага на суседскім вяселлі — загінуў. Маладзічка ходзіць па хаце, як манашачка, ціха плача па-дзявочаму і маўчыць, маўчыць.

Мы спачувалі ёй, суцяшалі, як маглі, а яна ў слязах, заікаючыся ў спазмах, нешта прамовіла нам... І мы зразумелі:

— Каб хоць за радзіму загінуў... А то так...

І жалю, здаецца, не было канца.

Мы выйшлі на падворак і ўбачылі генерала ўжо далёка на полі, стаяў адзін і аглядаў повую для Палесся культуру — кукурузу. Яна яшчэ генералу на пояс.

Фотарэпарцёр зараз жа пайшоў у ляспіцтва — сказаць нашаму шафёру, што трэба ехаць у суседнюю вёску. Там сельсавет. Яны павінны заехаць па мяне. І я, каб выкарыстаць час, сеў у цяньку пад страхою і пачаў запісваць тое-сёе ў блакнот.

Але штосьці доўга няма машыны. Я вырашыў урэшце накіравацца таксама ў лясніцтва.

Іду па гарачай тарфяной вуліцы. У наваколлі стаіць спёка. Усё дзесьці пахавалася. Нават сабак няма. Толькі ходзяць парасяты, гусі, куры. І ў цяньку пад плотам я набрыў на хлопчыка, які соладка спаў. Старое, даўняе, знаёмае прыйшло на памяць... Маленства наша залатое, сонечнае, памешанае з зямлёю. Я агляпуўся туды-сюды, каб дзе каго ўбачыць, сказаць, каб забралі хлопчыка,— тут жа ходзяць паблізу парасяты. Але нікога не ўбачыў. Толькі адагнаў парасят. Няхай хлопчык паспіць у цяньку.

Калі я завяршуў у завулак паміж хат і платоў на лясніцкую дарогу, то ўбачыў адну парачку дзяцей. Наперадзе ішла дзяўчынка год трох-чатырох і плакала наўзрыд, а за ёю крочыў год пяці хлопчык у чорнай кепцы, абуты ў лазовенькія лапцікі на раменных аборах. Дзяўчынка не хацела ісці, а ён яе пхаў у спіну, і тая, заліваючыся плачам, ішла. Потым спынялася, не хацела ісці. Тады хлопец штурхаў яе ў спіну зноў. І ўрэшце гэтымі штуршкамі давёў дзяўчынку да апошняга — яна абярнулася і, як кошачка, падняла на хлопца свае пазногцікі. Хлопец аж шарахнуўся назад. Добра, што скончыліся хаты і з-за палявога жэрдачпага плота паказалася маладая жанчына ў белай хустцы.

— Ты нашто яе пхаеш? — пакінулася яна на хлопца.

— А яна не хоча ісці...

Гэта была матка гэтых дзяцей.

За плотам сінелі ў квецені льны, і яна пядаўна палола,— то нагнуўшыся, то седзячы.

Маіх сяброў у лясніцтве не было. Я ўвайшоў на кухню, дзе на сцяне непарушна вісела ўсё тая ж самая «новая» леснічоўская шапка. На кухні нікога. Я пачаў выгружаць са свайго партфеля на лаву зялёныя лекі, якія я нарваў у лесе,— лекарскую зёлку — «бяссмертнік» для гаспадыні, што ўчора скардзілася на печань.

Але вось з пярэдняга пакоя выйшла і яна з грудным дзіцяткам, якога мы ўчора не заўважылі. Яно ляжала на руках маці і кармілася, прыпаўшы да адкрытых белых грудзей. Я сядзеў ля акна, а яна разглядала зёлкі. А потым, не адымаючы дзіцяці ад грудзей, усёй сваёй шырокай адкрытай беллю іх наблізілася да мяне зусім, зусім блізка. Я быў некалькі збянтэжаны такім становішчам і чакаў фіналу. Урэшце пачуў ціхі, крыху нясмелы, звычайны голас:

— Скажыце, калі ласка, а як піць гэтае зелле?

О, святая прастата! Я гатоў на цябе маліцца...

КВАС І ЛАПЦІ

У машыне апрача шафёра генерал і я. На дварэ — спякота, такая, што не выратоўваюць нават лясныя цені на дарогах. Едзем пад таўшчэзнымі выпоснымі соснамі, як нібы пад раскошным скляпеннем якогасьці храма.

І вось хатка пры дарозе — старая сяляпская, з малымі вокнамі, з пачарнелай страхою з сасновай дранкі. На парозе ў сенцавых дзвярах стаяў гаспадар хаткі — стары Кузьма, з якім генерал дружыць. Кузьма — сівы, белы, як голуб. Ён у белай саматканай сарочцы, падпяразапай рамешным матузком, і ў такіх жа саматканых штанах. Так і стаяў ён у цёмным праёме дзвярэй, як лясны вяшчун, калі спынілася наша машына.

— Ратуй, Кузьма, ад гарачыні,— прамовіў генерал.

— Паратуем... Зараз,— адказаў стары і падаўся ў камору.

Хутка выйшаў да нас. Нёс перад сабою поўны збанок палескага напітку — бярозавага соку, які ўжо зрабіўся квасам. Кубак за кубкам мы выпівалі гэты нектар старога сівавалосага Кузьмы, а ён глядзеў на нас з усмешкай на сваім суровым, нават строгім твары. Кузьма славіцца сваім квасам на ўсю ваколіцу — ні ў кога ён не бывае такім удалым, як у Кузьмы. Квас гэты смачны, яго пах адмысловы, у ім адчуеш не толькі водар бярозы, але і травы з прымешкай сасновай жывіцы. Кузьма дадае да квасу пчалінага воску, што канчаткова робіць яго духмяным, раскошным.

— Ну, то калі, Кузьма, будзеш перасяляцца ў сяло? — спытаўся генерал.— Пара ўжо.

— Ой, не трывож ты мяне, генерал. Дай мне дажыць да канца ўжо тут. Каму я там патрэбны ў сяле? А тут я цябе хоць квасам пачастую. Ён у мяне тут гадуецца за сцяною. Тут усё мне служыць. Жыву ў лесе, а каб хоць раз воўк прыйшоў, а то — не!.. Было, праўда, раз, але гэта даўно...

— Ну што з табой зробіш? Так і быць — жыві... Дзякуем за квас... харошы квас... Бывай здароў, Кузьма...

— Едзьце здаровенькія. Прашу, не мінайце мяне, старога.

Так і пабывалі мы ў ляснога вешчуна Кузьмы, з якім яшчэ не раз давялося сустрэцца. Адну такую сустрэчу я назваў «страшною». Мы загасцілі ў генерала надоўга. Азнаёміліся з мясцовасцю і пачалі самастойна хадзіць па лясных дарогах і петрах. Пры нас закончылі паглыбленне канала, пабудавалі над ім новы мост, які быў распачаты даўно. У выхадныя дні моладзь з гармонікам ужо ішла ў лес на канал. Там былі танцы на мосце, на белых сасновых дошках. Па сухім ужо бераэе прахаджваліся парачкі. А потым быў калектыўны абед пад вярбою, якая свае ка-

рэпні апусціла ў каналыную ваду. І толькі познім вечарам вярталася моладзь з гармонікам у сяло.

Я пачаў хадзіць па лесе адзін — дзе дарогамі, а дзе і без дарог. Так блукаючы, патрапіў на страхоцце. Яно ішло па беразе даўняй канавы, ужо зарослай травою, лазнякамі і чаротамі. Толькі сцежка была сухая, яна вілася па даўнім насыпе. І вось здалёк пачало набліжацца да мяне страхоцце. Яно ішло на дзвюх нагах, але галава не была чалавечай. Можа, гэта які-небудзь бык ці лось абвесіўся галінкамі, якія апускаюцца аж да зямлі.

Страхоцце няўмольна насоўвалася на мяне. Я спыніўся, глядзеў і нават пачаў думаць: «Можа гэта мне здаецца так? Можа гэта гульня ўяўлення?» Але не. Страхоцце рухасцца наперад — проста на мяне. Што гэта за цуд? І вось гэты «цуд» стаў перада мною. Я гляджу і вачам сваім не веру. Надраныя палоскі лазовай кары шапкаю звешваюцца з галавы, аднак, сапраўднага чалавека. З-пад лазовай шапкі вытыркаецца толькі нос, і з-пад сівых броваў глядзяць цёмныя лясныя вочы. Яны ўсміхаюцца, глядзяць на мяне здзіўлена.

— Не пазнаяце? — жартоўна прамовіла страхоцце.

— Ай... Дзядзька Кузьма! — спахапіўся я.— Ах вы, чарадзей, лясны чарадзей!

— Вось і напалохаў вас... Напалохаў?

— Можна сказаць, што трошкі было... было...

Мы абодва доўга рагаталі.

— Вось нараблю сабе абутку, хопіць мне ўжо па лета. А там — зноў надзяром...

І вось тады я заказаў дзядзьку Кузьме, каб ён сплёў і мне лапці-лазовікі.

Кузьма доўга не верыў, ці я праўду кажу, ці жартую. Доўга трэба было гаварыць, каб пераканаць дзядзьку, што я не жартую.

— Ну, калі так, спляту вам ужэ... гэтыя лазовікі. Як будзе ехаць генерал ля маёй хаты, кіпу яму ў машыну. Добра?

— Добра.

Так яно і сталася. Я даў дзядзьку Кузьме тры рублі, і ён быў вельмі рады.

— О, на махорачку мне ўжэ хваціць...

Цераз год мы зноў прыехалі ў канцы вясны да генерала-старшыні. Мы аглядалі пасевы на поваасушаных землях. Буйна кусцілася жыта, а за агародамі-соткамі шумела кукуруза, кукуруза, што называецца, на славу.

Ужо сотні гектараў асушаны ў генерала, а экскаватарчыкі нястомна робяць сваю справу далей. Пралягло ўжо некалькі каналаў праз лясныя гушчары, праз дрыгвяныя шы, ды так вырываюць, што, здаецца, трактар са скрыпам зараз лопне ад натугі, распадзецца. Па сухіх месцах пайшоў у ход кустарэз, які, як брытва́ю, зрэзвае не толькі кусты, але і самыя сосны. Разбагацеў ужо на тэхніку генерал.

Тая самая спякота, што і летась, тая самая гарачая тарфяная вуліца з курамі, парасятамі. Але няма ўжо таго ляснічага са сваёй мілавіднай жонкай. Недзе, кажуць, выехаў у Сібір. Яго заступіў ляснічы новы — малады, прыгожы хлопец.

Пляменніца генерала кожны дзень стаіць ранкам каля печы і варыць смачную яду, якою мы і частуемся ў генерала, нягледзячы на тое, ці ён дома, ці ў ад'ездзе. А ён часам ад'язджае — то ў райцэнтр, то ў вобласць. Так было ў адну чарговую нядзелю, калі генерал выехаў у Брэст.

Мне давялося пазнаёміцца з новым ляснічым, і мы, ідучы па вуліцы, зайшлі на кватэру генерала. Нас у сенцах сустрэла яна — пляменніца, якая ў сваім смутку па мужу — ды яшчэ ў чорным плацці — выглядала, як манашачка. Я заўважыў, як заззяў, успыхнуў яе твар. Дзверы ў хату былі адчынены насцеж, і я, не спыняючыся, прайшоў далей.

Малады ляснічы астаўся ў сенцах. Я аглянуўся і вымушаны быў зачыніць за сабою дзверы — малады ляснічы павіснуў на плячы засмучанай маладзічкі. Ну што ж, шчасце прыходзіць рознымі шляхамі-дарогамі. Можа, перастане плакаць маладзічка?

А яна праз некаторы час, як віхар, уляцела ў кухню, схапіла са стала доўгі нож і там, дзе ў сенцах віселі на жэрдцы скруткі каўбасы, пачала вымахваць ім, як мячом.

Яна частавала нас, разружавелая, як кветка. Яна запрашала есці, яна налівала ў чаркі, аж покі ноч не навісла над сялом і не паклікала ўсіх да сну. Я выйшаў на двор,

каб паглядзець у ціхае зорнае неба, а потым пайсці пад павець і расцягнуцца на генералавым сене, каб зоры пакінуць для іх...

АРЛІЦА

Нельга было не звярнуць на яе ўвагі нават пры першай сустрэчы. Яна — рослая, моцная, з моцнаю імклівай хадою. Нешта з арліпага свяціла ў яе шэрых вялікіх вачах, і русыя валасы з залацістым адценнем мякка ляжалі на яе галаве, як шаўковыя. На шыі свяціліся два радочкі пацерак. Нешта нават напышлівае можна было прыкмеціць у мужных рысах твару, што падкрэсліваў асабліва нос з ледзь прыкметнай гарбінкай.

Я ўвайшоў у вялікую хату, асабліва шырокую, што можна было б назваць яе папярочнай. Яна стаяла воддаль ад сяла на балотным мурозе, абкружаная вялікім агародам сярод высокага жэрдачнага плота.

У хаце падлога аказалася глінянай. Пасля спякоты на дварэ тут, у хаце, ад яе патыхала халадком.

Яна прыйшла сюды да знаёмай нешта пашыць на швейнай машыне. І яна шыла — нешта шэрае, крамнае, якое звешвалася з яе каленяў на зямлю. І тут жа церлася малое — да маці тулілася дзяўчынка, якой яшчэ не споўнілася двух год.

Я спытаўся, паказваючы на дзяўчынку:

— Гэта ваша?

— Маё.

— Гэта ўсё, ці ёсць больш?

Яна змоўкла, апусціла твар над работай. Усмешка мільганула на яе тварыы і тут жа знікла. Твар зрабіўся засяродкаваным, нават суровым. Я падумаў, што яна не хоча адказваць, і таму больш не распачынаў гутаркі. Пачаў прахаджвацца па хаце, разглядаць на сцяне сямейныя фотаздымкі. Так разглядаючы, непрыкметна зайшоў аж да кутка сляпой сцяны. Там, як звычайна, стаяў ложак. Бачу — упоперак ложка спяць абхутаныя тры маленькія істоты. З-пад коўдрачкаў у арэоле хусціпак відны тварыкі з маленькімі посікамі. Вядома, гэта былі дзеці. Я падышоў да яе і чамусьці ціха — можа, каб не пакрыўдзіць чым-небудзь — спытаўся:

— А там... на ложку — гэта што?

— Як што? Хіба не бачыце? Дзеці...

— Чые?

— Таксама мае,— нібы набраўшыся адвагі, адказала яна, і шчокі тут жа заліла ружовасць. Яна пешта вырэзяна, і шчокі тут жа заліла ружовасць. Яна пешта вырэзвала нажнічкамі ў тканіне, а шчокі і далей не гублялі ружовасці.

— Усе трое вашы? — асцярожна, з павагай спытаў я зноў.

Яна адчула павагу, ускінула поглядам на мяне і стала спакайнейшай, больш даверлівай. Бо аглянулася на ложак і паясніла:

— Вунь, злева, два хлопчыкі, а справа — дзевачка... Жыццё вось так падарыла мяне...— закончыла яна і ўздыхнула.

— А вы не гаруйце... Ад прыбытку, кажуць, галава...

— Ды я і не гарую,— перабіла яна і вясёлымі вачыма глянула на мяне. Тут жа рухава ўстала, сваёй постаццю захіліла акно. Павярнулася да ложка, абцягнула кофту на высокіх грудзях і накіравалася туды — у куток. Асанісна ўзнятая галава на гордай шыі, імклівая хада, прывабная постаць быццам гаварылі, што да сваіх арлянят пайшла арліца...

СВЯТОЕ МАЎЧАННЕ

Дымы плывуць з каміноў роўна, непахісна і там, бліжэй да сіні нябёс, разыходзяцца карункамі. Сонца ціхае, ласкавае, павольна сягае праменнямі ўсюды — у росныя разоры поля, у травы сенажацяў, у густы лес і праз вокны свеціць у хаты — лыпае праменнямі па лавах, падлозе, па кутках.

У хаце на пасцеленай саломе на падлозе расцягнуўся ў ботах, у кепцы шафёр генерала — Ваня. Учора прыйшоў дахаты пазнавата, падгуляўшы, і звалiўся як сноп, выцягнуўшы свае цыбатыя ногі. Храпе на ўсю сваю маладую моц, падставіўшы спіну сонцу. Побач з ім спіць, згарнуўшыся ў клубочак, яго хлопчык, якому ўсяго год жыцця. Яго пачынаюць ужо даймаць мухі. Ён гэтага не чуе. Жонка ўжо недзе падалася — відаць, на ферму.

У печы зырка палаюць дровы, трашчаць, страляючы іскрамі. Старая — маці Вані — недзе на момант выйшла. Яна павінна зараз вярнуцца.

Яна вось і вярнулася з бярэмечкам сухіх сасновых дроў на руцэ. Толькі кіўнула мне галавою на прывітанне, нічога не сказаўшы. Палажыўшы дровы, падышла да дзіцяці, узяла яго сонпага асцярожненька ў свае касці-

стыя далоні і палажыла ў лубкавую калыску. Паспрабавала будзіць Ваню і махнула рукою — надарэмна.

Я выйшаў на падворак — відаць, Ваня яшчэ няхай паспіць, цяжка яго цяпер абудзіць. І я стаю на падворку сярод сонечнага ззяння, якое залівае ўсё навакольле, трымаючы яго ў цёплай цішыні. Не чуваць нідзе не толькі чалавечага голасу, але павят голасу пеўня ці рохкання свінні за плотам. Усё, як знарок, прыціхла, перажывае цяпло свежага ранку. На страсе, па самым хрыбце, селі два белыя галубкі і сядзяць, нікуды не хочуць ляцець, сядзяць у сонечных праменнях, без руху, ціхія...

Выйшла з хаты старая і пайшла да свайго старога, які абчэсвае сякерай слуп для плота тут жа за вуглом хаты. Старая села на бярвенца, падпёрла сваю маршчынную шчаку рукою і так застыла ў маўчанні. Стары — сівы і шчуплы — дзяўбне сякерай некалькі разоў і сядзе, палажыўшы рукі на калені, і таксама маўчыць. Хоць бы што прамовіў да старой, а то не. Пасядзіць, зноў возьмецца за сякеру, адчэша некалькі трэсак і сядзе. Седзячы, маўчыць. Гэтае маўчанне выдаецца не то адпачынкам, не то нейкім услухоўваннем у гэткую ранкавую сонечную цішыню. Найхутчэй — апошняе. І думкі ў старых міжвольна плывуць свае, асаблівыя. Яны кранаюць сэрцы старых. На свеце ж такое харастВо, а ногі ўжо не могуць хадзіць, рукі хутка стамляюцца ад работы, яны ўжо спрацаваныя, астаялася певялікая рэшта іх сіл. Усяго толькі ўцехі, што пасядзець вось такім ласкавым ранкам на бярвенцы і памаўчаць. Толькі памаўчаць. Бо толькі такі ды адчуваецца — калі радаспа, а калі балюча праплываюць гарачыя струменьчыкі на душы і апякаюць сэрца.

Так і сядзіць старая — маці Вані, — падпёршы шчаку касцістым кулаком, сядзіць непарушна, як статуя, затапіўшыся думкамі ў свае перажытыя гады, пра якія пад ласкай ранняга сонца так добра памаўчаць. І старая маўчыць. Маўчыць і стары. Маўчаць і галубкі на страсе. І, здаецца, усё жывое навокал не хоча перашкаджаць маўчанню старой і старога. Гэта — святое маўчанне.

ГЕНЕРАЛ

Генерал-старшыня жыве па-спартанску. Устае, можна сказаць, найраней за ўсіх у сяле. Выпівае шклянку малака, апранае нейкі ваенны брызентавы плашч ужо немалой даўнасці і спяшаецца ў свой «кабінет». Гэта пядаўняя

прыбудоўка да будынка пошты з абпіленага сасновага бярвення. І сядзіць генерал у такім сваім кабінеце і па тэлефоне «ваюе» са сваімі брыгадзірамі. Дае парады на дзень. Брыгад у генерала шэсць. Адна самая далёкая — за чатырнаццаць кіламетраў — нядаўна ўлілася ў калгас.

Генералаў у навакольлі больш няма. Толькі ён адзін тут, у сваёй роднай мясцовасці, у сваім родным сяле, працуе, жыве, як падзвіжнік. Пасля сканчэння вайны прыйшоў ён сюды па закліку партыі, ветэран не адной вайны за свабоду народаў. Не кажучы пра грамадзянскую вайну, калі ён быў маладым чырвонаармейцам, гэты сапраўдны партызанскі генерал ваяваў на фронце барацьбы Заходняй Беларусі, калі яна падпала пад акупацыю панскай Польшчы. Гэта ўжо была партызанская барацьба, калі граміўся атрадамі паліцэйска-ваенны акупанцкі апарат.

Надышоў фронт камун, першых сацыялістычных гаспадарак. Потым — калгасы.

А пасля паклікалі да сябе вятры свабоды на далёкую іспанскую зямлю, дзе чырвоны камандзір з Палесся хадзіў з атрадамі па тылах фашыста Франка і знішчаў яго аб'екты.

І вось надышла вайна зноў, вайна, якой яшчэ не бачыў свет. Гэта была ўжо класавая вайна. Гітлераўская навала заліла вызваленую ад памешчыкаў і капіталістаў зямлю. Тады вось у палескіх лясах пачалася свая партызанка, на чале якой і вырас партызанскі генерал.

Цяпер ён зноў, як салдат, стаіць на варце народных спраў. Не здымаючы палатачнага плашча, ён звоніць і звоніць ва ўсе канцы сваіх «уладанняў» — то павышаючы голас да пагрозы, то зніжаючы да таварыскай гутаркі.

Вернасць партыі, савецкай уладзе выросла ў ім у непераможную сілу, замацаваную ў душы навекі. Суровасць, замкнутасць палескага жыцця пакінулі свой след на твары, на шэрых вачах, якія і цяпер глядзяць на людзей быццам з-пад рукі. Генерал — сапраўдны пурытанін. На сваім родным сяле асноўваецца яго ўласная думка, свая, калі хочаце, «тэорыя». Быць эканомным, працавітым, а значыць, гаспадарным. Гэта — зразумела. Так жылі дзяды, бацькі на Палессі — не толькі там. Так жыў дзед і бацька, пра якіх часам у дарозе ён расказвае.

Вось едзем прыгожай пескавой дарогай праз лес. На абочынах зеляное трава — паўзуп. І генерал раптам паказвае на палянку, зарослую бур'яном і маладзенькімі сасонкамі.

— Вось тут я нарадзіўся і вырас. Тут быў хутар нашай сям'і.

Глушыня лясная навокал, а потым хутка надышлі пескавыя паляны поля. Я ра́джу генералу абаспаваць тут стойлы для кароў, паляны засеяць кармавымі травамі. Ён глянуў на мяне неяк здзіўлена — як гэта пісака можа даваць такія практычныя парады?

— А я думаў засадзіць іх лесам. А цяпер пасля вашых слоў трэба, відаць, перадумаць,— адказаў генерал.

Ён усё больш і больш прывыкае да мяне і недзе ў таямніцы сваіх роздумаў пачынае па-сапраўднаму ацэньваць пісьменніцкую працу, асабліва, калі яна датычыць асабіста яго. А так — адносіны да мастацкай літаратуры былі ніякаватыя,— от, бавяцца людзі ў кніжачкі, гэта ж не так і цяжка. Сеў, навыдумляў, напісаў — і ўсё.

Вядома, так думае пра мастацкую літаратуру не адзін ён, і таму я не абвінавачваю ў гэтым партызанскага генерала, які быў мастаком у сваіх справах, што памагалі вызваленню народа. А неразуменне мастацкай літаратуры — гэта ёсць не што іншае, як спадчына непісьменнасці многіх пакаленняў нашых продкаў.

Асушка сваіх дрыгвяных і тарфяных нетраў пачынае ў яго набіраць сапраўды генеральскі размах. Ужо асушана нешта каля пяцісот гектараў, а экскаватарчыкі пястомна ўсё ідуць, усё чэрпаюць глыбінныя пласты палескай зямлі. Тут адчуваецца даўняя задума генерала, даўняя яго мара — ашчаслівіць сваіх людзей, вывесці з дзікасці свае лясныя і балотныя прасторы. Так, гэта даўняя мара генерала. І вось ён гэтую мару ажыццяўляе, ён — вялікі змагар за рэвалюцыю — робіць яе на жорсткай, нікім не бачанай практыцы. Бо практыка яго праходзіць там, дзе ніколі не магла ступіць нага чалавека — і не толькі чалавека, а нават і жывёліны. Ніхто са сваіх людзей не верыў, што можна штосьці зрабіць з непраходнымі хмызамі і кустаўём, патанулым у дрыгве.

Генерал гэта зрабіў і робіць далей. І людзі — недаверлівыя палешукі — нашы дзядзькі-земляробы прыціхлі. Маўчаць. У іх маўчанні пачынае адчувацца нібы заяўка на прабачэнне: «Мы ж так крычалі, што нічога не выйдзе з гэтай асушкі. А цяпер — бачыце?» Гэта было напісана на твары ў кожнага. Віпаватае маўчанне.

Пакінуўшы машыну пры сухой дарозе ў лесе, генерал не ходзіць па сваіх нетрах, а лазіць. У высокіх ботах, у сінім велюрным, ужо скамечаным капелюшы. І гэты неад-

менны ваенны суровы плашч. Здаецца, ён быў з ім у сонечнай Іспаніі. Відаць, што — так. Вяртаецца да машыны забраханы ў тарфяна-ржавай рудзе, засопшыся, і яшчэ больш загарэлы. У машыне ў торбе хлеб, кавалкі сала. Можна ўжо раскласці агонь і на пруціку смажыць сала на полымі. Бо сапраўды пара і абедаць.

Каналаў ужо многа. Па іх сплывае дрыгвяная вада. Куды? Ёсць такая таямніча-цудоўная рака, якая сваёй цішынай, амаль непрыкметнай плынню шэпчацца з непралазнымі лазнякамі і з самой пушчай, што соснамі і дубамі навісла над ёю. Яна завецца Лань. І цячэ яна непадалёку ад «уладанняў» генерала. Туды, у Лань, ён сваімі каналамі спускае дрыгвяную ваду, каб ціхая зялёная рэчка-рака занесла іх у шырокую чараўнічую Прыпяць.

Генерал жыве адзін — без жонкі. Яна далёка — за пушчамі, за лясамі — аж у Мінску.

Вось ён стаіць на беразе нядаўна скопчанага чарговага капала. На процілеглым баку некрануты чалавекам лес — стаіць над каналам без канца, без краю, стаіць, як век. Ніхто не падбірае сухога галля, якое ляжыць як хоча і навісае падламанае на дрэвах. Недалёчка над каналам пракінуты прымітыўны мосцік.

Генерал глядзіць туды — у лес. Стаіць, як на «смірна», нерухома. Толькі часам паляскваe дубчыкам па халяве бота. Стаіць і глядзіць, не змаргнуўшы. Няўжо ён там штосьці ўбачыў?

Залатая восень сыпле лісцем бяроз, асін і клёнаў, што пахаваліся паміж сосен. І сонечная дрэма абвалаквае павуцінnем дрэвы і кусты.

Павуцінне чапляецца і за самога генерала. А ён стаіць. А потым... потым раптам прыклаў стуленыя далоні да губ і свіснуў... свіснуў, як сыч. Свіснуў раз, другі раз. І хутка на бераг капала выйшла, як з казкі, жанчына з кошыкам на руцэ і накіравалася да мосціка.

Як толькі перайшла, адразу кінулася ў атаку на генерала:

— Калі тое было, што ты заходзіў у маю хату? Я ўжо не помню. Зусім забыўся мяне, Васілька...

Генерал усміхнуўся, павольна, стрымана аглядаў маладзіцу, не першых ужо год, ласкавымі прабачлівымі вачыма. А потым спытаўся жартам:

— Ну, яшчэ што? Усё?

А яна без затрымкі пускала ў ход сваю страляніну:

— Бо ці ж пяпраўду я кажу? Я ж цэлыя атрады тваіх

партызан карміла, даглядала і цябе самога. Я ж і цяпер сад калгасны даглядаю. А ты нават не здумаеш заглянуць на мой хутар. Дарога ж да мяне харошая, сухая. А ты ж ездзіш на машыне. Заехаў бы. Нічога б табе не сталася...

Маладзіца спрытна ляскатала. То ўсміхалася, то журылася, і вочы нібы абмацвалі генерала з галавы да ног. А ўсмешка паказвала радкі прыгожых зубоў.

— Ціха, Мар'яна, ціха, галубка,— загаварыў урэшце генерал,— вінават я перад табою. Не здарылася мне ў апошнія часы быць у тваіх краях. Пабываю, не крычы, пабываю...

— Калі? — спыталася Мар'яна.

— От, ужо і калі... Закалікала... Ну, паслязаўтра — у пядзелю.

— Ну, добра,— сказала Мар'яна і сціхла. Стала такою ціхаю, як навакольная восень. Нават на момант задумалася. Здаецца, не было ўжо пра што і гаварыць.

— Як цёпла на свеце. І такія растуць грыбы... Чаму людзі не збіраюць?

Яна адкрыла лісты папараці ў кошыку і паказала генералу свежыя, маладыя баравічкі. Генерал нагнуўся, папюхаў іх і крэкнуў.

— А... пах лясной зямлі...

— Ну, то заедзеш?

— Заеду, заеду...

— Ну, то давай сваю торбу, насыплю грыбоў.

Генерал адчыніў сваю скураную спадарожніцу, і Мар'яна дбайна, зычліва высыпала ў яе ўсе свае грыбы.

Генерал запратэставаў, чаму не пакінула сабе.

— От, не крычы, Васілька, я назбіраю больш. Толькі глядзі прыедзь.

— Прыеду, Мар'яна, прыеду... Дзякую.

СЯРОД ЧАРОТАЎ

Я іду па канале сярод чаротаў. Тарфяная вузкая сцежка ўгінаецца над маімі нагамі. Адбіткі розных слядоў так значны, што можна іх разглядаць нават без павелічальнага шкла. Сярод босых ног і ножак, надэшваў ад ботаў найбольш прыкметны адбіткі лапцей і лапцікаў, так знаёмых і тут ад вякоў прывычных. Падплёт — адзін за другім — адбіваецца па сцежцы, як кратачкі — стройнымі вузенькімі радочкамі.

Я іду сярод чаротаў. Канал свежы, пядаўна закончаны

генеральскімі экскаватарчыкамі, нават быстравата ляцe ў сваім рэчышчы прасвечаную сонцам, рудавую ваду. Яна нагадвае настой з векапомных раслін вось гэтай навакольнай зямлі, на якой яшчэ і цяпер можна адчуць дыханне сівой, шматмільённай даўнасці старыны нашай матухны-зямлі. Тут ля ног шалепчуць па далінах буйныя хвашчы, як маленькія далікатныя елачкі. Яны вядуць свой род ад ледавіковага перыяду. Тое самае трэба сказаць і пра духмяны ядловец. Ну, вядома, і пра чароты, з якіх праз многія стагоддзі стварыўся торф — залёг урадлівымі пластамі на шырокай і, як-піяк, яшчэ таямнічай палескай нізіне.

Я іду сярод чаротаў... Лёгкі ветрык плыве па асушанай даліне і сваім подыхам злёгку лашчыць чароты і мяне. Яны бясконцыя — гэтыя чароты. Трэба думаць, даходзяць яны аж да самай Прыпяці — гэтай маці неабдымных балот і лясоў. Чароты злёгку хвалююцца, а часам хіляцца ніжэй, і тады льсняцца пад сонцам шэра-шаўкавістыя блікі вострага задумнага лісця, каб потым выпрастацца зноў.

Колькі могуць ахапіць мае вочы ўдалечыню, насустрач мне ўсё плывуць у бляску сонца яны, вастралістыя чароты. Коцяцца хвалямі, пераліваюцца сонечнымі фарбамі і ў высокіх сваіх гушчах датыкаюць майго твару.

Нідзе нікога навокал. І пачынае здавацца, што наогул на свеце няма ні душы. Толькі чароты і я плывём пад сонцам. І ў сваім ільсняным пераліве чароты шэпчуць мне вялікую быль зямлі, якая пачынаецца ад тых парогаў, якія завуцца першабытнасцю. Адтуль чароты на сваіх хвалях нясуць нястомную, непазбежную, як праўда, казку вялікага тварэння.

Я іду сярод чаротаў. І, відаць, мне не хопіць дзён, каб прайсці праз іх да далёкага канца. Нідзе нікога... Я іду — і ў душы святкую нейкі нязведаны гімн прыродзе. Я люблю... люблю...

Я спыняюся і ўслухоўваюся ў перашэпты чаротаў. А яны, перашэпты, такія выразныя, вострыя і жорсткія, быццам нажавыя. Выраслі ж яны на суровай зямлі, прабіліся к сонцу з першабытных глыбінь. І цяпер расказваюць пра свой жорсткі шлях. Казка іх доўгая, бясконцая. Вокам акінуць — яны ўсё шэпчуць і шэпчуць. І здаецца, толькі я адзін заслухаўся ў іх перашэпты. Прыклаў далонь над вачыма, нібы шукаю чагосьці ці кагосьці. І там далёка мільганула пешта белае і раптам знікла. Я гляджу — мільганула зноў — і зноў знікла. Нехта ці пешта набліжаецца да мяне. Я пайшоў насустрач — не ведаю каму ці чаму.

Угінастая сцяжынка — чорная — вісцца, як змеїка, перада мною і вядзе ўсё ў больш высокія і густыя чароты. І на неїкім павароце сцяжынкі мільганула з чаротнай, зялёнаї могушчыні маладая жанчына, убраная не па-вясковаму. Можна сказаць, нават па-гарадскому. Але сціпласць убрання згладжвала вастрыню гарадскоі модпасці і рабіла ўражанне свойскай прыемнасці. Шэрая куртачка па таліі, падобная да мужчынскага пінжака, такая ж шэрая спаднічка, крыху ніжэй каленяў, і звычайныя жоўтыя туфлі на нізкіх абцасах. Белая, чысцепькая хусцінка, павязаная вузлом на патыліцу, прыадкрывала вачам цёмна-русыя валасы. Мне тут жа адчулася гармонія паміж яе хусцінкай, валасамі, шэрымі задуманымі вачыма і гэтымі навакольнымі чаротамі. Адкуль ты ідзеш і куды, загубленая ў чаротах? Пад правай рукой сціснуты ахапачак кніжак. Я ўглядаюся ў жанчыну і пачынаю квітнець душою. Адчуваю нешта харошае, шчаслівае.

— Куды ж вы? — пытаюся.

— А вось у сяло. Брала кніжкі ў тутэйшай бібліятэцы сярэдняй школы. А цяпер нясу назад.

— Ага... Вы — настаўніца?

— Настаўніца... пачатковай школы.

— Зразумела. Дык гэта, відаць, вы пратапталі гэтую чорную цудоўную сцежку праз чароты?

— Трошкі і я,— усміхнулася настаўніца.

І раптам дадала:

— Ну, а цяпер і вы...

Мы хораша засмяяліся. Чароты то закрывалі нас на сцежцы, то адкрывалі свету. А мы гутарылі, глядзелі адно другому ў вочы, быццам пазнавалі адно другога пасля доўгай разлукі.

Я пытаўся пра яе школу, пра колькасць дзяцей у ёй, пра самую вёску, пра звычаі мясцовых людзей, пра калгаспую гаспадарку і нават, як людзі тут адзяюцца і пра шмат чаго яшчэ ў жыцці палешукоў.

Яна расказвала павольна, не спяшаючыся, часам акідаючы позіркам чаротныя далі. І тады здавалася, што на момант прыціхалі чароты.

Яна пяць год працуе ўжо настаўніцай — гэтая сціплая паляшучка. Працуе тут сярод чаротаў, дзе, здаецца, пікога няма, дзе толькі шумяць першабытныя лясы і чароты. Не, тут жывуць, туляцца ў абдымках суровай прыроды людзі,— цэлыя вёскі і вёсачкі. І вось у гэтыя гушчы лясоў і чаротаў прабіўся прамень, каб асвяціць народныя глыбі-

ні. Гэта яна, у шэрай куртачцы, сціплая, ласкавая, з ахапачкам кніжак пад рукою. Яна ўжо развітваецца са мной і адыходзіць. Я доўга гляджу ёй услед, аж пакуль чароты не схавалі яе. І мне хочацца ісці далей і крыкнуць ёй наўздагон: «Мая краіна! Ці ж гэта ты, такая доўгачаканая, благаславёная?» І я спыніўся і крыкнуў. А яна чаротным рэхам зычліва адказала: «Так, гэта я... я!»

АПОВЕСЦІ

МУЖ І ЖОНКА

I

Макар Крыўда шлёпаў мокрымі лапцямі па лясной дарожцы. Лес пасля дажджу дыхаў свежасцю і тонкай цеплынёй. Абмытыя дубы, сосны і бярозы стаялі ціхія, маладжавыя. Нават буйныя кроплі вады, якія блішчалі на лісцях, не падалі з дрэў. Тонкая цеплыня плыла па зямлі разам з лёгкім туманам, які павольна атуляў гушчыню. Далёкія бомы даносіліся невядома адкуль пераліўным звонам. Тонкім і чыстым было шчабятанне птушак. Час ад часу выразна сыпаліся трэлі салаўя. Далёка ў гушчыні мерпа стукаў дзяцел.

За плячыма Макара рытмічна паскрыпвала каробка з сасновай дранкі. Апіраючыся на кій, пераходзіў ён па кладках цераз лясныя ручаіны. Лясная дарожка, як у казцы, вілася ў гушчыні і вабіла ісці і ісці.

Макару якіх сорак год. Твар даўно няголены, парос чорнай барадой. З твару глядзіць панурасць і нейкая затоеная цяжкая задумёнасць. Так назіраюць яго цёмна-шэрыя вочы. Мокрая кепка сядзела на галаве, як грыб. Ішоў Макар павольна, з такім выглядам, быццам ён нікому непатрэбны чалавек. Дахаты засталося ісці яшчэ кіламетры чатыры, але ён забыўся аб гэтым. Макар вельмі любіў лес — ён у ім вырас. Ён з закрытымі вачыма мог бы пайсці ў любое яго ўрочышча, ён адчуваў подых яго глыбіні. І цяпер, ідучы, ён часамі падымаў галаву і назіраў навакол. Яго ўвагу займаў то каржакаваты дуб пры дарозе, то

бярозавая палянка, то зязюлька, што пачала адлічваць сваё «ку-ку». Там, дзе раслі амаль выключна адны соспы, вытыркнуліся з зямлі самыя раннія грыбы — смаржкі. Макар асцярожна браў іх з сасновай ігліцы, адрэзваў ножыкам карэньчыкі і клаў у каробку. Там, дзе скрыжоўваліся дарогі, Макар прыпыніўся, закурыў, а потым зноў рушыў далей. Часамі ўздых вырываўся з яго грудзей і вылятала слова. Яно гучала дзіўна адзінока, сказанае па сакрэту аднаму лесу.

— Не, брэшаце, сабакі, такі мая праўда, наша праўда,— вымаўляў сам сабе Макар і соп носам. Лёгкім рухам локця папраўляў каробку за плячыма і шпарчэй крочыў па дарозе.

Ужо трэці дзень як Макар не быў дома. Адыходзячы, расказаў жонцы, што пойдзе за дванаццаць кіламетраў у Ражалавічы да гарбара — дагаварыцца аб вырабе кароўяй скуры. Калі прайшла чутка, што фашысты будуць браць каровы. Макар зарэзаў цялушку, каб не дасталася ворагам. А як жонка спытала, нашто ён набраў поўную каробку мяса ў дарогу, Макар буркнуў пад нос: «Прадам» — і пайшоў за парог.

— Ах ты, жонка, вось дык жопка,— прашаптаў Макар,— і што мне з ёю рабіць?

За дзень перад адыходам Макара быў у вёсцы сход адносна таго, каб плаціць падаткі і каб усе леснікі вярнуліся да працы на свае месцы.

Стараста Дзяргач — з кірпатым носам — стаяў за сталом і начальніцкім тонам гаварыў аб парадку. Голас Дзяргача грукатаў як тыя калёсы па мёрзлых каляінах. Гэтым грукатам Дзяргач страшыў сялян і ў канцы для ўмацавання свайго аўтарытэту паведаміў, што гітлераўцы ў раённым мястэчку пабудавалі тры шыбеніцы.

Пасля гэтых слоў Макар, былы ляснік, падняўся і сказаў: «Я тут не маю больш чаго слухаць. Не веру я ў гэтую вашу ўладу. Будзе савецкая ўлада, тады пойдзем кожны на сваё месца». І выйшаў з хаты. За ім, як бура, уся зачырванеўшыся, выбегла жонка.

Дома адбылася сварка. Жонка сказала: «Як цябе забяруць жандары, дык я яшчэ благаслаўлю на дарогу. Патрэбны ты мне такі. Можа пойдзеш у бандыты, што хаваюцца па лесе?»

Тут Макар не сцярпеў. Устаў на ўвесь рост, пабялеў. Сціснуў кулакі і хацеў размахнуцца, але стрымаўся, толькі скрыгануў зубамі.

— Ух ты, нягодніца!

Газнічка над камінкам асвятляла запечны куток, дзе на палку спала двое дзетак — хлопчык год сямі і дзяўчынка год пяці. Макар ступіў два крокі да печы, і позірк яго ўпаў на іх бесклапотныя тварыкі. Макар адчуў, як злосць стала паволі адлягаць ад сэрца. Сеў на лаве, закурыў і з прагавітасцю зацягнуўся дымам. У хаце было цяжкое маўчанне. І ў гэтым маўчанні муж і жонка адчулі, што між імі запала нешта такое, што зрабіла іх непрымірымымі ворагамі.

Сумеснае жыццё Макара і Алены ніколі не вызначалася згодай. Яна выросла ў багатых бацькоў, была па характару тою свавольнай пястуняй, учынкі якой часта залежалі ад капрызу. Дай ёй тое, дай другое, для яе нічога не існавала на свеце важнейшага ад яе жаданняў. Гэта не азначае, што ў Алены не было нічога сур'ёзнага, што ўсё было пабудавана на гэтых лёгкіх капрызах. У аснове яе нездавальненняў ляжала неасвядомленае пачуццё сваёй інакшасці ад іншых. Алена ўзяла сабе ў галаву, што яна дачка багатых бацькоў з культурай засцянковага толку, што ёй належыць пяршынства ў гэтым свеце. Алена свайго мужа Макара называла мужыком.

— Эх ты, мужык, што ты ведаеш?

Макар не звяртаў увагі на гэтыя яе выпады і толькі заўсёды адказваў:

— Ну, добра, будзь ты паняй, а я ўжо буду мужыком.

І на гэтым сварка канчалася.

Макар шанаваў сваю Алену, бо яна была прыгожая. Стараўся нават дагаджаць яе капрызам. Калі, напрыклад, улетку яна не хацела рана ўставаць падаіць карову, Макар ішоў даіць сам, прыносіў дроў у хату, клаў у печ, прыносіў вады. Трохі саромеўся гэтай слабасці, але што ты зробіш з бабаю? Ціха ступаючы па хаце, паглядаў на жонку, якая спала, раскінуўшы на падушцы свае цёмна-залацістыя валасы. І гэта перамагала Макара. Рухавей хадзілі яго ногі, рукі прасіліся да працы. Знікалі з памяці ўсе непрыемныя хвіліны іх сумеснага жыцця.

— ...І што мне з ёю рабіць? — спаваў далей свае думкі Макар.— Чортава шляхцянка!.. Такі шляхта шляхтай...

Дарога спускалася ў даліну і стала гразкай. Яшчэ адзін паварот управа, і праз стромкія сосны стала прасвечвацца вёска.

— Аж не хочацца ісці дахаты... Ідзеш, як у пекла. Гэта ж не жарты... Эх, каб не дзеці! — уздыхнуў Макар.

Каробка была поўная смаржкоў, і ў моманты забыцця Макара наведвала пачуццё задавальнення, амаль радасці, што вось ён прынясе дахаты грыбы, першыя свежыя грыбы, і ў хаце будзе ажыўленне. Заскачуць дзеці, будуць разглядаць смаржкі, дзяліцца з ім сваёй радасцю, завіпецца жонка каля печы, каб згатаваць смачную вячэру. Але гэтае пачуццё толькі мільганула, а потым зноў агарнуў душу нейкі цяжкі тумап.

Рашуча ўвайшоў Макар у хату. Шэры дзень набліжаўся к вечару.

Першымі сустрэлі яго дзеці — Коля і Люба.

— А што ты, татка, прынёс? А дзе ты быў так доўга? А ў нас учора было два немцы.

Пры апошніх словах Макар насцеражыўся.

— Чаго яны прыходзілі?

— Яны шукалі свіней, і мама іх частавала.

Алена сядзела каля акна і нешта шыла. Пры ўваходзе Макара толькі гляпула і зноў уткнула нос у работу. Макар скінуў каробку з плеч, паставіў на лаву і сеў. Сеў, як чужы, не могучы разабрацца ў сваіх пачуццях. Бязмэтна разглядаў хату, як бы шукаючы, на чым прыпыніць свой позірк. Часамі спадылба бліскаў вачыма на жонку. Дзеці корпаліся ў каробцы, паказвалі Макару то той, то другі грыб, але, бачачы, што бацька маўчыць, прыціхлі.

— Ну, што ж, трэба хоць разуцца,— сказаў Макар і стаў разбэрсваць аборы. Пасля пераадзеўся. Стаў пасярэдзіне хаты, адчуў прыліў бадзёрасці. Ён смела глянуў на жонку, ступіў крок бліжэй да яе і сказаў кпліва:

— Ну, што? Частавала ўчора немцаў, а цяпер пачастуй мяне. Устань, падпалі ў печы, падсмаж грыбкоў, пачастуемся разам... Можа і ліха з'ямо?

Алена адхіснулася, папраўляючы валасы, як бы хацела адагнацца ад куслівых мух. Гэты рух галавы назад з лёгкім выгібам спіны не ўхаваўся ад Макара. Гэта была Алена — тая, што зачаравала яго некалі на вечарыне, калі ён быў хлопцам удалым, з чорным чубам над правым брывом. Гэта было так даўно...

Макар дакрануўся рукою да пляча Алены. Трохі нагнуўшыся, ціха прамовіў:

— Пакінь дурыцца, Алена. Устань, прыгатуй вячэру...

Яна гляпула ва ўпор на Макара мутнымі вачыма. Кінула шыць, моўчкі ўстала, абтрасаючы спадніцу. Узняла свае вочы на Макара. Была хвіліна нейкага хістання.

— Макар, што я табе скажу? Усё будзе добра, як перастанеш валачыцца ў лес.

— Я ж табе казаў, чаго я пайшоў. Які ж тут лес, што за лес? Мы самі жывём у лесе, пікуды ад яго не дзенешся. Што ты выдумала?

— А тое выдумала, мой пане, што немцы хутка пачнуць парэзваць зямлю, і мая мама дастане столькі зямлі, колькі было да калгаса — трыццаць гектараў. І калі табе не падабаецца такое жыццё, то я пайду да мамы... Можаш ісці сабе ў лес...

— Што твая мама дастане зямлі ад гітлераўцаў, гэта можа і праўда, але тое, што і тваю маму, і цябе, і мяне потым яны знішчаць, у гэтым я таксама не сумняваюся.

— Гітлераўцы ведаюць, каго пішчыць. Вось учора заходзілі сюды, такія гаваркія, смяюцца, на адыходзе мяне ў рукі цалавалі. Такія шляхетныя, і яны мяне будуць пішчыць? Хай пішчаць тых, каго трэба...

— Эх, Алена, Алена, дурное ты гаворыш. Не ведаеш ты гітлераўцаў... У рукі цалавалі... Колькі дзяцей ляжыць на дарогах, пабітых імі, колькі людзей невінаватых.

— На тое вайна... Дзе вайна, там ёсць і забітыя. Няма дзіва...

— Ну, яшчэ пабачыш...

— Што там бачыць? Ужо ўсё відаць. Што тут больш бачыць? Учора самі казалі, што Масква забрана.

— А ты ім вер, яны табе нагавораць. Маскву пекалі і французы бралі, а што з гэтага выйшла?

— А цяпер выйдзе.

Непрыкметна скрыпнулі дзверы, і ў хату ўвайшла старая жанчына з кіем у руцэ, у чорнай суконнай хустцы, запшпілепай на шпільку пад барадою. З-пад хусткі відны былі пасівелыя валасы. Жанчына перахрысцілася па-каталіцку і прамовіла:

— Пахвалёны Езус...

— Навекі аман! — адказала Алена.

Стукаючы кіем па падлозе, жанчына не ішла, а паволна плыла на сярэдзіну хаты. Калючыя цёмныя вочы ныхліва глядзелі ўперад. На скручаным пальцы сухарлявай рукі блішчаў пярсцёнак.

Жанчына стомлена асупулася на лаву, зірнула на гаспадароў. Бліснулі два залатыя зубы.

Гэта была маці Алены. Старая ўладарным рухам галавы азірнула хату.

— Ну, аб чым гутарыце? Што — грыбкоў назбіралі?

Многа іх? Ох, даўно не ела грыбоў. Вайна — людзі баяцца хадзіць па лесе...

— А вы, мама, распрануліся б, пасядзелі,— прамовіла Алена.

— Няхай, я зараз пайду.

Падала голас, падобны да стогну, павярнула галаву да дзяцей, і твар яе злёгку зайграў усмешкай. Павабіла іх пальцам: «Хадзіце сюды».

Дзеці падышлі, і яна дала ім па адпаму коржыку, выняўшы іх з-за пазухі.

— Ох, дзеці, дзеці, пяшчаспыя небажаткі...

Ускінула позірк на Макара, які стаяў, прыхіліўшыся да печы.

— Хрысціў ты іх ці не? Ведаю, ведаю, што не хрысціў... Вось кажуць, што немцы будуць вырэзваць усіх нехрышчоных дзяцей.

Алена, шчапаючы лучыну на распал, стаяла насцярожаная. Старая казала далей:

— Зараз жа трэба шукаць ксяндза, каб вярнуў гэтых анёлкаў да бога...

— Нашто ксяндза,— сказаў Макар.— Ксяндза чорт яго ведае дзе шукаць, а поп, калі хочаш, не так далёка.

— Да ксяндза лепш, трывалей,— цягнула старая.

— Да ксяндза харашэй,— падхапіла Алена.

— Адзін чорт, што поп, што ксёндз,— буркнуў Макар.

— Ты праваслаўны, за сваё цягнеш, а я хачу да ксяндза. У нашым родзе толькі мой прадзед быў праваслаўны, а то ўсе католікі. Дзякуй богу, жыццё пражылі і бога хвалілі... Не толькі да Вільні, да маткі боскай вастрабрамскай хадзілі, але нават і да Чанстахова.

— Ну што ж, шукайце, шукайце,— паціснуўшы плячыма, сказаў Макар.

— Шукайце,— працягнула, сурова павысіўшы тон, старая.— А ты што — не хочаш? Думаеш, бальшавікі вярнуцца? Не, ужо ім тут не бываць...

— Я нікога шукаць не пайду і дзецям сваім не дам загінуць.

— А дзе ж ты іх дзенеш?

— Алена вось кажа, што гітлераўцы яе нішчыць не будуць, а тут, бачыш, з дзяцей хочуць пачынаць.

— Толькі нехрышчоных, толькі нехрышчопых,— забубніла старая.

Алена бліснула вачыма на Макара і на момант не ведала, што адказаць, а потым знайшлася:

— Як немцы прыйдуць, яны мяне і да ксяндза завядуць.

— Усяк можа быць, дачка, на гэта спадзявацца не трэба... Як сам не патурбуешся... кхе, кхе, кхе,— закашлялася старая,— то нічога не вы́йдзе... кхе, кхе, кхе...

Гляпула ў акно.

— Ну, ужо цямнее, пайду.

— Пачакай, мама, перапачуеш, я грыбоў падсмажу.

Старая павольна пакрочыла да парога і на хаду сказала:

— Прынясеш мне місачку, як будуць гатовы. Наш Ёзік лянуецца схадзіць. Бывайце.

І не аглянуўшыся, з лёгкім шорахам пераступіла за парог.

II

Сонца ўзыходзіла ў раннім тумане. Яно было яшчэ недзе за лесам.

Туман застыў у ляснoй гушчыні і глушыў раннія гукі.

Алена ўстала рана, кінулася паліць у печы — спяшалася ісці ў поле акучваць бульбу. Дровы палалі ўжо на ўсю печ. Алена збіралася пячы аладкі. Была маўклівая, заклапочаная.

Макар абуваўся за печчу. Учора ён позна прыйшоў дахаты — па загаду старасты разам з іншымі сялянамі хадзіў аж на Прыпяць віць вязь з лазы для звязвання плытоў. Гітлераўцы хацелі ўзяцца за плытагонства. Кожны дзень цэлыя грамады сялян з ежай за плячыма паныла брылі па дарозе.

Макар, абуўшыся, устаў, пацягнуўся. Косці балелі, і ногі не адпачылі за кароткую ноч.

За акном прамільгнулі дзве постаці. Макар кінуўся да акна. Угледзеў толькі спіны ў шынялях. Людзі былі ўзброены вінтоўкамі. Алена нічога не заўважыла, а Макар маўчаў. У хату ўвайшлі двое ваенных, апранутых у савецкія шынялі. На галовах былі кепкі. Прывіталіся. Адзін міг сустрэчы вачыма з Макарам, і Макар перасцярожліва кіўнуў галавою ў бок жонкі. Па запрашэнню хлопцы селі. Алена толькі раз коратка паглядзела на іх і занялася сваёй працай. Хлопцы адчувалі сябе ніякавата, сталі закурваць і гаварыць пра свежы рапак, пра буйную расу, у якой яны прамоклі.

— Куды ж вас бог нясе? — ціхім тонам гаспадара спытаўся Макар.

— Прайшлі ўжо чатыры хаты і вось дасталі толькі каваласк хлеба. Ідзём з акружэння.— Хлопцы апусцілі галовы і зацягнуліся дымам.

— То пасядзіце крыху, зараз паснедаеце,— сказаў Макар.

Алена глянула скоса і пахмурылася, але нічога не сказала. У руках яе пачала выяўляцца нервовасць — замест качаргі возьме вілкі або, наадварот, са злосцю кідае гэтыя прылады ў качарэжнік. Макар адчуў, што атмасфера можа згусціцца.

— Можа табе памагчы ў чым-небудзь? — спытаў ён у Алены.

Алена працадзіла праз зубы:

— Не трэба...

— Ну, як не трэба дык не трэба...

— Што ж гэта вы, гаспадынька, не хочаце, каб вам муж дапамагаў? — сказаў адзін з хлопцаў узнята, вясёла, каб толькі распачаць размову.— Цяпер трэба дапамагаць адзін аднаму, цяжкія часы,— дакончыў ён больш сур'ёзна.

— Мы ў гэтым не вінаваты, што цяжкія часы,— адказала Алена.

— Вінаваты не вінаваты, а дапамагаць трэба...

Хлопец хацеў яшчэ нешта сказаць, але стрымаўся. Макар, умыўшыся, выйшаў на двор разведаць, што дзе робіцца ў вёсцы, і хутка вярнуўся ў хату.

Алена ўжо скончыла паліць у печы. Узяла ў торбу некалькі аладак, бутэльку малака і, апрануўшы каптан, моўчкі выйшла з хаты. Макар сачыў за ёю і крыкнуў услед: «Алена, куды ты? Паснедала б!» Але ў адказ толькі абразнулі дзверы. Макар і хлопцы перагляпуліся між сабою. Макар выскачыў на двор і, зараз жа вярнуўшыся, сказаў:

— Накіравалася да маці. Ну, паснедаем. У вёсцы ціха, сёння круціць лазу не пойдзем. Яе маці — ого! — гэта, браткі, д'ябал у чалавечай скуры.

— Нам тут усё ж такі доўга затрымлівацца не трэба. Паядзім і — гайда. Ад тваіго прыходу, Макар, да сягоння ня шпяга дня жывіліся тым мясам, што ты прынёс. Дзякуем, брат. Атрад наш расце. Трэба, каб ты, Макар, дапамог нам у адной справе, за чым мы, уласна, і прыйшлі,— сказаў старэйшы, з чорнымі сур'ёзнымі вачыма.— Мы ідзём у разведку. Ты нам дапаможаш?



На сустрэчы з членамі літаб'яднання

раённай газеты «Слава працы».

Капыль, 1965 г.



У дні работы V з'езда пісьменнікаў СССР.

Злева направа: Іван Шамякін,

Пілін Пестрак, Андрэй Макаёнак.

Масква, 1971 г.

— Дапамагу, чаму не.

— Дык вось. Колькі немцаў тут ля вас, колькі палі-цыі — пажадана ведаць, з якіх яны вёсак і нават іх прозвішчы. Можа мы з іх каго... ведаеш... падчэпім, разумееш? Як настроены стараста?.. Ваш — поскудзь?

— Паскуда, хоць дурны, як сала без хлеба...

— Нічога, мы яго пастрашым...

— Вось што мне з жонкай рабіць, браткі? Люты вораг — і годзе...

— Жонка ў цябе прыгожая... Нічога, Макар, мы яе прыцішым.

— Ой, цяжка... Гэта будзе вельмі цяжка...

— Прыйшоў да нас адзін доктар ваенны, уцёк з-пад канвою, хварэе небарак, і няма чым дапамагчы... Трэба пашукаць які літар малака.

— Малако знайду... і яшчэ што-небудзь. А што яму баліць?

— Агульная слабасць, жывот і незагоеная рана на назе... Ну, сядзець няма чаго, паелі і ў дарогу.

Макар пайшоў у камору і цераз хвілін пяць прынёс у торбе два сыры, кусок масла, кусок сала і наліў малака.

— Але як вы гэта будзеце несці па вуліцы?

— Давай мяшок...

— Вы для адводу вачэй прайдзіце яшчэ некалькі хат, папрасіце таго-сяго... хоць, трэба сказаць, многія далі б, але баяцца...

— Абавязкова пройдзем. Вядома, так не можна... А з жопкай тваёй мы пагаворым. Мы яшчэ можа зойдзем да цябе начаваць.

— Толькі будзьце асцярожныя,— сказаў ім на развітанне Макар.

* * *

Ціхая ноч панавала над лясной вёскай, калі ўзброеныя хлопцы вярталіся да Макара. Над лесам выплыў месяц і асвятліў травы на прыдарожных сенажацях, жыта, паніклае над цяжарам расы, і дзікія грушы, раскіданыя тамсям на полі. Цішыню парушала толькі несціханае страката-пне палявых конікаў.

У праменнях месяца бліскацелі рулі вінтовак за плячыма. Нідзе нікога. Суправаджалі хлопцаў толькі іхнія ўласныя цені. Сярод прытуленых да сцяны вяргінь гляджзяць сопныя вокны хаты Макара. Рыпнулі веснічкі, і гэты скрып пранёсся рэхам па ўсёй вёсцы. Ціхі, умоўлены стук

у акно, пасля чаго з акна паказалася кудлатая галава Макара.

— Уваходзьце,— прамовіў ён, адчыніўшы дзверы.

Пасярэдзіне хаты, на падлозе, белымі палотпамі ляжала святло месяца.

— Сядзьце, а я завешу вокны,— сказаў Макар,— запалім лямпу.

Засвяціўшы лямпу, ён стаў разглядаць хлопцаў.

— Дзе ж ваш мяшок?

— Мяшок? Ужо, брат, дома, на месцы...

— Ага... Ну, хіба так. Бачыце, я адзін у хаце. Жонка забрала дзяцей і пайшла да маці. Не хацеў я з ёй спрачацца...

— Так, брат,— сказаў старшы,— цяпер толькі я пачынаю разумець, як табе цяжка. Я думаў, што гэта так сабе... А тут — не, справа больш сур'ёзпая...

— І ведаеце, што я надумаў, таварыш Кудрэвіч, яна пайшла да маці, а я пайду з вамі... Няхай скончыцца гэтае ліха.

Кудрэвіч закінуў нагу на нагу і прыпёрся да сцяны спіною, хвіліну памаўчаў.

— Ведаеш, Макар, пайсці з намі — гэта лёгка... Узяў і пайшоў. Трохі зарана. Ты нам патрэбен тут, пакуль табе яшчэ можна тут сяк-так жыць... А дзеці як — пакінеш ёй?..

— Дзеці... Гэта, таварыш Кудрэвіч, самае цяжкае. Ламаю галаву і не знаходжу выхаду. Можна было б ёй пакінуць, яна ж маці, але гітлераўцы ўсё роўна знішчаць. Дурная баба, ніяк сабе гэтага не можа ўцяміць.

— Пагутарым з ёй другім разам... Не супярэч ёй, хай гаворыць што хоча, а ты ўнікай спрэчак... А цяпер трэба падумаць аб начлезе. Нас, здаецца, ніхто не бачыў?

Макар палажыў на стол паўбохана хлеба, паставіў міску з халоднай бульбай, прынёс з сенцаў збанок кіслага малака.

— Вячэра няважная... Нягодніца... замкнула камору і ключ забрала з сабою.

— Нічога, абы быў хлеб.

— Ведаеце, я вас палажу ў хляве, на вышках, на сене. І вам трэба выйсці перад світаннем... Бо можа быць усяк... Я вас збуджу.

...Не спіцца Макару. Перавернецца з боку на бок і часам застогне. Паадвешваў вокны, каб відзён быў усякі рух на дварэ. Думкі гоняць адна другую. І ў цэлай чарадзе думак відзён адзін малюнак — ён урываецца ўладарна і

хоча засланіць сабою ўсё. Перад адыходам жонкі да сваёй маці яго абхапілі дзеці, зазіраючы ў вочы, як галубкі: «Тата, а ты пойдзеш з намі да бабуні?» — і тузаюць яго, і цягнуць за парог дзіцячыя рукі. Ах, ах... Вось яны стаяць перад вачыма — то са смехам, то з папрокам — чаму ж тата не ідзе з імі? Хата стала незвычайна ціхай і пустою — не чуваць дзіцячага дыхання. Толькі месяц асвятляе хату сваімі праменнямі і робіць яе дзіўна чужою і нават страшнаю. Выразна чуваць кожны рух на дварэ: ці то прабяжыць кошка, ці трэск раздасца ў лесе. «Вось што нарабіў вораг»,— заключае ў думках Макар.

Не адзін Макар не спаў у тую ноч. Далёка за агародамі, на адселлі, напалавіну схаваная ў яблыневым садку, стаіць пастарэўшая шляхецкая сяліба, пакрытая ўжо амшэлым гонтам, з пахіленым ганкам. Там не спяць Алена і яе маці.

— І ты добра бачыла іх? — пытае маці.

— Вядома. Завесілі вокны і вячэралі. Перадпечнае акно не было добра завешана — я і ўбачыла. Гаварылі нешта пра мяне, але я не разабралася.

— Нягоднік Макар, нягоднік,— з нейкай уедлівасцю і прыціскам паўтарала старая,— гэта ж ганьба, мой пане, знюхацца з гэтымі бандытамі... Не, так няможна. Ідзі зараз, падскоч да Вайнацкага, хай сядзе на каня і пад'едзе да каменданта. Да Дзергача не хадзі, гэты зараз шуму наробіць. Мы яму пакажам партызанаў!

Алена доўга маўчала. Задумалася. А потым энергічна схапілася з ложка, на якім сядзела, і сказала: «Пайду!» І пайшла. Старая спачатку прыслухалася да яе крокаў, а потым пачала класці крыжы і шаптаць малітву...

На зямлі паплылі лёгкія туманы — набліжаўся досвітак. Макар паспяшыў збудзіць Кудрэвіча і яго таварыша, паказаў ім дарогу праз агароды і вярнуўся ў хату. Калі сон не браў яго праз усю ноч, то цяпер, на світанні, падкошваліся погі і галава хілілася да пасцелі. Макар лёг і ў тую ж хвіліну заснуў як забіты.

...Чаму так поўна радасці ў грудзях, аж дыханне сціскае?.. Шырокая сенажаць у лесе, і каса свішча па траве ў магутных руках Макара. Так многа ласкавага, раскошнага сонца! Зелень лесу цягнецца ў блакіт. Агляну́ся — бачыць: ходзяць па сенажаці яго дзеці — Коля і Люба. І як яны тут з'явіліся? Дзеці ідуць у траву, ірвуць кветкі. То знікнуць у траве, то зноў пакажуцца. Трава цягне за сабою дзяцей усё далей і далей. І быў момант, калі Макар

страціў іх з сваіх вачэй. Кінуў касу, схапіў па дарозе дубец і пабег да дзяцей. Аж бачыць, каля іх маленькіх ножак віецца яна — бліскучая ад сонца змяя. Ах ты! Кінуўся Макар бегчы яшчэ шпарчэй. І скуль узяліся сілы? Змяя падняла галаву, рыхтавалася да скоку на дзяцей. Свіст дубца разрэзаў паветра — хвост змяі адляцеў убок і звіўся ў колца. Як жа шуміць кроў у вушах, стукае малаткамі ў скронях...

Дай аддыхаюся... І што ж гэта стукае так моцна?

Макар лыпнуў вачыма і скочыў на ногі. Вокны бразгалі — пехта стукаў з усёй моцы.

— Гэта вы, Коля, Люба? Гэта ты, Алена? Зараз адчыню. Пачакайце... Зараз... Зараз! — і скочыў у сені. Значыць, гэта быў толькі сон... толькі сон...

Макар паспешна адчыніў дзверы і ад неспадзеўкі ажно падаўся назад: перад ім стаяла восем чалавек, узброеных вінтоўкамі.

— Хто вы?

Пярэдні адказаў:

— Мы — паліцыя!

— Вы паліцыя? Чаго? Што вам трэба?

— Пакажы, дзе ў цябе спяць партызаны.

— У мяне няма ніякіх партызан. Ідзіце шукайце дзе хочаце.

— А дзе яны дзеліся?

— Ды іх і не было.

— Зараз пашукаем,— сказаў пярэдні і звярнуўся да паліцаяў: — Трое ў хляве, трое ў гумно, а мы двое зойдзем у хату.

Вобыск не даў ніякіх выпікаў. Паліцаі, сабраўшыся ў хату, дакладвалі старшаму, што ўсюды шукалі і нідзе нікога не знайшлі...

— Значыць, яны хутчэй паспяшылі за нас,— сказаў старшы ў шапцы, насунутай на правае вуха, і з чырвоным рубцом праз усю правую шчаку. Хоць лавы ў хаце Макара былі нічым не занятыя, старшы чамусьці сеў на стол, паставіўшы вінтоўку між ног. З вышыні стала, курачы цыгарку і пстрыкаючы слінаю па падлогу, ён звярнуўся да Макара, які сядзеў на ложку:

— Як яны даўно пайшлі ад цябе? Куды, у якім напрамку?

Макар паціснуў плячыма.

— Дзіўнае ваша пытанне. Вы так пэўныя, што ў мяне пехта быў. А я вам скажу, што ў мяне нікога не было.

Я ўчора толькі што прыйшоў з Прыпяці, хадзіў лазу віць на плыты па загаду старасты. І як толькі прыйшоў, лёг спаць. Вось і ўсё.

Старшы падмігнуў паліцаям:

— Чуеце, як брэша?

— Я не сабака, каб брахаць... А вось што ты на стол залез, дык гэта не па-чалавечы. Ці табе месца не хапае на лаве?

Старшы стукнуў прыкладам у падлогу.

— Цыц ты, морда! Я зараз табе ўсе вокны выб'ю, і ты мне нічога не зробіш. Каму дапамагаеш?

— Ну што ж, як маеш права, бі... Няхай табе не здаецца, што я там які-небудзь, я просты чалавек, як і ўсе.

— Ча-ла-ве-ек,— працягнуў старшы паліцай, і чырвоны рубец на шчацэ ажно наліўся крывёю. Усе паліцаі сядзелі на лаве ў адзін рад і курылі. У іх вачах і на тварах было многа халопскага шалапайства, дзікай тупасці. Яны смехам падтрымоўвалі словы свайго начальніка. Іхні смех гаварыў: «Нам усё роўна, ці зламаць палку, ці забіць чалавека. Чалавека забіць больш выгодна, бо пасля яго нешта дастанецца нам».

Старшы саскочыў са стала.

— Ну, няма чаго тарабарыць, збірайся, пойдзеш з намі ў камендатуру!

— Нікуды я не пайду. Я не магу пакінуць хаты адной. Жонка з дзецьмі пайшла да маці. І больш няма нікога.

— Збірайся, табе кажуць! — нахмурыўшы бровы, крыкнуў старшы, і рубец на яго шчацэ стаў яшчэ чырванейшым.— Хочаш зарабіць па рэбрах?

Усе паліцаі з шумам усталі з лавы.

— Апранайся, апранайся, дзядзька,— падгуквалі яны. Адзін з іх зняў са сцяны куртку і тыцкаў Макару ў рукі, другі тыцкаў шапку.

Маршчына паміж брывамі стала ў Макара глыбейшай. У вачах застыла цяжкая нянавісць. Больш не прамовіў ён ні слова. Апрануўшыся, пайшоў наперад. Апошні паліцай пры выхадзе на хаду закінуў руку на паліцу і схапіў два курыныя яйкі, сунуў іх сабе ў кішэню.

III

Алена вярнулася з дзецьмі ў сваю хату. Крыху скрывілася, убачыўшы на падлозе многа накіданых акуркаў і расцёртых пляўкоў. Кінулася замятаць. З аднаго боку, яна

адчула пэўную палёгку, што пазбылася Макара, а з другога боку, сумленне скрэбла над сэрцам. Што скажуць люд-дзі? І ўжо ідучы даіць карову, яна адкінула апошнюю раз-вагу: «Ой, а што ж тут за людзі? Якія гэта людзі? Паду-маеш... Я жыла без іх, пражыву і далей».

А людзі сям-там стаялі на вуліцы. Яны ўсе бачылі, як паліцаі павялі Макара,— хто праз акно сваёй хаты, хто з-за плота свайго падворка. А потым, калі Макар і паліцаі былі ўжо ў канцы вёскі, усе, як па загаду, вышлі на вулі-цу і пачалі глядзець услед адыходзячым.

Ніхто дакладна не ведаў, за што ўзялі Макара. Адны казалі, за тое, што зарэзаў цялушку, другія, што па сходзе выступіў супроць фашыстаў.

Ад адной грамадкі людзей адышла старая Кацярына. У яе два сыны ў Чырвонай Арміі, і яна не ведае аб іх лё-се, а два малодшыя сыны дома. Кацярына слухае і маў-чыць. Яна трывожыцца за сваіх сыноў. Яна ідзе павольна па вуліцы, скрыжаваўшы рукі на грудзях, з насцярожа-ным тварам. Яе босыя ногі мерна адлічваюць крокі, і зда-ецца, з кожным крокам у галаве Кацярыны мацнее нейкая думка.

Кацярына павярнула на падворак Макара. Заглянула ў акно. Дзеці забаўляліся, седзячы на падлозе. Алены не было. Кацярына хацела ўжо вярнуцца, але з хлява якраз выйшла Алена.

— А я думала, ці дома ты, бо чула, што ты пайшла да маці, і глянула ў акно, думаю, можа прыйшла.

— Заходзьце ў хату,— запрасіла Алена.

Кацярына зайшла і, прысеўшы на лаве, стала пытацца, ці няма ў Алены ліпавага цвету, бо яе сын Ігнат хадзіў на Прыпяць, начаваў там і такога дастаў кашлю, што ды-хаць не дае. Алена адказала, што было трохі цвету, але забрала яго маці. Кацярына вяла гутарку, углядаючыся ў Алену, хацела адгадаць, чаму ж Алена не плача, не скар-дзіцца, не просіць рады — што рабіць. Бачачы, што Алена не пачынае гутаркі пра арышт Макара, запыталася:

— І куды гэта пайшоў твой Макар з паліцыяй? Можа, па якой справе?

— А чорт яго ведае! Ці я яго пільную?

Кацярына прамаўчала, а потым прамовіла:

— Ой, Аленка, добрага чаго не можна чакаць ад гэта-га. Можа табе трэ было б пайсці да каменданта даведац-ца? А ўзяў ёп з сабою што есці?

— Чорт яго ведае, узяў ці не, мяне не было дома.

— Пайшла б па сялу з папераю, можа людзі падпісалі б за Макара, калі яго ўзялі па якому падазрэнню. Чалавек ён быў добры.

— Нікуды я не пайду.

— Як хочаш, гэта твая справа. А што, калі прыйдуць і цябе забяруць — ты ж яго жонка... Цяпер, чуваць, так гітлеры робяць.

— Мяне забяруць?! За што? — крыкнула Алена.— Можа я за калгасы каго ўгаварвала ці сама хацела іх? Ці што іншае?

Яна падпальвала ў печы. Шчокі яе расчырванеліся. Адвярнулася, стоячы ля лавы, і стала цадзіць малако. Крышыла буракі, налівала гаршкі вадою. Усё рабіла са злымі вачыма. Маўчала. Кацярына, пабачыўшы, што Алена не хоча гутарыць, устала і, уздыхнуўшы, выйшла.

Мінула гадзіна часу пасля адыходу Кацярыны, як па падворку Макара затарахцелі калёсы. Алена глянула ў акно і трывожна сказала сама сабе: «Ой, Стась прыехаў... І чаго?» Замітусілася па хаце, стала ў замяшанні змятаць лавы, сям-там прыбіраць.

Стась прывязаў каня да плота, падкінуў яму травы і з пугай і торбачкай увайшоў у хату.

— Добры дзень, сястра! — прамовіў ён, скідаючы шапку і стаўляючы пугу ў куток.

— Добры дзень, браток! — адказала Алена, крыху качырванеўшыся.— Даўно, даўно не быў у нас. Сядай. А каня не адпрог? Чаму?

Алена гаварыла хутка, слова за словам, як бы старалася нешта загаварыць у сабе. Стась, не спяшаючыся, выйшаў на сярэдзіну хаты і стаў вітацца з дзецьмі.

— Ну, бахуры, як маецеся?

Падняў хлопца, узяў на адну руку, пасля дзяўчыну на другую.

— Ну, што — паедзем да нас? Падраслі, бахуры, падраслі...— І ўсмешкаі расплываўся яго вялікі, ужо маршчыністы твар з жоўтымі вусамі.

— Але ты запыліўся, Стась,— прамовіла Алена і стала абтрасаць шэры, моцна паношаны касцюм Стася.

Выпусціўшы з рук дзяцей, у якіх цікавасцю гарэлі вочы, Стась працягнуў ім торбачку:

— Вось вам гасцінец — гэта зайчык мне даў на дарозе і казаў аддаць вам...

Дзеці засмяяліся, заскакалі, ім хацелася верыць, што

гэты гасцінец ад зайчыка. Стась асцярожна сеў на лаву і абапёрся локцем на стол. Твар яго зрабіўся паважным, сур'ёзным, цень заклапочанасці лёг паміж зморшчак. З другога канца стала села Алена. Дзядзька Стась выняў з кішэні капшук з табакай, стаў круціць цыгарку з газетнай паперы, спытаў:

— А дзе Макар?

Алена толькі і чакала гэтага пытання.

— Аж не ведаю, што адказаць табе, Стась...

— Чаму?

— Будзеш... сварыцца...

— Гм... А можа і не буду? Скуль ты ведаеш?

Алена з хістаннем адказала:

— Макар у камендатуры... арыштаваны.

Стась адказаў рэзкім тонам:

— Макар арыштаваны, а ты сядзіш дома і нічога не робіш, каб ратаваць чалавека!

Алена адвярнулася, апусціла вочы. На яе твары адбілася ўнутраная барацьба.

— Я... ведала, Стась, што ты гэта скажаш. Ты ў нас старэйшы і... можа, найлепшы. Ты многа зрабіў мне добрага, але я асуджала цябе і асуджаю за тое, што ты не пайшоў з намі па адной дарозе. Маці кляне цябе і цяпер, і ты, быў час, проста выракся нас. Але і тады не забываўся на мяне. Дзякую табе за гэта. Але ж...

— Што але ж? — напружана спытаўся Стась.— Калі я не пайшоў з вамі, дык пайшоў з людзьмі. Людзі мяне шанавалі так, як я іх шанаваў. Як я магу жыць без людзей? Быць ворагам для ўсіх? Якое ж гэта жыццё? І вось я зрокся бацькаўскай зямлі, зрокся вас і пайшоў у калгас у чужую вёску. Старшыня сельсавета, Іван Пятровіч, камуніст, толькі пагаварыў са мною тады і зразумеў мяне — даў мне хату, агарод, карову... Дай божа яму сілы і здароўя, дзе ён цяпер ёсць. Разумны быў чалавек. Вы мне нават каровы з сабою ўзяць не далі. Вы думалі перамагчы ўсю грамаду, увесь калгас. І што здабылі? Адну людскую зняважу і нянавісць... Толькі прыспешылі смерць бацькі сваёй упартасцю...

Стась змоўк і перавёў дух. Алена сядзела, падпёршы шчаку кулаком. І глядзела блукаючым позіркам на хату.

— Дык вось як,— прадаўжаў Стась.— А за што Макар арыштаваны?

Стась толькі хацеў ударыць крэсівам па крэмені, але

спыніўся ў чаканні адказу, спадылба ўпёршы вочы ў Алену. Алена маўчала, апусціўшы вочы, і слёзы адна за другою паплылі па яе шчоках. Стась выкрасаў агонь, прыкурыў і прамовіў:

— Ну, добра, не буду цябе мучыць распытваннем. Я сам ужо ведаю, за што Макар арыштаваны, дзеля чаго і заехаў да цябе.

Пры апошніх словах Алена бліснула вачыма на Стася, паспешна выціраючы слёзы канцамі хусткі.

— А скуль ты ведаеш? — спытала здзіўлена.

— Ведаю,— прадаўжаў Стась.

Алена паглядала то на Стася, то на свае рукі. Дзеці сталі прасіцца на вуліцу — яна іх адпусціла. Вярнулася ў хату з тварам больш лагодным. Сеўшы, сказала:

— Ведаеш, Стась, усё гэта маці... навяла заявіць у камендатуру, што ў нас начавалі два партызаны.

— Хто хадзіў заяўляць? Ты?

— Не, Вайнацкі...

— Вайнацкі? Гэты злодзей, прахвост, ашуканец... Ён жа ў нас калісьці мёд выбраў з вулля — вунь там, за бродам, на сасне. Яму век было мала, давіўся, абкрадаў чужога і свайго. І што ён мае? Што нажыў? Цьфу! Цьфу! Гадасць, а не чалавек. Цяпер, бачыце, ён ужо даверaны ў паліцыі... Чаму яго халера не задушыла малога?

— Ты так ганьбіш Вайнацкага, як быццам забыўся, што наша маці і яго бацька сястра і брат. Мы з ім стрыечныя.

— Дурная ты, Алена. Пры чым тут сват, брат? Той табе будзе сапраўдны сват, хто чалавек. А гэта? Цьфу! Ён і цябе і мяне, каго хочаш прадасць за гнілую рыбу. Ён не паглядзіць, што ты сястра...

Алена сядзела, апусціўшы галаву, і маўчала, але відно было, што яна да канца не згаджалася са словамі Стася. Стась гэта ведаў і адчуваў, бо барабаніў пальцамі па стале, дапытліва паглядаючы на Алену. Яго добры твар быў устрывожаны. Прадметам трывогі была Алена. Ён любіў яе не толькі як сястру, але і за тыя паводзіны ў мінулым, калі яна ішла разам з усімі, не маючы ў характары сваім ні зняважі, ні пустой ганарыстасці. У такія часы яна многа смяялася, цягнула Макара на вечарыны, танцавала. У такія хвіліны Стась, калі прыязджаў да іх у госці, цешыўся, што з сям'і не ён адзін «адшчапенец», але вось і сястра як быццам ідзе разам з ім. Усё гэта прабегла цяпер перад ім у думках.

Стась глянуў у акно на капя. Размова, здаецца, была скончана. Стась устаў.

— Пайду падкіну каню травы,— сказаў ён.

— Выбач, Стась, загаварыліся так, што я цябе і не частую нічым.— Схапіўшыся з месца, Алена пайшла ў каморy.

— Пачаставаць яшчэ паспееш,— адказаў Стась, выходзячы з Аленаю на падворак. Калі ён вярнуўся ў хату, то на стале стаяла талерка з нарэзанай вяндлінай і чацвярцушка свойскай чырвонай гарэлкі. Алена капалася ля печы, адкуль пахла бурачным баршчом. Стась вымыў рукі і твар, Алена падпесла яму чысты кужэльны ручнік. Уцершыся, Стась нават паглядзеў на вышыўкі ручніка. Усмешка прабегла пад вусамі.

— Ты ўсё і далей вышываеш? — запытаў ён.

— От, сяды-тады. Не ў галаве цяпер гэта,— адказала Алена.— Сядай, Стась. Ужо ўсе людзі абедаюць.

Хацела пры гэтым расказаць, што паліцаі забралі амаль усё сала пры вобыску ў каморы, але... стрымалася.

«А мо гэта Макар аддаў партызанам?» — падумала, і ёй стала лягчэй.

Сонца было на поўдні і ліло праз вокны палосы праменняў, ад якіх у хаце было светла. Стась і Алена абедалі, ведучы абыякавую гутарку, не кранаючы якой-небудзь вострай тэмы. І здавалася, што прыціхлі ўсе болі не толькі ў хаце, але і ўсюды. Аднак думка Стася ўвесь час працавала над тым, як вызваліць Макара з паліцыі.

Скончыўся абед. Выціраючы вусны ручніком, Стась прамовіў:

— Ведаеш што, Алена?

— Што?

— Бяры майго каня і едзь у паліцыю...

— Чаго? — спытала Алена, прыпыніўшыся збіраць посуду са стала.

— Як чаго? Прасі, каб выпусцілі Макара.

— Як гэта яны могуць Макара выпусціць? Ён жа партызан пускаў начаваць да сябе.

— А хто гэта бачыў? Паліцыя бачыла?

— Хтосьці, мусіць, бачыў, калі забралі...

— Хтосьці — гэта не закон! — у крыху павышаным тоне адказаў Стась.— Бяры каня і едзь, а я тут пачакаю з дзецьмі. Пяць кіламетраў — гэта не далеч... Раз, два і будзеш там.

Алена стала ў перашучасці, памаўчала, апусціўшы во-

чы. Неспакоі, пакутлівая первовасць, якія пакінулі яе на час абеду, зноў выплылі на твар чырвонымі плямамі.

— Не, не паеду я, Стась.

— Што? Хочаш, каб чалавека там забілі? Што ён табе крыўднага зрабіў? Апрача пашаны, ты ад яго больш нічога не мела. Ён жа твой муж. Дзетак прыжылі разам. Хочаш дзяцей пазбавіць бацькі? Ты ведаеш, які ты зробіш праступак, калі не паедзеш? Бяры каня і едзь. Яшчэ да вечара справішся... Паслухай мяне, лепш будзе.

Алена мыла пасуду перад акном, і твар яе то чырванеў, то бялеў. Што сказаў бы Стась, каб ведаў, што яна сама, Алена, хадзіла прасіць Вайпацкага паклікаць паліцыю? Гэтая думка холадам прабягала па душы Алены. Абярнулася да Стася і сказала:

— Ну, што з таго, як я яго, скажам, прывязу? Усё роўна будзе валачыцца да партызан у лес.

— Гэта нічога не азначае. Чалавека забрала паліцыя, і ты, яго жонка, нічога не робіш, каб выратаваць яго? Гэта ж не па-людску. Што ён, забіў каго? Украў што ў каго, ці што? Бяры каня і едзь. Кажу табе проста, Алена,— адной цябе я не зрокся ў нашай сям'і і Макара вельмі шаную. Я радаваўся, што ў цябе такі чалавек. Калі не паедзеш выратоўваць Макара і ён там загіне, то, як мне ні цяжка, ніколі мая нага не ступіць на твой парог. Хто ведае, што будзе з намі ўсімі, дык трэба трымацца разам, а не губіць адзін аднаго.

Стась сеў і змоўк. Доўга маўчалі абое. Стась, падпёршы шчаку рукою, думаў пра тое, як цяжка склалася іх жыццё. У хаце стала напружана ціха, толькі адна муха недзе бзыкала ў акне. Доўга сядзеў так Стась. Па твары яго час ад часу прабягалі цені.

Алена памыла пасуду, засланіла печ, падмяла хату, схадзіла па нешта ў сені. Вярнуўшыся, паглядзела навокал, як бы шукала сабе якой-небудзь работы, абы-чым заняцца. Пазбягала сустракацца позіркам з Стасем.

Стась непрыкметна для самога сябе цяжка ўздыхнуў. Алена глянула на яго, заўважыла, што ён неяк асунуўся, пастарэў. І зноў непакой апанаваў яе душу.

Стась скруціў папяросу, выкрасаў агню, прыкурыў. Прыемны пах паленай губкі разышоўся на хаце. Алена села воддаль на лаве.

Стась ціха падняўся з месца. Цяжка ступаючы, прайшоў пару крокаў, зняў шапку з цвіка. Павольна, не спяшаючыся, надзеў на галаву, паправіў яе то спераду, то з

патыліцы. Падабраў валасы за вушы і павольна, крыху згорблены, накіраваўся да парога. Стаў шукаць пугу ў качарэжніку.

Тады толькі Алена зразумела, што Стась сапраўды хоча ад'язджаць. Вось яна хацела нешта вымавіць, але змоўчала. Сэрца яе стукацела моцна. Калі Стась знайшоў пугу, павярнуўся і хацеў штосьці сказаць, у Алены вылецела слова «Стась».

— Што? — гледзячы спадылба, прамовіў Стась.

— Ты што, ужо хочаш ехаць?

— А што ж? Пара... Пакуль заеду...

— Пачакай трохі...

Алена схапілася з месца, невядома чаго глянула ў акно. Выпрасталася, паправіла хустку на галаве.

— Знаеш, Стась, я пабягу, параюся з маці.

— Гэта дарэмна, сястра, нават і не думай.

Алена на хвіліну захісталася, апусціла вочы. Падняла іх, глянула на Стася, увесь час перабіраючы фартух пальцамі.

— Ідзі, Стась, падрыхтуй каня, я буду апрапацца...

Стась жвава падышоў да Алены, абняў яе за галаву і пацалаваў у абедзве шчакі.

— Малайчына, сястра, малайчына... О, за гэта ты малайчына!

— Ну, ідзі, ідзі хутчэй, а то зараз вечар будзе.

— Ды ўжо іду,— сказаў Стась і жвавым крокам выйшаў за парог. Алена крыху ўсхліпнула. Адкрыла скрыню і пачала шукаць вопратку, выціраючы слёзы.

Абула туфлі, апранула цёмна-сінюю спадніцу і такі ж сачык, завязала белую хустку і выйшла ў сенцы. Прынесла кусок сала і хлеба, улажыла ў торбачку. Глянула ў акно: конь стаяў напагатове. Тады выйшла з хаты.

Стась правёў Алену за весніцы і вярнуўся ў хату. Хутка прыйшлі дзеці з вуліцы. Стась накарміў іх крупнікам і малаком. Гутарыў з імі па-дзіцячаму, перадражніваючы то адно, то другое. Дзеці смяяліся і выклікалі дзядзьку на новыя размовы. Пасля, выцершы дзецям губы ручніком, выпусціў іх на вуліцу. Некаторы час глядзеў у акно, куды яны пойдуць. Потым пацягнуўся так, што аж косці затрашчалі, і прайшоўся па хаце, шукаючы, чым бы заняцца. Глянуў угару, на паліцу, і заўважыў — тырчыць кніжка. Дастаў яе, абтрос пыл. Зірнуў на вокладку і ціха прачытаў: «Ге-аграфі-я СССР». Выняў з кішэні касцюма аку-

ляры. Насадзіў іх на нос, сеў ля акна і стаў чытаць. Твар яго ў акулярах зрабіўся суровым. Растапырыліся пасівелыя валасы на скронях, і між брывамі з'явілася маршчына.

У часе чытання Стась і не заўважыў, як пехта засланіў акно. Цень упаў на кніжку, і Стась парывіста гляпуў у акно. Убачыў там чырвоны голены твар з падкручанымі ўверх вусікамі. З-пад казырка кепкі паглядалі вытарашчаныя вочы.

— А, пане Станіславе... Зараз зайду,— адазваўся голены твар.

Стась зняў акуляры, палажыў з кніжкаю на стол. Прамовіў сам сабе: «Ліха цябе прэ сюды... Патрэбны ты тут...»

Вайнацкі з грукатам увайшоў у хату.

— Добры дзень, пане Станіславе! — крыкнуў ён на ўсю хату.

— Добры дзень, пане Вайнацкі! — павольна адказаў Стась і насмешліва дадаў: — Чамусьці пачынаеш велічаць мяне панам... Сядай...

— А што, хіба мы не папы! Хто ж мы? Хіба ў нас кроў не шляхецкая?..

— Якая ж яна, гэтая кроў, чырвоная ці белая? — насміхаўся Стась.

— Шляхецкая — значыць, не хамская...

— А каго ж ты лічыш хамам?

— Усіх мужыкоў, вось гэтых мужыкоў,— паказаў на вуліцу,— што кормяць бандытаў, якія хаваюцца па лесе.

— А вось дай паклічам з вуліцы каго-небудзь з гэтых мужыкоў, як ты кажаш, пяхай ён парэжа палец і ты парэж. Пабачым, якая кроў пацячэ ў цябе і ў яго.

— О, гэта што... Мала што... Гэтым не дакажаш,— заспрачаўся Вайнацкі.— Што чуваць, пане Станіславе? — перавёў ён гутарку на другое.

— А што чуваць? Нічога... Жывём дзень да вечара,— адказаў Стась і стаў круціць цыгарку.

Вайнацкі выняў з кішэні скураны партсігар і ўзяў адтуль цыгарэту.

— Не куры сваёй табакі, пане Станіславе, на, закуры нямецкую сігару. Учора адвозіў каменданта ў мястэчка, самага старшага, дык падараваў мне цэлую пачку. О, гэта дык сігары! На, закуры.

Стась круціў цыгарку далей, як ні ў чым не бывала, і на просьбы Вайнацкага адказаў:

— Не даспадобы мпе такія сігары. Сваёй табакі пе прамяняю на ніякія сігары. Куры сам здароў...

— Дарма, дарма,— крыху ў замяшанні адказаў Вайнацкі.

Закурыўшы, ён стаў пускаць дым у столь так, што хаваліся ў дыме задзёртыя ўверх вусікі. Выпусціўшы дым, спытаўся: — Ці ў вас перапіс быў?

— Быў,— адказаў Стась.

— Кім ты запісаўся? Палякам?

— А ты кім? — адказаў на пытанне пытаннем Стась.

— Я... вядома, палякам... Мы ж палякі... А хто ж? Чуваць, скора будзе Польшча. З Англіі мае вярнуцца жонд польскі, і нашыя землі адыдуць да Польшчы. Тады мы гэтым хамам (кіўнуў у акно) пакажам, аж пыл будзе курэць.

Стась з хвіліну паглядаў ва ўпор на Вайнацкага, а потым, уздыхнуўшы, сказаў:

— Біць людзей безабаронных і нявінных — на гэта розуму не трэба... Ад гэтага няма ні славы, ні чэсці...

— Ты кажаш так, а я не згаджаюся з гэтым... Я іх знаю... Я іх усіх...— І Вайнацкі застукаў кулаком па стале.— Дык ты, мусіць, запісаўся беларусам?

— Так, беларусам. Кім я ёсць, тым і запісаўся. Чаго мне лезці ў чужую скуру?

— Камуністы цябе напсавалі, перарабілі на беларуса. Адышоў ад сваіх, пане Станіславе...

— Нашто мяпе было перарабляць? Раслі ж разам. Як гаварылі, пасучы статак? Як гаварылі, аручы поле, косячы траву? Гаварылі на сваёй мове, на такой, на якой гаворым зараз з табою. Так ці не? А камуністы добра зрабілі тое, што вольнасць далі беларусам, далі зямлю, далі кніжку ў рукі на нашай мове, далі дзяржаву. Ніхто тут нікога не перарабляў. Вось бачыш кніжка — «Геаграфія СССР». Напісана па-беларуску...

— Гэта я ўсё ведаю... Як паслухаеш цябе, пане Станіславе, дык ты сапраўдны бальшавік!

— Заві мяне кім хочаш. Што добра сапраўды, то добра ўсім. Партыйнага білета ў кішэні не нашу. Не дарос, бачыш, да гэтага...

— У нас жа, пане, адна рэлігія, адна вера — якія ж мы беларусы? Яны ўсе праваслаўныя, мы — каталікі.

— Што — вера? Што — рэлігія, як ты кажаш? Рэлігія тады добрая, як яна народ к дабру вядзе. А як яна настаўляе на злое, то каму патрэбна такая рэлігія?

— А што, хіба ксяндзы нас на злое вучылі? Вучылі богу маліцца па-польску...

Стась перабіў нецярпліва:

— Так, вучылі больш маліцца панам, гнуць спіну перад імі. Жабраваць вучылі бедны народ, у цемры трымалі, як у ланцугах, пеклам страшылі... Што ім бог? Яны яго ў душы не мелі... Ім патрэбны быў пан-дзедзіц і яго бізун, каб мацней біў вось гэтага беларуса-мужыка, як ты кажаш...

— Што я чую! — завіпчаў Вайпацкі.— Ты — сапраўдны бальшавік, пане Станіславе! Ого-го! Гэта ж каб эсэсаўцы чулі гэтую тваю размову, дык ад цябе і пушынкі не засталося б. Гэта ж усюды цяпер касцёлы адкрываюцца, ксяндзы імшу служаць.

— Няхай служаць. Цяпер іх хлеб...

Стась адчуў, што далёка зайшоў у гутарцы з гэтым нягоднікам, але што зробіш, калі вырвалася? А потым падумаў: «Э, чорт з ім. Што ён мне зробіць? Няхай ведае. Хоць яму ўсё гэта як з гуся вада. Як захоча падняць руку на мяне, тады пабачым».

— А ты, што, я чуў, дружыш з гэтымі... гітлераўцамі?

— А чаму мне з імі не дружыць? Яны мяне любяць. Камендант мне ўчора сказаў, што польскія легіёны паехалі на фронт біць бальшавікоў. Мой хлопец Бронісь служыць у паліцыі. Як я дома гэта расказаў, дык ён прывязаўся да мяне: «Тата, тата, хачу ў легіёны». Хоць ты што хочаш з ім рабі...

Стась рашыў нічога не адказваць на гэта. Гутарка прыпынілася. Вайнацкі падкручваў свае вусікі і пазіраў у акно.

Стась схіліўся над сталом і перагортваў кніжку. Раптам Вайнацкі глянуў на гадзіннік і спытаўся:

— Куды гэта паехала Алена?

— Паехала дохтара шукаць у Ражанаўку,— спакойна адказаў Стась,— галава штосьці баліць і ў баку.

Адказ Стася збіў Вайнацкага з толку.

— Ага, дык яна ў Ражанаўку... А я думаў, можа ў Купцічы? — як бы сам да сябе прагаварыў Вайпацкі.— Я чуў, што дохтара няма ў Ражанаўцы — немцы забралі.

— Ну, што ж... Як няма, будзе лячыцца без дохтара.

Нешта не давала спакою Вайнацкаму. Не задавальнялі яго адказы Стася. Раздумваў, але ні да чаго не дайшоў. Думка аб тым, што Алена магла паехаць па Макара, ніяк не прыходзіла яму ў галаву. Ён не дапускаў гэтага —

сама ж Алена прыходзіла прасіць яго прывесці паліцыю. Аднак жа тут нешта ёсць. А можа падгаварыў яе гэты бальшавік?

— Ці ты ведаеш, папе Станіславе, што Макар арыштаваны?

— Ведаю, Алена казала.— І Стась стаў далей перагортваць кніжку.

— Гэта ж падумаць, адважыцца партызан пусціць начаваць,— цягнуў Вайнацкі.

— А што, паліцыя застала ў яго партызан? — не адрываючыся ад кніжкі, спытаў Стась.

— Было даказана,— адказаў Вайнацкі, пазіраючы на Стася. Стась паціснуў плячыма: «Ну, што ж, калі даказана, нічога не зробіш». І далей глядзеў у кніжку. Вайнацкі, бачачы, што гутарка не клеіцца, пакруціўся сюды-туды і ўстаў.

— Ну, бывай здароў, пане Станіславе... Заўтра трэба ехаць з немцамі на плыты, мужыкоў гнаць на работу.

— Бывай,— адказаў Стась, уткнуўшыся ў кніжку.

Вайнацкі, грукаючы ботамі па падлозе, размашыста выйшаў з хаты. Стась паглядзеў яму ўслед праз акно. Вайнацкі шырока крочыў у высокіх ботах, распахнуўшы касцюм, як той панскі войт ці аканом, у якога свярбяць вочы і рукі, калі няма з каго, як кажуць, здзіраць скуры.

* * *

Ужо сцямнела, а Алены яшчэ не было. Стась палажыў дзяцей спаць. Лямпы не хацеў запальваць, каб не ўзбуджаць цікавасці тых, хто праходзіў па вуліцы. Прылёг на лаве, падлажыўшы куртку пад галаву. Розныя думкі наведвалі яго, а сярод іх пераважала адна — думка аб сыне Міхасю. Сын у гэтым годзе скончыў бы ўжо лесатэхнічны інстытут. Пачалася вайна, і сын пайшоў у армію. Пры развітанні казаў: «Не сумуй, тата, мы пераможам. Як вернемся з вайны, будзем ізноў будаваць новае жыццё, а цябе выбярэм старшынёю калгаса...»

Усміхнуўся Стась сам сабе, цяплей стала ў грудзях, і адначасова пачуццё жалю стала падпаўзаць да сэрца. «Эх, сын, сын, дзіця маё разумнае, дзе ты цяпер?» Але ноч не адказвала на гэтае пытанне, толькі дыханне дзяцей даносілася з-за печы.

Стась павярнуўся на бок і лёг, падлажыўшы руку пад

пчаку. Уздыхнуў, і гэты ўздых патануў адзінока ў цішыні хаты. Ім стала авалодваць дрэма. І ў гэтым паўсне, як у марах, Стась убачыў сына. Сын стаяў на шырокім полі ў пілотцы і з вінтоўкаю. Глядзіць на яго Стась здалёк і дзівуецца: «Які ж ён чысты, твар вымыты, свежы, а ў правай руцэ дыміцца папяроса. Я ж казаў, прасіў яго: не куры, Міхась, яшчэ пачакай, накурышся за жыццё, а ён ужо...»

Пачуўся стук у акно. Стась аж падскочыў. Сэрца закалацілася. З чым яна прыехала? Мо з пустымі рукамі? Адчыніў сені і ля парога ўбачыў не адну постаць, а дзве.

— Стась, дарагі! — пачуўся голас Макара.— Дай увайсці ў хату.

Алена, як толькі пераступіла парог, зараз жа запаліла лямпу.

— Дай пагляджу на цябе, Макар,— сказаў Стась. Яны абняліся, пацалаваліся. Макар выглядаў змучаным, худым.

— Ну, як табе там было?

— Вось, бачыш, дзень пратрымалі, а здалося, што цэлы год. Было так, што мо лепш не расказваць.

І Макар схапіў сябе рукою за галаву і выцягнуў жмут валос.

— Бачыш? — паказаў Стасю.

— Што? Вырывалі валасы? — жахнуўся Стась.

— Усяго было...— Макар махнуў рукою.— Каб не прыехала яна, гэтай ноччу мо пайшоў бы на той свет.

Стась стаяў, анямеўшы, і вострыя аганькі паблісквалі ў яго вачах.

Раніцою Алена не ўстала. Балела галава. Яе кідала то ў гарачыню, то ў холад. Макар сам узяўся за гаспадарку. Стась, паснедаўшы, ад'ехаў. Сказаў, калі не перастане балець галава ў Алены, каб яму паведамілі.

Алена прасіла паклікаць маці. Макар выканаў гэта. Са здзіўленнем сустрэла яго цешча, але нічога не пыталася і не казала. Прыйшла, стала лячыць Алену сваімі лекамі: пырскала ў твар свянцонаю вадою, казала ёй пралезці над сталом (гэта нібы ад злога чалавека), выцірала ёй твар сваім фартухом, плюючы адпачасова на ўсе чатыры бакі (гэта ад урокаў), і варыла ліпавы цвет. Макар глядзеў на ўсё гэта, не ўмешваўся: няхай будзе ліха ціха. Калі падышоў вечар, а гарачка ў Алены не спынілася, маці палажыла ёй на лоб каптычку, сама стала на калені перад пярэднім кутом і пачала чытаць малітву, перабі-

раючы ружанец. Біла паклон за паклонам, шаптала, а з-за печы даносіліся стогны Алены.

Мінула ноч. Выпіўшы ліпавага цвету, Алена праз пэўны час была крыху суцішылася, але райкам тэмпература паднялася зноў.

Макар думаў, куды кінуцца шукаць лекара. Апытаў у вёсцы каго толькі можна было, усе казалі, што ў ваколіцы доктара няма. Быў адзін, і таго забралі жандары. Чакаць на тое, каб хвароба прайшла сама, небяспечна. Што рабіць? У хату чарадою сталі ісці бабы з вёскі, і кожная лічыла патрэбным даць сваю параду.

Думкі Макара з тугою паплылі ў лес. «Хоць бы параіцца з хлопцамі, можа яны што дапамаглі б?» Стоячы на падворку, Макар раптам успомніў, і твар яго праясніўся: «Як гэта я мог забыць? У іх жа ёсць дохтар... Што б ні было, трэба ісці... Ісці-то ісці, але пехатою хутка не зойдзеш. Гэта ўсё ж такі далёка, а каня свайго няма». Макар заскроб патыліцу, задумаўся. Стоячы на падворку, не заўважыў, як да яго падышла старая Кацярына. Яна ішла таксама, як і тады, калі Макара павяла была паліцыя — са скрыжаванымі рукамі на грудзях, павольнай хадою. Яе васковы, маршчыністы твар быў заклапочаны і адначасова зацікаўлены. Прывітаўшыся з Макарам, яна запыталася ласкава:

— Як табе, Макарка, паводзілася? Я думала, што ты ўжо не вернешся. Дзякаваць богу, што хоць так скончылася.

І тут Макар расказаў Кацярыне сваю бяду. Кацярына выслухала да канца, памеркавала нешта сама сабе, а потым сказала:

— Каня вазьмі ў мяне, хлопцы запрагуць, і мой Ігнат падвязе цябе хоць да палавіны дарогі.

Макар схаціўся за гэта, як за збаўленне, і зараз жа разам з Кацярынай пайшлі да яе.

* * *

Макар прыехаў з доктарам і Кудрэвічам перад самым світаннем. Прыехалі яны на партызанскай падводзе. Перад імі і пасля іх ехала яшчэ па адной падводзе — усяго дванаццаць узброеных партызан. Пярэдняя падвода мінула хату Макара і паехала ў канец вёскі, а задняя заехала на ўскраіну, у калгасны хлеў. Партызаны, пакінуўшы па аднаму вартавому пры падводах, разышліся на выбраныя

месцы вакол вёскі і залеглі на сваіх пастах. Падводу з доктарам і Кудрэвічам Макар накіраваў на свой падворак. З акон хаты Макара прабіваўся цьмяны бляск — відна была лямпа з прыкручаным агнём. Кудрэвіч застаўся пры падводзе, а Макар з доктарам пастукаліся ў дзверы. Старая азвалася з сяней і, пазнаўшы Макара, адчыніла. У твары ўвайшоўшых ударыла духата застаялага паветра. Доктар адразу сказаў, каб не зачынялі хатніх дзвярэй. Макар хуценька пазавешваў вокны, а доктар палажыў на стол сваю торбу. Выкруцілі агонь у лямпе, і ўсе ўбачылі ў асобе доктара высокага мужчыну ў шынялі, у ваеннай шапцы. Доктар скінуў шынель і шапку. На галаве хвалямі ляжалі цёмна-русыя валасы. Высокі ясны лоб з маршчынкай паміж броваў, просты, крыху кірпаты нос і шэрыя вочы рабілі яго твар прыгожым. Старая цешча прыплюшчыла вочы, задраўшы ўгару свой заскарузлы, як у мумііі, твар, углядалася, нібы хацела пазнаць даўно бачанага чалавека. Праводзіла вачыма, сачыла за яго рухамі. Адначасова ўскідала вокам на Макара. Нешта здагадвалася гэтая мумія, бо часам яе твар напружваўся. Калі трэба было доктару паліць вады на рукі, яна рабіла гэта без лішняй ахвоты.

Доктар сказаў перанесці лямпу за печ, да хворай. Алена ляжала тварам дагары і цяжка дыхала. Твар яе асунуўся, шчокі запалі. Доктар праверыў пульс і, прыклажыўшы хворай руку да лба, сцвердзіў вялікае аслабленне ад высокай тэмпературы. Фізічнага недамагання няма — лёгкія ў парадку, толькі аслаблена сэрца і боль у галаве. Гэта ад нервовага ўзрушання. Калі яшчэ раз паўторыцца такое, можа быць кепска. Цяпер хворай трэба добра выспацца.

— Вы, бабка,— звярнуўся доктар да мумііі,— знайдзіце чарку добрай настойкі, мядовай ці вішнёвай, бо віна цяпер няма, і дайце хворай выпіць. Калі няма гэтага, дык хоць проста якой-небудзь гарэлкі. Тады хворая засне. Апрача гэтага, наварыце малінавага лісця і дайце выпіць навару шклянкі дзве. Добра ўкрыйце хворую, тады яна выпацее. І ўсё будзе добра. Нічога цяжкага не даваць есці. Паранае малако, лёгкі малочны крупнік, кампот з груш і яблык.

Да свядомасці мумііі-маці нешта ўжо даходзіла, бо яна ківала галавою на словы доктара, і твар яе рабіўся лагоднейшым. Алена ледзь чутным голасам пытала: «Хто гэта — скажэце?» Маці схілялася над хворай і адказвала ёй, як беспамятнай, што «гэта — дохтар». Доктар стаў

апранацца. Старая не ведала, што рабіць,— не запрашала сесці, не прапанавала пачастунку, толькі калючыя вочы паблісквалі ў нерашучасці. Урэшце запытала роўным здаўленым тонам:

— Колькі вам заплаціць?

Доктар адмовіўся ад платы, ён адчуў сябе ніякавата пры такой абыходлівасці. Але ён ведаў гісторыю Макара, і таму яму было ўсё зразумела. Прысеўшы на момант закурыць, ён з цікавасцю прыглядаўся да старой.

Стала ледзь-ледзь брацца на дзень. Доктар, развітаўшыся, выйшаў. Старая, як бы для парадку, надзякавала і пажадала шчаслівай дарогі. Макар, Кудрэвіч і доктар апынуліся ў гумне. Гаварылі шэптам.

— Дзякую вам, таварыш Курганаў і таварыш Кудрэвіч. Усё, што я меў вам сказаць, я расказаў. Калі будзеце ісці на аперацыю, аб якой мы гаварылі, не хадзіце без мяне, бо можаце заблытацца і прайграць справу.

— Мы табе парадамо, калі быць гатовым. Без цябе не пойдзем,— адказаў Кудрэвіч.

— Не ведаю, як будуць трымацца мае паны пасля гэтага. Кажу вам, не веру ім, усё роўна не веру. Мо на які час прыціхнуць, а пасля...— Макар махнуў рукою.— Аднаго ў вас прашу: калі што здарыцца, памажыце мне ўратаваць дзяцей. Не аддам гэтаму кашчэю — цёшчы.

— Не бядуй, Макар,— сказаў Кудрэвіч,— толькі глядзі добра, каб не празяваць.

— Жонка твая, калі зробіць так, як я казаў, вычуняе. Але цёшча твая... Ого-го!.. Гэта — экземпляр для вывучэння,— сказаў Курганаў.

— Бачыце, ужо світае, давайце будзем выводзіць каня,— сказаў Кудрэвіч. Конь з возам быў выведзены з гумна. Кудрэвіч і Курганаў, не прыпыняючыся, селі на воз, кіўнулі Макару на развітанне і выехалі на вуліцу. Цераз хвілін пяць пачуўся свіст, цехта адказаў яму працяглым свістам. Хутка па вуліцы ў кірунку лесу затарахцелі адна за другою падводы.

IV

Мінула больш за месяц пасля хваробы Алены. Ужо канчалася жніво. Гэта было сумнае жніво сорак другога года. Працавалі ў большасці адны жанчыны. У каго муж, у каго сын былі ў Чырвонай Арміі. Людзі вечарамі ішлі

з поля, як цені. Ішлі ўразброд — на двух, на адным. Не чуваць было ні смеху, ні жніўных песень. Гітлераўскія прыхвасні трубілі, што немцы забралі ўсю Украіну і падыходзяць да Сталінграда. Людзі не былі пэўнымі ў сваім заўтрашнім дні. Па вёсках гулялі шайкі эсэсаўцаў, паліцаяў, з'явіліся розныя «камендanты». То вязі малако ў раён — аддавай задарма немцам, то вядзі карову, то свіння, аддай усю воўну з авечак, увесь лён. А за невыкананне — пагроза смерці.

А з другога боку, усё ясней і ясней сталі даходзіць весткі аб партызанах, аб іх дзеяннях. Гэтыя весткі пераляталі з хаты ў хату, з вёскі ў вёску і выраставалі да памераў легенды. Людзі з уцехай верылі ўсяму. Эсэсаўцы ўжо сталі паліць вёскі з людзьмі, і часам дым невядома адкуль валачыўся па лесе цэлымі днямі.

Быў адзін з тых летніх вечароў, калі ў паветры яшчэ чуецца подых гарачага дня, а з лясных нізін пачынаюць выплываць туманы. Людзі паціху ішлі з поля. У гэтыя трывожныя часы нараджаліся ў народзе адмысловыя песні. І часамі ўвечары на палявой дарозе можна было пачуць адну, найбольш вядомую, аб чорным воране. І цяпер, сярод маўклівасці людзей, сярод застыўшай навакол прыроды, поўнай паху спелага жыта, яна паплілася з вуснаў нейкай маладзіцы:

Вецер з поля, хваля з мора,
Ой, забалела галованька з гора.
Каму сказаці, дзе прыхіліцца,—
Ой, ды чорны воран на плечы садзіцца...

Людзі ішлі, слухалі, аглядаліся. Гэтая песня была да настрою ўсім — з словамі і мелодыяй скаргі. Ішлі па дарозе і Макар з Аленай. У абодвух у руках былі сярпы. Яны мала што гаварылі. Былі стомленыя, як і ўсе. Прыемна было ісці халадком дахаты. Алена крочыла крыху наперадзе і відно было, што гэтая песня і на яе зрабіла ўражанне, бо яна суцішылася ў сабе, часамі ўздыхала, а калі што і казала Макару, дык паўшэптам, нібы баялася перашкодзіць спявачцы.

Алена пасля прыезду Кудрэвіча і Курганава пралежала ў пасцелі яшчэ тыдзень. Калі даведалася ад маці, хто яе вылечыў, першым яе водрухам было:

— Непатрэбна гэта мне было... Я б і сама ачуняла...

— Што ж я мела рабіць? — чаўкнула старая.— Не я яго прывезла.

І той увесь дзень Алена не хацела гутарыць з Макарам. А калі зусім паправілася і стала прыглядацца да працы, была ўжо нават ласкавай з ім. Надышло жніво, закіпела работа, і здавалася, што ўзаемаадносіны паміж мужам і жонкай прыйшлі да поўнай згоды. Гэтаму спрыяла яшчэ тое, што Макар быў увішны работнік на полі — ён выжынаў у два разы больш за яе. Спаноў яна не зноён выкінаў у два разы больш за яе. Старалася як мага лагодзіць, дагаджаць яе вымогам, хоць у душы не раз змейкай прабягала тая тайна, аб якой ён даведаўся тады, калі быў катаваны ў камендатуры, што яго выдала паліцыі Алена, уласная жонка.

«Няхай гэта будзе тайна,— думаў Макар,— я выцерплю ўсё, абы добра скончылася».

І цяпер, ідучы з поля, яны былі ў мірным настроі: яны дажалі сваё збожжа. І цёплы вечар і песня — усё як быццам спрыяла збліжэнню людзей. Ужо даходзілі да вёскі, а песня лілася:

...Чорны воран, свет мне пастылы,—
Ой, скажы, мне праўданьку, дзе мой мілы?

Увайшлі ў хату. Там сядзела маці Алены. На прыпечку, на трыножніку, варыўся гаршчок бульбы. Дзеці паспелі ўжо заснуць. Макар і Алена сталі ўмывацца. У хаце было ўжо цёмна, дык Макар засвяціў капцілку. Старая падышла да трыножніка, паправіла агонь. Гаршчок стаў закіпаць.

— Ці вы нічога не чулі? — спытала старая.

— Не, нічога,— у адзін голас адказалі Макар і Алена.

— У Купцічы прыехаў цэлы атрад гітлераўцаў. Кажуць, што будуць партызан вышукваць па лесе.

Макар, седзячы на лаве, разуваўся і нічога не сказаў на гэта, хоць трывога пранізала яго з галавы да ног. Алена, прычэсваючы валасы, адазвалася:

— А што ж... Даўно трэба было гэта зрабіць, каб людзям не перашкаджалі. А то толькі бяды можна з імі нажыць.

Слізнула вачыма па Макару і падышла да печы. Макар з-пад валос, якія павіслі на лбе, бліснуў вачыма на Алену і спытаў у старое:

— А дзе вы гэта чулі?

— Казаў наш... Вайнацкі...

«Раз казаў Вайнацкі, значыць, гэта праўда»,— падумаў Макар.

— Так што, Макар, глядзі, каб цябе не забралі,— сказала Алена.— Я цябе больш выратоўваць не паеду.

— За што ж мяне браць? Ну, а як забяруць, то можа зноў жонкай будзеш? — жартаўліва сказаў Макар. Падышоў да Алены, нахіліўся над яе вухам, стоячы ззаду, і дадаў: — Ну, як? Так ці не?

Алена павярнулася назад, і на момант вочы іх сустрэліся.

— Ой, нават і не думай... Патрэбны ты мне такі. Колькі раз гаварыла не займацца гэтымі справамі. А ён за праўду нейкую хоча пастаяць. Які герой, падумаеш... Вось патаўклі ў камендатуры і нічому яшчэ цябе не навучылі...

Макар адышоўся нахмураны.

— Эх, Алена, скуль у цябе такое сумленне? Хто табе яго даў?

У адказ на гэта, як здзічэлая старая кошка, скокнула цешча.

— А што? Можа ты ёй даў сумленне? Ты — галадранец. Падзякуй, што маеш такую жонку...

На адну хвіліну ў Макара бліснула няўмольнае жаданне выкінуць гэтую ведзьму з хаты, але, задрыжаўшы ўсім нутром, спыніўся, стрымаў сябе. Толькі сказаў:

— Хлеба ніколі не еў з чужых рук... Хапала ў мяне сілы на гэта і хопіць.

— Ён мяне сумленнем папракае... Вось выратавала, дык маўчы,— дадала Алена.

— Так, ты выратавала мяне. А я цябе не выратаваў? Скажы?

— Бог яе выратаваў,— буркнула старая.— Непатрэбна было тваёй фатыгі.

— Сціхні, мама, годзе, давайце будзем вячэраць,— сказала Алена, ставячы на стол бульбу.

Алена адчувала, што Макар кажа праўду, яна добра памятала, дзякуючы каму яна ачуняла, але тое, што гэтую праўду нельга нічым прыкрыць, выводзіла яе з раўнавагі. Алена не магла змірыцца з тым, што не яе верх над Макарам, а яго. Гатова была не раз тупаць нагамі аж да плачу, каб толькі нагнуць Макара да баязлівасці, да пакоры.

Як ні хацелася Макару есці, душа ніяк не ляжала к таму, каб сесці разам за стол. Каб не было гэтай гутаркі або цешчы, можа і павячэраў бы. Абуў на босыя ногі боты, апрануў кажух і, узяўшы шапку, накіраваўся да дзвярэй.

— Куды ты? А вячэраць? — спыніла Алена.

— Вячэраць не хачу. Вячэрайце. Спаць у хаце не буду,— сказаў і выйшаў за парог.

Ноч прайшла спакойна. Макар устаў на ўсходзе сонца і пайшоў на поле паглядзець спапоў,— ці не парасцягалі коні ўначы або каровы на рашку. Прахадзіў там гадзіны са дзве.

Алена спыталася ў Макара, куды хадзіў, ці цэлае жыта. Калі села снедаць, прасіла, каб і ён сядаў. Макар не давяраў яе мірнаму тону, такая раптоўная перамена зацікавіла яго.

Увесь дзень людзі ў вёсцы былі ў напружанні — чакалі, што вось-вось прыедуць эсэсаўцы. Мала людзей заставалася ў вёсцы — хто пайшоў у лес, хто ў поле, абы не быць дома. Узяўшы сякеру, пайшоў у лес і Макар.

Эсэсаўцы прыехалі ў вёску ў абедзенную пару, але не прыпынялiся. Перасеклі вёску ўпоперак, там, дзе перакрыжоўвалася вуліца з дарогай. Яны ехалі павольна, на сытых конях — частка верхам, а частка ў вазáх. На пілотках былі значкі — чалавечыя чарапы. Апрануты ў маскіровачныя халаты. Выйшлі глядзець на іх толькі адны дзеці, якія крычалі, бегучы па вуліцы: «Немцы едуць, немцы!» Дзеці стаялі датуль, пакуль адзін эсэсавец не ляснуў нагайкай і не скіраваў на іх каня. Дзеці шмыгнулі, як зайчаняты, і вуліца стала пустою. Толькі за плотам, на падворку старасты, стаяў сам Дзяргач і Вайпацкі. Засланяючы далонямі вочы ад сонца, глядзелі ўслед эсэсаўцам, якія пачалі ўжо ўязджаць у лес.

— Куды, па-твойму, яны паехалі? — спытаў гнусавым голасам Дзяргач.

— Як куды? У Нізкую. Не іначай, як у Нізкую. Там, чуваць, аб'явіліся партызаны,— тонам усёзнаючага адказаў Вайнацкі.

Да вёскі Нізкай было пятнаццаць кіламетраў. Праз гадзіны дзве-тры ў тым кірунку далёка над лесам паваліў чорны дым. К вечару людзі даведаліся, што эсэсаўцы спалілі вёску Нізкую. Гэта была вёска, дзе жыў Стась, брат Алены.

V

Эсэсаўцы больш не вярталіся. Спаліўшы вёску Нізкую, яны паехалі некуды далей. Апрача таго, што спалілі вёску, пабілі многа людзей. Людзі хадзілі як у ваду апушчаныя. Сталі капаць ямы і хаваць сваё дабро.

Макар мала бываў дома — усё ў полі або ў лесе. Павазіў сваё збожжа — трэба было малаціць, але рукі не хіліліся да працы. Усё думаў сваю думу, пахудаў, спахмурнеў. Алена неяк суцішылася, нават стала да Макара ласкавей. Напрыклад, калі Макар адзін раз малаціў у гумне, яна прыйшла проста паглядзець, сварылася на Вайнацкага за тое, што набіў меншага хлопца старое Кацянрыны, злавіўшы яе каня ў канюшыне. Нават жонка Вайнацкага кінулася бараніць хлопца, ён і яе адным ударам звалiў з ног. Прыгледзелася да сарочкі Макара — у каўняры не хапала гузікаў. Сказала, каб пасля абеду змяніў сарочку. Дзеці бегалі, забаўляліся ў саломе, бацькі глядзелі на іх і супольна адчувалі ўцеху.

Але вось Вайнацкі задумаў зрабіць «баль». Нагнаў самагонкі, зарэзаў бычка. Людзі ў вёсцы ўжо гутарылі аб тым, якім мае быць гэты баль і хто будзе запрошаны. На балі апрача старасты, кулака Пушэвіча і іншых прыхлябаеў мае быць паліцыя і нейкі нямецкі начальнік.

І вось, урэшце, у адну з нядзель, пасля абеду, завітаў Вайнацкі. Макар спаў на лаве, а Алена нешта рабіла, седзячы ля акна. Вайнацкі ўвайшоў у хату і бразнуў дзвярыма так, што Макар прачнуўся.

— Пахвалёны Езус! — сказаў Вайнацкі.

Яму адказалі: «Навекі аман» — і запрасілі сесці.

— Не буду садзіцца, бо спяшаюся,— адказаў ён.— Прашу вас, пані матка, і цябе, пані сястра, і ты, Макар, прыйсці да мяне ў гасціну сягоння ўвечары.

— Дзякуем, папе браце, прыйдзем... Чулі мы, што ты вялікую гасціну збіраеш.

— Не бойся, у мяне хопіць. Гарэлкі будзе хоць залiся, сала яшчэ леташняе. Помніце таго вепрука, што быў вышэй за стол? Думаў Броніся жаніць, але нешта цяпер не выпадае — служба, паліцыя. У Глінянку прыехалі ўжо інжынеры зямлю наразаць. Хутка і ў нас будуць. Ніводнага камуніста не застанецца — усіх вымецем! Цябе папрашу, пані сястра, падысці, дапамагчы там жонцы на кухні.

І Вайнацкі выйшаў.

Увечары адбыўся «баль». Назаўтра вёска гудзела аб ім на ўсе галасы. Гаварылі аб тым, што на баль прыехала многа ўзброенай паліцыі і быў нейкі новы камендант, што ён прыехаў у Беларусь аж з Афрыкі. І нават казалі, як гэты гітлеравец піў самагонку: хлябне раз з шклянкі, а потым закусіць, а пасля ізноў хлябне. Піў так, як еў хлеб

з вадою, і ўсё прыгаварваў: гут, гут. А потым (як гэта дайшло да людзей!) казалі, што Вайнацкі доўга гутарыў з Аленай на кухні і ўсё напіраў: «памажы, памажы...» Што «памажы», людзі толкам не ведалі і па-рознаму здагадваліся. Напіўшыся, Вайнацкі закамандаваў «вальчыка» і, кружачыся ў гэтым танцы, абрыгаў нейкую панну Яніну. Усе адзначалі, што Макара не было і што Алена сядзела па «пачэсным» месцы — побач з гітлераўцам і як ён да яе лізаўся: туліўся плячом, раз-пораз цалаваў руку. А потым дадавалі аб тым, як перапіліся паліцаі і валяліся на двары — хто спаў, а хто рыгаў на ўвесь падворак. Аднаго буяна-паліцая госці на чале з Пушэвічам прывязалі да плота. А найстрашнейшым было тое, што, калі ўсе госці сядзелі за сталамі і пачалі піць новым навараце там, са двара пачуўся пранізлівы крык: «Партызаны! Партызаны ідуць!» У хаце ўзнялася паніка. Гітлераўец устаў, пераскочыў цераз стол, маючы напагатове рэвальвер у руцэ. Са сталоў ляцелі бутэлькі, шклянкі, талеркі. Госці сціснуліся ў дзвярах, пад нагамі храбусцела шкло. Староста Дзяргач пёрся праз натоўп з апруцянелымі бялкамі вачэй і ўсё стагнаў: «А божа ж ты, а божа ж ты...» Алена заціснулася ў куток і, дрыжучы, шукала вачыма маці. А Пушэвіч размахваў бутэлькай над галовамі ўсіх і крычаў: «Хутчэй выходзь, а то галаву разаб'ю!» Гітлераўец, выбегшы на двор, стаў страляць. Да яго далучылася пара паліцаяў. Але хто падняў трывогу, ніхто не ведаў. Аж раптам усім прарэзаў вушы новы крык ад плота: «Партызаны!» І ўсе ўбачылі, што гэта крычыць прывязаны да плота паліцай. Гітлераўец з размаху стукнуў паліцая рэвальверам над вуха, загадаў развязаць яго і адвесці дзе палажыць. Пасля запрашаў усіх вярнуцца ў хату і далей прадаўжаць «баль». Але госці пасалавелі, ні ў кога ўжо не было настрою, і ў дадатак да ўсяго — не было самога Вайнацкага. Як ні шукалі, нідзе не знайшлі яго. У часе напікі, бачылі, быў на кухні, а куды знік — невядома. Толькі раніцою жонка знайшла яго на агародзе у тычкавай фасолі — спаў, уткнуўшы нос у зямлю. Словам, хапіла гутаркі аб гэтым «балі» не толькі для адной вёскі, але і для ўсёй ваколіцы.

* * *

Як толькі выйшаў Вайнацкі, Макар сеў на лаву і моцна задумаўся, апусціўшы галаву. Разважаў: «Будзе п'яп-

ства, будзе паліцыя, усе прыхлябаі і будзе пехта з гітлераўцаў... Што больш трэба?» Заахвочваў Алену, каб хутчэй ішла да Вайнацкага. Сам адмовіўся, кажучы, што пешта баліць галава. Алена не пастойвала.

Як толькі выйшла Алена, спешна стаў апранацца. Узяўшы ў кішэню крыху ежы, выйшаў. Сонца было яшчэ высока. «Каб толькі паспець, каб толькі паспець. Тут мы іх...» Але, пэўна, што ноч агорне ў дарозе. І Макар упадаў у роспач. Калі выйшаў на першую лясную паляну, убачыў — пасвіцца трое коней. Спаймаў аднаго за грыву і сеў. Не шкадаваў каня, гнаў яго ва ўсю сілу, даючы яму час ад часу перадыхнуць толькі на пару хвілін.

Вярнуўся Макар з партызанамі на самым світанні. Так яны і меркавалі, каб застаць гасцей упоенымі і зморанымі. Усе прыехалі конна — дванаццаць чалавек на чале з Кудрэвічам. Кудрэвіч з двума таварышамі зайшлі да Макара, а рэшта — дзевяць чалавек (аднаго пакінулі пільнаваць коней у лесе) зайшлі да старасты Дзергача.

Алена паспела ўжо выспацца, калі яе абудзіў Макар. Першым пытаннем Макара было — ці ў вёсцы паліцыя? Алена сказала, што няма, што гасціна скончылася даўно і што наогул нікога няма. Макар і партызаны перагляну-ліся поглядамі расчаравання. Алена, убраўшыся, выйшла з-за печы і з усмешкай прывіталася з партызанамі, сказаўшы, што «крыху ўжо знаёмы». «Добры знак»,— падумаў Макар, а Кудрэвіч падмігнуў яму — значыць, з жонкай пайшло на лепшае. Хлопцы адчулі сябе больш надзейна. Сонца павольна падымалася недзе за лесам, на вуліцы сям-там сталі праходзіць людзі.

Алена, умыўшыся, прынесла з каморы талерку сала і талерку сыру. Палажыўшы хлеб, паставіла на стол паўлітра самагонкі.

— Пачастуйцеся крыху, а то вы з дарогі прагалада-ліся... Прашу, будзьце гасцямі,— запрашала Алена.— Макар, частуй гасцей...

«Зусім добра»,— падумаў Кудрэвіч. У Макара пасвятлеў твар. Стаў наліваць чаркі партызанам, наліў і Алене. Яна не адмовілася. Выпівалі, закусвалі, гутарылі і не заўважылі, калі Алена выйшла з хаты. Макар, закурыўшы, сказаў:

— Раз паліцыі няма, можаце пасядзець смялей, але пазірайце ў вокны, а я пабягу за гумно, паглядж у на агародзе ячменю. Начамі расцягваюць коні. Толькі прашу, усё ж такі сцеражыцеся.

Макар пайшоў на агарод. Снапы былі расцягнуты. Стаў збіраць іх — цэлыя ставіць на месца, разарваныя вязаць нанава, сабіраў каласкі па загону. Адагнуўся ад зямлі і аж здзівіўся ад нечаканасці — перад ім стаяла старая Кацярына.

— Ух, Кацярына, ты мяне проста напалохала... Як з неба звалілася...

— Макар, ці ў цябе хто ёсць? — спытала Кацярына.

— Ёсць. А што?

— Чаго гэта твая Алена пайшла да Вайнацкага?

— Няўжо? Ты бачыла? Можа што забылася ў гасціне? Паліцыі ж у вёсцы няма.

— Як няма? — цыкнула Кацярына.— Ёсць. Яна і не ад'язджала ад Вайнацкага...

— Ну?! Каб цябе...— Макар не дагаварыў. На яго падворку пачуліся стрэлы, потым чарга з аўтамата. Макар скокнуў у кірунку гумна і толькі ўбачыў, як Кудрэвіч перакуліўся цераз плот і шуснуў у каноплі, як другі партызан таксама перакуліўся за ім услед і ўпаў на граду. Раз такая справа, Макар пабег у кірунку лесу, да партызанскіх коней, дзе і сустрэўся з Кудрэвічам. Кудрэвіч змог толькі сказаць адно, што адзін з партызан, здаецца, забіты, і не пускаў Макара ісці ў вёску. Тым часам у вёсцы адкрылася густая страляніна. Шэсць партызан выбегла ад старасты і ўдарыла па паліцыі. Гэта было для яе нечакана. Паліцаі пусціліся ўроссып уцякаць у агароды. Партызаны, перабягаючы з месца на месца, палілі ім услед, аж пакуль не схавалі некаторых з іх далёкія кусты. Пушэвіч, які бег следам за паліцаямі, пры пераласе цераз плот раптам замёр і паваліўся на грады. Куля дагнала і яго.

У замяшанні спачатку і не заўважылі, што на падворку Макара пры выхадзе на вуліцу ляжаў забіты партызан. Цяпер яны падышлі да яго. У партызана быў разбіты чэрап і перабіты рукі і ногі. Людзі казалі, што ён быў ранены і ўпаў. Адзін паліцай з Вайнацкім забілі яго прыкладамі вінтовак. Другі партызан, што ўпаў на граду, ачнуўся — ён быў паранены ў нагу.

Назыходзілася многа людзей, пераважна жанчын. Усе плакалі шчырымі слязамі, праклінялі гітлераўцаў, як толькі маглі. Пад'ехала, ціха плачучы, старая Кацярына з сваім возам. Жанчыны палажылі партызана на воз і пакрылі чыстым, белым палатном. На другую падводу паклалі раненага. Накіраваліся ў лес. У дарозе да людзей

далучыліся Кудрэвіч і Макар. Пахавалі партызана на шырокай лясной паляне.

Вярталіся — жанчыны з плачам, а мужчыны з гневам. Ішла ўся вёска. Не было ў натоўпе Вайнацкага.

VI

Макар ірвануўся ісці ў вёску. Партызаны яго не пускалі.

— Пусціце, не вытрымаю,— біў сябе ў грудзі Макар.

— Што ты там цяпер зробіш? — казаў Кудрэвіч.

— Я... зраблю... Я знаю, што рабіць... Пусціце, бо... лоншe маё сэрца... Гэта ж падумаць, так зрабіць, як яна... Не, пусціце... Я мушу ісці... каб расквітацца з усім... а потым вярнуцца да вас назаўсёды... Зараз пашліце мяне ў разведку...

— Добра, схадзі ў вёску Нізкую. Яе спалілі эсэсаўцы. Дазнайся, колькі людзей забіта, як жывуць тыя, хто застаўся жывы. Там была група партызан. Даведайся аб ёй. Нам трэба яе прыняць у наш атрад...— гаварыў Кудрэвіч.

Твар Макара крыху праяснеў. У яго бліснула нейкая шчаслівая думка.

— Добра. Калі так, пайду. Пайду зараз.

Доўга не чакаючы, развітаўся з партызанамі і пайшоў напрасткі праз лес. Ішоў як у гарачцы. Сухое галлё трашчала пад яго нагамі. Галіпы кустоў балюча ўдаралі яму па твары, але ён не зважаў на гэта.

Выйшаў на дарогу, стаў, скінуў шапку і ёю ўцёр свой распалепы, спатнелы твар. Закурыў і шпарка рушыў далей. Яго цешыла, што можа ўбачыцца са Стасем, калі ён жывы. У лесе было ціха і парна. Гушчыня лесу змянялася ляснымі сенажацямі, якія застылі пад сонцам у моры розпакаляровых кветак, нікім не крануты я. Цяпер не было каму прылажыць да іх рукі. Макар паволі астываў, прыцішыў крок. Мінаючы знаёмыя мясціны, падумаў, што да вечара паспее дайсці.

Ужо сонца хілілася к захаду, калі Макар прыйшоў у вёску Нізкую. Як глянуў уздоўж, убачыў адны папялішчы, на якіх тырчалі абгарэлыя каміны печаў. Дзе-нідзе воддалі захаваўся хлевушок. Дыміліся кастры, каля іх сядзелі людзі. На некаторых папялішчах жанчыны шукалі нечага ў попеле або складалі цэглу. На адным пажары-

шчы, па абсмалелым бервяне сядзела жанчына і моцна плакала. Макар не адважыўся спытацца, чаго яна плача. Суседка, якая збірала цэглу на сваім папялішчы, сказала, што эсэсаўцы не далі гэтай жанчыне ўзяць дзіцяці з калыскі і яно згарэла. «І вось, абы толькі прыйшла на папялішча, так і плача»,— сказала суседка. Уздыхнуў Макар ідучы і часамі не мог нават паверыць у тое, што бачыць,— праўда гэта ці не?

Некаторыя пабудавалі сабе буданы з дошак або з калкоў і пакрылі сенам. Нейкая пусташ і спалохапая цішыня віселі ў паветры. У адным месцы, на сярэдзіне вёскі, дзе была невялічкая пярэрва, Макар убачыў свежыя магілы з новымі дубовымі крыжамі. Падышоў і налічыў іх сорак, «Гэта, мусіць, і ёсць тыя пабітыя...» — падумаў ён. Зняў шапку і пастаяў хвілінку. Урэшце завярнуў на падворак Стася. Тырчаў адзін коміп на папялішчы, а па задзе быў шалаш. Стась стаяў ля шалаша з павязанай левай рукою. Ён узрадаваўся Макару.

— Урэшце ты прыйшоў. Каб не рука, я ўжо быў бы ў вас, але рука...— сказаў Стась, запрашаючы Макара сесці на калодцы.

— А што з рукою? — спытаўся Макар.

— Ранены. Эсэсаўцы... забіць хацелі, як уцякаў. Ранілі ў руку. Я ўпаў у грады — гэтым і ўратаваўся. Рана нецяжкая, але трэба будзе крыху папасіцца.

І Стась расказаў, як эсэсаўцы загадалі, каб усе людзі выходзілі ў канец вёскі, на майдан. Людзі хто выхапіў што з свайго скарбу, а хто не. Ляцелі цераз агароды, а эсэсаўцы страчылі па ўцякаючых. Хто трапіў пад кулю, той і лёг. Забілі сорак чалавек. «Вунь там пахаваны»,— паказаў пальцам Стась.

— Я бачыў праходзячы,— сказаў Макар.

Прыйшла з агарода жонка Стася Лізавета. Гэта была жанчына год пяцьдзесят, спакойная, з лагодным тварам, які яшчэ не страціў сваёй жаночай прыгажосці. З усмешкай яна прывіталася з Макарам.

— Вось, Макарка, у якую бяду мы трапілі. Не думалі ўжо застацца жывымі. Бачыш, неяк абышлося — яшчэ жывём. Вопратка наша ўся пагарэла — усяго і маем, што на сабе.— Паказала на дзежачку, якая стаяла ў шалашы: — Вось схапіла гэтую дзежачку і круцілася на падворку, як дурная, пакуль Стась не крыкнуў — «кідай». Уратавала крыху пасуды, а вопратка згарэла. Гэта ўсяго ратунку, што было закопана крыху хлеба, а так хоць пра-

падай, бо новае згарэла ў хляве. Ячменю крыху на полі ёсць, грэчкі...

Лізавета крышыла гуркі ў квас, рыхтавала вячэру. Стась з Макарам прайшліся к папяліпчу, абышлі павокал, гутарачы. Макар расказаў Стасю пра свае прыгоды. Стась уважна слухаў. Калі Макар спытаўся ў яго: «Што ты скажаш пра Алену?» — Стась спыніўся і, гледзячы ў вочы Макару, сказаў: — На тваім месцы я застрэліў бы яе, як паскудніцу! Вось як... Вайпацкага... Не, на Вайпацкага шкода кулі. Яго павесіць перад народам... Нелюды... Не, гэтага пакінуць так нельга... Не, не...

— Дзе ж твая дачка Паўліна? — спытаў Макар.

— Уцякала разам з намі... і ўцякла. Прыйшла ўначы. Я сказаў: хай будзе, што ты недзе загінула, хай людзі не ведаюць, што з табою. Ідзі, скуль прыйшла.

— Ну, то дзе ж яна? — не здагадваючыся, пытаўся Макар.

— Пайшла... з партызанамі... Яна ж у мяне дохтар — яшчэ два гады засталося ёй давучыцца. Бачыш, руку мне перавязала...

Макар расказаў Стасю, якое заданне ён атрымаў ад Кудрэвіча.

— Ну, што ж,— адказаў Стась,— заўтра завяду цябе да іх. Возьмеш ад іх аднаго чалавека і пойдзеш у атрад або адразу ўсіх павядзеш. Зробіш як захочаш. Іх дваццаць чалавек — усе з гэтай вёскі... Можа хто падыдзе ўначы, тады пойдзеш з ім, а як не,— я завяду... Хацелі прыйсці ратаваць нас, як эсэсаўцы палілі вёску, але што ж... сіла яшчэ слабая, мала аружжа. Ну, вінтоўкі, адрэзы, аўтаматаў няма, толькі два рэвальверы... Шукаюць аружжа... Словам, пабачыш сам... Але ўсё ж такі засаду зрабілі на падпальшчыкаў. І павят моцна пакалацілі...

— Хадзіце вячэраць,— паклікала Лізавета, якая ўжо распаліла касцёр. Над агародамі слаліся туманы, і ў небе адна за другою сталі з'яўляцца зоркі. Надыходзіла прахладная ноч. Мужчыны дагаварыліся вартаваць на змену. Макар яшчэ доўга бачыў, як языкі полымя ценямі трапяталі на задуманым твары Стася.

Калі «Касцы» набліжаліся да паўдзённай стараны і Стась хацеў ужо збудзіць Макара, прыйшла Паўліна. Яе крокі Стась пачуў здалёк і, прытуліўшыся да шалаша, цікаваў, хто гэта мог быць.

Паўліна перавязала бацьку руку. Пры гэтым прачуў-

ся Макар. Паўліна была рухавай дзяўчынай. Яна самастойна трымалася з бацькам, адначасова ніколькі не зацямняючы гэтым сваёй даччынай ласкі да яго. Стась глядзеў на дачку, як на шчасце, адначасова не перашкаджаючы яе такой разумнай самастойнасці.

Паўліна прылегла ў шалашы, абудзіла маці, пагутарылі з ёю паціху.

Перад світаннем яна і Макар пайшлі ў лес.

VII

Макар выканаў заданне, якое даў яму Кудрэвіч: ён прывёў групу партызан вёскі Нізкая ў атрад. На другі дзень трыццаць партызан, а з імі і Макар пайшлі на апедзень ў вёску Глінянка. Макар ішоў наперадзе, з вінтоўкай на плячы, дзе напрасткі, дзе сцежкамі, дзе зарослымі травой, даўно няезджанымі дарогамі. Партызаны прыйшлі ў вёску Глінянка ў час снедання, калі ўсё насельніцтва было яшчэ дома. Мэтай аперацыі было «накрыць» купіцкую паліцыю, якая, па даных разведкі, мелася быць у Глінянцы.

Партызаны ішлі ў хаты не з вуліцы, а з агародаў. Паліцаі не чакалі такога манеўру і былі засцігнуты знянацку. Іх выводзілі з хат і адводзілі на плошчу. Некаторыя з іх, якія былі ў другім канцы вёскі, паспелі схавацца. Але знаходзілі і тых — каго выцягвалі з-пад печы, каго з вышак, а каго з хлява. Забралі зброю паліцаяў — апрача вінтовак, аўтаматаў і грапат адзін кулямёт з лентамі. Пагрузіўшы ўсё на падводы, паехалі цэлым абозам назад. На пярэдняй падводзе ехаў Макар. Пад'язджаючы к месцу, дзе разыходзіліся дарогі, Макар злез з воза і падышоў да Кудрэвіча. Нешта пагаварылі, і Кудрэвіч выдзеліў трох партызан і загадаў ім ехаць разам з Макарам.

Падвода Макара звярнула ўправа, пакінуўшы абоз. Гэта была дарога ў Дубоўку — вёску Макара. Не даязджаючы паўкіламетра да вёскі, Макар злез з воза і пайшоў цераз лес напрасткі. Макар быў ужо ў сваёй хаце, калі па вуліцы затарахцеў воз, на якім ехала трое партызан і прывязаны да білаў Вайпацкі. Той сядзеў, апусціўшы вочы, і яго вусікі ўжо не тырчалі ўверх.

Алены ў хаце не было. Да Макара прытуліліся дзеці, пыталіся, дзе ён так доўга быў, і расказалі, што захварэла бабуня.

— Чорт яе бяры, дзеткі, гэтую бабуню,— стомленым

голасам сказаў Макар. «Значыць, Алена недзе ў яе»,— падумаў ён.

Алена прыйшла неўзабаве і адразу накінулася на Макара:

— І дзе ты ходзіш так доўга? Тут столькі парабілася без цябе, што жыцця няма. Я думала, што ты згінуў дзе або і цябе забілі. Начамі не спала, чакала. Тут і маці была прыхварэла. Ой, што гэта робіцца! Ці ты ведаеш, што Стэфанавага Броніся таксама тады забілі? Знайшлі яго ў канцы агародаў. Толькі назаўчора пахавалі. Маці цераз гэта была аж прыхварэла. А тут вось і самога Стэфана павезлі нядаўна партызаны.

— Што? Вайнацкага павезлі? — са здзіўленнем спытаўся Макар.

— Вось нядаўна. Нічога ты не бачыш і не знаеш,— тонам крыўды гаварыла Алена. У гэтым тоне было нешта ад звычайнага страху і жаночага прытворства. Можа трэба было б упасці Макару да ног, прасіць прабачэння за ўсе крыўды, якія яму зрабіла, але гэта было б неганарова. Трэба абысці чалавека больш тонкай дарогай, каб падначаліць яго сабе і самой выйсці сухою.

Але Макар маўчаў. Алена даставала ежу з печы, а Макар маўчаў. Вочы схаваліся ў глыбіню пад бровы і сціліся цяжкім, панурым бляскам. Макар толькі гладзіў дзяцей па галоўках і маўчаў. Для яго было ўжо ўсё вырашана канчаткова. Сказаў толькі адно: «Нічога, усё будзе добра...»

Увечары, калі клаліся спаць, Макар падышоў да Алены і шэптам стаў гаварыць нешта такое, што Алена, слухаючы, аж прыўстала на ложку.

— І што я там буду рабіць? — пыталася яна.

— У іх няма каму спячы хлеб. Няма жанчыны. Спячэш ім хлеб і прыйдзеш дадому.

— А ты?

— І я вярнуся.

— Добра, заўтра пабачым. Кладзіся спаць.

— Я ў хаце спаць не буду — пайду ў салому,— адказаў Макар. Хутка апрануўся і выйшаў.

Назаўтра Макар з Аленаю пайшлі ў дарогу.

Дзень быў сонечны і ціхі. Цішыня лесу нагадвала набліжэнне восені. Дзе-нідзе з дубоў паціху падалі адзінокія лісты.

Хацелася стаяць і слухаць гэты шэлест. Адзінокія бярозы хаваліся між дубоў на палянах, з цікавасцю зазі-

раючы на падарожных. На пясчаных узгорках ціха і густа шумелі соспы. Над ручаінамі, з кучаравага алешніку звісаў нікім не крануты буйны хмель. Недзе ў небе крычалі журавы.

Макар з Аленаю прыйшлі ў атрад Кудрэвіча познім вечарам.

* * *

Хто не знае тых ціхіх і сонечных раніцаў, калі на полі стаяць апошнія снапы, калі дацвітае грэчка і пажоўклае проса хіліцца долу. Сонца не спяшаецца падымацца ўверх — яно стаіць доўга над лесам і павольна лье на ціхую прыроду свае прамяні, якія рассейваюцца ў лагоднай і мяккай дымцы, застыўшай над пожнямі, у кустах і ў неабсяжным дрымучым лесе. Як жа свежыя дарогі ў лесе ў гэты час! Учарашнія сляды зацягнуты вільгаццю і, здаецца, трава панова выраслa па стужэлым пяску. У лесе такая цішыня, што трэск сухой галінкі чуцён ясна і звонка, але без шумнага веснавога рэха. Часамі цвірыкне адна птушачка і сядзіць на галінцы маўкліва. Толькі неўгамонны дзяцел стукае прыглушана ў лясной гушчыні.

Макар павольна ішоў лесам з сваімі дзецьмі. Ішоў як бы адпачываючы. За плячыма быў клунак. Любу, як меншую, нёс на руках, а Коля ішоў побач, радаваўся дарозе, лесу. Знаходзіў грыбы па дарозе, паказваў бацьку. Люба не хацела адставаць ад яго і рвалася з рук на зямлю.

Макар прыпамінаў той час, як ён ішоў ад партызан з каробкай за плячыма. Тады таксама стукаў дзяцел. Але тады была росная свежасць лесу, хацелася дыхаць і жыць поўнымі грудзьмі. І чым больш вострым было гэтае жаданне, тым было яно больш балючым — тады быў пачатак яго трагедыі. Хацелася крыкнуць: не спявайце, птушкі, не прыхарошвайцеся, бярозы, калі я іду. Памажыце мне быць такім, як вы.

«Чаму не магло быць іначай? — падумаў Макар.— Хто ў гэтым вінават? Доктар Кургапаў казаў, што тут вінавата міпулае... што мы павінны ліквідаваць гэты перажытак... І пісьменны разумны Стась казаў тое самае, хоць па-свойму... Мудра ўсё гэта...»

— А чаго ты, тата, плачаш? — спыталася Люба, убачыўшы слязу на вачах Макара.

— Чаго я плачу? Не, я не плачу. Чаго я буду плакаць, Любачка? Не, гэта так сабе.— І ён пацалаваў дзяўчынку ў свежую дзіцячую шчаку.

ПАЧАТАК

I

Маладая бярозка задрыжала пад ударамі сякеры. Хвіліну перад гэтым яна красавалася на вуліцы, трапятала лісточкамі пад сонцам. А цяпер тры-чатыры ўдары сякерыры, і яна ляжыць, яшчэ свежая, поўная соку, але з прыпаўшымі да зямлі галінкамі. Як астатак ад яе, на зялёнай вулічнай мураве, ля пратоптанай сцежкі, тырчаў белы агузак-пень.

Пранук Альшэўскі дабіваў да рэшты і пня, раўняў яго з зямлёю. Кінуў сякеру на траву і выпрастаўся ва ўвесь рост. Стаў, узяўшыся ў бокі. Да лба, над казырком кепкі, прыліплі светла-рыжыя пасмы.

— Анеля! — крыкнуў раптам.— Хадзі сюды!

З хаты ніхто не выходзіў.

— Анеля! Заняло табе там, ці што?!

З хаты пачулася: «Зараз, не верашчы!»

І сапраўды, тон Прапука быў не той звычайны крык, якім клічуць чалавека на адлегласці, а нейкае дзікае галёканне.

Неўзабаве на парозе паказалася тоўстая жанчына сярэдніх год у сажань ростам. На вялікім круглым твары спалохана блішчалі шэрыя вочы.

— Хадзі сюды, паглядзі! — затупаў на адпым месцы Пранук.— Я думаю, тут пашырыць падворак. Шулу паставіць вось тут.— І ён узяўся ў бокі, пахаджваў на месцы, тупа глядзеў на мураву, усыпаную белымі трэскамі маладой бярозкі.

— Як абгародзім вуліцы пагэтуль,— Анеля паказала рукою,— тут пасею лён. Будзе расці ў свяжыне. Сёння пачынай гарадзіць, Прапуня.— Так называла яна свайго «лыцара».

Людзі, праходзячы па вуліцы, паглядвалі на гэтую пару, з якое адзін тонка выкрыкваў, а другая гудзела, як чмель. Некаторыя прыпыняліся для гутаркі, але ніхто не пытаўся, што і нашто робіць гэта Пранук, хоць у кожнага гэтае пытанне карцела на зубах. Толькі дзядзька Арсен, ідучы пасярэдзіне вуліцы прысадзістай ступою, сказаў, не прыпыняючыся:

— І нашто гэта работа, Пранук? Хаї бы стаяла дрэўца. Яно ж насаджана было на тое, каб расло. Такая харошая была бярозка, ай-я-яй...

— Садзіў калгас, а не я! — крыкнуў Пранук услед дзядзьку Арсену.— А цяпер скончыліся калгасы!..

Грамадка людзей стаяла, патупіўшы галовы.

Якраз у гэтую хвіліну да іх падышоў чалавек у шэрай кепцы, з худым тварам, на якім бліскалі цёмныя вочы. Яго ў вёсцы звалі бежанцам. Гэта быў адзін з тых, якія пры адступленні на ўсход не дайшлі да мэты, а змушаны былі прыпыніцца ў выпадковай вёсцы.

— Трэба ўсіх павысекваць,— дадаў Пранук і павёў позіркам па людзях. Сустрэўся вачыма з бежанцам. На нейкі міг іх зрокі скрыжаваліся і згаслі. Пранук апусціў вочы, як злоўлены на непрыстойным учынку. На каго быў намёк — «павысекваць», людзі ведалі і маўчалі.

Бежанец Пятро Зараневіч, аграном аднаго з саўгасаў Беларусі, усяго толькі тыдзень як прыпыніўся ў гэтай вёсцы мазырскага Палесся з жонкаю і двума малымі дзецьмі, прыйшоўшы сюды пехатою аж з заходняй мяжы рэспублікі.

Сын селяніна-серадняка Баранавіцкай вобласці, Зараневіч прайшоў цяжкі шлях сваёй маладосці. Атрымаў сярэднюю адукацыю падчас бежанства ў Расіі на Тамбоўшчыне. Вярнуўшыся з бацькамі з Расіі, малады Пятро Зараневіч падаўся ў Вільню да дзядзькі, які меў свой агарод і працаваў столярам. Там намагаў дзядзьку як у агародзе, так і ў сталярцы. Адначасова рыхтаваўся да паступлення ў Віленскі універсітэт на агранамічны факультэт, да чаго заахвочваў яго дзядзька.

Там жа, у Вільні, пазпаёміўся з сынам аднаго вядомага адваката, студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта, і па пратэкцыі яго бацькі быў дапушчан да экзаменаў.

Аднак скончыць агранамічны факультэт Зараневічу не ўдалося: на апошнім курсе, у 1933 годзе, быў арыштаваны за прыналежнасць да камуністычнай партыі і асуджаны на пяць год, якія і адбыў у розных турмах фашысцкай Польшчы. Гэта было якраз тады, калі Зараневіч звязаў свой лёс з вясковай дзяўчынай Надзяй, якая кожнае лета прыязджала ў Вільню да свайго брата, рабочага радыёзавода, суседа дзядзькі Зараневіча, а ў той 33-і год засталася і на зіму. Хацела паступіць у беларускую гімназію. Паступіць не ўдалося, і яна пасля арышту Пятра вярнулася ў вёску. У наступны год нарадзіла сына Лёніка,

дапамагала Зарапевічу ў турмах, ездзіла на пабачэнні, чакала яго.

Зарапевіч выйшаў з гродзенскай турмы ў снежні 1938 года і паехаў да жонкі ў адну з вёсак Брэстчыны, а пасля зноў падаўся ў Вільню да прафесара, у якога, будучы студэнтам, працаваў у лабараторыі асістэнтам. Прафесар яго прыняў на тую самую працу.

Па вызваленні Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй Зарапевіч камандаваў атрадам рабочай міліцыі па ўстанаўленню ў горадзе рэвалюцыйнага парадку. Пасля некаторы час працаваў намеснікам старшыні Часовага Упраўлення горада. Потым вярнуўся ў сваю вёску і стаў працаваць аграномам у саўгасе, створаным у былым панскім маёнтку.

...Зарапевіч адышоўся ад грамады людзей і паглядзеў уздоўж вёскі. Вёска была заселена з хутароў падчас калектывізацыі, пабудавана нанава на шырокім узгорку, блізка абкружаным лесам. Шырокая вуліца, роўная лінія хат гаварылі аб новых планах, аб пашырэнні жыцця чалавека. Сям-там на вуліцы пры хатах стаялі бярозкі, маладыя клёны і нават яблыні.

Вось адна з такіх бярозак сталася ахвяраю Альшынеўскага, кулака ў мінулым, які ганарыўся сваім шляхецкім паходжаннем. Жывучы на краі вёскі, задумаў прыгарадзіць кавалак вуліцы да свайго агарода. У гэтым перашкодзіла бярозка. І вось яна ляжыць, і вянуць яе лісці.

— Адкажаш ты і за гэтую бярозку,— сказаў сам сабе Пятро Зарапевіч, скіроўваючыся ў сваю хату-кватэру. У хаце жонка карміла груднога хлопчыка пішчымпай заціркай. На палку стаяў пуд грэчкі, зароблепай малацьбой. Большы хлопчык, шасці год, спаў на лаве, і яго босыя ногі абселі мухі.

Жонка вырашыла ісці па людзях — назбіраць трохі льну, каб сабрацца на якую-небудзь вопратку. Пачалася сумпая гутарка. Пятро наўтарыў сваю сталую думку аб пошуках партызан. Гэта была восень сорак першага года.

* * *

— Не спраўдзіліся вашы надзеі, Пятро Данілавіч, і мае таксама ,— гаварыў цяпер ужо былы брыгадзір калгаса Кастусь Говар, самы верпы чалавек у вёсцы. Ён апусціў

галаву і змоўк. Сябры сядзелі па калодзе, па падворку Говара. Ззаду іх, воддалі, сцяною стаяў лес, які застыў у асенняй дрэме.

— Што ж сталася, Канстанцін Андрэевіч? Кажэце...

— А сталася тое, што атрада ўжо няма...

— Як няма? — схапіўся Пятро.— Што з ім?

— Нехта выдаў стаянку атрада, і ў белы дзень пагралі эсэсаўцы і рассеялі яго. Забралі ўсю маёмасць... Ой, лепш не гаварыць...

І дзядзька Кастусь махнуў рукою і застагнаў.

— Ну як жа гэта магло стацца? Дзе ж была разведка, варта?

— Той гад прывёў эсэсаўцаў да самай стаянкі. Кажуць, што так...

І сябры напурылі галовы ў маўчанні. Пятро ўскочыў з месца, захадзіў туды і назад, сціскаючы кулакі.

— Вось, на табе... Што гэта сталася? Няўжо тут прыйдзецца чакаць?.. Чакаць невядома чаго. Гэта ж забойства душы і цела!

У адказ саркастычна стаў выліваць сваю злосць Говар. Ён гаварыў такім тонам, як бы здзекаваўся над кім: «А будзеш чакаць, нікуды не дзенешся... Будзеш глядзець, як розныя Пранукі і Анелі прыгароджваюць сабе вуліцу, ломяць, топчуць тое, што калісьці з такімі цяжкасцямі будавалася. Го-го! Яны цяпер галовы ўзнялі... Льюць гразь, як з вядра, на нашы галовы...»

Зараневіч слухаў гутарку Говара і ўнутрапа ўсміхаўся. Падумаў: «Забрала дзядзьку за жывое... Ды і як тут не забраць? Былое кулацтва пачынае ажываць,— гэта факт...»

Раптам затрашчала галлё, і Говар зрабіў перасцерагаючы рух рукою. Перад імі як з зямлі вырас Пранук з аброццю ў руцэ.

— Ці не бачылі тут майго капя? — залюлюкаў ён.— Каб яго пранцы... Дзе ён падзеўся? Шукаю ўжо можа з гадзіну...

І раптам:

— Што чуваць?

— А што? Бачыш, ціха,— адказаў Говар,— і ветру няма.

— Гітлераўчыкі цішыню зрабілі,— працягнуў Пранук і, выскаліўшы зубы, ніякава паглядзеў на лес.

— Як па-вашаму,— нечакана звярнуўся ён да Зараневіча,— Саветы перамогуць ці не?

— Я таксама ў вас магу спытацца — пераможуць ці не,— адказаў Зарацевіч.

— Ну, вы пісьменныя, а я што?

— Адкуль вы ведаеце, што я пісьменны?

— Ну, яно можна пазнаць.

Кашачыя, з жоўтымі зрэнкамі вочы Пранука хціва забегалі па твары Зарацевіча.

— А мне здасцца, што ўсё ж такі Саветы пераможуць...

Але тут ужо не сцярпеў Говар:

— Што ты прыстаў да чалавека? Што ён, генерал які, ці што? Хто што можа ведаць цяпер?

— Ну...— махнуў рукою Пранук і адвярнуў галаву. Стаў ціхенька свістаць праз зубы. Затым хутка ўстаў і, сказаўшы з падскокам у голасе, паўтараючы адно і тое: «Пайду шукаць, пайду шукаць... каб яго ліха...» — пайшоў у кірунку лесу.

Зарацевіч і Говар маўчалі, пакуль Пранук не аддаліўся.

Першы загаварыў Говар:

— От, чортава племя... Бачыце, як падлазіць. Назолаю лезе чалавеку ў вантробы...— І закруціў галавою.

— Няхай сабе брэша,— сказаў Зарацевіч,— няхай хітрус... Мы з вамі, Канстанцін Андрэевіч, усё роўна разумнейшыя за яго... Вось кажэцс, што нам далей рабіць?

Говар апусціў свой трохі дзюбаты нос, панурыўшы ў зямлю шэрыя вочы. На загарэлым твары глыбей вызначыліся маршчыны. Старая зліпялая кепка злезла на нос — ён яе адкінуў назад.

— Пачакаць... Што будзеш рабіць? Зіму прыйдзецца пачакаць. Адмерым вам трохі бульбы з калгаса, а што заробіцс...

Зарацевіч некалькі разоў праішоўся туды і назад перад калодаю.

— А каб схадзіць у разведку? Вы ж камандзіра атрада ведалі. Як кажацс, гэта быў нават ваш друг. Вам трэба даведацца, жывы ён ці не. А я схаджу ў Бор да каваля падвастрыць сякеру. У кузні заўсёды бываюць людзі з розных вёсак. Кузня — гэта часам проста бюро даведак. Ты можаш сабе маўчаць і толькі слухаць ды на вус накручваць.

— Добра. Гэта то мы зробім. Заўтра вазьму тры пуды жыта і паеду да млына ў Бярозаўку. Там... даведаюся.

* * *

Стары каваль, па прозвішчу Дубовік, гартаваў сякеру. Яго сухія спрацаваныя рукі ўпэўнена бралі патрэбныя нарэчы, хадзілі без прыпынку ад горана да кавадла і назад адварот. З-пад молата пырскалі іскры. Увіхаючыся ля работы, на хаду кідаў каму-небудзь: «Паддуй, паддуй, браце... Мацней... цішэй...» І адначасова не пераставаў гутарыць. У перапынках браўся ў бокі і гаварыў, як аратар, стараючыся здзівіць слухачоў надзвычайнасцю падзей:

— Разышліся, бедныя, па вёсках хто куды... Камандзір Каленік... ведаеце Каленіка? Ну, што быў у нас старшынёю сельсавета, кажуць, падаўся ў тураўскія лясы. Сем чалавек іх пайшло...— Крыху памаўчаўшы, уціраючы ад поту сівыя вусы, дадаў: — У Акцябрскім раёне таксама аб'явіліся партызаны... У Петрыкаве гэтымі днямі ўзарвалі параход на Прыпяці...

— А як далёка адгэтуль да Акцябрскага раёна? — спытаўся Зараневіч, круцячы тачыла.

— Далёка,— з нейкай павагай сказаў Дубовік,— кіламетраў сто дваццаць, калі не больш.— Дубовік памацаў астрыё сякеры пальцам і, сказаўшы «гатова», перадаў Зараневічу.

— Бой быў нядаўна за Смаленск,— гаварыў няўмоўкны Дубовік, стоячы ўжо пры гораце.— Смаленск тры разы пераходзіў з рук у рукі. Лягло шаснаццаць гітлераўскіх дывізій і пашых восем...— Каваль задаволеным вачыма азірнуў усіх. Настала кароткая паўза.

І раптам да вушэй Зараневіча, схіленага над тачылам, дзе ён абчышчаў сякеру, данеслася знаёмае люлюканне: «Колькі, колькі лягло нямецкіх дывізій?» Зараневіч не верыў сам сабе — адкуль гэта? Як прывід які... Азірнуўся цераз плячо. Так — ён. Нахіліўся наперад, над кавадлам, у бок каваля і пытае: «Колькі, колькі лягло нямецкіх дывізій?»

Дубовік яшчэ раз адказаў: «Шаснаццаць, а пашых восем».

— А я чуў наадварот,— нямецкіх восем, а пашых шаснаццаць.

— То дрэнна ты чуў,— адказаў каваль,— праходзіў адзін ваенны, уцёк з-пад капвою, і казаў, сам быў у баях.

— Не, бо я чуў, што пашых шаснаццаць, а нямецкіх восем,— робячы нявінны твар, адказаў Альшыпеўскі.

— Як па-вашаму, магло так быць, як ён кажа? — звярнуўся Пранук да прысутных, а свой зрок прыпыніў на Зараневічу. Прысутныя маўчалі. Тады Пранук проста звярнуўся да Зараневіча: «А па-вашаму як?»

— Слыхам зямля поўніцца. І, мусіць, нездарма гаворац, што лягло шаснаццаць дывізій гітлераўскіх...

Пры гэтых словах Зараневіча заварушыліся і прысутныя сяляне — амаль загамапілі:

— Такі ж нездарма... Мусіць, праўда, калі ўсе гаворац...

— Дзе ж тыя дывізіі, калі немцы ўжо Маскву абкружаюць? — збедпена сказаў Пранук.

Тут каваль не выцерпеў і павысіў голас:

— Маскву ўзяць — гэта не лёгкая справа! Перш нос утры, чым так гаварыць. Ого, Маскву ўзяць... Кажы, чаго прыехаў, а то зараз пайду абедаць.

Альшыпеўскі крыху змяшаўся. Хутка залюлюкаў:

— Я прыехаў, можа ўставіш мне новую ўтулку ў кола?

— Прыедзеш другім разам,— жорстка адказаў каваль,— цяпер маю тэрміновую работу. Мушу скончыць.

У кузні стала ціха. Пранук патупаў, аглянуўся туды-сюды і неспадзявана для сябе заўважыў, што Зараневіча ў кузні ўжо не было. Як спалохапы, замітусіўся:

— Трэба ехаць, трэба ехаць...

* * *

Анеля толькі што скончыла біць свайго старэйшага хлопца год шасці і яшчэ лямантавала на падворку. Ля плота стаяў без шапкі загарэлы хлапчук і верашчаў. Анеля біла хлопца незвычайна: падняла адной рукою і кінула аб зямлю, а потым штурхала сваёю тоўстаю нагою так, што хлопец ад удараў каціўся па падворку, як клубок. Гэта магло б прадаўжацца, калі б не набеглі суседзі і не сталі крычаць на раз'юшаную Апелю.

Пранук з разгону ўехаў на падворак. Якраз у гэты момант Анеля падняла сваё кулачышча пад нос хлопцу і, скрыганўўшы зубамі, крыкнула: «Сціхні! Замры!» Хлопец увабраў галаву ў плечы і, увесь пасінеўшы, стаў сціхаць, з дрыжаннем глынаючы слёзы.

Пранук з ярасцю распрагаў каня: аглоблі адна за другою з трэскам стукнулі аб зямлю. Выводзячы каня з аглабель, пачаставаў яго нагою ў дыхавіну і ўдарамі аброці выгнаў на вуліцу.

— Ты чаго плачаш? — спытаўся ў хлопца.— Хочаш, то я яшчэ папраўлю.— І паказаў хлопцу аброць з жалезнымі цуглямі.

— Апеля, давай абедаць! — галёкнуў, яшчэ не заходзячы ў хату.

— Дам, дам,— глуха, як з-за сцяны, пачуўся голас Апелі,— не памрэш. Выпетрала цябе так хутка.

Прапук сёрбаў капусны боршч, размашыста закідваючы лыжку ў рот, і час ад часу пазіраў у акно, схіляючы галаву то ўправа, то ўлева.

— Бежанец дома? — спытаўся.

— Няма. Паішоў жа сякеру ладзіць да каваля. Хіба ты там яго не бачыў? — адказала Апеля.

Прапук скончыў есці, выцер губы рукавом і, адкапляўшыся, адказаў:

— Ты вось што... пазпаёмся з жонкай бежанца. Схадзі туды па што-небудзь. Можа, прагаворыцца, кім яны былі пры Савстах. Мне здаецца, што яны былі багатыя, зарабілі добра. Трэба даведацца.

— Я схаджу... Можа ў яе верацёны ёсць... Замапуся. Я і сёння з ёю гаварыла. На размовы яна падатная.— А потым ціха дадала: — Мне здаецца, у іх грошы ёсць. Няўжо яны без грошай?

Апеля на другі дзень пайшла да бежанкі, сукала там піткі, ведучы абыякавую суседскую гутарку. Часам паглядала з-пад броваў у запечны куток, ці не ляжыць там што-небудзь надзвычайпае, чаго яна яшчэ не бачыла. На сцяне, на цвічку, вісеў кішанёвы гадзіннік з ланцужком, і Апеля, сукаючы нітку, раз прыпынілася перад ім і спытала:

— Мусіць, дарагі гэты гадзіннік?

— Я і не ведаю, колькі ён заплаціў,— сказала бежанка.

— Колькі ж браў у месяц ваш чалавек?

— Нешта трыста рублёў...

— Ого, усё ж такі...— здзівілася Апеля і шпарка крутпула верацяно ў далонях.

Адной галінай маладая густалістая яблыня глядзіць у акно. Здаецца, што яна ведае ўсе сакрэты. Калі бежанка чагосьці выйшла з хаты, Апеля падышла да чорнага зімовага паліто, якое адно вісела на сцяне. Паглядзела падшыўку, памацала каракулевы каўпер. Нават не вытерпела, паглядзела ў калысцы пад галавою ў дзіцяці. Вецер мацней зварухнуў яблыньку, і цені мітусліва за-

бегалі на сценах. Анеля раптам выпрасталася, рукі яе задрыжалі, і на момант густая чырвань разлілася на яе скуластым твары. Яна спалохалася ценяў яблынькі. Хутка пачала сукаць ніткі і, дайшоўшы да дзвярэй, стала ніць ваду.

Бежанка вярнулася ў хату. Анеля прыгнулася, каб паглядзець у акно на сваю хату, якая стаяла на другі бок вуліцы наўскос. Паправіла хустку на сваёй вялікай галаве і сказала:

— Пара ўжо ісці дадому, зараз поўдзень.— І дадала: — Зайдзі ка мне, дам табе місачку ячменю, паможаш мне церці лён.— І выйшла з хаты.

Пятро Зараневіч ужо к вечару прыйшоў з лесу, дзе ён рабіў почвы. Змораны, галодны, паставіў почвы ля печы і выцер пот з ілба. Адчуў палёгку ў целе і душы, калі ўзяў дзіця на рукі. Жонка налівала з гаршка нішчымны картапляны суп.

Калі жонка расказала аб візіце Анелі і аб «місачцы ячменю», Зараневіч рашуча забараніў ісці да яе.

Апошняя гутарка з Говарам (пасля разведкі) не дала жаданых вынікаў. Стопудовым цяжарам лягла на сэрцы Зараневіча туга. Нейкі ўнутраны голас падказваў Зараневічу: «Калі нельга нічога зрабіць, застаецца пакуль адна задача — захаваць сябе, бо ты чалавек. А як пачнуць складацца спрыяючыя ўмовы, пачынай дзейнічаць...» Калі дайшоў да гэтай думкі, на момант стала лягчэй на душы, бліснула супакойваючая яснасць. Але праз хвіліну бровы зышліся, і глыбокая маршчына прарэзала лоб.

«Стой,— сказаў сам сабе Зараневіч, як бы злавіўшы сябе па нейкім учынку,— ці ж так? Не, штосьці не так... А хто ж гэтыя ўмовы зложыць? Гм... Сам жа ты — Зараневіч, павінен быць першым будаўніком гэтых умоў... Так, так, брат, а не інакай...»

II

Ходзіць па лесе Зараневіч, ходзіць... Ён збірае грыбок за грыбком. У чырвонай медзі стаяць дубы, у празрыстым золаце — бярозы. Усё прыціхла, як перад якой тайнаю. І Зараневічу здаецца, што і лес сумуе тым самым сумам, што і ён. Зараневіч падняўся на ўзгорак і лёг на мураве над соснамі. Якая ж цішыня і адзінота! Спеў-

ная ляспая плынь у сасновых вяршынях навявае бяздумнасць. Здасцца, што чуваць нават, як расце трава.

На самую ніскую галіну сасны села жаўтагрудая птушачка. Яна не шчабятала, а толькі кудысьці ўглядалася адным вочкам, схіляючы сваю серабрыстую галоўку. Зараневічу здалося, што птушачка ўзіралася на яго. Ён, як бы зпячэўку, схапіўся з месца і пайшоў бязмэтна па дарозе на поўны крок. Не памятаў, колькі прайшоў, а толькі ўрэшце заўважыў, што дарога з пясчанай стала травяністаю, і каляіны мала-памалу пачалі згладжвацца, гінуць. Стаў і азірнуўся навокал. Яго абкружала гушчыня некранутага лесу. Здавалася, што тут не ступала чалавечая нага. Прасвечвалася сонцам лісце граба ў ціхіх урачыстых скупішчах вяршынь, а панізе густа разрослся арэшнік, бераэняк, маліннік, і ўсё пераплялося травою. Нешта бліснула воддаль у кустах: ці то вочы якога звера, ці кусочак ручаінкі мільгануў, ці можа так толькі здалося? Зараневіч прайшоў далей, пралез праз гушчар і сапраўды знайшоў адзінокую ручаіну. Прыслухаўся. Недзе цурчала вада. Цяністая ручаіна вілася, прабіваючыся між карчоў, а ў яе ўглядаліся маладыя вольхі, арэшнік, каліна. Віўся хмель, слаўся зялёнымі сакавітымі лістамі чартаналох, а воддаль, на заломе, як на паказе, стаяла рабіна, і ад гропак яе чырвоных ягад долу гнуліся галіны.

Нешта зашуршала недалёка, як бы абцерлася аб лісце кустоў. Зараневіч насцярожыўся. «Не, такі нешта тут ёсць...» Расхіляючы кусты, пайшоў назад і, калі выбраўся з гушчару, убачыў прад сабою, як укопанага, Альшэўскага. Гэта было нечакапа сустрэць яго тут. Зараневіча, як маланкаю, прарэзала думка, што вось гэты рыжы шляхтуи ішоў за ім крок за крокам.

— Чаго вы зайшлі аж сюды? — спытаўся Альшэўскі.

— Бачыце, грыбоў шукаю...

— Тут жа грыбы не растуць... Не, тут грыбы не растуць. Як жа вы далёка зайшлі ад вёскі...

— Лес, я думаю, для ўсіх, і кожнаму можна хадзіць па ім,— адказаў урэшце Зараневіч.— А вы чаго зайшлі сюды?

— Я хадзіў у Асташава і цяпер пацянькі іду дахаты.

Для Зараневіча было ясным, што такі адказ — гэта хлусня, але трэба было неяк вывесці бэстыю на чыстую ваду, і для таго пайшоў назад з ім разам.

Калі выйшлі на шырокую паляну, на якой раслі толькі адны дубы, селі, закурылі. Альшынеўскі лёг, падпёршыся рукою.

— Цяжка вам жывецца,— загаварыў хітрым топам спагады.— Пакуль скончыцца вайна, пацерпяць людзі. А вайна хутка скончыцца. Будуць намі кіраваць гітлераўцы... І вам дадуць зямлі. Яны — гэта ж культура...

Зарапевіч больш маўчаў. Перавёў гутарку на другое, спытаўшы:

— Можа, вы паходзіце з шляхты? Нешта мне так здаецца...

— О, так, з шляхты, з шляхты... Мой бацька і дзед былі шляхтаю. У нас быў багаты хутар у лесе. Будзем ісці, я вам пакажу. Былі валы, коні, кароў многа, свіней, на паляванне хадзілі, дзікоў білі...— Альшынеўскі захапіўся ўспамінамі.— Як установіцца фашысцкая ўлада, вярнуся назад у лес.

— І будзеце зноў шляхцічам? — спытаўся Зараневіч.

— Я і цяпер шляхціч... А хто ж?

Зараневіч усміхнуўся і сказаў:

— Вы вось так ганарыцеся гэтым шляхецтвам, а, напэўна, не ведаеце, адкуль шляхта паходзіць? Як хочаце, дык я вам магу расказаць.

— Чаму не ведаю? Ведаю. Круль нас зрабіў шляхтаю, польскі круль... А ну, раскажыце, цікава, як гэта было?

— Ходзіць у народзе такі сказ,— пачаў Зараневіч,— што бог тварыў шляхту, а не круль. Круль сам быў шляхцічам. Вось слухайце: захацелася богу... ну, скажам, да ветру...

— Разумею, разумею,— трохі пахмураны, але зацікаўлены, казаў Альшынеўскі.

— Пайшоў бог да ветру,— прадаўжаў Зараневіч.— Тая божая патрэба стала падаць з неба. Калі, скажам, упала пад дубам, там вырас пан Дубоўскі, калі, скажам, пад бярозаю — вырас пан Беразоўскі, а калі пад альшынаю — вырас пан... Аль-шы-неў-скі... і так далей. Так што шляхта, як бачыце, вось з чаго паходзіць...

Альшынеўскі так нечакана быў прыхоплены такім канцом расказа, што ў адну хвіліну зморшчыў лоб, даходзячы да сэнсу, а потым коратка пырснуў смехам, як драч, і раптоўна змоўк, зачырванеўшыся.

— Ну, штукар з вас... штукар. Няма чаго казаць,

штукар...— І Альшыпеўскі закруціў галавою, як бы адганяючыся ад мух.

— Што я зраблю — з песні слова не выкіпеш. Як ёсць, так і ёсць, нічога не зробіш. Трудна...— адказаў Зараневіч, развёўшы рукамі.

— Ай-яй-яй... Колькі жыву на свеце, яшчэ гэтага не чуў...— здзіўляўся Альшыпеўскі, усё далей круцячы галавою.

— Пажывеце, яшчэ не тое пачуеце ад людзей,— з рэзонам гаварыў Зараневіч.

Размова больш не клеілася. Яшы ўсталі і пайшлі. Альшыпеўскі ішоў насуплены, мусіць, перажываў усё ж такі расказ аб стварэнні шляхты і адчуваў сябе сапраўды пакрыўджаным, бо ўсю дарогу больш маўчаў. Меркаваў пешта сам сабе, гледзячы пад ногі. Здавалася, што часамі забываўся аб прысутнасці Зараневіча.

— А яшчэ кажаце, што вы малапісьменны,— мармытнуў у такт сваім думкам Альшыпеўскі,— а такія штукі ўмееце адліваць.

— На гэта не трэба быць пісьменным. Я гэты расказ чуў даўно ад старога, зусім непісьменнага чалавека,— адказаў Зараневіч і, дадаўшы: — Бывайце здаровы,— павярнуў налева на вузкую дарожку.

— Вы куды, вы куды? — зачасціў услед Альшыпеўскі.

— Хачу яшчэ пашукаць грыбоў! — крыкнуў Зараневіч і знік за павароткай.

Калі Зараневіч праз гадзіны дзве вярнуўся дахаты, жонка сказала, што ў вёсцы былі два пямецкія жандары і што яна з дзецьмі ўцякала ў лес.

— Жандары паехалі нядаўна назад, я сама бачыла, як была ў лесе, і тады вярнулася.

— Чаго ж ты ўцякала? Гэта толькі можа пагоршыць справу. Вось якая ты наіўная!

— Суседка Ганна прыйшла і сказала, каб я дзе схавалася, бо чула, як Альшыпеўскі гаварыў, што трэба і ў бежанца зрабіць вобыск. Тут жандары шукалі аружжа.

— Гм...— задумаўся Зараневіч.— Та-а-ак... Гэты Альшыпеўскі...

Глянуў у акно. Ля сваіх весніц стаяў Альшыпеўскі і глядзеў уздоўж вуліцы, выскаліўшы зубы.

— Гэта — спрут,— акрэсліў Зараневіч.— Ёп ліпис, як спрут... Пабачым, пане шляхціц, што ты яшчэ дакажаш.

III

Стараста Іван Мазунік вяртаўся на світанні дахаты ад сваёй палюбоўніцы Зосі і думаў, як жа сустрэне яго жонка, якую людзі празвалі «слязою». Вечна ў яе ліліся слёзы, што аж шчокі навымакалі ад іх. Стараста ішоў босы. Чорная шапка-казырок тырчала над ілбом. Доўгі прыплюспуты нос, пад якім прыліпалі да губы русыя і рэдкія па адной валасінцы вусы. Не раз гэтаму чалавеку казалі людзі на вуліцы:

— Іван, і чаму табе не загадае Зося, каб ты пагаліў свае вусы?

— Наадварот, яна просіць, каб я іх не галіў,— адказваў Мазунік з наіўнасцю прастака і ішоў далей сваёй дарогай, а ўслед яго даганяў рогат.

Рукавы курткі, накінутай на плечы, матляліся ў такт кроку, і гэта рабіла ўражанне, што ідзе задаволены пачнымі прыгодамі дзяцюк-рамантык.

Стараста з дарожкі, якая ішла папярок агародаў, звярнуў у разору і скіраваўся на падворак Альшынеўскага. Сюдой яму ісці было найпрасцей, а па-другое, нашто паказваць сябе на вуліцы. Пералезшы цераз весніцы, ён убачыў Альшынеўскага, які выходзіў з хлява.

— Рана, рана, стараста, ходзіш...

— Хто рана ўстае, таму бог дае,— адказаў Мазунік.— Думаю сёння збіраць сход, раздзяліць трэба калгаспую бульбу.

— Даўно трэба было гэта зрабіць. І яшчэ табе скажу, Іван, трэба гэтага бежанца выселіць з вёскі.

— Як выселіць? Прагнаць? Ён жа, здаецца, пікому шкоды не робіць...

— Ходзіць па лесе, ліха ведае, чаго шукае. Кожны дзень, кожны дзень... Заявіць у жандармерыю ў раён, няхай дапросяць. А то, калі што здарыцца, уся вёска будзе адказваць, а ў першую чаргу ты...

Стараста адчуў сябе закрапутым і абедзвюма рукамі стаў рабіць такія рухі, як бы хацеў ад каго адапхнуцца.

— І вось табе кажу, Прапук,— як бы скардзячыся, трохі сіпла загаварыў Мазунік,— чаго я не бачу, аб тым не магу гаварыць. А як чалавек ні ў чым невінаваты, тады што? Вось у чым справа,— даводзіў Іван і паправіў куртку на плячы, якая хацела з'ехаць.

— Тады вось што,— пашурпіўшыся спрасоння, ска-

заў Пранук,— давай пераканаемся, калі ты не верыш. Як трэба будзе, я па цябе прыйду... Добра? — І засадзіў правую руку за пазуху.

* * *

Дзень быў ціхі і хмарны. Сонца не паказалася ні на хвіліну. Такая ж самая, ціхая і хмарная, надышла ноч. Дрэвы і будынкі здаваліся ў цемры таямнічымі ценярамі. Усё прытаілася ў вёсцы. Не чутно было нават брэху сабак.

Зараневіч ляжаў на лаве ля акна. Доўга не спаў. Як толькі ім стала авалодваць дрэма, пачуўся лёгкі стук у шыбіну: тук, тук, тук...

Зараневіч прыўзняў галаву, паслухаў. Стук не паўтараўся, і ён падумаў, што гэта так прыдалося. Павярнуўся на бок. Толькі заплюшчыў вочы, і зноў: тук, тук, тук... Зараневіч прыўстаў і сеў. Потым ціха падышоў да перадпечнага акна, адкуль іменна і даносіўся стук. Пачуў, як нешта асунулася за акном. Упаўголаса спытаўся:

— Хто там?

Нешта зноў асунулася і прыліпла да шыбы. Моцным шэптам данеслося:

— Пятро Данілавіч, адчыніце.

Зараневіч адразу здагадаўся, хто гэта, і хутка пабег у сенцы. У хату ўвайшоў Говар.

— Як вы моцна спіце, не дастукацца,— прамовіў і стаў шукаць кубка ля вядра, каб напіцца вады.

— Вы надта ж паціху стукалі, і я думаў спачатку, што гэта так сабе.

— Іначай не можна, Пятро Данілавіч. Трэба, каб не пачула гаспадыня хаты, а мо і яшчэ хто-небудзь. Рэч у тым, прыйшоў да мяне мо паўгадзіны таму назад мой добры знаёмы, лесавод, і хоча пагутарыць з вамі. Чалавек ён верны, адукаваны. Можа нешта трохі расказаць.

— З вялікай прыемнасцю, Капстанцін Андрэевіч.— І стаў апранацца.

Ціхенька адчынялі дзверы і ціхенька іх зачынялі. Лезлі цераз платы, цераз агароды, вобмацкам праз цемру, час ад часу прыслухоўваючыся, каб дзе на каго не наткнуцца. А тут яшчэ туман паплыў па зямлі.

У Говара на кухні з адным акном было яшчэ цямней. Зараневіч і лесавод паціснулі адзін аднаму рукі проста

павослеп. Закурылі. Запалкаў не было. Выкрэсвалі «губку», і Зараневіч, калі прыкурваў лесавод, намагаўся разглядзець яго твар. Разгледзеў толькі нос: ён быў просты і шыракаваты, а над ім бліснулі невялікія чорныя вусы. «Значыць, брунет»,— заключыў Зараневіч. Голас у лесавода быў ціхі, стомлены.

Сябры селі трохкутнікам і наблізілі галовы адзін да аднаго. Гаварылі паўшэптам. Тры папяросы бліскацелі ў цемры.

— Трэба вам сказаць, што... Каленік жывы і жывыя тыя таварышы, што пайшлі з ім разам у тураўскія лясы. Словам, з атрада загінула толькі два чалавекі, астатнія захаваліся. Але ў гэтым раёне пяма піводнага. Каленік хоча ўсіх збіраць, чаму і даў загад, каб на працягу зімы ўсе вярнуліся ў свой раён. Сам таксама накіруецца сюды.— Апошнія словы лесавод сказаў павольна і зусім шэптам. Перадыхнуў і пацягнуў з тоўстай папяросы так моцна, што на момант ва ўсёй кухні пасвятлела. Папрасіў у Говара:

— Дай, Андрэевіч, яшчэ кубачак кваску. Надта ж смачны... люблю...

Выпіўшы квас і ўцёршы вусы рукавом, гаварыў далей:

— Вам,— звярнуўся да Зараневіча,— трэба быць вельмі асцярожным, каб ніхто не чапляўся... Мы сваё возьмем.

Зараневіча крыху ўразілі гэтыя словы лесавода, і ён у адказ доўга маўчаў. Урэшце прамовіў:

— Так-та яно так... Але пад ляжачы камень вада не пацячэ... Мы павінны, мы мусім нешта рабіць...

— Адпак важна, каб не згубіць сябе на дробязях...

Зараневіч у гэтых, здавалася б, простых словах лесавода пачуў тое, што называецца вопытам.

«З гэтым можна дагаварыцца...» — падумаў.

— Гэта — правільна... Але, з другога боку, няправільна было б сядзець злажыўшы рукі... Былое кулацтва вядзе рэй цяпер на вёсцы, намагаецца задаваць тон, кіруе, дапамагае фашыстам як толькі можа... Сынкі іхнія пайшлі і ідуць у паліцыю або працуюць як фашысцкія разведчыкі...

Говар заварушыўся на месцы так, што заскрыпела табурэтка, і, уздыхнуўшы, сказаў:

— Ой, цяжка...

— Вытрымка, усюды вытрымка — вось наша зброя,

наша багацце. У гэтым заключаецца ўсё: і сіла, і адвага, і... розум...

— Гэта азначае, калі пападацца, то каб не па-дзяшоваму,— ні то з запытаннем, ні то сцвярджаючы сказаў Говар.

— Ты праў, Андрэевіч,— дабрадушна-вясёлым тонам казаў лесавод.

— Не, нам трэба выпрацаваць нешта канкрэтнае, нейкі план... Інакш мы многае ўпусцім,— прадаўжаў сваё Зараневіч. Яму не сядзелася спакойна на месцы. Лесавод у гутарцы гэтай яўна нешта не дагаварваў да канца. Ён у гутарцы хацеў, каб сябры больш выразна выказаліся. Ён не спяшаўся з вывадамі. І толькі цяпер, падумаўшы, звярнуўся да Зараневіча ўжо ў рашучым тоне.

— Што вы прапануеце? — спытаўся лесавод.

— Хаця б, напрыклад... Нам трэба да дна пазнаць кожнага чалавека ў сваёй вёсцы, а таксама, каго можна, і ў бліжэйшых вёсках... Словам, нам трэба рыхтаваць актыў...

— Вы адчуваеце настрой людзей цяпер? — спытаўся лесавод.

— Ведаю гэтыя настроі...

Сябры змоўклі. Бліскалі агеньчыкі цыгарак. Відаць было, што ўсе сталі перад сур'ёзнай, цяжкай задачай. Кожнага ў душы штурхала нешта неспакойнае. Гэта — пачуццё абавязку, якое родзіцца недзе ў крыніцах падсвядомага і бліскне потым як яркая ісціна.

— Нядаўна гітлераўцы запялі Кіеў,— сказаў лесавод.

Сябры зноў змоўклі, зацягваючыся цыгаркамі.

— Няўжо яны, нячыстая сіла, перамогуць? — спытаўся ў цішыні Говар.

— Фашызм — гэта авантурызм. Даволі раз сур'ёзна спаткнуцца, каб усё пачало сыпацца назад.

— Адпак жа пруць усё на ўсход,— пярэчыў Говар,— і рэжуць нашых людзей, каго ні папала. І дзе той нямецкі пралетарыят падзеўся?

Зараневіч і лесавод змоўклі.

— Нічога... Усё роўна фашызм не мае ніякіх шансаў на перамогу,— сказаў Зараневіч,— бяда здарылася з нямецкім пралетарыятам... Абяззброілі яго фашысты і іх паслугачы — сацыял-здрадпікі... ашукалі... Але гэта толькі да пары...

— Вось быў бы камісар для атрада,— ціха сказаў лесавод, схіліўшыся да Говара.

За сцяною пешта асунулася ля акна і пачуўся лёгкі стук. Сябры змоўклі, насцярожыліся. Говар прамовіў: «Выйду пагляджу» — і выйшаў. Як толькі ён перастуніў за парог, на двары забрахаў сабака.

Говара доўга не было. Зараневіч і лесавод сядзелі больш моўчкі і ўрэшце пачалі трывожыцца: «Дзе падзеўся Говар?» Рашылі ўжо выйсці ў пошукі. Лесавод дастаў з кішэні рэвальвер. Ажно пачуліся крокі на сходах ганачка, і сябры застылі ў чаканні. Увайшоў Говар.

— Валацугі...— прамовіў.— І дзе ад іх падзецца? Яны думаюць, што яны толькі хітрыя, а я дурны... Як я выйшаў за хату, пачуў, што лапануліі на дарозе ўцякаць. Я таксама лапануў з сабакам, але ў другі бок, абабег навокал, дабег да вуліцы і стуль выйшаў на дарогу і тады ішоў назад. І вось ля грушы сустрэў іх...

— Каго? — спыталіся ў адзін голас Зараневіч і лесавод.

— Каго? Альшынеўскага і старасту Мазуніка. Каб яны ногі паламалі. І як гэта сабака не пачуў, як яны падышлі да акна? Тады толькі пачуў, як яны адыходзілі... Мусіць, ляжалі тут над акном. Няйпачай...

— Што яны казалі, як ты сустрэўся з імі? — спытаў Зараневіч.

— Казалі, ідуць ад коней. А аброцей у руках не было. Брэшуць, сукіны сыны... Няйпачай як ляжалі над акном. І як яны маглі асачыць? Ну, гэта будзе навука на другі раз.

— Яны ўсё роўна нічога не чулі,— сказаў лесавод.

— Халера іх душу знае. Каб што і чулі, то гэты стараста яшчэ так-сяк, з ім можна зладзіць, а вось гэтая рыжая зараза — не прапусціць. Ім было неспадзявана, што сустрэлі мяне. Задрыжалі, як сабакі, сталі пытацца напярабоіі: «Гэта ты, Кастусь? Адкуль жа так позна?»

— А, кажу, хадзіў каношыны глядзець... Ці паверылі, чорт іх душу знае... Што цяпер будзем рабіць? Гэты рыжкы сабака, калі што чуў, дык можа заявіць у жандармерыю.

— Добрыя маеш вушы? Добра чуеш? — спытаўся лесавод.

— Здаецца, добра... А што?

— Ідзі на двор, стань ля акна і слухай, а мы будзем гаварыць шэптам... як гаварылі.

«Рэпетыцыя» была зроблена. Говар вярнуўся і сказаў, што «нічагусенькі не чуваць». Стаў спакайнейшы.

Пасля паўзы Зараневіч сказаў:

— Альшыпеўскі — гэта разведка ворага. Ці ёп мае наказ зверху — займацца разведкай, хто яго ведае. Ва ўсякім разе ён дзейпічае, кіруючыся класавай нянавісцю. Як можна было асачыць, што мы тут? Нам гэта і ў галаву не прыйшло. Адпак жа бачыце, які спрыт. Што я хачу сказаць? — Зараневіч прыпыпіўся.— Я хачу сказаць тое, што мы павінны быць таксама разведчыкамі і разведчыкамі лепшымі за іх. Інакш — у які-небудзь дзень, час можам загінуць і загубіць справу, якую распачынаем. Нам трэба сачыць за ўсімі варожымі элементамі тут, а ў першую чаргу, за Альшыпеўскім.

— Думаў і я гэта... Здохпе ёп, не выкруціцца ад нас,— сказаў Говар.

Лесавод цалкам згадзіўся з Зараневічам. Сябры вырашылі, што называецца, завастрыць пільпасць.

— Ну, што ж...— сказаў асцярожна і сурова лесавод.— Давайце возьмем курс на мабілізацыю нашых людзей... Папярэджваю — асцярожнасць і яшчэ раз асцярожнасць... Без лішніх ахвяр. Вораг не спіць. Ён ходзіць, як драпежнік... Мы павінны чуць усе яго павароты... Усё занатоўваць у памяці, рабіць вывады...

Зараневіч наблізіўся тварам да лесавода і ціха сказаў, востра гледзячы яму ў вочы, хоць і было цёмна:

— Няўжо тут у раёне няма падпольнага партыйнага цэнтра? Каб нам яго намацаць, нам бы многае прасвятлела...

Лесавод глуха кашлянуў і змоўк, нешта абдумваючы.

Зараневіч чакаў. Пачынаў ужо абвінавачваць сябе ў неасцярожнасці. Паўза была доўгая. Лесавод кашляпуў яшчэ раз.

— Бачыце... Аб гэтым вам можпа не турбавацца. Пошукі падпольнага партыйнага цэнтра я вазьму па сябе...

У Зараневіча як бы нейкі цяжар адлёг ад сэрца. Нешта прасвятлела ў душы, хоць яшчэ не да канца. Важна тое, што ўжо ёсць нейкая апора. Ён толькі сказаў адпо:

— Гэта ж папросту дасканала!..

Лесавод прыўстаў і сказаў амаль урачыста:

— Я думаю, што гавару з сапраўдпымі патрыётамі...

— Канстапцін Андрэевіч вам знаёмы, а ва мне можаце не сумнявацца,— адказаў Зараневіч.

— Я для вас буду называцца проста Іван Аляксеевіч,— сказаў на астатку лесавод.

І сябры разышліся.

IV

Прайшло больш за месяц. Зараневіч прачнуўся на світанні і заўважыў незвычайную бель у вокнах. Глянуў: усё было пакрыта свежым, пульхным снегам. «Значыць, ужо зіма...» Падумаў, і трывога прабегла па сэрцы. Зрабілася яшчэ беспрытульней, чым было. З Говарам сустракаўся рэдка: так яны дамовіліся, каб адвесці падазрэнні Альшыпеўскага і яму падобных. Адначасова падбіралі людзей. Праца па людзях, праца па начах пры агні каміна. Жонка сядзела за кудзеляй. І вось гэтае доўгае маўчанне. Кожнаму за сваёй працай не сумна маўчаць. Кожны паглыбляецца ў свае думкі, якія цёплым струменьчыкам праплываюць праз душу. Часамі ўздыхне то сам Зараневіч, то жонка. Маўчаць абое і абое разумеюць адно аднаго. За вокнамі ноч — цёмная, лясная, нібы крыллі гругана. Ноч над краінай, цяжкая ноч...

Сягоння ў раённым мястэчку фашысты павесілі трох...

Ці разумеюць людзі адны другіх па погляду, па ўсмешцы, па хадзе, па тону голасу? Ці адчуваюць настрой? Ці ёсць нешта такое, што прыцягвае аднаго чалавека да другога? Безумоўна, нешта ёсць, бо сягоння, будучы ў лесе, Зараневіч сустрэўся з дзядзькам Арсенам. Дзядзька быў з пілою, чакаў свайго сына, каб разам спускаць грабы на дровы. Зараневіч быў толькі з сякерай. Дзядзька Арсен сам запрапанаваў свае паслугі — дапамог Зараневічу зрэзаць граб на дровы. У гутарцы Арсена чуліся ноткі задушэўнасці. «Нічога, трэба пацярпець, перажывём усё»,— гаварыў Арсен. А потым дадаў сабе ў нос, адвярнуўшы няўзнак галаву ўбок: «Не павешаеш усіх, людаед...» І пасля гэтых слоў замітусіўся дзядзька Арсен, стаў хутка рваць пілу, перавёў гутарку на другое. Прыпамінаючы цяпер гэта пад навесам цемнае, глухое начы, якая прытоена глядзіць у акно, Зараневіч падумаў: «Няўжо ўсё гэта было фальшам? Не, не можа быць. Усё гаворыць за тое, што гэта было шчыра». І Зараневіч запісвае дзядзьку Арсена ў свой зашыфраваны спіс.

Прайшло ўжо далёка за поўнач. Задумаўся Зараневіч. З-пад струга аддзяляліся ад дошкі гладкія, роўныя стружкі. Нешта стукнула ў парозе. Зараневіч з жонкай толькі пасмелі агляпуцца — ля дзвярэй стаяў прыгожы дзяцюк з папяросай у зубах. Гэта быў сын дзядзькі Арсена Сця-

нан. З добрым наіўным тварам гэты хлапец, не адыходзячы ад парога, ціха сказаў:

— Да вас ідуць з вобыскам староста, камендант паліцыі і Альшынеўскі...

Хлопец, не чакаючы адказу, знік. Зараневіч толькі паспеў убачыць яго шырокую спіну ў белым кажушку на фоне расчыненых дзвярэй.

Скрутачак папараў ляжаў пад бэлькаі. Дарагі быў гэты скрутак. Там быў дзённік, шыфраваныя запісы і тэкст лістоўкі. Куды дзець? У агонь — і запісы перастануць існаваць. Не, тое, што раз запісана, больш так не наўторыш. Нічога не кажучы жонцы, выскачыў са скруткам на двор і запхнуў яго над страху хлява. Вярнуўся ў хату і сказаў:

— Пагаворка нездарма кажа, што «свет не без добрых людзей».

Нечаканы прыход гэтага хлопца ўзварушыў Зараневіча. Нагнуўшыся над работаі, прыслухаўся да ўсякіх гукаў за сцяною. Чакаў прыходу «ўлады» для вобыску.

З падворка ў хату ўварваўся гоман чалавечых галасоў. Здавалася, што ідзе не менш дзесяці чалавек. Стук у дзверы быў нахабны, ярасны.

— Бежанец, адчыняй! — рычаў голас.

Зараневіч падскочыў к акну і сказаў, што ён адчыняць не мае права, бо не з'яўляецца гаспадаром хаты. У адказ бухнуў вінтовачны стрэл. Другі голас крычаў ля акна гаспадыні.

Дзверы адчыніла гаспадыня.

Увайшлі к Зараневічу. Загадалі распаліць камінок. Надзя, жонка Зараневіча, кінуўшы два смалякі на жар, падзьмухнула, і ўспыхнуўшае полымя асвяціла тры постаці з вінтоўкамі ў руках. Бліжэй да каміна стаяў камендант паліцыі, на прозвішчу Бык, староста Мазунік і Альшынеўскі стаялі воддаль, крыху ззаду. На наводзінах і на вачах было відаць, што ўсе былі п'яныя.

— Дзе працаваў пры Саветах? — гаркнуў камендант, стукнуўшы прыкладам вінтоўкі ў падлогу. Дзіця ў калыскі прачнулася ад крыку і стуку каменданта і стала плакаць. Надзя схапіла дзіця на рукі і пачала дакараць каменданта. Ён у адказ пачаў пагражаць «бальшавіцкаму насенню». Калі гаварыў камендант, у яго пырскала сліна з рота і цыгала кліпаватая пасівелая бародка. Твар быў нервовы, пос даўгаваты, скасабочаны.

— Грошы маеш?! — завішчаў Альшынеўскі.

— Каб меў, то вам бы зараз і аддаў,— адказаў Зараневіч.

— Усё аддасі, што маеш, як мы захочам,— пырскаў камендант.

Стараста Мазунік наглядаў на ўсё мутнымі вачыма, а пасля ціха прысеў на лаве.

Камендант і Альшыпеўскі прайшліся к покуцю. На сцяпе вісела адно паліто. Камендант стаў мацаць рукамі.

— Можа тут што зашыта?! — крыкнуў.

Бліснуў нож у руках Альшыпеўскага, а пасля па шву затрашчала подшыўка. З хцівасцю перашуквалі пальцамі ў ваце да апошняй дробязі. Былі нямала здзіўлены і расчараваны, калі нічога не знаішлі.

— Дзе газеты савецкія хаваеш? — наступаў камендант.

— А хто мне іх дае? — адказваў Зараневіч.

Шукаць больш не было дзе. Гляпулі на печ, пад бэлькі, нават у калыску. З грукатам пайшлі к парогу. Альшыпеўскі пацягнуў за сабой за рукаў старасту Мазуніка, які быў ужо заспуў, седзячы на лаве. Яшчэ раз агляпулася кліпаватая бародка, перастуліўшы цераз парог, і крыкпула:

— Ты не ўвайдзеш ад пашых рук!

На выхадзе «гасцей» Зараневіч патушыў каміпок, пасля ціха выйшаў на двор і прасачыў за імі. Тыя з тым жа самым п'яным гоманам паішлі да Говара.

— Я думаю,— сказаў жопцы, вярпуўшыся ў хату, Зараневіч,— што гэты вобыск яны зрабілі самі ад сябе. Яны не мелі ніякага загаду зверху...

— Хіба яны не дапосяць у раён? — сказала Надзя.

— Вось цяпер яны могуць данесці. А да гэтага часу не было на гэта ніякіх прычын. Гэта ўсё Альшыпеўскага работа...

V

Пятро Зараневіч ідзе рапа аспежапай лясной дарожкай. Лес, як з жывое казкі, застыў у цішыні ранку. На галінах сосен камамі ляжыць снег, як пушыстая вата. Здаецца, вось зараз выйдзе з сасопніку па дарожку спягурачка ў серабрыстай каропе або вандроўнік дзед-мароз. Дарожка, як урачыстая алея. Яе перасякаюць такія ж самыя дарожкі. Па адной з іх шпарка ідзе Сцяпан, сын Арсепа. У вушапцы з зайцавай скуры, у кажушку,

падпяразапым поясам, ён падобны не то да лесніка, не то да фурмана. Яго рукі ў рукавіцах трымалі петлі з тонкага дроту. Па прывітанні пайшлі разам. Сцяпан, як вопытны лесавік, тлумачыць Зараневічу ўсе сляды звяроў, птушак на свежай снежнай парошы. Вось, відаць па следу, што нядаўна толькі прабег зайчык. Як сіметрычныя памёткі ў саматканым поясе, пралёг яго слядок па пушыстым спяжку між сосен. Сцяпан адбягаецца далекавата ўбок і ставіць пятлю, бярэ з кішэні жменю аўса і цярусіць па снезе.

Ідуць далей. І зноў сляды, падобныя ўжо да калматай вяровачкі, дзе-нідзе прыцярушаныя снегам. Сцяпан тлумачыць, што гэта след лісы. Ліса хвастом прыцярушвае след. Сцяпан гляпуў уздоўж следу лісы, кінуўся ісці, але вярнуўся, сказаўшы: «Пасля зайдзем...» Звярнулі ўлева. Тут убачылі вялікія сляды. Гэта прабег воўк. Але побач пайшоў і чалавечы след — нядаўні, свежы.

— Хто б то мог быць? — спыніўся Сцяпан у задуме. Крыху падумаўшы, сказаў: — Я ведаю хто... Хадземце па следу. Куды ён пайшоў?

— Хто? — спытаўся Зараневіч, якога таксама цюкнула здагадка.

— Гэта, па-мойму, пайшоў Альшынеўскі,— адказаў Сцяпан.

— Я таксама падумаў,— сказаў Зараневіч.

— Я ведаю, ён часта ходзіць ранкамі, ставіць петлі і шукае чужых петляў,— гаварыў Сцяпан.

Нязведаны ўсе лясныя тропы звяроў і птушак, але Зараневічу і Сцяпану вядома, што яны ідуць па слядах двух блізкіх істот: воўка і Альшынеўскага. Зараневіч гаворыць аб гэтым. Сцяпан смяецца са ўсёй непадробленай юнацкай чыстасцю. У яго смеху было чуваць захапленне і ўдзячнасць Зараневічу за трапнае акрэсленае параўнанне.

— Вось гэтага звера,— прадаўжаў смяяцца Сцяпан,— паказваючы на след воўка, мы-та не зловім, а вось таго,— паказаў на след чалавечы,— мы зловім. Ён недзе навідавоць быць тут.

А Зараневіч думаў: ён ходзіць па нашых слядах, а мы па яго. Хто каго?

Чалавечыя сляды звярнулі ўлева ў густы сасоннік, які да палавіны сваёй вышыні тапіўся ў снезе. Воўчыя сляды пайшлі далей. «За якім воўкам гнацца?» — усё не сціхаў смяяцца Сцяпан. Пайшлі па слядах чалаве-

чых. Ішлі асцярожна, грузнучы ў снезе па калені. Сцяпан наперад. Зараневіч за ім.

— Ціха...— пасля нскалькіх крокаў, павярнуўшыся да Зараневіча, сказаў Сцяпан.

Сябры прыпыніліся, сталі прыслухоўвацца. Недзе блізка даносіліся чалавечыя галасы. Іх было два. Адзін тонкі, віскліві, з таропкаю вымовай. Сябры прызналі, што гэта голас Альшынеўскага. А чый другі? Сцяпан паклікаў пальцам Зараневіча, і сябры асцярожна, як толькі маглі, ступілі яшчэ два крокі. Сцяпан рассунуў галінкі сасонак, з-за пляча яго глядзеў Зараневіч.

— Гляньце, гляньце...— шапнуў Сцяпан.

У сасонніку, на прагалінцы, стаялі Альшынеўскі з нейкім незнаёмым.

Альшынеўскі быў у шапцы-вушанцы з катовай скуры, вушы якое былі апушчаны. На каўняры паношанай чорнай ватнай курткі, блізка рота, была густая замаразь. Другі таксама быў у чорнай вушанцы, але амаль у новай чортага драпу куртцы, у высокіх ботах. Звярталі на сябе ўвагу яго вочы. Яны былі шэрыя, вялікія, як буркалы,— навыкат. Нешта драпежнае было ў гэтым твары з такімі вачыма, з доўгім носам і ніжняй мясістаю губою. Цераз плячо ў яго вісела вінтоўка.

«Хто б гэта мог быць? — думае Зараневіч.— І чаго іх сюды занесла? У іх існуе, значыць, і свая канспірацыя...»

Гутарка стала амаль нячутнай. Незнаёмы часамі паглядаў наўкола. Здавалася, што гэта нейкі драпежны звер паводзіць вачыма.

Зараневіч і Сцяпан сталі адыходзіць назад на дарогу. Ужо не былі так асцярожны, і часамі снег з сасонак сыпаўся ім на галовы.

Калі выйшлі на дарогу і прайшлі некалькі крокаў, нечакана раздаўся віптовачны стрэл, і Зараневіч пачуў, як куля прасвісцела ля яго левага вуха. Яна праляцела між ім і Сцяпанам. Сябры на міг прыпалі да снегу, а пасля шмыгнулі ўбок, у кусты бярэзніку, грабніку і арэшніку.

Прабраліся да ручаіны і пайшлі на той бераг, дзе на ўзвышшы падымаўся смалісты бор, вяршыні сосен якога гаманілі з небам.

Шпарка пайшлі ў глыбіню лесу. Сталі, аддыхаліся.

— Хто гэта, па-твойму, быў другі? — спытаўся Зараневіч. Сцяпан паціснуў плячыма.

— Хто яго ведае, няйпачай, як нейкі паліцай... А хто?

Ліха яго ведае. Я раскажу дома бацьку, можа ён здагадаецца...

— Бачыш, Сцёпа, як яны згаварваюцца, стараюцца... для сябе, супроць нас...

— А можа ім гэтага не ўдасца,— адказаў Сцяпан.

Зараневіч крута павярнуўся да Сцяпана і глянуў яму ў чыстыя шэрыя вочы. Падумаў: паіўна гэта ці не?

— Што ты думаеш, Сцёпа, кажы?

— Я думаю вось што. Былі ў нас у раёне партызаны... Няўжо іх усіх гітлераўцы пералавілі? Гэтага не можа быць... Яны недзе ёсць, яны калі-небудзь прыйдуць да нас...

Думкі і настроі Сцёпы спадабаліся Зараневічу. Ён толькі адказаў:

— І мне здаецца, што так... Зусім з табою згодны...— А пасля вырашыў: «Пашлю яго цераз Говара да сувязнога лесавода».

* * *

Зіма ўвабралася ў поўную сілу. Зараневіч аж тры разы пасылаў Сцяпана з шыфраванай запіскай да сувязнога. Гутарка ішла аб збіранні зброі. Говар ездзіў да знаёмых у іншыя вёскі і «дыпламатычна», як ён казаў, таксама разведваў. Недзе ў палавіне зімы Говар наладзіў Зараневічу сустрэчу з адным лейтэнантам, які апынуўся ў акружэнні і пражываў у суседняй вёсцы. Говар запрог каня, і яны паехалі, нібы да млына.

У лейтэнанта Сахарава, якому было не больш трыццаці год, пасівелі скроні, і ў шэрых вачах ледзь прыкметнай цьмянай павалокаі свяцілася туга. І калі пасуплівай бровы над шэрымі вачыма, якія пачыналі цямнець і іскрыцца, відаць было, што ў гэтага куйбышаўскага хлопца не бракуе адвагі. Ён жа ўцёк з палону, на поўным ходзе цягніка кінуўся праз акно над адхон. Услед яму застракаталі аўтаматы вартавых, але бацька-лес прыняў яго ў свае сховы.

— Не, мы яшчэ паваюем, яшчэ пакажам,— стукаючы па стале кулаком, гаварыў Сахараў.

Кароткі зімовы шэры дзень набліжаўся к вечару. Говар пайшоў да знаёмага селяніна, дзе стаяла падвода, каб рыхтавацца дамоў.

Зараневіч дапытліва глядзеў у вочы Сахарава. У хаце нікога не было. Сахараў спытаўся:

— Чаго так глядзіш?

Зараневіч падняўся ва ўвесь рост і працягнуў руку Сахараву:

— Давай возьмемся за працу... Згодны?

— Згодны,— адказаў Сахараў і стаў ціснуць руку Зараневіча.

— Ты не дзівуйся, што я гавару табе так адразу, у лоб, хоць першы раз цябе бачу... Хачу верыць і веру ў тваё савецкае сэрца...

— Здраджваць не збіраюся,— гледзячы ва ўпор на Зараневіча, сказаў Сахараў.

— На першы раз пашукай сабе сувязнога, вернага, моцнага хлопца.

— Ёсць такі...— адказаў Сахараў.

— Па-другое, пазбірай людзей, і ўсякімі мерамі здабывайце зброю. Зразумела? — сказаў Зараневіч, не спускаючы вачэй з Сахарава.

— Усё зразумела,— шматзначна адказаў Сахараў.— Я толькі чакаў гэтага.— Ён первова праводзіў пальцамі па валасах, часамі ўставаў і садзіўся зноў. Хвалявaліся яго грудзі, праясняўся твар.

— Трымай сталы кантакт са мной і глядзі, пільна сачы за ўсім... Чакай, аж пакуль не паклічам... Арганізуй групу, збірай зброю.

Расцалаваліся па развітанне.

З гутаркі Зараневіч зразумеў, што Сахараў ужо сам распачаў працаваць. Тым лепш.

Конь Говара бег ахвотна па праезджанай дарозе, якая снежнымі каляінамі ўцякала ў далёкі лес. На небе плылі хмары, дзьмуў вецер — пачыналася лёгкая завейка. Ад'ехалі ад вёскі кіламетры чатыры і адчулі сябе нібы зусім вольнымі людзьмі. Говар бадзёра пагукваў на капя. Гэты настрой нават падштурхнуў Зараневіча на песню:

Эх, ды белыя снягі
Ўсе дарожкі замялі...

Говар не адставаў і падцягваў моцным, чыстым тэнарам:

Ўсе дарожкі, ўсе пуці,
І да мілай не дайсці...

— Эй, не дайсці! — уздыхнуў Зараневіч, і песня абарвалася.

— Быць не можа, каб паны не перамаглі! — нахіліўшыся да Зараневіча, крыкнуў у завейку Говар.

— Як не можа быць таго, каб сонца ішло назад з захаду. Сіла наша на ўвесь свет, Андрэевіч. І нікому нашых не перамагчы. Эхе-е... Хутчэй бы тая вясна... Яшчэ пачуюць гітлераўцы і іх паслугачы нашую вясну, ой, пачуюць! Вер, Андрэевіч, напомніш маё слова, што пачуюць!

— Вашымі вуспамі мёд піць, Пятро Данілавіч! — адказаў Говар і гукнуў на каня.

VI

Хоць сонца пачынала прыгравать па-вясеннему, Зараневіч не адчуваў вясны ў тым сэнсе, як гэта было ў тыя мінулыя добрыя часы, якія, здавалася, адышлі ў нябыт. Лёгкі, свежы вецер, малы снег, ручаінкі па вуліцы, у каляінах і як ачышчаны ад плесні лес выклікалі ў душы толькі балючы неспакой.

Быў шэры і ціхі дзень. Хмары не плылі — яны недзе яшчэ з ночы разаслаліся па прасторы неба і апусціліся на небасхіл. Пад нагамі ў Зараневіча быў адлеглы лёд, а па лесе, як вокам глянуць, сям-там бялелі яшчэ лапіны снегу.

Недзе тоненька цурчала вада. Зараневіч чуе, што гэтых нябачных ручаінак многа і кожная мае сваю мелодыю. А зводдалі, з нізіны, даносіўся шум. Гэта — ручаінкі сплывалі ў шырокі дол, лучыліся ў шырокі паток, які з шумлівым рэхам ірваўся праз гушчар некуды ў праточную ручаіну. Рэха шарахала далёка, і Зараневіч, заслуханы ў гэты шум, першы раз сапраўды па-свабоднаму ўсміхнуўся.

Вясна сорак другога года прынесла Зараневічу яшчэ большыя выпрабаванні і пакуты. Ніхто яго не браў на працу, бо ў людзей пачалася бясхлебіца. Прадаў на малако дзецям што меў апошняе, сам з жонкаю еў лебяду, крапіву, так што ўрэшце папухлі яго ногі.

Альшынеўскі пасварыўся з старастам Мазупікам: не падзялілі між сабою нейкага кавалка зямлі. Анеля бубніла паўдня на двары, робячы грады, і даводзіла, што ў яе быў хлеб і будзе, а староста здохне. Зараневіч са смехам казаў Говару аб супярэчнасцях у лагеры фашызму. Анеля, ведаючы, што ў людзей амаль што нічога няма, часта выходзіла на вуліцу з кавалкам хлеба ў руцэ, ела яго і з прытворнай нявінпасцю паглядала ўздоўж

вуліцы, нахілялася ўперад, як быццам хацела пепта разглядзець. Заходзіла часамі да бежанкі таксама з хлебам у руцэ і, сеўшы побач на прызбе, ела і казала, што хлеб прасеяны і што яго хопіць у яе аж да новага. Бежанка Надзя з пачуццём жаху дзівавалася з гэтых правакацый Анелі. Надзя адчувала, што ля яе сядзіць не чалавек, а пачвара.

Рэдкія хмаркі праплывалі па небе і час ад часу топкай заслопай закрывалі сонца, калі Надзя разам з суседкай Ганнай сядзелі на прызбе. Ганна якраз прынесла бежанцы жменю круп. Вецер даносіў пахі зямлі і лесу, ластаўкі шыбалі над галовамі, па вёсцы пераклікаліся пеўні. Чулася поўная плынь вясны. Толькі вёска была адцятай ад свету, прыгнечаная сполахам вайны.

Надзя ціхая і трывалая, стомлена гучыць яе ласкавы голас, голас жанчыны-маці. Запалыя шчокі і завостраны нос, у цёмных вачах цярплівасць надавалі ёй выраз пакутніцы. Залацістыя валасы, прыўзнятыя над прыгожым ілбом і накрытыя белай хусткай, завязанай на патыліцы, надавалі твару нешта высакароднае. Гэта была струджаная ў горы маладая маці, якая цярпліва зносіла ўсе пакуты падняволь нага жыцця. Надзя сядзела на прызбе побач з Ганнаю, і, хоць дакучаў голад, яна і словам не прамовілася аб гэтым, вяла гутарку роўным голасам, без адцення якой-небудзь скаргі.

У Ганны яшчэ маладая прыгожая постаць. У сціплым сімпатычным твары мяккая ветлівасць, вялікія шэрыя вочы глядзяць па-наіўнаму адкрыта. Як стаіць — простая і зграбная, дык яе можна было б прыраўняць да бярозкі ў полі, якая лёгенька хвалюецца пад павевам ветру. Ганна скардзілася, што ўчора даелі апошні хлеб, што ёсць крыху грэчкі, якую трэба змалоць. Спагадала бежанцы, ціха прыглядаючыся:

— Ой, Надзя, як жа ты пахудзела. Хутка ацеліцца мая карова, буду даваць табе малака для дзіцяці.

— От, я бачу, што ў большасці тут у вёсцы няма хлеба цяпер. Адкуль жа вось у гэтага хлеб? — спытала Надзя і ткнула пальцам у кірунку хаты Альшынеўскага.

— Ой, Надзечка, ён жа ўвесь свет абкрадае. Дзе ў каго гінулі снапы па полі, дык гэта яго работа. Дзялілі калгаснае жыта на карці, дык столькі накраў, навазіў. І казалі, і лаялі, і біць хацелі, дык што ты зробіш? Як скажа: пайду ў паліцыю заяўлю, што ты камуніст, дык людзі баяцца. І ў нас згінула дзесяць снапоў... Хай ён

удавіцца гэтым хлебам. Нават у другую вёску сздзіў красці. І яна такая ж самая...

Па вуліцы ў гэты час прайшоў незнаёмы мужчына ў ваеннай кашулі. Галава над пілоткай і адно вока былі перавязаны звычайнай белай хусткай. Альшыпеўскі вылецеў на вуліцу, паглядзеў услед мужчыну і зараз жа вярнуўся ў хату. Цераз хвілін пяць ён выехаў з падворка вярхом на кані і памчаўся ўслед незнаёмаму мужчыну. Жанчыны з трывогаю ў вачах пераглянуліся. Першая прамовіла Ганна:

— Мусіць, нешта будзе... Альшыпеўскі няйпачай паляцеў у паліцыю.— З выразам сполаху на твары Ганна схапілася з месца і пабегла дахаты.

Пятра Зарапевіча дома не было. Ён яшчэ пры ўсходзе сонца пайшоў у лес. Трэба было знайсці месца, куды б часова можна было знесці і схаваць зброю. Зброя знаходзілася пакуль што ў Сцяпана: былі вінтоўкі — дзве дзесяцізарадкі, пісталеты, патроны і некалькі гранат. Дабывалася зброя розным спосабам, нават не грэбавалі рамонтам старой. Але найболып знаходзілі ў лесе.

Ідучы ў лес, Зараневіч узяў з сабою вядро і сякеру, каб падсячы ў лесе бярозу і паставіць вядро пад сок.

Калі Зарапевіч вяртаўся назад, сустрэў задыханага і ўзрадаванага Сцяпана.

— У чым справа? — спытаўся Зараневіч, дапытліва гледзячы ў вочы Сцяпану.

— Маю нешта перадаць. Я так шукаў вас. Не знайшоўшы там, пусціўся ў лес проста наўгад,— прамовіў Сцяпан.

Сябры сышлі з дарогі, і Сцяпан перадаў Зарапевічу запіску. У запісцы была напісана (не шыфрам, а звычайна) толькі адна фраза: «Сахараў сягоння на світанні арыштаваны гестапаўцамі». І кропка. І больш нічога. Зарапевіч навольна рваў запіску на дробныя кавалачкі, апусціўшы павекі на вочы. Стараўся асэнсаваць усю небяспеку сітуацыі. Сцяпан крыху разгублена глядзеў на Зарапевіча, намагаючыся разгадаць, што здарылася. Зарапевіч сеў на пень і, крыху памаўчаўшы, спакойна сказаў:

— Ідзі, Сцёпа, дахаты, каб нас тут хто не ўбачыў... Хлопца, які прынёс гэту запіску, больш не прымай, парві з ім сувязь... Зразумеў?

— Зразумеў,— адказаў крыху азадачаны Сцяпан.

— Зброя дзе ляжыць у цябе?

— У гумне над сенам.

— Зараз жа... не ідзі... а ляці і закопвай у зямлю ў гумне. Зараз жа ідзі...

Убачыўшы, што Сцяпан марудзіць, дадаў:

— Пасля я табе ўсё раскажу. Цяпер няма часу...

Сцяпан, не чакаючы ні хвіліны, нырнуў у гушчар і знік.

Зараневіч некалькі хвілін сядзеў, апусціўшы галаву. Пасля, як бы злавіўшы сябе на чымсьці, устаў і хутка пайшоў проста цераз лес нацянькі. Думаў: трэба зараз убачыць Говара, трэба паведаміць лесаводу, папярэдзіць. Як трымаўся Сахараў у жандармерыі? Яго арыштавалі па світанні, гэта значыць у гадзін пяць, а цяпер ужо, напэўна, дзевяць. Каб Сахараў выдаў нас, то ўжо даўно прыбылі б гестапаўцы або паліцыя... Іх няма — значыць, можна думаць, што Сахараў не выдаў. А з другога боку, хто ведае... Тактыка ў іх можа быць усякая... Адным словам, трэба дзейнічаць як мага хутчэй. Так раздумваў Зараневіч, прабіраючыся праз лес. Выйшаў на дарогу, якая проста вяла з лесу да хаты Говара. Тут на роўным грудку раслі высокія бярозы, разложыстыя старыя дубы, пад імі быў ціхі і мяккі цень, які прыемным халадком лёг на маладую траву. Зараневіч глянуў удаль, па гэтаму грудку, і ўбачыў, што з гушчыні лесу на паляпку выйшаў яму насустрач чалавек з белай павязкай на галаве. Зараневіч прытуліўся да бярозы і чакаў. Падпусціўшы чалавека з павязкай на крокаў пяць, крыкнуў ціха: «Чалавека, вы куды?» Чалавек стаў і адным адкрытым вокам глядзеў на Зараневіча, увесь насцярожаны. Зараневіч глядзеў на яго. Раптам чалавек з павязкай энергічна накіраваўся да Зараневіча і, яшчэ не спыніўшыся нават, сказаў:

— Пётр Данілавіч, прывет!

Нешта знаёмае пачулася Зараневічу ў гэтым голасе, але ён, збянтэжаны нечаканасцю, не мог здагадацца, хто ж стаіць перад ім.

— Ну што ты, Сахарава забыўся? — спытаўся чалавек з павязкай.

Чырвань выступіла на твары Зараневіча. Ён моўчкі схапіў Сахарава за галаву і разглядаў.

— Ты жывы? Цябе выпусцілі ка́ты?..— сыпаў пытанні Зараневіч.— Што, білі? Катавалі? Ну, як жа гэта? Хадзем у кусты. Раскажаш... Ну, закурвай.

— Вер не вер — уцёк з-пад капвою... Вось табе ко-

ратка,— сказаў Сухараў, зацягваючыся дымам самасаду. Прыўзняў павязку над левым вокам, каб паказаць. Вока было закрытае і крывава-сіняе наўкола. Адкрыў рот і паказаў, дзе былі выбіты зубы. Уся патыліца была сколана іголкамі.

— Гналі палопных... пейкі карпы атрад, шапкі з чарапамі... Ну, і мяпе разам. Там яшчэ былі і другія, не ваенныя... Кірунак быў на Мазыр... Калі ў адпым месцы, дзе быў зруйнаваны мосцік над рэчкай, мы рэчку перахадзілі ўброд, вось там я і ўцёк. Увесь атрад адкрыў па мне страляпіну... Як не забілі... пе ведаю... Я не падаў, не поўз, а толькі бег... Думаў — заб'юць так заб'юць... І вось стаю перад табой, як ліст перад травой,— усміхнуўшыся, скончыў Сахараў.

— Ці то ў нас проста выпадковая сустрэча, ці ты наўмысна ішоў сюды да нас?

— Не, спярша я проста ішоў у лес, каб адысці як пайдалей ад шляху, а потым, праходзячы, спытаўся ў пастушкоў, якія пасвілі кароў, як прайсці ў вашу вёску. Яны мне паказалі, вось і ўсё...

Зараневіч крыху задумаўся.

— Праз вёску ішоў? — спытаўся.

— Толькі краечкам... Але ўсе на мяне страшна глядзелі... Я проста ішоў не сваімі нагамі.

— Дарма ішоў...— сказаў Зараневіч.— Але што цяпер зробіш... Ты пасядзі тут з паўгадзіны... Я арганізую што трэба... Здаецца, што ў вёску ты не пойдзеш зусім...

І Зараневіч хутка адышоў к Говару.

Говар стаяў па ярусе бярвенняў на сваім падворку і на прывітанне Зараневіча адказаў шэптам:

— Хадзеце сюды, пагляпьце.— І паказаў пальцам па прагаліну ў недалёкім лесе, за другім канцом вёскі. Зараневіч глянуў і змоўк — па дарозе ў вёску конпа і на вазах мільгацелі мундзіры. «Гітлераўцы»,— было першай думкай, і Зараневіч пачаў злазіць з бярвенняў і цягнуць за сабою Говара.

— Зараз жа пяхай сям'я ідзе ў лес... Папярэдзь другіх. Пабягу і я па сваіх... Тут могуць быць не жарты. Там у лесе сядзіць Сахараў — нам трэба яго не губіць. Ёп уцёк з рук жандараў, увесь скатаваны...

Говар стаяў, вылупіўшы вочы, і толькі казаў:

— Сахараў?.. Сахараў?.. Дык як жа гэта!..

— Пасля... пасля... Няма часу... Пайшлі...— казаў Зараневіч і подбегам накіраваўся дахаты.

Зараневіч толькі паспеў пералезці цераз плот на свой падворак і спытацца ў жонкі, дзе дзеці, як у канцы вёскі пачулася чарга з аўтамата. Па вуліцы шумна шугнулі людзі. Яны беглі аглядаючыся. Жанчыны і дзеці падпялі крык і плач. Навослеп кідаліся цераз падворкі ў агароды, бегучы россыпам у кірунку лесу. Пасля застракатаў кулямёт. Зараневіч з жонкай, пабраўшы дзяцей, подбегам прабіраліся ля гумнаў і хлявоў. Толькі ўбеглі ў лес, кулямёт затрашчаў так блізка, што жопка аж прысела, а потым, прыгнуўшыся, падалася далей у гушчар. Хлопцу Лёніку галіна царапнула па твары, і ён закрычаў. Зараневіч затуліў яму рот, шэптам просячы, каб сціхнуў. А тым часам страляніна набліжалася: яна была бязладная — чэргі з кулямётаў, аўтаматаў і адзіночныя стрэлы з вінтовак. Зараневіч з жонкай адышліся далёка і прыпыніліся, каб перадыхнуць. Рэха даносіла адзіночныя стрэлы і прыглушаныя галасы людзей. Пайшлі далей. Прыпыняліся часамі і слухалі, стрэлы раз-поразу чуліся радзей — выляталі адзіночна і рэхам танулі ў лясной гушчыні. Зараневіч глянуў на сваю жонку: на яе ціхіх вачах застылі кроплі слёз. І ён, здаецца ўпершыню, адчуў усю моц пратэсту, нянавісці гэтай ціхай жанчыны.

— Стамілася? — спытаўся ласкава.— Давай прысядзем. Стрэлы ўжо зусім заціхаюць...

Малое на руках у жонкі заварушылася і заплакала. Надзя прысела на вільготную траву і стала карміць дзіця пустымі грудзьмі. Здалёку данёсся адзінокі стрэл, і настала доўгая ціша, якая ўжо не перарывалася.

* * *

Эсэсаўцы кінуліся ў першую крайнюю хату. Гэта была хата дзядзькі Арсена. Адзін эсэсавец ударыў прыкладам вінтоўкі па замку. Прабой вылез з праўшняка, і дзверы распахнуліся ў сенцы. Эсэсаўцы пачалі рабіць вобыск. Каго шукалі? Мусіць, таго ці тых, хто ад іх уцёк. Не знайшлі нікога. Калі ж дзядзька Арсен са сваёй жонкай сталі бегчы з агарода і крычаць, эсэсаўцы, што стаялі на падворку, накіравалі па іх свае аўтаматы. Адна чарга з аўтамата палажыла іх на месцы. Гэта і была іменна першая чарга. Дзядзька Арсен толькі паспеў узмахнуць рукамі і паваліўся на спіну. На яго пакрыж лягла галавою ў белай хустцы жонка з выцягнутымі ўперад рукамі.

Сын Сцяпан і дачка Люба пры стрэле пападалі ў грады і не падымаліся.

Твары ў гітлераўцаў былі, як у засопшыхся ганчакоў, раздуваліся храпы і звярыпымі бялкамі бліскацелі вочы. Стаяўшая воддаль грамадка людзей уміг зразумела ўсю небяспеку і жудасць становішча. Адразу кіпулася ўцякаць з плачам і крыкам. Гітлераўцы ўслед паслалі чэргі з аўтаматаў. Урэшце, уцякала ўся вёска. Хату дзядзькі Арсена гітлераўцы абрабавалі — забралі палатно, усю адзежу з скрыні. Уся зграя рассыпалася па вёсцы. Рабавалі, дзе што траплялася ў рукі, і выносілі на вазы. Калі ўся каманда наблізілася да лесу, некаторыя гітлераўцы пачалі разглядаць нарабаванае. Шаўковыя хусткі прасвечвалі на сонцы, мацалі іх пальцамі з нахабнымі мінамі. Каманда ўглыбілася ў лес і, ідучы па дарозе, страчыла навослеп па лесе. Але тут ужо гітлераўцы аказаліся бяссільнымі. Людзі рассыпаліся ў розных кірунках, так што не толькі атрад, але і цэлы полк мала што зрабіў бы.

Па вуліцы пранёсся тупат конскіх капытоў. Гэта ехаў атрад паліцыі, а з імі і Алышынеўскі. Старшы гітлераўцаў загадаў паліцыі «прачасаць» лес навокал вёскі, пасля чаго яны хутка ад'ехалі. Апошняя іх падвода з кулямётам, скіраваным руляй назад, знікла ў лесе, і ў вёсцы асела цішыня. Толькі адзін Алышынеўскі з сваім братам, паліцаем, шнырылі па падворках і падбіралі дзе-якія рэчы суседзяў, не ўзятыя эсэсаўцамі.

* * *

Змучаныя голадам, перажываннямі і няведаннем становішча, Зараневіч з жонкаю і дзецьмі набліжаліся да таго месца, дзе ён пакінуў Сахарава. Гэта было ўжо недалёка ад вёскі. Тут сустрэў Говара, які ішоў па прасецы. Говар ішоў, апусціўшы галаву. Яго жонка ішла з хлопцам і дачкой. Сустрэліся і ўзрадаваліся. Але што робіцца ў вёсцы? Ці адышлі эсэсаўцы — певядома. Говар расказаў, што бачыў па дарозе забітых некалькі чалавек. Войкаў, стагнаў, драпаў сабе грудзі, адначасова круцячы галавою.

— Як гэта можа вытрымаць чалавек? Трэба жыць і глядзець на такі глум, якога яшчэ і свет не бачыў...

— Сахарава не сустракаў? — спытаўся Зараневіч.

— Не... як жывы, то прыйдзе.

Так, ідучы памалу і гутарачы, убачылі забітую дзяў-

чынку год дванаццаці-трынаццаці. Яна ляжала пры дарожцы тварам дагары. Яе босыя ногі хаваліся ў кустах, а галава лягла ў травяністую каляіну. Белая хустачка з'ехала з русых прычэсаных валасоў і вянком ахінала галаву. Набраклая кроўю сукенка прысохла да жывата, ля якога на траве чарнелася мясцінка крыві. Шэрыя вочы былі адкрыты і з шкляным спалоханым бляскам глядзелі ў прагаліпку неба. Рукі бязвольна адкінуліся ў баокі. Ля вачэй і на шыі поўзалі мурашкі. Жанчыны (Надзя і Мар'я, жонка Говара) схіліліся над дзяўчынкай. Ціха плачучы, ачысцілі ёй тварык ад мурашак, абцягнулі сукенку на калені.

— Ганніна дзяўчынка,— ціха сказала Надзя.

Мужчыны панура маўчалі.

— Хадземце, хопіць,— пеяк знарочыста сурова сказаў Говар,— трэба зараз жа сказаць Ганне. Мусіць, яна і не ведае, калі сама яшчэ засталася жывая.

Сахараў прыйшоў да Говара, калі ўжо зусім сцямнела. Ён быў змучаны і згаладнелы. Пасля вячэры Говар, даўшы яму кажух, адвёў яго ў лес. Назаўтра было знойдзена яму больш сталае месца ў лесе. Ежу яму насіў Сцяпан, сын загінуўшага Арсена. Праз два дні сувязны Сахарава прывёў яго групу да Сцяпана.

VII

Цераз два тыдні пасля гэтага крывавага здарэння вёска, пахаваўшы свае ахвяры, была здзіўлена навіною. Ужо вечарэла, калі вёску абляцела вестка: прыйшлі партызаны. Зараневіч спачатку не паверыў, хоць задрыжаў ад пачуцця радасці. Няўжо? Праўда — прайшла па вуліцы група ўзброеных віптоўкамі хлопцаў. За імі чарадою беглі дзеці і ішлі дарослыя. Вось спыніліся і гутараць з жанчынамі. У хату ўбег Альшыпеўскі і крыкнуў да Зараневіча:

— Партызаны прыйшлі!

— Прыйшлі так прыйшлі... Ім жа не забароніш хадзіць,— адказаў Зараневіч.

— Можа вы выйшлі б пагаварыць з імі, яны вам мо больш чаго раскажуць.

— Не маю ахвоты,— адказаў Зараневіч і сачыў за вачыма Альшыпеўскага. Як ён ні намагаўся зрабіць іх

бесстароннімі, наіўнымі, за тонкай павалаччу блішчаў агапёк уцехі ад таго, што ахвяра блізкая да пасткі.

— Але ж і хлопцы здаровыя... Кажуць, у Маскве былі і назад прыляцелі...— бубніў Альшыпеўскі.

— Хай ляцяць, што мне да гэтага?

Альшыпеўскі, нічога не атрымаўшы, адышоў. Надзя слухала гутарку і ўсё казала Зарапевічу:

— Не хадзі, не спяшайся... Я лепш сама спачатку пайду, паглядж у.

І калі Альшыпеўскі выйшаў з хаты, стала збірацца. Зараневіч сказаў ёй:

— Як-небудзь ухітрыся, перадай Сцяпану, каб падышоў толькі на адну мінуту. Мая брытва ў яго — няхай прынясе...

Надзя выйшла, а Зараневіч неспакойна захадзіў па хаце. Гляпуў у акно яшчэ раз. Ізноў захадзіў. На твары выступілі чырвоныя плямы.

— Ну так, ён, не іначай... Буркалы... тыя самыя буркалы, а не вочы... І ніжняя мясістая губа... Ён...

Яшчэ раз глянуў у акно. Чалавек з вачыма навыкат і з ніжняй мясістай губой, узброены вінтоўкай, стаяў вось ля плота, шчэрыў зубы. «Тады ён быў у шапцы-вушанцы, а цяпер у кепцы... Гм... Ну, вядома, цяпер жа вясна, зараз лета, а тады была зіма...» Зараневіч адчуў, як у яго скронях застукалі малаткі. «Правакацыя...» Стаў сярод хаты, узяўшыся за шчаку. Думаў доўга, напружана.

У хату ціха ўвайшоў Сцяпан.

— Збірай, Сцёпа, сваю пяцёрку і будзь на варце. Скажы Говару, каб сабраў сваю.

— Гэта, па-мойму, не партызапы, Пётр Данілавіч,— прашаптаў Сцяпан,— бо з імі той губаты, што мы з вамі бачылі зімою ў лесе...

— Бачыў і я... Вось для чаго і кажу,— збірайце людзей. Чакайце мяне ў гумне... Гэта, Сцёпа, правакацыя... не іначай...

— І яшчэ адно, Пётр Данілавіч...— Сцяпан гаварыў хуткім шэптам, увесь схваляваны.— Яшчэ адно...

— Што? — перабіў Зараневіч.

— Усе так.. ну, гутараць, смяюцца, акрамя дваіх... Ці яны нямыя, ці што... Маўчаць, толькі дзяўчатам падмігваюць і шчыпаюць, як дзе каторая падверпецца... Трымаюцца трошкі ўбаку, між сабою гавораць ціха, як бы больш знакамі... Гэта проста кідаецца ў вочы...

— А як адзеты? — спытаўся Зарапевіч.

— Адзеты так, як і ўсе... Толькі папяросы курыць з залатымі кончыкамі.

— Значыць... Гэта — гестапаўцы. Не іначай. Усё зразумела... Прыйшлі кіраваць правакацыяй... ну, і парабаваць дзе што... Разведка і ўсё такое... Гэта — гестапаўцы, Сцёпа... Ідзі, хуценька збірай людзей...

Сцёпа глядзеў з хвіліну, утаропіўшыся ў Зараневіча, як бы раздумваючы над гэтай навіной, а затым, толькі сказаўшы «зараз», хутка выйшаў з хаты.

Гэтыя «партызаны» нічога не рабілі ў вёсцы. Зрабілі, праўда, адну рэч, а іменна: забралі ў старасты Мазуніка ўсё сала і пайшлі.

Зараневіч пайшоў на падворак. Ужо сцямнела. На захадзе цягнулася над лесам крывавая паласа пад навіслаю чорнаю глыбаю хмары.

«Здаецца, што з гэтага дня мы пачнём па-баявому дзейнічаць...» — думаў Зараневіч. Ад водбліску крывавага захаду твар яго быў бронзавы. Глянуў на хату Альшынеўскага, у вокнах якой пераламляўся водбліск ад заходзячага сонца, і падумаў, што нядрэнна было б даведацца, дзе ён цяпер. А Альшынеўскі якраз ішоў пасярэдзіне вуліцы, кіруючыся дахаты, і гаварыў сустрэчным аб адышоўшых «партызанах», аб тым, што яны, напэўна, прыйдуць яшчэ, што трэба выстаўляць варту нанач, што вартаваць павінны ўсе па чарзе, што бежанца Пятра трэба паставіць першым для спробы. Зараневіч, стоячы ля сцяны хаты пад яблынькай, чуў дзе-што з гэтай гутаркі. У душы была трывалая рашучасць, якую ён вынасіў у вялікім горы, цярпенні. У душы быў ужо ясны напрамак: «Альшынеўскі вярнуўся,— значыць, яны ўжо недзе за вёскай». І Зараневіч накіраваўся агародамі к гумну Сцяпана.

Хлопцы ляжалі ў прыстаранку на леташнім сене. Калі Зараневіч увайшоў у гумно, яны ўсхапіліся і сталі, абапёршыся на вінтоўкі.

* * *

Дзесяць бандытаў былі абяззброены за шэсць кіламетраў ад вёскі.

Назаўтра Зараневіч усім назначыў збор у лесе, там, дзе жыў Сахараў з групай. Павінен быў прыйсці лесавод. Лесавод прыйшоў да Говара ўначы, калі, здаецца, над

усім светам ліў дождж. Усё прыціхла, схавалася ад непагоды. Вада плюхацела за акном. Парыванні ветру тузалі маладую яблыньку, і шротам густа сыпаліся кроплі з яе. Уся вёска неяк утулілася — хаты, здаецца, яшчэ ніжэй паўрасталі ў зямлю. Вада сплывала па шыбах акон — адзінокіх і сляпых. Шуршала саламяная страха.

Ізноў, але ўжо мацней, пастукаў у акно Зараневічу Говар.

Сябры, доўга не марудзячы, пайшлі.

Дарога была нялёгкая. Хоць дождж крыху зменшаў, але цемра не давала мажлівасці разгледзець дарогу. Сябры час ад часу траплялі ў лужыны. Наперадзе ішоў Говар. Яму Зараневіч перадаў сваю батарэйку, каб у кожную мінуту можна было асвяціць якога-небудзь неспадзяванага «госця». Рэвальверы ва ўсіх трох былі ў кішэнях напагатове.

Але праз усё падарожжа не сустрэлі нікога. Калі з бакавой дарогі, што развілкай адыходзіла ад галоўнай, сышлі на сцежку, тут іх спыніў вартавы і давёў да зямлянкі Сахарава.

Сахараў не спаў. Пры святле ліхтара ён разлажыў на століку крыху пацёртую тапаграфічную карту і пільна ў яе ўглядаўся, трымаючы ў руках аловак. Глянуў на ўвайшоўшых прамоклых над дажджом сяброў і ўсхапіўся з месца:

— Вось гэта неспадзявана! Прашу, прашу...

Сябры пазнімалі з сябе свае курткі і, абтрахнуўшы іх, павесілі на цвіках, што былі ўбіты ў слупы — падпоры страхі зямлянкі.

Закурылі. У зямлянцы было зацішна і цёпла. Крыху аддавала вільгаццю. Лесавод сеў на лаўцы за столік і на момант прыпыніў дапытлівы позірк на Сахараве.

— Ну, пачынаем, таварышы...— прамовіў ён і выняў з кішэні невялічкі блакнот.

— Ітак, Калепік ужо тут... З таварышамі. Жывуць яны ў цяжкіх умовах. Жывуць у стозе на дзікім балоце. Факт, што доўга там яны жыць не могуць, трэба перабрацца ў другое месца...

— Чаму ім не пасяліцца ў лесе? Усё ж такі лепш,— спытаўся Говар.

— Лес у тым месцы амаль кожны дзень прачэсваецца карнікамі. Яны ведаюць, што робяць... Прыходзіў нядаўна да мяне Калепік. Прыходзіў упачы. Я вярнуўся позна — хадзіў да ляснічага, які выклікаў да сябе і казаў

станавіцца на работу... Выглядае Каленік як лясун. Барада вырасла амаль па пояс, худы, толькі вочы блішчаць... Хацеў прабірацца да цябе, Андрэевіч, але далёка. Прасіў, каб звязацца.

Агонь ліхтара, які стаяў на століку, праліваў тусклае святло на бярвеністыя сцены зямлянкі. Твары сяброў у паўзмроку выглядалі таямнічымі, вочы блішчалі зацікаўленасцю. Цыгаркі дымілiся бесперастанку.

— Перад намі, Іван Аляксеевіч, цяпер сталі складаныя задачы,— сказаў Зараневіч,— трэба пачаць дзейнічаць і больш абрастаць людзьмі і зброяй. На заўтра мы назначылі прыняцце прысягі ад нашых людзей. Мы ўжо, як бачыш, пачынаем жыць па-ваенпаму... Трэба будзе зрабіць раптоўны ўдар па гарнізоне, каб іх аглушыла, каб яны падумалі, што тут незлічоныя сілы. І для народа гэта будзе найлепшай агітацыяй. Лічу, Іван Аляксеевіч, што мы ад сягоняшняга дня павінны думаць аб выбары аб'ектаў для нападу...

— Аб'екты выберам...— сказаў лесавод,— і няхай гэта будзе для вас як дырэктыва. Да нашай наступнай сустрэчы распрацаваць план нападу на выбраны аб'ект.

Пачуўшы слова «дырэктыва», Зараневіч падумаў, што гэты лесавод няйначай з партыйнага цэнтра. І стаў больш мабілізаваным у сабе, падцягнутым.

* * *

Перад світаннем дождж заціх. На праясненым небе дагаралі набялеўшыя зоры. З-за лесу палыхала ўжо чырвань узыходзячага сонца. Зараневіч пайшоў у вёску адведаць сям'ю. Калі прыйшоў і прылёг на лаве, убачыў, што нейкі цень прасунуўся ля акна. Глянуў — па падворку прайшоў Альшынеўскі і накіраваўся да свае хаты.

«Што гэта за манеўры? Казалі — хворы, ды, выходзіць, што не зусім,— падумаў.— Тут пешта ёсць».

Выйшаў на двор, пасля на вуліцу, паглядзеў у абодва бакі. Нідзе нічога, цішыня... Тады вярнуўся і лёг заснуць па-сапраўднаму.

Пасля спедання, якое складалася з крапівы і хлеба (хлеба прынёс лесавод спецыяльна для Зараневіча), Пятро Данілавіч стаў збірацца ў лес. Сказаў жонцы, каб ішла ў поле на цэлы дзень абгортваць бульбу, бо могуць жа здарыцца розныя нечакапасці. Так і зрабілі — Зараневіч пайшоў у лес, а жонка з дзецьмі ў поле.

Прысягу прымалі чатырнаццаць чалавек з груп Сцяпана і Говара і дзесяць з групы Сахарава, не лічачы Зараневіча, лесавода, Говара і Сахарава. Першым прысягаў Сцяпан. Яго прысяга была буптоўна-шчырай. Сцяпан узмужнеў, пасур'ёзнеў пасля смерці бацькоў. Зараневічу ўспомніўся той момант, калі Сцяпан плакаў з сястрою над свежай магілай, і як ён уцяшаў, даводзячы: «Не плач це, мы за ўсё адпомсцім... Ад нашай помсты будзе гарэць зямля пад нагамі іх...» І цяпер вось Сцяпан стаіць сур'ёзны і пахмураны, гаворыць словы прысягі і ўплятае свае: «...Клянуся і памяццю бацькоў сваіх, загінуўшых ад рук фашыстаў...»

Сахараў выглядаў загарэлым, дзіўна ціхім і мала ўсміхаўся, як гэта было раней. Мусіць, дні, праведзеныя ў лесе, налажылі на яго такі след. На воку павязкі ўжо не было, але знак застаўся: вока было яшчэ чырванаватым і часамі слязілася. Лесавод меў з Сахаравым асобную гутарку.

Пасля прысягі камандзірам быў выбраны Сахараў, камісарам — Зараневіч. Сцяпан і Говар былі абраны камандзірамі груп. Некаторы час занялі арганізацыйныя справы. Пасля вырашылі, што Сахараў павінен з сваёй вёскі прывесці ў лагер другую групу. Была для ўсякага выпадку таксама выслана разведка ў вёску, дзе жылі Зараневіч і Говар. Разведка вярнулася цераз паўтары гадзіны і паведаміла, што атрад паліцыі, уварваўшыся ў вёску, падпаліў дзесяць хат партызан. Хаты гараць яшчэ і цяпер, а паліцыі ўжо няма.

— Дзе Альшынеўскі? — спыталіся разам Зараневіч і Говар.

— Альшынеўскі ў падпале ўдзелу не браў... Цяпер дома, ляжыць хворы...— адказалі разведчыкі.

Зараз жа на кароткай нарадзе пяцёрка (Зараневіч, лесавод, Сахараў, Говар і Сцяпан) вырашыла, што першым аб'ектам для партызанскіх аперацый будзе гарнізон у вялікім сяле пры шляху — Ражанка. План разгрому гарнізона даручана было распрацаваць Сахараву. Аперацыю правесці вырашылі пасля з'яднання з групай Каленіка. Адносна сямейнага лагера абмеркавалі, што рабіць яго яшчэ не час. Галоўнае, каб бесперастанку працавала разведка.

Пасля абеду лесавод сабраўся ў дарогу. На развітанне сказаў Зарапевічу і Говару, каб прыйшлі ў назначанае месца цераз два дні.

— На балота будзе выходзіць глухая дарожка,— паясняў, крэслячы маршрут на паперы.— Ля гэтай дарожкі налева, амаль тут жа пры выхадзе на балота, стаяць тры старыя дубы. Гэта будзе найлепшай прыметай. Калі выйдзеце на ўскраіну, убачыце два стагі — адзін бліжэй, другі далей, крыху ў кустах. Яны ў другім стозе. Возьмеце на тычку шапку і будзеце махаць. Яны заўважаць і выйдуць к вам. Вось і ўсё,— скончыў лесавод.

Пяцёрка ў дадатак вырашыла па прапанове Зараневіча расправіцца з Альшынеўскім.

Калі сонца стала хіліцца к захаду, адышоў з лагера лесавод. Крыху пазней пайшлі Говар і Зараневіч, каб упарадкаваць з сем'ямі. Заходзячы па свой падворак, Зараневіч заўважыў, што нешта бялее пад яблынькай. Падышоўшы, убачыў — сядзіць яго жонка з дзіцем на каленях, а побач на мяшку, набітым саломай, спіць Лёнька. Надзя прачнулася ад дрэмы.

— Чаго ты тут сядзіш? — спытаўся Зараневіч.

— Чакаю цябе... Сягоння пасля пажару быў сход на вуліцы... Альшынеўскі ды Анеля дамагаліся здаць нас у жандармерыю, бо гэта наша віна, што прыйшла паліцыя і падпаліла хаты...

— Я не ведаю, што было б далей,—прадаўжала Надзя,— але большасць сходу ўступілася за нас — і мужчыны і жанкі, так што да нічога не дайшлі і разышліся.

Голас у Надзі быў стомлены і збалелы. Туліла дзіця да грудзей, гаворачы павольна, як бы перажывала смагу. Ды так яно і было.

— Гаспадыня з сям'ёю недзе пайшлі, і яшчэ няма... Нічога мне не сказалі... Хата пустая... Сяджу, і сэрца нешта калоціцца. Пабаялася адна сядзець у хаце... Вось выйшла... Ідзі прынясі мне вады...

Зараневіч пайшоў у сенцы і перш-наперш агледнуў у палавіну гаспадыні. Увайшоў — і стаў, разгубіўшыся. Кашляпуў, і рэха прагучала па хаце. Хата была сапраўды пустая. Ля стала пры сцяне заўсёды стаяла скрыня — яе ўжо не было. Не было і пасуды на паліцы, ніякай адзежыны па сценах. Зараневіч скочыў у камору і там таксама ўбачыў апусташэнне — не было ні кадушак, ні скрынь.

Нешта злавеснае мільганула ў галаве Зараневіча. Што? Прабегла страшпая здагадка. На момант гарачкай абдало яго з галавы да ног, і на лбе выступіў пот. Калі прынёс вады Надзі, здолеў толькі сказаць:

— Пі хутчэй, бо нам нельга заставацца тут ні па хвіліну.

— Чаму? — нічога не ведаючы, у сваёй чыстай прастаце спыталася Надзя.

— Не толькі няма гаспадыні з сям'ёю, але і хатніх рэчаў няма ў хаце, ні ў каморы... Ці ж ты не бачыла, калі і куды яны гэта ўсё павыносілі?

— Не, не бачыла... Была ў полі... Пасля з дзецьмі хадзіла ў лес... Няўжо няма нічога? Як я вярнулася з лесу, дык старая стаяла на парозе... Калі пайшла з дому — я гэтага, праўда, не ведаю...

— Эх, дзівачка ты, дзівачка... Ты можа хворая? Га! — Зараневіч прылажыў руку да лба Надзі. Лоб быў гарачы.— Ні хвілінкі тут нельга сядзець.

Зборы трывалі не больш пяці хвілін. Увесь «хатні скарб» быў пакладзен у мяшок. Выйшлі за вёску на ўзлессе. Зараневіч вёў за руку соннага Лёньку, які намагаўся вось-вось заплакаць.

Пакінуўшы сям'ю ў лесе, у нейкім няскончаным зрубе, Зараневіч памкнуў да Говара. Говар яшчэ не спаў. Пачуўшы ад Зараневіча пра ўсё, што адбылося, ён насупіўся.

— Няўжо нячыстая сіла падумала нешта... Гэта нездарма... Старую, вашу гаспадыню, папярэдзіў... А сам усё хворы... Да чаго можа быць здатная бэстыя,— абураўся Говар.

— Нам нельга, Андрэевіч, траціць часу... Трэба папярэдзіць вёску... Пасылай свайго хлопца і дзяўчыну — няхай ідуць па хатах і скажуць, каб людзі былі напагатове... падаваліся ў лес... Давай будзем ачышчаць тваю хату...

Цераз гадзіну-дзве некаторыя сяляне, нагрузіўшы на вазы і на сябе свой скарб, са скрыпам і ціхім гомапам ад'язджалі ў лес. Першым на фурманцы ехаў Говар з сям'ёю. Побач з лагерам ваенным сам сабою рабіўся ўжо лагер цывільны.

VIII

Калі Альшынеўскі клаўся спаць, Апеля паведаміла яму, што людзі ад'язджаюць у лес, што, можа, яны што дзе пачулі. Альшынеўскі ўсміхаўся ў адказ.

— Няхай дурні павалочацца па лесе. Надаесць, вернуцца. Нічога вёсцы не пагражае. Каб што мелася быць, то я ведаў бы...

Альшынеўскі пазяхпуў на ўвесь рот і павярнуўся на бок. Праз хвіліп дзесяць ён ужо хроп з прысвістам на ўсю хату.

Альшынеўскі прачнуўся ад стуку ў шыбіну акна. Нехта стукаў проста яму над галавою.

Ён хутка пакінуў каптан, кепку і выйшаў. Ноч была цёмная і ціхая. Здаецца, спала ўсё на свеце. Альшынеўскі з нейкім чалавекам, што быў з вінтоўкай за плячыма, хутка, нават прыгпуўшыся, накіраваліся к хаце, дзе пражываў Зараневіч. Першае, што яны зрабілі,— гэта зашчапілі дзверы, пасля абышлі хату навокал. Альшынеўскі прыпаў к шыбіпе акна, углядаўся.

— Ці ёсць у цябе батарэйка? — спытаўся ў свайго сябра.— Здаецца, што яны тут.

— Ёсць,— адказаў той. Выняў батарэйку, пакіраваў у акно, але як ні націскаў на гузік, батарэйка не запальвалася. Сталі глядзець у вокны абодва. Нешта там бялела-маячыла, нешта нібы паварушылася, злёгку застагнала. Здалося нават, што нехта кашлянуў, нібы дзіця.

— І мне так здалося,— шапнуў Альшынеўскі.— Пачынаем.

Цёмная постаць з вінтоўкай дастала з кішэні бутэльку і пырснула з яе на сцяну нейкую вадкасць. Пасля пайшла к сцяне, што ад вуліцы, і там зрабіла тое самае. Так абышла ўсю хату наўкола. Цераз хвіліну чатыры агеньчыкі мільганулі на чатырох сценах хаты. Яны шторaз пашыраліся, абдымалі сцены языкамі, аж пакуль не злучыліся ў адзін вогненны шырокі абруч.

У гэты час Зараневіч выйшаў з лесу з пяццю партызанамі. Але, абышоўшы вёску наўкола, яны нідзе нікога не знайшлі.

На ранак у вёсцы ўсе гаварылі, што бежанцы згарэлі. У гэтай гутарцы была і розніца: адны гаварылі, што толькі жонка з дзецьмі, а другія,— што загіпулі ўсе. Ганна хадзіла ля яшчэ гарачага папялішча з тычкаю і торкала ў попел, уціраючы другою рукою слязу за слязою. Яна думала — можа знойдзе хоць якія сляды астаткаў чалавека. Не знаходзіла нічога. Села тут жа ля плота на бервяно і затраслася ў глыбокім плачы.

— Дамучыліся, бедныя, ды так цяжка і страшна... Дзе ж тая пагібель на гэтых душыцеляў? Калі яна прыйдзе? — так праз плач гаварыла сама з сабою Ганна. Працерла вочы, поўныя слёз, і ўбачыла над галавою Альшынеўскага.

— А ты чаго плачаш? Варона ты, варона... Цешся, што сама жывеш. Плакаць здумала... Па кім? Можа гэта быў твой брат, сват?

Ганна маўчала, а потым не выцерпела:

— У цябе сапраўды няма ні братоў, ні сватоў, ты наўкол чужы для ўсіх... А ў мяне ёсць і сват, і брат, вось я і плачу, мне ёсць па кім плакаць...

— Яшчэ хваробу ў бок сабе наплачаш,— сказаў Альшыпеўскі.

— Не, ужо горшай хваробы, як ты, і на свеце няма...

— А ты маўчы, не задзірайся...— уставіўся вачыма Альшыпеўскі.

— А што ж ты мяне хваробаю страшыш! Не задзірайся... Мае вочы на цябе і глядзець не хочуць, а не толькі з табою задзірацца...

Ганна ўстала і пайшла. Альшынеўскі, скрывіўшы галаву, глядзеў ёй услед, як чымсьці азадачаны.

Зараневіч вырашыў, што адпраўляць сям'ю назад у вёску непатрэбна, раз ворагі ўзялі курс на яе знішчэнне. З другога боку, хацелася паказаць людзям і самому Альшынеўскаму сваю перамогу. «Але з гэтым яшчэ паспеем»,— падумаў. Куды ж накіраваць сям'ю? Вось задача. Пасля нарады з Говарам і Сахаравым вырашылі накіраваць яе ў вёску лесавода. Туды трэба было ісці кіламетраў пятнаццаць і ўсё лесам. Правёў бы Надзю хоць да палавіны дарогі, калі нельга было б на больш, але сёння трэба ісці ў групу Каленіка — гэтае заданне даручана выканаць яму, Зараневічу, і Говару. Зараневіч раіцца з жонкай. Яна згаджаецца ісці і кажа, што да вечара пройдзе пятнаццаць кіламетраў. Гэта была адсутнасць разліку — гэтая жанчына рада была ісці і ісці, хоць на край свету, абы толькі пазбыцца гэтага месца. Зараневіч правёў Надзю кіламетры тры, несучы Лёніка на руках.

— Вось тут, Надзя, пасядзіце, пачакайце, аж пакуль не прыйдзе да вас адзін хлопец, які павядзе вас аж да канца. Хто будзе, які хлопец, яшчэ я не ведаю, але абавязкова будзе.

Прыпыніліся і сталі адно супроць аднаго. На некаторы час сустрэліся вачыма. Зараневіч адчуў, што гэта стаіць іменна яго жонка — самы блізкі і ласкавы чалавек, каторы нясе на сабе такі аграмадны цяжар. Нясе яго без дакору, без жальбы. І хваля ласкі заліла сэрца Зараневіча.

— Надзечка, я вас ужо не скора ўбачу... Дай патрымаю дзіця...

Пару ўсмешак да дзіцяці. Прысеў на прыдарожны пень і прытуліў да сябе Лёніка. Цалаваў сваіх дзяцей. Не скора іх убачыць, а можа... хто ведае... можа гэта апошні раз. Развітаўся з Надзяй ціха, ласкава, прасіў, каб усё зносіла цярпліва. Перадаў дзіця назад. Надзя ўцерла слязінку і, сеўшы на пень, прытуліла да сябе Лёніка. Як бы гэтым яна ўжо казала Зараневічу:

— Ідзі, ідзі, бо каб не было позна...

«Вось гэта якраз і трэба, гэтыя дарагія словы»,— поўны ўдзячнасці да Надзі, падумаў Зараневіч. Ён усміхнуўся сям'і ўцешнай, супакойваючай усмешкай і пайшоў проста ў лес нацянькі.

Надзя чакала не больш гадзіны, пакуль прыйшоў партызан. Гэта быў здаровы, вясёлы хлопец — ён пасадзіў Лёніка сабе на спіну, і ўсе пайшлі пясчанаю лясной дарогай.

IX

Назаўтра на самым світанні Зараневіч і Говар, узброеныя дзесяцізарадкамі і гранатамі, выйшлі з лагера.

Была ўжо самая квяцістая пара вясны. Пах дуба перамешваўся са смалістым пахам сасны і са свежым, як маладосць, пахам чаромхі. Дрэвы ў ранняй цішыні стаялі нерухома і, як здавалася Зараневічу, з бадзёрасцю праводзілі іх усё далей і далей у глыбіню лесу. Прачыналіся першыя птушкі.

Каля броду іх сустрэў партызан-дазорны, увесь мокры ад расы. Партызан быў тутэйшы, з групы Сцяпана.

— Ото нячыстая сіла...— сказаў ён.

— Што такое? — спыталіся Зараневіч і Говар.

— Бачыў гэтага злыдня... Альшынеўскага... Прайшоў нядаўна... Каб ён вам не папсаваў усёй абедні.

— Не папсуе. Пойдзем следам за ім, прасочым, куды ён пойдзе. Бо ён нездарма так рана выйшаў,— сказаў Зараневіч.

— Як доўга будзем цацкацца з ім? — абураўся Говар.

— Ужо нядоўга... Пайшлі! — сказаў Зараневіч і з месца ўзяў шырокі крок.

Доўга ішлі дрымучым лесам. Мала што гаварылі. Перакідаліся паўсловам. Калі ішлі моўчкі, задуманыя, здавалася, што адзіны сведка — лес таксама пешта думае.

Дрэвы нібы прыслухаліся да іхніх крокаў, праводзілі ціхімі позіркамі.

Колькі ні ішлі, Альшыпеўскага підзе не заўважылі.

— Лапануў, чорт,— сказаў Говар.

Ужо сонца перайшло палудзённую пару, а дарога ўсё яшчэ ішла лесам. Калі перайшлі адзін шырокі брод, дарога прыкметна пайшла ўніз. Лес стаў дзе-нідзе прасвечвацца.

— Блізка ўжо балота,— сказаў Говар,— будзем па старожы.

Лёгкі неспакой прабег па нервах. Сябры прыціхлі і напружана ўглядаліся навокал. Дарожка павярнула ўправа, і сябры ўбачылі вылет яе на прастор. Вось налева відны і тры дубы — густалістыя, раластыя. Сябры прыбавілі кроку.

— Стой,— таркануў Говара рукою Зараневіч.— Нейкі трэск, і я пачуў чалавечы голас.

Стаялі, слухалі. Стаялі за кустамі і глядзелі ў вылет дарогі на балота. Выразна ўбачылі, як дарогу ля самага вылету на балота перабег чалавек у форме эсэсаўца. За ім другі, трэці і больш. Хутка недзе далёка на балоце пачуліся ўзрывы гранат. Сябры збялелі і глянулі адзін аднаму ў вочы. Убачылі, як за лесам паваліў слуп чорнага дыму. Вецер данёс пах палепага сена.

— Падпалілі стог...— прашаптаў Говар.

— Што рабіць? — сказаў Зараневіч шэптам.— Ісці назад... Не, трэба пачакаць, пакуль пройдуць гітлераўцы.— Зараневіч гляпуў уверх на дубы, і яго азорыла шчаслівая думка. Прамовіў, як бы загадаў:

— Лезь, Андрэевіч, на той дуб, а я на гэты. У разе чаго чакай сігналу ад мяне. Буду я страляць, страляй і ты, буду я кідаць грапату, кідай і ты... Ну, хутчэй!..

Праз хвіліну сябры былі на дубах. З вышыні ўбачылі, як навокал стога, які палымпеў, стаяла многа эсэсаўцаў. Другі стог, які быў далёка ў кустах, стаяў цэлы. Эсэсаўцы доўгімі тычкамі падварушвалі сена, раскідалі па балоце, думалі, папэўна, што з стога выскачаць людзі. З стога ніхто не выскакваў.

Дагаралі падонкі сена. Гітлераўцы тычкамі паролі ў гарачы попел. Потым адзін з іх у седлаватай шапцы даў знак, і ўсе кінулі тычкі і рушылі на дарогу проста над дубы. Прыйшлі захляпаныя ў балоце, сталі паўкругам навокал седлаватай шапкі. Сябры глядзяць з дубоў, прытаіўшы дыханне. Не дзіва — апошні гітлераверц, які далучыўся да круга, быў... Альшыпеўскі. Говар спіспуў зу-

бы і мацней ушчаперыўся за галіну. Зараневіч лічыў гітлераўцаў. Налічыў трыццаць. Альшынеўскі быў трыццаць першы.

— Кдзе партызаны? — пыталася ў Альшынеўскага седлаватая шапка.

— Я ведаў, што былі тут, а дзе цяпер, хто іх ведае, буду шукаць,— патупіўшы вочы, адказаў Альшынеўскі.

— Калі за тыдзень не знойдзеш — расстраляем,— сказала седлаватая шапка і адвярнулася вострым носам ад Альшынеўскага.

Зараневіч зразумеў, што гітлераўцы зараз будуць адыходзіць. Нервы ўзняліся, напружыліся, дрыжачая рука палезла да гранаты.

Выбух быў аглушальны. Услед выбуху паляцела другая, трэцяя граната. Говар таксама пускаў адну гранату за другою. Зараневіч не бачыў, колькі эсэсаўцаў упала, толькі заўважыў, як ляцела ў дыме седлаватая шапка. Стаў страляць з дзесяцізарадкі. Страляў і Говар.

Зразумела, што для эсэсаўцаў гэта было неспадзяваным. Уцякаючы, яны спатыкаліся, падалі, але былі і такія, якія, прапоўзшы некалькі крокаў, азіраліся навокал, каб сарыентавацца, адкуль адбыўся ўдар.

І тут здарылася тое, чаго не чакалі пашы сябры на дубах. Калі Зараневіч і Говар пачалі страляць з дзесяцізарадак, пачулі зусім блізка моцныя віптовачныя залпы. На нейкі момант у Зараневіча мільганула думка, можа якія іншыя гітлераўцы зайшлі з другога боку і, не ведаючы ў чым справа, страляюць навослеп. Сябры на дубах перасталі страляць і толькі слухалі. А залпы білі ўжо направа ад дубоў і налева.

«Як быццам пайшлі ў абход,— падумаў Зараневіч.— Няўжо гэта нашы?»

Парахавы дым асядаў паволі на кустах. Залпы змяніліся адзіночнымі стрэламі і ўрэшце сталі заціхаць. З дуба Зараневіч бачыў — воддалі, за дарогаю, між кустоў, ляжаў забіты эсэсавец. Аўтамат у яго быў на шыі і пры падпні ўпёрся ложам у зямлю і цяпер тырчаў уверх руляй. Раптам каля забітага паказаўся барадаты чалавек у чорнай пашарпанай куртцы, з вінтоўкай у руках напагатове. Чалавек пераступіў цераз забітага эсэсаўца і пакіраваўся па дарогу к дубам. Выйшаўшы на дарогу, глянуў у абодва бакі, паціснуў плячыма і сам сабе прамовіў:

— Дзе ж яны? Хто ж тут страляў?

З суседняга дуба пачуўся асцярожны голас Говара:

— Ігнат, гэта ты?

Затрашчала галлё. Говар спехам злазіў з дуба.

— Кастусь...

Сябры абняліся.

— Пятро Данілавіч, злазьце... Гэта свае...

Зараневіч ужо сам злазіў з дуба.

— А, гэта той... твой таварыш? Чуў, чуў,— сказаў барадач, гледзячы на Зараневіча.— Дай абніму і цябе... Ай, хлопчыкі, малайцы... Добрую работу зрабілі...

Гітлераўцы ляжалі ў розных позах — уроссып і адзін на другім. Былі і раненыя.

Говар шукаў вачыма Альшыпеўскага.

— Так, пабылі ў работцы,— прамовіў ён з задавальненнем.— Але дзе той злыдзень? Ніяк не знайду...

Сябры падышлі бліжэй да забітых гітлераўцаў і ўбачылі: з-пад іхніх цел у адпым месцы тырчала збоку рыжая галава, уткнутая носам у зямлю. Гэта быў Альшыпеўскі.

— Га-а... Вось даскакаўся,— сказаў Говар.— А дзе ж твая кепка, рыжы чорт? І не відаць яе. Вось згніеш тут без роду, без племені. Усе добрыя людзі пляваць будуць на гэтае месца, дзе ты здох. Ляжы! Каб і трава не выросла на гэтым месцы.

З кустоў па дарогу выйшла некалькі партызан. Сярод іх быў лесавод.

Партызапы віталіся з Зараневічам і Говарам. Прамяневў твар лесавода. Ён гаварыў:

— Мы паўзлі ўжо балотам, калі эсэсаўцы кіраваліся да стога. Прапаўзлі кіламетры два, калі не больш...

Паціскаючы Зараневічу руку, з усмешкай прадаўжаў:

— Помніце, вы гаварылі аб пошуках падпольнага партыйнага цэнтра?

— Помню,— адказаў Зараневіч, заінтрыгавана гледзячы ў вочы лесаводу.

— Перад вамі стаіць член падпольнага райкома партыі. Цяпер можаце ведаць і маё прозвішча, якога пават і Говар не ведаў. Прозвішча маё — Мядзведзіч...

Зараневіч схапіў за руку лесавода і толькі мог сказаць, увесь праяспеўшы:

— Ах, Іван Аляксеевіч... Як гэта добра... Якая выдатпая ваша работа... Я пачынаў ужо і тады разумець, што вы пяйначай...

— Цяпер мы праверылі адпы другіх... Цяпер будзем разам...— сказаў лесавод.

Ён завіхпуўся наўкол і амаль крыкнуў Говару, які ўсё яшчэ «бласлаўляў» Альшынеўскага:

— Няма часу... Сабаку — сабачая смерць... Няма чаго над ім слоў траціць... Трэба збіраць зброю.— А сам, прыпомніўшы пешта, дадаў: — Гэта яму і за маладую бярозку!

— Ай, малайцы... Гэта — удача...

— Зброю, хлопчыкі, збірайце... Даволі растабарваць! — ужо крыкнуў Калепік. І не відаць было ў гэтым чалавеку перажытых пакут.

А сэрца Зарапевіча таропка выстуквала: «Час на дарогу, сябры, на вялікую баявую дарогу!»

КАМЕНЬ

I

Гэта было ў пачатку нашага стагоддзя...

У невялікім фальварку пана Казіміра Рэклайціса не толькі ціха, але нават неяк дрымотна, сонна. Ці было віната ў гэтым жнівеньскае сонца, ці, можа, ад таго, што на падворку ўсюды млява хадзілі куры? Яны паласкаліся ў пяску, у градах, у крапіве, ля плота...

Старасвецкі драўляны домік з амшэлай гонтавай страхою, дажываючы век, абапёрся на чатыры драўляныя калоны, якія з усім домікам пахіліліся ўперад. Адчыненыя насцеж дзверы, з якіх ніхто не выходзіў, гаварылі аб беспакланотнасці гаспадароў да ўсяго навакольнага. Здавалася, што жыхары пакінулі гэтую сялібу, пакінулі без боязі, што могуць прыйсці сюды ліхія людзі і забраць усё дабро. Праўда, у садзе, які быў усё ж такі велікаваты, хоць недагледжаны, стаяла хатка, у якой жыў садоўнік Яўхім, ён жа і пасечнік, і начны вартаўнік, але і яго няма,— пацягнуўся на Нёман з маладым панічом вудзіць рыбу. Апрача хаткі ў садзе, бліжэй да Нёмана, на самай ускраіне двара, цягнулася шэрая даўгаватая будыніна, якая ўрасла ў зямлю па вокны. У ёй туліліся дзве сям'і парабкаў, але і іх не было,— паехалі араць на поле. Іх гаспадыні падаліся з дзецьмі ў бліжэйшы лес па грыбы. Нікога не відаць у фальварку, нават і экономкі-служанкі, якая пайшла ў недалёкае мястэчка купіць тое-сёе для дому.

Сонца ўзнялося высока і пачало прыпякаць, калі ў цішыню падворка ўварваліся галасы. На пясчанай дарожцы, што выходзіла з двара паўз жыллё парабкаў да Нёмана, паказаўся каштанаваты сабака, а за ім два чалавекі. Адзін, пасівелы, быў у скамечанай шапцы, а другі, высокі юнак — у саламяным, пажоўклым ад заношанасці капелюшы і ў нацельнай сарочцы. Гэта быў садоўнік Яўхім з так званым панічом.

Яўхім нёс на плячы чатыры вуды. На іх вісела вядзерца для прынанкі, а юнак трымаў у мокрай зрэбнай торбе налоўленую рыбу, якой было няшмат.

Рыбакі спыніліся ля свірпа, і пад яго павеццю Яўхім паставіў вуды. На тварах абодвух, у кожнага па-свойму, адбівалася прыемная стомленасць. Вочы Яўхіма яшчэ больш паглыбіліся сярод зморшчак, на якіх быццам заста-

лася яшчэ вільгаць ад расы, як на шэрай зямлі. Твар юнака крыху асунуўся, ад чаго завастрыўся яго роўны даўгаваты нос. Ён зняў каняюш, павесіў яго побач з вудамі на жалезны крук і прыгладзіў свае залаціста-русыя валасы, якія мяккімі хвалямі клаліся назад аж да самай патыліцы. Лоб з лёгкімі маршчынкамі гаварыў, што гэтага юнака ўжо кранула сур'ёзнасць думак і перажыванняў. Цёмныя вочы глядзелі неяк удумліва, крытычна і разам з тым непасрэдна.

— Ах, як прыемна, Яўхім, зараз памыць рукі, паесці і паспаць.

— То ўжо ж... дня хопіць... Спаць на пасеку прыходзьце.

— Добра,— адказаў юнак і працягнуў Яўхіму торбу з рыбай.

— На, бяры, Аксеня спеданне згатуе... Пад'ясі...

— Што вы, пане Яне? Лавілі ж разам, і вы выцягнулі найбольшыя дзве рыбіны... Не, бярыце вы... Пан наш, бацька ваш, любіць свежую рыбу.

— Не, не, Яўхім, бяры, няхай згатуе Аксеня, я прыйду... Тата, як звычайна, мусіць, нездаровы,— адказаў рашуча юнак і, усміхнуўшыся, дадаў: — Эх, не ўтрымалі вы... важная была рыбіна. Трэба было дзвюма рукамі за вудзільна і так... лёгенька.

— Я ведаю, не першы раз,— увесь заварушыўся Яўхім,— нічога, мы яе сцапаем...

— А ўсё вінавата ваша малітва. Вы правай рукой бохалі кулаком сабе ў грудзі, адчытваючы пацеры, а тут якраз яна і хватанула. Вы рванулі спярша левай, а потым абедзвюма рукамі. Каб не малітва, вы б яе выцягнулі. Ці ж можна дзве работы рабіць зараз. Бачыце, малітва зрабіла шкоду. А хто скажа, што яна калі-небудзь рабіла карысць? Га?

— Што вы, паночак, бог з вамі! — крыху адступіўшыся, прамовіў Яўхім.— Не было ж часу дома. Гэта ж для бога.

Юнак засмяяўся.

— Добра, пагаворым потым,— сказаў ён.

А Яўхім тым часам наблізіўся да юнака і таямніча, амаль шэптам, пачаў гаварыць:

— У тое месца, дзе сёння вудзілі,— пад камень — не пойдзем. Там заўсёды якая-небудзь няўдача ды здарыцца.

— Пад які камень? Што з крыжам? Ага...— працягнуў юнак і сам сабе ўсміхнуўся.

* * *

Пан Рэклайціс пасля шклянкі кавы сядзеў у сваім кабінеце, як звычайна апрануты ў халат, і рашаў чарговую шахматную задачу, узятую з часопіса «Нива», экземпляры якога відаць запушчапасць. Шпалеры на сценах да таго выцвілі, што нельга адгадаць іх першапачатковы колер. Яны былі не то жоўтыя, не то шэрыя, не то яшчэ якія. Там, дзе ўбіты цвікі для партрэтаў і карціш, гняздзіліся ў шчылінках клапы. Яны, безумоўна, жылі і ў кніжках на невялікіх стэлажах, дзіркаватых ад шашалю. На процілеглай сцяне вісеў у старынных рамках партрэт Міцкевіча, а крыху воддаль з-за шкла выглядала кучаравая галава Пушкіна, і тут жа побач — доўгія вусы і шапка-папаха ўкраінскага кабзара Тараса Шаўчэнкі. Направа ад пісьмовага стала, над этажэркай, нібы прыхаваны ў цяньку, глядзеў з невялічкіх рамак ксёндз, хударлявы, з аскетычным тварам. На партрэціку ўнізе можна было прачытаць два словы, напісаныя лацінкай: Kristjonas Donelajtis. Гэта паэт прыгоннай літоўскай старыны. На шырокім пісьмовым стале стаяла чорная статуэтка Дантэ, а побач — пісьмовы прыладак з перламутра, бязлітасна запылены; над купеллю нахілілася статная Венера, сабраўшыся купацца.

Далей на сценах віселі фотаздымкі краявідаў Нёмана і сярод іх над выцвілай старасвецкай канапай быў адзін здымак каменя з жалезным крыжам.

Запушчаны кабінет, недагледжаны, бы сапраўды няма каму яго даглядзець. Пан Рэклайціс баіцца, каб служанка не дакраналася да кніжак, бо тады не знойдзеш чаго трэба. А рамонт давядзецца яшчэ на год адкласці.

— Не чапайце мяне, не перашкаджайце,— адмахваецца пан Казімір тады, калі служанка захоча крыху прыбраць кабінет.

Удавалася ёй гэта зрабіць толькі ў той час, калі гаспадар выходзіў на прагулку, што здаралася рэдка ў апошнія гады.

Пан Рэклайціс сядзеў, нахіліўшыся над шахматнай дошкай, соп посам, часам шчоўкаў пальцамі, уздымаючы руку, і наўтараў сам сабе:

— Гм... Каб цябе пляга... Гм...

Палыселы і пасівелы, з азызлым тварам, ён меў цёмныя вочы, якія часта мігалі і разам з засяроджанасцю выражалі штосьці наіўнае. За гэта яго ў свой час любілі

жанчыны і жартавалі над ім, але і ён не заставаўся ў даўгу. Гэта не азначала, што Рэклайціс не быў ніколі суровым. Ён бываў не толькі суровы, але і крыклівы, асабліва калі гутарыў са сваімі парабкамі-літоўцамі.

Казімір Рэклайціс выхоўваўся ў прапольскіх традыцыях, бо паходзіў хоць з літоўскага, але ўжо спалаізаванага роду. Аднак у сям'і разам з польскай захоўвалася і літоўская мова. Ведалі і беларускую мову, якою ў гэтай мясціне, дзе жыў Рэклайціс, даводзілася карыстацца найбольш, бо тут беларускія вёскі перамешваліся ўжо з літоўскімі.

Бацька Казіміра Адам Рэклайціс, юрыст па адукацыі, уласнік трохсот дзесяцін зямлі разам з лесам, удзельнічаў у паўстанні 1863 года. Паранены ў наднёманскіх лясах, ён быў узяты ў палон. Пасля выздараўлення царскі суд саслаў яго ў Сібір, адкуль ён і не вярнуўся. Маці ад гора захварэла на сухоты і хутка памерла. І таму адукацыяй маладога Казіміра, якому было ў часе паўстання пятнаццаць год, заняўся нейкі дзядзька па матчынай лініі, засцянковы шляхціц, прызначаны судом за апекуна. Апекаваць трэба было не толькі гэтага аднаго нашчадка Рэклайцісаў, але і ўсю гаспадарку, у якой засталіся толькі сто пяцьдзесят дзесяцін, бо другія сто пяцьдзесят царскі ўрад канфіскаваў за ўдзел бацькі ў паўстанні. Гэтыя дзесяціны пайшлі ў надзелы сялянам у выніку рэформы 1861 года і палітыкі цара ў адносінах да сялянства Беларусі, Літвы і Польшчы. Каб спыніць рэвалюцыйны ўздым прыгоннага сялянства гэтых краін, абуджанага паўстаннем, царызм вырашыў надзяліць яго большымі надзеламі зямлі, чым у карэннай Расіі.

Казімір Рэклайціс скончыў рускую гімназію ў Вільні, а потым ветэрынарны інстытут у Маскве. Дзядзька-апякун хацеў, каб яго пляменнік быў гаспадаром, каб трымаў у цэласці сваю спадчыну.

Вучоба маладога Казіміра ў Маскве, як аказалася, вызначыла склад яго мышлення на ўсё яго жыццё. Калі Казімір прыязджаў з Масквы на лета ў свой фальварак, то сустракаў паблажлівую ўсмешку дзядзькі і паслухмянасць усёй фальварковай службы.

Але, гутарачы з дзядзькам, ён з усёй шчырасцю пераканаўча юнака гаварыў аб вялікай сацыяльнай несправядлівасці, аб нядолі народа, аб тым, што трэба сяляне надзяліць памешчыцкай зямлёю, і нават аб тым, што трэба скінуць цара.

Дзядзька слухаў, пыхкаў люлькай, выпускаючы дым праз адчыпенае акно пад бярозу, і ўсміхаўся. А потым круціў галавою і гаварыў:

— Ці то ў Маскве школа такая ёсць, ці што, дзе вучаць вас такім, наше, віктарыям? Га? Глядзі, пябожа, каб не пайшоў ты ўслед за бацькам.

Казімір у адказ на гэта звычайна гаварыў:

— Уся Расія паўстане... Уся Расія!..

Дзядзька мармытаў:

— Мм... Мы не дачакаем гэтага паўстання. Шануйся, хлопча, у цябе бацькоўская фартуна... Яшчэ гадок — вернешся,— і мы цябе ажэнім...

Але зусім не туды плылі думкі Казіміра.

Дзядзька, памаўчаўшы, прадаўжаў:

— Часцей хадзі са стрэльбай у лес, дапамагай Пятру, бо многа парубак. Пільнуй свайго — гэта напэўней.

Казімір сапраўды часта хадзіў у лес, але не для таго, каб лавіць сялян на парубцы, а на паляванне, для ўласнай уцехі. Хадзіў адзін або з лесніком Пятром. Калі яму здаралася застаць сялян за збіраннем ламачча, ён нават заступаўся за іх перад сваім лесніком.

Надышоў час, калі ён, скончыўшы ветэрынарны інстытут, вярнуўся ў свой фальварак. Тады з'ехалася ўся радня, якая толькі была ў шляхецкай акрузе, і вырашыла, што Казімір павінен жаніцца. Жанчыны пачалі нашэптваць яму на вуха розныя імёны дзяўчат-шляхцянак. Але жаніцца ў Казіміра не было ніякай ахвоты.

— Каб жаніцца, трэба пакахаць, а так — што? — казаў ён.— Жыць без кахання — гэта значыць есці яблыка без соку.

Усе госці гукнулі ў адказ збітае, старасвецкае: «Сцерпіцца — злюбіцца!»

Госці раз'ехаліся, і Казімір Рэклайціс, гаспадар бацькоўскай фартуны, стаў жыць адзін, праводзячы час з парабкамі. Да работы па гаспадарцы не хілілася сэрца, не падымаліся рукі. Калі б хто спытаўся: «Чаму?» — Казімір адказаў бы: «Багацця я не хачу і не люблю, трэба ўсё аддаць народу. Я чакаю рэвалюцыі».

Спачатку ён крыху быў зацікавіўся жывёлай, якую любіў, завёў новую пароду кароў і купіў народзістую кабыліцу. А потым усё здаў на рукі акапома. Часта стаў ад'язджаць надоўга ў Вільню і нават у Варшаву да сваіх літоўскіх і польскіх таварышаў па вучобе і рэвалюцыйнаму гуртку ў Маскве.

Прайшоў год, другі, трэці, а рэвалюцыі ўсё не было. І пайшоў Казімір Рэклайціс з прапагандай у народ па-свойму: пайшоў у карчму. Там у гомане сялян выліваў сваю тугу за чаркай, часам напяваючы:

Не тоска, друзья-товарищи,
В грудь запала глубоко...

Сяляне ўсміхаліся, за яго ж грошы пілі за яго здароўе. Прасілі ў яго лесу — ён даваў, прасілі жыта, капюшыны на насенне — таксама даваў. Грошай не патрабаваў. Калі хто аддасць, то і добра. Расказваў сялянам, як трэба пабудаваць лад, каб усім добра было. Дзівавaліся сяляне і многія думалі: «Відаць, нешта з розумам зрабілася ў пана».

Пажылы стаў Казімір Рэклайціс, пахмурны. Адпусціў вусы, бародку. Хадзіў ужо з кіем адмысловым і пачаў курыць люльку. Гаварыў з сялянамі, з аднымі па-беларуску, з другімі па-літоўску. У гутарцы любіў карыстацца мясцовымі народнымі прымаўкамі. І разам з тым, стукаючы кіем аб падлогу карчмы, часта казаў:

— Калі я, пане мой, вучыўся ў ветэрынарным інстытуце ў Маскве і калі адпаго разу ў нас была студэнцкая сходка супроць цара...

Усе, хто быў у карчме, пераглядаліся і пачыналі гаварыць:

— Пане Казімір, ціха, а то і сцены маюць вушы...

— Я гэтыя вушы заткну! — крычаў Казімір і гаварыў далей.

Аднак аднаго дня брычка са званочкам пад дугою пад'ехала да ганка пана Казіміра. З яе саскочыў пан іспраўнік. Гутарка спачатку вялася ў кабінеце, а потым у сталовай за чаркай. Па скончэнні «гутаркі» хатняя служба ўжо саджала пана іспраўніка ў брычку і побач клала абкручаны ў палатніну кумпяк.

Пасля гэтага былы студэнт-народнік Казімір Рэклайціс запіў на даўжэйшы час. Ездзіў у Вільню, Варшаву, Маскву, залез у даўгі. Стаў прадаваць зямлю. З ста пяцідзесяці дзесяціп урэшце засталося сто. Ён не гараваў аб гэтым.

І толькі тады абудзіўся ад горкай спячкі, калі пачуў адну навіну, якую ўсе людзі ў ваколіцы лічылі звычайнай. Але для былога студэнта Казіміра, які запіў ад нуды жыцця, гэтая навіна не была звычайнай. Навіна гаварыла: у бліжэйшай вёсцы ў маладзіцы, якая ў свой час была самай прыгожай дзяўчынай у акрузе, нарадзілася дзіця.

Казімір устаў рапа і, узброіўшыся кіем, пайшоў па свежым сняжку, папёс ёй — першай прыгажуні — вялікую торбу духмяных сушаных груш і слоік мёду. Як жа лёгка ішлося яму тады!

Часта хадзіў ён на паляванне ўжо з новым маладым лесніком. Гэта быў селянін з суседняй вёскі, нейкі беззямельнік Васіль Нітка. Пры частым наведванні гэтага лесніка ў адной з кватэр фальварачнага чвараку вочы Казіміра не раз спыняліся на прыгожай постаці і вачах маладой лесніковай жонкі. Марта была поўная процілегласць свайму мужу Васілю — высокая, статная, у росквіце сіл, з сялянскай непасрэднасцю ў твары і ў шэрых, амаль блакітных, вачах. А Васіль — наадварот, быў сухарлявы, цьмяны. Толькі сціснутыя заўсёды губы выдавалі яго цяжкаваты характар, бо і гаварыў ён павольна, без усмешкі, часам нават панура. Марта выйшла за яго замуж ад беднасці. Няшчасцем гэтай пары сталася тое, што яны не мелі дзяцей. Пражылі пяць год, а дзяцей усё не было. Асабліва гаравала па гэтым Марта. Яна малілася не толькі ў царкве, але і хадзіла да розных знахарак-шаптух. Нічога не памагала, і краса жаночая ўжо думала нагадзіцца з лёсам: «Так бог даў». Але нехта параіў схадзіць памаліцца перад каменем, які ляжыць у полі недалёка ад Нёмана. Бо гэта камень, бачыце, незвычайны — ён вельзарны, і на ім нехта некалі ўмацаваў жалезны крыж.

І Марта пайшла. Толькі пачало мярэжыць світанне жнівеньскага дня, як яна апусцілася на калені перад каменем. Малілася заўзята і не чула, як па яе прыгожым твары цяклі слёзы. І ён, гэты камень, пачаў здавацца ёй жывым. Круглыя страшныя вочы раптам глянулі на яе. Камень меў шэсць метраў даўжыні, тры — шырыні і амаль столькі ж вышыні. А колькі яго было ў зямлі, ніхто не ведаў.

Марта малілася і час ад часу сустракала страшныя вочы. Гэты камень — цёмны, сіняваты, з шэранькімі меткамі шорсткага лішайніку — нагадваў жывёліну, якая падчас свайго незапамятнага ледніковага падарожжа ўгрузла па бруха ў зямлі, паказваючы свету толькі сваю даўжэзную, магутную спіну, угрузла і скамянела навекі.

Марта малілася і, калі сустракала вочы пачвары, хутчэй закрывала свае, каб яе не бачыць. Адчувала, што зараз самлее ад страху, але малілася, прыпадаючы нават тварам да зямлі. І калі адзін раз, прыўзняўшыся, глянула на гэтае каменнае дзіва, дык убачыла, што яно, чорнае

і калматаё, варушыцца, расце... І дзікі крык вырваўся з грудзей Марты. Яна, закрыўшы твар далонямі, кіпулася ўцякаць. Бегла, нічога не бачыла перад сабою, пакуль не пачула, што чыясьці рука кранулася яе пляча. І тады спынілася. Заплаканыя, спалоханыя вочы сустрэліся з вачыма пана Казіміра. Ён, трымаючы на левай руцэ кошык і не адымаючы правай ад яе пляча, павольна ўсміхаўся. А Марта ўтаропілася ў яго, ускрыкнула раптам: «Ой, адкуль гэта?» — і змоўкла.

Лес быў недалёка. Там раслі баравікі і заўсёды жыло маладое рэха. Калі падышлі да лесу, аглянуліся — камень з чорным жалезным крыжам стаяў воддаль, пры далінцы, і здаваўся ўжо малым, загубленым у полі.

А Казімір гаварыў:

— Да чаго ж яшчэ дурныя людзі. Маліцца каменю? Цьфу! Каб ты, Марта, больш гэтага глупства не рабіла.

— Ой, калі ж гора, паночку...— адказала Марта.

Казімір уздыхнуў.

— Можа, не звала б мяне паночкам, а проста Казімір Адамавіч.

— А як жа зваць? А хто ж вы? — пярэчыла Марта.

— Хто я? Тое, што і ты...

— Ой, я мужычка цёмная, сляпая... і няшчасная, ваш парабак.

— Людзі ўсе навінны быць роўнымі, і гэта некалі будзе, Марта.

Казімір вёў Марту з сабою ўсё далей і далей у лес. І дзесьці на абрывістым беразе Нёмана пад ціхі шум бору прыгалубіў сваю, здаецца, даўнюю мару...

II

Людзі праз многа год забыліся пра незвычайнае каханне Марты. Разам з гаспадаром Казімірам пастарэлі і бярозы пад акном і яблыні ў садзе, наогул, усё пастарэла ў фальварку.

На пасецы, на старым ужо вогнішчы, гарэў агонь, раскладзены Яўхімам. Ля агню стаяла лавачка, а над самым полымем на перакладзіне з тоўстага дроту, што ляжала на рагачыках, вісеў на круку аплецены дротам чыгунок. У ім варылася рыба. Пасека, якая налічвала не больш дваццаці вулляў, старасвецкіх калод, знаходзілася за садам і ўпіралася ў малады сасняк, за якім уздоўж Нёмана

пачынаўся сапраўдны лес. Пратаптаная сцежка вілася праз пасеку і спускалася да Нёмана.

На лавачцы сядзелі стары Яўхім і юнак, якога парабкі ў фальварку называлі папічом. Яўхім абіраў бульбу і кідаў у драўляпас вядзерка з вадою. Тое самае рабіў і юнак. І трэба сказаць, што гэтая работа ішла ў яго паспяхова. Яўхім, паглядаючы на запэцкапыя пальцы юнака, час ад часу кідаў:

— Пакіньце, нашто вам гэта? Я сам... Колькі тут гэтай работы.

— Маўчы, Яўхім, маўчы,— адказаў юнак,— хіба ж я дрэнна раблю?

— Яно-то так, але...— гаварыў Яўхім і абыякава махаў рукою. Потым на нейкі момант, гледзячы на полымя, задумваўся.

— Што ж...— уздыхнуў Яўхім,— прырода бярэ сваё. Ваша маці, нябожчыца Марта, царства ёй нябеснае (тут Яўхім перахрысціўся), мужычкай была, вось з недалёку, з нашай вёскі. Вы павінны помніць, калі яна памерла. Вам, пане Яне, было тады не больш адзінаццаці год. Тады многа людзей памерла ад тыфусу. Хварэў і я, але, вось бачыце, яшчэ жыву...

— Помню, Яўхім, як памерла мама. Мы тады жылі ў вёсцы, у дзедавай хаце. Найбольш помню тое, як я плакаў, седзячы ля печы, а потым раптам заснуў. Маму пакавалі тады без мяне. Даведаўшыся пра гэта, я яшчэ больш плакаў.

— Харошая маладзіца была ваша маці. І я, грэшны, хадзіў да яе ў сваты. Але доля, відаць, не тая. Трапіла пану ў рукі. Добра, што пан наш не такі, як іншыя, ну, як зусім не пан... Шкадаваў вас, украдкам памагаў. А як памерла маці, забраў вас да сябе, усынавіў, значыць. Хоць якое тут усынаўленне? І вось вы цяпер ужо студэнт, хутка доктарам будзеце. Гэта не важна, што называецеся вы Ян Нітка. Так поп запісаў. Такое прозвішча насіў муж вашай маці — нябожчык Васіль. Лесніком тут служыў. Памёр яшчэ малады ад жаўтухі...

Яўхім змоўк, пакінуў чысціць бульбу, выцер рукі аб анучку і дастаў з кішэні люльку. Напіхаючы пальцам тытунь, гаварыў пібы сам сабе:

— Парода... усё яна. Вось чаму вы так спраўна абіраеце бульбу. Ад маці ў маленстве навучыліся...— Перачакаўшы хвіліну, Яўхім дадаў: — Усё праз гэты камень. Каб не ён, вас, можа, і на свеце не было б...

— Чаму так? — прыўзняў галаву Ян Нітка.

— А так... Была такая прычына.

— Чуў я пра гэта, што быў такі выпадак. Але камень тут ні пры чым. Мала якія выпадкі бываюць. Камень ёсць камень, і больш нічога.

Праз хвіліну Яўхім пакруціў галавою і дадаў, нібы з аглядкаі, асцярожна:

— Не... Нячысты гэты камень. Вось чаму на ім і крыж пастаулены.

І зноў палілася старая быль пра камень:

— Гэта было даўно, яшчэ пры паншчыне. Я тады хлапчуком быў. Ну колькі мне было? Ды... гадоў дванаццаць, не больш, як ксяндзы з'язджаліся да гэтага каменя ставіць на ім крыж.

— А колькі ж год вам цяпер? — уважліва слухаючы, спытаўся Нітка.

— Цяпер? Ды ўжо нешта шэсцьдзесят пяць, дзякуй богу.

— Раскажыце, Яўхім, урэшце, пра гэты камень падрабязней. Пра яго ходзіць многа размоў. У таты нават здымак яго вісіць у кабінеце.

— Вы ўжо, бачыце, вучоны,— павёў сказ Яўхім,— і, як павялося ў адукаваных маладых папоў, не верыце і богу... Павстра такое паплыло па зямлі. То мала што ведаеце пра гэты камень. Вы ўсё больш па свеце ездзіце, то ў Вільню, то ў Нямеччыну, і мала чулі, што рабілася ля гэтага каменя. Навакольныя людзі даўно, паколькі помню я, як расказваў не толькі мой бацька, але яшчэ і дзед, баяліся гэтага каменя. Кланяліся яму, маліліся і нават у такія святы, як радаўніца, тройца, прыходзілі пад камень частавацца і, адыходзячы, пакідалі трохі ежы. Гэта для тых памерлых душачак, якія ў вялікіх пакутах вандруюць з пекла ў рай. Так паяснялі нам ксяндзы на фэстах, якія пачалі ўжо за маёй памяццю адбывацца ля гэтага каменя.

Студэнт Нітка, пакінуўшы абіраць бульбу, слухаў, а потым засмяяўся.

— Гэта ж усё ксяндзоўская лухта, Яўхім! Ха-ха! Вандруюць з пекла ў рай... Ну проста цудоўнае ашукаиства!

— Вам усё смех... Што ж — маладыя...

Яўхім з лёгкай усмешкаі зірнуў на Яна Нітку і прадаўжаў:

— Вось слухайце далеі. Адпаму дзеду-жабраку, які жабраваў у пашых вёсках, прыспіўся такі сон: прыйшла

да яго маці божая і загадала — ідзі да ксяндза Каршэ-віча... Быў такі ксёндз у нас. Ідзі, кажа, і скажы яму, што пан бог у крыўдзе, ён патрабуе дому свайго там, дзе ён з сваёй ласкі даў знак, там, дзе ляжыць гэты камень. Вось яно як! І калі дзед-жабрак расказаў пра гэта ксяндзу, той сеў і паехаў у Вільню да біскупа. І пасля паехала многа ксяндзоў да гэтага каменя. Маленне было вялікае. І тады паставілі крыж.

— А ці гэты ксёндз Каршэвіч не наняў дзеда-жабрака на такі сон?

— Каб было так, то бог пакараў бы за гэта, а то, бачыце, не.

— Бо самога ж бога няма, Яўхім. Няма каму караць.

— Грашыце вы, грашыце. Гэта, як бог захоча, як яго ласка.

Студэнт закруціў галавою і ўздыхнуў.

Яўхім устаў, падклаў дравец у агонь, памяшаў лыжкаю ў чыгунку і, глянуўшы па сцежцы ў напрамку Нёмана, пацяснуў плячыма і сказаў:

— Трэба было б перамываць бульбу, а яе ўсё няма з вадою. І што яна там так доўга робіць? Пайшла і няма...

А потым, крыху прыўзняўшы галаву, крыкнуў:

— Аксеня-а-а!

Рэха глуха пакацілася па сасняку і сціхла. Яўхім стаяў, гледзячы на сцежку, і чакаў адказу. Яго не было.

— Ну пачакаем трохі, пане Яне. А што б вы зрабілі, што б вы сказалі, каб вас паслаць у цёмную ноч увосень над той камень? Усё жывое баіцца хадзіць ля яго ў такую пару.

— А што там? Варушыцца той камень, ці што? — спытаўся студэнт абыякава.

— Там такі свіст навокал, што чалавек не можа вытрымаць. Нехта высвістае на розныя галасы. А над балоцечкам, што ля каменя пры дарозе, скачуць агеньчыкі. Вось вам! Ці ж не чэрці гэта? Што іх туды гоніць? Яны чуюць, што іх сіла не перамагае, вось і верашчаць. Падыдзі да іх чалавек — затопчуць у балоце. Або, напрыклад, усё раптам сціхне, і толькі беленькі баранчык бегае па полі і бляе. Як чалавек пачне яго лавіць, зноў галасы засвішчуць, засвішчуць...

Студэнт устаў, зачарпнуў з вядзёрка жменю вады і апаласнуў рукі, пасля выцер іх кухонным ручніком, што вісеў на суку бярозы за два крокі ад лавачкі.

— Гэтыя агеньчыкі, дзядзька Яўхім, я вам калі-не-

будзь пакажу. Вы іх зведаеце. Бачылі, як свецяць, асаблі́ва цёмпаї ноччу, асінавыя гнілушкі?

— Бачыў, чаму не,— адказаў Яўхім.

— Ну вось. Гэта і ёсць тыя агеньчыкі, якія скачуць уначы над балотам.

— А чаму яны скачуць? Хіба яны жывыя? І хто іх туды пакідаў?

Ян пачаў гаварыць аб балотных газах, што выходзяць часам на паверхню і свецяць. Гаворачы так, дадаў:

— А што датычыцца тых свісткоў і баранчыкаў, то гэта толькі п'яным здаецца ў вачах і вушах, калі яны ўначы вяртаюцца дахаты з карчмы.

Яўхім змоўк, доўга маўчаў, але ўсё роўна не паверыў. Пачаў зноў набіваць люльку тытунём.

Ужо вечарэла. З Нёмана пацягнула цёплым струменем вільгаці. Некаторы час і Яўхім і студэнт маўчалі, гледзячы ў невялічкае, празрыстае полымя вогнішча.

Урэшце студэнт заварушыўся і хацеў нешта сказаць, але з-пад Нёмана пачуўся дзявочы спеў.

— О, ужо загаласіла,— прамовіў Яўхім,— нарэшце.

Спеў набліжаўся.

Пад бярозаю грыбок
Ка мне засмяяўся,
А я думала — дружок,
Што за мной ганяўся.

Студэнт зірнуў у бок Нёмана і адчуў, як у яго забілася сэрца.

Гэта ішла Аксеня, дачка ўдаўца Яўхіма, адзіная яго ўцеха. Цешыцца ёю Яўхім і гаруе падчас. Агонь, а не дзеўка. Усё гарыць у яе руках. Моцная і прыгожая. Такая, як маці. Тая гарэла на рабоце — ну і згарэла без пары. Што будзе з дачкою? Бяда! На работу — першая, але і на гульні таксама. Часта доўга думае стары Яўхім пра сваю дачку і яшчэ мацней яе шкадуе, любіць.

— Дочачка мая...— уздыхае ён сам сабе не раз.— Усе памерлі. Адна ты засталася мне на ўцеху, на маю старасць. Ох, не пакрыўдзі ты бацьку старога, не пакрыўдзі.

III

Хоць расказы Яўхіма аб камені з крыжам былі заўсёды прасякнуты забабоннаю вераю і страхам, адпак і ў іх прасвечвалі зярняткі праўды. Культ каменя ў мясцовага насельніцтва Надняможня перайшоў з часоў язычаст-

ва ў нашыя навейшыя часы. Перасмікамі гэтага культу з'явіліся ксяндзы. Пасля, як расказваў і Яўхім, калі паставілі крыж і высвенцілі камень, «святая» курыя задумала пабудаваць на гэтым месцы касцёл. Збіраліся ахвяры ў часе набажэнства ў касцёлах і па фэстах ля каменя. Але пабудова касцёла ўсё чамусьці адкладалася. Яўхім тлумачыў гэта тым, што «не дазваляў біскуп», які казаў, што яшчэ не час, што замала сабрана ахвяр. А гэта азпачала яшчэ педастатковую пашану ў людзей да каменя. Калі ж аднаго лета падчас навальніцы было забіта каля каменя два чалавекі, ксяндзы на фэсце даводзілі, што бог патрабуе ахвяр, патрабуе, каб тут стаў яго дом божы. Ахвяр пабольшала, але ў тої год і пабольшала расказаў аб страхоццях навокал каменя. Чаму? Бо град выбіў жыта, і ў народзе пачалася бясхлебіца. Людзі чакалі цуда. І па розных «здарэннях», якія нехта тварыў ля каменя, усе намагаліся адгадаць свой лёс.

Вось, напрыклад, нехта бачыў, як уначы загарэлася бяроза недалёка ад каменя. Загарэлася і тут жа згасла. Ніхто не падумаў, што плытнікі, спыніўшы плыты, вылезлі на бераг пачаваць і расклалі агонь. Полымя ад ядлоўцу шуганула высока і асвяціла далёкую бярозу. Дзе там! Усім хацелася верыць, што гэта таямнічы цуд. Другія бачылі, як мясцовая ведзьма-шаптуха стаяла голая на камені з распушчанымі валасамі на самым золку і рабіла нейкія знакі — заклінанні. То зноў знайшлі ля гэтай каменнай завалы забітага чалавека, і паліцыя доўга таптамалася навокал. Аднаго разу нехта паставіў іконку. Гэта было якраз перад фэстам. Ксёндз забраў іконку ў касцёл. Пасля пачалі нават прыходзіць здалёк невялічкія групкі багамольцаў для пакланення «цудадзейнаму» каменю.

На́дпёманская лясная глушыня стала яшчэ глушэйшай. Гэтага і трэба было «святой» курыі. Яна пачала рыхтавацца да закладкі касцёла.

Былы студэнт-народнік Казімір Рэклайціс ведаў гэты камень з дзяцінства. Камень стаяў тады не ў полі, а ў лесе. І паўстанцы 1863 года — навакольная шляхта, хаваючыся ў паднёманскіх лясах, малілася разам з ксяндзамі перад гэтым камепем, на якім ужо стаяў крыж. Вось з якой прычыны здымак каменя апынуўся на сцяне ў кабінеце шляхціца-паўстанца Адама Рэклайціса. Сын Казімір хаваў гэты здымак як успамін аб бацьку. Забабонную веру народа ў камень ён тлумачыў цемраї. «Бедны народ, рабнарод»,— сцвярджаў ён, хоць сам не быў да канца атэі-

стам, чаму і не адважваўся на гутаркі з сялянамі супроць бога. Толькі скажа, бывала: «Каменю кланяцца — трэба быць зусім цёмным, дурным; пане мой, пакіньце гэта».

Казімір дажыў ужо да шасцідзесяці год і заўсёды, калі гляне на здымак каменя на сцяне, прыпомніць свой «грэх», у выніку якога мае сына, які скончыў медыцынскі факультэт у Віленскім універсітэце, пасля чаго паехаў давучвацца на лекара ў Берлін. Там ужо далі яму ступень бакалаўра. «Сын, таленавіты і прыгожы, стаў радасцю майго жыцця, сын ад беларускай прыгожай мужычкі Марты, сын з прозвішчам Яп Нітка — ха-ха-ха!..» — не раз гаварыў сам сабе пан Казімір. Навакольная шляхта адвярнулася ад яго, зненавідзела сына-хлопца, баіцца, каб бацька не перапісаў фальварак на яго. А Казімір крычаў: «А я... перапішу! Назло ўсім перапішу!»

Пасля такіх роздумаў ён, разбіты падаграй, кульгаў па кабінеце, абапіраючыся на кій.

Першы сардэчны прыпадак быў у яго тры гады таму назад, калі зайгралі баявыя сурмы па ўсёй Расіі — ад Пецярбурга, Масквы да Варшавы і Вільні, калі паўстаў да бою вялікі рабочы клас.

Гэта быў слаўны 1905 год.

Былы студэнт-народнік Казімір замітусіўся, загарэўся, выбег на ганак, стаў крычаць:

— Яўхім! Сядлай каня і — у мястэчка на пошту, па газеты! Падрыхтаваць мне брычку, заўтра паеду ў Вільню! Чуеце? Зараз,— ён стукнуў нагою, ускінуў сціснуты кулак уверх і, збялелы, апусціўся на лаўку. Паспеў толькі сказаць: «Вады». Падбег Яўхім, паклікаў служанку...

Аддыхаўшыся, Казімір устаў і сказаў, каб пакінулі яго аднаго. Стоячы на ганку, ён ціха паводзіў вачыма па панадворку і паўтараў:

— Інваліды мы ўжо... Інваліды... А цар з памешчыкамі яшчэ раз перамаглі.

І тады надоўга настала зацішша. Адзінота прыйшла ў кабінет, у сад... Хворы ўжо стаў стары ваяка. Добра, што прыехаў сын, які два гады пражыў у Берліне.

Сын сапраўды прыехаў на ўсё лета, каб пагутарыць з бацькам аб шырокім свеце, аб навінах у Заходняй Еўропе. Ён прыехаў пражыць лета ў альтанцы ў садзе са сваёй бібліятэчкай, якую ён дапоўніў «Капіталам» Маркса. Ён прыехаў, каб вудзіць рыбу ў Нёмане з Яўхімам і закахацца ў яго дачку Аксеню.

Не хоча спрачацца бацька Казімір з сынам аб кіруючай

ролі рабочага класа ў рэвалюцыі. Нешта не ўсё тут для яго зразумела. «Сяляп жа больш,— думае ён.— Як жа так?»

Зацішша на свеце. Ксяндзы правяць імшы часцей, чым у мінулыя гады, касцельныя званы ў мястэчку ўсё выюць і выюць бясконца.

Сын Ян часта ходзіць у мястэчка. Яно ж недалёка. Сын Ян не мае там знаёмых, ён напалову мужык, і таму не атрымалася з шляхтай ніякай дружбы. Пагарджалі ім. А цяпер ён, доктар медыцынскіх навук, пагарджае імі. Уся знявага, якою абдорвалі яго з маленства, засталася ў душы назаўсёды. Безумоўна, не адной шляхцянцы хацелася пазнаёміцца з ім, але бацькі не дазвалялі. Казалі, што ён бязродны і бязбожнік. Не ходзіць у касцёл. А калі, здаралася, заходзіў, дык толькі на пяць мінут, як для смеху.

Ян сапраўды заходзіў у касцёл, каб выслухаць прамову ксяндза. Вярнуўшыся дахаты, расказваў бацьку, амаль слова ў слова, што казаў ксёндз. А ксёндз з амбона таптаў чалавека: «Вось калі здзейсніваецца суд божы над нікчэмнасцю чалавека за яго крамольныя ўчынкі супроць панаradку, устаноўленага богам. Кайцеся, прасіце найвышэйшага бога, каб ён дараваў вам вашы грахі. Набліжаецца суд божы, падайце ніцма, маліцеся ў страсе, накладвайце пакуты на сябе, каб уміласцівіць бога-айца...»

І калі адурманеныя людзі пачыналі падаць ніцма і біць ілбамі аб падлогу, Ян Нітка выходзіў з касцёла не толькі з пагардай, але і з пачуццём гідлівасці.

Ксяндзы заклікалі да зпішчэння дэмакратаў, сацыялістаў, рознай, як яны казалі, галоты — рабочых і студэнтаў...

...Гасцямі Яна Ніткі былі толькі студэнты з Вільні. Гэта былі сыны або ўрачоў, або адвакатаў, а адзін, з кім Ян знаўся найбліжэй, быў сынам народнага настаўніка. З вялікімі цяжкасцямі давялося яму скончыць агранамічны факультэт. Ян Нітка, жывучы з ім на адной кватэры, дзяліўся ўсім, што меў ад бацькі, ішоў заўсёды на выручку. Як жа было не памагчы такому здольнаму, але абязоленаму сябру, у бацькі якога яшчэ чацвёра дзяцей дома? Але скончыліся цяжкасці, і Андрэй Рэдзька працаваў ужо асістэнтам у прафесара. Яму не раз даводзілася бываць у сяле, дзе настаўнічаў бацька Андрэя, праводзіць час з вудаю, бо там таксама была рака над назваю Вілія.

І цяпер, калі пастарэлы ўжо Казімір больш ляжаў у

ложку, чым хадзіў, Яп, часта вудзячы рыбу з Яўхімам у Нёмане, чакаў свайго друга Андрэя Рэдзьку, каб пажартаваццa ўволю і пагаварыць аб розных ыытаннях і праблемах. Чым, напрыклад, скончыцца такое масавае паломніцтва ў Вільню?

Брылі паломнікі ўздоўж па Нёмане з клункамі за плячыма і памагаліся, каб не абысці часам, а абавязкова пакланіцца гэтаму каменю з крыжам. Пакланіўшыся з малітвай і абышоўшы камень навокал, садзіліся багамольцы адпачыць, каб хапіла сілы дайсці да Вільні. Там шмат касцёлаў і цэркваў, там шмат усялякіх багоў — і каталіцкіх, і праваслаўных, і іншых. Там праз тонкую дымку, прасвечаную сонцам, тырчаць у небе зборышчы крыжоў на касцельных вежах, на купалах цэркваў, на кірхах, там гудзяць званы, выюць, равуць, намагаючыся да рэшты заглушыць проблескі чалавечага розуму і пратэсту. Там ёсць каму кланяцца, гнуць спіну, ёсць перад кім поўзаць на каленях і ў сваёй слепаце ліць слязу за слязою перад абразамі розных святых, якім і ліку няма. Там ёсць перад кім развязваць свае вузялочкі з грашыма, здабытымі ў горы і бядоце, і аддаваць іх розным багам. Там адна матка боская вастрабрамская можа апошнюю сарочку забраць.

«Каторыя ж з гэтых багоў будуць лепшыя? — меркавалі багамольцы.— Няхай яны злітуюцца над хатняй нядоляй, дзе пануюць бясхлебіца, цемра і хваробы...»

А званы гудзелі, вылі, слугі божыя ўздымалі галовы. Чорная рэакцыя абрастала тлушчам...

...Ходзіць па беразе Нёмана Яп Нітка. Ужо апалі росы. Сонечныя праменні пранізваюць лясны цень, але воблакі час ад часу закрываюць сонца. Яны ўсё плывуць — белыя, клубкаватыя, так, як плывуць і думкі Яна. Ён узыдзе на край абрывістага берага і спыніцца. Слухае цішыню, слухае свае ўласные думкі. Толькі што, як заўсёды апошнім часам, гутарыў з сваім бацькам адносна рэлігіі, адносна гэтага каменя.

— Нельга жыць асвечаным людзям і спакойна глядзець, як ашукваецца народ, як ён адурманьваецца з кожным днём ад такога пябачнага вар'яцтва,— гаварыў бацьку Ян.

Бацька маўчаў. Ён захапляўся сыноўнім розумам, як некалі захапляўся ідэямі свабоды. Не ведаў, што адказаць, бо не меў такіх доказаў і спосабаў, якімі б можна было вызваліць народ ад гэтага ката, створанага жрацамі, шаманамі, ксяндзамі...

— Адчуваю, Яначка,— адказваў бацька,— што нешта не так... Ну, а што ты зробіш? Бог у разуменні цёмных людзей — гэта самае страшнае, а значыць — самае святое. Няважна для іх, што няшчасці сыплюцца ім на галовы, хоць няма ніякай дапамогі ад багоў. Важна для іх тое, каб была надзея на збаўленне...

— Вось на гэтым і спекулююць ксяндзы і іншыя сучасныя шаманы,— уставіў Ян.

— Ну, а маеш сілы супроць бога? — спытаўся бацька.— Я, напрыклад, не магу давесці людзям, што яго няма.

— А я магу і будуць даводзіць,— глуха сказаў Ян.

Бацька зноў закульгаў па кабінеце, прыстукваючы кіем аб падлогу, і не мог ніяк успрыняць, асвоіць адказ сына. Страх агарнуў яго. Ён зразумеў, што першы, хто кінецца на гэтую крэпасць, якая завецца рэлігіяй, можа загінуць. Стары Казімір спыніўся перад сынам, які сядзеў у канцы пісьмовага стала, і так доўга глядзеў на яго, што сын аж адвярнуў галаву да акна. Ён ім у гэтую хвіліну любаваўся. Што ж яму сказаць? І ўрэшце сказаў:

— Калі маеш намеры вялікія, працуй для іх штодня...

А потым, крыху адышоўшыся, ціха дадаў:

— Але не забудзь і таго, што ты мой сапраўдны сын і што без цябе я застануся сіратою...

Нехта пастукаў у дзверы, і пасля дазволу ўвайшоў аканом.

Выцершы вусы, ён адразу сказаў:

— Карове стала лепш. Пачала есці... А жонка параб-ка Ёнаса ўсё роўна пайшла ў Вільню... на багамолле...

— Пайшла?

— Пайшла, пане... Трэба наймаць новую даярку.

— Што гэта робіцца з людзьмі? — ускрыкнуў Казімір.— Павар'яцелі з гэтым багамоллем.

А аканом дадаў:

— Наш ксёндз загадаў паліць агні навокал каменя, як на Купалу, кожны вечар... Перад фэстам...

Бацька з сынам пераглянуліся.

— Добра, Вінцэнты, я зараз падыду да каровы,— сказаў гаспадар.

Аканом адышоў. Бакалаўр Ян Нітка ўстаў узбуджаны, са сціснутымі вуснамі.

— Калі пратрывае так даўжэй, вернемся да пяшчэрнага жыцця. Здзічэем! — сказаў ён са злосцю і накіраваўся да дзвярэй.

Бацька паціснуў плячыма і толькі паспеў вымавіць самае ласкавае, што вымаўляў толькі ў выключных выпадках:

— Сынок...

Дзверы зачыніліся, і бацька застаўся адзін.

...Ходзіць па беразе Нёмана студэнт Ян Нітка. Бачыць, як хмары ўсё больш і больш закрываюць сонца і дзень робіцца шэры, дзень без руху, сонны і нудны. Выйдзе Ян з лесу на палявую прагаліну, і перад вачыма стане той ненавісны камень з крыжам. Абыдзе Ян камень навокал, нават памацае яго рукою і плюне. «Відаць, народ настольк і забіты цемрай і горам жыцця, што гатоў верыць абычаму, толькі б служкі божыя заклікалі. Цемра, нядоля народа — гэта хлеб ксяндзоў»,— думае Ян.

За каменем, куды павілася дарожка, з-за ўзгорка віднеецца пацямнелая, нават амшэлая, страха гумна. А за ім, недзе паміж пералескавых узгоркаў, схавалася, як быццам патанула, невялічная вёска. Гэта адна з тых наднёманскіх вёсак, якія туляцца ў сасновых зацішках пры беларагавых сакавітых палянах.

Ян глядзіць з абрывістага берага і бачыць на другім баку рэчкі такі ж пасёлачак у некалькі хат. Ад іх маляўніча віецца сцежка да таўшчэзнай разгалістай вярбы, што стаіць на самым беразе. Яе нахіленыя галіны глядзяць у чыстыя, імклівыя воды Нёмана, і так глядзеліся яны з лета ў лета сотні год. Пры вярбе віднеецца прывязаная лодка, чакае рыбака з вудай або з сецямі. Але Ян не бачыць людзей, не чуе ні голасу, ні песні. Яму здаецца, што людзі недзе сядзяць у цяні груш, ліп або на ўтульных прызбах пад навіслымі стрэхамі, сядзяць, як зачараваныя, слухаюць шэпты бору і прыглушаны, з журчаннем шум Нёмана. Яну здаецца, што яны быццам плывуць у нябыт, плывуць да сваіх далёкіх продкаў, якія, запалоханыя сіламі прыроды, дзікія, бездапаможныя, кланяліся некалі тысячагоднім дубам — патрыярхам лясоў і вось гэтаму каменю. Тых дубоў ужо няма, а камень застаўся, каб стаць зброяй у руках новых шаманаў з крыжам у руцэ. Ян Нітка ўсё ідзе па беразе далей і далей, каб потым сказаць сабе: «Нёман, глухі і разбойны, Нёман, чароўны і пакутлівы, ты павінен стаць свабодным!..»

Пасля некалькіх шэрых дзён і цёмных начэй надышла ясная ноч, калі святло месяца купалася ў струменях Нёмана і, рассыпаючыся на мірыяды іскраў, плыло і плывало — хваліста, мігатліва. Тады таемна сціхваўся бор, ва-

біў да сябе ўтульнасцю і задумай. Тады хацелася ісці ў невядомыя прасторы з жаданнямі, якія толькі сняцца.

Павольна ішоў па беразе Ян Нітка. Калі спыняўся, то быў падобны да статуі. У капелюшы, у чорнай студэнцкай накідцы-крылатцы, абапёрты на кій, ён стаяў, як падарожнік з далёкай краіны, і глядзеў на хвалі Нёмана, быццам лунацік. Засяродкаваны, нахмураны, ён у такі час быў падобны да бацькі. Але трэба было толькі ўсміхнуцца, бліснуць белымі, моцнымі зубамі, і твар рабіўся дзіўна наіўны, непасрэдны, як твар колішняга пастушка. У такія хвіліны Ян рабіўся больш падобны да маці.

Разам з хвалямі Нёмана плылі і ўспаміны. Дзяцінства ў вёсцы. Пастушок у наймах. Дакоры суседзяў, што ён панскі байструк. Маці адмаўлялася ад усякай дапамогі пана Казіміра. А ён усё ж такі памагаў украдкам... Ціхія слёзы маці і малітвы. Яна вяла яго за руку ў царкву і там вучыла кланяцца багам, вучыла быць падпявольным. А потым... а потым яе не стала. А пасля... Як жа ён не мог заснуць у чыстай пасцелі, у старашляхецкім доміку! Ён уцякаў, а парабкі яго лавілі. Школа ў мястэчку. Чалавек, якога ён павінен быў звать бацькам, прыходзіў наведаць яго адзін раз у месяц. Самота стала ўсё больш і больш падабацца. Далей... А далей прыйшла ў душу ўдзячнасць да свайго хлебадаўцы, якога ён цяпер лічыць за свайго бацьку. Затым Вільня, пасля — Берлін, паездка ў Парыж. Ён пачынае разумець свайго бацьку як гуманіста. Бацька не карыслівы — ён любіць поступ.

«Ён першы навучыў і мяне яго любіць,— думаў Нітка.— І ўсё ж такі я недзе ў глыбінях сваёй душы, як быццам і сам не ведаючы аб гэтым, не магу да канца даверыць бацьку... Чаго? Відаць, аховы жыцця. Бацька ўсё ж такі пан, а я мужык. І права майго жыцця мужыцкага вышэй права панскага. Так, дарагі бацька! І таму я хачу, каб асвету атрымлівалі і такія, як Аксеня, дачка Яўхіма, каб не хадзілі падаць ніцма перад багамі, перад каменем...»

Ян крануўся з месца, каб зноў пасоўвацца, быццам лунацік. І тут убачыў, як на сцежку выйшла ў белі яна... Не, не русалка, а яна, сапраўдная Аксеня. Выйшла к берагу і спынілася, а потым паблізілася, як прывід, і стала перад Янам з бляскам у вачах, са свежасцю шчок і валасоў, адважная і жаданая, а разам з тым — простая і непасрэдная. Рука Яна ціха абвіла яе стан, і яны пай-

шлі, як быццам паплылі ў струменях Нёмана. Яму хацелася сказаць, што думалася заўсёды: «Аксеня, ты найбліжэйшая за ўсіх... Нам абавязкова трэба стаць на адзіи узровень, і тады мы ўсё пераможам... пераможам і гэты злавесны камень з крыжам...»

* * *

Прыехаў урэшце жаданы друг Андрэй Рэдзька. Ён прыйшоў са станцыі ў фальварак рапа, калі яшчэ не апалі росы, прыйшоў свежы, крыху загарэлы, у аброшаных чаравіках, у такім капелюшы і плашчы-накідцы, як у Яна. Сябра пастукаў блішчастым кіем у дзверы альтанкі, дзе сядзеў яшчэ босы і расхрыстаны Ян, схілены над раскрытай шырачэзнай кнігай — «Живописная Россия».

— Мой паклон Русо ў даліне Манмарансі! — загудзеў барытонам Рэдзька, увайшоўшы ў альтанку.

— А-а...— усміхнуўся Ян, устаючы.— Паклон, паклон вандруючаму Скаварадзе, які нічым не папярэджвае аб сваім прыездзе... Лайдак...

Сябры абняліся.

Андрэй Рэдзька, паставіўшы свой чамаданчык на падлогу, пачаў сцягваць з рук белыя пальчаткі. Ён сцягваў іх спраўна, элегантна, быццам смакуючы. Ян назіраў за гэтым, ледзь-ледзь устрымліваючыся, каб не засмяяцца.

— О, пальчаткі! — узняўшы рукі, зжахнуўся Ян.— Плебеюс ты няшчасны, што скажуць багі на Алімпе? Ты сораму нарабіў гэтым палям, праз якія ішоў.

— Я ж з Вільні прыехаў, а не з твайго кайзераўскага Берліна,— адказаў Рэдзька, вешаючы капялюш. А потым дадаў: — Ну ты, вядома, Праметэй.

Сказаўшы так, ён стаў зараз жа разувацца.

— Абмый мае ногі, Праметэй, і валасы мае... і мазгаю маю памаж мірам, бо інакш... перараблюся ў Спартака і тады... Гэта, брат, гразней за Праметэя.

Андрэй Рэдзька меў шырокі, некалькі вуглаваты твар з носам амаль кірпатым. Русыя, нават злёгку бялявыя валасы ад шырокага лба прывычна клаліся назад. Шэрыя вочы, здаецца, заўсёды глядзелі пасмешліва. І, наогул, усмешка была разліта па ўсім яго твары.

— Калі так,— сказаў Ян,— пойдзем аддамося над уладу бацькі Нёмана. Яшчэ рапа. А потым сходзім да пашага боскага Яўхіма на пасеку...

— І да яго боскай дачкі,— дадаў Рэдзька,— для якой хочацца пабудаваць палац над Нёманам, як для княгіні наднёманскіх лясоў.

— І пакаштуем боскага мёду, як... як мядзведзі-пустэльнікі,— сказаў Ян.

Сябры пайшлі на Нёман. Па дарозе Андрэй апавядаў аб вілепскіх навінах, аб падпольных студэнцкіх гуртках, аб умацаванні сувязей з рэвалюцыянерамі — сацыял-дэмакратамі...

— Калі ты развітаешся з гэтым Берлінам і вернешся да нас?..— ляпнуўшы Яна па плячы, спытаўся Андрэй.— Табе ж там і сумна і нудна.

— Я там таксама вывучаю Маркса.

— «Тэорыя, дружа мой, шэрая, але вечна зелянее дрэва жыцця»,— помніш у Гётэ? Патрэбна практыка.— Рэдзька нахіліўся і дыхнуў у вуха сябру: — Адтуль, з Берліна, да цара далёка. А тут, у Расійскай матачцы-імперыі, мы яго адчуваем на сваёй спіне... Хутчэй канчай там свае філасофскія мудрагельствы, Праметэй, і да нас! Пойдзем да рабочых.

— Я ведаю, працы тут многа. Колькі навокал цемры, ксяндзоўскіх цянёт... Маё месца, вядома, тут. І я сюды вярнуся. І тады...

— Што тады? Я адчуваю, брат, што ты... Што табе яшчэ многаму трэба вучыцца...

— Таксама, як табе,— перабіў Ян.

— І мне, вядома... Але мы тут паспыталі ўжо, многа зведалі, чаго ты не ведаеш!

— Ты не думай, што я да нічога непрыгодны,— некалькі з папрокам прамовіў Ян.

— Не! Я так не думаю.

Ян мог бы больш сказаць аб тым, на што толькі намякнуў.

Яму ўспомнілася нядаўняя гутарка з бацькам аб атэізме, аб гэтым камені — прадукту цемры. Сябры з завальненнем выкупаліся і вярталіся назад праз лес. Яны хутка выйшлі на палявую дарожку, якая прывяла да каменя з крыжам.

— Вось ён...— тыцнуў пальцам у камень Ян.— Ты кажаш, што Вільню запаланілі багамольцы... Вось якой пачвары прыходзяць клапяцца тут.

— Гэтай?

— Гэтай.

Рэдзька падышоў да каменя і стаў глядзець на яго

так, як быццам чакаў чагосьці неспадзяванага. Нават прыгнуўся разглядаючы:

— Моцная скала. Нават лішаёў мала на гэтым ледніковым страхоцці,— сказаў ён. А потым спытаўся: — І яму кланяюцца?

— Так, брат. Поўзаюць навокал на калсніях.

— Што тут дзіўнага? Магамет на камені Кааба пабудаваў цэлую рэлігію,— адказаў Рэдзька.

Ян Нітка і не згледзеў, як Андрэй узлез на спіну каменя.

— Злазь, а то можа быць бяда! — крыкнуў Ян.— Калі ўбачыць хто, кара ксяндзоўская цябе не мінс. Могуць прыйсці з вёскі фанатыкі і, чаго добрага, пабіць.

— Няўжо да такой ступені дурныя людзі? Гэтага я не падазраваў...

Ходзячы па спіне каменя, Рэдзька акінуў вокам мясцовасць і сказаў:

— Колькі поля пустуе навокал гэтага страхоцця.

— Пляц для збору фэсту. Належыць ужо касцёлу. Зямля забрана ад сялян. Але злазь ты хутчэй, калі не хочаш мець непрыемнасці!

Рэдзька, замест таго каб злезці, стаў у позу артыста, выставіўшы левую нагу наперад, і пачаў дэкламаваць:

Ликует буйный Рим... торжественно гремит
Рукоплесканьями широкая арена...

Скончыўшы страфу, Рэдзька саскочыў з каменя і сказаў Яну:

— Ты ж берлінскі эскулап. Прыкладзі вуха, паслухай. Можа гэтая пачвара на што-небудзь хворая?

— Чорт яе не браў, яшчэ моцная.

— Што моцная, то моцная, нічога не скажаш. У старажытным Рыме Юпіцер пабудаваў бы сабе на ім храм.

— Пабудуюць і цяпер, не бойся...— адказаў Ян.

— Хто? Ксянжулькі — езуіцкія танцулькі? І ханжы і крукі, і шаманы і шпікі? Так?

— Яны!..— гукнуў Ян і цяжка ўздыхнуў.

* * *

Ваколіцу абляцела вестка, што заўтра ля каменя будзе вялікі фэст. Перад гэтым стары Яўхім са страхам і з таямнічым выглядам сказаў Яну Нітку і Андрэю Рэдзьку

чарговую навіну: ïà ćàмым свìтаннì ля ќàменя плакала нованароджанае дзіця. Перадаў Яўхім гэтую навіну і самому гаспадару Казіміру.

Ян і Андрэй не вельмі здзівіліся гэтай з'яве. А Казімір пасля такой весткі неяк спахмурнеў, задумаўся. Нейкія ўспаміны варушылі яго.

Але гэта было яшчэ не ўсё. Яўхім прадаўжаў расказваць:

— Каб толькі гэта, то можна было б падумаць, што нехта падкінуў дзіця. Але вось што... Нехта заявіў старасту, што ля каменя плача дзіця. Староста сабраў паўсяла і пайшоў. Прыйшлі, а дзіцяці няма... Вось і думай што хочаш...— развёў рукамі Яўхім.

— Можа, хто выдумаў,— сказаў Ян,— не было ніякага дзіцяці.

— Як то не было?! — нават ускрыкнуў Яўхім.— Я чуў ад траіх людзей. Мая Аксеня хадзіла на вёску, там ва ўсе званы звоняць пра гэты цуд.

Яўхім сцішыў голас і прадаўжаў:

— Ксёндз хадзіў... сам ксёндз разам з людзьмі і казаў, што святы бог патрабуе ахвяры... За грахі нашы...

Яўхім, расказваючы, выглядаў нават жвавым, радасным, відаць, ад таго, што вось яму нарэшце ўдалося пераканаць гэтых недаверкаў, як ён называў Яна і Андрэя, у боскай вялікасці.

Але Андрэй Рэдзька, жартаўліва нахмурыўшыся, гарэзліва нацягнуў паветра носам і, нахіліўшыся да Яўхіма, сказаў:

— Ці ж ты, Яўхім, не зможаш зразумець? Нехта палажыў дзіця, а потым забраў. Не можа ж твой бог скідаць з неба дзяцей... Ды яшчэ, можа, байструкоў. Яго ж тут людзі засмяюць.

— Ну і бог,— дадаў Ян,— плодзіць дзяцей і скідае на зямлю. Ці ж ён не вар'ят?

— От, грэшнікі, божа, божа,— паківаў галавою Яўхім і, роспачліва махнуўшы рукою, паплёўся ў сад.

А справа з дзіцём сапраўды набірала цікавасці. Сябры вырашылі пайсці даведацца аб усім да Аксені. Справа праяснілася. Сярод многіх чутак была і такая: нейкая дзяўчына ў вёсцы парадзіла дзіця і пайшла да ксяндза каяцца ў сваіх «грахах». Ксёндз загадаў ёй пакласці дзіця ля каменя, каб там яно падало свой голас, і тады, казаў ксёндз, божая ласка сыдзе на яе, на маці.

Уся гэтая ксяндзоўская афера была патрэбна на тое,

каб яшчэ больш умацаваць перад людзьмі аўтарытэт камення. Набліжаўся дзень фэсту...

Ён пачаўся ціхім жнівеньскім ранкам, калі асцярожна ўзыходзіць сонца, нібы вобмацкам прабіраючыся праз заслону туману. Самыя першыя, хто пачаў прыбываць да каменя,— гэта гандляры і багамольцы. Гандляры з сялян везлі на продаж найбольш яблыкі, грушы, мёд. Толькі некаторыя развешвалі саматканыя паясы, ручнікі, выстаўлялі тое-сёе з бандаркі. Гандляры з мястэчка везлі булкі, пернікі, цукеркі, губныя гармошкі, шаўковыя хусткі, істужкі, грабяні, пацеркі, пярсцёнкі і іншыя рэчы. Апрача гэтага, прадавалася каўбаса, сітны і чорны хлеб, абаранкі. Знаходзілі людзі недзе і гарэлку, хоць гэта і забаранялася.

Фэсты ля каменя заўсёды былі мнагалюднымі. Калёсы стаялі па ўсім шырокім полі аж да лесу. Сярод іх піліка-ла катрынка з папугаем, і на ўсе лады нылі карагоды жабракоў, якія заўсёды садзіліся ля дарогі.

Багамольцы з далёкіх наднёманскіх вёсак прыходзілі перад фэстам панач і начавалі ў бліжэйшай вёсцы, каб заўтра рана нашча прыйсці да каменя і ў сваёй пакорлівай слепаце пакланіцца яму. Заўважалася, што багамольцаў і жабракоў прыбывала больш, чым у мінулым годзе. Тое самае можна было сказаць і пра гандляроў. Людзі ішлі і ехалі. Старыя, маладыя і нават дзеці.

Камень быў прыбраны накрыж двума вышываным палотнішчамі, а на тым жалезным крыжы вісеў вянок з розных кветак, сярод якіх найбольш вылучаліся астры. Ля самага каменя стаяў стол, накрыты белым абрусам. Ён заўсёды замяняў ксяндзам «прастол божы». Усё гэтае ўбранства пільнаваў касцельны прыслужнік без шапкі, з цёмнымі кругамі пад вачыма. Хутка яму на дапамогу прыехала некалькі паліцэйскіх з ураднікам. Яны таксама, як і ўсе, хто прыходзіў, сталі перад каменем, пазнімалі свае паліцэйскія шапкі і пачалі шчопцямі церусіць у сябе хто перад носам, хто перад грудзьмі, робячы знак маленькага крыжа.

Так прывітаўшыся з камепем, вартаўнікі царскага і божаскага ладу і парадку — вусатыя, плячыстыя, пры шаблях і з партупеямі цераз плячо — разбрыліся па двое паміж незлічоных калёсаў, і хутка сям-там пачалі ўжо раздавацца іх стражніцкія выкрыкі.

З мястэчка, да якога было пяць вёрст, даносіўся глухі пералівісты гул ад касцельных званоў. А сонца, разагнаў-

шы туманы, уздымалася па чыстым небе ўсё вышэй і вышэй. Гоман людзей па ўсім полі напаўняў паветра магутным гулам. Навокал ідала-каменя поўзалі цёткі з дзецьмі і без дзяцей.

Усе, хто тут быў, чакалі ксяндзоў. Яны павінны з працэсіяй прыйсці з мястэчка.

Ян Нітка і Андрэй Рэдзька павольна пасоўваліся, прабіраючыся паміж калёс па гэтай вялікай плошчы, якую адваяваў сабе ненажэрны камень. Сябры паспелі пачаставацца ўжо яблыкамі, паглядзець на прыгожыя дробязі ў гандляроў, спыніліся ля прадаўцоў касцельных кніжак, абразікаў, «святых» медалікаў, нагрудных крыжыкаў і крыжоў вялікіх, настольных. Ян патрымаў нават у руцэ невялічкую фігурку жоўтага колеру, думаючы, што гэта звычайная лялька. Аказалася, што гэта алавяны Хрыстос, які пафарбаваны жоўтай фарбай. Сябры пераглянуліся, ледзь стрымаліся ад смеху і пайшлі далей, прытрымліваючы часам крылы сваіх чорных накідак-плашчоў, каб не зачапіць драўляныя восі калёс, канцы якіх блішчалі ад каламазі.

А вось і жабракі. Яны сядзелі доўгай чарадою, выставіўшы к дарозе свае рукі-жмені, і нылі. Ля кожнага амаль жабрака стаяла, нагнуўшыся, бабка або маладзіца. Яны ўсе прасілі памаліцца за памерлыя душачкі і гаварылі жабракам іх імёны. А жабракі ўзносілі модлы і чакалі падачкі. Сябры пачулі, што ў агульным шуме і завыванні жабракоў адна жабрачка спявала не пра бога, а звычайную песню: «Шырок лісток на каліне, яшчэ шырчэ на дубочку...»

— Ну што ж... абы гук,— сказаў Нітка.

Але вось і той ідал-камень. У Андрэя Рэдзькі нават ссунуўся крыху капялюш на патыліцу, калі ён, задраўшы нос, стаў глядзець на камень. Ківаў галавою то направа, то налева і зжахаўся: «Вось гэта штука... І, бачыш, ніхто не смяецца...» Звярнуўшыся тварам да Яна Ніткі, ён сказаў:

— Прыбралі яны гэты камень, як старажытныя егіпцяне прыбіралі свяшчэннага быка.

— Ну, бык хоць жывое стварэнне... А тут? — Ян уздыхнуў на ўсе грудзі і дадаў: — О, людзі, людзі! — І пасля гэтага стаў пануры, нават, у процілегласць Рэдзьку, пасунуў свой капялюш яшчэ ніжэй на лоб.

Сябры не паспелі заўважыць, як нейкі незвычайны рух пракаціўся па плошчы, як быццам павеяў вецер, і над

морам чалавечых галоў замільгалі ў руках шапкі. Глухія званочкі, якія час ад часу даносіліся, гаварылі, што да плошчы набліжаецца працэсія з ксяндзамі. Хутка пачуліся грозныя выкрыкі стражнікаў: «Шырэй дарогу! Шырэй! Убок! Убок!»

Званочкі паўтараліся часцей. Сябры хутка ўбачылі, як па ачышчанай стражнікамі ад натоўпу дарозе першым ішоў ксёндз у поўным ксяндзоўскім уборы і нёс перад сабою, сціснуўшы абедзвюма рукамі, масіўны залацісты крыж. За пярэднім ксяндзом ішло яшчэ пяць ксяндзоў, потым жанчыны, а за імі бясконцы хвост працэсіі — мужчыны, старыя і дзеці. Пярэдні ксёндз, які нёс крыж, маўчаў, а тыя пяць, што ішлі за ім, нешта мармыталі сабе пад нос. Перад пярэднім ксяндзом ішлі два хлапчукі, ростам, як адзін, адзетыя ў касцельныя балахончыкі, і час ад часу пазвоньвалі адмысловымі званочкамі.

Пярэдні ксёндз заняў месца ля стала, павярнуўшыся тварам да «галавы» каменя. На стале ён паставіў перад сабою той крыж, які нёс. Пяць ксяндзоў сталі па баках стала. Усе яны павыціралі хустачкамі свае чырвоныя спацелыя твары, нібы адпачылі хвілінку, пасля чаго ўзяліся за «работу». Хлопчыкі павымалі з касцельных торбаў кніжачкі і паклалі перад кожным ксяндзом па адной. Пасля пачалі распальваць некалькі кадзілаў. «Работа» пачалася выкрыкамі галоўнага ксяндза па-лацінску, на што адказаў хор з дзяўчат і арганіста.

Людзі душыліся, піхаліся, імкнуліся стаць бліжэй да каменя. Стражнікі іх адпіхалі. Бо, чаго добрага, натоўп мог бы прыціснуць ксяндзоў да «боскага» каменя. І тады што было б?

Маленне цягнулася нядоўга. Ксёндз складаў далоні, кланяўся сталу і каменю. Званочкі званілі — тады ўвесь натоўп, што стаяў навокал, падаў на калені і так стаяў, нагнуўшы галовы, аж датуль, пакуль не забразгаюць званочкі зноў. Ксяндзы вымахвалі кадзіламі, ходзячы навокал каменя, абкурвалі яго пахучым дымам. Урэшце галоўны ксёндз рушыў да каменя з крапілам. Пачаў крапіць яго на ўсе бакі, усё накрыж і накрыж. Бабкі паўзлі з натоўпу на руках і каленях, шапталі малітвы.

Маленне скончылася. Галоўны ксёндз пачаў гаварыць прамову, у якой праз кожнае амаль слова паўтаралася: «Дай божа... Дай божа...» А ўсё хілілася да таго, каб добра паводзілася таму касцёлу, які будзе пабудаваны на гэтым камені.

Пасля прамовы ксёндз перахрысціў натоўп з пахілёнымі галовамі і, адвярпуўшыся да стала, узяў крыж і даў знак ісці назад у мястэчка. Паліцыя пачала расчышчаць дарогу. Тады жанчыны, найбольш старыя, хлынулі да каменя. Лезлі над стол і паперабой ірвалі над ім траву. Япа, бачыце, ужо «боская», бо над ёю, на стале, правілася імша. Другія поўзалі навокал каменя, мацалі яго рукамі, хрысціліся, падалі і не хацелі адыходзіць. Іх адганялі другія.

— Толькі вам адным трэба? — крычалі яны,— усё роўна ў кішэню не возьмеш...

Ксяндзы адышліся ад каменя ўжо некалькі крокаў. Ян Нітка, хмуры, усхваляваны, ускочыў на стол, на той стол, дзе нядаўна стаяў ксяндзоўскі залацісты крыж. Ён зняў капялюш, і галава ў вянку залацістых валасоў узнялася горда над натоўпам.

Людзі аж прыціхлі ад здзіўлення, аж раты раскрылі некаторыя. Што гэта? Адкуль? А Ян Нітка крычаў:

— Людзі добрыя! Ці ж вы не бачыце, не разумееце, як вас ксяндзы ашукваюць, як змушаюць вас маліцца гэтаму ідалу-каменю? Гэта ж звычайны камень. Што вас ухае яму маліцца? Гэта ж сорам вялікі перад сабою быць такім сляпым, цёмным, быць рабом, маліцца каменю, якога прыгналі сюды леднікі недзе аж з фінскіх гор тысячы і тысячы гадоў таму назад. Чытайце, хто пісьменны, кніжкі, як стварылася наша зямля. Вучыце сваіх дзяцей...

Недзе ў гушчыні натоўпу раптам заклекатала і тут жа сціхла. Потым вырваўся крык:

— Бязбожнік! Антыхрыст!

Працэсія, што выраўнівалася ўслед за ксяндзом, спынілася. Насустрач ёй пад аховай стражнікаў ішлі ксяндзы. Ішлі назад. У пярэдняга з прышухлымі шчокамі ўздрыгвалі павекі ад хвалявання.

— Зыйдзі, няшчасны, са стала! — крыкнуў ксёндз.— Ты топчаш тое месца, дзе стаяў крыж святы!

— Не зыйду! — крыкнуў Ян і, звярнуўшыся да ксяндзоў, прадаўжаў крычаць: — Дакуль вы будзеце ашукваць народ, вы — дармаеды, езуіты, хапжы?! Вы — найміты папы рымскага! Але не думайце, прыйдзе на вас кара народная! Людзі добрыя, не слухайце ксяндзоў, яны вас вядуць на пагібель. Верце толькі ў сваю працу, у свае сілы!..

— Прэч, бязбожнік, слуга д'ябла! — крыкнуў ксёндз.

І тады натоўп крыкнуў зноў:

— Бязбожнік! Прэч!

Стражнікі падбеглі, каб сцягнуць Яна са стала, але ён ужо саскочыў сам. Андрэй Рэдзька хацеў падхапіць яго пад руку, але стражнік адарваў яго ад Яна, сказаўшы: «Вы арыштаваны!»

Натоўп грозна заклекатаў. Знясіленага ксяндза двое сялян падхапілі пад рукі, а ён, паказваючы пальцам на Яна Нітку, крычаў пагрозліва, захліпваючыся:

— Адпомсціце яму за імя божае, хрысціяне! Чуеце?

І тут выскачыў жабрак з крывавымі вачыма, кудлаты, страшны. Абвешаны торбамі, з кіем у руцэ, ён, кульгаючы, набліжаўся да Яна, якога разам з Рэдзькам пільнавалі стражнікі. Рэдзька рвануўся, каб прыкрыць друга, але ўжо было позна.

Раздаўся хрыплы голас.

— Няхай бог даруе табе твае грахі,— прашыпеў жабрак і з размаху ўдарыў Яна кіем па галаве.

І тады пачалося... Натоўп рыкнуў і сцяною рушыў на Яна. Не далі рады і стражнікі — яны былі амаль што не збіты з ног і ледзь здолелі ўцячы, павалокшы за сабою Рэдзьку.

— Што вы робіце? Апомніцеся! — прагучаў чыйсьці моцны, абураны голас.— Ён жа сказаў праўду! Праўду! — Але гэты моцны, чысты голас ужо не мог перакрыць фанатычнага крыку.

...Ян яшчэ бараніўся. Яшчэ мільгаў паміж кулакоў і локцяў чорны капялюш на яго гордай галаве. Плашчнакідка ўжо была парваная. Нешта трашчала, ламалася ў духаце разгарачаных цел, нешта стагнала. Яшчэ быў адзін выкрык Яна: «Прыйдзе час — вы зразумееце! Вы...» Але ўдар звалiў яго. Пачалася мітусня ног, кіёў і калоў...

Натоўп адступіўся. Усе ўбачылі і зразумелі, што акрываўлены юнак, які ляжаў на траве з адкінутай русай галавой, быў ужо нежывы, і сталі разыходзіцца панура і навольна.

Стражнікі не вярталіся. Яны павялі арыштаванага Андрэя Рэдзьку сярод ксяндзоўскай працэсіі да мястэчка. Андрэй Рэдзька ішоў і ў душы аплакваў свайго нязменнага друга. Аб сабе не думаў, што будзе з ім...

Плошча паволі пачала пусцець. Над Янам ніхто не схіляўся. Багамольцы разыходзіліся, як быццам нікому тут ужо нічога больш непатрэбна.

Але не... Выйшла па пляц яна — у шаўковых істужках, заплецепых у косы, бледная, нахмураная. Яна —

Аксеня. Ішла хуткай хадою, і вочы яе засцілаліся пякучымі слязамі. Яна апусцілася над ім на калені, заглянула ў твар, ціха, ласкава прыгладзіла яго мяккія валасы. І тады прарваўся яе здушаны плач:

— Саколік... што яны зрабілі, гэтыя азвярэлыя людзі? За што?! Ах...— ускрыкнула яна і ў нястрымным плачы прыпала тварам да яго грудзей.

Дадому вестка прыйшла хутка. Вестку, балючую і страшную, нечакана прынёс Яўхім са слязінкай у вачах. Ужо стары Казімір слухаў, слухаў да канца, а потым, збялеўшы, раптам ускрыкнуў:

— Як? Няма? Яго няма?!

Крутнуўшыся на адной назе, ён сарваў здымак злавеснага каменя з крыжам са сцяны і пачаў таптаць яго нагамі. Таптаў люта, злосна, на колькі хапала сілы, а потым, схапіўшыся за сэрца, у смяротнай бледнасці апусціўся на падлогу. Над ім, упаўшы на калені, нахіліўся Яўхім.

КАМЕНТАРЫІ

ПРЫНЯТЫЯ СКАРАЧЭННІ:

Рунь весняходу, 1928.— Рунь веснаходу: Зборнік твораў паэтаў і пісьменнікаў Заходняй Беларусі. Выданне Беларускага выдавецкага таварыства.— Вільня, 1928.— 48 с.

На варце, 1940.— На варце: Вершы.— Мн.: Дзяржвыд пры СНК БССР, 1940.— 130 с.

За сваю Айчыну, 1946.— За сваю Айчыну: Вершы.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1946.— 123 с.

Выбр. тв., 1947.— Выбраныя творы.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1947.— 190 с.

Першыя ўсходы, 1951.— Першыя ўсходы: Апавяданні.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1951.— 187 с.

Лясная песня, 1958.— Лясная песня: Апавяданні і нарысы.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1958.— 271 с.

Падарожнае, 1962.— Падарожнае: Вершы.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1962.—123 с.

Сярод чаротаў, 1964.—Сярод чаротаў: Апавяданні.— Мн.: Беларусь, 1964.— 121 с.

Зб. тв., т. 1, 1969.— Збор твораў: У 4-х т.— Мн.: Беларусь, 1969—1971. Т. 1, 1969.— 459 с.

У першы том Збору твораў Піліпа Пестрака ўваходзяць вершы, паэма «Слова пра Мінск», апавяданні і аповесці 1927—1976 гг.

Вершы 1970—1976 гг. і паэма «Слова пра Мінск» уключаны ў Збор твораў упершыню.

Творы падаюцца ў храналагічным парадку. Крыніцай аснoўнага тэксту з'яўляецца тэкст 1 тома апошняга прыжыццёвага выдання Збору твораў — Піліп Пестрак. Збор твораў: У 4-х т.— Мн.: Беларусь, 1969—1971. Т. 1, 1969.— 459 с.

Паколькі амаль для ўсіх твораў, змешчаных у дадзеным томе, крыніца аснoўнага тэксту адна і тая ж, у каментарыях да кожнага твора яна не ўказваецца. Адзначаюцца першая публікацыя і дата напісання твора.

Увесь архіўны матэрыял, які адлюстроўвае працу пісьменніка, захоўваецца ў сям'і П. Пестрака і знаходзіцца ў асноўным у папках «Для папер» рознага колеру, з рознымі надпісамі на іх.

Рукапісныя і машынапісныя тэксты вершаў захоўваюцца ў пяці папках і ў семнаццаці сшытках і блакнотах. Рукапісы напісаны фіялетавым, сінім, зялёным чарнілами і простым алоўкам. Праўкі — гэтымі ж чарнілами і алоўкам. У большасці выпадкаў рукапісы і машынапісы датаваныя, пад некаторымі стаіць подпіс П. Пестрака. Некаторыя вершы запісаны на лістах паперы, складзенай напалам.

Рукапісы і машынапісы апавяданняў і аповесцей захоўваюцца ў дзевяці папках.

Апавяданні і аповесці часцей за ўсё заканчваюцца датай напісання твора, некаторыя з іх надпісаны аўтарам.

Адну папку ў архіве займаюць машынапісы паэмы «Слова пра Мінск» — белавыя і з праўкамі, з паметамі пісьменніка. Апрача яе захоўваецца «Счетоводная книга» з рукапісам паэмы. Тэкст паэмы напісаны ў асноўным фіялетавым чарнілам, некалькі строф напісаны простым алоўкам. Праўкі зроблены фіялетавым і зялёным чарнілами, простым алоўкам. Рукапіс без назвы, старонкі стандартныя, зеленаватага колеру, у лінейку. Даты ў канцы тэкста няма. На палях — заўвагі пісьменніка, некаторыя строфы дапісаны збоку. На вокладцы рукой П. Пестрака простым алоўкам напісана: «Паэма «Мінск».

Аналіз правак, зробленых пісьменнікам у творах, паказвае, што карэнных змен аўтар не ўносіў, праўка ішла ў асноўным у напрамку паляпшэння стылю і мовы твора.

Паэтычная спадчына Піліпа Пестрака з'яўляецца каштоўным здабыткам беларускай мастацкай літаратуры. Яго вершы ў значнай ступені пашыраюць ідэйна-тэматычны дыяпазон нашай паэзіі, узбагачаюць яе новымі матывамі, вобразамі. На працягу ўсяго творчага шляху Пестрак пастомпа шукаў найбольш дасканалыя формы паэтычнага асэнсавання рэчаіснасці, сродкі вобразнага выяўлення думкі. І ў гэтым ён дасягнуў немалых поспехаў. Многія яго вершы вылучаюцца глыбінёй ідэйнага зместу, свежасцю і арыгінальнасцю паэтычных вобразаў, багаццем інтанацый.

Асобнае месца ў багатай і шматгранній творчасці П. Пестрака займае даваенская паэзія, якая нараджалася ва ўмовах

заходнебеларускай рэчаіснасці, у падполлі, на этапных шляхах, за кратамі панскіх казематаў і была голасам прыгнечанага, але нязломнага ў сваёй рэвалюцыйнай мужнасці працоўнага народа. Мастацкае слова было тады для паэта зброяй у барацьбе за лепшае будучае, служыла вялікай справе рэвалюцыйнага вызвалення працоўных мас.

Ужо ў адным з сваіх ранніх вершаў «Над намі віхры выюць...» (1928) П. Пестрак, які ўзяў сабе надзвычай трапны літаратурны псеўданім Звястун, ад імя ўсіх тых, «хто у грудзях збалелых нясе агонь дабра, нясе пядолі крыж», выказаў рашучы пратэст супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Паэт заклікае да барацьбы, славіць тых, «хто ў муках сэрц сваіх, стагнаннем ашалелых, змагання грозпага падняў трывожны кліч!».

Вышэйшая мэта, у служэнні якой паэт бачыць свой свяшчэнны абавязак,— гэта барацьба за шчасце прыгнечанага і абяздоленага народа. Паколькі шлях да гэтай жаданай мэты ляжыць праз рэвалюцыйнае змаганне, паэт сцвярджае гераізм, подзвіг, мужную самаахвярпасць як вышэйшыя чалавечыя вартасці.

Герой лірыкі П. Пестрака — барацьбіт, камуніст-падпольшчык, адзін з тых, каго парадзіла сама рэвалюцыйная эпоха, выхавала камупістычная партыя і паслала ў «навальнічны авангард», «агітатар — салдат-масавік», які заўсёды «на пасту». Ён гатовы полымем уласнага сэрца асвятліць людзям шлях з «цемры-задухі» да свабоды:

О дайце мне сілы! Я сэрца агнём
З грудзей сваіх вырву, на меч насаджу
І з паходняю рушу: за мной!

(«Развітанне»)

Апынуўшыся за турэмнымі кратамі, герой працягвае барацьбу, мужнасцю і цярпеннем перамагае ворагаў-катаў. У змрочнай адзіночцы марыць ён аб вызваленні свайго прыгнечанага народа, зняшчэнні таго «ракавога рубяжу», што падзяліў беларускую зямлю «на нашай ростані ў вялікай барацьбе» («Гадзіна мукі»), сніць аб новым савецкім аграноме, бачыць той радасны час, калі скончыцца нарэшце яго «барацьбянае падарожжа», калі «люд-пралетар, люд песні-працы заб'е прыгоннае пракляцце» («Сон аб аграноме»).

Палымяныя, буптарныя вершы П. Пестрака ўпершыню адкрыліся шырокаму чытачу толькі ў 1940 годзе ў першым зборніку паэта «На варце». Яны атрымалі шчырае прызнанне як жывыя адгалосы зведапых аўтарам і яго народам нечуваных пакут, як сведчапне невымернай мужнасці рэвалюцыянераў-змагароў. Крытыка горача вітала тады выхад гэтай кнігі, адзначала вострую ідэйную накіраванасць, камупістычную партыйнасць, вялікую сілу эмацыянальнага ўздзеяння паэзіі Пестрака. «Філіп Пестрак — прапікнёны лірык рэвалюцыйна-вызвалепчай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі. Вершы, змешчапыя ў зборніку, паражаюць чытача сваёй упутрапай глыбінёй, прачутасцю кожнага радка, кожнага слова. Яны напісаны крывёй сэрца, іх рэвалюцыйпая страснасць, выключпая эмацыянальпая насычапасць, іх упутраны агонь палкам паглыпаюць чытача»[1],— пісаў у рэцэпзіі на зборнік былы ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі Т. Лясовіч. Паводле сведчання шматгадовага вязня панскіх астрогаў, паэта-

[1] Лясовіч Т. «На варце» Філіпа Пестрака.— Вольная праца, 1940, 27 кастр.

рэвалюцыянера В. Таўлая, такія вершы Пестрака, як «На смерць барацьбіта», «Паэзія», «Дарожка», «Пад роднай страхой», «дапамагалі многім зняволеным таварышам пераносіць пакуты турмы, гадавалі душу чалавека-барацьбіта» [1].

Асобныя спробы крытычна паставіцца да некаторых твораў П. Пестрака сустрэлі рашучы адпор. У прыватнасці, сцвярджанне Р. Бярозкіна, што «лірычны вобраз вершаў Пестрака нечым нагадвае адзінокую постаць з дарэвалюцыйных паэм Маякоўскага», аспрэчвалася Я. Шарахоўскім («Лірычны герой паэзіі Ф. Пестрака — гэта не адзінокі чалавек, а змагар, рэвалюцыянер, які ўвесь час адчувае арганічную сувязь з народам, з таварышамі, з партыяй, з камсамолам» [2]), а таксама Т. Лясовічам («Лірычны герой Пестрака — прадстаўнік авангарда працоўных Заходняй Беларусі, непарыўна звязаны з народам, з роднай краінай, якая пітае яго жыватворчымі сокамі» [3]).

М. Клімковіч, гаворачы пра творчую эвалюцыю П. Пестрака, адзначаў ужыванне паэтам, асабліва ў ранніх вершах, традыцыйнай сімволікі (чорнай ночы-ведзьмы, якая карагодзіць над могільнікамі і крыжамі, зор далёкіх і халодных, дуба-волата, што «выйшаў з гушч глыбокіх»). Але гэтае захапленне было нядоўгім. Рэвалюцыйная барацьба патрабавала ад паэта вершаў-заклікаў, вершаў-гімнаў. І яны выходзяць — «Паэзія», «Дарожка», «На фронце», «У дэфензіве», «Пасля прысуду», у якіх ужо зусім іншая паэтыка, трыбунны, аратарскі стыль. «Паэту хацелася як мага больш сказаць у кароткай фразе, як мага глыбей закляймiць ворага. Таму яго радок сугуба метафарычны, суровы, пазбаўлены напеўнасці і строга вытрыманай танічнай рытмікі. Паэт часта не гоніцца за звонкай рыфмай, здавальняючыся аддаленымі асанансамі. Гэта добра, аднак, не заўсёды. Часамі Ф. Пестрак настолькі абцяжарвае свой радок метафарамі, што губляе пачуццё меры і засланяе сэнс слова» [4].

Даверaснёўская паэзія П. Пестрака прыцягвала да сябе ўвагу перш за ўсё сваёй незвычайнасцю, як жывое сведчанне чалавека, што прайшоў суровымі дарогамі рэвалюцыйнай барацьбы, падполля, вынес пакуты шматгадовага турэмнага зняволення. Таму і падыход да яе быў своеасаблівы, ва ўсякім разе іпакшы, чым да звычайнай «мірнай» паэзіі. Асобныя недахопы, стылёвыя пралікі проста дараваліся аўтару, крытыка адносіла іх за кошт незвычайных умоў, у якіх ствараліся вершы.

Каб сапраўды аб'ектыўна ацаніць гэтую паэзію, трэба было падыходзіць да яе з улікам не толькі гістарычных абставін, але і ідэйна-эстэтычных пазіцый самога аўтара. Станаўленне Пестрака як паэта адбывалася няпроста. У сваіх успамінах «Дарогаю жыцця» ён прызнаваўся, што ў канцы 20-х гадоў яго літаратурна-мастацкая практыка не была задаволена старымі канонамі і настойліва шукала новых шляхоў. «Першае знаёмства з Уладзімірам Маякоўскім,— успамінае паэт,— было аглушальным і не зусім зразумелым. Толькі пасля частага чытання дайшоў да душы тры-

---

[1] Звязда, 1940, 11 сак.

[2] Шарахоўскі Я. Аб беларускай паэзіі.— Полымя рэвалюцыі. 1941, № 2, с. 150.

[3] Вольная праца, 1940, 27 кастр.

[4] Клімковіч М. Філіп Сямёнавіч Пестрак.— Літ. і мастацтва, 1940, 3 люг.

бунны пафас паэта. Аднак адчувалася, што для адлюстравання беларускай рэчаіснасці, відаць, нельга было механічна браць здабытае Маякоўскім. Беларуская паэзія павінна мець свае формы, якія парывалі б са старой лірыкай і ўспрымалі б новы змест жыцця ў формах, блізкіх да форм Маякоўскага.

Надышла паласа канструктывізму. Мне падабалася гэтая, па сутнасці фармалістычная, ілынь за лаканізм, за адбор слова, за арыгінальнае выказванне думкі, нават за аддаленыя «мудрагелістыя» асацыяцыі...

Потым надышла пара асуджэння канструктывізму за яго адарванасць ад чытача, ад народа» [1].

Надзвычай важным і каштоўным для разумення ідэйна-творчай эвалюцыі П. Пестрака з'яўляецца таксама сведчанне В. Таўлая, блізкага сябра і саратніка пісьменніка па рэвалюцыйнай барацьбе і літаратурнай працы. У 1935—1936 гг. на Лукішках з дазволу турэмнага камітэта Пестрак і Таўлай вялі творчую перапіску-дыскусію аб новых шляхах беларускай паэзіі. Пазней, у пасляваенны час, Пестрак пісаў, што ён дорага даў бы, каб мець гэтыя каштоўныя дакументы, якія не захаваліся. В. Таўлай успамінаў: «У нашых літаратурных дыскусіях т. Пестрак адстойваў прынцыпы шчырай прастаты ў паэзіі, апяванне звычайных з'яў з жыцця працоўнага люду, узняцце на вышыню мастацкага сінтэзу кожнай слязы прыгнечанага чалавека, кожнай кроплі ахвярнай крыві, распальванне свяшчэннай нянавісці і справядлівай помсты ворагу» [2].

Такое ўсведамленне сутнасці і задач паэзіі выяўлялася ў творчасці самога паэта, пра што яскрава сведчыць напісаны і змешчаны ў астрожным часопісе «Краты» верш П. Пестрака «Паэзія», які паэт называў сваім праграмным творам, падкрэсліваў, што выношваўся ён у жудасных умовах Пінскай турмы каля двух гадоў (1934—1935). Паэзія, як сцвярджае аўтар, заўсёды з'яўляецца адбіткам жыцця, у якім і стогны хворай жанчыны-маці, і журботнае завыванне ветру, і самотны спеў бацькі на начным асеннім гасцінцы, і балючыя згрызоты асірацелага хлапчука-паэта. Але досыць ужо гэтай чалавечай нядолі, «пачэй векавога праклятства». Жыццё патрабуе новых песень:

...Больш не трэба! не трэба! не трэба
Тых жахлівых, бязвыхадных пут,—
Я даўно не малюся да неба,
Я гадую ў душы сваёй бунт!
Дай, паэзія, меч прамяністы —
Слова-гарт, слова-кліч, слова-бой,
Дай палёт мне арліны, агністы —
Гімнам-полымем біць да пябёс!

Гэтае слова-меч павінна бязлітасна нішчыць тых, хто «абуў жыццё нашае ў лапці», «тую чорна-крывавую зграю». Такім і было народжанае ў мужным змаганні палымяное слова самога П. Пестрака. А. Астапенка пісаў тады пра яго кнігу «На варце», што «ўсе 50 вершаў, якія ўвайшлі ў зборнік, хоць па сваёй якасці і не ўсе роўныя, тэматычна звязаны паміж сабой, і таму іх можна

---

[1] Пестрак П. Дарогаю жыцця.— Полымя, 1959, № 12, с. 147—148.

[2] Таўлай В. Філіп Пестрак.— Звязда, 1940, 11 сак.

назваць паэмай аб пакутах і вызваленчай барацьбе народаў Заходняй Беларусі» [1].

Творы, напісаныя П. Пестракам пасля верасня 1939 і ў часы Вялікай Айчыннай вайны, увайшлі ў яго новую кніжку паэзіі «За сваю Айчыну» (1946). Вершы гэтага зборніка сведчаць аб творчай перабудове паэта ў новых абставінах жыцця.

В. Таўлай у артыкуле «Думкі пра зборнік «За сваю Айчыну» [2] адзначаў, у прыватнасці, што паэт у пошуках выйсця з умоўнай, «заглыбленай» вобразнасці звяртаўся да ўзораў народнай песні («Зашумі ты, бор», «Армія Чырвоная»). Аднак заглыбленасць паэтычных вобразаў адчувалася яшчэ нават у такіх добрых па задуме творах, як «Маўзалей», «Даўні знаёмы» і некаторых іншых. Высока ацэньваючы вершы П. Пестрака ваенных гадоў («Маці», «На варце», «Марш Ракасоўскага»), В. Таўлай папярэджваў аўтара ад другой крайнасці, указваў, што ў некаторых яго творах («Перастрэлка над ракой», «Слухайце, пушчы, паляны», «Дзень вызвалення» і інш.) замест рапейшай заглыбленасці заўважаецца павярхоўная ілюстрацыйнасць.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе П. Пестрак звяртаецца да тэм, якія былі ўласцівы ўсёй тагачаснай беларускай паэзіі.

Аспоўныя з іх — тэма нядаўняй вайны, аднаўлення разбуранай фашысцкімі акупантамі народнай гаспадаркі, барацьбы за мір. Герой яго вершаў — просты чалавек, які перанёс ваенныя пакуты і зараз самааддана працуе, каб адрадзіць свой зруйнаваны ворагам родны край («Ляснік», «На заводзе»). Многія вершы паэта падсвечаны жывымі ўражаннямі ад наведанняў Ленінграда («Ленінграду», «У Петрапаўлаўскай крэпасці», «Нява»), Каўказа («Ля помніка Лермантава», «Зеленню шчаслівы»), Украіны («Украіне», «На Дняпры», «Не забыты песні»). Паэт славіць братэрскую дружбу савецкіх народаў («Сябры»), усхвалявана гаворыць пра глыбіню народнай любві да Якуба Коласа («Якубу Коласу»), захапляецца веліччу генія Пушкіна («Пушкінская восень»), высокай мудрасцю М. Горкага («Аб мудрасці і любві»).

Паэта ў гэты час глыбока хвалююць пераўтварэнні, што адбываліся ў жыцці працоўных Заходняй Беларусі. Іх спрадвечную мару аб шчасці П. Пестрак паэтычна ўвасобіў у вершы «Кветка» (1947). Здаўна «гадаваў у бяздоллі» гэтую запаветную мару на задумных палескіх прасторах «вякамі забіты народ».

Сярод пушчаў, пяскоў і балотаў
Выпіў горкую чару да дна,
Вось і выпесціў долю ў журботах —
Кветкай шчасця завецца яна.

Вершы П. Пестрака 50—60-х гадоў, змешчаныя ў кнізе «Падарожнае» (1962),— вынік глыбокіх роздумаў аўтара аб жыцці, месцы чалавека ў ім, аб пераемнасці гераічных традыцый, якія робяць больш змястоўнай нашу сучаснасць, дапамагаюць лепш разумець веліч ленінскіх ідэй, што становяцца явай. Пра гэта гаворыць паэт у многіх вершах зборніка, аб'яднаных у цыклы «Сягоння і заўтра», «Сябрам па-сяброўску», «Латышскія сустрэчы», «З чэхаславацкага дзённіка», «Пад небам Францыі».

---

[1] Астапенка Л. «На варце» Філіпа Пестрака.— Звязда, 1940, 11 снеж.

[2] Літ. і мастацтва, 1946, 22 кастр.

Ва ўрачыстым маўчанні схіляе паэт галаву «над форумам спраў нятленных» у Пражскім Доме-музеі У. І. Леніна («Дваццаць адзіш»), прыгадвае, як «займалася Кастрычніка світанне, чырвонай паласой дрыжала на Няве» («Зали «Аўроры»), як «з вінтоўкамі на тамбурах шнурых латышскія стралкі застылі на пастах», калі «ў тым поездзе ў Маскву сяшаўся Ленін» («Латышскія стралкі»).

Цеплынёю братэрскай любові і дружбы прасякнуты вершы П. Пестрака, прысвечаныя Латвіі («Сірэны», «Сын рыбака», «Кветкі» і інш.). Баявыя песні Райніса, што «шлях пракладалі да сонца, да зор», блізкія і нам, беларусам, яго магутны голас «дораг і мілнашай братняй душы» («Райніса струны»). Мелодыі латышскага коклэ нагадваюць паэту «беларускіх цымбал неразвоны» («Коклэ»).

Цікавы па задуме і мастацкаму ўвасабленню цыкл «Пад небам Францыі», вершы якога з'яўляюцца жывымі ўражаннямі паэта ад знаёмства з сучасным і мінулым гэтай краіны. З шчырым замілаваннем успамінае Пестрак былую славу рэвалюцыйнай Францыі, якая ўвекавечана не толькі ў сцяне-помніку Пэр-Лашэз, але і ў мужнай цвёрдасці «нашых дзён камунара» старога рабочага («Ветэран»), у сённяшняй барацьбе французскіх камуністаў за свае правы, за мір і сацыялізм («Юманітэ»). Паэт задумваецца над глыбокімі сацыяльнымі кантрастамі ў сённяшняй Францыі, яго турбуе лёс мастацтва ў сучасным капіталістычным свеце, якое можа нават самога Хрыста паказаць без шатаў, «у вузкіх штанах, над гальштукам...» («Манмартр»).

Лірыка П. Пестрака апошніх гадоў багатая і разнастайная па сваёй тэматыцы, па вобразна-выяўленчых сродках. Усё больш у ёй глыбокіх філасофскіх разваг, імкнення асэнсаваць жыццё ва ўсёй яго складанасці і супярэчлівасці, раскрыць харастно і веліч душы чалавека. І не выпадкова паэт усё часцей звяртаўся да такой ёмістай формы верша, як санет. Сапраўднай творчай удачай з'явіліся яго санеты «Жураўлі». «На магіле Максіма Багдановіча», «Возера Свіцязь», «Калумбы», «Запавет маладосці» і іншыя.

Асобнае месца ў паэзіі П. Пестрака займае паэма «Слова пра Мінск». Напісаная яшчэ ў першае пасляваеннае пяцігоддзе, яна была апублікавана толькі ў канцы 60-х гадоў.

У паэме ёсць прысвячэнне 50-годдзю Савецкай Беларусі. Праўда, яно не зусім адпавядае зместу твора, які не адлюстроўвае падзей жыцця нашай рэспублікі за гады Савецкай улады, а звернуты больш у мінулае, у дакастрычніцкую пару. Сюжэтна-кампазіцыйная структура паэмы дае падставу меркаваць, што яна была задумана як своеасаблівая паэтычная хроніка важнейшых падзей гісторыі Беларусі і яе сталіцы Мінска. У такім плане і напісаны першы раздзел, які пачынаецца ад тых змрочных часоў, калі працоўны беларускі люд цярпеў жорсткі прыгнёт, калі натоўпы сялян-беднякоў з надзеяй цягнуліся да Мінска ў пошуках працы і кавалка хлеба. Няветліва сустракаў іх тады гэты губернскі горад, якім уладарыў царскі вяльможа з сваёй світы жандараў.

Але ў душах працоўных беларусаў ужо наспяваў пратэст, абуджаліся новыя сілы, нараджаліся «воі-трыбуны, аддавалі сябе за народ». Тут, у Мінску, у доміку над ціхай Свіслаччу, «закладалася гмаху цагліна, шляху слаўнага ВКП(б)». А неўзабаве пралетарыяў горада «песняй свабоднаю клікнуў да баёў дзевяцьсот пяты год».

Далей паэт толькі называе важнейшыя эпізоды рэвалюцыйнай гісторыі Мінска, яе герояў, гаворыць пра падзеі, звязаныя з барацьбой за ўстанаўленне Савецкай улады ў Беларусі. Затое больш адчувальным становіцца ў паэме лірычны струмень. У прыватнасці там, дзе паэт расказвае пра падзеі імперыялістычнай вайны, якая ўсім сваім цяжарам лягла на плечы беларускага народа, пра заходняй Беларусі белапанскай Польшчай, калі «ў нас палову краіны забралі аж на дваццаць пакутлівых год», успамінае пра мужную барацьбу заходнебеларускіх працоўных, пра свой удзел у ёй. На суровых дарогах падполля, у баях барыкадных, за кратамі турмаў паэту тады «спіўся Мінск, новы ленінскі лад». І вось, вяртнуўшыся з «крывёю налітых» этапных дарог, радасна вітае ён родную сталіцу, якая стала для яго сімвалам свабоды і шчасця: «кветкі радасці, клятвы суровай палажыў я да ленінскіх ног».

Адначасова з паэзіяй П. Пестрак шмат увагі аддае прозе, якая паступова займае асноўнае месца ў яго творчасці. Першыя яго апавяданні былі напісаны яшчэ ў гады вайны і прысвечаны пераважна партызанскай тэматыцы. Абапіраючыся на бачанае і ўласна перажытае, пісьменнік праўдзіва малюе карціны народнага жыцця ў часы акупацыі, паказвае баявыя справы партызан, іх сувязь з насельніцтвам. У полі зроку аўтара часцей за ўсё пейкі асобны эпізод, падзея, праз якія і раскрываецца мужнасць народа, што не скарыўся фашысцкім захопнікам, узняўся на барацьбу. Адначасова пісьменнік імкнецца пранікнуць ва ўнутраны свет чалавека. Многія героі яго апавяданняў («Гараць вёскі», «Аўдоця і яе ўнучак», «Генерал» і інш.) яркія, жыццёва праўдзівыя, увасабляюць тыповыя рысы народнага характару.

Спроба больш шырока адлюстраваць народную барацьбу з фашызмам зроблена П. Пестракам у аповесцях «Муж і жонка» і «Пачатак». «Муж і жонка» была напісана ў 1945 годзе спачатку як апавяданне. Пазней твор быў перапрацаваны і ў значнай ступені дапоўнены аўтарам. Больш шырока і пераканаўча паказана, як у складаных абставінах барацьбы з фашызмам часам блізкія людзі маглі апынуцца ў супрацьлеглых лагерах. Самой логікай развіцця характару Алены пісьменнік змог давесці, як умовы жыцця, асяроддзе, выхаванне з'явіліся прычынай таго, што яна становіцца пасобнікам ворага, выдае гітлераўцам свайго мужа Макара і яго сяброў-партызан.

Аповесць «Пачатак» прысвечана паказу першых крокаў партызанскага руху ў Беларусі. Здзекі акупантаў абуджаюць у сэрцах савецкіх людзей гнеў і нянавісць, клічуць да помсты непавіснаму ворагу. Спачатку за зброю бяруцца самыя свядомыя і мужныя. Гэта — камуністы, такія, як аграном Пятро Зараневіч, былы калгасны брыгадзір Кастусь Говар, лейтэнант Сахараў, лесавод Іван Аляксеевіч і іншыя. Яны і становяцца арганізатарамі партызанскай барацьбы, сваімі актыўнымі дзеяннямі кладуць пачатак усенароднаму змаганню супраць фашысцкіх захопнікаў.

У творы праўдзіва адлюстраваны многія характэрныя з'явы жыцця беларускага народа ў часы акупацыі, добра перададзены настрой савецкіх людзей, якія прагна ловяць кожную вестку пра Чырвоную Армію, партызан, жывуць надзеямі на хуткае вызваленне. У той жа час узнімаюць галаву кулакі, якія становяцца памагатымі ворага. Пранук Альшынеўскі сочыць за кожным кро-

кам «бежанца» Зараневіча, адчуваючы ў ім свайго праціўніка, спрабуе нават знішчыць яго разам з сям'ёй.

Вобраз кулака Альшыпеўскага, як і яго жонкі Апелі, намаляваны ў аповесці надзвычай ярка і праўдзіва. Гэта прагны эксплуататар, хітры і небяспечны вораг. Каб пашырыць свой падворак, Прапук ссякае пасаджаную на вуліцы каля яго хаты маладую бярозку, якая павінна была ўпрыгожваць вёску. У час рабунку вёскі эсэсаўцамі ён падбірае чужыя рэчы і цягне дадому. Яго тоўстая Анеля знарок прыходзіць да Зараневічаў з кавалкам хлеба ў руцэ, каб з драпежнай пачварнасцю паздзекавацца з галодных дзяцей.

Першыя аповесці П. Пестрака «Муж і жонка» і «Пачатак» сведчылі аб тым, што пісьменнік даволі паспяхова авалодваў майстэрствам эпічнага адлюстравання рэчаіснасці. Адчувалася ўмепне аўтара падпарадкоўваць жыццёвы матэрыял сваёй ідэйна-творчай задуме, будаваць стройны сюжэт, ствараць тыповыя чалавечыя характары, маляваць яркія карціны народнага побыту.

Асобныя празаічныя творы П. Пестрака на партызанскую тэматыку вызначаюцца выразнай лірычнай танальнасцю. Пісьменнік спрабуе паказаць жыццёвыя з'явы, раскрыць характары праз адносіны чалавека да прыроды, стварыць адпаведны настрой шляхам выкарыстання народных песень. Характэрнае ў гэтых адносінах апавяданне «Лясная песня». Падзейнасць (асобныя эпізоды партызанскага жыцця, паказ узаемаадносін партызан і мясцовага насельніцтва, дапамога апошняму ў апрацоўцы зямлі і інш.) адыходзяць у творы на другі план. Замест гэтага аўтар уважліва прасочвае, як параджалася і мацнела каханне партызана Сцяпана Хомчыка і прыгожай вясковай маладзіцы Аксені. Іх светлае і чыстае пачуццё раскрываецца ў апавяданні на фоне чароўнай лясной прыроды, сялянскага побыту, пад акампанемент задушэўных беларускіх мелодый.

Яркімі фарбамі малюе пісьменнік партрэт гераіні ў момант яе першай сустрэчы з Хомчыкам: «З-пад хусткі відаць былі цёмныя валасы. Даўгаваты твар з выпуклым ілбом, а пад тонкімі доўгімі бровамі — вялікія вочы невыразнага колеру. Яны, здаецца, мянялі свой колер — то цямнелі, то рабіліся шэрымі. Моцны румянец на шчоках, змешаны з загарам, нагадваў лясную прыроду, поўную паху траў і дрэў. Сакавітыя вусны пры ўсмешцы пад крыху задзёртым посам паказвалі радок белых зубоў. Гэта была сіла і краса ад зямлі і лесу».

Характар Аксені П. Пестрак раскрывае паступова, выкарыстоўваючы розныя мастацкія дэталі, трапныя падрабязнасці, дыялог, песні, што так сугучны настрою герояў. У выніку яму ўдалося стварыць надзвычай яркі вобраз прывабнай «лясной жанчыны», якая параўнаўваецца ў творы з грушай-дзічкай, што «і цвіце і калючая».

Праўда, некаторыя крытыкі папракалі пісьменніка, што ён пабыта не здолеў захаваць у творы суразмернасць частак падзепага жыццёвага матэрыялу, захапіўся ідылічным паказам іншых узаемаадносін герояў і таму не змог перадаць ва ўсёй паўнаце атмасферы часу. «Хомчык... мог бы і забыцца, што ён партызан, што на свеце вайна,— пісаў тады І. Кудраўцаў.— Але за плячыма муляў аўтамат. Варта забраць у Хомчыка гэты аўтамат і пазбавіць яго імені партызана — ад гэтага ў «Лясной песні» амаль нічога не зменіцца,— і мы атрымаем твор, дзеянне

якога не абумоўлена часам і абставінамі»[1]. Думаецца, што крытык у дадзеным выпадку падыходзіў да твора не з тымі крытэрыямі і ацэньваў яго не па тых эстэтычных законах, якімі кіраваўся аўтар.

У апавяданнях 50-х пачатку 60-х гадоў на сучасную тэматыку П. Пестрак усё часцей звяртаўся да гумару і сатыры. «Матывы народнага гумару,— прызнаваўся пісьменнік,— уведзены мною ў апавяданні свядома. Я думаю, што гогалеўскія, чэхаўскія традыцыі забываць не варта, бо інакш для літаратуры можа стварыцца пагроза закамянець на пэўных канонах»[2].

Трэба зазначыць, што гумар дапамагае аўтару лепш перадаць той агульны народны аптымізм, які праявіўся ў перыяд будаўніцтва новага жыцця ў былой Заходняй Беларусі. Сродкамі гумару, у прыватнасці, трапна раскрываюцца многія характэрныя з'явы станаўлення і ўмацавання калгаснага ладу ў апавяданнях «Вярнуўся», «Як для скрыпкі струны», «Путавод» і іншых. Едка высмейвае пісьменнік асобныя чалавечыя заганы, недахопы ў апавяданнях «Дзед за сцяною», «Уяда», «Коленька», рашуча асуджае сквапнасць, мяшчанства, душэўную чэрствасць, выступае за новыя нормы агульнажыцця.

Багаццем і разнастайнасцю тэматыкі, мастацкай шматфарбнасцю, кампазіцыйнай зладжанасцю вызначаюцца такія апавяданні П. Пестрака канца 50-х гадоў, як «Куфэрачак», «У змаганні», «Апошні крыж». У іх выявілася павышаная ўвага аўтара да лёсу асобнага чалавека, імкненне глыбей прапікнуць у яго псіхалогію, духоўны свет.

Сучаснасць у творах пісьменніка яшчэ выразней выступае на фоне мінулага, якое падаецца часцей за ўсё праз унутраны маналог, успаміны герояў («Гумно без варот», «Не, не загубленая»). Новыя рысы заўважаюцца і ў стылі апавяданняў, які становіцца больш стрыманым, засяроджаным, часам драматычна напружаным. Характэрнымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца апавяданні «Апошні крыж», «Вось як было», а таксама аповесць «Камень».

Аповесць «Камень» (1954) увогуле вызначаецца сваімі характэрнымі асаблівасцямі і займае адметнае месца ў творчай практыцы П. Пестрака. Гэта — твор гістарычнага жанру. Ён авеяны рамантыкай гераічнага мінулага нашага народа, слаўных традыцый паўстання 1863 года, якія шануюць і прадаўжаюць героі аповесці — збяднелы шляхціц Казімір Рэклайціс і яго пабочны сын Ян Нітка.

Многае засталося нязгэйісненым у жыцці былога народніка пана Казіміра, аб каменную сцяну царскага самаўладства разбіліся яго лепшыя намеры і маладыя парывы. У адзіноце і немачы дажывае веку стары Рэклайціс. Адзінай яго ўцехай і надзеяй з'яўляецца сын, бакалаўр медыцыны, які давучваецца за мяжой, а зараз прыехаў дадому адведаць бацьку.

У аповесці надзвычай дакладна і праўдзіва перададзена атмасфера народнага жыцця пачатку нашага стагоддзя, калі ў Беларусі пасуперак рэакцыі, духоўнаму запяволенню, рэлігійнаму цемрашальству зараджаліся і шырыліся ідэі сацыяльнай і нацы-

---

[1] Кудраўцаў І. Статычнасць і схематызм.— Літ. і мастацтва, 1947, 2 жн.

[2] Пестрак П. Дарогаю жыцця.— Полымя, 1959, № 12, с. 150.

ялальнай свабоды. Нялёгкі і пяпросты шлях змагароў за гэтую свабоду, такіх, як Ян Нітка і яго сябра Андрэй Рэдзька. Яны — прадстаўнікі новага пакалення барацьбітоў, якое ўжо цесна звязана з народам, імкнецца служыць справе яго вызвалення. Сяброў узрушае і да глыбіні душы абурае тое, што ксяндзы-іезуіты адурманьваюць і ашукваюць простых людзей, запалохваюць іх розным выдуманым цудамі, якія быццам бы адбываюцца ля святога каменя. Але іх шчырыя жаданні прасвятліць свядомасць беларускіх сялян разбіваюцца аб каменную глыбу невуцтва, забабоннасці, веры ў бога. Ахвярай гэтай сляпой веры і стаў Ян, які ўступіў у адкрыты паядынак з царкоўнікамі і быў забіты фанатычна настроеным натоўпам.

«Камень» — твор востраюжэтны. Дынамічнасць дзеяння спалучацца ў ім з шырынёй і маштабнасцю паказу народнага жыцця, з уменнем аўтара перадаваць жывое дыханне гісторыі. Значных поспехаў дасягнуў аўтар і ў стварэнні яркіх чалавечых характараў. У аповесці выразна адчуваецца ўжо багаты вопыт працы пісьменніка над раманам «Сустрэнемся на барыкадах», творам, у якім з найбольшай сілай і паўнатой праявіўся талент Пестрака-празаіка, сапраўднага майстра шырокіх эпічных палотнаў.

Вылучаецца ў творчасці П. Пестрака і цыкл празаічных мініяцюр «Сярод чаротаў», якія былі напісаны ў пачатку 60-х гадоў і выдадзены асобнай кніжкай (1964). Тэматычна, а таксама сваёй вобразна-стылёвай афарбаванасцю гэты цыкл прымыкае да рамана «Серадзібор» (1963). Складаецца ён з кароткіх апавяданняў на тэмы жыцця сучаснага Палесся. З шчырай любоўю і замілаванасцю малюе аўтар прыроду гэтага запаветнага краю, яе адмысловую красу, расказвае пра дарагіх яму людзей, якія сваёй руплівай, самаадданай працай пераўтвараюць аблічча зямлі.

Напісаныя ў форме дарожных нататкаў, гэтыя творы заключаюць у сабе ўражанні аўтара, карэспандэнта-літаратара, ад сустрэч з рознымі людзьмі. Людзі гэтыя духоўна багатыя і прыгожыя. Як жывыя, паўстаюць перад намі непаўторная ў сваёй жаноцкай прывабнасці маладая лесніцыха («У палоне прастаты»), лясны чарадзей дзед Кузьма («Квас і лапці»), дбайны гаспадар палескіх абшараў, былы партызанскі камандзір, калгасны старшыня («Генерал»). Кожны з іх нясе ў сабе выразныя рысы нацыянальнага характару нашага народа.

Своеасаблівым гімнам непаўторнаму харству палескай зямлі і яе цудоўным людзям з'яўляецца ўзнёсла-лірычная замалёўка «Сярод чаротаў». Любуючыся лясным абшарамі, услухоўваючыся ў таямнічыя перашэпты чаротаў, пісьменнік адкрывае ў іх вялікую быль зямлі, «пястомную, непазбежную, як праўда, казку вялікага тварэння». А вобраз маладой вясковай пастаўніцы з ахапачкам кніжак у руцэ на балотнай сцяжынцы абуджае ў душы аўтара радаснае ўсведамленне, што і «ў гэтыя гушчы лясоў і чаротаў прабіўся прамень, каб асвяціць народныя глыбіні». Позіркам глыбока зацікаўленага чалавека і адпачасова сталага майстра мастацкага слова аглядае П. Пестрак сваю родную зямлю. А думка яго сягае ў светлае будучае, дзеля якога жыў, змагаўся і працаваў разам з сваім народам і сам пісьменнік.

К. Р. Хромчанка

ВЕРШЫ

Праз турэмныя гады

Дні... (с. 23)

Упершыню — На варце, 1940, с. 67.
У машынапісе датуецца чэрвенем 1927 года з паметай: Са-коўцы.

Паколькі большасць вершаў 1927—1929 гг. не друкавалася асобна, а ўвайшла ў першы зборнік П. Пестрака «На варце» (Пестрак П. На варце: Вершы.— Мн.: Дзяржвыд пры СНК БССР, 1940,— 130 с.), можна выказаць меркаванне, што першадрукам для іх з'яўляецца названы зборнік.

У аўтабіяграфічных накідах «О себе» (1962) паэт прыгадваў: «После освобождения Западной Белоруссии, по выходе из тюрьмы, Государственным издательством в г. Минске был издан первый сборник моих стихов под названием «На страже». Я их вынес из тюрьмы в своей памяти — что-то больше ста пятидесяти стихотворений».

Вёска Сакоўцы (Сакаўцы), якой пазначаны вершы «Дні...» і «Над намі віхры выюць...»,— родная вёска паэта, куды сям'я Пестрака вярнулася ў 1921 годзе. Тут, на радзіме, Піліп Пестрак пачаў пісаць свае першыя вершы на беларускай мове.

Над намі віхры выюць... (с. 24)

Упершыню — Рунь веснаходу, 1928, с. 25.
У машынапісе датуецца лістападам 1928 года.
Змешчаны ў зборніку верш падпісаны псеўданімам Звястун.

Ночы сон... (с. 24)

Упершыню — На варце, 1940, с. 77—78 пад назвай «Гоман ночы...».
У машынапісе датуецца чэрвенем 1930 года з паметай: Гродзенскі астрог.

Як пазначана ў машынапісах вершаў перыяду 1929—1933 гг., яны напісаны ў Гродзенскім астрозе.

За рэвалюцыйную падпольную дзейнасць у 1929 г. Піліп Пестрак быў арыштаваны і асуджаны на 5 год турэмнага зняволення, якія адбыў у Гродзенскім астрозе. Тут паэтам было напісана шмат вершаў, у якіх гучыць нянавісць да ворагаў, заклік да бязлітаснай барацьбы супраць паноў, вера ў перамогу і вызваленне.

Мацуйся (с. 25)

Упершыню — На варце, 1940, с. 18—19.
У машынапісе датуецца кастрычнікам 1930 года з паметай: Гродзенскі астрог.

Наш марш (с. 26)

Упершыню — На варце, 1940, с. 20—21.
У машынапісе датуецца красавіком 1931 года з паметай: Гродзенскі астрог.

Я цябе абніму (с. 27)

Упершыню — На варце, 1940, с. 72—73.
У машынапісах пад назвай «Мы з табою ідзем...» датуецца чэрвенем 1931 года з паметай: Гродзенскі астрог.

На волю (с. 27)

Упершыню — На варце, 1940, с. 35—36.

У машынапісах датуецца снежнем 1935 года з наметаі: Вільня. Астрог Лукішкі.

Машынапісы вершаў, напісаных у перыяд з восені 1935 г. да восені 1936 г., назначаны Вільняй, астрогам Лукішкі; вершаў, напісаных у 1937—1939 гг.— Гродзенскім астрогам. Звязана гэта з тым, што ў 1934 г., пасля невялікага перапынку, Піліпа Пестрака арыштоўваюць у Пінску і зноў назбаўляюць волі тэрмінам на 6 год. Восенню 1935 года яго праводзяць у Вільню, у астрог Лукішкі, дзе паэт прабыў год. З Вільні некалькі дзесяткаў вязняў, сярод якіх знаходзіўся Пілін Пестрак, былі праведзены ў Гродзенскі астрог. Тут, у Гродзенскім астрозе, палітзняволеныя дачакаліся вызвалення Чырвонай Арміяй у верасні 1939 г.

Паэзія (с. 28)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1939, 12 лістап.

У машынапісах датуецца снежнем 1935 года з наметай: Астрог Лукішкі.

Тут можна прыгадаць словы Піліпа Пестрака пра верш: «Верш «Паэзія», які я лічу сваім лепшым вершам (выношваўся на этапах пару год), напісаны... у «Лукішках» і надрукаваны быў у нашым турэмным падпольным рукапісным часопісе «Краты» [1].

Нёман (с. 29)

Упершыню — Беларускі летапіс, 1936, № 2.

У машынапісе датуецца сакавіком 1936 года з наметай: Вільня. Астрог Лукішкі. Верш падпісаны — П. З.

Дарожка (с. 31)

Упершыню — На варце, 1940, с. 39—41.

У машынапісах датуецца сакавіком 1936 года з наметаі: Астрог Лукішкі.

Развітанне (с. 33)

Упершыню — На варце, 1940, с. 24—25.

У машынапісе датуецца сакавіком 1936 года з наметаі: Вільня. Астрог Лукішкі.

Паходня — пераносная свяцільня ў выглядзе наматанага на канец палкі прасмоленага пакулля.

Падарожнік пастаянны (с. 34)

Упершыню — На варце, 1940, с. 37—38 пад назвай «Іграе вецер...».

У машынапісах датуецца сакавіком 1936 года з наметаі: Вільня. Астрог Лукішкі.

Пасля прысуду (с. 35)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1939, 5 лістап.

У машынапісе датуецца красавіком 1936 года з наметаі: Вільня. Астрог Лукішкі.

Бастылія — крэпасць у Парыжы, з 15 ст.— дзяржаўная турма. Штурм Бастыліі паўстаўшым народам 14 ліпеня 1789 г. з'явіўся пачаткам Вялікаі Французскаі рэвалюцыі. З 1880 г. гэты дзень

---

[1] Пестрак П. Дарогаю жыцця.— Полымя, 1959, № 12, с. 148.

адзначаецца як нацыянальнае свята Францыі. Крэпасць у 1790 г. была зрыта.

Пад роднай страхой (с. 37)

Упершыню — На варце, 1940, с. 81—82 пад назвай «Дала мне кашы...».

У рукапісе датуецца красавіком 1936 года з наметай: Вільня. Астрог Лукішкі.

На фронце (с. 38)

Упершыню — На варце, 1940, с. 98—100.

У машынапісе датуецца маем 1936 года з наметай: Вільня. Астрог Лукішкі.

*** Ты і я на возе... (с. 41)

Упершыню — Беларускі летапіс, 1937, № 9.

У машынапісе датуецца чэрвенем 1936 года з наметай: Вільня. Астрог Лукішкі. Верш падпісаны — П. З.

Мы не памрэм! (с. 42)

Упершыню — На варце, 1940, с. 9—10.

У машынапісе датуецца кастрычнікам 1936 года з наметай: Гродзенскі астрог.

Лёха — склеп, падзямелле.

Першы снег (с. 43)

Упершыню — Полымя рэвалюцыі, 1940, № 1, с. 12.

Датуецца студзенем 1937 года.

У машынапісе і ў Зб. тв., т. 1, 1969 верш датуецца студзенем 1936 года з наметай: Гродзенскі астрог. Але з аўтабіяграфічных матэрыялаў вядома, што П. Пестрак у студзені 1936 г. знаходзіўся ў Лукішках, а ў студзені 1937 г.— у Гродзенскім астрозе. Таму можна дапусціць, што верш напісаны ў студзені 1937 г., а дата — студзень 1936 г.— пастаўлена аўтарам памылкова.

Гадзіна мукі (с. 43)

Упершыню — На варце, 1940, с. 26—27.

У машынапісе датуецца лютым 1937 года з наметай: Гродзенскі астрог.

У Зб. тв., т. 1, 1969 верш памылкова датуецца студзенем 1937 года.

Сон аб аграноме (с. 44)

Упершыню — На варце, 1940, с. 95—97.

У машынапісе датуецца лютым 1937 года з наметаі: Гродзенскі астрог.

Мой раманс (с. 46)

Упершыню — На варце, 1940, с. 86.

У машынапісах датуецца лютым 1937 года з наметаі у адным: Гродзенскі астрог, у другім — Гродна — турма.

Пасіянарыя (с. 47)

Упершыню — На варце, 1940, с. 124—125.

У машынапісах датуецца ліпенем 1939 года з наметай: Гродзенскі астрог.

Пасіянарыя — псеўданім Далорэс Ібаруры, гапаровага старшыні Камуністычнай партыі Іспаніі.

Эбро — рака ў паўночна-ўсходняй частцы Іспаніі.

Таледо — горад у цэнтральнай частцы Іспаніі.

Ціхі зрок... (с. 48)

Упершыню — На варце, 1940, с. 89—90.

У машынапісах датуецца жніўнем 1939 года з паметай: Гродзенскі астрог.

У шуме вызвалення

Заходняй Беларусі (с. 50)

Упершыню — Полымя рэвалюцыі, 1939, № 11—12, с. 76 пад назвай «Краіна родная!..».

У машынапісе датуецца вераснем 1939 года з паметай: Гродна.

Маўзалей (с. 51)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1940, 23 крас.; Полымя рэвалюцыі, 1940, № 4, с. 5.

У машынапісах датуецца лістападам 1939 года з паметай: Масква.

Армія Чырвоная (с. 51)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1940, 14 верас.

У машынапісе датуецца 1940 годам з паметай: Гродна.

Вясна мая (с. 53)

Упершыню — Звязда, 1940, 1 мая пад назвай «Мой першы Май! Цябе чакаў я доўга...».

У машынапісе датуецца красавіком 1940 года з паметай: Гродна.

*** Я маю сонцы два... (с. 53)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1940, 5 крас.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1940 годам з паметай: Гродна.

Даўні знаёмы (с. 54)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1940, 21 снеж.

У машынапісе датуецца 1940 годам з паметаі: Гродна.

Пра верш «Даўні знаёмы» П. Пестрак гаварыў, што гэта яго лепшы твор, напісаны ў перыяд паміж вызваленнем Заходняй Беларусі і пачаткам Вялікай Айчыннай вайны [1].

Аб Леніне вялікім (с. 54)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1941, 18 студз.; Полымя рэвалюцыі, 1941, № 1, с. 5.

У машынапісах датуецца студзенем 1941 года з паметай: Гродна.

Партызанская маршавая (с. 55) [2]

Упершыню — За сваю Айчыну, 1946, с. 91—92.

У машынапісе датуецца красавіком 1943 года з паметай: Лагер партызан Сабурава.

Сабураў Аляксандр Мікалаевіч (1908—1974) — адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў час Вялікай Айчыннай вайны, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза.

У аўтабіяграфіі (кастрычнік 1968 г.) П. Пестрак пісаў: «...На

---

[1] Пестрак П. Дарогаю жыцця.— Полымя, 1959, № 12, с. 149.

[2] У выпадках, калі першадрук некаторых твораў у перыядычным выданні не выяўлены, першадрукам для іх будзе лічыцца зборнік, у які ўпершыню быў уключаны дадзены твор.

этой работе (старшыня аддзялення Саюза пісьменнікаў у г. Беластоку.— *Т. С.*) застала война. Шел с женой и ребенком на восток. Дошел до Лельчицкого района Полесской области (теперь Гомельской) и, когда создавалась партизанская группа, стал партизаном — 12 декабря 1942 года. Выполнял все требования командования как боец — ходил в караул, ездил по поручениям и т. д. Через месяца три командование узнало от меня, что являюсь депутатом. Тогда послало в штаб генерал-майора Александра Николаевича Сабурова, командира украинского соединения, которое размещалось на пограничной территории Белоруссии — 75 километров от нашего отряда. Там стал работать в редакции партизанской газеты, потом создавал журнал».

*** Пад зорным карагодам... (с. 56)

Упершыню — За сваю Айчыну, 1946, с. 92—93 пад назвай «Пад зорным небазводам...».

У машынапісе пад назвай «Пад зорным небазводам...» датуецца маем 1943 года з паметай: Лагер партызан Сабурава.

Першы май (с. 57)

Упершыню — За сваю Айчыну, 1946, с. 93—94.

У машынапісе датуецца маем 1943 года з паметай: Лагер партызан Сабурава.

Памяці Янкі Купалы (с. 57)

Упершыню — За сваю Айчыну, 1946, с. 105—106.

У машынапісе датуецца ліпенем 1943 года з паметай: Масква.

Верш прысвечаны гадавіне з дня смерці Янкі Купалы.

Месца напісання некаторых твораў часоў Вялікай Айчыннай вайны — г. Масква. У адзначанай вышэй аўтабіяграфіі (Гл. каментарый да верша «Партызанская маршавая», с. 413), паэт працягваў: «Командование отправило жену с ребенком на самолете в Москву где-то в мае 1943 г., а в июле командование получило телеграмму из нашего ЦК КП(б)Б с требованием моего прилета в Москву.

В Москве стал работать начальником Управления по делам искусств».

Рыцар Айчыны (с. 58)

Упершыню — Беларусь, 1944, № 1, с. 27.

У машынапісах датуецца вераснем 1943 года з паметай: Масква.

Даватар Леў Міхайлавіч (1903—1941) — генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза. Загінуў у баі пры абароне Масквы.

Маці (с. 59)

Упершыню — Беларусь, 1944, № 2, с. 30.

У машынапісах датуецца лістападам 1943 года з паметай: Масква.

Слухайце, пушчы, паляны... (с. 62)

Упершыню — Белостокская правда, 1943, 29 лістап. пад назвай «Слухайце, пушчы...».

У машынапісе датуецца снежнем 1943 года з паметай: Масква.

Прыпяць (с. 63)

Упершыню — Полымя, 1945, № 10, с. 80—81.

У машынапісе датуецца снежнем 1943 года з паметай: Масква.

На варце (с. 65)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1945, 12 жн.

У машынапісах датуецца 1943 годам з наметай: Партызанскі атрад.

Павеі, вецер... (с. 66)

Упершыню — За сваю Айчыну, 1946, с. 106—107.

У машынапісах датуецца студзенем 1944 года з наметай: Масква.

Паводле сведчання К. Р. Хромчанкі, даследчыка творчасці пісьменніка, Піліп Пестрак у асабістай гутарцы з ім паведаміў, што песня «Павеі, вецер...» была напісана для фільма пра Героя Савецкага Саюза Даватара Л. М.

Ткачыха (с. 67)

Упершыню — Беларусь, 1944, № 6, с. 26.

У машынапісах датуецца красавіком 1944 года з наметай: Гомель.

Уток — папярочныя ніткі, якія пераплятаюцца з прадоўжнымі (асновай).

Дзядзька-беларус (с. 67)

Упершыню — За сваю Айчыну, 1946, с. 87—89.

У машынапісе датуецца 1944 годам з наметай: Масква.

Сінія туманы (с. 70)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1945, 12 жн.

У машынапісе датуецца 1944 годам з наметай: Гомель.

Палкоўнік (с. 70)

Упершыню — За сваю Айчыну, 1946, с. 82—84.

У машынапісе датуецца 1944 годам з наметай: Гомель.

Песня аб воладце (с. 72)

Упершыню — За сваю Айчыну, 1946, с. 116—117.

У машынапісе датуецца 1945 годам з наметай: Мінск.

Пасля вайны

Дзяўчынка (с. 73)

Упершыню — Беларусь, 1946, № 5—6, с. 74.

У машынапісе датуецца вераснем 1945 года з наметай: Ружанская пушча Брэсцкай вобласці.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1945 годам з наметай: Мінск.

*** Дарогаю лясною... (с. 73)

Упершыню — Беларусь, 1946, № 5—6, с. 74.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1945 годам з наметай: Мінск.

Вулей (с. 74)

Упершыню — Беларусь, 1946, № 5—6, с. 74.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1945 годам з наметай: Мінск.

Жураўлі (с. 75)

Упершыню — Беларусь, 1946, № 5—6, с. 74.

У архіве захоўваюцца машынапісы, якія датуюцца адпаведна

1945 і 1977 гг. У Зб. тв., т. 1, 1969 верш датуецца 1959 годам з паметай: Мінск. Відаць, 1959 і 1977 гг.— даты перапрацоўкі тэксту верша.

Лясніку (с. 75)

Упершыню — Выбр. тв., 1947, с. 141—142.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1945 годам з паметай: Мінск.

У машынапісе пад назвай «Вітаю, Даніла...» датуецца маем 1946 года. Відаць, гэта дата з'явілася пры перадрукоўцы тэксту.

Якубу Коласу (с. 76)

Упершыню — Советская Белоруссия, 1946, 3 лістап.

У машынапісе датуецца 1946 годам з паметай: Мінск.

Сябры (с. 77)

Упершыню — Беларусь, 1947, № 2, с. 25.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1946 годам з паметай: Сочы.

Менестрэль — вандроўны паэт-музыкант у Францыі і Англіі ў сярэднія вякі.

Сірэна — у грэчаскай міфалогіі паўптушка-паўжанчына, якая завабліваала маракоў сваімі песнямі ў небяспечныя мясціны.

Арганаўты — у старажытнай міфалогіі героі, якія плавалі ў Калхіду на караблі «Арго» па залатое руно, што аберагалася драконам.

Ленінграду (с. 78)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1948, 17 студз.

У машынапісах датуецца жніўнем 1947 года.

У Зб. тв, т. 1, 1969 падаецца з паметай: Ленінград, 1947.

У Петрапаўлаўскай крэпасці (с. 79)

Упершыню — Выбр. тв., 1947, с. 183—184.

У машынапісах датуецца вераснем 1947 года.

У Зб. тв, т. 1, 1969 падаецца з паметай: Ленінград, 1947.

Ульянаў Аляксандр Ільіч (1866—1887) — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў «Тэрарыстычнай фракцыі» партыі «Народная воля». Старэйшы брат Леніна. Удзельнік падрыхтоўкі замаху на Аляксандра III. На судзе выступіў з праграмнай прамовай. Павешаны ў Шлісельбургскай крэпасці.

Баўман Мікалай Эрнэставіч (псеўданім Грач, 1873—1905) — дзеяч расійскага рэвалюцыйнага руху з 90-х гадоў. Бальшавік. Забіты чарнасоценцамі.

Фігнер Вера Мікалаеўна (1852—1942) — дзеяч расійскага рэвалюцыйнага руху, пісьменніца. У 1884 г. прыгаворана да пажыццёвай катаргі. 20 год правяла ў Шлісельбургскай крэпасці. У 1906—1915 гг.— у эміграцыі.

Ля помніка Лермантава (с. 81)

Упершыню — Полымя, 1948, № 2, с. 88.

У машынапісах датуецца вераснем 1947 года з паметай: Кіславодск.

Сонм — устар., мноства чаго-небудзь.

* *Улус* — вёска [1].

---

[1] Тут і далей зорачкай пазначаны словы, тлумачэнні якіх даюцца аўтарам у Зб. тв., т. 1, 1969.

Нява (с. 82)

Упершыню — Выбр. тв., 1947, с. 185—186.
У машынапісах датуецца вераснем 1947 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 надаецца з паметай: Ленінград, 1947.
Сага — паданне; старажытнаскандынаўскія ці старажытнаірландскія гераічныя або гістарычныя аповесці, у якіх чаргуюцца вершаваныя і празаічныя ўрыўкі.

Кветка (с. 83)

Упершыню — Выбр. тв., 1947, с. 173—174.
У машынапісе датуецца снежнем 1947 года з паметай: Пінск.

Зелепню шчаслівы (с. 84)

Упершыню — Выбр. тв., 1947, с. 162.
Датуецца годам апублікавання.
У Зб. тв., т. 1, 1969 верш памылкова датуецца 1950 годам.

Аб мудрасці і любві (с. 84)

Упершыню — Беларусь, 1948, № 6, с. 7.
У рукапісе датуецца 1948 годам.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1948.

Мастак (с. 85)

Упершыню — Полымя, 1955, № 12, с. 65—66.
У машынапісах датуецца студзенем 1949 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1949.
Пілігрым — вандроўнік, падарожны.
Скрыжаль — перан. «тое, што ахоўвае» (куды заносяцца памятныя падзеі, даты, імёны, ідэі).

Пушкінская восень (с. 86)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1949, 4 чэрв.
У рукапісе і машынапісе датуецца чэрвенем 1949 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1949.

Хлопчыку (с. 87)

Упершыню — Полымя, 1951, № 1, с. 79.
У машынапісах датуецца 12 кастрычніка 1950 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 верш памылкова датуецца 1961 годам.

З асенніх матываў (с. 88)

Упершыню — Беларусь, 1950, № 11, с. 13.
У рукапісе і машынапісе датуецца лістападам 1950 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1950.

Не забыты песні... (с. 89)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1954, 22 мая.
У машынапісах датуецца студзенем 1954 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1954.
Запарожская Сеч — украінскае казацкае войска ў 16—18 стст.
Багдан (Зіновій) Міхайлавіч Хмяльніцкі (каля 1595—1657) — гетман Украіны, кіраўнік вызваленчай барацьбы ўкраінскага народа супраць польска-шляхецкага прыгнёту ў 1648—1654 гг. 8 студзеня 1654 г. аб'явіў аб уз'яднанні Левабярэжнай Украіны з Расіяй.

Маяк (с. 89)

Упершыню — Полымя, 1956, № 2, с. 3.

У рукапісе датуецца 31 студзеня 1955 года, у машынапісе — 1961 годам. Другая дата, відаць,— вынік перапрацоўкі тэксту верша.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з наметай: Мінск, 1961.

Дарожка (с. 90)

Упершыню — Беларусь, 1957, № 3, с. 13.

У машынапісах датуецца вераснем 1956 года.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з наметай: Нарач, 1956.

Бомы (с. 91)

Упершыню — Беларусь, 1957, № 3, с. 13.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1956 годам з наметай: Нарач.

Дзівасіл (с. 92)

Упершыню — Ніва, 1956, 14 кастр.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1956 годам з наметай: Нарач.

Верасы (с. 92)

Упершыню — Падарожнае, 1962, с. 41—42, дзе датуецца 1956 годам.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1956 годам з наметай: Нарач.

Так сказаў капітан... (с. 93)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1957, 19 кастр.

У рукапісе датуецца 3 жніўня 1957 года. У машынапісах памета: Друскенікі — чэрвень — 1957.

Белы комін (с. 94)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1957, 15 снеж.

У рукапісе датуецца 8 жніўня 1957 года. У машынапісах памета: Друскенікі — чэрвень — 1957.

Хвалі жытнія... (с. 95)

Упершыню — Падарожнае, 1962, с. 70.

У рукапісе датуецца 8 жніўня 1957 года. У машынапісах памета: Друскенікі — жнівень — 1957 г.

Па Дняпры (с. 95)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1957, 14 верас. пад назвай «На Дняпры».

У рукапісе датуецца 12 жніўня 1957 года.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з наметай: Мінск, 1957.

Украіне (с. 96)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1957, 25 снеж.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1957 годам з наметай: Мінск.

Чумацкі шлях — шлях, на якім чумакі (возчыкі солі, рыбы і г. д.) вазілі прадукты галоўным чынам з Крыма на Украіну.

Сонца (с. 98)

Упершыню — Зара, 1958, 12 кастр.

У машынапісах датуецца 14 верасня 1958 года.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з наметай: Мінск, 1958.

Латышскія стралкі (с. 98)

Упершыню — Полымя, 1960, № 3, с. 3.

У рукапісах датуецца сакавіком, снежнем 1959 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1959.

Дваццаць адзін (с. 99)

Упершыню — Беларусь, 1959, № 4, с. 2.
У рукапісе датуецца красавіком 1959 года з паметай: Мінск.
П. Пестрак наведаў ЧССР у 1958 годзе ў якасці турыста. Вынікам паездкі з'явіўся цыкл вершаў пад назвай «З Чэхаславацкага дзённіка». Вось што піша паэт у сваіх успамінах: «...Назаўтра пабывалі ў музеі У. І. Леніна, там, дзе адбывалася Пражская канферэнцыя. Крэслы і сталы (усіх месцаў каля 21) стаяць так, як быццам людзі толькі выйшлі. Невялічкі столік для прэзідыума на трох чалавек...»
Ліквідатары — прадстаўнікі правага крыла меншавізму, якое ўзнікла ў 1907 г. Выступалі за ліквідацыю нелегальнай рэвалюцыйнай партыі, адракліся ад рэвалюцыйнай праграмы РСДРП. 6-я (Пражская) канферэнцыя РСДРП (1912) выключыла меншавікоў-ліквідатараў з партыі.

Аб вясне (с. 100)

Упершыню — Беларусь, 1960, № 2, с. 10.
У машынапісах датуецца снежнем 1959 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1959.

Залп «Аўроры» (с. 100)

Упершыню — Полымя, 1960, № 3, с. 3.
У рукапісе датуецца снежнем 1959 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1959.

На магіле Максіма Багдановіча (с. 101)

Упершыню — Полымя, 1960, № 6, с. 77.
У рукапісах датуецца снежнем 1959 года і лютым 1960 года з паметай: г. Ялта. Відаць, другая дата — вынік дапрацоўкі тэксту верша.
Верш напісаны ў сувязі з наведваннем магілы Максіма Багдановіча ў Ялце, дзе Піліп Пестрак адпачываў зімой 1959 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1959.

Вячэрнія далі (с. 101)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1960, 9 мая.
У машынапісах датуецца студзенем 1960 года.
Верш напісаны ў сувязі з прысваеннем у 1960 г. Веры Харужай звання Героя Савецкага Саюза.
Харужая Вера Захараўна (1903—1942) — дзеяч камсамола, Герой Савецкага Саюза. Член КПСС з 1921 г. У 1924—1932 гг. сакратар падпольнага ЦК КСМ Заходняй Беларусі і член ЦК КСМ Польшчы. З 1941 г. адзін з кіраўнікоў партыйнага падполля на Віцебшчыне. Закатавана фашыстамі.

Возера Свіцязь (с. 102)

Упершыню — Полымя, 1960, № 8, с. 57.
У машынапісе датуецца студзенем 1960 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1960.

З язюля (с. 103)

Упершыню — Беларусь, 1960, № 12, с. 7.

У машынапісах датуецца чэрвенем 1960 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1960.

Калумбы (с. 103)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1960, 9 верас.
У рукапісе і машынапісе датуецца жніўнем 1960 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1960.

Запавет маладосці (с. 104)

Упершыню — Беларусь, 1960, № 12, с. 7.
У машынапісах датуецца жніўнем 1960 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1960.

Сірэны (с. 104)

Упершыню — Беларусь, 1960, № 12, с. 7.
У рукапісе і машынапісе датуецца вераснем 1960 года з паметай: Латвія.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Рыга, 1960.

Кветкі (с. 105)

Упершыню — Беларусь, 1960, № 12, с. 7.
У машынапісе датуецца вераснем 1960 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1960.

Сын рыбака (с. 105)

Упершыню — Беларусь, 1960, № 12, с. 7.
У машынапісе датуецца вераснем 1960 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1960.

Райніса струны... (с. 106)

Упершыню — Беларусь, 1960, № 12, с. 7.
У машынапісе датуецца вераснем 1960 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1960.

Райніс Ян (сапр. прозвішча Пліекшан, 1865—1929) — народны паэт Латвійскай ССР, грамадскі дзеяч. За рэвалюцыйную дзейнасць быў падвергнуты турэмнаму зняволенню і ссылцы (1897—1903). У 1905—1920 гг.— у эміграцыі. Пафас рэвалюцыйнай барацьбы рабочага класа, рэвалюцыйныя прадчуванні адлюстраваны ў многіх яго творах. Паэзія Райніса аказала значны ўплыў на развіццё латышскай савецкай літаратуры.

Латгальскі (Латгалія) — вобласць ва ўсходняй Латвіі, населеная латгаламі,— народнасцю, якая дала этнічную назву ўсяму латышскаму народу.

Коклэ (с. 106)

Упершыню — Беларусь, 1960, № 12, с. 7.
У машынапісах датуецца вераснем 1960 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1960.
* *Коклэ* — музычны інструмент, падобны да цымбалаў.

Пад небам Францыі

Чырвоная куртка (с. 108)

Упершыню — Полымя, 1961, № 12, с. 104—105.
У рукапісе датуецца вераснем 1961 года з паметаі: Парыж — Мінск.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметаї: Мінск, 1961.

Цыкл вершаў «Пад небам Францыі» быў напісаны П. Пестракам у сувязі з наведваннем у 1961 годзе Францыі. Вось што паведаміла газета «Літаратура і мастацтва» 22 жніўня 1961 года: «Днямі з Мінска ў Парыж выехала турысцкая група работнікаў культуры БССР, арганізаваная Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі.

У яе склад уваходзяць пісьменнікі В. Вітка, П. Пестрак, Ус. Краўчанка, народны мастак БССР І. Ахрэмчык, мастак В. Ціхановіч...»

* *Пэрмэтэ* — дазвольце, з вашага дазволу.

Негр у атэлі (с. 109)

Упершыню — Полымя, 1961, № 12, с. 105.

У рукапісе пад назвай «Негр-кухар» датуецца вераснем 1961 года з паметай: Парыж — Мінск.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1961.

Ветэран (с. 109)

Упершыню — Полымя, 1961, № 12, с. 104.

У рукапісах датуецца вераснем 1961 года з паметай: Парыж — Мінск.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1961.

«Юманітэ» («Чалавецтва») — французская штодзённая газета, з 1920 г. цэнтральны орган камуністычнай партыі Францыі.

Пэр-Лашэз (с. 111)

Упершыню — Полымя, 1961, № 12, с. 103.

У рукапісах датуецца вераснем 1961 года з паметай: Парыж — Мінск.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1961.

Пэр-Лашэз — могілкі ў Парыжы, месца апошніх баёў у маі 1871 г. камунараў з версальцамі. 27 мая каля паўночна-ўсходняй сцяны Пэр-Лашэз былі расстраляны палонныя камунары. У 1899 г. быў узведзены помнік «Сцяна камунараў».

Манмартр (с. 111)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1962, 13 крас. пад назвай «На гары Манмартр».

У рукапісе датуецца вераснем 1961 года з паметай: Парыж — Мінск.

У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з паметай: Мінск, 1961.

Манмартр — прыгарад, з 1860 г.— раён Парыжа. Паўстанне на Манмартры 18 сакавіка было пачаткам Парыжскай камуны 1871 г. З канца 19 ст. стаў вядомы як месца, дзе збіралася артыстычная багема.

Садом і Гамора — у біблейскай міфалогіі два гарады ля вусця ракі Іардан, жыхары якіх былі абвінавачаны ў распусnасці і згарэлі ў агні, пасланым з нябёс. У пераносным значэнні: беспарадак, хаос.

«Юманітэ» (с. 113)

Упершыню — Літ і мастацтва, 1962, 13 крас. пад назвай «У «Юманітэ».

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1961 годам з паметаї: Мінск.

Рабесп'ер Максімільен (1758—1794) — дзеяч Вялікай Францыз-

скай рэвалюцыі (1789—1794), адзін з кіраўнікоў якабінцаў. Фактычна ўзначаліў у 1793 г. рэвалюцыйны ўрад, адыграў вялікую ролю ў разгроме ўнутранай і знешняй контррэвалюцыі.

Прыкметы (с. 114)

Упершыню — Зб. тв., т. 1, 1969, с. 151 з наметай: Мінск, 1964.
У машынапісах датуецца 19 лістапада 1964 года.

Ліст са Швейцарыі (с. 114)

Упершыню — Зб. тв., т. 1, 1969, с. 154—155 з наметай: Мінск, 1967.
У машынапісах датуецца 1967 годам з наметай: Мінск.

Зорная быль (с. 116)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1968, 27 сак.
У машынапісе датуецца лютым 1968 года.
У Зб. тв., т. 1, 1969 падаецца з наметай: Мінск, 1968.

У ціхім гімне (с. 117)

Друкуецца — Літ. і мастацтва, 1971, 1 студз., дзе ўпершыню апублікаваны.
У рукапісах датуецца ліпенем 1970 года.
У Збор твораў уключаецца ўпершыню.

Час (с. 118)

Друкуецца — Літ. і мастацтва, 1976, 12 лістап., дзе ўпершыню апублікаваны.
У рукапісах датуецца 16 мая і 17 кастрычніка 1974 года, ў машынапісе — 27 студзеня 1977 года. Відаць, дзве апошнія даты — даты дапрацоўкі тэксту верша.
У Збор твораў уключаецца ўпершыню.

Ён і самалёт (с. 118)

Друкуецца — Літ. і мастацтва, 1975, 21 сак., дзе ўпершыню апублікаваны.
Датуецца годам апублікавання.
У Збор твораў уключаецца ўпершыню.

Пошумы (с. 119)

Друкуецца — Літ. і мастацтва, 1975, 21 сак., дзе ўпершыню апублікаваны.
Датуецца годам апублікавання.
У архіве захоўваюцца машынапісы з датамі: 1975 і 1977 гг. Відаць, другая дата — вынік перапрацоўкі тэксту верша.
У Збор твораў уключаецца ўпершыню.

Неспакой (с. 119)

Друкуецца — Літ. і мастацтва, 1975, 21 сак., дзе ўпершыню апублікаваны.
Датуецца годам апублікавання.
У архіве захоўваюцца рукапісы з датамі: 1976 год і 6 жніўня 1977 года. Гэтыя даты, відаць,— вынік перапрацоўкі тэксту верша.
У Збор твораў уключаецца ўпершыню.

Кліч свабоднай зямлі (с. 120)

Друкуецца — Літ. і мастацтва, 1976, 12 лістап., дзе ўпершыню апублікаваны.
Датуецца годам апублікавання.
У архіве захоўваюцца машынапісы з датамі: 1977 год, 2 сту-

дзеня 1977 года і май 1977 года. Відаць, гэта даты перапрацоўкі тэксту верша.

У Збор твораў уключаецца ўпершыню.

ПАЭМА

Слова пра Мінск (с. 121)

Друкуецца па тэксту першай публікацыі — Пестрак Піліп. Слова пра Мінск. Паэма.— Мн.: Беларусь, 1968.— 39 с.

У машынапісах датуецца 1949—1950 гг. з паметай: Мінск.

Урыўкі з паэмы друкаваліся: «Я іду з успамінам...» — «Беларусь», 1967, № 5, с. 6; «Кірмаш» — «Літ. і мастацтва», 1967, 16 мая; «Там над Свіслаччу ціхай...» — «Вяч. Мінск», 1968, 15 ліп.

* *Захар'еўская* — галоўная вуліца Мінска ў царскія часы. Цяпер — Ленінскі праспект.

АПАВЯДАННІ

Партызанскімі сцежкамі

Аўдоцця і яе ўнучак (с. 139)

Упершыню — Беларусь, 1945, № 3, с. 33—36.

У машынапісах датуецца 1945 годам.

Пад славацкія песні (с. 145)

Упершыню — Беларусь, 1946, № 8, с. 40—41.

У машынапісах датуецца красавіком 1946 года з паметай: Нясвіж.

З гары спускаліся авечкі,
Ты падавала мне руку,
Лілося з гаю па-над рэчкай:
Ку-ку, ку-ку, ку-ку...— урывак з песні, якая, відаць, належыць да т. зв. «жорсткіх» рамансаў (песні гарадскога мяшчанства).

Лясная песня (с. 147)

Упершыню — Полымя, 1947, № 2, с. 73—80.

У архіве захоўваюцца машынапісы з датамі: жнівень 1946 года і 1948 год. Відаць, апошняя дата — дата перапрацоўкі тэксту апавядання.

Не шумі ты, лес, цёмнай ночкаю...
Не заві мяне, муж, сваёй жонкаю...
Я й прыгожая, я й удалая,
Як бярозанька, маладжавая...
А ты б'еш мяне, колькі хочацца,
І з вачэй маіх слёзы коцяцца...
Ой, пайду я ў лес, там загінуся,
Ад цябе навек я адкінуся.
Не шукай мяне ты з расіцаю,
Не гукай мяне над крыніцаю...— перайманне з беларускай народнай песні.

Генерал (с. 160)

Упершыню — Беларусь, 1947, № 3, с. 39.

У рукапісе датуецца жніўнем 1946 года з паметай: Мінск.

Гарадзь вёскі (с. 163)
Упершыню — Беларусь, 1947, № 10, с. 20—22.
У машынапісах датуецца снежнем 1946 года з наметай: Мінск

Калгасныя палеткі

Як для скрыпкі струны... (с. 171)
Упершыню — Першыя ўсходы, 1951, с. 163—173.
У машынапісах датуецца 1950 годам.
У Зб. тв., т. 1, 1969 апавяданне памылкова датуецца 1955 годам.

Вярнуўся (с. 177)
Упершыню — Беларусь, 1953, № 7, с. 20.
У машынапісе датуецца 1953 годам.
У Зб. тв., т. 1, 1969 апавяданне памылкова датуецца 1955 годам.

Раздвоены (с. 182)
Упершыню — Беларусь, 1955, № 5, с. 21—23.
У архіве захоўваюцца рукапіс з датай: 22 студзеня 1955 года і машынапісы з датай: 1954 год. Відаць, дата ў рукапісе — дата перапрацоўкі тэксту апавядання.
У Зб. тв., т. 1, 1969 апавяданне памылкова датуецца 1956 годам.

Коленька (с. 190)
Упершыню — Звязда, 1960, 17 крас.
У рукапісе датуецца 1955 годам.

Куфэрачак (с. 195)
Упершыню — Лясная песня, 1958, с. 162—169.
У рукапісе датуецца 8 сакавіка 1956 года.

Дзіця (с. 199)
Упершыню — Работніца і сялянка, 1957, № 5, с. 18—20.
У машынапісах датуецца красавіком 1956 года.

«Путавод» (с. 206)
Упершыню — Літ. і мастацтва, 1956, 22 верас.
У машынапісе датуецца жніўнем 1956 года.

Імунітэт (с. 209)
Упершыню — Калгасная праўда, 1957, 21 кастр.
У машынапісе датуецца снежнем 1956 года.
* *Імунітэт* (у медыцыне) неўспрымальнасць арганізма да інфекцыі (заразы), залежная або ад натуральных прычын, або ад здабытых у працэсе жыцця якасцяў арганізма. У пераносным сэнсе — гарт душы чалавека ў стаўленні да нягод і недахопаў жыцця.

Гумно без варот (с. 216)
Упершыню — Калгасная праўда, 1957, 31 студз.
У рукапісе датуецца снежнем 1956 года з наметай: Каралішчавічы.
* Як вядома, старажытнарымскі палкаводзец Антоніі, пайшоўшы ў бой супраць егіпцян на чале марской эскадры, убачыў на карме егіпецкага карабля каралеву Клеапатру, у якую ён быў закаханы, адарваўся ад сваёй эскадры і паплыў на спатканне з Клеапатраі. Бой, вядома, быў прайграны.

Л г у д о к г у д з е ў... (с. 222)
Упершыню — Літ. і мастацтва, 1956, 19 мая.
У машынапісе датуецца 1956 годам.

Д з е д з а с ц я н о ю (с. 225)
Упершыню — Лясная песня, 1958, с. 155—161.
У машынапісе датуецца 1956 годам.

А п о ш н і к р ы ж (с. 229)
Упершыню — Літ. і мастацтва, 1957, 2 сак.
У машынапісе датуецца 1957 годам.
* *Ол райт* — Добра! Усё ў парадку!

Н а р у ч н ы г а д з і н н і к (с. 241)
Упершыню — Літ і мастацтва, 1960, 27 мая.
У рукапісе датуецца красавіком 1960 года.

У з м а г а н н і... (с. 246)
Упершыню — Беларусь, 1960, № 5, с. 16 пад назвай «Залатая зорка».
У машынапісах датуецца 1960 годам.

Не, н е з а г у б л е н а я... (с. 251)
Упершыню — Беларусь, 1964, № 4, с. 8—9.
У рукапісах датуецца 26 красавіка 1961 года.

В о с ь я к б ы л о... (с. 255)
Упершыню — Літ. і мастацтва, 1963, 26 лістап.
У рукапісах датуецца ліпенем 1963 года з паметаі: Ялта.

З цыкла «Сярод чаротаў»

У п а л о н е п р а с т а т ы (с. 262)
Упершыню — Сярод чаротаў, 1964, с. 88—98.
У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1963 годам.

К в а с і л а п ц і (с. 267)
Упершыню — Сярод чаротаў, 1964, с. 99—102.
У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1963 годам.

П а д з о р а м і (с. 270)
Упершыню — Сярод чаротаў, 1964, с. 102—104 пад назваі «Цераз год. Пад зорамі...».
У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1963 годам.

А р л і ц а (с. 271)
Упершыню — Сярод чаротаў, 1964, с. 104—107.
У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1963 годам.

С в я т о е м а ў ч а н н е (с. 272)
Упершыню — Сярод чаротаў, 1964, с. 107—109.
У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1963 годам.

Г е н е р а л (с. 273)
Упершыню — Сярод чаротаў, 1964, с. 109—117.
У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1963 годам.
Як паведаміў П. Пестрак у гутарцы з К. Р. Хромчанкам, прататыпам героя апавядання з'явіўся В. З. Корж.

Корж Васіль Захаравіч (псеўданім Камароў, 1899—1967) — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айчынную вайну. Генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза.

Сярод чаротаў (с. 277)

Упершыню — Сярод чаротаў, 1964, с. 117—121.

У Зб. тв., т. 1, 1969 датуецца 1963 годам.

АПОВЕСЦІ

Муж і жонка (с. 281)

Упершыню — Полымя, 1946, № 4, с. 70—113.

У машынапісе датуецца жніўнем-вераснем 1945 года з паметай: Мінск.

* *«Касцы»* — народная назва сузор'я Пояс Арыёна.

Пачатак (с. 323)

Упершыню — Полымя, 1948, № 4, с. 4—30.

У рукапісе пад назвай «Па слядах» датуецца красавіком — чэрвенем 1946 года з паметай: Нясвіж — Мінск.

Камень (с. 370)

Упершыню — Полымя, 1954, № 7, с. 74—92.

У рукапісе датуецца 21 лютага 1954 года.

* *Чаварак* — жыллё для парабкаў.

Т. Р. Строева

ЗМЕСТ

Ад рэдакцыі 5
Хромчанка К. Р. Водгалас зведапага і перажытага 6

ВЕРШЫ

Праз турэмныя гады

Дні... 23
Над намі віхры выюць... 24
Ночы сон... 24
Мацуйся 25
Наш марш 26
Я цябе абніму 27
На волю 27
Паэзія 28
Нёман 29
Дарожка 31
Развітанне 33
Падарожнік пастаянны 34
Пасля прысуду 35
Пад роднай страхой 37
На фронце 38
*** Ты і я на возе... 41
Мы не памрэм! 42
Першы снег 43
Гадзіна мукі 43
Сон аб аграноме 44
Мой раманс 46
Пасіянарыя 47
Ціхі зрок... 48

У шуме вызвалення

Заходняй Беларусі 50
Маўзалей 51
Армія Чырвоная 51
Вясна мая 53
*** Я маю сонцы два... 53
Даўні знаёмы 54
Аб Леніне вялікім 54
Партызанская маршавая 55
*** Пад зорным карагодам... 56
Першы май 57

Памяці Янкі Купалы 57
Рыцар Айчыны 58
Маці 59
Слухайце, пушчы, паляны... 62
Прыпяць 63
На варце 65
Павей, вецер... 66
Ткачыха 67
Дзядзька-беларус 67
Сінія туманы 70
Палкоўнік 70
Песня аб волаце 72

Пасля вайны

Дзяўчынка 73
*** Дарогаю лясною... 73
Вулей 74
Жураўлі 75
Ляснік 75
Якубу Коласу 76
Сябры 77
Ленінграду 78
У Петрапаўлаўскай крэпасці 79
Ля помніка Лермантава 81
Нява 82
Кветка 83
Зеленню шчаслівы 84
Аб мудрасці і любві 84
Мастак 85
Пушкінская восень 86
Хлопчыку 87
З асенніх матываў 88
Не забыты песні... 89
Маяк 89
Дарожка 90
Бомы 91
Дзівасіл 92
Верасы 92
Так сказаў капітан... 93
Белы комін 94
Хвалі жытнія... 95
Па Дняпры 95
Украіне 96
Сонца 98
Латышскія стралкі 98
Дваццаць адзін 99
Аб вясне 100
Залп «Аўроры» 100
На магіле Максіма Багдановіча 101
Вячэрнія далі 101
Возера Свіцязь 102
Зязюля 103
Калумбы 103
Запавет маладосці 104

Сірэны 104
Кветкі 105
Сын рыбака 105
Райпіса струны... 106
Коклэ 106

Пад небам Францыі

Чырвоная куртка 108
Негр у атэлі 109
Ветэран 109
Пэр-Лашэз 111
Манмартр 111
«Юманітэ» 113
Прыкметы 114
Ліст са Швейцарыі 114
Зорная быль 116
У ціхім гімне 117
Час 118
Ён і самалёт 118
Пошумы 119
Неспакой 119
Кліч свабоднай зямлі 120

ПАЭМА

Слова пра Мінск 121

АПАВЯДАННІ

Партызанскімі сцежкамі

Аўдоцця і яе ўнучак 139
Пад славацкія песні 145
Лясная песня 147
Генерал 160
Гараць вёскі 163

Калгасныя палеткі

Як для скрыпкі струны... 171
Вярнуўся 177
Раздвоены 182
Коленька 190
Куфэрачак 195
Дзіця 199
«Путавод» 206
Імунітэт 209
Гумно без варот 216
А гудок гудзеў... 222
Дзед за сцяною 225
Апошні крыж 229
Паручны гадзіннік 241
У змаганні... 246

Не, не загубленая... 251
Вось як было... 255

З цыкла «Сярод чаротаў»

У палоне прастаты 262
Квас і лапці 267
Пад зорамі 270
Арліца 271
Святое маўчанне 272
Генерал 273
Сярод чаротаў 277

АПОВЕСЦІ

Муж і жонка 281
Пачатак 323
Камень 370
Каментарыі 399

Пестрак П.

П 28 Збор твораў. У 5-ці т. Т. 1. Вершы, паэма, апавяданні, аповесці/[Аўт. прадм. К. Р. Хромчанка; Падрыхт. тэкстаў і камент. Т. Р. Строеваї.— Мн.: Маст. літ., 1984.— 430 с., 4 л. іл., 1 л. партр.

У пер.: 2 р.

Збор твораў у пяці тамах вядомага беларускага пісьменніка Піліпа Сямёнавіча Пестрака (1903—1978) — першае навукова-масавае выданне яго літаратурна-мастацкай, публіцыстычнай спадчыны.

Першы том складаюць вершы, паэма «Слова пра Мінск», апавяданні і аповесці розных гадоў. Том адкрываецца прадмовай кандыдата філалагічных навук К. Р. Хромчанкі.

П $\frac{4702120200—055}{М\ 302(05)—84}$ падпісное

ББК 84Бел 7
Бел2

Филипп Семенович Пестрак

Собрание сочинений в пяти томах

ТОМ 1

Стихи, поэма, рассказы, повести

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар А. А. Сляпцова
Мастак Г. Р. Малышаў
Мастацкі рэдактар Л. Я. Прагін
Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал
Карэктар Л. П. Бялова

ІБ № 1632

Здадзена ў набор 03.11.82. Падп. да друку 25.01.84. АТ 01017. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 22,68+0,53 укл. Ум. фарб.-адб. 23,21. Ул.-выд. арк. 24,33. Тыраж 10 000 экз. Зак. 3109. Цана 2 р.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кнігагандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.